МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт

БЕЛАРУСКАЯ МОВА, ЛІТАРАТУРА, КУЛЬТУРА І СВЕТ: ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ

Зборнік навуковых артыкулаў
па выніках Міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Мінск, 3–4 лістапада 2016 г.)

Мінск МДЛУ
2018

УДК 811.161.3
ББК 81.411.3я4
Б43

Р э к а м е н д а в а н ы Рэдакцыйным саветам Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Пратакол № 1(48) ад 04.01.2018 г.

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я: *Л. А. Тарасевіч*, *П. В. Васючэнка* (адказны рэдактар), *Н. Ю. Паўлоўская*, *В. У. Барысенка*, *І. А. Бурдзялёва*, *Л. С. Кныш*

Р э ц э н з е н т ы: кандыдат філалагічных навук, дацэнт *Т. М. Рудэнка* (МДЛУ); кандыдат філалагічных навук, дацэнт *А. А. Манкевіч* (НАН Беларусі)

Беларуская мова, літаратура, культура і свет: праблемы
Б43 рэпрэзентацыі: зб. навук. артыкулаў па выніках Міжнар. навук. канф., Мінск, 3–4 лістап. 2016 г. – Мінск: МДЛУ, 2018. – 276 с.

ISBN 978-985-460-855-6.

Зборнік артыкулаў складзены па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў МДЛУ 3–4 лістапада 2016 г. і сабрала 70 удзельнікаў з 7 краінаў свету, прысвечаны актуальным праблемам сучаснага мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогіі і перакладазнаўства. Мэта выдання – узбагаціць навуковыя веды пра культурныя здабыткі Беларусі і іх папулярызацыя ў свеце.

Для шырокага кола беларускіх і замежных навукоўцаў, спецыялістаў у галіне кампаратывістыкі, выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін і студэнтаў.

УДК 811.161.3
ББК 81.411.3я4

ISBN 978-985-460-855-6

© УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», 2018

ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

Т. П. Беценко (Сумы, Украина)

ЯЗЫК ФОЛЬКЛОРА В МЕЖКУЛЬТУРНОМ ОСМЫСЛЕНИИ

Народнопоэтическое творчество является той языково-культурной средой, которая тесно взаимосвязана с народным мышлением, мировоззрением, бытовыми представлениями, т.е. со всеми сторонами жизнедеятельности этноса.

Актуальность исследования состоит в том, чтобы засвидетельствовать языковые каноны народного песнетворчества, наблюдаемые в фольклорно-песенном континууме украинского и белорусского наследия, изучение которых даст возможность сравнить родственные и неродственные народноязыковые песенные культуры.

Цель статьи – выявить и описать словесно-образные конструкции, характерные для белорусского и украинского народнопесенного текстообразования, с точки зрения их каноничности, универсальности и одновременно уникальности. Основная задача – типизировать текстово-образные формулы (универсалии) как системоорганизующие единицы фольклорного дискурса украинских и белорусских народных песен.

Каноничность словесно-образной организации народнопесенных произведений рассматриваем как фольклорную категорию, свидетельствующую о сложившейся языковой традиции, и вместе с тем – о своеобразии, самобытности, оригинальности отдельной культуры, в частности, украинской и белорусской.

По-другому каноничность понимаем как традиционность, формульность, универсальность. Без канонов текстообразования немыслимо существование народного творчества. Поэтому традиция – свидетельствование бытия этнической культурной реальности.

Наличие текстово-образных формул (универсалий) – показатель устойчивой, сформировавшейся по правилами (нормам), законам песенной традиции, закрепленность последней за отдельным национально-языковым континуумом.

Как в украинском, так и в белорусском народнопесенном творчестве, по нашим наблюдениям, представлены канонические текстово-образные универсалии – *атрибутивные*, *субстантивные*, *вербальные*, *адвербиальные*, *предикативные структуры*.

А т р и б у т и в н ы е конструкции – структурные образования типа «прилагательное + существительное». В белорусском народном творчестве естественными являются универсальные для славянского фольклора формулы *буйны ветры* [1, с.37], *дробны дождж* [1, с.37], *маманька родная* [1, с. 51, *дзіўненькі сон* [1, с. 54], *ясен сокал* [1, с. 54], *халодная вада* [1, с. 290],

драмучымі лясамі [1, с. 427], *цёмная ночачка* [1, с. 428], *ясен месяц* [1, с. 428], *луг зялёны* [2, с. 47], *быстрая рака* [2, с. 206], *быстрая вада* [2, с. 80]. Ср. в украинских народных думах: *бистрі води* [3, с. 327, 333], *біле каміння* [3, с. 163, 183, 188, 197, 202], *білий камінь* [3, с.109, 124, 125, 128, 312, 314, 315], *білі руки* [4, с. 145, 284], *буйні вітри* [3, с. 176, 291], *дрібен дощик* [3, с. 107, 108, 223, 254], *дрібні сльози* [3, с. 94, 96, 97, 182, 184, 193, 265 та ін.], *зелені явори* [3, с. 161, 206], *зелена діброва* [3, 363, 378], *холодна вода* [3, с. 91, 92, 93, 94, 95, 97], *ясні соколи* [13, с.103, 154], *ясне сонце* [3, с.138, 182], *темная нічка* [3, с. 206, 208].

Только в белорусском фольклоре засвидетельствованы формульные структуры *зялёная ліпка* [2, с. 146], *ліпачка кудравая* [2, с. 146], *бярозка белая* [2, с. 147], *белая бярозка караністая* [2, с. 402], *яленчанка зеляная* [2, с. 278], *зязюлечка баравая* [2, с. 223].

Универсальность подобных словосочетаний усматриваем в том, что, во-первых, это самые простые структуры и самые употребляемые в языке конструкции, во-вторых, – это единицы, обладающие эстетической окраской, образностью, тропеические по своей сущности, в-третьих, национально обусловленные. Сравните, например, в украинских народных думах: *бистра куля* [3, с. 93], *бистра річка* [3, с.276], *бистра супротивна хвиля* [3, с. 386, 388], *бистра хвиля* [3, с. 98, 108, 110, 112, 395, 397, 398] , *бистрі ріки-озера* [3, 300], *прудкі річки* [3, с 332], *битий гординський шлях* [3, с. 74], *бідні невільники* [3, с.13], *бідні козаки* [3, с. 95, 97 126, 209], *запорозьке войско* [3, с. 149], *сизопірі орли* [3, с. 156], *превоздобне дерево* [3, с. 116], *православні християни* [3, с. 115, 165, 181] и т.д.

Атрибутивные конструкции в качестве непосредственного отображения неязыковых фактов репрезентируют расчлененное обозначение предмета и его признака (т. е. представление предмета таким, каким его видит этноноситель языка).

С у б с т а н т и в н ы е т е к с т о в о - о б р а з н ы е формулы – сочетания существительного с существительным. В украинских народных думах – это конструкции *слава-рицарство* [3, с. 231, 232, 236], *сокіл-брат* [3, с. 114] , *срібло-злото* [3, с. 100], *час-пора* [3, с. 305], *щастя-доля* [3, с. 127, 155, 201, 212, 361], *щука-риба* [4, с. 317], *шлях-дорога* [3, с.367], в белорусском народном творчестве – *рута-мята* [1, с. 36], *зязюлька-кукушка* [1, с. 47], *мёд-гарэ-ланьку* [1, с. 50], *мёд-віно* [1, с. 50], *мурагу-сена* [1, с. 287], *віно-мёд* [1, с. 295], *паніч-каролік* [1, с. 295], *сад-вінаград* [1, с. 296], *званы-калакалы* [1, с. 382], *бары-сосны* [2, с. 81], *шчуцы-рыбаньцы* [2, с. 179], *каліна-маліна* [2, с. 222].

Сложные слова составляют неотъемлемую часть народнопесенной словесной культуры славян.

В е р б а л ь н ы е текстово-образные формулы-универсалии в украинской и белорусской фольклорной традиции также подчинены законам канонической внутренней архитектоники. К этим формулам принадлежат сложные глагольные конструкции (сложные слова): *сікти-рубати* [3, с. 163, 164, 177], *бере-хапає* [3, с. 203, 205], *бити-карати* [3, с. 218], *бігти-доганяти* [3, с. 216],

грати-вигравати [3, с. 98] – в украинских народных думах, в белорусском фольклоре – *селы-пасел* [1, с. 37], *сячыце-рубайце* [1, с. 285], *стучыць-гручыць* [1, с. 297, 298], *лець-палець* [5, с. 570], *едзь-паедзь* [1, с. 370] и структуры, образованные по модели «глагол + глагол»: *не гнися*, *не ламайся* [1, с. 433], *хоць маем, хоць не маем* [2, с. 427], *не гніся, не ламіся* [1, с. 432], *хаджу, малачу* [2, с. 80].

Принцип конструирования структур – тот же, компонентный состав близкий, похожий, но в большинстве случаев – неодинаковый, не повторяющийся.

Интерес представляют а д в е р б и а л ь н ы е текстово-образные универсалии. Предназначение этих структур – поэтизировать пространственные, временные и другие характеристики измерения бытия. Формульные структуры с семантикой места указывают на местоположение описываемого предмета, явления, события, на направление, движение к определенному предмету в пространстве и проч. Пространство в фольклоре, как и время, – реальное обобщенное бытие, мыслящееся в тесной связи с человеком. Для белорусского носителя культуры актуальным является макропространство: на *Русь, на Украіну* [1,с. 282], *на ціхім Дунаі* [1, с. 282], *за ціхім Дунаем* [1, с. 288], *на Украіну* [1, с. 281, 282], *на Русь* [1, с. 283], *на моры на сінюсенькім* [1, с. 37], *з поля* [1, с. 37], *па Дунаечку* [2, с. 126, 127], *на рыночку* [1, с. 36], *у луг, у бор* [1, с. 40], *у крыніцу* [1, с. 41], *у садзе* [1, с. 41], *па саду* [1, с. 42], *у садочку* [1, с 42], *да з гары на даліну* [1, с. 283], *пад круту гару* [1, с. 430], *да на моры, на моры, на сіненькім возеры* [1, с. 283], *у бару* [1, с. 289], *у чыстым полі* [1, с. 299], *за лесам* [1, с. 302], па *чысту полю* [1, с. 302], *за гарой, за гарой круценькай* [1, с. 392], *за гумном*, *за новенькім* [1, с. 289], *чэрэз тры лясы* [1, с. 303], *чэрэз тры сялы* [1, с. 303], *між гор, між даліны* [1, с. 292], *да й у чыстым у полі, да й на бітому шляху* [1, с. 430], а также и микропространство: *на камені на бялюсенькім* [1, с. 37], *у каморы* [1, с. 42], *у хаце* [1, с. 48], *на бярозах* [8, с. 50], *на дварэ* [1, с. 293], *каля коніка* [1, с. 287], *на коніку* [1, с. 55], *у новым калодзежы* [1, с. 281], *з-пад крыніцы* [1, с. 290], *на масту* [2, с. 427]. Идентичное словесно-образное кодирование пространства в украинском фольклоре свидетельствует о родст-венности этносов: з *чужої сторони* [3, с. 116], *із чистого поля* [3, с. 312], *з криниці Салтанки* [3, с. 94, 96], *із чужого дому* [3, с. 360], у *тихий Дунай* [3, с. 409], *в чисте поле, в широке роздолля* [3, с. 216], у *чужий дім* [3], *через темні луги* [3, с. 328], *через високі ліси* [3, с. 338].

Поэтизацию пространства мы связываем с намерением песнетворцев зафиксировать местопребывание, местонахождение существенных для бытия реалий духовной и материальной жизни человека. Локус есть часть этноса, составляющий мировоззрение индивидов, компонент национальной (генетической) памяти. Для белорусов важными локативами считаются *лес, сад, поле, бор, гай, гора, дубрава, море* и др. Для украинцев, к примеру, – *степь, поле, лес, сад, бор, гора, дубрава, море* и др. Сходство пространственного обозначения действительности и в белорусском, и в украинском фольклоре – очевидное.

Время в словесно-образном оформлении также есть обязательный показатель национально-образного видения бытия. Для белорусского носителя языковой культуры характерным считается время, определяемое словами *ранюсенька* [1, с. 51], *з суботкі на нядзельку* [1, с. 5, 53], у *суботу на нядзелю* [1, с. 52], *у нядзелю рана* [1, с. 55], *у нядзелечку* [1, с. 56], *з суботы на нядзелю* [1, с. 56, 57], *у нядзелю да рана параненька* [1, с. 280], *у нядзельку рана* [1, с. 280], *ой, рана, рана, на зарэ* [1, с. 429]. Для украинской фольклорной традиции характерны конструкции *ранньою зорею* [3, с. 325], *у святую неділеньку рано-пораненьку* [3, с. 190, 366, 367], *до схід сонця* [3, с. 59], *в неділю рано-пораненьку з світовою зорею* [13, с. 340, 341], *ясною зорею* [3, с. 206].

Текстово-образные п р е д и к а т и в н ы е конструкции-универсалии в народном творчестве – структуры, соотносительные с предложениями. Такие единицы достаточно активные и в украинском, и в белорусском народном фольклоре. Например, в белорусском народном творчестве: *дробныя слёзкі роніць* [1, с. 43], *дробныя дажджы паліваюць* [1, с. 36], *коніка сядлае* [1, с. 47], *зязюлька кукавала* [1, с. 48], *па сенях пахадзіла* [1, с. 51], *сон сасніла* [1, с. 53], *сон відзела* [1, с. 53], *на коніку сядзіць* [1, с. 55], *цякла рэчачка* [1, с. 56], *русая каса да паяса* [1, с. 280], *два конікі да ваду пілі* [1, с. 280], *коні поюць* [1, с. 289], *вада ручаём цячэ* [1, с. 290], *вада цячэ холодная* [1, с. 290], *вадзічка ручаём бяжыць* [1, с. 292], *быстра рэчка цячэ* [1, с. 294], *па чысту полю стралою імчыся* [1, с. 302], *не вей, вецер* [1, с. 431], *каля рэчанькі хадзіла*, *каля быстрае гуляла* [2, с. 390], *я над ракою стаяла, белыя ручкі умывала* [2, с. 391], *з адной гары вецер вее, з-пад другой гары павявае* [2, с. 279], *кукавала зязюля* [2, с. 222] и др., в украинском фольклоре: *став з Дніпра тихий вітер повівати* [3, с. 388], *будуть козаки чистим полем гуляти* [3, с. 89], *дрібен дощик накрапає* [3, с. 254], *став буйний вітер повівати* [3, с. 186], *не буйні вітри повівали* [3, с. 79]. По своей сущности (учитывая лексический состав, содержательность конструкции) подобные текстово-образные универсалии, на наш взгляд, родственны с эпическими формулами песен славянского фольклора вообще.

Итак, язык фольклора – та область духовно-культурной традиции, которая позволяет изучать и сравнивать своеобразие этнического мышления, этнического творчества в контексте родственных и неродственных культурных связей.

ЛИТЕРАТУРА

1. Вяселле : песні: у 6 кн. – Мінск: Навука і теэхніка, 1981. – Кн. 1.
2. Восеньскія талочныя песні. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981.
3. Украинские народные думы. – М. : Наука, 1972.
4. *Беценко, Т. П.* Мова українських народних дум: словник текстово-образних одиниць / Т. П. Беценко. – Суми, 2016.
5. *Беценко, Т. П.* Текстово-образні універсалії – системні одиниці / Т. П. Беценко // Карповские научные чтения: сб. науч. ст.: в 2 ч.– Минск, 2012. – Вып. 6, ч. 1. – С.12–25.

А. Ю. Краеў (Ружамберак, Славакія)

БАЗАВАЯ ЛЕКСІКА Ў БЕЛАРУСКАЙ, РУСКАЙ І СЛАВАЦКАЙ МОВАХ: АГУЛЬНАЕ І АДРОЗНЕННІ

Параўнальнае апісанне моў, як роднасных, так і народнасных, ужо на працягу доўгага часу ўяўляе сабой адзін з прадметаў інтарэсу лінгвістычнай навукі, у якой існуюць і развіваюцца раздзелы супастаўляльнага, параўнальнага ці кантрастыўнага мовазнаўства.

Асновай для розных спосабаў параўнання выступаюць разнастайныя сукупнасці фактаў тых ці іншых моў. Не прадстаўляе сабой выключэння і лексічны склад мовы, яе лексічная падсістэма. Звернемся да апісання і сістэматызацыі лексічных з'яў трох роднасных славянскіх моў – беларускай, рускай і славацкай.

Не выклікае сумнення той факт, што такога роду параўнальныя апісанні могуць выконвацца на пластах лексікі рознага аб'ёму. Для прадмета нашага разгляду мы абралі т.зв. базавую, асноўную лексіку ў трох мовах. У якасці матэрыялу для параўнання, які б адпавядаў зместу паняцця *базавая лексіка*, можна абраць лексічныя адзінкі, зыходзячы з некалькіх крытэрыяў.

Першы крытэрый адсылае нас да сістэмы тэсціравання пры валоданні мовамі ў рамках агульнаеўрапейскіх моўных кампетэнцый, дзе паняцце *базавы* (*узровень*) суадносіцца з узроўнем валодання мовай А2. Набор лексікі, якім неабходна валодаць на гэтым узроўні, для рускай мовы складае каля 1 300 адзінак, сабраных і прадстаўленых у афіцыйна зацверджанай дакументацыі па тэставанні валодання рускай мовай як замежнай на розных узроўнях (у дадзеным выпадку – ТРКИ, тэст базавага ўзроўню). У выпадку выкарыстання дадзенага падыходу да аналізу паняцце *базавы* адпавядала б назвам ў сістэме ТРКИ. Але тут узнікае пэўнага роду праблема, якая заключаецца ў тым, што, па даступнай нам інфармацыі, аналагічныя дакументы не існуюць ці, па меншай меры, не апублікаваныя і афіцыйна не зацверджаныя для дзвюх іншых моў параўнання – як для беларускай, так і для славацкай.

Зыходзячы з усяго сказанага вышэй, мы вырашылі выкарыстоўваць для параўнання больш лімітаваны спіс слоў, які ўключае ў сябе крыху больш за 200 лексічных адзінак і вядомы ў лінгвістыцы апошніх дзесяцігоддзяў пад назвай «спіс Сводэша» (даступны на http://be.rfwiki.org/wiki/Спіс_Сводэша, дата: 12.10.2016). Такога роду спісы складзеныя і выкарыстоўваюцца для большай часткі апісаных моў свету. Асабліва цікавыя ў дадзеным аспекце яны для груп моў (славянскай, германскай, раманскай і т.п.). Такім чынам, пад базавай лексікай у нашым артыкуле мы разумеем лексічныя адзінкі, прадстаўленыя ў т.зв. «кананічным» спісе Сводэша для выбраных намі моў.

Дадзены спіс быў прапанаваны ў сярэдзіне XX стагоддзя амерыканскім лінгвістам Морысам Сводэшам з мэтай выкарыстання пэўнага пераліку слоў для ацэнкі ступені сваяцтва паміж рознымі мовамі. Крытэрыем ацэнкі выступае падабенства найбольш устойлівага базавага слоўніка ў аналізаваных мовах.

У сучасных умовах існуюць і могуць выкарыстоўвацца варыянты такіх спісаў, якія ўключаюць у сябе 100 ці 200 (дакладней, 207) лексічных адзінак канкрэтнай мовы, яе так званую «ядзерную» лексіку. Прызнаецца, што спіс са ста слоў з'яўляецца больш актуальным і больш устойлівым, аднак дапускаецца і выкарыстанне спісаў з 200 (207) слоў, якія з'яўляюцца старэйшымі і менш устойлівымі. Менавіта з такіх спісаў, якія змяшчаюць у сабе 207 лексічных адзінак трох моў, мы і зыходзілі пры рабоце з матэрыялам.

Спіс Сводэша для ўсіх моў адкрываецца словамі, якія, на думку даследчыка, з'яўляюцца самымі «базавымі», самымі устойлівымі ў любой мове. Гэта асабовыя, указальныя, некаторыя пытальныя займеннікі і некалькі прыслоўяў. Спынімся на падабенстве (цалкам натуральным і лагічным) дадзеных адзінак у трох мовах (табл. 1).

Таблiца 1

Беларуская мова	*Руская мова*	*Славацкая мова*
я	я	ja
ты	ты	ty
ён	он	on
мы	мы	my
вы	вы	vy
яны	они	oni, ony
тут	тут	tu
там	там	tam
хто	кто	kto
што	что	čo
дзе	где	kde
не	не	nie, ne-

Як бачым з табл. 1, гэтыя базавыя словы зразумелыя носьбітам кожнай з трох моў і адрозніваюцца толькі некаторымі асаблівасцямі. Напрыклад, у славацкай мове ў ходзе гістарычнага развіцця гук [ы] зліўся з [і], таму літары *і* і *у* абазначаюць адзін і той жа гук. Таксама ў сістэме славацкай мовы хацелася б адзначыць наяўнасць дзвюх форм асабовага займенніка 3-й асобы множнага ліку для абазначэння групы асоб або прадметаў мужчынскага роду або змяшанай групы (*oni*) і асоб або прадметаў жаночага ці ніякага роду (*ony*).

У сферы ўказальных займеннікаў спецыфічным (у параўнанні з рускай і беларускай мовамі) з'яўляецца афармленне слоў для абазначэння прадметаў па характарыстыцы ‘блізкі – далёкі’ (табл. 2).

Т а б л і ц а 2

Беларуская мова	*Руская мова*	*Славацкая мова*
гэты	этот	tento
гэта	эта	táto
гэта	это	toto
той	тот	tamten
тая	та	tamtá
тое	то	tamto

У славацкай мове для абазначэння і ўдакладнення месца знаходжання прадмета па прыкмеце ‘блізкі – далёкі’ выкарыстоўваюцца «фарманты» *to* і *tam*, далучаныя да слоў *ten*, *tá*, *to*, якія функцыянуюць у якасці ўказальных прыметнікаў.

Што датычыцца лексікі, унікальнай у дадзеным пераліку для беларускай мовы, то можна адзначыць наступныя словы (табл. 3).

Т а б л і ц а 3

Беларуская мова	*Руская мова*	*Славацкая мова*
шмат	много	veľa, mnoho
бацька	отец	otec
насенне	семена	semená
бачыць	видеть	vidieť
трымаць	держать	držať
зорка	звезда	hviezda

Прызнаная спецыфічнасць лексічнага фонду рускай мовы ў параўнанні з іншымі славянскімі мовамі, абумоўленая асаблівасцямі яе гістарычнага развіцця, на матэрыяле спісаў Сводэша можа быць ілюстравана наступнымі словамі (табл. 4).

Т а б л і ц а 4

Руская мова	*Беларуская мова*	*Славацкая мова*
другой	іншы	iný
большой	вялікі	veľký
глаз	вока	oko
слышать	чуць	počuť
охотиться	паляваць	poľovať
луна	месяц	mesiac
красный	чырвоны	červený
хороший	добры	dobrý
ребенок	дзіця	dieťa

У дадзеную табліцу маглі быць уключаны і іншыя наборы слоў, аднак часам такая групоўка лексічных адзінак можа здацца неправамернай (напрыклад, *спяваць – петь – spievať*, *граць – играть – hrať*, *кветка – цветок – kvet*), калі адрозненні абумоўленыя выключна фанетычным афармленнем слоў ці наяўнасцю роднаснага слова і ў іншай мове, якое адрозніваецца ці стылістычна, ці па сферы ўжывання (напрыклад, і ў рускай мове існуюць словы *дитя, око, ведать, иной*). Таксама нам прадстаўлялася важным зыходзіць з аднаго з асноўных прынцыпаў складання спісаў Сводэша – разглядаць слова ў яго прамым, дэнататыўным значэнні, стылістычна «нейтральным» (такім чынам, табл. 4 не дапоўнілі рускія словы *добрый, Месяц*).

Таксама неадназначна можна прадставіць і набор слоў, з пункту гледжання нашага прадмета разгляду ўнікальных і для славацкай мовы (поўны спіс прыводзіцца ў табл. 5 з наступным каментарам).

Т а б л і ц а 5

Славацкая мова	*Беларуская мова*	*Руская мова*
strom	дрэва	дерево
lano	вяроўка	верёвка
chodidlo	ступня	ступня
cesta	дарога	дорога
a	і	и
žena	жанчына	женщина
muž	мужчына	мужчина
pes	сабака	собака
had	змяя	змея
vajce	яйка	яйцо
brucho	жывот	живот
chrbát	спіна	спина
prach	пыл	пыль
krk	шыя, карак	шея

Напрыклад, у славацкай мове існуе слова *drevo*, але толькі для абазначэння матэрыялу, *život* – у значэнні ‘жыццё’, грамадзянскі стан «жонка – муж» па-славацку пазначаецца словамі *manželka – manžel*, як відавыя паняцці ў заалогіі выкарыстоўваюцца назоўнікі мужчынскага роду *pes, had*. Таксама нельга цалкам сцвярджаць, што *brucho, chrbát, prach* ці *krk* з'яўляюцца ўнікальна славацкімі словамі (пар. рус. *брюхо, хребет, прах*, беларус. *карак* і т.п.). Аднак тут мы зноў звяртаемся да фундаментальнага прынцыпу складання спісаў Сводэша – улічваць асноўнае, прамое значэнне кожнага слова ў кожнай з моў, а не толькі іх знешняе, фармальнае падабенства.

Так, напрыклад, можна прадставіць словы, якія абазначаюць адно і тое у трох мовах, але значна адрозніваюцца па форме (табл. 6).

Т а б л і ц а 6

Беларуская мова	*Руская мова*	*Славацкая мова*
садавіна	фрукты	ovocie
тлушч	жир	tuk
штурхаць	толкать	tlačiť
лічыць	считать	počítať
хмара	туча	mrak
дрэнны, кепскі, благі	плохой	zlý
брудны	грязный	špinavý

У табл. 7 прадстаўленыя словы, якія абазначаюць тыя самыя прадметы або з’явы, але па-рознаму аформленыя ў трох мовах.

Т а б л і ц а 7

Беларуская мова	*Руская мова*	*Славацкая мова*
Сонца	Солнце	Slnko
зямля	земля	zem
імгла	мгла	hmla
попел	пепел	popol
рыба	рыба	ryba
дым	дым	dym
хвост	хвост	chvost
далонь	ладонь	dlaň
воблака	облако	oblak
жывёла, жвёліна/звер	животное/зверь	živočích/zviera

Цікава, што валоданне ўсходнеславянскімі мовамі як роднымі палягчае засваенне правапісу слоў, у якіх у славацкай мове традыцыйна пішацца літара *y* для вызначэння галоснага гука [i]. Носьбіты славацкай мовы вывучаюць словы кшталту *ryba* як «выбраныя словы», у якіх з невядомых ім прычын пішацца *y*, а не *i* для вызначэння адпаведнага гука.

Не звяртаючы ўвагу на лагічныя адрозненні ў лексіцы трох блізкароднасных моў, можна сцвярджаць, што генетычная блізкасць значна палягчае засваенне і эфектыўнае валоданне іншымі славянскімі мовамі на аснове роднай.

Н. Б. Лысова (Полацк)

ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ЎТОПІЯ: НАТАТКІ ПРА ТВОРЧАСЦЬ СВЯТЛАНЫ АЛЕКСІЕВІЧ У КАНТЭКСЦЕ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА ПРАЦЭСУ

Сучасныя літаратуразнаўцы даўно гавораць аб тэндэнцыі мастацкай літаратуры да дакументальнасці, або да прэзентацыі «жыцця як яно ёсць». Размова ідзе не аб рэалізме як метадзе літаратурнага аповеду. Справа – у разбурэнні мастацкасці літаратуры, імітацыі пісьменнікамі журналісцкага, навуковага пісьмовага выказвання або наратыву сузіральніка падзей. Такая тэндэнцыя нарадзіла ў сучаснай літаратуры мноства фармальных, жанравых, варыянтаў аповеду – ад «новага рамана» да літаратуры «нон-фікшн» (нявыдуманай). Безумоўна, падобнае развіццё літаратурнага працэсу звязана з агульным крызісам гуманітарнай думкі канца XX ст., у выніку чаго адбываюцца пошукі сінтэзу мастацтва і навукі, мастацтва і філасофіі, пошукі новых сувязяў мастацтва з жыццём.

Прыкладам сучаснага дакументальна-мастацкага выказвання аб рэальнасці з'яўляецца і творчасць беларускай пісьменніцы Святланы Алексіевіч, якая пачынала сваю літаратурную дзейнасць як журналістка, аўтар нарысаў, рэпартажаў, кінасцэнарыяў да дакументальных стужак. А потым яна звярнулася да дакументальна-мастацкай літаратуры, вынікам чаго стала стварэнне цыкла «Галасы ўтопіі», які складаецца з пяці кніг: «У вайны не жаночы твар», «Апошнія сведкі», «Цынкавыя хлопчыкі», «Чарнобыльская малітва» і «Час секанд хэнд». Літаратурная творчасць С. Алексіевіч выклікала вялікую цікавасць чытачоў свету, яе творы перакладзены на дзясяткі моў. А ў 2015 г. яна была ўзнагароджана Нобелеўскай прэміяй па літаратуры з фармулёўкай «за яе шматгалосную творчасць – помнік пакутам і мужнасці ў наш час».

Сярод сваіх папярэднікаў у літаратуры С. Алексіевіч называе Соф'ю Фядорчанка, рускую і савецкую пісьменніцу першай паловы XX ст., дакументальныя запісы якой аб салдатах Першай сусветнай вайны, аб часе «кераншчыны» і аб Грамадзянскай вайне друкаваліся ў 1917–1927 гг. і ўяўлялі сабой, па меркаванні самой пісьменніцы, стэнаграфічныя запісы вусных апавяданняў народа. Гэтыя запісы Фядорчанкі атрымалі агульную назву «Народ і вайна». Такім чынам, з твора рускай пісьменніцы пачынаецца традыцыя дакументальных кніг пра вайну, дзе апавяданні ўдзельнікаў падзей запісаны жанчынай-літаратарам.

С. Алексіевіч прызнаецца і ў ментальных славянскіх падмурках сваёй творчасці: «Что касается того, почему я выбрала именно этот жанр, – это просто мой жанр. Я мир воспринимаю через голоса. … Я жила в славянской деревне, где все выговаривается, где вся беда (а мы люди беды и страданий) выносится на улицу… Это выше тебя, этот жанр не только тебе принадлежит» [1].

Творы Алексіевіч напісаны на рускай мове, але яе літаратурнае станаўленне адбывалася пад уплывам беларускамоўнай літаратуры. Сама аўтар не аднойчы падкрэслівала ўздзеянне твораў беларускіх пісьменнікаў Алеся

Адамовіча і Васіля Быкава. Менавіта А. Адамовічу, як аднаму з аўтараў такіх «народных кніг», створаных з запісаў апавяданняў сведкаў падзей, як «Я з вогненнай вёскі» (А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка) і «Блакадная кніга» (А. Адамовіча, Д. Граніна), пісьменніца абавязана, па яе словах, самім метадам літаратурнай працы, што быў вызначаны пісьменнікам-літаратуразнаўцам А. Адамовічам як «адкрыты» метад здабываць праўду жыцця. А творчасць В. Быкава натхняла яе, як і мноства пісьменнікаў наступных пакаленняў, ідэяй маральнага выбару ў сітуацыі памежжа жыцця/смерці, праблематыкай экзістэнцыйнага выбару сучаснага чалавека.

Мэтаю нашага даследавання з'яўляецца прагляд тэматычна-жанравых асаблівасцяў твораў С. Алексіевіч, асэнсаванне пераемнасці яе пісьменніцкіх метадаў аналізу рэчаіснасці з беларускім літаратурным працэсам, або – разгляд творчасці сусветна вядомай пісьменніцы ў кантэксце гісторыі культуры.

Беларуская літаратура, як і іншая нацыянальная літаратура, пачынаецца з рамантычных спроб засваення прафесійнымі літаратарамі фальклорнага, вуснага, выказвання пра рэальнасць. Разам з тым сацыяльны вопыт канца XIX – пачатку XX ст. з яго тэндэнцыямі да навуковага даследавання законаў жыцця і рэвалюцыйных пераўтварэнняў актуалізаваў рэалістычна-публіцыстычны метад літаратурнага аповеду. Беларуская літаратура пачынаецца і з дакументальных, аўтабіяграфічных твораў. М. Лазарук адзначае «побытавую» (не мастацкую) стылістыку твораў Францішка Багушэвіча, а А. Адамовіч ухваляе творчасць «стыхійнага дакументаліста» Максіма Гарэцкага, які сваёй «хранікальнай эпапеяй» («Камароўская хроніка»), «літаратурай факта» (ад «Сібірскіх абразкоў» і «Віленскіх камунараў») стварае «дакументальны вобраз» пачатку стагоддзя. Пры гэтым А. Адамовіч сцвярджае, што «дакументальнасць у стылі, манеры, у жанры – гэта не толькі прамежкавая ступень да больш закончанай формы (хоць так і бывае), а раўнапраўная і таксама закончаная форма» [2, с.163].

Даследчыкі гістарычнага шляху айчыннай літаратуры заўважылі суіснаванне двух стылістыстычных напрамкаў творчасці (мастацка-паэтычнай, рамантычнай і дакументальна-мастацкай, рэалістычнай), больш таго, яны падкрэслівалі блізкасць гэтых тэндэнцый мастацкага мыслення: «…ў беларускай літаратуры XIX і пачатку XX стагоддзя граніцы паміж гэтымі дзвюма асноўнымі тэндэнцыямі, лініямі развіцця – рэалістычнай і рамантычнай – даволі невыразныя» [3, с. 85]. Пры гэтым тэндэнцыя да дакументальнага, хранікальнага, аўтабіяграфічнага і публіцыстычнага аповеду і надалей заставалася важным прынцыпам айчыннага пісьменства. Літаратуразнаўцы звязваюць яе з «драматычным сутыкненнем грандыёзных падзей XX стагоддзя» з «небывала паскораным бегам часу» [4, с. 93], ва ўмовах якога сталела нацыянальная літаратура.

Імкненне адлюстраваць рэальнасць у дакументальных формах суправаджала развіццё нацыянальнай літаратуры і ў савецкі час. А. Яскевіч адзначае звароты будучых айчынных класікаў да форм дакументальна-мастацкай творчасці: «Немагчымасць паказаць трагедыю сяла ў час галавакружнай калектывізацыі змусіла М. Зарэцкага выказваць жыцёвую праўду мовай

нарысаў “Падарожжа на новую зямлю” (1929) і “Лісты ад знаёмага” (1931). … Мастацкая дакументалістыка становіцца значным спектрам творчасці і ў Якуба Коласа. Для трылогіі “На ростанях”, кнігі свайго першага ўваходжання ў жыццё, пісьменнік выбірае форму мастацкага “дневніка”. У сваю чаргу, мастацкі дзённік Мележа-франтавіка расказаў болей аб драме адступлення і салдацкай мужнасці 41 года, чым пазнейшае яго мастацкае палатно “Мінскі напрамак”» [4, с. 93]. Падагульняючы вынікі літаратурнага працэсу пасляваеннага дзесяцігоддзя (1945–1955), літаратуразнаўца быў вымушаны нават дадаць да традыцыйнага падзелу літаратурнай творчасці на прозу, паэзію, драму дзве старонкі тэксту без падназвы пра «мастацка-дакументальныя разнавіднасці літаратуры» [4, с. 93]. Вылучаючы нарыс В. Таўлая «Марына Гурына», тагачасныя аўтабіяграфічныя творы Я. Брыля («Ты мой найлепшы друг» і інш.), мемуары Б. Мікуліча «Аповесць для сябе», А. Яскевіч заўважае: «Яшчэ чакае свайго тэарэтычнага даследавання гэтая літаратура непасрэднага аўтабіяграфічнага маналогу і плыні свядомасці, дзе аўтар можа быць адначасова і рэалістам, і рамантыкам, і сентыментальна багавець перад жыццёвай марай, бо гэта ж непасрэдна выказаныя рухомыя спектры душы і станы чалавечага экзістэнцыянавання» [4, с. 94].

Імкненне надаць дакументальна-мастацкаму аповеду такія мэты, як адлюстраванне поліфанічнасці чалавечага існавання ў часы выпрабаванняў, паказ экзістэнцыйнага стану, нарадзіла ў 1970-я гг. і такое «адкрыццё ў савецкай літаратуры» [5, с. 515], як кніга А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі», «першую спробу дакументальнай эпапеі народнай памяці, якая не толькі дапаўняла – праз 30 гадоў – уяўленні аб мінулай вайне, але ў нечым супрацьстаяла яе афіцыйнай трактоўцы» [5, с. 516]. Кніга набыла такія жанравыя вызначэнні, як «мастацкі дакумент», «кніга-араторыя», «сімфонія», «хор» з-за поліфанічнасці прадстаўлення адной тэмы – гісторыі спаленых беларускіх вёсак. Для творчасці яе аўтараў дакументальна-мастацкі метад літаратурнага засваення вопыту рэальнасці становіцца ўжо не мастацкім эксперыментам, а галоўным метадам далейшай творчасці. Даследчыца творчасці Я. Брыля, у спадчыне якога найбольш значнае месца займае аўтабіяграфічная і мастацка-дакументальная проза з яе мемуарамі, белетрызаванымі біяграфіямі, дзённікамі, запісамі, лірычнымі мініяцюрамі, В. Нікіфарава заўважае: «Я. Брыль яшчэ раз упэўніўся, што, давяраючы заўсёды найбольш народнаму меркаванню і слову, індывідуальнай памяці канкрэтнага чалавека, ён рабіў правільна. Зразумеў ён і тое, што гэтыя крыніцы гістарычных сведчанняў далёка не вычарпаныя і патрабуюць распрацоўкі» [5, с. 516].

Пашырэнне літаратурнай прасторы дакументальна-мастацкімі творамі ў 1980-я гг., «узмацненне публіцыстычнай дакументальнасці» вызначалася літаратуразнаўцамі як тэндэнцыя «да глыбінь народнай памяці». Пры гэтым ужо пазначалася праблема пакутлівага ўспрымання такой натуралістычнай літаратуры, ці «праблема мастацкасці такой літаратуры» [6, с. 20]. Першыя кнігі С. Алексіевіч увайшлі менавіта ў гэтую плынь беларускай літаратуры. Яны набылі вызначэнне «кніг народнай памяці» і выклікалі крытыку за

акцэнтаванне балючых кропак-тэм жыцця. Заўважым, што пачатак творчасці Алексіевіч супаў з гадамі ўзмацнення тэндэнцыі да пошукаў сацыяльнай праўды і звязанага з імі культу чалавечай годнасці, што падрыхтоўвала настроі перабудовы, сацыяльнай і экзістэнцыяльнай.

Невыпадкова таму першыя кнігі пісьменніцы атрымалі і «шматгалосую» крытыку – ад прызнання да выкліку ў суд. Апошняе звязана з трэцяй кнігай цыкла «Цынкавыя хлопчыкі», асноўным зместам якой сталі ўспаміны ўдзельнікаў афганскай вайны і іх родных. Атрымалася сутыкненне трох рэальнасцяў памяці: ваеннай, савецкай і мастацкай. Калі першая ствараласяся вобразамі смерці і пакутаў на вайне, другая – прыкметамі жыцця апошніх гадоў савецкай улады, то трэцяя – матэрыяламі запісных кніжак, выбаркай, кампазіцыяй, назвамі раздзелаў. Мастацкая ідэя кнігі ўрэшце набыла алюзію на біблейскую апакаліптычную ідэю стварэння свету і яго самаразбурэння, смерці ці надыходу Суднага дня. Назвы раздзелаў кнігі агучваюць гэтую ідэю: «Дзень першы», «Дзень другі», «Дзень трэці», «Post morten», «Суд над “Цынкавымі хлопчыкамі”». Усе тры рэальнасці перапляліся ў адзіны «хор» ці «дыялог» успамінаў. Пісьменніца ўключае ў наступныя рэдакцыі і крытычныя артыкулы на першае выданне, і лісты-скаргі, і асабістыя прамовы ў абарону кнігі. Такім чынам, сёння ў XXI стагоддзі кніга «Цынкавыя хлопчыкі» адлюстроўвае той драматычны час перабудовы і, магчыма, пачынае тэму грамадзяніна, выхаванага савецкай ідэалогіяй, тэму «чырвонага чалавека» ці прадстаўніка «часу секанд хэнд». У адным са сваіх інтэрв’ю Алексіевіч тэматычна аб’ядноўвае пяць кніг менавіта гэтай тэмай як савецкай ідэалагічнай утопіяй: «35 лет я писала эти пять книг… Можно сказать, что это одна книга, одна душа. Эта книга больше всего о том, как мы жили, и как эта жизнь кончилась, и как мы оказались в растерянности» [7]. Сама аўтар называе гэтую ідэалогію «вялікай утопіяй». Але мастацкая ідэя кнігі пра афганскую вайну пазначана апакаліпсісам, у якім апынуліся людзі напрыканцы існавання савецкай улады, ці антыўтопіяй.

Праўда, у 1980-я гады першыя кнігі С. Алексіевіч яшчэ не атрымалі жанравага вызначэння «ўтопіі». Творы пісьменніцы, можна так сказаць, нараджаліся і сталелі: дапаўняліся дзённікавымі запісамі, урыўкамі з інтэрв’ю, эпіграфамі, цытатамі і г.д. Так, кніга «У вайны не жаночы твар», паўторна выдадзеная ў 2007 г., адзначана некалькімі перыядамі стварэння: 1978–1985; 2002–2004 гг. Будучым даследчыкам творчасці пісьменніцы яшчэ трэба будзе прагледзець шлях стварэння, нараджэння вобразаў «Галасоў Утопіі», ці крокі асэнсавання аўтарам зафіксаванай рэальнасці ад першых прыступкаў як дакументальнага пашырэння ведаў пра трагічныя падзеі да далейшага развіцця літаратурнага вобраза як сацыяльна-аналітычнага і філасофска-мастацкага. І падмуркам, на якім пісьменніца «будавала» вобразнасць сваіх твораў, стала руская рэлігійная філасофія і літаратура. Сама Алексіевіч пра гэта гаворыць: «Нейкія рэчы, якія я рабіла, напрыклад Чарнобыль ці нават вайна, я, магчыма, і не змагла б зрабіць без усясьветнага досьведу філязофскай думкі пра вайну, без касмаганічнага досьведу расейскай культуры і філязофіі я не змагла б пісаць пра Чарнобыль, наўрад ці я б змагла» [8, с.15].

Сапраўды, кніга «Чарнобыльская малітва» ўтрымлівае алюзіі на творы рускіх пісьменнікаў. І галоўнымі з іх, на наш погляд, з'яўляюцца звароты да тэм «маленькага чалавека» і «рускага космасу». Успаміны пра аварыю ў прадмове да кнігі названы маналогамі «маленькіх людзей», а ў кампазіцыйнай рамцы кнігі размешчаны два апавяданні жонак ліквідатараў аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі пра апошнія дні жыцця сваіх мужоў, два апавяданні пра любоў і смерць, пазначаныя адзінаю назваю «Самотны голас чалавека» («Одинокий голос человека»).

Назва раздзелаў адсылае чытача да кінастужкі рэжысёраў Аляксандра Сакурава і Юрыя Арабава па творах пісьменніка Андрэя Платонава, дзе тэма самотнага голасу – гэта тэма разбурэння чалавечага існавання пасля вайны, рэвалюцыі, голаду. Але, як пісала крытыка, «Дело ведь вовсе не в том, что человек беззащитен, заброшен во враждебный мир, презираем властью, государством и подвержен ужасу небытия. Таков удел каждого смертного, в какую бы эпоху он ни жил. Речь идет именно об экспансии смерти в сферу сущего, о том, как далеко продвинулась смерть» [9, с.17].

Платонаў падымае тэму канкрэтнай гісторыі да біблейскага вобраза Апакаліпсісу. Да вызначанай Дастаеўскім у апавяданні «Бабок» тэмы паза-жыццёвага існавання як вобраза існавання не цялеснага, як ужо немагчымага, а толькі гукавога на апошніх хвілінах богапакінутасці, калі раптам адкрываецца мудрасць космасу і мізэрнасць чалавека. Пасля сацыяльных катастроф чалавек зноў, як і ў першыя дні выгнання з раю, самотны. Не ён гаворыць з сусветам, а сусвет адкрываецца перад ім у сваёй праўдзе. Амаль усе героі Алексіевіч гавораць аб тым, што ім адкрылася ў пазнанні свету. І ты як чытач разумееш, што існаванне чалавека можа трымацца толькі непарыўнай сувяззю з космасам, любоўю, як падмуркам новазапаветнай маралі. Аб сугучнасці думцы рускага пісьменніка гаворыць і абраная Алексіевіч назва і жанравае вызначэнне кнігі – «Чарнобыльская малітва. Хроніка будучага». Хроніка будучага як антыўтопіі, ці не жыцця, а растварэння ў космасе.

Эпіграфам да кнігі «У вайны не жаночы твар» выбраны радкі з «Вершаў аб невядомым салдаце» В. Мандэльштама 1937 г., у якім паэт вобразна зафіксаваў трагічны вопыт сусветнай чалавечай гісторыі і свайго асабістага лёсу, як сведкі Першай сусветнай вайны і сталінскіх рэпрэсій: «Миллионы убитых задешево / Протоптали тропу в темноте...» [10, с. 6]. Прадстаўляючы словамі Мандэльштама твор аб Вялікай Айчыннай вайне, Алексіевіч, такім чынам, заяўляе аб тоеснасці свайго меркавання з гуманістычнай думкаю паэта. Кніга «У вайны не жаночы твар» пераўтвараецца з кнігі даследавання мінулага вопыту ў мемарыяльную кнігу – даніну памерлым, скалечаным, вядомым і невядомым абаронцам чалавечай годнасці. Нездарма пісьменніца абірае назваю да свайго папярэдняга дзённікавага запісу да кнігі выраз «Человек больше чем война» [10, с. 6].

Сусветны, ці філасофскі кантэкст тэматыкі сваіх кніг аўтар прагаворвае ў сваіх інтэрв'ю: «Мы жывём у вялікім, пахіленым сьвеце, які трашчыць па ўсіх швох. Чалавек ідзе па шляху самазьняшчэньня, і стаіць лямант» [8, с. 18]. Але гэта – тэма антыўтопіі, канца свету, а не яго шчаслівага пераўтварэння. І аб гэтым яе першыя кнігі аб вайне.

Менавіта тэму разбурэння чалавечай гуманнасці, а не натуралістычную праграму дакументальнага твора С. Алексіевіч, заўважыў яшчэ ў 1970-я гг. кінарэжысёр Віктар Дашук, які стварыў паводле яе кнігі кінацыкл «У вайны не жаночы твар». Кінадакументалісты не проста ілюстравалі апавяданні гераінь кнігі Алексіевіч ваеннай кінахронікай, але падабралі спецыфічныя кадры ваеннага побыту, хвілін адпачынку, партрэты маладых удзельніц вайны. Прычым выкарыстоўвалі запаволены паказ дакументальнай хронікі, быццам расцягвалі хранікальныя ўспаміны, суправаджаючы іх лірычнымі мелодыямі таго часу, «песнямі аб самым галоўным» – аб каханні. Прыём такога сумяшчэння кінахронікі і інтэрв'ю кінакрытыка вызначыла як кінематаграфічны вобраз хронікі-памяці, у якой ваенныя кінакадры становяцца «знакам ірэальнай рэальнасці», а самі інтэрв'ю ці маналогі гераінь выглядаюць як «дакладна рэальныя» [11].

Да такіх кінаілюстрацый споведзяў гераінь твора натхнялі адпаведныя назвы ці абарваныя ўспаміны-словы, знойдзеныя аўтарам і дадзеныя кожнаму апавяданню, главе кнігі і фільму цыкла: «Гэта была не я…», «Страляць жадала…» і інш. Амаль кожная з іх заканчвалася шматкроп'ем, незавершанасцю думкі. Перажытае не давала спакою, удзельніцы вайны ўсё яшчэ асэнсоўвалі яго. Пісьменніцы ўдалося, фармальнымі прыёмамі рамкі, зафіксаваць некалькі пластоў рэальнасці – канкрэтнай, псіхалагічнай і ірэальнай ці мастацкай. Кінацыкл атрымаў галоўную ўзнагароду фестывалю «Сярэбранага голуба» ў нямецкім Лейпцыгу менавіта як узор спавядальнага кінематографа, дзе жанчыны праз камеру давяраюць самае патаемнае рэжысёру, не проста ўзгадваюць мінулае, а аналізуюць свае паводзіны, словы, разважаюць услых. Як бачым, псіхалагізм тэмы перамог натуральнасць і разбурыў межы канкрэтнага дакумента гісторыі, паказаў гарызонт сусветнага гуманістычнага бачання чалавечага вопыту.

І ў кнізе, і ў кінацыкле лейтматывам (у назве і падназвах, ва ўспамінах і развагах) гучыць жаночая тэма, гендэрна вызначаная праз тэму прыгажосці, кахання, параўнання магчымасцяў і дзеянняў жанчыны на вайне з мужчынскімі і г.д. Сама аўтар ва ўступным да кнігі «У вайны не жаночы твар» асабістым дзённіку напіша: «Деревня моего детства после войны была женская. Бабья. Мужских голосов не помню. Так у меня это и осталось: о войне рассказывают бабы. Плачут. Поют, как плачут» [10, с.7]. І яшчэ там жа: «Женские рассказы другие и о другом. У "женской" войны свои краски, свои запахи, свое освещение и свое пространство чувств» [10, с. 9]. Пазней у інтэрв'ю яна падкрэсліць: Я училась воспринимать жизнь с женского голоса. Не случайно моя первая книга – это книга о женщинах на войне» [1, с. 14]. Такі ракурс успамінаў пра вайну быў новым, невядомым ра-ней. Кніга Алексіевіч уставала ў шэраг літаратуры аб «невядомай вайне» з яе паваротам да тэмы «звычайнасці фашызму», ці псіхалогіі чалавека вайны.

Другая кніга цыкла «Галасы Утопіі» «Апошнія сведкі. Сола для дзіцячага голасу» (1981) таксама была сугучна тэме «невядомай вайны» і суадносілася з творамі пісьменнікаў – дзяцей вайны, якія ўзнялі тэму «бляшаных

барабанаў» (Грас), ці эстэтычнага, пачуццёвага, засваення вопыту сустрэч з ваеннай рэальнасцю. С. Алексіевіч далучалася да нацыянальнай літаратурнай традыцыі, твораў пісьменнікаў – дзяцей вайны – Міхася Стральцова, Віктара Казько і інш. У 1978 г. адкрыццём стала першая беларускамоўная аповесць В. Казько «Суд у Слабадзе», дзе «ў форме “падвойнага бачання” падаюцца рэтраспектыўныя вобразы вайны, якія набываюць рысы адчужанасці, ірацыянальнасці» [12, с. 733]. Літаратуразнаўцы адзначалі ўскладненую жанравую, сюжэтную, стылістычную структуру твора, якая спалучала і «плынь свядомасці», і натуралістычнае апісанне жахаў, і інтэлектуальныя філасофскія абагульненні, і біблейскія рэмінісцэнцыі – суд, прароцтвы, пазбаўленне ад віны. Апошняе характэрна і для кнігі С. Алексіевіч «Апошнія сведкі», напісанай праз некалькі год.

Біблейскія рэмінісцэнцыі пачынаюцца з назвы кнігі, дапаўняюцца апавяданнямі аб малітвах пра вяртанне душы да чалавека на вайне («Бабуля малілася… Яна прасіла, каб мая душа вярнулася…»), аб бачанні анёла ўсю вайну маленькай сведкай трагічных падзей («Яна адчыніла акно… І аддала паперкі ветру…») і інш., завяршаюцца ці аб’ядноўваюцца («Паслямоўе замест прадмовы») вядомым пытаннем Ф. Дастаеўскага аб «слязінцы дзіцяці». Трансцэндэнтальны пласт вобразнасці дакументальнай кнігі Алексіевіч зноў прымушае гаварыць аб суіснаванні разам з рэальнасцю ірэальнасці, аб спалучэнні неспалучальнага, аб тым, што адлюстроўвае такі мастацкі троп, як аксюмаран, самае трапнае выказванне якога гучыць у спалучэнні «цёмнае святло», або Бог.

Завяршальны твор цыкла «Галасы Утопіі» «Час секанд хэнд» нарадзіўся ў часы перабудовы (першая частка кнігі акрэслена перыядам 1991–2001 гг.) [13, с. 19]. Яе аўтары-галасы – людзі розных пакаленняў, але адной краіны – Савецкага Саюза. Кніга аб перажытым у савецкі час і гады перабудовы. Знакамі часу з’яўляюцца і вылучаныя пісьменніцай гістарычнымі маркёрамі назвы частак твора – «З вулічнага шуму і размоў на кухні» («Из уличного шума и разговоров на кухне»).

Менавіта савецкая ідэалогія, асноўная тэма кнігі «Час секанд хэнд», натхніла аўтара на назву цыкла «Галасы Утопіі». У прадмове да твора С. Алексіевіч прама гаворыць аб гэтым – аб развітванні з савецкім часам і савецкім чалавекам, светапогляд якога адлюстроўвае ўтапічныя камуністычныя погляды. Але час – паняцце суб’ектыўнае і існуе толькі ў межах апрабавання ці ў выглядзе «second hand». Кніга атрымалася аб перажыванні траўмы знікнення ідэалаў, краху веры. Твор – сведчанне драмы і трагедыі лёсаў перабудовы, звязаных з лакальнымі войнамі, пераменай месца жыхарства, стратай сацыяльных падмуркаў, чалавечых сувязяў і г.д. Але тэматыка зноў выйшла за аб’яўленае жанравае вызначэнне. Таму што яшчэ ёсць вонкавы мастацкі вобраз кнігі – у назвах, эпіграфах, кампазіцыі, рамцы. Звароты ў эпіграфах да філасофскіх выказванняў аб суаднесенасці, дакладней – аб узаемасувязі, дабра і зла, катаў і ахвяраў; узгадванне тэмы «канца свету» ў назвах раздзелаў – «Суцяшэнне Апакаліпсісам» («Утешение

Апокалипсисом») і «Чароўнасць пустаты» («Обаяние пустоты») – вядуць чытача да думак аб хаосе, трагічнасці жыцця, аб немагчымасці спраўджання ідэалаў – да антыўтопіі.

Постсавецкія часы развіцця беларускай культуры звязаны з пошукамі новых сацыяльных і гуманістычных ідэалаў, у тым ліку і ў рэлігійнасці. Дакументальна-мастацкая літаратура сучаснасці ўсё больш скіроўваецца да філасофска-спавядальнага ці псіхалагічна-аналітычнага жанру. Літаратуразнаўцы заўважаюць, што літаратура «нон-фікшн» сёння «ўяўляе сабой трансфармаванае мадэрнізаванае эсэ» [14, с. 322]. Маштабы дакументальна-мастацкай прозы пашыраюцца, дапаўняюцца ўсё новымі жанравымі формамі, традыцыйнымі і эксперыментальнымі, публіцыстычнымі і аўтарска-крэатыўнымі: запісамі і зацемкамі, дзённікамі і імпрэсіямі, мініяцюрамі і эга-эсэ і г.д. Аднак крытыка падкрэслівае пры гэтым, што «кардынальнае адрозненне беларускай «нявыдуманнай прозы» ад еўрапейскіх аналагаў заключаецца ў змене стратэгіі аповеду: унутраны свет у большасці выпадкаў для нацыянальных мастакоў слова з'яўляецца асноўным аб'ектам адлюстравання» [14, с. 322]. Нацыянальная сучасная літаратура схіляецца да аўтабіяграфічнага аповеду ва ўсіх яго жанравых формах.

Напэўна, самае галоўнае адрозненне прозы С. Алексіевіч ад асноўнага масіва беларускай літаратуры заключаецца ў тым, што яна даследуе ўнутраны свет людзей, што жывуць побач. Яе творы прэтэндуюць на аб'ектыўнасць з улікам асаблівасцяў успрыняцця часу яе субяседнікамі, людзьмі некалькіх пакаленняў, рознымі сацыяльнымі і псіхалагаічнымі тыпамі. Але ў галоўным, стылістычным, накірунку проза С. Алексіевіч не адыходзіць ад агульнай тэндэнцыі культуры часоў постмадэрна – ад аповеду аб чалавеку ў гадзіны экзістэнцыйнай трагедыі, калі асноўнай прыкметай яго мыслення становіцца сумяшчэнне процілегласцей, ці аксюмаран. І тады ён шукае паратунку ў тым, што магло б аб'яднаць рознае, – у трансцэндэнцыі, або ў «цёмным святле».

ЛІТАРАТУРА

1. *Алексиевич, С. А.* «Мы – общество жертв» / С. Алексиевич // Свободные новости плюс. – 2013. – 2 июля. – С.14.
2. *Адамовіч, А. М.* «Браму скарбаў сваіх адчыняю…» / А. М. Адамовіч. – Мінск : Выд-ва. БГУ імя У. Леніна, 1980. – (Врата сокровищницы своей отворяю…» (на белорусском языке). – 224 с.
3. *Лазарук, М. А.* Часу непадуладнае: Літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы / М. А. Лазарук. – Мінск : Мастац. літ., – 1981. – 239 с.
4. *Яскевіч, А. С.* Паэзія. Проза. Драматургія / А. С. Яскевіч // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: у 4 т. / Ін-т імя Я. Купалы НАН Беларусі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Т. 3. – С. 42–94.
5. *Нікіфарава, В. Б.* Янка Брыль / В. Б. Нікіфарава // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст.: у 4 т. / Ін-т імя Я. Купалы НАН Беларусі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Т. 3. – С. 479–520.

6. *Коваленко, В. А.* Общность судеб и сердец. Белорусская проза о Великой Отечественной войне в контексте русской и других литератур / В. А. Коваленко. – Мінск : Наука и техника, 1985. – 351 с.
7. *Алексеевич, С.* «Мы живем в промежуточное время. Но европейское будущее все равно будет» / С. А. Алексиевич // «Комсомольская правда» в Белоруссии. – 2014. – 11 февр. – С. 6.
8. На пытаньні «Arche» адказваюць вядомыя расейскамоўныя інтэлектуалы Беларусі / С. Алексіевіч, А. Фядута, С. Панькоўскі, Ю. Дракахруст, А. Сасноў і інш. // Arche. – 2004. – № 5. – С. 7–27.
9. *Секацкий, А. А.* Сокуров «Одинокий голос человека» (1978–1987) / А. Секацкий // Сокуров. Части речи. – СПб: Сеанс. – 2006. – С.14–23.
10. *Алексиевич, С.* У войны не женское лицо / С. А. Алексиевич. – М. : Время, 2007. – 416 с. – (Голоса Утопии).
11. *Ямпольский, М.* Лицом к объективу / М. Ямпольский // Искусство кино. – 1984. – № 7. – С. 27.
12. *Васючэнка, П.* Віктар Казько / П. В. Васючэнка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ ст.: у 4 т. // Ін-т імя Я. Купалы НАН Беларусі. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2003. – Т. 4, кн. 2. – С. 729–749.
13. *Алексиевич, С. А.* Время секонд хэнд / С. А. Алексиевич. – М. : Время, 2013. – 512 с.
14. *Гоўзіч, І. М.* Трансфармацыя жанравага канона эсэ ў сучаснай беларускай прозе: на прыкладзе літаратуры «нон-фікшн» / І. М. Гоўзіч // Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства: матэрыялы міжнар. навук. канф. да 120-годдзя з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы. Мінск, 3–4 сак. 2016. – Мінск : Права і эканоміка, 2016. – С. 320–322.

Н. Ю. Паўлоўская (Мінск)

МАДАЛЬНАСЦЬ СМЕХАВОГА ДЫСКУРСУ І ПРАЦЭСЫ ТРАНСПАНАВАННЯ

У дакладзе з апорай на ідэі аднаго з заснавальнікаў лінгвістычнай прагматыкі Т. А. ван Дэйка разглядаюцца кагнітыўна-прагматычныя параметры мадальнасці – макраструктура, суперструктуры, макрапрапазіцыі, стратэгіі, тактыкі. На гэтай аснове даследаваны працэсы транспанавання мадальных сэнсаў, рэалізаваных у смехавым дыскурсе.

Канстытутыўнай уласцівасцю мадальнасці з'яўляюцца суадносіны выказвання і рэчаіснасці з пункту погляду моўцы ў адпаведнасці з паўнатой яго ведаў аб аб'ектах, ступенню задаволенасці яго патрэб, жаданняў, імкненняў, інтарэсаў, мэт.

Калі раней мадальнасць разглядалася ў якасці граматычнай, функцыянальна-семантычнай катэгорыі, у наш час звяртаецца ўвага на яе аналіз у лінгвапрагматычным рэчышчы, паколькі гэты аспект прадугледжвае

актыўную ролю мадальных эксплікатараў у фарміраванні камунікантамі маўленча-разумовых актаў і інтэнцый для рэалізацыі вербальных паводзін і ацэнкі задач у працэсе зносін. Лінгвапрагматычную інтэрпрэтацыю мадальнасці можна трактаваць у якасці правілаў, што ахопліваюць разнавіднасці выкарыстаных у ім мадальных значэнняў. Усе падзеі, адлюстраваныя ў дыскурсе, адрасат успрымае мадальна асэнсаванымі. Сістэма гэтых правілаў фарміруецца паняццямі макраструктуры, суперструктуры, макрапрапазіцыі, прапанаваных Т. А. ван Дэйкам [1]. Макраструктурай мадальнасці варта лічыць маўленча-разумовую здольнасць суб'екта ўвасабляць рэча-існасць у прапазіцыю моўных адзінак. Мадальнымі суперструктурамі з'яўляюцца кагнітыўныя мадэлі моўных рэпрэзентантаў, схемы, якія даюць магчымасць сканцэнтраваць увагу толькі на неабходных для вывучэння ўласцівасцях аб'екта.

Дыскурс і факты ў ім прафілююцца ў адносінах да індывідуальных нормаў і цэннасцей камунікантаў. Пры гэтым мадальнасць ідэнтыфікуе аднесенасць адзінак дыскурсу да таго ці іншага магчымага свету, што маецца ў распараджэнні ўдзельнікаў камунікацыі і рэалізуецца з дапамогай дыхатамічных кагнітыўных параметраў рэальнасці/патэнцыяльнасці, крэатыўнасці/дэскрыптыўнасці, валітыўнасці/імавернасці [2, с. 67–69]. Мадальна аформленыя выказванні рэпрэзентуюць паслядоўнасць дзеянняў, што адлюстроўваюць пераход ад зыходнага магчымага свету да пажаданага. Прыведзеныя велічыні і іх камбінаторыка дазваляюць прадставіць суперструктуру мадальнасці ў выглядзе макраполя волевыяўлення (з палямі аптатыўнасці, імператыўнасці, неабходнасці) і макраполя верагоднасці (з палямі праблематычнай, простай, катэгарычнай верагоднасці і магчымасці). Задаючы агульную форму, суперструктура мадальнасці і яе віды арганізуюцца макрапрапазіцыямі, якія выводзяцца з мноства падобных з'яў, канструююцца на аснове значэнняў і акцэнтуюць мадальны аб'ём інфармацыі. Макрапрапазіцыі ў суперструктурах мадальных макрапалёў волевыяўлення і верагоднасці можна прадставіць наступным чынам:

Суперструктуры	Палі	Макрапрапазіцыі
Волевыяўленне	Аптатыўнасць	*S жадае P*
	Імператыўнасць	*S пабуджае да P*
	Неабходнасць	*S павінен P*
Імавернасць	Праблематычная верагоднасць	*S мяркуе P*
	Магчымасць	*S можа P*
	Простая верагоднасць	*S канстатуе P*
	Катэгарычная верагоднасць	*S акцэнтуе ўпэўненасць у P*

У якасці дыскурсіўнай катэгорыі, што выходзіць за межы лексічнай і граматычнай семантыкі, мадальнасць рэалізуе камунікатыўныя стратэгіі і тактыкі, з дапамогай якіх выяўляюцца веды, думкі, установкі, інтарэсы, мэты карыстальнікаў мовы, спосабы і шляхі разумення адрасатам аўтарскіх адносін да выказвання. Калі стратэгіі ўвасабляюць «глабальныя намеры аўтара» (паводле Т. А. ван Дэйка), выбраныя ім правілы прымянення моўных адзінак для рэпрэзентацыі канкрэтных камунікатыўных мэт, то тактыкі – гэта сукупнасць сродкаў і прыёмаў для дасягнення гэтых мэт.

Найбольш агульнымі мадальнымі стратэгіямі выступаюць дзве: 1) адрасаванае ці неадрасаванае пабуджэнне моўцы да выканання/невыканання дзеяння адрасатам; 2) эксплікацыя моўцам ступені паўнаты сваіх ведаў пра з'явы рэчаіснасці ці змест выказванняў, што тым самым фарміруе і пазіцыю адрасата.

Прыватнымі стратэгіямі мадальнасці волевыяўлення могуць быць наступныя: апеляцыя моўцы да адрасата ў выглядзе загада, распараджэння, просьбы, папярэджання; жаданне моўцы ажыццявіць дзеянне; непазбежнасць здзяйснення дзеяння, падзей ці заканамернасць таго, што павінна адбыцца.

Прыватныя стратэгіі верагоднасці рэалізуюцца ў наступных пазіцыях: няўпэўненасць моўцы ў сваіх ведах адносна падзей; дапушчальнасць узнікнення ці ажыццяўлення чагосці; аб'ектывацыя моўцам верагоднасці фактаў, заснаваная на яго ведах; ультыматыўнасць, акцэнтаванне звестак пра падзеі і сітуацыі.

Мадальныя тактыкі ў якасці комплексу моўных і маўленчых прыёмаў пабудовы дыскурсу (Г. А. Золатава) і камунікатыўных хадоў як маўленчых дзеянняў (В. С. Ісерс) выражаюцца ў кожным канкрэтным выпадку адпаведна аўтарскім інтэнцыям і стратэгіям. Сярод выяўленых лінгвістамі мадальных тактык адзначым наступныя: перакананне, параду, забарону, пагрозу, прыцягненне ўвагі, абарону сваёй пазіцыі ў выглядзе прабачэння, апраўдання, тлумачэння. эксплікацыю нормаў, навязванне поглядаў і жаданняў, самапрэзентацыю, тлумачэнне, удакладненне, каментаванне, проціпастаўленне, засцярогу, папрок, маскіроўку, імпліцытнасць, адхіленне ад тэмы, змякчэнне, вылучэнне, перавагу, устанаўленне кантакту (Т. А. ван Дэйк, В. С. Ісерс, А. В. Ільіна, Т. В. Раманава, В. У. Какорына, В. Н. Паршына, А. П. Пензева, С. В. Дароніна і інш.). Мадальныя макраструктура, суперструктуры, макрапрапазіцыі, стратэгіі, тактыкі з'яўляюцца лінгвапрагматычнымі асновамі пабудовы любога дыскурсу, неабходнымі для эфектыўнай эксплікацыі пазіцыі моўцы, а таксама для рэалізацыі прадстаўленняў слухача.

Разнастайнасць мадальных сэнсаў абумоўлівае іх розныя камбінацыі, спецыфічныя для кожнага дыскурсу. Асаблівасцю гэтых працэсаў з'яўляецца выкарыстанне ідэнтычных мадальных кваліфікатараў у якасці метасродкаў для розных тыпаў дыскурсу.

У любым дыскурсе галоўным інтэрпрэтацыйным крытэрыем выступае аўтарскі погляд у спалучэнні з пазіцыямі герояў. Бачанне свету аўтарам з яго індывідуальнымі, сацыяльнымі, прафесійнымі прыярытэтамі сумяшчае

досвед суб'екта і элементы сусветнай свядомасці (мадальнасці свету) як вынік акумуляваных чалавецтвам ведаў і кампетэнцый. У працэсе камунікацыі аўтарская мадальнасць даасэнсоўваецца, дапаўняецца інтэнцыямі адрасата, апасродкавана ўключанага ў мадальны ўніверсум дыскурсу. Вынікам гэтых працэсаў з'яўляецца фарміраванне ў адрасата ўласнай мадэлі карціны свету, не абавязкова аналагічнай дыскурсіўнай. Але аўтар з дапамогай мадальных лінгвапрагматычных сродкаў мае магчымасць карэктаваць, а часам змяняць карціну свету атрымальніка інфармацыі. Такім чынам, карціны магчымых сусветаў аўтара і адрасата, аформленыя з дапамогай мадальных эксплікатараў, зараджаюць дыскурс уласнай яму танальнасцю, якая ствараецца разнастайнымі мадальнымі адзінкамі лексічнага, марфалагічнага, сінтаксічнага, прасадычнага ўзроўняў.

Лінгвапрагматычныя характарыстыкі мадальных кваліфікатараў найбольш выразна праяўляюцца ў дыскурсах з непрамымі спосабамі эксплікацыі мадальных адносін, маўленчыя сэнсы якіх патрабуюць дадатковых інтэрпрэтатыўных намаганняў адрасата. У лінгвістычнай літаратуры падобныя з'явы называюцца таксама ўскоснымі, неканвенцыянальнымі, нефармальнымі, імпліцытнымі, кансітуатыўнымі актамі камунікацыі. Моўныя адзінкі ў гэтым выпадку становяцца нагружанымі дадатковым ці новым зместам і часта выступаюць у неўласцівай для іх ролі, фарміруючы незвычайныя дыскурсіўныя сэнсы. Падобныя працэсы можна кваліфікаваць як транспанаванне: перамяшчэнне сэнсавай структуры выказвання ў іншы магчымы свет. Паводле І. Гофмана, гэта тое, што адбываецца з камунікатыўнай стратэгіяй. Асноўным механізмам транспанавання з'яўляецца пераключэнне – «сістэматычная трансфармацыя суб'ектаў дзеяння, прадметаў, ужо асэнсаваных у пэўнай сістэме інтэрпрэтацыі» [3, с. 106], калі «ілакутыўная мэта дасягаецца не пасродкам лакутыўных актаў, канвенцыянальна звязаных з дадзенай ілакутыўнай мэтай, а іншымі сродкамі» [4].

Працэсы транспанавання мадальных сэнсаў характэрны для тэкстаў з элементамі моўнай гульні, якія часта рэалізуюцца ў жанры смехавога дыскурсу – жартах, анекдотах, сатырыка-гумарыстычных мініяцюрах, розыгрышах, загадках, памфлетах і інш. Моўная гульня – асобая форма лінгвакрэатыўнай дзейнасці, што адлюстроўвае нестандартнае, некананічнае вар'іраванне камунікантамі вербальных сродкаў формамі досціпу, балагурства, каламбура, жарта [5; 6; 7].

У якасці фактычнага матэрыялу для аналізу ўзяты выбраныя з інтэрнэт-дыскурсу жарты – выказванні ці невялікія тэксты гумарыстычнага зместу, мэтай якіх ёсць стварэнне камічнага эфекту. З'яўляючыся найлепшым спосабам выражэння максімальнага ўзроўню гумару пры мінімуме слоў, жарт увасабляе яскравы, сфакусаваны вобраз рэчаіснасці, ператвораны ў гульнявы.

Так, у жарце *Конь у яблыках і гусак у яблыках – гэта два прынцыпова розныя лёсы* рэалізавана агульная стратэгія волевыяўлення, аб'ектываваная прапазіцыяй з мадальнай семантыкай неабходнасці: 'не варта змешваць

несуразмернае, несумеснае’. Хаця фармальна міні-дыскурс з’яўляецца індыкатыўным выказваннем (канстатацыяй фактаў рэальнага свету), транспанаваным у вобласць мадальнасці неабходнасці. Прадстаўленая камунікатыўная сітуацыя эксплікуе наступныя тактыкі: акцэнтаванне, рэалізаванае з дапамогай паўтораў прыназоўнікава-склонавых структур; кантраст семантыкі розных прапазітыўных планаў і іх аднолькавай фармальна-граматычнай пабудовы; кантамінацыя кампанентаў дыскурсу з рознай семантычнай арганізацыяй, маскіроўка мадальных адносін (міні-дыскурс фармальна – рэпрэзентатыў, фактычна – дырэктыў з інфармацыйна-ініцыяльным значэннем). У аналізуемым жарце таксама рэалізавана тактыка імпліцытнай каўзацыі – навязванне адрасантам свайго разумення транспанаванага сэнсу выказвання.

Жартоўны міні-дыялог *Над гэтыми вершами заснуць можна, – гаворыць рэдактар аўтару. – Вось и добра, надрукуйце іх у якасці калыханкі* абыгрывае інстытуцыянальную сітуацыю звароту «начальніка» (прафесіянала) да «падначаленага». Дзве часткі з рознымі тыпамі мадальных сродкаў – магчымасці і імператыўнасці – эксплікуюць зусім іншыя мадальныя сэнсы. У першай частцы рэалізуецца глыбінны сэнс простай канстатацыі ‘вершы дрэнныя’, у другой – пад відам мадальнасці пабуджэння маніфестуецца таксама канстатацыя, але процілеглага сэнсу: ‘вершы добрыя, годныя да друку’. Камічнасць ситуацыі, аформленая мадальными сродкамі з ускоснымі сэнсамі, будуецца несупадзеннем ацэнак рэдактарам і аўтарам яго твора, што прыводзіць да камунікатыўнай няўдачы – непаразумення паміж камунікантамі ці іх нежаданне эксплікаваць свае намеры. З гэтай прычыны назіраецца перавод мадальных сэнсаў (магчымасці і пабуджэння) у іншы пласт рэальнасці – простую верагоднасць з уласцівымі ёй стратэгіямі і тактыкамі: аб’ектывацыя камунікантамі сваёй кампетэнтнасці ў вершаскладанні; маскіроўка мадальных адносін (міні-дыскурс фармальна рэалізуе мадальнасць магчымасці і імператыўнасці, фактычна – простую верагоднасць); імпліцытная каўзацыя з проціпастаўленнем поглядаў камунікантаў: і адрасант і адрасат, кожны па-свойму, жадаюць змяніць стан спраў (першы хоча пазбегнуць публікацыі вершаў, другі – рэалізаваць гэту падзею).

Лінгвапрагматычны аналіз смехавога дыскурсу ў святле працэсаў транспанавання мадальных сэнсаў сведчыць пра іх значную ролю ў стварэнні камічнага эфекту. Транспанаванне ў якасці мадальных трансфармацый выступае адным з вядучых прынцыпаў пабудовы гумарыстычных форм, пераўтвараючы камунікатыўныя ўласцівасці дыскурсу. Выяўленне кагнітыўна-прагматычных параметраў мадальнасці будзе спрыяць вырашэнню праблемы разумення розных тыпаў маўленчых актаў, дзе выказванне, згодна з Д. Сёрлам, рэалізуе не толькі тое, што яно непасрэдна эксплікуе, а і нешта іншае.

ЛІТАРАТУРА

1. *Дейк, Т. А. ван* Язык. Познание, коммуникация / Т. А. ван Дейк. – М. : Прогресс, 1989. – 312 с.
2. *Паўлоўская, Н. Ю.* Катэгорыя мадальнасці ў сучаснай беларускай мове / Н. Ю. Паўлоўская. – Мінск : МДЛУ – 206 с.
3. *Гофман, И.* Анализ фреймов: эссе об организации повседневного опыта / И. Гофман. – М, 2003. – 752 с.
4. *Серль, Дж. Р.* Косвенные речевые акты / Дж. Р. Серль [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.classes.ru/grammar/159.new-in-linguistics-17 /source/worddocuments/5.htm. – Дата доступа : 16.09.2016.
5. *Гридина, Т. А.* Языковая игра: стереотипы и творчество / Т. А. Гридина. – Екатеринбург, 1996 – 225 с.
6. *Норман, Б. Ю.* Игра на гранях языка / Б. Ю. Норман. – М., 2006. – 344 с.
7. *Санников, С. В.* Русский язык в зеркале языковой игры / С. В. Санников. – М., 2002. – 552 с.

Секцыя 1. БЕЛАРУСКАЯ МОВА І СВЕТ

БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАГА ГУМАНІТАРНАГА ПРАЦЭСУ

А. А. Акуленка, В. В. Леонцьева (Мінск)

ЛЕКСЕМЫ КІТАЙСКАГА ПАХОДЖАННЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ
(па матэрыялах лексікаграфічных крыніц і корпусных тэкстаў)

Сёння ў лінгвістыцы замацаваліся ўзважаныя, разумныя адносіны да запазычанняў як да аднаго са спосабаў узбагачэння слоўнікавага саставу мовы, яго стылістычных магчымасцей і развіцця любой сучаснай мовы ў цэлым. Узаемадзеянне моўных утварэнняў, моўныя контакты – рэальнасць нашага часу, якая параджае адкрыты, дынамічны моўны кантынуум, бязмежны па сваіх магчымасцях. Камунікатыўная прастора мовы ўбірае ў сябе новыя рэаліі, сэнсы і формы. Розныя краіны, далёкія і блізкія ў культурна-моўных адносінах, становяцца партнёрамі, развіваюць гандлёва-эканамічныя сувязі. І мовы не могуць заставацца безуважнымі.

У цэнтры нашай увагі – лексемы кітайскага паходжання, якія сёння паспяхова функцыянуюць у саставе лексіка-семантычнай сістэмы беларускай мовы. Паспрабуем прасачыць прадстаўленасць дадзеных лексічных адзінак у беларускамоўных лексікаграфічных крыніцах.

У «Тлумачальным слоўніку сучаснай беларускай мовы» (1977–1984) (далей – ТСБЛМ) [1] зафіксаваны 16 лексем кітайскага паходжання: *гаалян, гаміндан, жэньшэнь, каалін, лі, нанка, тайфун, тунг, фа'нза, фанза', фынь, хунхуз, чай, часуча, чуміза, юань.* На даўнюю засвоенасць у беларускай мове гэтых найменняў указваюць, па-першае, наяўнасць вытворных ад іх слоў, напрыклад: *гаміданавец, гаміданаўскі* ад *гаміндан; каалінавы, каалініт* ад *каалін; нанкавы* ад *нанка; фанзовы* ад *фанза'; хунхузскі* ад *хунхуз; часучовы* ад *часуча; чумізны* ад *чуміза; чайны, чайнік* ад *чай;* па-другое, уключэнне кітаізма ў састаў фразеалагічных выразаў, напрыклад: *адправіцца да святых на* ***чай*** *(****чай*** *піць)* ‘памерці’, *даць/атрымаць на* ***чай*** ‘чаявыя’; па-трэцяе, ужыванне запазычаных слоў у мастацкіх творах, асабліва ў паэтычных, напрыклад: *Не ў страх нам пагрозаў замахі, не ў страх інтэрвенцкія шхуны, Ні стуль, дзе гадуюць манархаў, Ні стуль, дзе бушуюць* ***тайфуны*** (Я. Купала).

У «Слоўніку іншамоўных слоў» А. М. Булыкі (1999) [2], акрамя вышэйназваных, адзначаны яшчэ 10 лексем: *гінкга, гохуа, даа, даасізм, дацзыбао, жэнь, канфуцыянства, макао, тайпіны, хунвейбіны*. Пасля выдання «Слоўніка новых слоў сучаснай беларускай мовы» В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч (2009) [3] да спісу кадыфікаваных далучыліся яшчэ 4 лексемы кітайскага паходжання: *кун-фу / кунг-фу, ушу / у-шу, фэн-шуй, цыгун* (табл. 1).

Т а б л і ц а 1

Кітаізмы ў лексікаграфічных крыніцах сучаснай беларускай мовы

№ п/п	Словы кітайскага паходжання	ТСБЛМ	Слоўнік іншамоўных слоў	Слоўнік новых слоў беларускай мовы*
1	*Гаалян*	+	+	–
2	*Гаміндан*	+	+	–
3	*Гінкга*	–	+	–
4	*Гохуа*	–	+	–
5	*Даа*	–	+	–
6	*Даасізм***	–	+	–
7	*Дацзыбао*	–	+	–
8	*Жэнь*	–	+	–
9	*Жэньшэнь*	+	+	–
10	*Каалін*	+	+	–
11	*Канфуцыянства***	–	+	–
12	*Кунг-фу, кун-фу*	–	–	+
13	*Лі*	+	+	–
14	*Макао*	–	+	–
15	*Нанка*	+	+	–
16	*Тайпіны*	–	+	–
17	*Тайфун*	+	+	–
18	*Тунг*	+	+	
19	*У-шу, ушу*	–	–	+
20	*Фа'нза*	+	+	–
21	*Фанза'*	+	+	–
22	*Фынь*	+	+	–
23	*Фэн-шуй*	–	–	+
24	*Хунвейбіны*	–	+	–

* Знак (–) у гэтым слупку табліцы не сведчыць пра адсутнасць слова ў беларускім маўленні; у «Слоўнік новых слоў беларускай мовы» (2009) былі ўключаны толькі лексемы, якія з'явіліся ў беларускай мове на мяжы XX–XXI стагоддзяў (яны пазначаны ў адпаведным слупку табліцы знакам «+»).

** На думку сучасных дэрыватолагаў, вытворныя лексемы *даасізм* і *канфуцыянства* адносяцца да спрадвечнай лексікі, аднак іх наяўнасць у «Слоўніку іншамоўных слоў» дазваляе нам уключыць іх у спіс даследуемых.

Заканчэнне табліцы 1

25	*Хунхузы*	+	+	–
26	*Цыгун*	–	–	+
27	*Чай*	+	+	–
28	*Часуча*	+	+	–
29	*Чуміза*	+	+	–
30	*Юань*	+	+	–

Паводле даных слоўнікаў, большая частка кітаізмаў – прамыя запазычанні, да апасродкаваных запазычанняў з кітайскай мовы адносяцца словы *гінкга* (яп. *hinkho* ад кіт. *in-hinh*), *майфун* (праз рус. *майфун* з англ. *typhoon* ад кіт. *tai fĕng*) і *чай* (цюрк. *čaj,* ад кіт. *čhā*). Не зафіксаваным у лінгвістычных лексікаграфічных крыніцах застаецца шэраг слоў, вядомых носьбітам сучаснай беларускай мовы, напрыклад: *інь* ‘у традыцыйнай кітайскай касмалогіі: жаночы, адмоўны пачатак у прыродзе, які праяўляецца ў пасіўнасці, глыбіні, цемры, холадзе, вільгаці’, *ян* ‘мужчынскі, станоўчы пачатак, які праяўляецца ў дзейнасці, вышыні, святле, цеплыні, сухасці’, *улун* ‘паўферментаваны чай’.

Невялікая група кадыфікаваных у сучаснай беларускай мове кітаізмаў папоўніла розныя сферы яе лексічнага складу.

1. Філасофскія тэрміны: *дао* (кіт. *dao* = шлях, закон, прынцып) ‘паняцце старажытнакітайскай філасофіі, якое абазначала ў тэорыі пазнання заканамернасць прыроды, у этыцы – сэнс жыццёвага шляху чалавека, этычную норму, у логіцы – падставу, аснову, аргумент’, *даасізм* (ад *дао*) ‘1) адзін з кірункаў старажытнакітайскай філасофіі, паводле якога прырода і жыццё людзей падпарадкаваны не волі неба, а закону, які існуе па-за свядомасцю чалавека; 2) адна з кітайскіх рэлігій, якая ўзнікла ў 2 ст. да н.э.’, *жэнь* (кіт. *žen* = чалавек) ‘асноўная кітайская канфуцыянская дабрачыннасць; любоў да чалавека, дабрата і справядлівасць’, *канфуцыянства* (ад кіт. *Kon-fu-tsy* = імя старажытнакітайскага філосафа, 6 ст. да н.э.) ‘сістэма маральна-філасофскіх поглядаў, заснаваная на вучэнні Канфуцыя, якая вызначае ўзаемаадносіны паміж людзьмі і патрабуе пакоры малодшых старэйшым’.

2. Гістарычна-палітычная тэрміналогія: *гаміндан* (кіт. *homindan* = нацыянальная партыя) ‘палітычная партыя ў Кітаі, заснаваная ў 1912 г. Сунь Ятсенам; вяла нацыянальна-вызваленчую барацьбу, з 1927 г. была кіруючай партыяй краіны; улада яе была звергнута ў 1949 г.’, *хунвейбіны* (кіт. *hunwejbin*) ‘удзельнікі створаных у 1966 г. у час т.зв. «культурнай рэвалюцыі» ў Кітаі атрадаў з вучняў сярэдніх школ і студэнтаў, якія выкарыстоўваліся для барацьбы з праціўнікамі Мао Цзэдуна’, *тайпіны* (кіт. *tajpin*) ‘удзельнікі сялянскай антыфеадальнай вайны ў Кітаі 1850–1864 гг. супраць маньчжурскай дынастыі Цін’, *хунхуз* (кіт. *hung hu-cy* = чырвоныя бароды) ‘удзельнік грабежніцкіх банд у Кітаі пач. 20 ст.’.

3. Намінацыі са сферы творчай дзейнасці чалавека: *гохуа* (кіт. *го-хуа*) ‘традыцыйная школа кітайскага жывапісу вадзянымі фарбамі на шаўковых і каляровых скрутках’, *дацзыбао* (кіт. *daczybao* = газета вялікіх іерогліфаў) ‘насценныя рукапісныя газеты ў Кітаі, якія атрымалі распаўсюджанне ў 50–70 гг. 20 ст.’, *каалін* (кіт. *Kao-ling* = назва гары) ‘белая вогнетрывалая гліна, якая выкарыстоўваецца ў фарфора-фаянсавай, папяровай, гумавай і іншых галінах прамысловасці’, *фэн-шуй* (кіт. = паветра і вада) ‘мастацтва гарманізацыі прасторы, стварэння інтэр’ера кватэры, дома ў адпаведнасці са спецыяльнымі зонамі, якія адказваюць за душэўны спакой, здароўе і дабрабыт чалавека’.

4. Найменні відаў спорту і гульняў: *кун-фу / кунг-фу* (кіт. = кулачнае мастацтва) ‘від усходняга адзінаборства – кулачны і нажны бой, падобны да каратэ’, *ушу / у-шу* (кіт. = баявое мастацтва, воінскае майстэрства) ‘комплекс традыцыйных воінскіх мастацтваў, якія заснаваны на філасофскіх, этычных і псіхафізічных канцэпцыях удасканальвання асобы’, *цыгун* ‘кітайская лячэбна-дыхальная гімнастыка’), *макао* (кіт. *Macao* = назва горада ў Кітаі) ‘род азартнай картачнай гульні’.

5. Назвы адзінак вымярэння: *лі* (кіт. *li*) ‘1) кітайская мера даўжыні, роўная 576 м або 644,6 м; 2) кітайская адзінка вагі золата і серабра, роўная 37,5 мг’.

6. Назвы грашовых адзінак: *юань* (кіт. *juan* = акруглы) ‘грашовая адзінка Кітая, роўная 100 фыням’, *фынь* (кіт. *fyn*) ‘дробная разменная манета Кітая, роўная 1/100 юаня’.

7. Назвы з’яў прыроды: *тайфун* (кіт. *taj fung* = вялікі вецер) ‘трапічны цыклон вялікай разбуральнай сілы’.

8. Найменні раслін: *гаалян* (кіт. *kaoliang*) ‘травяністая расліна сям. злакавых, від сорга з высокім сцяблом і шырокім лісцем; кітайскае, маньчжурскае проса’, *гінкга* (яп. *hinkho* ад кіт. *in-hinh* = серабрысты абрыкос) ‘дрэва сям. гінкгавых, пашыранае ва Усх. Азіі; на Беларусі вырошчваецца як дэкаратыўнае’, *жэньшэнь* (кіт. *žen-žen* = корань жыцця) ‘від панакса з доўга-чаранковым лісцем і дробнымі зеленавата-белымі кветкамі, пашыраны ва Усх. Азіі, карэнне якога высока цэніцца як лячэбны сродак; на Беларусі вырошчваецца аматарамі’, *тунг* (кіт. *tung*) ‘лістападнае дрэва сям. малачаевых, пашыранае ў Паўд. і Паўд.-Усх. Азіі, з насення якога здабываюць алей для тэхнічных мэт’, *чай* (цюрк. *čaj,* ад кіт. *čhā)* ‘1) высушаныя і асобым спосабам апрацаваныя лісты вечназялёнага чайнага дрэва, на якіх настойваюць духмяны напітак; 2) гарачы напітак, настоены на лісці гэтай расліны; 3) працэс піцця такога напітку’, *чуміза* (кіт. *cumiza*) ‘злакавая расліна, якая вырошчваецца ў Азіі і Афрыцы як зерневая і кармавая культура’.

9. Назвы пабудоў: *фа'нза* 1 (кіт. *fan-czi*) ‘сялянская хата на каркасе з драўляных слупоў у Кітаі, Карэі’.

10. Назвы тканін: *нанка* (ад кіт. *Nankin* = назва горада ў Кітаі) ‘грубая баваўняная тканіна, найчасцей жоўтага колеру’, *фанза'* (кіт. *fan-czi*) ‘кітайская шаўковая тканіна, падобная да тафты’, *часуча* (кіт. *če-su-ča*) ‘шчыльная шаўковая тканіна палатнянага перапляцення’.

Паводле нашых даных, найбольш багатае лексічнае напаўненне характарызуе такія лексіка-семантычныя групы кітаізмаў, як найменні раслін (20 %), тэрміны філасофіі, гістарычна-палітычныя тэрміны, намінацыі са сферы творчай дзейнасці чалавека, найменні відаў спорту і гульняў (па 13,3 %).

Адна з задач, якія ставіліся ў нашым даследаванні, – прасачыць ступень актыўнасці слоў кітайскага паходжання ў сучасным беларускім маўленні. Для гэтага мы звярнуліся да матэрыялаў Нацыянальнага корпуса беларускай мовы. Беларускі N-корпус – першая спроба стварэння публічнага агульнага корпуса беларускай мовы. Гэта збор тэкстаў (словаўжыванняў) беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі з граматычнай разметкай і пашпартызацыяй агульным аб’ёмам больш за 185 тысяч тэкстаў і 80 млн словаўжыванняў [4], паводле якіх у маўленні беларусаў актыўна выкарыстоўваюцца даўнія запазычанні (*чай, жэньшэнь, тайфун, юань*): *За столікам сядзеў мужчына з сівымі, калматымі, нерасчасанымі валасамі, хлёбаў з шклянкі густы* ***чай*** (В. Адамчык. Чужая бацькаўшчына); ***Чай*** *заварваюць на мінеральнай вадзе* (С. Алексіевіч. Чарнобыльская малітва); *Вакол джунглі з калючай сваячкі* ***жэньшэня*** *– дрэвападобнай араліі* (У. Караткевіч. Чазенія); *Настойка* ***жэньшэню*** *прымяняецца і пры паніжаным, і пры павышаным ціску, паколькі нармалізуе яго* («Звязда»); *У XIII стагоддзі кіраўнік Мангольскай імперыі хан Хубілай збіраўся захапіць Японію, але два* ***тайфуны*** *перашкодзілі яго планам ажыццявіцца* («Звязда»); *Пры знаёмстве не здзівілася, калі убачыла зусім не жар-птушку, а худую бясколерную воблу, якую ссушылі сямейныя* ***тайфуны*** *са штодзённай рэўнасцю і непакоем* (С. Бязлепкіна. Шазюбль, або проста гульня); *Аляксандр Лукашэнка: расійскі рубель можа стаць рэзервовай валютай нараўне з доларам, еўра і* ***юанем*** (БелаПАН); *Мы маем намер больш шырока выкарыстоўваць нацыянальныя валюты: у гандлі з Еўрасаюзам – еўра, з Расіяй – расійскія рублі, з Кітаем –* ***юані*** (БелаПАН).

У корпусным дыскурсе знайшлі адлюстраванне яшчэ некалькі найменняў – *ушу, канфуцыянства, хунхуз* і *гаалян,* аднак колькасць іх словаўжыванняў значна меншая (табл. 2): *Каля Палаца спорту арганізаваны… рэспубліканскі фестываль баявых майстэрстваў (таэквандо, каратэ-до, айкідо, кікбоксінг,* ***ушу****)…* (БелаПАН); *Тысячагоддзі кітайцы знаходзіліся пад уплывам* ***канфуцыянства****, якое прапаведавала прагматызм, пакланенне імператару (вецер дзьме – трава гнецца), падпарадкаванне старэйшаму ў сям’і…* («Звязда»); *Там старая сцежка* ***хунхузаў*** (У. Караткевіч. Чазенія); *Сусветную вядомасць празаіку прынеслі дзве яго навэлы, якія леглі ў аснову фільма «Чырвоны* ***гаалян»*** («Звязда»).

Таблiца 2

Частотнасць кітаізмаў у Беларускім N-корпусе

№ п/п	Словы кітайскага паходжання	Колькасць словаўжыванняў
1	*Чай*	больш за 100
2	*Юань*	больш за 100
3	*Жэньшэнь*	60
4	*Тайфун*	42
5	*Ушу*	6
6	*Канфуцыянства*	6
7	*Хунхуз*	2
8	*Гаалян*	1

Прыклады ўжывання іншых лексем кітайскага паходжання ў Нацыянальным корпусе беларускай мовы не адзначаны, аднак гэта сведчыць, хутчэй за ўсё, пра непаўнату ахопу моўнага матэрыялу ў пакуль што «маладым» корпусе, паколькі ў некаторых лексікаграфічных крыніцах для такіх кітаізмаў прыводзіцца ілюстрацыйны матэрыял, нават не адзінкавы, напрыклад, з сучаснага беларускага друку: *Але выпадковая сустрэча на вуліцы з майстрам* ***кун-фу*** *наводзіць кульгавага футбаліста на выдатную думку* (Чырвоная змена, 25.04.2003); *Усе без выключэння астролагі і спецыялісты па* ***фэн-шуй*** *сцвярджаюць, што год спрыяльны для таго, каб нарадзіць дзіця і завесці сур'ёзныя адносіны* (Звязда, 04.02.2006); *Я сустракаюся з адным чалавекам, які займаецца сістэмай* ***цыгун*** *– спробамі знайсці энергетыку ўсярэдзіне сябе самога* (Новы час, 18.02.2008).

Нягледзячы на нейкую фрагментарнасць прадстаўленых корпуснымі тэкстамі даных, прывядзём вынікі нашага аналізу сфер функцыянавання кітаізмаў у моўнай прасторы Беларусі: лексемы *чай, жэньшэнь, тайфун* характарызуе найбольш шырокая дыстрыбуцыя, што з'яўляецца чаканым (у выніку даўнасці самога факта запазычання): яны адзначаны ў беларускім радыёдыскурсе, друкаваных СМІ, а таксама ў мастацкай літаратуры; лексічныя адзінкі *канфуцыянства, юань, ушу* зафіксаваны ў беларускіх друкаваных СМІ і радыёдыскурсе; лексема *гаалян* выяўлена выключна ў тэкстах друкаваных СМІ, а *хунхузы* – у мове мастацкай літаратуры.

Прынцыповая кансерватыўнасць лексікаграфіі (што з'яўляецца абсалютна чаканым для дадзенага раздзела лінгвістычнай навукі), адставанне кадыфікацыі ад працэсаў рэальнай моватворчасці ў рамках моўнага кода, які нас цікавіць, заканамерныя. Намі знойдзены ў тых ці іншых лексікаграфічных крыніцах лексемы *тайпін, хунхуз, хунвейбін*, якія сёння з'яўляюцца хутчэй фактамі гісторыі лексічнай сістэмы беларускай мовы, чым сучаснага яе стану. У той жа час выклікае неўразуменне поўная адсутнасць ва ўсіх

выкарыстаных намі ў мэтах аналізу лексікаграфічных крыніцах лексем *інь*, *ян*, якія дастаткова шырока ўжываюцца і ўваходзяць у моўную кампетэнцыю большасці носьбітаў беларускай мовы.

Нечаканай, на нашу думку, з'яўляецца агульная колькасць зафіксаваных у лексікаграфічных крыніцах кітаізмаў (30 адзінак). (У мэтах супастаўлення прывядзём вызначаную намі колькасць японізмаў у сучаснай беларускай мове – 53 кадыфікаваныя адзінкі.) Аднак, на наш погляд, у бліжэйшай будучыні выяўлены ў ходзе аналізу колькасны састаў кітаізмаў зменіцца. Беларуска-кітайскае ўзаемадзеянне апошніх гадоў у сферы культуры, палітыкі і эканомікі прагназавана прывядзе да новага патоку лексічных запазычанняў з кітайскай мовы, і мы можам нават зрабіць здагадку, якія іменна камунікатыўныя сферы стануць крыніцамі папаўнення слоўнікавага саставу беларускай мовы як мовы-рэцыпіента (гастраномія, вольны час, мастацтва, высокія тэхналогіі). Ужо сёння яны актыўна ўспрымаюць і выкарыстоўваюць не зафіксаваныя раней у камунікатыўнай прасторы беларускай мовы лексічныя адзінкі: *ніхао* (добры дзень), *гунбао* (страва з курыцы), *кунг пао* (страва з кураняці), *ван тан* (кітайскія пельмені), *дан-дан* (вострая локшына), *Xiaomi* (брэнд), *Meizu* (брэнд), *Huawei* (брэнд), *MIUI* (прашыўка) і інш. (графічнае афармленне такіх знакаў у цяперашні час варыятыўнае).

ЛІТАРАТУРА

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: у 5 т. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1977–1984.
2. *Булыка, А. М.* Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск : БелЭн, 1999.
3. *Уласевіч, В. І.* Слоўнік новых слоў беларускай мовы / В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч. – Мінск : ТетраСистемс, 2009. – 448 с.
4. Беларускі N-корпус [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http:// bnkorpus.info. – Дата доступу: 29.09.2016.

В. А. Арцёмава (Мінск)

ДЭЙКТЫЧНЫЯ ДЗЕЯСЛОВЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОВАХ: ПАРАЎНАЛЬНА-СУПАСТАЎЛЯЛЬНЫ АСПЕКТ

Дэйктычнасць як фундаментальная катэгорыя выяўляе непасрэдную глыбінную сувязь з чалавекам, яго псіхалагічнымі характарыстыкамі, маўленчай кампетэнцыяй, фонавымі ведамі. Дэйксісам называюць функцыю суаднясення выказвання з каардынатамі камунікатыўнага акта: яго ўдзельнікамі (персанальны дэйксіс), часавымі (тэмпаральны дэйксіс) і прасторавымі (прасторавы дэйксіс) параметрамі сітуацыі зносін.

Прасторавы дэйксіс указвае на лакацыю аб'екта або сітуацыі адносна дэйктычнага цэнтра моўнага акта. Лакацыя можа разумецца як месца ці перамяшчэнне. Сітуацыя перамяшчэння прадугледжвае змяненне месцазнаходжання суб'екта. У навуковых працах яно трактуецца як шматаспектны феномен з адначасовым суіснаваннем мноства функцыянальна значных уласцівасцей і адносін (хуткасць, аддаленасць аб'екта і пад.). Напрыклад, Р. Лангакер, інтэрпрэтуючы паняцце перамяшчэння, апелюе да двух кампанентаў: суб'ект, які рухаецца, – «траектар» (Trajector – Tr) і пункт адліку «траектара» – арыенцір (Landmark – Lm) [1]. Кагнітолагі Р. Дзірвен і М. Верспур разглядаюць рух як трохкампанентную працэсуальную схему з указаннем месца пачатку працэсу (крыніца – source), месца, дзе ён працякае (шлях – path) і куды ён накіраваны (мэта – goal) [2, p. 98]. Д. І. Слобін [3] трактуе рух як падзейную рамку (motion – event), што складаецца з чатырох кампанентаў: суб'ект перамяшчэння (figure), перамяшчэнне (motion), спосаб (manner), траекторыя (path), мэта або канчатковы пункт перамяшчэння (goal): *John ran into the room* 'Джон забег у пакой', дзе *Джон* – гэта фігура, *забег* – рух + спосаб, *у* – траса, *пакой* – мэта [3].

Іншыя крытэрыі выкарыстоўвае Л. Талмі і разглядае рух у тэрмінах фігуры (Figure) і фона (Ground). Фігура – гэта першасны аб'ект, што характарызуецца значнай мабільнасцю, меншым памерам, простай формай і прыкметнасцю (saliency). Фон – гэта другасны аб'ект, які вызначаецца пастаянным месцазнаходжаннем, вялікім памерам, складанай геаметрычнай формай. Фігура мае дынамічную прыроду, а фон статычную [4, p. 184]. Сам працэс руху ўключае да васьмі кампанентаў: 1) фігура (Figure), 2) фон ці арыенцір (Ground), 3) шлях руху (Path), 4) рух (Motion), 5) спосаб перамяшчэння (Manner), 6) прычына руху (Cause), 7) асяроддзе (Circumstance), 8) выніковы стан (Resulting State).

Адным з асноўных кампанентаў перамяшчэння з'яўляецца яго напрамак. Пры аналізе моўнага матэрыялу даследчыкі Ф. Бурдэн [5], Й. Ікегамі [6], Ч. Філмар [7] звярнулі ўвагу на асіметрыю напрамку руху. У іх працах яна атрымала назву *goal-bias* 'ўхіл у бок канчатковага пункта' ці *goal-over-source principle* 'прынцып перавагі мэты над крыніцай руху'. Дадзеная нераўназначнасць можа быць абумоўлена дзвюма прычынамі. Па-першае, канчатковы пункт руху аказваецца камунікатыўна больш значным, чым зыходны [8]. Моўцы заўсёды важней паведаміць пра тое, куды перамяшчаецца суб'ект, паколькі зыходны пункт перамяшчэння вядомы або лёгка аднаўляецца з кантэксту метадам лагічнага вываду [9, p. 122]. Па-другое, падобная асіметрыя абумоўлена прыродай чалавека, чые органы зрокавай перцэпцыі накіраваны наперад: чалавек рухаецца туды, куды глядзіць, і не можа кантраляваць тое, што знаходзіцца ў яго за спінай. Менавіта таму канчатковы пункт руху як мэта ўспрымаецца моўцам станоўча, а пачатковы пункт – адмоўна [9, p. 695].

У залежнасці ад арыентаванасці семантыкі на зыходны ці канчатковы пункт руху вылучаюць два тыпы дзеясловаў: *source-oriented* 'арыентаваныя на зыходны пункт руху' – «дзеясловы прыбыцця» і *goal-oriented* 'арыента-

ваныя на канчатковы пункт руху’ – «дзеясловы аддалення» [7]. Гэтыя дзве семантычныя валентнасці з’яўляюцца найважнейшымі для ядзерных дэйктычных дзеясловаў перамяшчэння англ. *go, come* і беларус. *ісці*, *прыйсці,* пра што сведчаць іх слоўнікавыя дэфініцыі:

1) *go: to move or proceed, to or from a point or in a certain direction* [10] ‘рухацца або перамяшчацца да ці з некаторага пункта або ў некаторым напрамку’;

2) *come: to move or travel towards the speaker or with the speaker, to move or travel in the direction of the person being spoken to* ‘перамяшчацца ў напрамку моўцы або з моўцам, перамяшчацца ў напрамку да адрасата’ [10];

3) *ісці*: а) перамяшчацца, ступаючы нагамі; б) перамяшчацца, рухацца [11];

4) *прыйсці* – дасягнуць чаго-небудзь, з’явіцца дзе-небудзь [11].

Як вынікае са слоўнікавых дэфініцый, асаблівасцю дадзеных дзеясловаў з’яўляецца абагульненае пазначэнне руху з указаннем на напрамак да моўцы (*come, прыйсці*) і ад моўцы (*go, ісці*). На думку даследчыцы А. Л. Ерзінкян, англійскія дзеясловы *come* і *go* ўтвараюць дэйктычную апазіцыю, дзе маркіраваным членам выступае лексема *come* з семантычным кампанентам ‘набліжэнне да моўцы’, якую магчыма растлумачыць праз немаркіраваны член гэтай апазіцыі *go*: *come* = *go* + direction towards the speaker [12].

Дзеясловы *go* ў англійскай мове і *ісці* ў беларускай мове з’яўляюцца цэнтральнымі дзеяслоўнымі лексемамі для абазначэння перамяшчэння ў прасторы, паколькі маюць у сваім семантычным тлумачэнні зыходны і канчатковы пункт перамяшчэння, што абумоўлівае іх ужыванне ў сітуацыях, дзе напрамак руху нерэлевантны, як у наступных кантэкстах: *Bosch just looked at her, giving no indication of approval or disapproval of her plan.* “*Can we* ***go*** *now?*” (M. Connelly. City Of Bones) ‘Босх абыякава глянуў на яе: – Цяпер мы можам **ісці**?’ [НКРЯ]; *Час* ***ісці,*** *– нарэшце выдыхнуў тэўтон, пераклаў нож з правай рукі ў левую і шырока перахрысціўся* (Л. Дайнека. Меч князя Вячкі) [НКРЯ]. На думку К. Танц, гэтая асаблівасць семантыкі дзеяслова *go* дазваляе растлумачыць тыя выпадкі, калі дадзеная лексема можа ўключаць рух да моўцы / слухача і ад моўцы / слухача адначасова: *The people were going in and out,* у той час як **The people were coming in and out* недапушчальна [13, p. 123].

Шырокая семантыка дзеясловаў *go* і *ісці* таксама абумоўлівае іх высокую частотнасць у параўнанні з маркіраванымі *come* і *прыйсці*, што, згодна з даследчыцамі І. Кларк і О. Гарнік, звязана з умовамі ўжывання гэтых дзеяслоўных лексем: *come* – станоўчы член апазіцыі, калі «моўца ці слухач знаходзіцца ў канчатковым пункце (*at the goal*) у момант размовы або ў момант часу, апісаныя ў выказванні, у адрозненне ад *go* – адмоўнага члена апазіцыі, калі моўца не знаходзіцца там у гэты час» [14, p. 560].

На думку Ч. Філмара, дзеяслоў *go* змяшчае назіральніка ў зыходны пункт траекторыі руху [7], а сам дзеяслоў, як мяркуе даследчык К. Годар, больш засяроджаны на руху аддалення ад назіральніка, чым набліжэння да яго [15, p. 152]. У адрозненне ад англійскага дзеяслова *go*, беларуская

лексема *ісці* не фіксуе ў сваёй семантыцы становішча назіральніка і пры адсутнасці паказчыка зыходнага або канчатковага пункта траекторыі руху сумяшчальная з любой з іх. Паколькі пазіцыя назіральніка ў дзеяслове *ісці* не замацаваная ў яго семантычнай структуры, яна можа быць прадстаўлена наступнымі варыянтамі [16, с. 128].

1. Адсутнасць зафіксаваных крайніх пунктаў пры дзеяслове *ісці* абумоўлівае магчымасць знаходжання назіральніка ў любым з гэтых пунктаў або ў сярэдзіне : *«Ох і задам жа я ёй потым», – падумаў дзед Іван, а ўголас сказаў: – Ну, дык* ***ідзі*** *хутчэй. І Таня пабегла* (В. Зуб. Таямнічы надпіс) [НКРЯ] (назіральнік у зыходным пункце); *Ай! нехта* ***ідзе****. Ён, ён, напэўна ён*! (Я. Купала. Паўлінка) (назіральнік у канчатковым пункце траекторыі).

2. Калі ў *ісці* запоўненая валентнасць канчатковага пункта, то назіральнік можа знаходзіцца ў зыходным пункце: – ***Ідзіце*** ***адсюль****, людзі, ідзіце да мяне ў шалаш, у Задзвінне* (У. Караткевіч. Званы Віцебска) (назіральнік у пачатковым пункце).

3. Калі валентнасць зыходнага пункта запоўнена, то назіральнік можа знаходзіцца ў канчатковым пункце: *Ладны дом, спакой у хаце,* ***ад пячы*** ***ідзе*** *цяпло, ціхі сон твайго дзіцяці, мужа моцнае плячо* (А. Клышка. Роднае) (назіральнік у канчатковай кропцы) [17].

4. Калі абедзве валентнасці запоўненыя, назіральнік размяшчаецца пасярэдзіне траекторыі: *Дзе я іх бачыў? Ага, ля Бяздоннага возера пад Слонімам і яшчэ… і яшчэ ля сцежкі, якой* ***ішоў з Замшан у Цёмны Бор*** (У. Караткевіч. Чорны замак Альшанскі) [НКРЯ].

Шырокая семантыка дзеяслова *ісці*, прадстаўленая ў лексікаграфічных крыніцах, дазваляе выкарыстоўваць яго з аб'ектамі, якія пазначаюць віды транспарту: *Па суботах* ***аўтобус*** ***ідзе*** *з Докшыц праз Дзядкі на Макаравічы, а з Сітцаў ідзе на Гарадзішча і толькі тады вяртаецца ў Докшыцы* [18]. На думку Е. У. Рахілінай, такое ўжыванне становіцца магчымым пры ўспрыманні назіранага перамяшчэння як міжвольнага (*non-arbitrary*) і арыентаванага на канчатковы пункт (*goal-oriented*) [19, p. 7]. Пры гэтым маршрут руху звычайна лічыцца фіксаваным, і канчатковы пункт выяўляецца ў кантэксце або з дапамогай фармальных паказчыкаў, напрыклад, прыназоўнікавымі групамі [19, p. 7]: *Поезд* ***ідзе ў Віцебск****.* Наадварот, для пазначэння некантралюемага перамяшчэння з відамі транспарту, маршрут якіх не фіксаваны, ужываецца дзеяслоў *ехаць* [20; 19, p. 7–8]*: – Дзевушка, а праўда гэты* ***аўтобус*** ***едзе*** *ў Чыжоўку? – стомлена і вырачана, як да апошняга паратунку на ўжо вызначаным шляху, звяртаецца да мяне дзядзечка, плюгаваценькі і ў сцельку п'яны* [21]; *Схема адна: пратакол допыту, ордэр на вобыск, які праводзіць лейтэнант. Яго старэйшы калега ў гэты час у машыне праз тэлефонную трубку наводзіць патрэбныя спраўкі аб іншай машыне (марка, прыватная, колеру суніцаў з малаком,* ***едзе*** *па вуліцы імя Пілата, вадзіцель такі і гэтакі)* (У. Караткевіч. Чорны замак Альшанскі) [НКРЯ].

Ужыванне дзеяслова *ісці* з неадушаўлёнымі аб'ектамі абумоўлена ступенню акрэсленасці траекторыі руху і функцыянальнай значнасцю аб'екта: ідуць тыя аб'екты, маршрут і мэта якіх вызначаныя, канчатковы пункт імкнецца быць запоўненым для маркіравання набліжэння: *Вялікая хмара* ***ідзе на***

Мінск *з паўночнага захаду* [22]. Аб'екты, якія рухаюцца самі па сабе без запланаванай траекторыі, прадугледжваюць ужыванне спецыфічных дзеясловаў перамяшчэння: *Метэоры, каметы* ***ляцяць****! Сутыкаюцца і паміраюць!* [23].

Дзеясловы *come* і *прыйсці*, якія змяшчаюць указанне на лакацыю моўцы, фіксуюць становішча назіральніка ў канчатковым пункце траекторыі руху. Але, нягледзячы на ўяўную поўную эквівалентнасць, паміж *come* і *прыйсці* выяўляецца цэлы шэраг адрозненняў. Для *come* прамое ўказанне месца азначае прысутнасць у ім назіральніка-моўцы, які павінен знаходзіцца ў канчатковым пункце: *See, they carry green branches. They are* ***coming*** *to surrender most likely* '– Глядзіце, яны махаюць зялёнымі галінамі. Падобна на тое, яны **прыйшлі** здавацца' (C. S. Lewis. The Chronicles of Narnia. Prince Caspian) [НКРЯ] (назіральнік прысутнічае ў гэтым месцы). У семантыцы дзеяслова *прыйсці*, якая пазначае запланаванае перамяшчэнне, актуалізуецца не столькі перамяшчэнне, колькі выніковы стан: – *Да вас* ***прыйшоў*** *я, Пярун і Дажджабог* (Л. Дайнека. След ваўкалака) [НКРЯ]. Фокус на выніковым стане робіць немагчымым ужыванне дзеяслова *прыйсці* для дзеяння, таго, што адбываецца ў момант гаворкі: **Глядзі, ён прыходзіць дадому.* У той жа час шырокая семантыка *ісці* робіць магчымымі выказванні накшталт *Глядзі, ён ідзе (= збіраецца) дадому*. На думку А. В. Падучавай, гэта звязана з тым, што «ў семантыку дзеяслова *прыйсці* ўваходзіць назіральнік. Ён фігуруе ў статыўным кампаненце, таму адбываецца зрушэнне семантычнага акцэнту на стан, дынамічны кампанент аказваецца не ў фокусе і таму не можа скласці дзеянне для аператара імперфектацыі» [16, с. 136].

Такім чынам, дэйктычныя дзеясловы *come, go* і *ісці*, *прыйсці* ўдзельнічаюць у прасторавай арганізацыі выказвання і рэгулююць ўзаемадзеянне паміж удзельнікамі ў працэсе камунікацыі. Пры падабенстве іх значэнняў дадзеныя дзеяслоўныя дэйктыкі маюць свае асаблівасці семантыкі і функцыянавання. Так, дзеяслоў *go* пазначае рух аддалення ад назіральніка-моўцы, у той час як *ісці* не змяшчае ў сваёй семантыцы становішча назіральніка і пры адсутнасці паказчыка зыходнага або канчатковага пункта траекторыі руху сумяшчальны з любой з іх. Дзеясловы *прыйсці* і *come* фіксуюць становішча назіральніка-моўцы ў канчатковым пункце траекторыі руху. Аднак дзеяслоў *come* характарызуецца абавязковай наяўнасцю ў яго семантыцы ўбудаванага назіральніка-моўцы, які знаходзіцца ў канчатковым пункце, у адрозненне ад беларускага *прыйсці*, дзе гэтая асаблівасць факультатыўна.

ЛІТАРАТУРА

1. *Langacker, R. W.* Mouvement abstrait / R.W. Langacker // Lang. Fr. – 1987. – Vol. 76. – P. 59–76.
2. *Dirven, R.* Cognitive Exploration of Language and Linguistics / R. Dirven, M. Verspoor. – Philadelphia : J. Benjamins Comp., 1998. – 277 p.
3. *Slobin, D. I.* Linguistic Representations of Motion Events : What is Signifier and What is Signified / D. Slobin // Outside-in, Inside-out : Iconicity in Language and Literature 4 / C. Maedor [et al.]. – Amsterdam : Philadelphia, 2005. – P. 307–322.

4. *Talmy, L.* Toward a Cognitive Semantics : in 2 vol. / L. Talmy. – Cambridge : MIT Press, 2000. – Vol 2 : Toward a Cognitive Semantics : Typology and Process in Concept Structuring. – 482 p.
5. *Bourdin, Ph.* On Goal-Bias Across Languages: Modal, Configurational and Orientational Parameters / Ph. Bourdin // LP'96 : Typology–Prototypes, Item Orderings and Universals : proc. of the conf., Prague, 20–22 Aug., 1996 / Charles Univ. Press ; ed. B. Palek. – Prague, 1997. – P. 185–218.
6. *Icegami, Y.* «Source» vs «Goal» : a Case of Linguistic Dissymmetry / Y. Icegami // Concepts of Case / ed.: R. Dirven, G. Radden. – Tübingen : Narr, 1987. – P. 122–122.
7. *Fillmore, Ch. J.* Deictic Categories in the Semantics of «Come» / Ch. J. Fillmore // Intern. J. of Language a. Philosophy. – 1966. – Vol. 2, № 3. – P. 219–227.
8. *Майсак, Т. А.* Семантика и статика : глагол *идти* на фоне других глаголов движения // Т. А. Майсак, Е. В. Рахилина // Логический анализ языка. Языки динамического мира / Ин-т языкознания РАН ; Междунар. ун-т природы, общества и человека «Дубна» ; отв. ред.: Н. Д. Арутюнова, И. Б. Шатуновский. – Дубна, 1999. – С. 53–66.
9. *Lyons, J.* Semantics : in 2 vol. / J. Lyons. – London : Cambridge Univ. Press, 1977. – Vol. 2. – 897 p.
10. Cambridge English Dictionary [Electronic Resource]. – Mode of access : dictionary.cambridge.org/dictionary/english. – Date of access : 10.03.2016.
11. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы [Электронны ресурс]. – Рэжым доступу : http://rv-blr.com/dictionary/explanatory?letter=2. – Дата доступу : 15.04.2016.
12. *Ерзинкян, Е. Л.* Фактор адресата в дейктическом обозначении / Е. Л. Ерзинкян [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http // publications.ysu.am/wp-content/uploads/2015/02/Yerzinkyan_Y..pdf. – Дата доступа : 10.10.2015.
13. *Tanz, Ch.* Studies in the acquisition of deictic terms / Ch. Tanz. – Cambridge: Cambridge Univ. Press, 1980. – 184 p.
14. *Clark, E. V.* Is He Coming or Going? On the Acquisition of Deictic Verbs / E.V. Clark, O. K. Garnica // Journal of Verbal Learning and Verbal Behavior [Electronic resource]. – 1974. – № 13. – P.559–572. – Date of access : 10.05.2016.
15. *Goddard, C.* The semantics of coming and going / C. Goddard // Pragmatics 7.2. – 1997. – P. 147–162.
16. *Падучева, Е. В.* Дейктические компоненты в семантике глаголов движения / Е. В. Падучева // Логический анализ языка. Семантика начала и конца : сб. ст. / Ин-т языкознания РАН ; отв. ред. Н. Д. Арутюнова. – М., 2002. – С. 121–136.
17. *Клышка, А.* Роднае [Электронны рэсурс] / А. Клышка. – Рэжым доступу : http://pdf.kamunikat.org/15477-1.pdf. – Дата доступу : 24.09.2015.
18. Рушыцца ўсё, прападае край. Нататкі Кастуся Шыталя з кароткай дарогі / Вестkі.інфо [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://westki.info/artykuly/20188/rushycca-usyo-prapadae-kray-natatki-kastusya-shytalya-z-karotkay-darogi. – Дата доступу : 3.04.2016.

19. *Rakhilina, E. V.* There and back: the case of Russian ‘go’ / E. V. Rakhilina [Electronic resource]. – Mode of access : /https://slaviccenters.duke.edu/.../5 rakhilina.origin. – Date of access : 23.04.2016.
20. *Рахилина, Е. В.* Мы едем, едем, едем / Е. В. Рахилина [Электронный ресурс]. – Режим доступа : www.rakhilina.ru/files/exat.pdf. – Дата доступа : 20.04.2016.
21. Куды ідзе 59-ы аўтобус? [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://wroblewska.livejournal.com/7070.html? – Дата доступу: 10.03.2016.
22. Надвор’е // Наша ніва [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://nn.by/?c=ar&i=131814. – Дата доступу : 01.04.2016.
23. *Факторан, А.* Сьвет / А. Факторан [Электронны рэсурс]. – Режим доступа : https://www.stihi.ru/2009/09/19/7136. – Дата доступа : 23.02.2016.

КРЫНІЦЫ ПРЫКЛАДАЎ

НКРЯ – Национальный корпус русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://ruscorpora.ru/search-para-be.html. – Дата доступа : 12.12.2015.

В. У. Барысенка (Мінск)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ. ВОПЫТ ВЫКЛАДАННЯ КІТАЙСКІМ СТУДЭНТАМ

Вучэбны прадмет «Сучасная беларуская мова» з'яўляецца абавязковым для вывучэння ў беларускіх установах вышэйшай адукацыі. Замежныя студэнты, якія навучаюцца разам з беларускімі, таксама маюць экзамен па гэтым прадмеце. Савет Мінскага дзяржаўнага ўніверсітэта прыняў рашэнне аб стварэнні асобных зборных груп замежных студэнтаў для выкладання ім беларускай мовы як замежнай у межах вызначанага стандартам аб'ёму вучэбных гадзін. У такіх групах разам навучаюцца прадстаўнікі розных краін: Расіі, Украіны, Літвы, Эстоніі, Туркменістана, Турцыі, Карэі, Кітая і інш. Натуральна, што выкладчык прымяняе ўніверсальныя метады выкладання беларускай мовы як замежнай. Але нельга не ўлічваць аспект роднай мовы навучэнцаў.

Працуючы з рускамоўнымі студэнтамі, няма неабходнасці падрабязна спыняцца на кожнай літары алфавіта, дастаткова акцэнтаваць увагу на адрозненні літар, а потым гукаў беларускай мовы ад літар і гукаў рускай. Пры пастаноўцы вымаўлення спецыфічных беларускіх гукаў, засваенні націску і створаных пры яго дапамозе рытмічных мадэляў, засваенні тыпаў беларускай інтанацыі зноў-такі асноўная ўвага надаецца спецыфічным з’явам. Безумоўную складанасць уяўляе сабой пастаноўка рускамоўным навучэнцам правільнай артыкуляцыі зычных гукаў (фрыкатыўнага [г], цвёрдага [ч], афрыкат [дж], [дз’], [ц’]), падоўжаных зычных, спалучэнняў зычных

гукаў. У аснове навучання беларускаму вымаўленню ляжыць імітацыйна-свядомы прынцып, які выражаецца ў спецыфічнай паслядоўнасці прэзентацыі гукаў. Паколькі вывучаюць беларускую мову як замежную дарослыя навучэнцы, фарміраванне фанетычнай кампетэнцыі ў іх прадугледжвае ў асноўным свядомы, аналітычны падыход да засваення фактаў мовы ў адрозненне ад імітацыйнага падыходу, які прымяняецца ў дзіцячай аўдыторыі.

Засваенню лексікі і граматыкі беларускай мовы садзейнічае блізкасць ладу рускай мовы. З'ява станоўчага пераносу спрыяе развіццю навыкаў моўнай здагадкі ў навучэнцаў. Пры гэтым неабходна помніць пра заканамернае ўзнікненне руска-беларускай дэструктыўнай інтэрферэнцыі, якая ўскладняе працэс засваення лексікі і граматыкі беларускай мовы рускамоўнымі і ўплывае на чысціню мовы. Гэта праяўляецца ў граматычных характарыстыках слова і яго сінтаксічнай спалучальнасці ўнутры словазлучэння і сказа. Фарміраванне граматычнай кампетэнцыі ў навучэнцаў дасягаецца выкананнем адпаведных практыкаванняў, арыентаваных у першую чаргу на супастаўленне блізкіх граматычных з'яў у беларускай і рускай мовах. Лексічная кампетэнцыя фарміруецца ў практыкаваннях, якія адпрацоўваюць спецыфічна адрозныя ад рускай мовы элементы беларускага словаўтварэння, лексіка-граматычнай семантыкі і спалучальнасці, калі адна і тая ж думка ў рускай і беларускай мовах выражаецца рознымі сродкамі. Навучэнцы павінны атрымаць навыкі падбору адэкватных беларуска-рускіх эквівалентаў лексічных адзінак і словазлучэнняў, у тым ліку і фразеалагічнага характару, пазнаёміцца са з'явамі міжмоўнай аманіміі (так званых уяўных сяброў перакладчыка).

Камунікатыўна-дзейны падыход павінен абавязкова выражацца ў кантэксце ўзаемадзеяння культур. З'яўляючыся прадстаўнікамі ўсходнеславянскай сям'і народаў, беларусы, натуральна, маюць у нацыянальным характары і культуры шэраг аднолькавых з рускімі рыс. У нас агульны маральна-этычны імператыў, падабенства традыцыйных народных звычаяў, але пры гэтым беларуская культура ўнікальная.

Студэнты з іншых краін, з практычна адсутнай базай рускай мовы, павінны за семестр авалодаць асновамі беларускай мовы на элементарным узроўні, а таксама мець сфарміраваную міжкультурную кампетэнцыю. Значыць, да студэнтаў з Кітая, Карэі, большасці з Туркменіі неабходны індывідуальны падыход.

Спынімся на асаблівасцях выкладання беларускай мовы кітайскім студэнтам. «У аснову <…> лінгвістычнай базы павінна быць пакладзена супастаўляльнае вывучэнне фанетычных сістэм дзвюх моў, і чым больш адрозныя гэтыя сістэмы, тым больш дасканала павінна быць падрыхтавана лінгвістычная база – павінна быць праведзена супастаўляльнае даследаванне фанетычнага ладу дзвюх моў – роднай мовы навучэнца і рускай мовы. Супастаўляльнае вывучэнне фанетычных з'яў дзвюх моў – рускай і кітайскай – налічвае не больш за паўтара дзесяцігоддзя. Першыя працы з'явіліся ў 1990-я гг. XX ст. (Н. В. Агопава, Л. Р. Бікцеева, В. Н. Караткова, Л. Л. Прысная,

Л. Сунь Юйхуа, Чжао Юйцзян і інш.). Фанетычная сістэма рускай і кітайскай мовы настолькі адрозная, што без высвятлення ступені іх падабенства і адрознення немагчыма гаварыць пра добрую лінгвістычную падрыхтоўку студэнта» [1, с. 29]. Калі аўтары артыкула вядуць гаворку пра паўтара дзесяцігоддзя супастаўляльнага вывучэння фанетычных з'яў рускай і кітайскай моў, то кантрастыўныя беларуска-кітайскія лінгвістычныя даследаванні толькі пачалі з'яўляцца. Так што выкладчыкам беларускай мовы як замежнай прыходзіцца абапірацца на асабістыя назіранні і на кампаратыўныя даследаванні рускай мовы як замежнай.

Яшчэ нядаўна кітайскія студэнты МДЛУ засвойвалі цяжкае вымаўленне рускіх гукаў, што звязана з тыпалагічным і генетычным адрозненнем фанетычных сістэм дзвюх моў. А цяпер ва ўмовах абмежаванасці акадэмічных гадзін яны сутыкаюцца з блізкароднаснай рускай, але далёкай ад кітайскай фанетычнай, лексічнай і граматычнай сістэмай беларускай мовы. Пры гэтым варта адзначыць, што арфаэпічныя нормы беларускай мовы, нягледзячы на тыпалагічнае і генетычнае адрозненне, засвойваюцца кітайскімі студэнтамі прасцей і хутчэй, чым рускія.

У кітайскай мове няма націску, а ёсць чатыры тоны, таму кітайцам цяжка даецца беларускі дынамічны рухомы рознамясцовы націск, яны часта робяць памылкі. У прасадычнай сістэме кітайскай мовы інтэнсіўнасць і даўжыня – галоўныя кампаненты тону. Калі кітайцы вывучаюць рускую мову, то яны выкарыстоўваюць кітайскі тон, што выклікае парушэнне рэдукцыі рускіх ненаціскных галосных. Кітайцы вымаўляюць на іх месцы галосныя поўнага ўтварэння. Беларускае літаратурнае вымаўленне, наадварот, патрабуе выразнай артыкуляцыі галосных у пераднаціскной і паслянаціскной пазіцыях. У выніку пры ўсіх цяжкасцях вымаўленне беларускіх галосных кітайцам даецца лягчэй за рускія. У рускай мове зычных не толькі больш, але і вакалізм падпарадкоўваецца кансанантызму. Вымаўленне рускіх спалучэнняў зычных выклікае складанасці ў кітайцаў, у такія спалучэнні яны часта ўстаўляюць галосны гук. «Рытміку рускага слова скажае няправільнае вымаўленне спалучэнняў зычных. Аналіз вуснага маўлення паказаў, што пры вымаўленні рускіх слоў са спалучэннямі некалькіх зычных навучэнцы спрабуюць утварыць зручныя для сябе склады тыпу зычны + галосны. Гэта вядзе да павелічэння ці змяншэння фанетычных элементаў таго ці іншага сегмента. Перанос дыстрыбутыўных мадэляў роднай мовы прыводзіць да спрашчэння ў маўленні навучэнцаў груп зычных за кошт выпадзення аднаго з іх ці ўстаўкі галоснага паміж зычнымі. <…> Адхіленні ад вымаўлення спалучэнняў зычных, зафіксаваныя ў маўленні кітайскіх навучэнцаў, тлумачацца ўплывам іх роднай мовы, у якой групы зычных у адным складзе не сустракаюцца» [2, с. 297]. Фанетычная сістэма беларускай мовы, наадварот, характарызуецца большым вакалізмам, і гэтая асаблівасць пазітыўна ўплывае на выпрацоўку правільнага вымаўлення беларускіх слоў кітайцамі. (Параўнаем: рус. *лгать* – беларус. *ілгаць*; рус. *мгновенно* – беларус. *імгненна*; рус. *кафедр* – беларус. *кафедраў*; рус. *преломление* – беларус. *пераламленне*.)

Санорныя [р] і [л] – самыя цяжкія гукі для кітайскіх студэнтаў. Але затое пастаноўка беларускага санорнага [ў] практычна не выклікае праблем. В. Н. Караткова, аналізуючы памылкі вымаўлення рускіх гукаў кітайскімі студэнтамі, адзначае: «Пры вымаўленні шчыльных [з] і [з’] назіраецца замена кітайскай афрыкатай [dz]: *[dz]има – зима, [dz]онт – зонт*» [2, с. 295]. Пры вывучэнні беларускай мовы наяўнасць у кітайскай мове афрыкаты [dz] з’яўляецца спрыяльным момантам, бо яна падобная да беларускай афрыкаты.

Памылкі вымаўлення кітайскіх студэнтаў можна падзяліць на дзве групы: памылкі, звязаныя з узнаўленнем, і памылкі, звязаныя з успрыняццем. Памылак успрыняцця звычайна менш.

Чытанне на беларускай мове для замежных студэнтаў таксама аказваецца прасцейшым працэсам. Беларуская арфаграфія ў большасці заснавана на фанетычным прынцыпе, таму фарміраванне гукава-літарных адпаведнасцяў, авалоданне вымаўленчымі нормамі адбываецца хутчэй.

Граматыка беларускай мовы ў гэтым курсе падаецца ў максімальна сціснутым выглядзе. Працуючы з кітайскімі студэнтамі, неабходна памятаць, што граматыка рускай мовы не можа служыць добрым падмуркам вывучэння беларускай, а часам і перашкаджае (руска-беларуская інтэрферэнцыя). Граматыка ў кітайскай мове не адыгрывае істотнай ролі – студэнтам цяжка прывыкнуць псіхалагічна да важнасці форм беларускіх зменных часцін мовы. «Кітайская мова, у адрозненне ад рускай, характарызуецца найперш намінатыўным ладам і граматычна значным парадкам слоў, перадпазіцыяй азначэнняў, а таксама аглютынатыўным ладам: адсутнасцю прыназоўнікаў, катэгорый роду, асобы, склону, ліку, аформленых флексіямі» [3, с. 172]. Кітайскі даследчык Тань Аошуан адзначыў, што «граматычная сістэма кітайскай мовы “не адчыненая” для непасрэднага назірання па прычыне складова-марфемнага характару яе асноўнай адзінкі – слова – і адсутнасці ўнутранай флексіі. Акрамя таго, пры спалучэнні слоў у рускай і кітайскай мовах выкарыстоўваюцца спецыфічныя сродкі граматычнай сувязі» [4, с. 72].

Яшчэ ў 70-я г. XX ст. Савет Еўропы прапанаваў удасканаліць сістэму навучання замежным мовам. Асноўным быў прызнаны камунікатыўны сістэмна-дзейны падыход, які адлюстроўвае рэальныя чалавечыя стасункі. Значыць, граматыка неаддзельная ад сінтаксісу. Як аснова, маўленчы ўзор замежным навучэнцам адразу даецца канструкцыя сказа, схема пабудовы дыялога і маналога.

З практыкі выкладання беларускай мовы нерускамоўным студэнтам можна адзначыць, што найбольш памылак яны робяць пры ўтварэнні склонавых форм назоўніка, дапасаванні прыметніка да назоўніка, утварэнні прыналежных займеннікаў, формаў асобы ў цяперашнім часе і роду ў прошлым часе дзеяслова. Пэўную цяжкасць уяўляе і парадак слоў як граматычны сродак пры пабудове беларускага сказа. Утрымаць у галаве тры скланенні, два спражэнні, выключэнні, слэнг і націскі атрымліваецца не адразу.

Авалодваючы замежнай мовай, чалавек так ці іначай фарміруе іншамоўную свядомасць, іншамоўную карціну свету. У Беларусі замежныя нерускамоўныя студэнты сутыкаюцца з сур'ёзнымі як лінгвістычнымі, так і псіхалагічнымі цяжкасцямі. Пры гэтым варта адзначыць, што псіхалагічныя праблемы ў нашай краіне кітайцы пераадольваюць хутчэй, чым у Расіі. Гэта тлумачыцца пэўным падабенствам беларускага і кітайскага нацыянальных характараў. Па сведчанні саміх замежных студэнтаў, беларусы менш эмацыйныя, менш карумпаваныя, больш працалюбівыя, больш сумленныя, больш талерантныя, больш ветлівыя за рускіх. Гэтыя якасці стасуюцца з кітайскай палітыкай «захавання гонару» адносна сябе і суразмоўцы. Акрамя гэтага, выкладчык можа абапірацца на кітайскую здольнасць да цэласнага ўспрыняцця пісьмовай інфармацыі, высокі ўзровень развіцця інтуіцыі і творчасці, вобразнага мыслення і кантэкстуальнай здагадкі. Кітайскія студэнты добра працуюць са словаўтваральнымі мадэлямі беларускай мовы, бо яны натрэніраваныя на распазнаванне і спалучэнне некалькіх марфем ці слоў з далейшым цэласным успрыняццем новага сэнсу слова. Такая практыка папаўняе лексікон студэнтаў.

Беларуская мова – гэта не набор фанетычных і лексічных адзінак, граматычных структур і правілаў, а своеасаблівы спосаб мыслення, успрыняцця навакольнай рэчаіснасці, найлепшы сродак для азнаямлення і разумення культуры беларусаў. Навучанне замежнікаў, заснаванае на суаднясенні беларускай і роднай моў студэнтаў, дае магчымасць супаставіць культурныя традыцыі, усвядоміць арыгінальнасць і ўнікальнасць кожнай з іх, развіць талерантнае стаўленне да прадстаўнікоў іншых культур.

ЛІТАРАТУРА

1. *Присная, Л. Л.* Лингвистические основы формирования фонетического навыка у китайских студентов в условиях профессионально ориентированного обучения / Л. Л. Присная, Т. В. Самосенкова, Т. Н. Литвинова // Научные ведомости Белгород. гос. ун-та. Сер.: Гуманитарные науки. – Белгород, 2012. – Вып. № 12 (131), т. 14 – С. 29–35.
2. *Короткова, О. Н.* Консонантные системы русского и китайского языков и особенности китайского акцента в русской звучащей речи / О. Н. Короткова // Вестн. ф-та рус. яз. и лит. / Ун-т китайской культуры. – Вып. 9. – Проблемы изучения и преподавания русского языка и литературы. – Тайбэй, 2006. – С. 293–303.
3. *Ян Фан.* Обучение русскому языку китайских студентов-русистов в грамматическом аспекте / Ян Фан // Язык и культура. – Томск, 2014. – Вып. № 1 (25). – С. 168–173.
4. *Тань Аошуан.* Китайская картина мира. Язык, культура, ментальность / Тань Аошуан. – М. : Рукописные памятники древней Руси, 2012 – 272 с.

Т. Г. Казакевіч (Мінск)

ЛІНГВАМЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫВУЧЭННЯ ФРАЗЕАЛОГІІ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ЗАМЕЖНАЙ

Людзі ў свеце жывуць у адпаведнасці са сваімі светапоглядам, сістэмай каштоўнасцяў, з'яўляючыся носьбітамі розных моў і культур, і мяркуюць пра іншых на аснове асабістых культурных стэрэатыпаў.

З гэтай прычыны надзвычай важным становіцца асэнсаванне сучасных мэт і задач навучання замежным мовам. Сёння актуальна фарміраванне такіх якасцяў моўнай асобы, якія б маглі забяспечыць эфектыўныя зносіны на мове, якая вывучаецца. Такая пастаноўка пытання фіксуе ўвагу не столькі на фармальных (правільнае маўленне з пункту гледжання лексічных і граматычных нормаў), колькі на зместавых аспектах маўлення і яго ўспрымання, г.зн. асэнсаванне мэты навучання мове як замежнай не абмяжоўваецца рамкамі развіцця ў замежных навучэнцаў навыкаў практычнага валодання мовай як сродкам зносін, а надзвычай важным з'яўляецца фарміраванне кампетэнцыі міжкультурнай камунікацыі. Гаварыць пра паспяховасць яе фарміравання ў замежнага навучэнца можна толькі тады, калі пры зносінах з носьбітам мовы ён дасягае ўзаемапаразумення ў адпаведнасці з прынятымі культурнымі нормамі і традыцыямі.

Мова з'яўляецца формай выражэння нацыянальнага погляду на свет. Асваенне мовы – гэта шлях да пазнання культуры носьбіта мовы, што служыць асновай узаемапаразумення.

Нельга адрываць мову ад культуры носьбіта мовы. На гэтым грунтуюцца ўсе сучасныя канцэпцыі навучання мове як замежнай, што скіроўвае выкладчыка на навучанне міжкультурным зносінам, на адбор моўных адзінак з нацынальна-культурнай маркернасцю, дзе ўтрымліваецца культурна значная інфармацыя (пра матэрыяльнае, сацыяльнае, духоўнае жыццё носьбітаў мовы). Такімі з'яўляюцца і фразеалагічныя адзінкі (ФА). Кожны народ мае сваё ўспрыманне і асэнсаванне свету і адлюстроўвае гэта ў мове праз адметную сістэму вобразаў. Вывучэнне фразеалогіі дапамагае навучэнцам-замежнікам зразумець адметнасці нацыянальна-культурнага вопыту і традыцыі носьбітаў мовы.

Уключэнне ФА ў змест навучання беларускай мове як замежнай дазваляе студэнтам-замежнікам паўнавартасна ўдзельнічаць ў працэсе камунікацыі з носьбітам мовы. Сучасная лінгвадыдактыка мае пільную патрэбу ў тэарэтычным абгрунтаванні і распрацоўцы метадычнай сістэмы выкладання фразеалогіі мовы навучэнцам-замежнікам. Трэба азначыць, як і якія ФА неабходныя пры навучанні беларускай мове як замежнай, адабраць, вызначыць аб'ём фразеалагічнага матэрыялу для актыўнага валодання і для пасіўнага разумення, які падлягае ўключэнню ў навучальны працэс на розных узроўнях і этапах асваення мовы, метадычна распрацаваць сістэму ўвядзення ФА ў працэс выкладання беларускай мовы як замежнай, распрацаваць сістэму практыкаванняў, накіраваных на ўспрыманне, разуменне і правільнае ўжыванне ФА.

З прычыны нераспрацаванасці метадычнай сістэмы выкладання фразеалогіі беларускай мовы як замежнай, адсутнасці рэкамендацый выкладчык на сучасным этапе самастойна, арыентуючыся на свой вопыт, адбірае ФА для замежнай аўдыторыі, улічваючы частотнасць іх выкарыстання носьбітамі, камунікатыўную і краіназнаўчую каштоўнасць.

Асабісты вопыт выкладаня беларускай мовы як замежнай дазволіў зрабіць наступныя высновы па выніках працы па вывучэнні фразеалогіі беларускай мовы замежнымі студэнтамі:

1) вывучэнне ФА мовы павінна засноўвацца на разуменні камунікатыўнай накіраванасці навучання беларускай мове як замежнай;

2) вывучэнне ФА мовы павінна адбывацца з першага году навучання;

3) вывучэнне ФА мовы павінна адбывацца паступова, з улікам засваення навучэнцамі-замежнікамі лексічнага і граматычнага матэрыялу;

4) прэзентацыя ФА мовы павінна адбывацца з апорай на лінгвакультуралагічны каментарый;

5) сістэма распрацаваных практыкаванняў павінна быць накіравана не толькі на ўспрыманне і разуменне, але і на выкарыстанне ў маўленні.

Сёння надзвычай актуальнай з'яўляецца задача вызначэння крытэрыяў адбору і спосабаў прэзентацыі ФА, якія ўключаюцца ў аб'ём моўнага матэрыялу. Знаёмства з ФА павінна пачынацца яшчэ на пачатковым этапе, але весці размову пра сістэмнае вывучэнне можна толькі на прасунутым этапе.

Зразумела, што ў межах канкрэтнай методыкі важна ўлічваць такія «зменныя» параметры, як этап навучання, узровень ведаў навучэнцаў, нацыянальны склад, колькасць вучэбнага часу і інш.

Пры вызначэнні аб'ёму неабходна кіравацца камунікатыўнай каштоўнасцю ФА, нарматыўнасцю. Некаторыя расійскія выкладчыкі-практыкі прапаноўваюць адбіраць па 10–12 ФА ў адпаведнасці з тэматычнымі групамі («Сям'я», «Адукацыя», «Характар чалавека» і інш.). Адбор можа адбывацца па тэматычным прынцыпе, семантычных групах, па апорных словах. Пры гэтым неабходна кіравацца частотнасцю ўжывання ФА.

Для аналізу фразеалагічнага матэрыялу пры навучанні замежнікаў беларускай мове могуць выкарыстоўвацца розныя метады яго прэзентацыі: семантычнае тлумачэнне на беларускай ці роднай мове навучэнца, пераклад па словах, падбор словазлучэнняў, сэнсавая здагадка (у кантэксце), каментарый лінгвакультуралагічнага ці камунікатыўна-прагматычнага характару, выкарыстанне сінонімаў, антонімаў, супастаўляльны аналіз ФА беларускай і роднай мовы навучэнца.

Пасля абавязковых практыкаванняў на асэнсаванне (напрыклад, «Прачытайце сказы, замяніце блізкім па сэнсе словам ці словазлучэннем», «Перадайце змест сказа сваімі словамі» і інш.) можна даваць практыкаванні на засваенне граматычнай структуры ФА (напрыклад, «Пабудуйце сказы, выкарыстоўваючы ФА *белая варона* ў розных склонах» і інш.).

Адпрацоўка навыку выкарыстання ФА ў маўленні прадугледжвае наступныя практыкаванні: «Састаўце характарыстыку чалавеку, выкарыстоўваючы ФА, дадзеныя ў спісе», «Прачытайце сказы, устаўце ФА, якія падыходзяць па сэнсе», «Закончыце апавяданне з дапамогай ФА», «Раскажыце пра пэўны эпізод з жыцця і падбярыце ФА да нейкіх момантаў» і інш.

Адбор ФА ў залежнасці ад лексіка-граматычнай арганізацыі курса, пабудова рознага тыпу заданняў з іх выкарыстаннем – усё разам садзейнічае ўключэнню ФА ў актыўны слоўнік навучэнцаў, падтрымлівае цікавасць да вывучэння мовы, спрыяе разуменню характару беларускага народа.

На пачатковым этапе асваення фразеалагічнага мінімуму мовы неабходны даведнік па фразеалогіі як кампанент вучэбнага комплексу, які ўключаў бы прыклады іх выкарыстання і тлумачэнне значэння.

ФА выкарыстоўваюцца ў вусным маўленні, у літаратуры, у мове сродкаў масавай камунікацыі, надаючы мове адметную выразнасць і эмацыянальную насычанасць.

Вывучэнне фразеалогіі мовы з апорай на культуралагічны падыход з разуменнем мовы як феномена культуры пры выкладанні мовы як замежнай спрыяе фарміраванню ў замежных навучэнцаў адэкватных паводзін у сітуацыях міжкультурных зносін.

Ю. М. Кардубан (Мінск)

КАМПРЭСІЎНАЕ СЛОВАЎТВАРЭННЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ І АНГЛІЙСКАЙ МОВАХ: СУПАСТАЎЛЯЛЬНЫ АСПЕКТ

З’ява *кампрэсіі* выступае ў якасці аднаго з самых рэпрэзентатыўных паказчыкаў эканоміі моўных сродкаў. Моўная эканомія як агульнатэарэтычнае паняцце лінгвістыкі мае *дыяхранічнае* і *сінхранічнае* вымярэнне.

Д ы я х р а н і ч н ы падыход звязаны перш за ўсё з эвалюцыяй моўнай сістэмы. Так, адной з прычын існавання змен у мове Ш. Балі лічыў тэндэнцыю да сцісласці [1, с. 313]. У дачыненні да фанацыйнай дзейнасці Я. Д. Паліванаў называў эканомію тыповай характарыстыкай, якая дазваляе рабіць высновы пра эвалюцыю мовы [2, с. 60–61]. На думку гэтых даследчыкаў, праявы кампрэсіі – гэта не аднаактныя з’явы, а рэзультат эвалюцыйнага развіцця мовы, звязаны з яе ўспрыняццем, калі па фрагментах пэўнай адзінкі можна зразумець значэнне цэлага.

У с і н х р а н і ч н ы м плане неабходна згадаць тэорыю А. Марцінэ [3, p. 77], які абгрунтаваў «закон найменшага намагання» (loi du moindre effort), у адпаведнасці з якім чалавек растрачвае свае сілы толькі ў той ступені, у якой гэта неабходна для дасягнення пэўнай мэты.

Моўную кампрэсію перш за ўсё звязваюць з такімі адзінкамі, як слова, сказ, тэкст. Акадэмік В. У. Вінаградаў пісаў, што існуе «синтетическое сжатие», і адзначаў, што ў выніку з’яўляецца слова, якое мае меншую колькасць каранёў у параўнанні з утваральнай асновай [4, с. 164]. Па сутнасці, гэта разгляд кампрэсіі на ўзроўні словаўтварэння.

Як вядома, асноўнымі функцыямі словаўтварэння як дзейнасці з'яўляюцца наступныя: 1) *уласна намінатыўная*, калі вытворнае ствараецца для найменння якой-небудзь новай або перайменавання ўжо наяўнай рэаліі (прадмета, дзеяння, прыметы); 2) *канструктыўная*, якая мае сваёй мэтай спрашчэнне сінтаксічнай структуры выказвання і таму вытворнае адрозніваецца ад утваральнай асновы не па значэнні, а па прыналежнасці да іншай часціны мовы; 3) *кампрэсіўная* функцыя, мэтай якой з'яўляецца скарачэнне пэўных намінатыўных адзінак, якія існуюць у мове; 4) *экспрэсіўная*, калі вытворнае ствараецца для выражэння суб'ектыўных адносін моўцы, яго ацэнкі таго, што называецца; 5) *стылістычная*, якая ўключае выпадкі, калі вытворнае слова набывае стылістычную афарбоўку, носьбітам якой выступае словаўтваральны афікс [5, с. 8–12].

Як заўважае М. Д. Сцяпанава, любое вытворнае або складанае слова (незалежна ад яго тыпу) можна прадставіць як згорнутае паведамленне [6, с. 96]. Інакш кажучы, усе вытворныя словы выступаюць у якасці словаўтваральных кандэнсатаў з рознай ступенню кампрэсіі.

Нават павярхоўны разгляд вытворных адзінак розных тыпаў сведчыць пра тое, што ў найбольшай ступені кампрэсіўная функцыя ўласціва абрэвіятурам. Наш зварот да праблематыкі абрэвіятурнага словаўтварэння ў беларускай і англійскай мовах абумоўлены сучаснымі патрабаваннямі лінгвістычнай навукі, якім адпавядаюць даследаванні, прысвечаныя аналізу функцый словаўтварэння, у тым ліку кампрэсіўнай, у параўнальна-супастаўляльным, кагнітыўным і генетычным аспектах [7, с. 5]. Таму супастаўляльнае даследаванне лексічных адзінак розных моўных сістэм – англійскай і беларускай – павінна стаць істотным дапаўненнем да агульнатэарэтычнага апісання кампрэсіўнага словаўтварэння.

У адпаведнасці з прынятым у нашым даследаванні падыходам да абрэвіяцыі як спосабу кампрэсіўнага словаўтварэння заканамерным з'яўляецца разгляд асноўных паняццяў тэорыі словаўтварэння: 1) матываванасці, паколькі значэнне абрэвіятурнага слова заўсёды абумоўлена значэннем матывавальных слоў; 2) словаўтваральнай вытворнасці, заснаванай на магчымасці фармальнага і семантычнага вывядзення ўласцівасцей вытворных адзінак у залежнасці ад асаблівасцей утваральных асноў. У нашым даследаванні неабходна прасачыць рэлевантнасць гэтых паняццяў для разгляду абрэвіятур розных тыпаў у няблізкароднасных англійскай і беларускай мовах.

Уключэнне абрэвіятур у сістэму кампрэсіўнага словаўтварэння адпавядае агульнай канцэпцыі вытворнага слова А. С. Кубраковай, згодна з якой вытворнай з'яўляецца любая другасная, г. зн. абумоўленая іншым знакам або сукупнасцю знакаў адзінка намінацыі са статусам слова незалежна ад структурнай прастаты або складанасці апошняга [8, с. 5]. Гэта дае падставы для абгрунтаванага даследавання адносін словаўтваральнай вытворнасці, якія могуць быць не адлюстраваны фармальна, і размежавання матываваных і матывавальных адзінак.

Падчас свайго ўтварэння скарочаныя лексічныя адзінкі з'яўляюцца матываванымі, паколькі змяшчаюць у сваім складзе фрагменты ўтваральных асноў і тлумачацца шляхам адсылкі да гэтых асноў. Абрэвіятуры характарызуюцца марфалагічнай матываванасцю, якая абумоўлена паўтаральнасцю знакаў у межах марфалагічнай структуры вытворных скарочаных адзінак і назіраецца нават у тых выпадках, калі такімі знакамі з'яўляюцца асобныя літары [8, с. 22]. Матываванасць абрэвіятур абумоўлена ўключэннем у іх структуру розных частак крыніцы матывацыі, ад лінейнай працягласці якіх залежыць магчымасць вывядзення значэння абрэвіятур, што, у сваю чаргу, абумоўлівае ступень матываванасці скарочаных адзінак [9, с. 15].

Што датычыцца ўстанаўлення адносін вытворнасці, то тут неабходна прымаць пад увагу не толькі фармальныя марфалагічныя паказчыкі, але і магчымасць члянення слова на марфалагічным узроўні. Найбольш рэлевантнымі павінны выступаць паказчыкі на ўзроўні словаўтварэння – звесткі пра структурна-семантычныя асаблівасці ўтвораных адзінак. Таму для аналізу адносін словаўтваральнай вытворнасці галоўнае заключаецца ў тым, каб пераканацца ў ажыццяўленні семантычных змен падчас словаўтваральных працэсаў, а таксама акрэсліць іх сутнасць.

Паказчыкам словаўтваральнай вытворнасці выступае менавіта семантычны зрух, які назіраецца ў вытворнай адзінцы шляхам параўнання з утваральнай асновай і заўсёды з'яўляецца карэлятыўным у адносінах да выкарыстанай фармальнай аперацыі дадзенай мовы [8, с. 48]. Параўнанне скарочанай адзінкі з матывавальнай крыніцай можа прывесці да вываду, што семантычны зрух як паказчык вытворнасці тут адсутнічае, паколькі адзначаецца поўная семантычная эквівалентнасць абрэвіятуры і зыходнага поўнага найменння.

На нашу думку, семантычныя змены як паказчык вытворнасці адзначаюцца і тут, хоць семантычнае проціпастаўленне поўнага і скарочанага знакаў можа прымаць розную форму ў залежнасці ад тыпу скарочанай адзінкі. Семантычныя змены падчас абрэвіяцыі не столькі закранаюць перадачу новага значэння ў літаральным сэнсе слова, колькі вядуць да змен у суадносінах экспліцытнай і імпліцытнай перадачы кампанентаў значэння, а таксама да змен у ступені раздзеленасці семантычнага прадстаўлення аднаго і таго ж. Пры ўсёй разнастайнасці тыпаў скарочаных адзінак характэрнай для іх уласцівасцю з'яўляецца пераход ад матываванага найменння да дэматываванага [8, с. 70–71].

Відавочна, што падчас узнікнення абрэвіятур, таксама як і іншых тыпаў вытворных адзінак, адбываецца апора моўцаў на асабісты вопыт і сістэму найменняў пэўнай мовы, г. зн. у дынамічным, працэсуальным аспекце паміж абрэвіятурамі і зыходнымі адзінкамі складваюцца матывацыйныя адносіны [10, с. 322]. Аднак падтрымка матывацыйных адносін скарочаных лексічных адзінак, або захаванне матываванасці абрэвіятур як статычнай уласцівасці ў сістэме вытворных адзінак, паводле З. А. Харытончык, забяспечваецца пэўнымі стратэгіямі ўжывання абрэвіятур у працэсе камунікацыі, што, у сваю чаргу, садзейнічае захаванню вытворнага статусу падобных адзінак у сінхронным плане [10, с. 332].

Як згадана вышэй, абрэвіятурам уласціва марфалагічная матываванасць, якая выразна выяўляецца ў дынамічным аспекце. Паказчыкам вытворнасці абрэвіятур выступае семантычны зрух, што адзначаецца ў вытворнай адзінцы шляхам параўнання з утваральнай асновай і можа прымаць разнастайную форму, якая залежыць ад пэўнага тыпу абрэвіятурнага знака. Гэта палажэнне прадвызначае разгляд абрэвіятур англійскай і беларускай моў у межах адной агульнай тыпалогіі для апісання спецыфікі словаўтваральнай вытворнасці скарочаных лексічных адзінак розных тыпаў.

Пад *словаўтваральным тыпам* надалей будзем разумець асноўную класіфікацыйную адзінку словаўтварэння як сістэмы; адзінку, якая характарызуецца агульнасцю словаўтваральнага значэння ў плане зместу і агульнасцю структурнай схемы (матывавальнае – матываванае) у плане выражэння [11, с. 34]. Як адзначае А. А. Лукашанец, словаўтваральны тып у першую чаргу з'яўляецца абстрактнай схемай, згодна з якой будуюцца словаўтваральна матываваныя словы [12, с. 15].

Не адмаўляючы вартасці існуючых класіфікацый, мы лічым мэтазгодным абапірацца ў сваім даследаванні на аб'яднаную тыпалогію скарочаных слоў, якую на матэрыяле англійскай, нямецкай, французскай і рускай моў распрацаваў А. М. Елдышаў.

Найбольш важкімі крытэрыямі вылучэння асноўных абрэвіятурных тыпаў даследчыку паслужылі структурная прастата або складанасць абрэвіятур і лінейная працягласць кампанентаў слоў, якія вызначаюць будову такіх вытворных адзінак [9, с. 6]. З улікам згаданых параметраў аўтар вылучае тры асноўныя тыпы *абрэвіятур*:

складовыя – скарочаныя адзінкі, якія змяшчаюць рэшткі толькі аднаго слова, не меншыя за двухфанемны склад;

складанаскладовыя – скарочаныя адзінкі, якія змяшчаюць не толькі рэдукаваныя часткі слоў, па лінейнай працягласці не меншыя за двухфанемны склад, але часам і цэлыя словы;

ініцыяльныя – скарочаныя адзінкі, якія абавязкова змяшчаюць пачатковыя гукі і/або літары ўтваральнай асновы або асноў.

Так, с к л а д о в ы я а б р э в і я т у р ы (іншыя тэрміны: усячэнні, усечаныя словы, clippings, stump-words, truncations) адзначаюцца такімі семантычнымі зменамі, якія прымаюць форму маркіравання адрозненняў афіцыйнай, нейтральнай і размоўнай мовы. Згаданая ўласцівасць усячэнняў дазваляе прыйсці да вываду, што паміж поўнымі прататыпамі і адпаведнымі ўсячэннямі прасочваюцца адносіны вытворнасці. Сапраўды, скарочаным адзінкам англійскай і беларускай моў накшталт *tec* (*detective*), *aristo* (*aristocrat*), *phenom* (*phenomenon*), *expat* (*expatriate*), *sax* (*saxophone*); *адмін* (*адміністратар*), *спец* (*спецыяліст*), *клава* (*клавіятура*), *камп* (*камп'ютар*) уласціва набыццё стылістычнай маркіраванасці ў параўнанні з нейтральнымі поўнымі найменнямі.

Найбольш характэрнай рысай с к л а д а н а с к л а д о в ы х а б р э в і я т у р з'яўляецца незалежнасць абрэвіятурнага ўсячэння ад марфемнага дзялення ўтваральных асноў. Абрэвіятуры гэтага тыпу дазваляюць прасачыць глыбокую сувязь паміж мерай экспліцытнасці ў называнні непасрэдна

матывавальных слоў у рамках складанаскарочанага найменння і ступенню раздзеленасці гэтай вытворнай адзінкі. Таму ў выпадках складанаскладовай абрэвіяцыі семантычны зрух паміж утваральнай і вытворнай адзінкамі, па-першае, можа адлюстроўваць новае значэнне ў літаральным сэнсе слова; па-другое, можа зводзіцца да змен у суадносінах паміж экспліцытна і імпліцытна выражанымі кампанентамі значэння. Нягледзячы на дастаткова разнародны структурны характар складанаскладовых абрэвіятур, яны валодаюць здольнасцю служыць адсылкай да крыніцы матывацыі, напрыклад: *decit* (*decimal digit*), *codec* (*coder + decoder*), *telemarketing* (*telephone marketing*), *modem* (*modulator + demodulator*), *medevac* (*medical evacuation*), *журфак* (*факультэт журналістыкі*), *дзяржстрах* (*дзяржаўнае страхаванне*), *Мінфін* (*Міністэрства фінансаў*), *медсанбат* (*медыка-санітарны батальён*).

Ініцыяльныя абрэвіятуры (іншыя тэрміны: initialisms, acronyms, letter-words, графалексічныя скарачэнні) захоўваюць у сваім складзе найменш выражаныя элементы слоў матывавальных словазлучэнняў, таму яны могуць служыць адсылкай да сваіх прататыпаў толькі пры ўмове суадноснай расшыфроўкі. Інакш кажучы, пры ініцыяльнай абрэвіяцыі адбываецца максімальная кампрэсія крыніцы матывацыі, што характарызуе падобныя скарочаныя адзінкі як патэнцыяльна матываваныя. Матываванасць ініцыяльных абрэвіятур з'яўляецца кантэкстуальна абумоўленай, паколькі ўжыванне ў тэксце без апоры на зыходную матывавальную адзінку сведчыць пра пераход такіх адзінак у разрад нематываваных слоў. Семантычнае проціпастаўленне поўнага і скарочанага найменння – ініцыяльнай абрэвіятуры – можа прымаць розныя формы: ад маркіравання прыналежнасці моўцы да пэўнай прафесіянальнай групы і спецыяльнага характару ўжывання да змен у спосабе апісання дэнататаў і ступені раздзеленасці іх семантычнага прадстаўлення.

Праведзены аналіз трох абрэвіятурных тыпаў, уласцівых даследаваным мовам (складовы, складанаскладовы і ініцыяльны), дазволіў выявіць адрозненні, абумоўленыя неаднолькавай прадуктыўнасцю і актыўнасцю тыпаў, а таксама несупадзеннямі ў прадстаўленасці і колькасным складзе структурных мадэлей. У англійскай мове вылучана 20 мадэлей абрэвіятур, у беларускай – 9.

Тып ініцыяльных абрэвіятур характарызуецца найбольшай прадуктыўнасцю ў англійскай і беларускай мовах (адпаведна 68,89 і 70,04 % абрэвіятур), аднак паказчыкі яго актыўнасці вар'іруюцца ад 57,14 % абрэвіятур-неалагізмаў у англійскай мове да 10,97 % – у беларускай. Размеркаванне абрэвіятур гэтага тыпу па мадэлях (3 мадэлі ў англійскай мове і 2 – у беларускай) дазволіла ўстанавіць моўна-спецыфічны характар ініцыяльна-слоўнай мадэлі англійскіх абрэвіятур.

Выяўлена, што складовы тып з'яўляецца найменш прадуктыўным у беларускай мове (складае 0,87 % усіх абрэвіятур і 5,49 % абрэвіятур-неалагізмаў), у той час калі ў англійскай мове гэта другі па прадуктыўнасці тып (19,97 %) з большай актыўнасцю (10,81 %). Сярод 5 прааналізаваных

мадэлей складовай абрэвіяцыі агульнымі для дзвюх моў з'яўляюцца 4 мадэлі (апокапы, аферэзы, сінкопы і гібрыдныя). Мадэль краявых абрэвіятур складовага тыпу, не выяўленая ў беларускай мове, з'яўляецца спецыфічнай для англійскай мовы.

У найбольшай ступені структурныя адрозненні англійскіх і беларускіх абрэвіятур праяўляюцца ў складанаскладовай абрэвіяцыі. Установлена, што англійскія абрэвіятуры гэтага тыпу ўтвараюцца па 12 мадэлях, з якіх 6 з'яўляюцца прадуктыўнымі (мадэлі I_1F_2; I_1I_2; I_1W_2; W_1F_2; W_1F_2, $F_1= I_2$; W_1I_2). У беларускай мове вылучаны 3 мадэлі складанаскладовых абрэвіятур, пры гэтым прадуктыўнасцю характарызуюцца 2 мадэлі (I_1I_2; I_1W_2). Выяўлена, што складанаскладовай абрэвіяцыі ў сучаснай беларускай мове ўласціва значна больш высокая актыўнасць у параўнанні з англійскай мовай (адпаведна 83,53 і 32,05 % абрэвіятур-неалагізмаў).

Такім чынам, будова зыходнай і вытворнай адзінак, а таксама знакавая спецыфіка апошняй вызначаюць тып абрэвіятуры. Улік фармальных аперацый, якія забяспечваюць утварэнне абрэвіятур розных тыпаў па агульных формулах, агульных схемах арганізацыі, дазваляе разглядаць абрэвіятурныя працэсы як мадэляваныя. Разгляд абрэвіяцыі як спосабу кампрэсіўнага словаўтварэння ў англійскай і беларускай мовах сведчыць пра тое, што агульныя словаўтваральныя тыпы абрэвіятур характарызуюцца шэрагам лінгваспецыфічных праяў у кожнай з даследаваных моў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Балли, Ш.* Общая лингвистика и вопросы французского языка / Ш. Балли. – М. : Изд-во иностр. лит., 1955. – 416 с.
2. *Поливанов, Е. Д.* Статьи по общему языкознанию / Е. Д. Поливанов. – М. : Наука, 1968. – 374 с.
3. *Martinet, A.* Éléments de linguistique générale / A. Martinet. – Paris : Armand Colin, 1967. – 216 p.
4. *Виноградов, В. В.* Исследования по русской грамматике : избр. тр. / В. В. Виноградов. – М. : Наука, 1975. – 559 с.
5. *Земская, Е. А.* Словообразование как деятельность: на материале периодической печати, живой разговорной речи, художественной и научной литературы / Е.А. Земская. – 3-е изд. – М. : ЛКИ, 2007. – 224 с.
6. *Степанова, М. Д.* Номинативно-коммуникативная функция словообразовательных конструкций (на материале немецкого языка) / М. Д. Степанова // Язык как коммуникативная деятельность человека : сб. науч. тр. / Моск. гос. пед. ин-т иностр. яз. им М. Тореза. – М., 1987. – Вып. 284. – С. 92–99.
7. *Кубрякова, Е. С.* О новых задачах в изучении функций словообразования / Е. С. Кубрякова // Функцыянальныя аспекты словаўтварэння: тэз. дакл. IX Міжнар. канф. Камісіі па славянскім словаўтварэнні пры Міжнар. камітэце славістаў, Мінск, 9–14 кастр. 2006 г. / адк. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Права і эканоміка, 2006. – С. 5–6.

8. *Кубрякова, Е. С.* Типы языковых значений. Семантика производного слова / Е. С. Кубрякова. – М. : Наука, 1981. – 200 с.
9. *Елдышев, А. Н.* Строение и мотивированность сокращенных слов (к проблеме взаимодействия формально-содержательных признаков в слове) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / А. Н. Елдышев ; Моск. гос. пед. ин-т иностр. языков им. М. Тореза. – М., 1985. – 22 с.
10. *Харитончик, З. А.* О сохранении мотивированности аббревиатур / З. А. Харитончик // Очерки о языке. Теория номинации. Лексическая семантика. Словообразование: избр. тр. / З. А. Харитончик. – Минск : МГЛУ, 2004. – С. 320–334.
11. *Соболева, П. А.* Словообразовательная полисемия и омонимия / П. А. Соболева; отв. ред. В. П. Григорьев. – М. : Наука, 1980. – 295 с.
12. *Лукашанец, А. А.* Словаўтварэнне і граматыка / А. А. Лукашанец; Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа НАН Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2001. – 251 с.

Л. С. Кныш (Мінск)

ДЗЕЯСЛОЎ: НЕКАТОРЫЯ ЦЯЖКАСЦІ ПРЫ НАВУЧАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ
(праз пасярэдніцтва рускай мовы)

Навучанне беларускай мове праз пасярэдніцтва рускай – праца няпростая і карпатлівая. Яна патрабуе ад навучэнцаў не толькі глыбокага засваення тэарэтычных ведаў, але і сур'ёзнай вучэбна-маўленчай практыкі. Неабходна ўлічваць, што моўная сістэма беларускай мовы (як і іншай) уяўляе з сябе складаны механізм, дзе ўзаемадзейнічаюць самыя розныя яго складнікі (фанетыка, лексіка, марфалогія, граматыка, сінтаксіс), якія характарызуюцца цеснымі сувязямі. Іх веданне і авалоданне імі ў канчатковым выніку фарміруе веданне мовы ў цэлым. Варта адзначыць, што ў сістэме рускай і беларускай моў сказ (выказванне) фарміруецца галоўным чынам назоўнікам і дзеясловам (дзеяслоўнымі формамі), астатнія часціны мовы выконваюць другасную ролю. Пры гэтым кожная мова мае свае ўнутраныя правілы і законы. Спынім увагу на канкрэтных прыкладах. Дзеяслоў. Як вядома, гэта адна з найбольш канструктыўных часцін мовы, якая абазначае працэсуальную прыкмету і характарызуецца разнастайнымі формамі і катэгарыяльнымі значэннямі. Дзеяслоў мае 4 формы: інфінітыў, спрагальныя формы, дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе. Значэнне дзеяння выражаецца ў катэгорыях асобы, ліку, часу, ладу, а таксама роду (у формах прошлага часу, умоўнага ладу, дзеепрыметніка), трывання (віду) і стану. Пры вывучэнні дзеяслова цяжкасці ўзнікаюць самыя розныя: спражэнне дзеясловаў і асабовыя

канчаткі, рознаспрагальныя дзеясловы (архаічны тып спражэння), словаўтваральныя мадэлі (прыставачныя і суфіксальныя), асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, дзеясловы з няпоўнай парадыгмай і інш.

У якасці прыкладу можна разгледзець ужыванне дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў і тыя памылкі, якія ва ўмовах білінгвізму надзвычай часта дапускаюць рускамоўныя студэнты. Так, вядома, што дзеепрыслоўе – нязменная форма дзеяслова, якая абазначае дадатковае дзеянне і паясняе асноўнае дзеянне, выражанае дзеясловам-выказнікам. Дзеепрыслоўі незакончанага трывання ўтвараюцца ад асновы цяперашняга часу дзеясловаў I спражэння з дапамогай суфікса ***-учы / -ючы***, ад дзеясловаў II спражэння – з дапамогай суфіксаў ***-ачы / -ячы***: *чытаюць – чыта**ючы**, пішуць – піш**учы**, любяць – люб**ячы**, бачаць – бач**ачы**.* Аднак зрэдку такая мадэль утварэння можа парушацца: ад такіх дзеясловаў, напрыклад, як *баяцца, крычаць, дрыжаць, спаць* утвараюцца формы на ***-учы / -ючы***: *ба**ючы**ся, крыч**учы**, дрыж**учы**, спл**ючы**.* Дзеепрыслоўі закончанага трывання ўтвараюцца ад асновы інфінітыва (або прошлага часу) з дапамогаю суфіксаў ***-ўшы*** (пасля галосных) і ***-шы*** (пасля зычных): *падпісаць – падпіса**ўшы**, прывезці – прывёз**шы**.* Існуюць пэўныя заканамернасці і правілы ўжывання дзеепрыслоўяў, на якія трэба звяртаць увагу пры засваенні гэтай тэмы.

1. Дзеепрыслоўе павінна адносіцца да таго ж суб'екта, што і дзеяслоў-выказнік, які мае значэнне асноўнага дзеяння: *Падпісаўшы заяву, Ніна выйшла з кабінета рэктара.* Нельга ў адным сказе ўжываць дзеепрыслоўе і дзеяслоў-выказнік, якія абазначаюць дзеянні розных асоб або прадметаў. Няправільным будзе сказ: *Здаючы экзамен па мовазнаўстве, у мяне калацілася сэрца і дрыжалі рукі*. Такія сказы прапаноўваецца замяняць на складаназалежныя: *Калі я здаваў экзамен па мовазнаўстве, дык у мяне калацілася сэрца і дрыжалі рукі.*

2. Нельга выкарыстоўваць дзеепрыслоўе ў безасабовых сказах: *Апынуўшыся ў войску, яму здалося, што ён самы няўдалы ў гэтай грамадзе.* Падобныя сказы таксама лепш перабудаваць у складаназалежныя: *Калі ён апынуўся ў войску, дык яму здалося, што ён самы няўдалы ў гэтай грамадзе.*

Выключэнні тут могуць складаць канструкцыі з інфінітывам: *Хораша, стаміўшыся, ляжаць у траве пасля ўтомнай дарогі; На чужы лоб сягаючы, трэба і свой падставіць.*

3. У беларускай і рускай мовах дзеепрыслоўі незакончанага трывання ўтвараюцца з дапамогай розных афіксаў: *чытаючы – читая; думаючы – думая* і г. д. Пад уплывам рускай мовы няправільнымі будуць сказы тыпу *Седзя на беразе ракі, я любаваўся купаламі царквы.* Трэба: *Седзячы…* (а не: *седзя*). Больш таго, у беларускай мове дзеепрыслоўі незакончанага трывання ўтвараюцца практычна ад усіх дзеясловаў, у тым ліку і ад тых, якія ў рускай мове такой формы не маюць: *мыць – мыючы, жаць – жнучы, пісаць – пішучы* і інш. Практыкаванне, выкананае студэнтам-замежнікам, будзе наглядным прыкладам парушэння пэўных нормаў і правілаў утварэння дзеепрыслоўяў у рускай мове (табліца).

Інфінітыў	Дзеепрыслоўі незакончанага трывання	
	Беларуская мова	Руская мова
Мыць	*Мыючы*	*Моя*
Шыць	*Шыючы*	*Шья / шея*
Ліць	*Льючы*	*Лея / лья*
Віць	*Уючы*	*Вья*
Жаць	*Жнучы*	*Жа / Жня*
Пісаць	*Пішучы*	*Пися́*
Рэзаць	*Рэжучы*	*Режа*
Сохнуць	*Сохнучы*	*Сохня*

4. Дзеепрыслоўі з гутаркова-дыялектнай зваротнай часціцай ***-сь*** лічацца ненарматыўнымі. Памылковым будзе сказ: *Развітаўшысь з Максімам, Іван пайшоў дадому.* Трэба: *Развітаўшы**ся** з Максімам, Іван пайшоў дадому.*

5. Дзеепрыслоўе неабходна суадносіць з выказнікам у часе: памылкі ўзнікаюць, калі варта выкарыстоўваць дзеепрыслоўе незакончанага трывання, а ўжываецца дзеепрыслоўе закончанага трывання, ці наадварот: *Ехаўшы ў вёску на канікулы, Сцяпан думаў пра сваю каханую.* Трэба: *Едучы ў вёску на канікулы, Сцяпан думаў пра сваю каханую; Уваходзячы ў клас, Пятрусь сеў за парту.* Трэба: *Увайшоўшы ў клас, Пятрусь сеў за парту.*

Як было адзначана, дзеяслоў з’яўляецца асноўным структурным кампанентам выказвання (сказа). Таму, улічваючы спецыфічныя задачы практычнага навучання рускамоўных студэнтаў маўленчай дзейнасці, варта разглядаць асобныя тыповыя словазлучэнні і канструкцыі з дзеяслоўным кіраваннем, выяўляць іх спецыфіку ў беларускай мове. У якасці прыкладаў тут абавязкова трэба звярнуць увагу на тыя, што істотна адрозніваюцца ў рускай мове, напрыклад: *узяць за жонку – взять в жены*, *выбраць на свой густ – выбрать по своему вкусу*, *чуць на свае вушы – слышать своими ушами*, *бачыць на свае вочы – видеть своими глазами*, *жыць пры бацьках (пры дзецях) – жить с родителями (с детьми)*, *паехаць да сваякоў (сяброў) – поехать к родственникам (друзьям)*, *стаяць пры мікрафоне – стоять у микрофона*, *спатыкнуцца на камень (пень) – споткнуться о камень (пень)*, *ажаніцца (пабрацца) з каханаю (Ганнаю, Валяю) – жениться на любимой (Анне, Валентине)*, *спяваць на тры галасы – петь в три голоса*, *чытаць сам сабе (самому сабе) – читать про себя*, *узбіцца на грошы – разжиться деньгами*, *жыць каля самага мора – жить у самого моря*, *пісаць на адрас – писать по адресу*, *хадзіць па аўдыторыях (пакоях) – ходить по аудиториям (комнатам)*, *праз цябе мы спазніліся – из-за тебя мы опоздали* і інш.

Пры вывучэнні адметных сінтаксічных словазлучэнняў, звязаных сувяззю кіравання, у першую чаргу неабходна акрэсліць тыя, у якіх выражаюцца разнастайныя аб’ектныя адносіны.

Так, дзеясловы руху *ісці, бегчы, ехаць ляцець, плыць* і волевыяўлення *паслаць, адправіць, выправіць*, калі яны маюць мэтавае значэнне, кіруюць назоўнікамі вінавальнага склону з прыназоўнікам ***па***: *ісці па ваду, пайсці па сына, паслаць па дачку, выправіць па прадукты, бегчы па доктара*. Аднак

ужыванне некаторых канструкцый іншы раз залежыць ад кантэксту, напрыклад: *ісці па бацьку* (да суседа), *ісці за бацькам* (крок у крок, услед за ім); *ісці ў арэхі, у грыбы, у ягады, у маліны, у чарніцы, у рыбу* (рус.: *на рыбалку*), але: *паехаць на Камароўку па рыбу, па арэхі*. Тым не менш памылковымі і недарэчнымі будуць калькаваныя з рускай мовы выразы тыпу ***бегчы за***, *пайсці* ***за*** і інш.: *Бацька захварэў, і маці загадала мне бегчы* ***за*** *доктарам у паліклініку*. Услед за ім? ці па яго? Безумоўна, тут трэба *па доктара*. *Бабуля выправіла мяне ў магазін за хлебам*. Трэба: *па хлеб*.

Дзеясловы *дзякаваць, падзякаваць, аддзячыць, выбачаць, прабачаць, дараваць* у беларускай мове спалучаюцца з назоўнікамі і займеннікамі давальнага склону: *дзякаваць настаўніку, аддзячыць начальніку, падзякаваць бацькам, выбачаць ёй, дараваць яму, выбачайце мне.* У рускай мове дзеясловы гэтай групы ўтвараюць словазлучэнні з вінавальным склонам: *изините меня, благодарить учителя, простить друга, благодарить их.*

Неабходна кантраляваць маўленне студэнтаў пры парушэнні нормаў і не дапускаць калькаваных канструкцый, такіх, як: *дзякаваць яго, выбачайце мяне, падзякаваць сябра, выбачаць яе* і г. д.

Дзеясловы думкі, пачуцця, маўлення *гаварыць, думаць, турбавацца, хвалявацца, непакоіцца* звычайна кіруюць назоўнікамі вінавальнага склону з прыназоўнікам ***пра***: *гаварыць пра небяспеку, клапаціцца пра дзяцей, турбавацца пра бабулю, непакоіцца пра дачку.* Канструкцыі тыпу *клапаціцца аб дзецях, гаварыць аб бацьках, думаць аб сяброўцы* і інш. калькаваныя з рускай мовы, дзе пры дзеясловах гэтай семантычнай групы залежнае слова мае форму меснага склону з прыназоўнікам ***о*** (***об***): *говорить о сестре, думать о матери, беспокоиться об учениках.*

Дзеясловы *жартаваць, цешыцца, дзівіцца, смяяцца, насміхацца, здзекавацца, кпіць* ужываюцца з назоўнікамі роднага склону з прыназоўнікам ***з***: *жартаваць з сяброўкі, цешыцца з кацяня, кпіць з сябра, смяяцца з дзіцяці.*
Аддзеяслоўныя назоўнікі *жарты, кпіны, здзекі, смешкі, жарты, смех* маюць такое ж прыназоўнікавае кіраванне: *кпіны з дачкі, смех з дзіцяці, здзек з хлопца, жарты з яго* і інш. Параўнайце з рускай мовай: *смеяться над мальчиком, шуточки над ним, издевательство над животным* (творны склон + прыназоўнік ***над***).

Памылковымі будуць у беларускай мове такія словазлучэнні, як *хварэць грыпам, хворы тыфам, захварэць адзёрам* і пад. Дзеясловы *хварэць, захварэць*, а таксама прыметнік *хворы* ў беларускай мове патрабуюць формы вінавальнага склону назоўніка з прыназоўнікам ***на***: *хворы на сухоты, захварэць на шкарлятыну, хворы на адзёр, захварэць на грып.*

Неабходна засцерагаць і ад такіх зрусіфікаваных штучных канструкцый і выразаў (не толькі дзеяслоўных): *Ён выбраў спартыўны касцюм па свайму росту.* – Трэба: *пад свой рост*; *Гэты касцюм аказаўся вялікі па памеры*. – Трэба: *вялікі памерам*; *Пятро Іванавіч з'яўляецца загадчыкам кафедрай*. Трэба: – *загадчыкам кафедры*; *Яна вельмі глядзела за сабой*. – Трэба: *глядзела сябе*; *Мы атрымалі чатырохпакаёвую кватэру*. – Трэба: *кватэру на чатыры пакоі*; *Мікола падрос і станавіўся гаспадаром*. – Трэба: *браўся на гаспадара*; *Каця правучылася ва ўніверсітэце больш трох*

гадоў, але не закончыла яго. – Трэба: *больш за тры гады*; *Сцяпан быў разумней усіх у групе*. – Трэба: *разумнейшы за ўсіх; Мы набылі неабходныя падручнікі па новаму прадмету.* Трэба: *па новым прадмеце* і інш. (з вуснага маўлення студэнтаў).

Адзначаныя прыклады з'яўляюцца толькі нязначнай часткай праграмы па граматыцы ў цэлым, практычнае засваенне чаго тым не менш забяспечвае іншаземным студэнтам больш гнуткае выкарыстанне беларускай мовы ў тых межах, якія адпавядаюць іх канкрэтным мэтам навучання.

Н. П. Лобань, А. М. Фендзіч (Мінск)

КАНАТОНІМ *КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ* Ў КАНТЭКСЦЕ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ

Прынесці жыццё ў ахвяру Радзіме –
гэта не сумны канец для чалавека.
Гэта – яго неўміручасць!
П. Карнэль. Сід

Онімы заўсёды займалі важнае месца ў будове мастацкага твора. Семантыка оніма – галоўная крыніца інфармацыі як пра героя (яго сацыяльнае становішча, характар, асноўныя рысы асобы), так і пра лінгвакультурную мастацкую прастору. Таму, як адзначаюць многія даследчыкі, у мастацкіх творах фактычна няма нейтральных, стылістычна неафарбаваных імён, а ўсё часцей сустракаюцца сэнсавыя, стылістычна афарбаваныя онімы.

У творах мастацкай літаратуры онім часта адыгрывае настолькі важную ролю, што перастае быць маркерам толькі аднаго персанажа, а набывае сацыяльна-культурную значнасць. У літаратурнай прасторы сэнсавы онім, які актуалізуе асабовае імя і напаўняе яго канатацыйнай афарбоўкай, з'яўляецца сімвалам народнай самасвядомасці.

Апошнім часам можна назіраць цікавасць да вывучэння асаблівасцей функцыявання онімаў у мастацкіх творах, але роля і функцыі *канатонімаў* застаюцца недаследаванымі. Аб'ектам дадзенага даследавання з'яўляюцца творы мастацкай літаратуры розных жанраў, прадметам – канатонімы, якія ўваходзяць у сацыяльна-культурную прастору беларускага народа.

Цяжка, а можа і зусім немагчыма, знайсці ў Еўропе краіну, у якой не было б прызнанага ўсім народам нацыянальнага героя. Ва Украіне – Багдан Хмяльніцкі, у Польшчы – Тадэвуш Касцюшка, у Чэхіі – Ян Гус і г.д. Няма ніякага сумневу, што ва ўсе гістарычныя эпохі ў нашага народа таксама былі асобы, годныя найвышэйшага звання нацыянальнага героя. З поўнай упэўненасцю можна сказаць, што такой выбітнай асобай быў кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Польшчы, Літве і Беларусі 1863 – 1864 гг. *Кастусь Каліноўскі* – перакананы носьбіт беларускага духу. Разам са сваімі паплечнікамі ў неверагодна цяжкіх умовах ён здзейсніў выданне першай у нашым

краі беларускай газеты «Мужыцкая праўда», выступаў за стварэнне школы на роднай мове, лічыў, што яна павінна дамінаваць і ў царкоўна-рэлігійным жыцці, з чым тады не пагаджаліся ні праваслаўная, ні рымска-каталіцкая канфесія.

Да вобраза беларускага рэвалюцыянера-дэмакрата пісьменнікі ў сваёй творчасці звярталіся неаднойчы і, трэба адзначыць, звяртаюцца да яго і дагэтуль. Сёння можна казаць пра вялікую анталогію празаічных і вершаваных (У. Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім; М. Машара. Смерць Кастуся Каліноўскага; А. Куляшоў. Хамуціус; А. Вольны. Кастусь Каліноўскі; А. Жамойцін. Кастусь Каліноўскі; А. Бачыла. Думы Каліноўскага; А. Дудар. Кастусь Каліноўскі; Я. Падабед. Ён спіць; П. Броўка. Кастусь Каліноўскі; В. Маракоў. Чуеш, Беларусь?; А. Разанаў. Арышт Кастуся Каліноўскага; С. Законнікаў. Кастусь Каліноўскі), драматычных твораў (Е. Міровіч. Кастусь Каліноўскі; У. Караткевіч. Кастусь Каліноўскі), прысвечаных Каліноўскаму.

Упершыню ў мастацкай літаратуры вобраз Кастуся Каліноўскага з'яўляецца ў творах рускага пісьменніка У. Крастоўскага, які ведаў паўстанца па сумеснай вучобе ў Пецярбургскім універсітэце. У сваіх раманах «Панургово стадо» і «Две силы» з дылогіі «Кровавый пуф» (1869–1875) аўтар вывеў змагара цэнтральным героем пад іменем *Васіля Світкі*. Кіраўнік паўстання на Беларусі надзелены ўсімі характэрнымі атрыбутамі рамантычнага героя: таямнічасцю, авантурнасцю, эгаістычнымі памкненнямі, усюдыіснасцю і ўсёведаннем, пастаяннымі пераўвасабленнямі і зменай абліччаў. Аднак у сваіх творах, напісаных з прарасійскіх шавіністычных пазіцый, У. Крастоўскі імкнуўся ачарніць мэты паўстання 1863 г., зняважыць вобразы яго кіраўнікоў і ўдзельнікаў ды паказаць, што паўстанцы былі пакараны справядліва [1, с. 80].

Актыўная распрацоўка вобраза К. Каліноўскага ў беларускай мастацкай літаратуры распачалася толькі ў 20 г. XX ст. Менавіта ў гэты час беларуская нацыянальная ідэя перажывала перыяд свайго станаўлення, і ў грамадстве адчувалася вострая патрэба ў стварэнні ўласнага нацыянальнага міфа. Вобраз Кастуся Каліноўскага ў творах беларускіх пісьменнікаў успрымаецца парознаму, але ўсюды прасочваецца адна думка: К. Каліноўскі – змагар за волю і долю народа [2, с. 130].

Паступова К. Каліноўскі пачынае ўспрымацца змагаром не столькі за волю і долю народа, колькі за Беларусь і беларушчыну. На глыбокае асэнсаванне яго ролі ў гісторыі і грамадскім жыцці Беларусі асабліва моцна паўплываў У. Караткевіч. І найперш сваім раманам «Каласы пад сярпом тваім», а таксама п'есай «Кастусь Каліноўскі. Смерць і неўміручасць». Менавіта ў гэтым гістарычным рамане пранікнёна ўвасоблены вобраз Каліноўскага. А ў п'есе У. Караткевіча канфлікты (сацыяльны і нацыянальны) дапоўнены любоўнай калізіяй. Драма вызначаецца філасофскім зместам, інтэлектуальным напаўненнем, рамантычнай акрыленасцю ідэі. Сам К. Каліноўскі паказаны ў творы як *утрапёны фанатык; чалавек каменнай волі, вялікага розуму, таленту; таленавіты арганізатар, ваявода, публіцыст; і ваявода, і трасца, і хвароба… і паэт… і акадэмік, і герой.*

Тэма паўстання 1863–1864 гг. закранаецца таксама ў паэме М. Машары «Смерць Кастуся Каліноўскага», дзе галоўны герой з'яўляецца *дыктатарам; бунтаром; Літвы-дыктатарам; патомкам слаўных крывічоў; мяцежнікам дзікім; абаронцам мужыка; дыктатарам хамаў і рабоў; народу верным сынам* і інш.

Ва Усходняй Беларусі пра Кастуся ўспомнілі ў гады Другой сусветнай вайны. Мабыць, усе са школьных хрэстаматый добра памятаюць верш П. Броўкі, які пачынаўся радкамі: *На Беларусі па вёсках ідуць пагалоскі, з'явіўся Кастусь Каліноўскі*. Кастусь Каліноўскі ў вершы – збіральны вобраз блакітнавокага партызана-антыфашыста, мсціўца, які з'яўляўся ў самых нечаканых месцах і нёс акупантам заслужанае пакаранне. І імя Каліноўскага не было пустым гукам [2]. У вершы П. Броўкі «Кастусь Каліноўскі» імя паўстанца развівае наступныя канатацыйныя значэнні: *– І чуе ён голас народны,// Бацькоўскі:// – Ты,* ***сын мой геройскі****, Кастусь Каліноўскі!,* а таксама *хлопец Каліна; герой.*

Паўстанца-рэвалюцыянера ў сваіх творах пісьменнікі ідэнтыфікуюць найменнямі, якія па сваёй структуры і сэнсе з'яўляюцца перыфразамі: *барацьбіт за долю бедных і прыгнечаных; патомак слаўных крывічоў; абаронца мужыка; рыцар свабоды; народу верны сын; абаронца працоўных; Беларусі лепшы сын.*

Можна сцвярджаць, што гістарычная постаць славутага паўстанца трывала замацавалася ў культурным каноне Беларусі і ў цэлым мае станоўчую канатацыю. У творах розных аўтараў Кастусь Каліноўскі – *паўстанец-мужык; русы хлопец; атаман; магутны, горды волат; сын геройскі; суровы і смелы, як сокал; хлопец Каліна; дыктатар; бунтар; Літвы-дыктатар; мяцежнік дзікі; барацьбіт; русавалосы малады затворнік; Яська-гаспадар з-пад Вільні* і інш.

Зразумець матывы ўчынкаў, разгадаць пэўную загадку асобы кіраўніка паўстання складана. Каліноўскі ў нечым быў «тыповым чалавекам» сваёй эпохі («такім, як усе»), у нечым быў такім, як некаторыя, а ў нечым – не падобным ні на каго. Грунтоўнае разуменне асобы ў спалучэнні з даследаваннем дзейнасці Кастуся Каліноўскага – гэта рэальны шлях да навуковага асэнсавання ягонага месца ў беларускай гісторыі.

На жаль, патрыятычнае выхаванне на нацыянальных каштоўнасцях і традыцыях беларускага народа ў 30–70-я гады XX ст. у сферы адукацыі і справавой сферы было зведзена да нуля, што яскрава адбілася на фактах тапанімікі. Мала ў нас найменняў, звязаных з імёнамі дзеячаў старажытнай беларускай культуры, навукі, асветы: *Ф. Скарыны, К. Тураўскага, С. Полацкага, К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, І. Дамейкі, Э. Пякарскага, М. Доўнар-Запольскага, В. Дуніна-Марцінкевіча* і іншых. Пра гэта, напрыклад, вельмі пераканальна пісаў К. Тарасаў у нарысе «Заезная карчма»: «Вуліцы Грунвальдскай у нас няма нават у тых гарадах, якія пасылалі сваіх сыноў на бітву з тэўтонцамі. Не існуе і вуліцы *Лышчынскага*. Хіба ж мысліцель не заслужыў? А хто бачыў на дамах шыльдачкі з імёнамі *Афанасія Філіповіча, Усяслава Чарадзея, Давыда Гарадзенскага, князя Альгерда, Канстанціна*

Астрожскага, Андрэя Полацкага? Імя *Глінкі* ўшанавана ў назвах вуліц дзевяці беларускіх гарадоў, а вось *Манюшка* забыты нават у Мінску, дзе ён нарадзіўся і ствараў музыку, дзе, дарэчы, жылі ўсе пакаленні ягоных продкаў…» [3, с. 191].

ЛІТАРАТУРА

1. *Сорокин, Ю.* К историко-литературной характеристике антинигилистического романа: дилогия Вс. Крестовского «Кровавый пуф» / Ю. Сорокин. – М., 1947. – С. 79–87.
2. *Гетман, І. У.* Вобраз К. Каліноўскага ў заходнебеларускай літаратуры / І. У. Гетман // Паўстанне 1863 года і яго гістарычнае значэнне : матэрыялы міжнар. навук. канф., 10–11 кастр. 2003 г., Брэст. – Брэст, 2004. – С. 128–133.
3. *Тарасаў, К.* Памяць пра легенды : Постаці беларускай мінуўшчыны.– 2-е выд., дап. – Мінск : Полымя, 1993. – 270 с.

Н. Г. Пятигор (Минск)

АССОЦИАТИВНЫЙ МЕТОД ОБУЧЕНИЯ ИНОСТРАННОМУ ЯЗЫКУ

Ассоциативный метод обучения иностранному языку известен также как «метод подсказки» или «метод словарного ключа». Ассоциации основаны, главным образом, на раздражителях, воспринимаемых органами чувств, которые вызывают определенные мысли. В процессе обучения строятся ассоциации, в которых лексические единицы, цифры, формулы связываются с определенными словами, картинками, знаками, переживаниями.

Преимущество ассоциативного метода обучения обусловлено тем, что человек обладает огромной силой воображения. Его разум в состоянии представить себе разнообразные вещи. В голове могут возникать картины, не существующие в реальном мире, которые связываются с дру-гими предметами.

При ассоциативном методе обучения не устанавливается никаких границ для фантазии, поскольку для обучающегося ассоциации являются логичными и осмысленными. Например, слова родного языка могут подставляться в предложение рядом со словами иностранного. Эти предложения порождают в сознании определенные картинки и устанавливают связь обоих слов. Простыми ассоциациями для английских лексем могли бы быть, например, следующие предложения.

Uhr – clock: «Um sieben **Uhr** hört man die **Klock** (clock)»;

trocken – dry: «In der Dose liegen **drei** (dry) **trocken**e Kekse»;

Auto – car: «Im **Auto** sitzt ein ***Kar*** *(car)* **–**pfen».

Приведенные примеры свидетельствуют, что в начале ассоциативной цепочки находится звуковая оболочка иноязычной лексемы, воспринимаемая обучающимся, которая совпадает со звучанием слова родного или уже известного языка.

При ассоциативном методе обучения могут широко использоваться исходные слова из различных областей окружающей реальности:

• имена друзей, знакомых, коллег по работе, героев фильмов, известных личностей и т.п. Например, немецкая фраза ***Wie geht`s?*** ‘Как дела?’ может ассоциироваться с именем *Билл Гейтс*;

• названия городов, стран, курортов, памятных мест, рек и т.п. Например, ассоциацией для формы причастия II *ge**gang**en* немецкого глагола ***gehen*** ‘идти’ послужит название главной реки Индии *Ганг* и исключит ошибки в изменении корневой гласной; слово ***Räuber*** ‘разбойники’ ассоциируется с названием спортивно-оздоровительного комплекса под Минском: *In Raubitschi wohnen keine **Räub**er*;

• названия символов, учреждений, памятников и т.п. Например, лексема ***Käse*** ‘сыр’ ассоциируется у жителей Минска с названием концертного зала «Минск»: *Im Büfett vom КЗ kann man guten **Käse** essen*;

• названия продукции, известных фирм, марок и т.п. Например, глагол ***laden*** ‘грузить, загружать’ автоматически напоминает название популярной марки советского автопрома «*Лада*»: *Ich muss meinen Lada **lad**en*;

• цифры или буквы. Например, ассоциация лексемы *der Elf* ‘эльф’ и цифры *elf* ‘одиннадцать’ очевидна: ***Elf Elf**en sind im **Elf**enhaus*;

• названия цветов или сокращения. Например, в предложении ***Orangen** essen wir gern* легко провести связь между названием цвета (*оранжевый*) и фруктом ***Orangen*** ‘апельсины’;

• придуманные слова. Например, немецкий военный термин ***Hockloch*** ‘ячейка для стрельбы с колена’ ассоциируется со словом *хохлик* (слегка подвыпивший человек): *Ohne **Hockloch** kann хохлик das Ziel nicht treffen*;

• слова диалектов или сленгов. Например, немецкая лексема ***prickeln*** ‘щипать, щекотать’ вызывает ассоциацию с молодежным эпитетом *прикольный*: *Der mich **prickelt** ist nicht*.

Включение преподавателем незнакомых лексем в иноязычное высказывание побуждает обучающихся догадываться о значении нового слова по его звуковой оболочке. Если звуковое оформление незнакомого иноязычного слова совпадает со звучанием слова из родного или известного языка, то обучающийся пытается угадать смысловое содержание воспринятой лексической единицы, причем сделать он это должен на изучаемом языке. Особенно интересно данное задание в смешанных группах студентов из разных стран, поскольку они являются представителями различных культур и мировосприятия и устанавливают совершенно своеобразные ассоциативные связи. В заключение подводится итог и называется победитель, т.е. студент, точнее всех определивший правильное значение нового слова.

При использовании преподавателем ассоциативного метода в процессе обучения иностранному языку обучающиеся приобретают устойчивые навыки выполнения предлагаемых заданий. Для групп с более продвинутым уровнем знаний и навыков существует ряд усложненных заданий на нахождение ассоциаций. Например, задание «Двойная ассоциация» предполагает

нахождение не одной, а двух ассоциаций на заданное слово. Суть данного упражнения состоит в том, чтобы второй участник нашел к исходному слову ассоциацию, но, не называя ее, придумал уже к своей ассоциации еще одну и назвал последнюю следующему участнику, который, в свою очередь, угадывает и называет слово посередине, т.е. ту ассоциацию, которую не назвал второй участник. Это должно выглядеть примерно следующим образом:

die Tür – *der Schlüssel* – die Tasche (дверь – *ключ* – сумка).

В данном примере последний участник угадывает неозвученную ассоциацию – слово *der Schlüssel.*

Еще один пример: die Katze – ... – das Zimmer (кошка – ... – комната). Вторым ассоциативным словом было слово *das Sofa* ‘*диван*’

Своеобразной подсказкой в толковании незнакомых лексических единиц являются знания обучающихся об основных грамматических признаках разных частей речи изучаемого языка. Отличным примером может служить хорошо известная лингвистам фраза *Гло́кая ку́здраште́ко будлану́ла бо́кра* и *курдя́чит бокрёнка*, где, независимо от лексического значения, четко прослеживаются имена существительные и прилагательные (их род, число, падежи), глаголы и т.д.

Использование ассоциативного метода на занятиях иностранного языка позволяет быстро и прочно запомнить новые лексические единицы. Кроме того, обучающийся учится учиться, т.е. самостоятельно применять метод при запоминании иноязычной лексики.

Следует отметить, что наряду с ассоциацией как таковой, т.е. как мы ее понимаем и толкуем, существует понятие *биссоциация*, предложенное А. Кестлером в книге «Акт творчества», означающее творческий процесс связи понятий, картин или представлений из различных понятийных сфер отношений [1]. Сегодня это ключевое понятие в исследовании как природы творчества, так и природы юмора, отражающее прорыв мыслительной рутины, креативность. В то время как ассоциация обозначает мысленную связь между словами одной сферы, т.е. так называемую линейную связь понятий, биссоциация объединяет обычно понятия из двух независимых друг от друга областей, т.е. многоуровневую связь понятий, и предполагает парадоксальное столкновение различных, не взаимосвязанных понятий.

Данное креативное связывание может привести к трем различным находкам.

1. Комизм: объединение двух совершенно не зависимых друг от друга вещей может вызвать комичный эффект. Это четко прослеживается в народном творчестве, а именно в анекдотах, где необычная реакция или выход из ситуации и является примером биссоциации:

Начальник обращается к секретарше: «Напишите сверху “совершенно секретно”. Я хочу, чтобы эту информацию прочитали все сотрудники нашего офиса». Биссоциация: «совершенно секретно – заинтересованность/ любопытство сотрудников – всеобщее ознакомление с документом». Если

сравнить с обычной ассоциацией, то получим такую цепочку: «совершенно секретно – информация закрыта – читать запрещено».

2. Познание/открытие: столкновение двух до сих пор совместно не упоминавшихся элементов может привести к удивительному результату.

Типичным примером биссоциации является открытие греческого мыслителя Архимеда, как известно, занимавшегося вычислением объема короны. Когда он принимал ванну (кстати, то же самое наблюдали десятки тысяч человек), то вода вылилась через край в таком объеме, какой и составляло тело ученого, помещенного в ванну. Архимед понял, что, поместив корону в мерную емкость с водой, можно легко узнать объем короны. Посредством биссоциации в точке пересечения сфер физики и ухода за телом был найден физический закон.

Немецкий химик Ф. А. Кекуле увидел во сне змею, укусившую себя за хвост. Проснувшись, он придумал кольцевую модель формулы бензола, которая приобрела для всей органической химии выдающееся значение. По словам изобретателя, он всегда сводил вместе то, что не относится друг к другу, наподобие мужа, который, найдя свою жену в объятиях епископа, поспешил к прихожанам и, благословляя их, сказал: «Если епископ занял мое место, то я займу его место».

3. Понимание: совместное употребление может привести к более глубокому пониманию контекстуальной причинной связи.

В исследованиях природы юмора основной акцент падает на первый аспект: юмор и комизм возникают при столкновении различных сфер и областей.

Некоторые соображения в исследованиях природы творчества привели к предложениям по их непосредственному использованию. Причем биссоциация стала методом, который осознанно соединяет друг с другом понятия и объекты, не подходящие один к другому согласно обычному рутинному мнению. Семантическая интуиция является образцом данного метода.

Приведем пример использования креативных техник.

1. Группа рассматривает пять картин, которые не имеют ничего общего с какой-либо определенной проблематикой. К примеру, это могут быть предметные или абстрактные картины известного художника.

2. Каждый участник пытается найти ассоциацию между заранее предложенной постановкой вопроса и аспектами/фрагментами картин и записывает вызванные картинами идеи.

3. По окончании идеи собираются и обсуждаются.

Необходимо подобрать картины/фото таким образом, чтобы они были интересными для обучающихся и могли вызвать ассоциации. Вместе с тем они должны быть как многогранными, так и очерчивать в общем плане конкретную проблему. Рекомендуется перед заданием на ассоциации предложить участникам сделать несколько расслабляющих либо побуждающих к оживлению упражнений. Именно на второй фазе, когда речь идет о соединении ассоциаций с ранее поставленной проблемой, может получиться весьма комичный результат. Участники должны стремиться построить

необычные высказывания. Подобно опыту проведения «мозгового штурма», выясняются необычные и нетрадиционные предложения, из которых, в конечном счете, и развиваются лучшие идеи.

Например, участникам могут быть предложены изображения курортного острова, садов, моря, цветов, пейзажей. Проблемой, с которой нужно найти ассоциации по изображениям, является *работа*. Цепочка биссоциации может быть следующей: море – остров – пейзажи – цветы – сады – садовник – работа.

Метод может быть очень эффективным и приносить огромное удовольствие обучающимся. Во всяком случае, основным условием его эффективности является активное участие всей группы в процессе проведения ассоциаций. Тайна успеха метода биссоциации состоит в том, что посредством задания по установлению связи между ассоциацией и исходной темой в известной степени становится неестественным отказаться от приемов мышления, которые обычно выбираются при обсуждении проблемы. На этом основании представляется особенно важным проведение ассоциаций к картинам, максимально отдаленным от заявленной проблемы.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Koestler, A.* Der göttliche Funke. Der schöpferische Akt in Kunst und Wissenschaft Scherz / A. Koestler. – Bern; München; Wien, 1966. – S.212.

Н. П. Старавойтава (Мінск)

МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ЯК ЗАМЕЖНАЙ З ДАПАМОГАЙ СКАЙПУ

Валоданне замежнымі мовамі ў сучасным свеце ўжо даўно сталася неабходнасцю, паколькі менавіта такім чынам мы атрымліваем значную колькасць інфармацыі, што дае мажлівасць лучнасці, не абмежаванае моўнымі бар’ерамі. Выкладанне беларускай мовы як замежнай (БМЗ) ва ўмовах інавацыйнай мадэлі адукацыі патрабуе арганізацыі не толькі інтэрактыўнага навучання, скіраванага на развіццё інтэлектуальных і творчых здольнасцяў студэнтаў, але і насамперад мабільнага і камфортнага, якое адпавядала б запатрабаванням нашага дынамічнага, «інтэрнэт-спрэсаванага» часу. Такім можа быць выкладанне мовы анлайн, да прыкладу, у *Скайпе*, што ёсць цудоўным трэнінгам слыхавога ўспрымання, эканоміяй на падручніках, сходнымі суадносінамі кошту ды якасці і аптымальным вырашэннем для тых, хто ідзе ўпоравень з часам і выразна плануе свой графік. На жаль, практыка выкладання БМЗ у традыцыйным выглядзе не настолькі шырокая, каб весці актыўную гаворку пра анлайн-навучанне, аднак, мажліва, менавіта магчымасць «вывучаць мову дома, не выязджаючы са сваёй краіны» і прывабіла б замежных навучэнцаў зрабіць першы крок да знаёмства з беларускай мовай

і Беларуссю. Уласна гэтымі мэтамі мы і кіраваліся пры арганізацыі курсаў БМЗ на факультэце міжнародных бізнес-камунікацый БДЭУ, у якіх прадугледзілі і *скайпавую* форму навучання, што пакуль знаходзіцца на стадыі распрацоўкі[1].

Разгледзім агульную структуру заняткаў у Скайпе. Методыка выкладання моваў анлайн крыху адрозніваецца ад традыцыйнай і найперш тым, што выкладчык павінен выдатна валодаць інфармацыйнымі тэхналогіямі, у прыватнасці, добра арыентавацца ў магчывасцях Скайпу (акрамя функцыі чата). Перад пачаткам заняткаў выкладчык дасылае слухачу ўсе неабходныя навучальныя матэрыялы, што будуць выкарыстаныя ў працэсе навучання: гэта могуць быць электронныя падручнікі, розныя метадычныя распрацоўкі, гульні, дыялогі, кнігі да чытання, аўдыякнігі, разнастайныя аўдыя- і відэафайлы ды іншае, у залежнасці ад мэтаў і ўзроўню навучэнца. Варта адзначыць, што лепш за ўсё рыхтаваць да кожных заняткаў адзін асобны PDF-файл, каб слухач не блытаўся ў вялікай колькасці матэрыялаў, а мог засяроджана працаваць з адным кампактным файлам.

П е р а д п а ч а т к а м з а н я т к а ў выкладчык тэлефануе слухачу ў Скайпе. Наяўнасць навушнікаў і мікрафона як у анлайн-рэпетытара, так і ў студэнта значна паляпшае якасць сувязі. П а д ч а с з а н я т к а ў у Скайпе ажыццяўляецца трэнінг усіх аспектаў мовы.

- Чытанне. Студэнты чытаюць навучальныя тэксты і мастацкую літаратуру (творы класікаў і сучасных беларускіх аўтараў), абмяркоўваюць прачытанае з выкладчыкам, выконваюць практыкаванні на выманне канкрэтнай і агульнай інфармацыі з тэксту і адпрацоўваюць новую лексіку і канструкцыі. Дадзены аспект таксама ўключае чытанне сучасных інтэрнэт-выданняў і навінаў на мове арыгінала.
- Слуханне мае на ўвазе развіццё навыкаў разумення беларускай мовы на слых. На кожных занятках студэнты выконваюць практыкаванні на праслухоўванне невялікіх дыялогаў ці атрымліваць асалоду ад музыкі, адначасова ўстаўляючы адсутныя словы ў тэкст песняў. Таксама яны могуць глядзець урыўкі са стужак і невялікія відэасюжэты з наступнай адпрацоўкай праслуханага. Дарэчы, выкладанне мовы ў Скайпе – гэта адна з разнавіднасцяў аўдыявання.
- Пісьмо. У працэсе вывучэння беларускай мовы анлайн важнае месца займае і адпрацоўка пісьмовых навыкаў. Дадзены аспект практыкуецца паразнаму ў залежнасці ад мэтаў вывучэння мовы. Для тых, хто вывучае беларускую мову агулам, гэты від працы арганізаваны ў выглядзе напісання твораў і эсэ, а таксама лістоў і іншых пісьмовых паведамленняў, што людзі выкарыстоўваюць у паўсядзённым жыцці. Пры вывучэнні бізнес-мовы акцэнт робіцца на напісанні справавых лістоў рознага характару (ад афіцыйнага ліста партнёру і да справаздачы па развіцці продажаў кампаніі).

[1] http://www.bseu.by/russian/courses/belarusianAsForeignBy.htm
http://www.bseu.by/russian/courses/belarusianAsForeignRu.htm
http://www.bseu.by/english/courses/belarusianAsForeignEn.htm

▪ Гаварэнне. Каб пераадолець моўны бар’ер і цалкам авалодаць беларускай мовай, як і нейкай іншай, неабходна размаўляць, размаўляць і размаўляць. Галоўная мэта БМЗ у Скайпе – гэта навучыць замежнікаў свабодна размаўляць на мове. Выкананне на занятках розных маўленчых заданняў будзе стымуляваць іх да зносінаў і спрыяць развіццю маўлення (дэбаты, абмеркаванні стужак, выказванне меркавання паводле прыказак ды прымавак, афарызмаў знакамітых людзей і шмат што іншае).

П а з а к а н ч э н н і з а н я т к а ў выкладчык адпраўляе студэнту хатняе заданне ў электронным выглядзе на пошту ці ў Скайпе. Карэктыроўка адбываецца за адзін дзень да пачатку наступных скайп-заняткаў: студэнт дасылае выкананае заданне свайму выкладчыку на электронную пошту. Выкладчык выпраўляе або падкрэслівае памылкі дзеля таго, каб у пачатку наступных заняткаў абмеркаваць і выправіць іх разам са студэнтам.

Увогуле ж, не трэба забывацца, што Скайп – гэта ўсяго толькі сродак сувязі, які скарачае адлегласць. Таму методыка выкладання замежнай мовы ў Скайпе ўзяла шмат ад традыцыйнай методыкі. Агульныя падыходы досыць простыя, розніца – у выкарыстанні тэхналогій. У залежнасці ад слухача і ягоных мэтаў фармулюецца мэта заняткаў. Потым выкладчык глядзіць, якія матэрыялы для гэтага патрэбныя, і вырашае, якія тэхналогіі могуць дапамагчы гэтую задумку ўвасобіць на практыцы. Скайп – гэта тэлефон. Калі далучыць тэкставы чат – гэта дошка. Калі даслаць файл – гэта постар альбо наглядны дапаможнік, картка альбо карцінка. Размаўляць і тлумачыць усё можна гэтак жа, як у звычайнай аўдыторыі. Усё, што мы напісалі б на дошцы, – пішам тэкстам. Калі трэба праілюстраваць – дасылаем файл ці спасылку. Можна пашукаць тэхналогіі, якія дазваляюць паказваць PowerPoint, што вельмі добра заахвочвае навучэнцаў. Акрамя Скайпу трэба ўласна навучальныя матэрыялы, што бываюць вельмі розныя, а таксама тэхналогіі і сродкі іх максімальна эфектыўнага задзейнічання. Калі чалавеку трэба з дзясятак кансультацый, то Скайпу са звычайнай поштай для дасылання файлаў будзе больш як дастаткова. А калі займацца сістэматычна, дык трэба ўжо ствараць навучальную віртуальную сістэму і напаўняць яе інтэрактыўнымі матэрыяламі, зместам – а гэта ўжо досвед не аднаго года выкладання. Напачатку выкладання беларускай мовы ў Скайпе вельмі карыснымі для выкладчыка будуць адпаведныя відэазаняткі на YouTube па іншых замежных мовах, якія дапамогуць зарыентавацца і выбудаваць уласную канцэпцыю працы.

Спадзяёмся, што выкладанне БМЗ у Скайпе будзе развівацца ў нашай краіне і зробіцца папулярнай формай камунікацыі паміж беларусамі ды беларусістамі Беларусі і замежжа, што паспрыяе пашырэнню сфераў уплыву беларускай мовы і ў метраполіі.

А. В. Строк (Лімерык, Ірландыя)

АСЭНСАВАННЕ ШЛЯХОЎ ВЫРАШЭННЯ ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МОВЫ Ў ІРЛАНДЫІ ЯК КРЫНІЦА ІДЭЙ ДЛЯ ПАЛЯПШЭННЯ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Tír gan teanga, tír gan anam.
(Краіна без мовы – краіна без душы.)
Patrick Pearse

Ірландыя – яскравы прыклад суіснавання вялікай колькасці моў і культур. Паводле перапісу 2011 г. у краіне размаўляюць на 182 мовах. Кожны дзясяты жыхар Ірландыі карыстаецца ў паўсядзённым жыцці не англійскай альбо ірландскай мовай. Самымі распаўсюджанымі замежнымі мовамі па колькасці носьбітаў з'яўляюцца польская, французская, літоўская, нямецкая і руская. Месца беларускай мовы сярод іншых вельмі сціплае. У першаю чаргу гэта абумоўлена колькасцю носьбітаў: беларусаў у параўнанні з прадстаўнікамі іншых нацый мала, а тых, хто размаўляе па-беларуску, яшчэ менш. Паводле апошняга перапісу насельніцтва ў Ірландыі пражывае 969 беларусаў, з якіх толькі 40 размаўляюць па-беларуску ў паўсядзённым жыцці (рускай мовай карыстаюцца 804 чалавекі). Гэтаму здзіўляюцца прадстаўнікі многіх нацый, але толькі не ірландцы, бо ў іх сітуацыя з мовамі вельмі падобная.

У Ірландыі, як і ў Беларусі, 2 дзяржаўныя мовы, прытым ірландская мова з'яўляецца першай афіцыяльнай мовай рэспублікі (Канстытуцыя Рэспублікі Ірландыя, артыкул 8(1). Насамрэч галоўнай функцыянальнай мовай для большасці жыхароў краіны з'яўляецца англійская. Перапіс 2011 г. паказаў, што толькі 1,8 % насельніцтва карыстаюцца ірландскай мовай ў паўсядзённым жыцці.

Такая сітуацыя з нацыянальнай мовай абумоўлена гісторыяй краіны. Шматвекавое англійскае праўленне прывяло да яе заняпаду. У XIV ст. ірландская мова была забаронена ў судовай сістэме і камерцыі (Статут Кілкэні, 1366, артыкул 3). Яшчэ больш сур'ёзнымі ўдарамі па ёй сталі палітычная і рэлігійная нестабільнасць XVII ст., Вялікі голад 1845–1849 гг., які прывёў да смерці мільёна носьбітаў мовы і эміграцыі яшчэ мільёна. У 1831 г. ірландская мова была забаронена для ўжывання ў адукацыйнай сістэме. Англійская мова стала дамінуючай сярод насельніцтва Ірландыі ў XIX ст., яна асацыявалася з дабрабытам і працаўладкаваннем, у той час як ірландская заставалася мовай простых людзей і стала асацыявацца з беднасцю і сацыяльнымі праблемамі. У выніку таго, што ірландская мова паступова набывала непрэстыжны сацыяльны статус, доля ірландскамоўных скарацілася з амаль 100 % у пачатку XVI ст. да 18 % у 1926 [1, p.49].

У канцы XIX ст. адбыліся спробы адраджэння ірландскай мовы. У 1876 г. было створана Таварыства захавання ірландскай мовы, якое ставіла своёй мэтай вярнуць мову ў сістэму адукацыі, а ў 1893 г. – патрыятычная арганізацыя «Гэльская ліга», што змагалася за поўнае адраджэнне мовы ў краіне. Нарэшце ў 1922 г., калі Ірландыя стала незалежнай, ірландская мова была абвешчана афіцыйнай мовай краіны. Больш таго, з 1937 г. паводле канстытуцыі Рэспублікі ірландская мова мае статус нацыянальнай і першай афіцыйнай мовы, а англійская – толькі статус другой афіцыйнай мовы. Згодна з Канстытуцыяй прэзідэнт краіны абавязаны падпісаць абодва моўныя варыянты любога законапраекта, прынятага парламентам на дзвюх мовах. Калі законапраект прымаецца толькі на адной афіцыйнай мове, то Канстытуцыя абавязвае рабіць афіцыйны пераклад на другую.

Галоўным законам, які датычыцца моў у Ірландыі, з'яўляецца «Акт аб афіцыйных мовах», прыняты ў 2003 г. Ён абазначае адну са сваіх мэтаў як развіццё выкарыстання ірландскай мовы дзяржаўнымі ўстановамі і пашырэнне выкарыстання імі мовы ў зносінах з насельніцтвам і ў аказанні яму паслуг.

Так, напрыклад, рассылка інфармацыйных (звычайных і электронных) лістоў грамадзянам павінна ажыццяўляцца на ірландскай ці на дзвюх афіцыйных мовах, пры гэтым тэкст на ірландскай павінен ісці першым і быць гэткім жа заўважным, як і англійскі, і перадаваць дакладна тую ж інфармацыю.

Статус ірландскай мовы падмацоўваецца і іншымі законамі. Напрыклад, у «Акце аб універсітэтах» 1997 г. адной з мэтаў гэтых навучальных устаноў названа «прамоцыя афіцыйных моў дзяржавы, асабліва захаванне, прамоцыя і выкарыстанне ірландскай мовы…». У кіраўнічы орган ВНУ павінен уваходзіць прадстаўнік ці прадстаўнікі арганізацый, якія займаюцца пытаннямі мовы.

З 2007 г. ірландская мова атрымала статус афіцыйнай мовы Еўрасаюза, яе можна выкарыстоўваць у парламенце, судах усіх узроўняў, ёсць спецыяльнае моўнае заканадаўства і моўная камісія.

З 2010 г. у краіне дзейнічае распрацаваная Урадам Ірландыі праграма адраджэння роднай мовы, разлічаная на 20 гадоў.

Яна прадугледжвае наступныя змены на гэты тэрмін.

- Ірландская мова выкарыстоўваецца больш шырока, стала больш вядомай і ёй ганарацца ва ўсім грамадстве.
- Мова часцей выкарыстоўваецца ў грамадскім жыцці, для яе створаны сферы ўжывання.
- Ірландская мова робіць багацейшым жыццё ўсіх людзей; гэта жывая мова, не абмежаваная толькі школьным асяродкам.
- Ірландцы з'яўляюцца прыкладам для іншых народаў і краін, якія імкнуцца абараніць свае мовы, што мала выкарыстоўваюцца.

Распрацоўшчыкі стратэгіі лічаць, што «заканадаўства не ёсць сродак выратавання мовы. Мову не можа выратаваць урад, міністэрства альбо іншая

дзяржаўная ўстанова. Выратаваць мову могуць толькі людзі. Але ўрад і дзяржаўныя ўстановы, безумоўна, са свайго боку павінны падтрымліваць і заахвочваць, ствараць месца і прастору для мовы ў грамадскай дзейнасці, каб яна не знаходзілася па-за грамадствам, а належала масавай культуры».

Да 2030 г. плануецца павялічыць колькасць людзей, якія штодзень будуць размаўляць па-ірландску, да 250 тысяч (у 3 разы больш, чым цяпер). Але гэта стратэгія падвяргаецца крытыцы не толькі з боку грамадства, але і многіх даследчыкаў, вучоных. Яе называюць наіўнай, нерэалістычнай, бо ў ёй ставяцца немагчымыя для ўвасаблення ў жыццё задачы, дакладна не вызначаны інструменты, якія мусяць прывесці да яе практычнай рэалізацыі. Так, напрыклад, ва Уэльсе, дзе падобная моўная сітуацыя, імкнуцца павялічваць колькасць носьбітаў мовы на 5 % кожныя 10 гадоў, у той час у Ірландыі такая задача ставіцца на кожны год. Многія справядліва лічаць, што гэта заведама немагчыма, і ставяць пад сумнеў рэалізацыю дадзенай стратэгіі і нават заклікаюць адмовіцца ад яе, каб пазбегнуць расчаравання.

На сёння найлепш ірландская мова захавалася на астравах і ў аддаленых заходніх раёнах (гэлтахтах). Гэлтахт (ірл. *Gaeltacht*) – ірландская назва для рэгіёнаў, у якіх большая частка насельніцтва захоўвае ірландскую гэльскую мову ў паўсядзённых зносінах. Гэлтахты не з'яўляюцца адміністрацыйнымі адзінкамі Ірландыі, але іх статус вызначаны заканадаўча. Яны атрымліваюць моцную падтрымку з боку дзяржавы, існуе спецыяльны Дэпартамент мастацтваў, спадчыны і спраў гэлтахтаў, дзе працуе больш за 600 чалавек і які займаецца прадстаўніцтвам і аховай спадчыны Ірландыі, пашырэннем і падтрымкай нацыянальнай мовы. Тым не менш, згодна з апошнімі даследаваннямі, ужо праз 10 гадоў у гэтых раёнах мова прыйдзе ў заняпад.

Перапіс 2011 г. паказаў, што з 4,5 млн насельніцтва 1,77 млн валодаюць ірландскай мовай «у некаторай ступені», але толькі 77 тысяч (з іх 23 тысячы жыве ў гэлтахце) карыстаюцца ёй у паўсядзённым жыцці. Але гэтыя лічбы не даюць поўнай інфармацыі аб рэальным узроўні ведання мовы. Інстытутам эканамічных і сацыяльных даследаванняў на тэрыторыі Рэспублікі Ірландыя і Паўночнай Ірландыі было праведзена апытанне, вынікі якога былі апублікаваны ў жніўні 2015 г., з мэтай вызначэння сучаснага становішча ірландскай мовы і адносін да яе ў грамадстве. Яно выявіла, што насамрэч 43 % апытаных вызначылі свой узровень мовы як «вельмі абмежаны», то бок веданне і разуменне некаторых фраз, 14 % валодаюць мовай на «базавым узроўні», і ўсяго 3 % могуць ёй свабодна карыстацца. Пры гэтым большасць жыхароў Рэспублікі (67 %) заявілі аб тым, што станоўча ставяцца да ірландскай мовы, неабходнасці яе захавання, бо без яе краіна згубіць сваю ідэнтычнасць. Узнікае пытанне, як з такім высокім узроўнем падтрымкі нацыянальнай мовы і патрыятызму моўная сітуацыя з’яўляецца настолькі сумнай?

Аналіз дадзеных даследавання паказвае, што на ўжыванне мовы ўплываюць такія фактары, як адукацыйная сістэма, адносіны да мовы ў сям'і і магчымасць выкарыстання мовы па-за адукацыйнай сістэмай.

Большасць абвінавачвае ў першую чаргу сістэму адукацыі. Найбольш распаўсюджаны адказ на пытанне «Ці гаворыце Вы па-ірландску?» – «Не, бо ў школе ірландскую мову дрэнна выкладалі». Гэта пры тым, што ірландская мова з'яўляецца абавязковым школьным прадметам і ёсць ў раскладзе заняткаў кожны дзень, вывучаецца на працягу 14 гадоў, пачынаючы з 4-гадовага ўзросту.

Гаворачы пра вывучэнне ірландскай мовы ў школе, праблему многія бачаць у тым, што яе выкладаюць як школьны прадмет, а не як мову, жывую, прыдатную для выкарыстання ў штодзённых стасунках. Галоўным чынам наракаюць на тое, што вывучэнне зводзіцца да механічнага завучвання правапісу, бясконцага аналізу вершаў, вывучэння неактуальнай літаратуры, граматыкі, адарванай ад жывой мовы. Лічбы, прыведзеныя ў даследаванні, паказваюць нізкі статус ірландскай мовы ў параўнанні з іншымі школьнымі прадметамі: 68 % вучняў старэйшых класаў назвалі вывучэнне такіх прадметаў, як матэматыка, гісторыя, геаграфія, больш важным, чым вывучэнне ірландскай мовы [2, p. 91], а таксама адзначылі галоўным матывам яе вывучэння «неабходнасць трымаць іспыт» [2, p. 90]. Ірландскую мову многія лічаць больш складаным, менш цікавым і менш карысным, чым іншыя, прадметам. Так, 55 % назвалі яе цяжкім, 24 % – цікавым і каля 40 % – карысным прадметам [2].

Да таго ж, існуе сур'ёзная праблема з настаўнікамі ірландскай мовы. Часта крытыкуецца фармальнасць яе выкладання, якая заключаецца ў падыходзе: «давайце зробім гэта заданне, бо мы мусім яго зрабіць». Альбо другая крайнасць, калі выкладчыкі, асабліва сталага ўзросту, якія выдатна ведаюць свой прадмет, агрэсіўна дакараюць вучняў за маўленчыя памылкі, такім чынам адбіваюць усялякае жаданне гаварыць па-ірландску.

Па-за школай мова практычна не выкарыстоўваецца. Як вынік, пасля 14-гадовага вывучэння сярэднестатыстычны ірландзец не толькі не можа свабодна на ёй размаўляць, але і нават падтрымаць простую размову. Нездарма большасць адчувае, што час, прысвечаны яе вывучэнню, згублены дарма. Існуюць і выключна ірландскамоўныя школы, і ёсць меркаванне, што тамтэйшы ўзровень адукацыі лепшы, але вышэйшая адукацыя ўсё роўна даступная толькі на англійскай.

Негледзячы на тое, што большасць ірландцаў практычна не карыстаецца нацыянальнай мовай, ёсць людзі, якія добра ёй валодаюць і прыкладаюць шмат намаганняў, каб яе пашыраць: ствараюць разнастайныя клубы, суполкі, культурныя праекты і робяць гэта з энтузіязмам. Несумненна, яны заахвочваюць да вывучэння мовы больш эфектыўна, чым школьная сістэма. Адным з найбольш паспяховых напрамкаў з'яўляецца адкрыццё летніх каледжаў, дзе на працягу некалькіх тыдняў студэнты знаходзяцца ў натуральным ірландскамоўным асяродку, а ўсе стасункі адбываюцца ў менш акадэмічнай атмасферы, цікава і нязмушана. Дзякуючы гэтаму яны атрымліваюць выдатную практыку маўлення па-ірландску [3, p. 117]. Вельмі дзейснымі таксама з'яўляюцца курсы-інтэнсівы, якія прадугледжваюць

поўнае пагружэнне ў мову на працягу 2–3 тыдняў. Яны асабліва папулярныя сярод студэнтаў з іншых краін. Даволі распаўсюджана праходжанне такіх курсаў у спалучэнні з пражываннем ў ірландскамоўных сем'ях.

Калі падсумаваць асаблівасці моўнай сітуацыі ў Ірландыі, можна канстатаваць, што нягледзячы на трывалую падтрымку з боку дзяржавы, у тым ліку фінансавую, нацыянальная мова мала распаўсюджана і выкарыстоўваецца вельмі невялікай часткай насельніцтва. Сярод асноўных прычын гэтага – неэфектыўная сістэма выкладання, што не адпавядае сучасным патрабаванням, адсутнасць вышэйшай адукацыі на ірландскай мове, фактычная адсутнасць магчымасці выкарыстоўваць мову па-за сістэмай адукацыі.

Безумоўна, беларускія рэаліі значна адрозніваюцца ад ірландскіх. Няма такой моцнай дзяржаўнай падтрымкі, якая проста неабходна, каб адчуць рэальныя змены. Але некаторым рэчам мы можам у ірландцаў павучыцца. Перш за ўсё, іх досвед вучыць, што ніякія фармальныя стратэгіі не дапамогуць зрабіць крокі наперад. Мову нельга насаджваць «зверху», вучыць ёй пад прымусам, гэта павінен быць асэнсаваны выбар людзей. Пакуль што ў значнай часткі беларусаў не хапае гістарычнай годнасці, разумення, што мы – самастойная нацыя, адна з асноўных каштоўнасцей якой – мова. Сёння ў краіне 2 дзяржаўныя мовы, і, на жаль, у нацыянальнай мовы больш слабая пазіцыя ў выніку шматгадовай русіфікацыі, яе трэба абараняць і падтрымліваць, рабіць усе магчымыя захады, каб пашыраць яе выкарыстанне. Найважнейшым у дадзены момант бачыцца выхаванне ў людзях пачуцця моўнай саматоеснасці, павагі да роднай мовы, разумення, што яна можа быць не толькі школьным прадметам, але і натуральным сродкам зносінаў. Па-за адукацыйнай сістэмай з гэтай задачай выдатна спраўляюцца, напрыклад, такія папулярныя моўныя курсы, як «Мова Нанова». Яны адкрылі для многіх беларусаў мажлівасць апынуцца ў добразычлівым беларускамоўным асяроддзі, дзе можна практыкаваць і ўдасканальваць сваю мову, узбагаціць веды па гісторыі і культуры Беларусі, сустрэцца з выбітнымі людзьмі розных прафесій і поглядаў, якіх аб'ядноўвае цікавасць і пачцівае стаўленне да роднай мовы. Курсы распаўсюджваюцца, адкрываюцца ў новых гарадах Беларусі і па-за яе межамі, і хочацца спадзявацца, што яны і надалей будуць развівацца і прыцягваць усё большую колькасць людзей.

Калі ў дарослых часта ёсць комплекс моўнай непаўнавартасці і залішняя самакрытыка, то ў дзяцей такіх праблем не павінна быць, калі з самага пачатку прывучаць іх гаварыць па-беларуску.

А пачынаць трэба з самага малодшага ўзросту. Ужо ў дзіцячым садку размаўляць і займацца з дзеткамі па-беларуску. Натуральна, што далёка не ўсе дзеці з беларускамоўных сем'яў і ў наш час поўнасцю адмовіцца ад рускай мовы пакуль не атрымаецца, але ў дашкольным узросце дзеці здольныя ўспрымаць і вучыцца больш, чым адной мове. Трэба даводзіць да бацькоў інфармацыю аб тым, як спрыяе агульнаму развіццю дзіцяці вывучэнне 2 моў. Так як у дзяцінстве нейронавыя сувязі фарміруюцца

хутчэй, навучанне другой мове адбываецца больш эфектыўна і хутка, чым у старэйшым узросце. У сучасным свеце білінгвізм вельмі распаўсюджаны, чаму б гэтай з'яве не стаць агульнапрынятай і ў Беларусі? Дзве мовы заўсёды лепш, чым адна.

Перавагі білінгвізму сёння пацвярджаюць шматлікія даследаванні. Білінгвізм – гэта значна больш, чым проста валоданне дзвюма мовамі. Па-першае, двухмоўныя дзеці больш успрымальныя да іншых людзей, іншых культур і маюць больш шырокі кругагляд у параўнанні са сваімі аднагодкамі, якія валодаюць адной мовай.

Па-другое, дзеці-білінгвы валодаюць больш развітым лінгвістычным успрыманнем. Яны лепш усведамляюць сувязь паміж літарамі і гукамі, здольныя часцей пазнаваць няправільныя граматычныя канструкцыі, разумець граматычныя правілы. Для кожнага прадмета ў іх, як мінімум, два словы. Двухмоўнае дзіця ўвесь час пераключаецца паміж мовамі і таму здольнае лепш факусавацца, выконваць некалькі задач адначасова. У білінгваў лепш развіта дывергентнае мысленне (здольнасць прыдумаць мноства спосабаў выкарыстоўваць які-небудзь прадмет, напрыклад, звычайную сашчэпку). У дарослых білінгваў звычайна больш гнуткі розум, мозг больш устойлівы да старэчых захворванняў. І, нарэшце, гісторыя пацвярджае карысць білінгвізму: вялікі працэнт прызнаных творцаў сярод двухмоўных.

Хацелася б не паўтараць памылкі ў выкладанні мовы ў школах Ірландыі: вывучаць беларускую мову як мову, а не адзін са школьных прадметаў. Не лішнім было б зрабіць праграму па беларускай мове і літаратуры больш сучаснай, разнастайнай, унесці элемент займальнасці ў навучанне, актыўна выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі. Каб зацікавіць школьнікаў, трэба даваць як мага больш творчых заданняў, можна прапаноўваць ім удзел у разнастайных праектах (напрыклад, дзяліць дзяцей на групы, каб кожная падрыхтавала сваю прэзентацыю па якой-небудзь тэматыцы, дух саперніцтва у іх звычайна добра выражаны, і яны будуць імкнуцца зрабіць сваю частку як мага лепш). У старэйшых класах можна ладзіць дыскусіі на цікавыя для іх тэмы. Добра арганізаваныя пазакласныя мерапрыемствы на беларускай мове, гістарычныя і іншыя гурткі, невялікія пастаноўкі/мюзіклы могуць таксама спрыяць павышэнню інтарэсу да мовы. Галоўнае, каб гэта было цікава дзецям. Вельмі эфектыўным спосабам падтрымкі мовы бачыцца стварэнне беларускамоўных летнікаў і арганізацыя чагосьці падобнага не толькі падчас летніх, але і астатніх канікул на працягу навучальнага года. Галоўная ўмова – каб дзеці знаходзіліся ў сітуацыі абсалютнай беларускамоўнасці. А для гэтага патрэбны людскія рэсурсы, бо шмат чаго залежыць ад асобы выкладчыка, яго волі, энергіі, мэтанакіраванасці, здольнасці заахвоціць. Такія энтузіясты ёсць і цяпер, пры такіх неспрыяльных умовах (нізкі паклон ім за гэта!), а пры належнай падтрымцы іх, несумненна, будзе больш.

Можна доўга тэарытычна разважаць, марыць аб зменах, але напрыканцы гэта не зменіць сітуацыю. Мала гаварыць, трэба проста рабіць тое, што можаш, што ў тваіх сілах. Чым больш людзей зразумее, што і іх унёсак

у справу беларушчыны мае значэнне, тым хутчэй будзе створана крытычная маса для фарміравання новага грамадства з нацыянальнымі адзнакамі, адна з якіх – свая мова.

Рыгор Барадулін казаў: «Беларусы – эксперыментальная нацыя ў Бога». Ён не дачакаўся канца гэтага эксперыменту. Малаверагодна, што яго дачакаемся і мы. Але калі кожны з нас будзе рабіць усё, што ад яго залежыць, для захавання нашае мовы, ёсць надзея, што некалі гэты эксперымент завершыцца паспяхова.

ЛІТАРАТУРА

1. A New View of the Irish Language. Caoilfhionn Nic Pháidín, Seán Ó Cearnaigh. – Dublin, 2008.
2. Attitudes towards the Irish Language on the island of Ireland / Dr. Merike Darmody (ESRI) and Tania Daly (Amárach Research). – 2015.
3. The Irish Language. Darerca Ní Chartúir. – N. Y., 2002.

Л. І. Сямешка (Мінск)

ЛЕКСІЧНЫ МІНІМУМ У СІСТЭМЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЯК ЗАМЕЖНАЙ: АД ЛЕКСЕМЫ ДА КАНЦЭПТУ

Міжнародныя стандарты моўнай адукацыі, пабудаваныя на ўзроўневай тэорыі іншамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі, прапануюць агульныя падыходы да мадэлявання сістэм навучання мове іншафонаў і ацэнкі ўзроўняў агульнага валодання мовай з дапамогай тэставых тэхналогій. У айчынным адукацыйным кантэксце гэта актуалізуе праблему распрацоўкі ўзроўнева-кампетэнтнаснай лінгвадыдактычнай мадэлі навучання беларускай мове як замежнай і рэпрэзентацыі яе ў комплексе курыкулярных адукацыйных дакументаў, што вызначаюць нарматыўныя патрабаванні да зместу камунікатыўнай кампетэнцыі на розных узроўнях, акрэсліваюць яе ключавыя складнікі і метадычна забяспечваюць працэс навучання і тэставання. У склад абавязковых курыкулярных дакументаў, што дапамагаюць стандартызаваць патрабаванні да ўзроўняў валодання мовай, уваходзіць (побач з *адукацыйным стандартам, вучэбнымі праграмамі, лінгвадыдактычнымі тэстамі)* сістэма лексічных мінімумаў, прызначаных для рэгламентацыі дынамікі развіцця лексічнага запасу іншафонаў на розных этапах навучання.

У межах распрацоўкі адукацыйнага стандарту і сістэмы сертыфікацыйнага тэставання па беларускай мове як замежнай вядзецца праектаванне лексічных мінімумаў беларускай мовай для розных этапаў навучання. Для беларускай лінгвадыдактыкі – гэта новы напрамак навукова-метадычных даследаванняў, звязаны з мадэляваннем зместу і структуры лексікона, пад якім разумеецца лексічны складнік камунікатыўнай кампетэнцыі іншафона,

з сістэматызацыяй і метадычнай інтэрпрэтацыяй шырокага кола пытанняў вучэбнай лексікаграфіі і мінімізацыі як базавага метадалагічнага адукацыйнага прынцыпу.

На сённяшні дзень выдадзены праектныя варыянты лексічнага мінімуму для іншаземцаў, што вывучаюць беларускую мову на пачатковым этапе навучання (узроўні А1 і А2) [1], і распрацоўваюцца канцэптуальныя асновы фармату лексічнага мінімуму для сярэдняга этапу навучання (узроўні В1 і В2). Паколькі такі праект у методыцы выкладання беларускай мовы як замежнай выконваецца ўпершыню, уяўляецца вартым абмеркаваць яго канцэптуальныя асновы ў кантэксце асэнсавання досведу замежнай вучэбнай лексікаграфіі і сучасных метадалагічных падыходаў да мінімізацыі лексікі дзеля навучальных мэтаў. У прапанаваным дакладзе ўвага акцэнтуецца на лексікаграфічнай, функцыянальнай сутнасці лексічнага мінімуму і яго дыдактычных магчымасцях у працэсе мадэлявання лексічнага і іншых кампанентаў камунікатыўнай кампетэнцыі на розных этапах навучання.

Лексічны мінімум (далей ЛМ) як разнавіднасць дыдактычнага матэрыялу для іншафонаў – паняцце агульнавядомае ў глотадыдактыцы, бо навучанне любой замежнай мове, і беларуская як замежная – не выключэнне, заўсёды пачынаецца з вылучэння і сістэматызацыі пэўнага аб'ёму лексічнага матэрыялу, запатрабаванага ў рэальных маўленчых сітуацыях. Гэтым тэрмінам традыцыйна абазначаюцца як мінімальныя лексічныя спісы (алфавітныя, тэматычныя), што падаюцца ў падручніках па замежных мовах для рацыяналізацыі працы з лексікай, так і вучэбныя слоўнікі, гласарыі, тэзаўрусы, розныя паводле функцый, структуры, прынцыпаў складання. Практыка вылучэння мінімальна неабходнай у пэўнай сферы камунікацыі лексікі адлюстравана і ў вучэбных дапаможніках па беларускай мове як замежнай. У многіх з іх лексічны матэрыял структуруецца тэматычна, і «кожная тэма суправаджаецца лексічным мінімумам – беларуска-рускім слоўнікам» [2, с. 4], ці кожны раздзел пачынаецца з лексічнага комплексу, які змяшчае «словы, словазлучэнні, выразы па пэўнай тэме, адабраныя з улікам іх практычнай значнасці» [3, с. 6]. Падобныя тэматычныя спісы, сфармаваныя дзеля абслугоўвання навучальнага працэсу, адлюстроўваюць фрагменты лексічнай сістэмы і цікавыя як эмпірычныя напрацоўкі на базе педагагічнага досведу і моўнай інтуіцыі складальнікаў, аднак яны не маюць выразнай метадалагічнай асновы і не абгрунтаваныя як рэгулятары лексічнага складніку зместу навучання. У адрозненне ад эмпірычна складзеных лексічных спісаў, прызначаных для аспектнага навучання мове, ЛМ як інструмент мадэлявання і вымярэння слоўнікавага запасу іншафонаў грунтуецца на пэўнай сістэме крытэрыяў адбору лексікі і формах яе рэпрэзентацыі ў адпаведнасці з мэтамі навучання і ўзроўнем валодання мовай. Ён вызначае аб'ём намінатыўных адзінак, неабходны і дастатковы для забеспячэння камунікатыўных патрэб на канкрэтным узроўні валодання мовай, дакладна акрэсліваючы пры гэтым ніжнюю мяжу лексікону (што асабліва важна на пачатковым этапе навучання), рэгулюе прадуктыўны, рэцэптыўны і патэнцыяльны слоўнікі навучэнцаў і выступае адным з паказчыкаў пры ацэнцы навучэнцаў для пераходу на больш высокі ўзровень валодання мовай [4, с. 15].

Канцэптуалізацыя ЛМ як міждысцыплінарнага кампанента сістэмы навучання і тэставання ў сувязі з укараненнем у адукацыйную парадыгму ўзроўневай тэорыі іншамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі і лінгвадыдактычнага сертыфікацыйнага тэставання пашырыла сістэму ўяўленняў пра гэты від вучэбнага слоўніка і абумовіла неабходнасць распрацоўкі ЛМ беларускай мовы для іншафонаў і ўключэння яго ў сістэму сродкаў навучання беларускай мове як замежнай. Канструяванне ЛМ беларускай мовы ў яго сучасным разуменні прадугледжвае вырашэнне комплексу пытанняў, звязаных з вызначэннем 1) аб'ёму лексічнага запасу іншафонаў на розных этапах навучання, 2) крытэрыяў і крыніц адбору лексікі, 3) прынцыпаў яе сістэматызацыі і канцэптуальнага размеркавання па ўзроўнях валодання мовай, 4) адзінак лексікаграфічнага апісання, 5) дыдактычнага патэнцыялу ЛМ у адукацыйным працэсе і спосабаў яго інтэгравання ў навучальную практыку. На сучасным этапе развіцця беларуская лінгвадыдактыка не мае спецыяльных публікацый па гэтай важнай праблематыцы, што непасрэдна карэлюе з канцэптуальнымі асновамі навучання лексіцы, таму распрацоўка яе грунтуецца на аналізе і сістэматызацыі вопыту замежнай глотадыдактыкі, дзе падыходы да адбору і прэзентацыі лексічнага матэрыялу як асновы фарміравання лексічных ведаў грунтоўна даследуюцца на матэрыяле розных моў. На асобных з гэтых падыходаў, істотных у межах акрэсленай праблематыкі, спынімся ў дакладзе.

Еўрапейская глотадыдактыка надае вялікае значэнне структуры лексікона як аснове авалодання мовай. З улікам таго, што разуменне любога тэксту на 80 % забяспечваецца веданнем лексікі і фразеалогіі, і слова застаецца ключавой адзінкай навучання, пытанні адбору і каталагізацыі лексічных адзінак дзеля дыдактычных мэтаў разглядаюцца як базавыя ў методыцы выкладання замежных моў. Маючы адмысловую ўнутраную ўпарадкаванасць, лексічны склад кожнай мовы ў пэўным сэнсе сістэмна ўладкаваны. Адпаведна розныя метадычныя тэорыі аптымізацыі моўнай адукацыі будуюцца, як правіла, на сістэмаўтваральнай ролі лексікі ў засваенні мовы і пошуку эфектыўных спосабаў адбору і прэзентацыі лексічнага матэрыялу, якія ў сукупнасці дазволілі б паказаць «зменшаны аналаг мовы» – рэпрэзентацыйную «мадэль» слоўніка. Аднак лексічная сістэма не абумоўлена цалкам сістэмнасцю аб'ектыўнай рэчаіснасці, і «карціна свету», адлюстраваная ў мове, значна складанейшы кангламерат сэнсаў, унутраных сувязяў, дэтэрмінаваных у тым ліку і пазамоўным (гістарычным, кагнітыўным, сацыякультурным) кантэкстам, таму стварыць адэкватную «мадэль» лексічнай сістэмы дзеля навучальных мэтаў дастаткова складана. Нягледзячы на значную колькасць замежных публікацый, прысвечаных зместу і структуры ЛМ, адзінай упарадкаванай тэарэтычнай базы, універсальнай тэхналогіі яго складання не існуе. Аб'ём паняцця ЛМ, наменклатура і змест крытэрыяў яго камплектавання на розных этапах развіцця метадычнай навукі вызначаліся рознымі метадалагічнымі падыходамі да адбору і арганізацыі лексічнага матэрыялу. Так, яшчэ на пачатку XX ст. еўрапейскімі спецыялістамі былі акрэслены перспектыўныя напрамкі мінімізацыі ў кантэксце

ідэаграфічнай сістэматызацыі лексічнага матэрыялу на аснове фундаментальнага тэматычнага падыходу, што на працягу стагоддзяў дамінаваў у еўрапейскай лексікаграфіі. У 1930–1950-я гг. падчас актыўнага абмеркавання ў межах розных метадычных школ пытанняў складання слоўнікаў-мінімумаў замежнай (пераважна англійскай) мовы былі сфармуляваны два асноўныя падыходы да адбору лексікі: *логіка-філасофскі,* арыентаваны на словы, што абазначаюць найбольш значныя канцэптуальныя паняцці для апісання свету, і *лінгвастатыстычны*, які грунтуецца на прынцыпе частотнасці слоў у тэкстах.

Логіка-філасофскі падыход рэалізаваны ў слоўніку базавай англійскай лексікі (Dictionary of Basic Englich, Text Book, 1930) Ч. Огдэна (C. K. Ogden). Слоўнік уключаў 850 слоў (600 – назоўнікаў, 150 – прыметнікаў і прыслоўяў, 100 – слоў-аператараў (дзеясловы, займеннікі, службовыя словы), якія, паводле аўтара, выконвалі працу 200 000 слоў. Праз вылучэнне найбольш важных ідэй і канцэптуальных паняццяў і падбору «простых» намінацый для іх абазначэння аўтар ставіў мэтай даць зменшаную канцэптуальную мадэль мовы. Пазней канцэпцыя слоўніка, надзвычай папулярнага працяглы час, крытыкавалася, бо высветлілася, што 850 вылучаных слоў маюць больш за 12 000 значэнняў, а значная частка лексікі паўсядзённага ўжытку не адлюстравана ў слоўніку.

Лінгвастатыстычны падыход да адбору лексікі, заснаваны на крытэрыі *частотнасці* слоў, абгрунтаваны прадстаўнікамі (H. Palmer, M. West, L. Faucett) метадычнага напрамку Reading Movement. На яго аснове ў 1953 г. М. Уэстам (M. West) быў выдадзены базавы слоўнік англійскай мовы (General Service List of Englich Words). Слоўнік уключаў 2 000 агульнаўжывальных слоў і іх дэрыватаў і змяшчаў такую важную інфармацыю, як лексіка-семантычная варыянтнасць слова (з ілюстрацыйнымі прыкладамі), прыналежнасць да часціны мовы і працэнтныя суадносіны частотнасці ўжывання слова ў кожным яго канкрэтным значэнні.

Крытэрый *частотнасці*, дзякуючы сваёй выразнасці, магчымасці фармалізацыі і таму, што тысяча найбольш частотных слоў складае ў кожнай мове каля 80 % любога тэксту, набыў статус базавага прынцыпу. Улічваючы, што частотныя словы, як правіла, стылістычна неабмежаваныя, маюць багатую семантыку і высокую ступень граматычнасці, ён быў дапоўнены крытэрыямі *стылістычнай нейтральнасці*, *тэматычнай неабмежаванасці, структурнай каштоўнасці, словаўтваральнай здольнасці*. Прынцып *частотнасці* да гэтага часу застаецца адным з вызначальных, але не адзіным у вучэбнай лексікаграфіі, бо ў многіх выпадках выяўляецца яго ненадзейнасць. Частотнасць слоў у тэксце, як вядома, залежыць ад яго жанрава-стылявой прыроды, таму шмат якія лексічныя адзінкі ўжываюцца толькі ў пэўных кантэкстах, не маючы дачынення да рэальнай паўсядзённай маўленчай практыкі. Акрамя таго, вызначана, што «пачынаючы з другой тысячы, каэфіцыент паўтаральнасці слоў ужо настолькі невялікі, што не можа быць пераканаўчым доказам пашыранасці і важнасці слова для ўсіх стыляў мовы» [5, с. 31].

У якасці альтэрнатывы крытэрыю частотнасці ў канцы 1950-х гг. французскія даследчыкі Ж. Гугенейм, Р. Мішэа прапанавалі камплектаваць корпус базавай лексікі паводле прынцыпу *«прысутнасці ў свядомасці»*, аргументуючы тым, што многія словы, неабходныя для фарміравання лексікона паўсядзённых стасункаў, не з'яўляюцца частотнымі, а ўзнікаюць у свядомасці, калі патрабуе сітуацыя. Гэты падыход (у іншых метадычных інтэрпрэтацыях прынцып «*рацыянальнага эмпірызму»*, «*практычнай неабходнасці»* ці «*сітуацыйна-тэматычнай суаднесенасці»*) дамінуе пры вызначэнні складу ЛМ для пачатковага этапу навучання. Менавіта на прынцыпах *частотнасці* і *сітуацыйна-тэматычнай прыналежнасці лексікі* грунтуецца сучасная канцэптуальная парадыгма еўрапейскага ЛМ. У якасці дадатковых крытэрыяў, рэлевантнасць якіх прызнаная большасцю даследчыкаў, вылучаюцца: 1) *стылістычная немаркіраванасць* (адсутнасць гутарковай, слэнгавай лексікі, тэрмінаў); 2) *семантычная каштоўнасць* (здольнасць абазначаць часта ўжывальныя предметы і паняцці); 3) *словаўтваральная каштоўнасць* (здольнасць слова да словаўтварэння: чым больш вытворных мае слова, тым больш падстаў для ўключэння ў мінімум); 4) *мнагазначнасць* (чым больш значэнняў мае слова, тым важней яго ведаць); 5) *структурная каштоўнасць* (у слоўніку павінны быць службовыя словы, кампаненты ўстойлівых словазлучэнняў).

Еўрапейскія канцэпцыі канструявання ЛМ у той ці іншай ступені адлюстраваліся ў савецкай і расійскай тэорыі і практыцы вучэбнай лексікаграфіі і методыцы выкладання рускай мовы як замежнай. ЛМ рускай мовы для іншаземцаў, асновы якога складваліся ў другой палове XX ст., паступова «эвалюцыянаваў ад простага эмпірычна выбранага алфавітнага спісу слоў без якіх-небудзь памет да складана арганізаванага, шматфункцыянальнага твора вучэбнай лексікаграфіі» [4, с. 14]. З канца 1990-х гг. на ўзор ЛМ еўрапейскіх моў распрацоўвалася як карыкулярны дакумент градуальная серыя ЛМ па рускай мове, «патрэба ў якой узнікла ў сувязі са стварэннем Расійскай дзяржаўнай сістэмы тэставання, і якая стала адным з найважнейшых яе кампанентаў» [6, с. 4]. Гэты напрамак даследаванняў вылучыўся ў асобную перспектыўную прыкладную навуковую галіну, у межах якой ЛМ асэнсоўваецца як складаны міждысцыплінарны феномен лінгвадыдактыкі, тэсталогіі, вучэбнай лексікаграфіі і тэорыі падручніка (В. Маркоўкін, Т. Балыхіна, А. Маркіна, Н. Андрушына, М. Нахабіна, М. Скопіна і інш.), і абгрунтоўваецца метадалагічная значнасць яго як інфармацыйнага, дыферэнцыйнага, праграмавальнага і арыентацыйнага рэсурсу для замежных навучэнцаў, а таксама для тэстолагаў, тэстараў, аўтараў вучэбных дапаможнікаў. У апошні час у расійскай лінгвадыдактыцы актыўна даследуюцца падыходы да адбору лексічнага матэрыялу на аснове яго лінгвакультурнай мінімізацыі, фарміруецца тэарэтычная і метадычная база лексікаграфавання лінгвакультуры і ствараюцца яе слоўнікі, якія інтэрпрэтуюць розныя тыпы культурна значнай інфармацыі.

Канцэптуальныя асновы ЛМ беларускай мовы для іншаземцаў распрацоўваюцца з улікам традыцый еўрапейскага ЛМ і вопыту складання дыдактызаваных фарматаў ЛМ рускай мовы. Яны падпарадкаваны агульнай адукацыйнай стратэгіі – авалоданню беларускамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыяй, істотнае месца ў якой займае лексічны складнік, праз паглыбленне ў метадычна ўпарадкаванае маўленчае асяроддзе з акрэсленым для канкрэтнага ўзроўню мінімальным аб'ёмам лексікі як асновай камунікатыўна-маўленчай дзейнасці. Гэта падразумявае карэктнае з пункту гледжання навукі і практычна мэтазгоднае абмежаванне лексічнага матэрыялу да мінімальнага яго аб'ёму, неабходнага і дастатковага для рэалізацыі маўленчых інтэнцый, акрэсленых адукацыйным стандартам на канкрэтным узроўні валодання мовай, і максімальнай яго колькасці, што можа быць засвоена ў межах вызначанага вучэбнага часу. Прадугледжваецца таксама сістэматызацыя і лексікаграфічная інтэрпрэтацыя лексічнага матэрыялу ў адпаведнасці з мэтамі і этапам навучання. Мінімальныя колькасныя межы лексікі на элементарным узроўні (А1) вызначаюцца 800 агульнаўжывальнымі словамі; мэтазгодна мінімальнае ядро лексікі на базавым узроўні (А2) – да 1300 лексічных адзінак; на сярэднім этапе навучання: узровень В1 – 2300 слоў і В2 – да 5 000 адзінак актыўнага лексікону. Для ўзроўняў С1, С2, якія прадугледжваюць дасканалае валоданне мовай, блізкае да ўзроўню адукаванага носьбіта мовы, ЛМ лічыцца неактуальным.

Кожны ўзровень *валодання мовай* мае свае параметры мэтаў, зместу і вынікаў навучання, аднак грунтуюцца яны на адзінай лексіка-тэматычнай дамінанце, акрэсленай адукацыйным стандартам праз сферы, тэмы, сітуацыі прадметнага камунікатыўнага кантэксту. Тэматычны складнік зместу навучання, які рэалізуецца ў межах стандартнай тэматыкі камунікацыі як абагульненыя найменні шырокіх фрагментаў рэчаіснасці (Я і мае інтарэсы; Сям'я; Сябры; Навакольнае асяроддзе; Вучоба; Адпачынак; Падарожжа і інш.), арганізаваны канцэнтрычна, паводле прынцыпу спіралі. На кожным новым узроўні валодання мовай тэмы паўтараюцца, але ўскладняюцца за кошт новай актуальнай праблематыкі ў гэтых сферах, што прадугледжвае павелічэнне аб'ёму лексічнага складу ў кожным сэнсавым полі і ўключэнне новых пластоў лексікі ва ўсёй разнастайнасці сістэмных адносін яе парадыгматыкі і сінтагматыкі. Адпаведна структура ЛМ будуецца на комплексным падыходзе да арганізацыі моўнага матэрыялу з улікам сістэмы міжслоўных (тэматычных, дэрывацыйных, сінанімічных, антанімічных і інш.) сувязяў, якія так ці інакш дэманструюць характар унутранай арганізацыі лексікона і паказваюць розныя шляхі дасягнення пазнавальных мэтаў. ЛМ для ўзроўняў А1, А2 уключае тры часткі: 1) ***перакладны алфавітны слоўнік,*** які інфармуе пра карэктнае напісанне слова, націск, яго граматычныя адзнакі і дае пераклад на іншыя мовы (узровень А1 – на рускую, англійскую, нямецкую, французскую, іспанскую мовы; узровень А2 – на рускую, польскую, англійскую, нямецкую, кітайскую мовы); 2) ***тэматычную класіфікацыю лексікі,*** дзе падаецца ідэаграфічная сістэматызацыя лексічнага матэрыялу, згрупаванага паводле

пэўных тэм (з дадатковым лексічным напаўненнем кожнай з іх); 3) ***дадатак,*** які змяшчае а) агульнаўжывальныя беларускія імёны (мужчынскія і жаночыя); б) сінанімічныя пары слоў; в) антанімічныя пары слоў; г) лінгвістычныя тэрміны, веданне якіх патрэбна пры засваенні сістэмы беларускай мовы.

Комплексны характар лексікаграфічнай інфармацыі, спалучэнне ў ЛМ розных спосабаў прэзентацыі лексікі – рэестравага *алфавітнага* спісу як інварыянтнага кампанента слоўніка (які аднак не адлюстроўвае міжслоўныя сувязі і не суадносіцца з сістэмай ведаў пра свет) і *тэматычнай* дыстрыбуцыі лексікі, што дапамагае асацыяваць словы семантычна, прагназаваць і дэкадаваць лексічны матэрыял пры пабудове ўласных тэкстаў і спрыяе самакантролю, – скіраваны на тое, каб структураваць набытыя веды, эксплікуючы і актывізуючы пры гэтым міжслоўныя сувязі. Ужо з пачатковага этапу навучання ЛМ арыентуе іншаземца на розныя стратэгіі авалодання беларускай лексікай. Усё гэта дае падставы разглядаць ЛМ не проста як фармальны мінімальны рэпертуар лексічных адзінак, а як аснову для рацыянальнай працы са словам і паспяховага фарміравання мадэлі паэтапнага пераходу ад увагі да слова – яго значэння (суаднясення з тэмай), графічнага вобліку – да свядомага карыстання парадыгматычнымі і сінтагматычнымі сувязямі лексічных адзінак у рэальных маўленчых сітуацыях.

З улікам таго, што змест навучання рэалізуецца праз тэматычны складнік камунікацыі і рэгулюецца сферамі, маўленчымі сітуацыямі, дамінантай у ЛМ выступае тэматычная сістэматызацыя лексікі, якая не толькі акрэслівае лексічнае напаўненне той ці іншай тэмы, але і канцэптуальна структуруе пазамоўную рэчаіснасць з яе адметнымі культурнымі сэнсамі. Ідэаграфічная падача матэрыялу ў ЛМ паводле тэм, якія складаюць асноўныя паняційныя палі (канцэптасферы) *Чалавек як жывая істота (узрост, часткі цела, здароўе, харчаванне, жыллё, мэбля, адзенне, абутак); Чалавек як разумная істота (інтэлект, воля, эмоцыі, рысы характару і інш.); Чалавек і грамадства (дзяржава, улада, месца жыхарства, сям'я, сваякі, сферы дзейнасці, навука, мастацтва і інш.); Прырода (прыродныя з'явы, жывёлы, расліны); Прастора і час; Адзінкі вымярэння* і інш., адлюстроўвае агульную структуру ведаў пра важныя фрагменты рэчаіснасці і суадносіцца са схемай «вобразу свету». Гэты «вобраз» мае ўніверсальны характар і можа быць сфармаваны на любой мове, бо з'яўляецца натуральным для чалавека. Адрозненні ў напаўненні яго лексічным матэрыялам, які ў розных мовах адлюстроўвае пераважна тую ж самую рэчаіснасць, выяўляюцца пры падыходзе да слова як апасродкаванага адбітку рэчаіснасці ў мове праз свядомасць яе носьбітаў. У сувязі з гэтым уяўляецца перспектыўным разглядаць функцыі ЛМ не толькі як рэгістратара лексічных адзінак на элементарным (дэнататыўным) узроўні іх моўнай семантыкі, але і як аснову для распрацоўкі ў межах ідэаграфічнай прэзентацыі слоўніка прыёмаў яго *канцэптуальнай мінімізацыі*, суадноснай са структурай менавіта беларускага «вобразу свету».

Сучасная лінгвістыка актыўна даследуе семантыку слоў праз прызму свядомасці, ментальнасці і моўнага вобразу свету, падкрэсліваючы, што словы не проста «здымкі» рэчаў навакольнага свету, а «партрэты» ментальныя (Е. Бартміньскі), пэўныя вобразы, што грунтуюцца на сегментацыі і катэгарызацыі свету праз свядомасць чалавека. Беларускае мовазнаўства, прыярытэты якога скіроўваліся пераважна на структурна-сістэмнае вывучэнне мовы, сёння шырока ўключае ў сваё даследчае поле канцэптуальны, ментальны змест мовы. Праз актуалізацыю розных аспектаў мовы, культуры, мыслення, свядомасці інтэрпрэтуюцца сэнсы моўных адзінак у кантэксце фрагментаў беларускай моўнай карціны свету. Гэта стварае глебу для распрацоўкі на аснове аналізу, сістэматызацыі і метадычнай інтэрпрэтацыі лінгвакагнітыўных ведаў мадэлі фарміравання лексічнага складніка камунікатыўнай кампетэнцыі ў межах інтэграванага падыходу да слова – *структурна-функцыянальнага* (узуальнае лексічнае значэнне, парадыгматычныя і сінтагматычныя сувязі слова, эксплікацыя алгарытмаў яго ўжывання ў маўленні) і *кагнітыўнага*, які актуалізуе частку значэння, звернутую ў рэальны свет, і вызначае месца прадмета ці з'явы ў сферы прадметна-лагічных адносін і шырэй – у прасторы нацыянальнай культуры. Такая мадэль, заснаваная на лінгвакагнітыўным падыходзе да арганізацыі лексічнага матэрыялу і канцэпце як спосабе арганізацыі і пабудовы кагнітыўных схем навучання, дазволіла б сістэмна рэпрэзентаваць беларускую лінгвальтурную прастору ў змесце навучання беларускай мове як замежнай і спрыяла б фарміраванню сацыякультурнага і дыскурсіўнага складнікаў камунікатыўнай кампетэнцыі іншафонаў.

У кантэксце сучасных інтэгральных падыходаў да канструявання зместу і вынікаў розных аспектаў (моўных, сацыякультурных, кагнітыўных) адукацыйнага працэсу, улічваючы недастатковую яго дыдактычную забяспечанасць (адсутнасць інтэпрэтацыйнага метадычнага матэрыялу, вучэбных дапаможнікаў для ўзроўневага навучання, слоўнікаў лінгвакультуры), ЛМ можна браць за аснову мінімізацыі і сістэматызацыі лексічнага матэрыялу з пункту погляду лінгвакультурнай інфармацыі, адлюстраванай ва ўнутранай форме слова. Праз тэматычную дыстрыбуцыю лексікі ЛМ акрэслівае ў агульных рысах семантычнае поле «вучэбнай» лінгвакультурнай прасторы, калі мець на ўвазе мадэль гэтай прасторы як культуру быцця ў шырокім сэнсе – сукупнасць рэчаў, паняццяў, нормаў, неабходных для разумення тэкстаў культуры як у вонкавых матэрыяльных знаках (*культура жылля, адзення, харчавання, культура працы, адпачынку, розныя культурныя правілы ў жыцці, ці культура самакантролю)*, так і ў знаках духоўнага свету, што сталі носьбітамі культурных сэнсаў.

Кожны тэматычны блок ЛМ уключае назвы прадметаў штодзённага побыту, прыродных з'яў, дэталяў пейзажу, паняцці матэрыяльнай культуры, якія ў свядомасці носьбітаў беларускай мовы існуюць як культурныя канцэпты, розныя паводле складанасці і абстрактнасці. Большасць паняццяў

з канкрэтна-прадметнай сферы (*дом, хата, сцяна, парог, кут*, *дуб, вярба, бусел*), якія на элементарным узроўні (А1) падаюцца ў дэнататыўным значэнні (што адпавядае камунікатыўным патрэбам гэтага узроўню), на базавым (А2) узроўні, дзе становіцца важнай сістэматызацыя слоўніка і актывізацыя лагічных, тэматычных, асацыятыўных сувязяў (бо з назапашваннем лексічнага аб'ёму магчымы працэс забывання), патрабуюць эксплікацыі сваіх культурных сэнсаў, вядомых у межах канцэптуальнага этнакультурнага дыскурсу (*дом* і *хата як канцэптуальныя структуры* атаясамліваюцца або проціпастаўляюцца, мадэлюючы ў розных кантэкстах вобраз свету*; сцяна* – перашкода, непаразуменне; *парог* – мяжа паміж «сваім» і «чужым» і *абабіць парогі; на парозе новага*; (*родны*) *дом, кут* – цэнтр «свайго» свету, сімвал роднага дому, Радзімы).

Пабудова ЛМ на аснове цэласнай структуры лексічнага значэння патрабуе адбору, сістэматызацыі і метадычнай інтэрпрэтацыі кагнітыўна дамінантнай канцэптасферы як структураваных ведаў, ментальных вобразаў, вербалізаваных у намінатыўных адзінках, і распрацоўкі спосабаў іх прэзентацыі з улікам мэтаў навучання і ўзроўню валодання беларускай мовай як замежнай.

Канструяванне ЛМ беларускай мовы для іншаземцаў як курыкулярнага дакумента, які ў значнай ступені вызначае канцэптуальныя асновы навучання лексіцы (адбор і стратыфікацыю лексікі па ўзроўнях валодання мовай, арганізацыю яе засваення і кантролю), і інтэграцыя яго ў сістэму навучання беларускай мове як замежнай на сённяшні дзень актуальная праблема, вырашэнне якой паспрыяе распрацоўцы тэарэтычных і метадычных асноў навучання іншаземцаў беларускай лексіцы, якія ўлічвалі б пазнавальную зацікаўленасць навучэнца, яго самастойнасць і імкненне да хуткага авалодання мовай. Усё адзначанае дазваляе таксама акрэсліць перспектыўны напрамак даследаванняў, звязаны з распрацоўкай ЛМ беларускай мовы на аснове складанай структуры лексічнага значэння, з улікам усіх (*элементарнага, сістэмнага, кагнітыўнага*) яго кампанентаў, які спрыяў бы авалоданню камунікатыўнай кампетэнцыяй як комплекснай катэгорыяй, што аб'ядноўвае моўны, маўленчы, сацыякультурны, дыскурсіўны, кагнітыўны, стратэгічны складнікі, і стварэннем на яго аснове вучэбных дапаможнікаў, пабудаваных з улікам дасягненняў лінгвістычнай навукі ў галіне вывучэння мовы як сродку пазнання свету.

ЛІТАРАТУРА

1. Лексічны мінімум па беларускай мове як замежнай. Элементарны ўзровень (А1). Агульнае валоданне / Л. І. Сямешка [і інш.] – Мінск: РІВШ, 2016. – 75 с; Лексічны мінімум па беларускай мове як замежнай. Базавы ўзровень (А2). Агульнае валоданне / Л. І. Сямешка [і інш.] – Мінск: РІВШ, 2017. – 112 с.

2. Беларуская мова для пачаткоўцаў / В. У. Барысенка (і інш.). – Мінск: МДЛУ, 2017. – 244 с.

3. Гаворым па-беларуску. Вучэбны дапаможнік па беларускай мове для замежных навучэнцаў/ Л. І. Сямешка (і інш.); пад рэд. Л. І. Сямешкі. – Мінск: БДУ, 1999. – 247 с.
4. *Маркина, Е. А.* Лингводидактические основы разработки лексических минимумов по русскому языку как иностранному (для разных уровней и профилей): автореф. дис… канд. филол. наук / Е. А. Маркина; Моск. гос. ун-т им. М. В. Ломоносова. – М., 2011 [Электронный ресурс]. – Режим доступа : philol.msu.ru/--ref/avtoreferat2011/markina.
5. *Костомаров, В. Г.* Принципы отбора лексического минимума / В. Г. Костомаров // Русский язык в национальной школе. – 1963. – № 1. – С. 31.
6. Лексический минимум по русскому языку как иностранному. Элементарный уровень. Общее владение / Н. П. Андрюшина, Т. В. Козлова. – М. – СПб.: ЦМО МГУ. – Златоуст, 2006.

С. М. Якуба (Мінск)

ТЭСЦІРАВАННЕ Ў СІСТЭМЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЯК ЗАМЕЖНАЙ

Працэсы інтэграцыі, што адбыліся ў еўрапейскім грамадстве ў другой палове XX стагоддзя, абумовілі пастаноўку і вырашэнне глабальных педагагічных праблем, сярод якіх – праблема фарміравання іншамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыі на аснове ўзроўняў валодання мовай. Прыняцце Саветам Еўропы дакумента «Агульнаеўрапейскія кампетэнцыі валодання замежнай мовай: вывучэнне, выкладанне, ацэнка (CEFR)», стварэнне Асацыяцыі лінгвістычных тэстараў Еўропы (ALTE), рэкамендацыя Саветам Еўрапейскага Саюза CEFR у якасці базы для стварэння нацыянальных сістэм тэсціравання дазваляе ўніфікаваць падыходы да распрацоўкі сродкаў кантролю і правядзення сертыфікацыйных экзаменаў па замежных мовах.

Нягледзячы на значныя тэарэтычныя і метадычныя напрацоўкі па стварэнні сертыфікацыйных тэстаў (выкладчыкамі БДУ, МДЛУ, БДТУ разам з сябрамі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны на аснове CEFR распрацаваны праекты стандартаў і пробная версія тыпавых тэстаў па вызначэнні ўзроўню сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі па беларускай мове як замежнай) на сёння не існуе нарматыўна-прававой і навукова-метадычнай базы для стварэння беларускай дзяржаўнай сістэмы тэсціравання грамадзян замежных краін па беларускай мове.

У сувязі з гэтым Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь прызнана актуальнай і надзённай навукова-даследчая тэма «Распрацоўка Дзяржаўнага адукацыйнага стандарта і тыпавых тэстаў па беларускай і рускай мове як замежных», якая выконваецца ў межах дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства».

Адной з задач даследавання з'яўляецца распрацоўка тыпавых тэстаў у адпаведнасці з узроўнямі валодання беларускай мовай. Стварэнне нацыянальнай сістэмы тэсціравання будзе садзейнічаць інтэграцыі беларускай сістэмы адукацыі ў сусветную адукацыйную прастору, прызнанню ў свеце сертыфікатаў аб узроўні валодання беларускай мовай, пашырыць магчымасці беларускай адукацыі на міжнародным рынку адукацыйных паслуг. Акрамя таго, стварэнне экзаменацыйных тэстаў у адпаведнасці з сертыфікацыйнымі ўзроўнямі, што напрамую звязана з распрацоўкай вучэбна-метадычных комплексаў па фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі на розных узроўнях вывучэння беларускай мовы як замежнай, рознаўзроўневых дыягнастычных і кантрольна-вымяральных матэрыялаў, дапаможа павысіць якасць адукацыі замежных студэнтаў, дазволіць на дзяржаўным узроўні ажыццяўляць стандартызаваны кантроль за дасягненнямі замежных грамадзян у вывучэнні беларускай мовы.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што тэсты і тэставыя заданні ў якасці сродку дыягностыкі і кантролю ўжо даўно ўвайшлі ў практыку выкладання беларускай мовы як замежнай, сёння нам патрэбны, гаворачы словамі М. А. Магамедавай, «кантроль новага тыпу – незалежны, аб'ектыўны, які мог бы вымераць ступень сфарміраванасці камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў незалежна ад месца, часу і формы навучання беларускай мове і выявіць дасягненне падыспытнымі пэўнага ўзроўню валодання замежнай мовай» [1, с. 1].

Пры навучанні беларускай мове як замежнай актуальным з'яўляецца не толькі якасць адукацыі, але і фарміраванне базавых і прыватных кампетэнцый. Пры кампетэнтасным падыходзе мэтай навучання выступае фарміраванне не ведаў, уменняў і навыкаў саміх па сабе, а комплексу запатрабаваных грамадствам кампетэнцый, якія дапамагаюць асобе сацыялізавацца і самаўдасканальвацца. У сувязі з тым, што працэс развіцця кампетэнцый уяўляецца як бесперапынны, то пра ступень сфарміраванасці той ці іншай кампетэнцыі можна гаварыць толькі на пэўным узроўні валодання мовай. Узровень валодання мовай, на думку Т. М. Балыхінай, варта кваліфікаваць як «ступень сфарміраванасці камунікатыўнай кампетэнцыі, якая забяспечвае магчымасць камунікаваць на … мове з выкарыстаннем неабходных навыкаў і ўменняў. Вылучэнне розных узроўняў звязана з рознай ступенню дасканаласці валодання мовай і не залежыць ад месца, часу і формы вывучэння мовы замежным грамадзянінам» [2, с. 5].

Параметрамі для вызначэння ўзроўню валодання мовай выступаюць камунікатыўныя задачы, якія трэба вырашыць пры дапамозе тых ці іншых моўных сродкаў, а таксама тэмы, сітуацыі маўлення, карэктнасць вырашэння пастаўленых моўных і маўленчых задач і інш.

Метадалагічнай базай для стварэння беларускай нацыянальнай сістэмы тэсціравання з'яўляюцца ўзроўні авалодання нацыянальнай мовай як замежнай, прызнаныя Саветам Еўропы, паводле якіх вызначаны шэсць узроўняў валодання камунікатыўнай кампетэнцыяй, чаму адпавядае шасцібальная шкала ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў агульнага валодання мовай.

Іншамоўную камунікатыўную кампетэнцыю разглядаюць як сукупнасць ведаў і ўменняў, якія дазваляюць асобе камунікаваць на замежнай мове ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай, прагматычнымі ўстаноўкамі і сітуацыяй маўлення. У сувязі з тым, што іншамоўная камунікацыя прадугледжвае яшчэ і засваенне культуры іншага народа, яго маралі, традыцый, то яна мае на мэце і фарміраванне адпаведных камунікатыўных паводзін.

Як вядома, мэтай тэсціравання з'яўляецца вызначэнне ўзроўню сфарміраванасці комплекснай камунікатыўнай кампетэнцыі, у склад якой уваходзяць моўная, маўленчая, сацыякультурная і іншыя, сродкам кантролю гатоўнасці навучэнца вырашаць тыя ці іншыя камунікатыўныя задачы ў межах пэўнага ўзроўню валодання беларускай мовай як замежнай выступае камунікатыўны тэст. Пад *камунікатыўным тэстам* вучоныя разумеюць «лінгвадыдактычны тэст, пабудаваны на камунікатыўна значным матэрыяле, які вымярае ступень сфарміраванасці камунікатыўнай кампетэнцыі падыспытнага і дазваляе ацаніць эфектыўнасць рашэння задач камунікавання і моўную правільнасць выказвання» [3, с. 13].

Асноўным патрабаваннем да камунікатыўнага тэста з'яўляецца тое, што ён павінен мець дыскурсіўны характар, мадэляваць камунікаванне, у аснову якога пакладзена маўленча-разумовая дзейнасць асобы.

Для таго каб тэст выступаў як сродак кантролю і мог аб'ектыўна ацаніць ступень сфарміраванасці камунікатыўнай кампетэнцыі, кожнае тэставае заданне павінна мець вымяральную здольнасць, а сам тэст – адпавядаць крытэрыям якасці. Сёння якасць тэста разглядаюць як яго эфектыўнасць, якая, паводле Л. Бахмана і А. Палмера, характарызуецца такімі паказчыкамі, як валіднасць, надзейнасць, эканамічнасць, аўтэнтычнасць, інтэрактыўнасць, уздзеянне, практычнасць [4, с. 13].

Пры стварэнні тэста звяртаецца ўвага на вызначэнне мінімальна дапушчальнага ўзроўню дасягненняў навучэнцаў у межах зместу камунікатыўнай кампетэнцыі, акрэсленага адукацыйнымі стандартамі для таго ці іншага ўзроўню валодання беларускай мовай як замежнай.

Варта адзначыць, што ў якасці дадатка да адукацыйных стандартаў кожнага ўзроўню прапануецца тыпавы тэст, які дапаможа праверыць ступень сфарміраванасці камунікатыўнай кампетэнцыі і на аснове якога можна арганізаваць так званае рэпетыцыйнае тэсціраванне. Што ж разумеюць пад тыпавым тэстам? На думку Т. М. Балыхінай, тыпавы тэст – гэта «метадычна мэтазгодна арганізаваны моўны і маўленчы матэрыял пэўнага ўзроўню валодання» нацыянальнай мовай як замежнай, які «перадае мадэль, структуру, змест тэставага (сертыфікацыйнага) экзамену» [2, с. 33].

Нягледзячы на тое, што першым сертыфікацыйным узроўнем з'яўляецца ўзровень В1, тыпавыя тэсты, якія маюць аднолькавую структуру, складаюцца і для пачатковага (А1), і для базавага ўзроўняў (А 2). Так, тэст для пачатковага ўзроўню прадстаўлены пяццю субтэстамі: «Лексіка. Граматыка», «Чытанне», «Пісьмо», «Аўдзіраванне», «Гаварэнне». Субтэст

«Лексіка. Граматыка» дапамагае вызначыць узровень сфарміраванасці моўнай кампетэнцыі, неабходнай для паўнавартаснага камунікавання на беларускай мове на адпаведным узроўні, і пададзены тэставымі заданнямі множнага выбару, выкананне якіх дазваляе гаварыць пра тое, у якой ступені навучэнцы засвоілі значэнні беларускіх слоў, у тым ліку і аднакаранёвых, наколькі ўмеюць выкарыстоўваць у маўленні формы іменных часцін мовы, дзеясловы, прыслоўі, службовыя часціны мовы, ужываць моўныя сродкі для пабудовы простых і складаных сказаў. Напрыклад:

1. Кніжная крама «Вянок» … каля майго дома.
   А) знаходзіць, Б) зачыняецца, В) знаходзіцца;
2. Андрусь, скажы, калі ласка, колькі … білет на спектакль «Паўлінка»?
   А) каштуе, Б) каштуюць, В) каштуем;
3. У жыце квітнелі … валошкі.
   А) сіняе, Б) сінія, В) сінюю;
4. Мой сябар цікавіцца беларускім жывапісам, … часта наведвае выставы.
   А) бо, Б) калі, В) таму.

Тэставыя заданні субтэста «Чытанне» накіраваны на праверку ўмення чытаць тэкст: вызначаць яго тэму і асноўную думку, вылучаць асноўную і дадатковую інфармацыю, пададзеную ў ім. Для праверкі чытацкіх уменняў і навыкаў у асноўным прапануюцца тэксты даступных для гэтага ўзроўню жанраў: аб’ява, анонс, рэклама, інтэрв’ю і інш. Вызначэнне ўзроўню сфарміраванасці ўменняў і навыкаў ажыццяўляецца, як правіла, на аснове аўтэнтычных ці часткова адаптаваных тэкстаў, бо якраз на іх матэрыяле фарміруецца і правяраецца сацыякультурная кампетэнцыя. Разам з тым для чытання прапануюцца і так званыя інфармацыйныя тэксты, у якіх падаюцца звесткі пра гістарычную спадчыну беларусаў, шляхі культурнага і грамадскага развіцця, пра вядомых у свеце асоб – ураджэнцаў Беларусі, прыроду і знакамітыя мясціны нашай краіны.

У залежнасці ад тыпу чытання (азнаямляльнае ці вывучальнае) рэпрэзентуюцца тэставыя заданні на ўстанаўленне адпаведнасці пададзеных выказванняў зместу тэксту, на пашырэнне сказаў інфармацыяй з тэксту, адказы на пытанні да тэксту і іншыя.

Мэта субтэста «Пісьмо» – праверыць узровень маўленчай кампетэнцыі замежных навучэнцаў на матэрыяле заданняў рэпрадуктыўнага і прадуктыўнага характару, уменне прымяняць атрыманыя веды ў працэсе камунікацыі: пісьмова адказваць на пастаўленыя пытанні з апорай на прачытаны тэкст, ствараць уласнае выказванне ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай і сітуацыяй маўлення, захоўваючы нормы сучаснай беларускай мовы. Напрыклад:

Ваш сябар набыў новую кватэру. Павіншуйце яго з гэтай падзеяй. Спытайцеся пра новае месца жыхарства, пра памеры кватэры, мэблю.

Субтэст «Аўдзіраванне» мае на мэце праверыць уменне разумець пададзеную з голасу інфармацыю ў форме маналога і дыялога, адэкватна рэагаваць на яе з улікам камунікатыўных намераў моўцы ці суразмоўцы. Напрыклад, падыспытным прапануецца наступнае заданне:

Паслухайце тэкст анонса мультфільма. Вызначце, якія з выказванняў адпавядаюць зместу праслуханага вамі тэксту.

Дыплом журы на XX Міжнародным фестывалі анімацыйных фільмаў «Крок» атрымаў беларускі мультфільм «Прыгоды Несцеркі». Мультфільм складаецца з васьмі смешных гісторый. У іх расказваецца пра прыгоды самага вядомага героя беларускіх легенд і паданняў Несцерку. Разам са сваімі сябрамі катом і сабакам ён знаходзіць выйсце з любой сітуацыі. Героі мультфільма ператвараюць гліняныя гаршкі ў музычны інструмент, выратоўваюць нявесту Несцеркі, перамагаюць Ліха.

1. Беларускі мультфільм атрымаў дыплом на XX Міжнародным фестывалі анімацыйных фільмаў «Лістапад».

2. Галоўным героем мультфільма з'яўляецца Несцерка.

3. Пра прыгоды Несцеркі расказваюць восем смешных гісторый.

4. Несцерка разам са сваімі сябрамі катом і лісой перамагае хваробу.

5. Героі мультфільма іграюць на звычайных гліняных гаршках.

6. Сябры выратоўваюць бабулю Несцеркі.

7. Несцерка з сябрамі можа знайсці выйсце з любой сітуацыі.

У адрозненне ад вышэйзгаданых субтэстаў, выкананне якіх ажыццяўляецца ў пісьмовай форме, субтэст «Гаварэнне» прадугледжвае вуснае маўленне, падчас якога ацэньваецца ўменне будаваць маналагічнае выказванне і дыялог (пачынаць дыялог, удзельнічаць у дыялогу, заканчваць дыялог) у адпаведнасці з камунікатыўнай задачай, прапанаванай тэмай і сітуацыяй маўлення, выкарыстоўваючы пры гэтым неабходныя моўныя сродкі і захоўваючы нормы беларускай літаратурнай мовы, маналагічнага і дыялагічнага маўлення, правілы маўленчага этыкету. Напрыклад:

1. Пагадзіцеся ці не пагадзіцеся з выказанай думкай. Ужывайце выразы *згодны* / *згодна з вамі, сапраўды, дазвольце не пагадзіцца*.

– На маю думку, беларускія стравы, якія мы пакаштавалі, былі вельмі смачнымі.

2. Вы заўважылі сацыяльную рэкламу «Рыба не паскардзіцца! Беражыце чысціню вадаёмаў!» Растлумачце яе сэнс свайму сябру / сяброўцы.

3. Аднавіце дыялог.

– …?

– Я сустракаю свайго калегу на чыгуначным вакзале.

Такім чынам, зварот беларускай адукацыйнай сістэмы да тэсціравання пры падрыхтоўцы сертыфікацыйных матэрыялаў па беларускай мове як замежнай азначае прызнанне гэтага метаду кантролю ў якасці найбольш эфектыўнага пры вызначэнні ўзроўню камунікатыўнай кампетэнцыі замежных грамадзян.

ЛІТАРАТУРА

1. *Магомедова, М. А.* Лингводидактическое тестирование как средство управления процессом овладения русским языком как иностранным: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / М. А. Магомедова. – М., 2007. – 19 с.
2. *Балыхина, Т. М.* Что такое русский тест? / Т. М. Балыхина. – М.: Рус. яз.; Курсы, 2006. – 55 с.
3. *Лаврова, Н. В.* Тестирование как средство измерения сформированности коммуникативной компетенции в русском языке как иностранном в сфере профессионального общения: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / Н. В. Лаврова. – М., 1999. – 20 с.
4. *Мустафина, Г. К.* Тестирование как эффективное средство контроля знаний будущих учителей английского языка: автореф. дис. … канд. пед. наук: 13.00.02 / Г. К. Мустафина. – Астана, 2009. – 25 с.

АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІНГВІСТЫКІ

С. Ф. Бут-Гусаім (Брэст)

АНАМАСТЫКОН ГІСТАРЫЧНАЙ ПРОЗЫ І НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЗІНАІДЫ ДУДЗЮК

Прадметам мастацкага аналізу ў гістарычным прыгодніцкім рамане Зінаіды Дудзюк «Велясіты» стала адна з невядомых старонак даўняй славянскай гісторыі. Пісьменніца ўзнаўляе падзеі IX–X ст. н.э. – процістаянне старажытнай славянскай дзяржавы Велясіціі Візантыйскай імперыі. У аповесці-хранографе «Славянскія князі» З. Дудзюк, абапіраючыся на звесткі, пакінутыя старажытнымі гісторыкамі, адшуквае даўнія сляды славянскіх плямёнаў – смалян, магілян, селічаў, рачан, лісічан, сапаў, люцічаў і многіх іншых – у помніках культуры чалавецтва. У зборніках эсэ «Нямеранае багацце» і «Вяртанне забытага міфа» З. Дудзюк тлумачыць паходжанне найстаражытнейшых антрапонімаў, тапонімаў, касмонімаў, вывучае сканцэнтраваную ў іменаслове легенд, міфаў, паданняў, казак, старажытных пісьмовых помнікаў культурна-гістарычную інфармацыю – захаванае і перададзенае ад продкаў да нашчадкаў нямеранае духоўнае багацце славянскіх народаў. Аўтарка не толькі малюе драматычныя падзеі і постаці мінулага. Яна тонка перадае асаблівасці светаадчування і мыслення старажытных славян. Вырашэнню гэтай мастацкай задачы спрыяе ўмелае выкарыстанне вобразна-выяўленчых магчымасцей уласных імёнаў, найперш – антрапонімаў.

Імёны, што функцыянуюць у творах, складаюць антрапанімічную прастору мастацкага тэксту. Тэрмін ***антрапанімічная прастора*** азначае «сукупнасць усіх антрапонімаў, якія ўжываюцца ў мове пэўнага этнасу

ў пэўны гістарычны перыяд» [1, с. 131]. Пісьменніца ў антрапаніміконе сваіх твораў па-мастацку прэзентуе рэальны свет, рэчаіснасць. Таму антрапанімічная прастора мастацкага тэксту з'яўляецца адлюстраваннем пэўнай этнамоўнай антрапанімічнай прасторы, якая аб'ектыўна склалася і існуе ў тую ці іншую гістарычную эпоху. Ствараючы антрапанімічны свет свайго твора, аўтарка выбірае адпаведныя месцу, часу, этнакультурнаму рэгіёну, у якім разгортваюцца падзеі, онімы.

Творы З. Дудзюк цікавыя і адметныя спалучэннем свету рэальных падзей і постацяў айчыннай гісторыі са светам падзей і персанажаў, народжаных уяўленнем аўтаркі. Таму ўсе зафіксаваныя ў творах антрапонімы мы можам падзяліць на дзве групы. Па-першае, гэта імёны рэальных гістарычных асоб, па-другое, гэта празванні персанажаў, створаныя фантазіяй пісьменніцы.

Значную частку антрапанімікону гістарычных твораў складаюць імёны рэальных гістарычных дзеячаў, валадароў тагачасных дзяржаў свету: славянскіх князёў ***Вакаміра, Драгавіта***, ***Мусокія, Пірагаста, Людавіта,*** імператара Вялікай Рымскай імперыі ***Карла***, булгарскага хана ***Крума***, візантыйскіх базілеўсаў ***Канстанціна, Льва, Нікіфара,*** базілісы ***Ірыны***, патрыярха ***Мікалая III***, каліфа ***Гаруна-аль-Рашыда*** і інш.

Аўтарка не раз выкарыстоўвае прыём актуалізацыі ўнутранай формы імені рэальнай гістарычнай асобы. Напрыклад, князь Велясіціі мае імя ***Вакамір***. Кантэкст рамана «Велясіты» напаўняе гэтае найменне глыбінным сэнсам. Празванне валадара велясітаў утрымлівае інфармацыю пра даўнія вандроўкі славянскіх плямёнаў па Еўропе і Азіі. Сын князя наведаў мёртвы горад у далёкай пустыні, дзе яму расказалі пра тое, што «*ў такім горадзе была пабудавана вежа, на якой прымацаваны вялізны празрысты крышталь, праз які чараўнікі разглядалі зорнае неба і чыталі боскія тайны лёсаў. Гэты крышталь называўся* ***вокам свету [міру]***. ***Мір*** *на славянскіх мовах азначае не толькі згоду, адсутнасць вайны, але і свет. Выходзіць, што і продкі славян ведалі пра гэта цудоўнае вока*» [2, с. 117]. Згодна з традыцыяй таго часу асабовыя імёны палітычных дзеячаў ужываліся ў некалькіх фармальных разнавіднасцях. Так, рамеі (візантыйцы) называлі князя ***Акамірам***: «*магчыма, першыя тры літары ім нагадваюць слова "****аква****" – вада*» [3, с. 24].

Нашы продкі разумелі імя матэрыяльна, як неад'емную частку іменаванага, верылі ў тое, што імя прадвызначае жыццёвы шлях чалавека. Вера ў сувязь імені і лёсу яго носьбіта выявілася ў звычаі надаваць немаўляці імя боства, якое будзе ахоўваць носьбіта празвання ад небяспекі. Так, князь ***Веляслаў*** быў названы ў гонар ***Вялеса***: «*Ён носіць імя <u>бога, які спрадвеку апекуецца іхнім родам і гаспадаркаю</u>*» [3, с. 21]. У цяжкія хвіліны жыцця ***Веляслаў*** просіць падтрымкі і спрыяння ад пакравіцеля шляхоў і падарожных, магутнага чараўніка ***Вялеса***: «*Магутны* ***Вялесе*** *і духі продкаў, звяртаюся да вас з просьбаю. Дапамажыце мне ва ўсіх задумах і здзяйсненнях, дайце мудрасці і сілы*» [3, с. 53]. Сляды пакланення нашых продкаў язычніцкім багам можна знайсці і ў сучасным антрапаніміконе. Пісьменніца адзначае, што імёны бостваў ляжаць у аснове найменняў магутных правадыроў славянскіх плямёнаў: «*Хоць у гістарычных крыніцах гэта імя запісана*

*як **Ардагаст**, хутчэй за ўсё, па-славянску яно гучала як **Радагост**, або **Радагосць**. Слова Ардагаст дзеліцца на дзве часткі: арда (зменена "**рада**") і гаст (сэнсава адпавядае слову "**госць**"). Прынамсі, **Радагостам** называўся галоўны бог паморскіх славян. У якасці антрапоніма гэтае імя было распаўсюджана ў старажытнабалгарскай, старых чэшскай і польскай мовах*» [4, с. 214]; «***Вышан** – князь славянскага племені абадрытаў. Магчыма, імя магло гучаць як **Вышань**, бо **так называўся адзін з галоўных язычніцкіх багоў, у якім увасабляўся дух Усявышняга***» [4, с. 246].

«Слова *імя* ўзыходзіць да індаеўрапейскага *nmen- з *enmen-, якое тлумачаць як утварэнне ад *en "унутры", "у" + -men (суфікс). Адсюль – найстаражытнейшая семантычная інтэрпрэтацыя імені як таго, што ўкладваецца, накладваецца, ускладаецца» [5, с. 23]. **Стваральная** прырода называння праяўлялася ў функцыянаванні так званых **імёнаў-пажаданняў,** якімі нібыта накрэсліваўся лёс старажытных валадароў: «***Валук** – князь венедаў. Імя гэтае паходзіць ад слова "**ўладыка**" і азначала ў славян вярхоўнага **кіраўніка, правадыра** ці **князя.** Магло паходзіць імя і ад слова «**вялікі**», якое, магчыма, уваходзіла ў склад княжацкага тытула*» [4, с. 235]. З. Дудзюк адзначае, што ў славян былі пашыраны **засцерагальныя** імёны, якія, маючы адмоўны сэнс, павінны былі адхіліць беды, хваробы і смерць: «***Нябул** – славянскі князь, імя якога паходзіць ад дзеяслова "**не быў**" і з'яўляецца ахоўным ад злых духаў, дарэчы, на палескім дыялекце гэтыя словы вымаўляюцца як "**не буў**"*» [4, с. 241].

У даўніх імёнах, якія данеслі да нас казкі і легенды, фіксуюцца ўяўленні нашых продкаў пра будову Сусвету. Ён уяўляўся старажытным славянам як адзінства неба, зямлі і свету падземнага. З зямлі можна было падняцца да неба і трапіць у царства памерлых. Вось зямлі пранізвала Сусвет і звязвала неба, зямлю і апраметную ў адно цэлае. Воссю зямлі было Сусветнае Дрэва Жыцця, гара або камень. Галоўным героем беларускай казкі «***Сіняя Світа Навыварат Сшыта Саламяны Каўпак***» з'яўляецца чараўнік, які можа мяняць свой выгляд як заўгодна. Каб абхітрыць цара, чараўнік ператвараецца ў звяроў, рыбу, іголку і просіць дапамогі ў птушкі Нагай, якая жыве на тым свеце. ***Сіняя Світа Навыварат Сшыта*** пераходзіў з таго свету ў гэты, мяняючы абліччы. Пісьменніца тлумачыць сакральны сэнс імені гэтага персанажа: «***Сіняя Світа Навыварат Сшыта** – гэта не што іншае, як неба. Мы бачым вонкавы бок неба, а герой казкі ведае яго з сярэдзіны, з левага боку. **Саламяны Каўпак** – другая частка імя – гэта таксама намёк на нябесны купал ці, можа, нават на сонца… Галоўны персанаж казкі не проста чалавек, гэта хутчэй пасланец неба, каб пазмагацца з зямным царом-чарадзеем, перамагчы яго ды ажаніцца з ягонай дачкою, яднаючы зямлю і неба. Гэтак неба яднаецца з зямлёю праз Вечнае Дрэва Жыцця, каб прадоўжыць існаванне свету*» [5, с. 22–23].

Што да імёнаў персанажаў, створаных фантазіяй пісьменніцы, то найменні гэтыя адлюстроўваюць мадэлі іменавання, якія існавалі ў старажытных славянскіх дзяржавах. Даследчык У. А. Ніканаў пісаў: «Уласнае імя існуе толькі ў грамадстве і для грамадства; яно і дыктуе няўмольна выбар іх,

якім бы індывідуальным ён ні ўяўляўся» [6, с. 158]. Імёны ў старажытным грамадстве былі сацыяльна інфарматыўнымі. Так, героі рамана «Велясіты», якія з'яўляюцца прадстаўнікамі вышэйшых саслоўяў, маюць складаныя імёны: княгіня ***Міраслава***, вядун ***Святаслаў*** і інш. У такіх імёнах адлюстравана найстаражытнейшая традыцыя ***імяслаўя***. Празванні ўтрымлівалі пажаданне чалавеку стаць вялікім, магутным, моцным, слаўным валадаром або святаром. Імёны прадстаўнікоў ніжэйшых саслоўяў уяўляюць сабой празванні-мянушкі, якія адлюстроўваюць знешнасць (***Агнян, Злаціца, Лілея***), характар чалавека (***Радуня, Весяліна, Гаразд, Храбр***), абставіны нараджэння (***Обрыч*** быў народжаны славянскай жанчынай ад ***обра*** – прадстаўніка цюркскага племені), адносіны да дзіцяці ў сям'і (***Любім***). Апатрапеічнае (ахоўнае) імя ***Неўдах*** (Нешчаслівы) павінна было адпужваць духі няўдачы ад чалавека.

Пісьменніца фіксуе даўні звычай нашых продкаў – набываць новае імя пры пераходзе ў іншы ўзроставы, сацыяльны статус. Аўтарка адзначае, што ў старажытнасці людзі былі ўпэўнены ў ***пераўтварэнні*** чалавека, які набывае новае празванне. Сын князя ***Веляслаў*** трапляе ў палон і праходзіць цяжкія выпрабаванні, каб вярнуць найдаражэйшую каштоўнасць – ***волю***. Набываючы яе, юнак бярэ новае імя: «*Самая галоўная рэч на гэтым свеце – **воля**. Толькі з ёю ты належыш сам сабе, а без яе чалавек ператвараецца ў жывёлу, з якою можна зрабіць што заўгодна. Заві мяне проста **Воля**. Я – гэта **Воля**. Калі няма **Волі**, няма і мяне*» [7, с. 16]. Вандруючы па мусульманскіх краінах разам з сябрам і паплечнікам Мусой, славянскі князь атрымлівае імя ***Хасан Сакр*** (***Прыгожы Сокал***). ***Сакалібамі (сокаламі)*** мусульмане называлі славян, а азначэнне ў складзе імені перадае знешнюю і ўнутраную прыгажосць маладога чалавека. Адзначым, што імёны народнасці і чалавека ***Сокал*** маюць татэмістычнае напаўненне: на ранніх этапах развіцця ўсходнеславянскай імянной сістэмы найменні плямёнаў былі непасрэдна звернуты да свету прыроды, часткай якой былі і людзі. Продактатэм персаніфікаваў сабой чалавечы калектыў і як бы існаваў ў кожным яго члене, што выражалася ў імёнах. У этноніме і антрапоніме ***Сокал*** адлюстраваны водгалас уяўленняў пра татэмнага продка славянскага племені.

Дахрысціянскія імёны часта ўтвараліся на базе найменняў раслін і жывёл. Я. Станкевіч адзначаў ***дэзідэратыўны (пажадальны)*** характар такіх імёнаў: «Даючы такія й падобныя ймёны, бацькі ймёнамі выказвалі свае зычэньні дзецяняці, зычылі, каб сын быў дужы, як мядзьведзь, тур, вол; хітры, як ліс; адважны, як арол, сакол; цьвярды, як дуб; каб дачка была любовая, як зязюля; харошая, як ластаўка, краска, кветка» [8, с. 96]. На старонках твораў З. Дудзюк многа паганскіх імёнаў, утвораных на базе найменняў жывых істот. Носьбіты такіх празванняў нібыта роднасныя тым жывёлам, птушкам і раслінам, назвы якіх сталі асновай гаваркіх імёнаў. У аснове язычніцкага імені княгіні ***Дубраўкі*** ляжыць апелятыў са значэннем '*лес са значнай колькасцю **дубоў** і маладога **дубняку***'. ***Дуб*** у славянскай міфалогіі – сімвал вечнага жыцця. Верхняя частка дуба сімвалізуе свет

вечнасці, а карані адпавядаюць зоне захавання продкаў. Каля каранёў знаходзіцца ўваход у трыдзявятае царства – царства смерці. «***Дубравы*** старажытнымі славянамі лічыліся свяшчэннымі, былі звязаны з культам продкаў, уяўляліся месцам, дзе захоўваліся душы дзядоў» [9, с. 147]. Імя ***Дубраўка*** адпавядае надзвычайным здольнасцям жанчыны, якая тонка адчувае нябачны свет духаў і можа адкрываць будучыню ў прарочых снах. Страціўшы мужа-князя, ***Дубраўка*** самаахвярна кідаецца ў пахавальны агонь, каб суправаджаць Вакаміра ў царства памерлых.

Сродкам увасаблення прасторава-часавых адносін у мастацкіх і навукова-папулярных творах з'яўляюцца ***тапонімы.*** Несумненны інтарэс у чытача выклікаюць «схаваныя» ў ***тапонімах*** звесткі пра гісторыю паселішчаў – пра іх заснавальнікаў, даўнія плямёны, якія некалі жылі ў гэтых мясцінах. Зінаіда Дудзюк у зборніку «Вяртанне забытага міфа» адзначае: «*Забытае і праклятае хрысціянамі паганства працягвае сваё незаўважнае жыццё ў звыклых назвах, словах і абрадах беларусаў*» [10, с. 39]. Раскрываючы таямніцы старажытнай веры, пісьменніца шукае ключ да разумення матывацыі празванняў людзей (***антрапонімаў***) і назваў населеных пунктаў (***тапонімаў***), у якіх захавалася вера старажытных славян: «*Вывучаючы назвы беларускіх паселішчаў, я прыйшла да высновы: на нашу тапаніміку паклала след ведычная міфалогія. Магчыма, прадстаўнікі гэтай рэлігіі, брахманы ці будысты, сяліліся на нашай зямлі, неслі святло сваіх ведаў і ўяўленні пра Сусвет. Гэта былі місіянеры, якіх удосталь і ў наш час. Міфалагічны персанаж* "*Рыгведы*" ***Вішну*** *– адзін з трох галоўных багоў індыйскага пантэону, бог-ахоўнік і стваральнік, які за тры крокі праходзіць Сусвет. Між тым у тапаніміцы Беларусі мне сустрэліся наступныя назвы:* ***Вышамір, Вышкава, Вышэль, Вышчын, Вішне, Вішневічы, Вышні, Вішаў, Вішня, Вешня, Вушэнь, Вышадкі, Вішнараўшчына*** *і шмат іншых*» [9, с. 137]; «*У славян вельмі шанаваўся адзін з галоўных багоў язычніцкага пантэону* ***Вялес (Волас)****. Каб свойская жывёла не хварэла і не траціла плоднасці, каб ураджай быў багаты, людзі стараліся дагадзіць* ***Вялесу****, здзяйснялі ў ягоны гонар пэўныя абрады, прыносілі ахвяры. Асабліва шанаваўся Вялес на тэрыторыі Беларусі. У гонар* ***Вялеса*** *было названа сузор'е –* ***Валасажары, Валасыны*** *(цяперашняя назва Пляяда). Зрэшты, на Берасцейшчыне даволі пашыраныя прозвішчы* ***Велясевіч, Валасевіч, Волас, Валаско, Власюк, Волах, Валашанюк, Валошка, Валошчык, Валашчук****,* ***Волх****, што паказвае на магчымую прыналежнасць уласнікаў гэтых прозвішчаў да племя, якое пакланялася* ***Вялесу****. Відавочна, што паходжанне беларускіх тапонімаў (горад* ***Вільня****, рака* ***Вялля*** *і яе левы прыток* ***Вільня****) звязана з пакланеннем* ***Вялесу****. Акрамя гэтага, па ўсёй Беларусі раскіданы назвы паселішчаў, якія таксама паходзяць ад імя бога* ***Вялеса (Воласа): Воласаўцы, Воласава, Валасовічы, Велясніца*** *і іншыя*» [10, с. 28]. І хоць у сваіх разважаннях аўтар нярэдка падкрэслівае, што гэта яе асабістае бачанне праз «*інтуіцыю, праз адчуванне на генным узроўні тых ці іншых праяў беларускасці*», але нярэдка бывае так, што таленавітае мастацкае, паэтычнае прадбачанне папярэднічае навуковаму адкрыццю ісціны.

Лад жыцця нашых продкаў і сучаснікаў вызначаўся цыклам каляндарных свят, у якіх складаным чынам пераплятаюцца язычніцкія вераванні і хрысціянства. Зінаіда Дудзюк шырока выкарыстоўвае ***геартонімы***, суправаджаючы іх гістарычнымі і культуралагічнымі заўвагамі: «*Старажытнае абрадавае свята* ***Купалле*** *славяне прымяркоўвалі да летняга сонцастаяння – часу найбольшага красавання і росквіту зямлі. Яно персаніфікавалася ў вобразах міфічных істот* ***Купалы*** *і* ***Купалінкі****. У выніку пазнейшых наслаенняў на язычніцкі абрад хрысціянскай традыцыі свята прывязалася да дня нараджэння* ***Іаана Хрысціцеля****. У народзе свята стала называцца* ***Іванам Купалам****. У гэты ж дзень святкавалі імяніны* ***Святой Аграфены Купальніцы***» [10, с. 12].

Такім чынам, у творах З. Дудзюк па-мастацку адлюстраваны не толькі іменаслоў даўняй пары, але і адчуванне старажытным чалавекам свету праз імя – неад'емны складнік асобы, які праграмуе лёс, звязвае з татэмным продкам, абараняе чалавека ад злых сіл, аб'ядноўвае з сям'ёй, родам, племенем.

ЛІТАРАТУРА

1. *Хрышчановіч, Л.* «Па імені і жыццё»: антрапанімічная прастора беларускай народнай казкі / Л. Хрышчановіч // Роднае слова. – 1999. – № 5–6. – С. 131–139.
2. *Дудзюк, З. І.* Велясіты. Ч. 3 / З. І. Дудзюк // Маладосць. – 2005. – №. 4. – С. 110–132.
3. *Дудзюк, З. І.* Велясіты. Ч. 1 / З. І. Дудзюк // Маладосць. – 2005. – №. 2. – С. 18–87.
4. *Дудзюк, З. І.* Славянскія князі : аповесць-храніограф / З. І. Дудзюк // Кола Сварога. – Мінск : Беларусь, 2006. – С. 202–258.
5. *Дудзюк, З. І.* Нямеранае багацце : эсэ / З. І. Дудзюк. – Брэст : Альтернатива, 2012. – 82 с.
6. *Никонов, В. А.* Личное имя – социальный знак / В. А. Никонов // Сов. этнография. – 1967. – № 5. – С. 157–168.
7. *Дудзюк, З. І.* Велясіты. Ч. 2 / З. І. Дудзюк // Маладосць. – 2005. – №. 3. – С. 5–23.
8. *Станкевіч, Я.* Хрышчоныя імёны вялікалітоўскія / Я. Станкевіч // Спадчына. – 1992. – № 6. – С. 96–101.
9. Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўнік / С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.
10. *Дудзюк, З. І.* Вяртанне забытага міфа / З. І. Дудзюк. – Мінск : Беларусь, 2013. – 144 с.
11. *Рогалёв, А. Ф.* Введение в антропонимику. Именование людей с древнейших времён до конца XVIII века (на белорусском антропонимическом материале) / А. Ф. Рогалёв. – Брянск : Группа компаний «Десяточка», 2009. – 147 с.

Л. В. Вікторка (Мінск)

ЗБЕЛАРУШЧАНЫ СВЕТ: З ДОСВЕДУ ЎКЛАДАННЯ «АНГЛІЙСКА-БЕЛАРУСКАГА СЛОЎНІКА ГЕАГРАФІЧНЫХ НАЗВАЎ І АСАБОВЫХ ІМЁНАЎ»

З усяго шэрагу ўласных імёнаў геаграфічныя назвы і асабовыя імёны з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі у розных дыскурсах. Ім прысвечаны розныя слоўнікі – тлумачальныя і перакладныя. Яны падаюцца таксама ў дадатках і ўваходзяць у слоўнікавыя артыкулы ў складзе фразеалагічных адзінак, прыкладаў і г.д. На жаль, да гэтага часу не існавала ніводнага англійска-беларускага слоўніка, які б уключаў геаграфічныя назвы і асабовыя імёны, не гаворачы ўжо пра спецыяльныя перакладныя слоўнікі ўласных імёнаў, якія ўжо даўно зроблены ў іншых краінах на матэрыяле розных пар моў.

«Англійска-беларускі слоўнік геаграфічных назваў і асабовых імёнаў» з'яўляецца прадаўжэннем «Англійска-беларускага слоўніка», які выпусціла ў свет выдавецтва «Вышэйшая школа» ў 2013 годзе. Дадатак, што складаўся з геаграфічных назваў і асабовых імёнаў, не быў уключаны ў слоўнік па пэўных прычынах.

Слоўнік складаецца з дзвюх частак – геаграфічных назваў і асабовых імёнаў і ўключае найбольш распаўсюджаныя геаграфічныя назвы свету і асабовыя імёны, але найбольшая ўвага надаецца англамоўным геаграфічным назвам і шырока ўжываным асабовым імёнам.

Геаграфічныя назвы ўключаюць 860 адзінак. Гэта назвы англамоўных краін і найбольш распаўсюджаныя назвы іншых краін свету, гарадоў, гор, астравоў, водных аб'ектаў і іншых. Асабовыя імёны прадстаўлены 730 адзінкамі. Гэта найбольш распаўсюджаныя імёны ў Вялікабрытаніі і ЗША. Пры выбары назваў і імёнаў нам дапамагалі доктар філалогіі П. Дж. Мэё (Вялікабрытанія) і прафесар кафедры лексікалогіі МДЛУ Т. М. Суша.

Алгарытм перадачы назваў і імёнаў быў распрацаваны пры навукова-метадычным цэнтры «Слоўнік» (МДЛУ) [1, с. 38–39; 2, с. 1–13; 3, с. 257–258].

Імёны і назвы заўсёды займалі асаблівае месца ў камунікацыі. Дадзеная група слоў узнікла і існуе як сродак вылучэння індывідуальнага з масавага, адзінкавага з агульнага. Гэта спецыфічная функцыя ўласных імёнаў вызначае іх своеасаблівасць, лінгвістычную і сацыяльную значнасць.

У час сусветнай глабалізацыі, калі павышаецца ўзровень валодання замежнымі мовамі, ідзе абмен мастацкай і навуковай літаратурай, расце цікавасць да міжнародных падзей і персаналій, уласныя імёны актыўна пранікаюць па-за межы той культурна-моўнай прасторы, для якой яны з'яўляюцца звыклымі. Для працэсу міжмоўных зносін правільнасць перадачы імя з'яўляецца істотнай. У гэтым рэчышчы актуальнай праблемай стала перадача іншамоўных назваў і імёнаў з адной мовы на другую.

У кожнай мове іншамоўныя словы, у тым ліку геаграфічныя назвы і асабовыя імёны, адаптуюцца ў адпаведнасці з яе ўнутранымі законамі. Але

ўласнае імя – глыбока нацыянальна-культурная рэалія, і мэта перакладчыка і з утылітарнага, і з этычнага пункту гледжання – як мага дакладней узнавіць форму ўласнага імя, выкарыстоўваючы ўсе аптымальныя сродкі.

У гэтай галіне лінгвістычных распрацовак беларуская мова доўгі час знаходзілася пад уплывам нормаў і традыцый рускай мовы, якая звычайна выкарыстоўвалася ў якасці прамежкавай мовы. Пры гэтым зусім не ўлічвалася тое, што фаналагічныя сістэмы рускай і беларускай моў, нягледзячы на агульныя рысы, маюць шмат адрозненняў. Вынікам гэтага з'яўляюцца разнастайнасць і непаслядоўнасць у перадачы англійскіх асабовых імёнаў і геаграфічных назваў. Як паказваюць назіранні, мастацкія тэксты, сродкі масавай інфармацыі і нават даведнікі і энцыклапедыі напоўнены недакладнымі і памылковымі адпаведнікамі англійскіх уласных імёнаў.

У беларускай пісьменнасці, як вядома, у якасці алфавіта ўжываецца кірыліца. Гэта прадвызначае сабой тое, што перадача іншамоўных назваў, напісаных з дапамогай іншага алфавіта, у беларускай мове адбываецца не шляхам узнаўлення графічнага вобраза слова, як гэта мае месца ў мовах, якія карыстаюцца лацінскім алфавітам, а фіксаваннем яго гукавага вобраза, гэта значыць фанетычным спосабам. Таму пры перадачы на беларускую мову англійскія назвы не транслітаруюцца, а хутчэй транскрыбіруюцца: англійскія фанемы, якія ўваходзяць у склад пэўнай англійскай назвы, выражаюцца адпаведнымі беларускімі фанемамі. А паколькі ў беларускай мове існуе фанетычны правапіс, і ў выніку гэтага кожнай беларускай фанеме ў пераважнай большасці пастаянна адпавядае і пэўная літара, то можна сказаць, што англійскія фанемы перадаюцца адпаведнымі беларускімі літарамі, за выключэннем некаторых выпадкаў.

Асноўным спосабам, які намі выкарыстоўваўся, з'яўляецца практычная транскрыпцыя. У яго аснове ляжыць прынцып фанетычнага падабенства. Разам з гэтым практычная транскрыпцыя павінна, калі гэта магчыма, захоўваць марфемную структуру слова, яго графічныя асаблівасці, фанемныя супрацьпастаўленні мовы-крыніцы, а таксама забяспечваць лёгкасць засваення гэтага слова ў мове перакладу. Сучасная тэорыя і практыка ў гэтай вобласці зыходзяць з таго, што ў мове перакладу належыць з магчымай паўнатой адлюстраваць фанетычныя і граматычныя асаблівасці мовы-крыніцы. Галоўным патрабаваннем пры перадачы іншамоўных імёнаў на мову перакладу з'яўляецца, па-першае, тое, што слова павінна быць пазнаным, а яго пазнаванне павінна адбывацца на двух узроўнях: моўным і камунікатыўным. Але разам з гэтым прызнаецца непажаданым лішні фанетызм і наогул «механічнае ўзнаўленне слова». Страта інфармацыі непазбежная ўжо з прычыны неадэкватнасці структур нават блізкароднасных моў [4, с. 45].

Такім чынам, выкарыстанне спосабу практычнай транскрыпцыі павінна адбывацца згодна з прынцыпам ўліку марфалагічных і граматычных асаблівасцей мовы-крыніцы і мовы перакладу, прынцыпам мілагучнасці, уліку гістарычнай традыцыі, а таксама нацыянальна-моўнай прыналежнасці імя. Павінна таксама быць і строгая паслядоўнасць пры перадачы аднолькавых

і аналагічных імёнаў, што, на жаль, не заўжды захоўваецца. Адным з патрабаванняў з'яўляецца магчымасць адваротнай транскрыпцыі, гэта значыць, магчымасць вяртання слова ў мову, з якой яно прыйшло ў такім выглядзе, каб яго можна было пазнаць.

Згодна з вышэйназванымі патрабаваннямі і асаблівасцямі перадачы назваў і імёнаў на беларускую мову практычная транскрыпцыя выкарыстоўвалася намі ў выпадках, калі ў англійскай і беларускай мовах былі прыблізныя гукавыя эквіваленты. Але паколькі ў запазычаных уласных імёнах важная роля належыць таксама і графічнаму вобразу слова, мы таксама выкарыстоўвалі некаторыя элементы транслітарацыі, калькаванне і змешаны спосаб.

Трэба ўлічваць, што пры міжмоўнай камунікацыі вялікая колькасць інфармацыіі перадаецца і ў пісьмовым выглядзе, таму асаблівасці напісання ўласнага імя таксама дапамагаюць больш дакладна ідэнтыфікаваць яго носьбіта. У выпадку выкарыстання элементаў транслітарацыі пры перадачы імя будзе лягчэй узнавіць яго зыходную форму ў мове-крыніцы.

Напрыклад, у англійскай мове існуюць імёны, якія адрозніваюцца толькі графічна (*Bann**ar*** – *Bann**er***). У такіх выпадках слушна перадаваць спалучэнні *ar* і *er* пры дапамозе транслітарацыі (*Бэн**ар*** – *Бэн**эр***). Транслітарацыяй мы карысталіся таксама пры перадачы гука [з:], які ў англійскай мове перадаецца на пісьме пры дапамозе галоснай літары і літары *r* (***Jer**sey* – *Джэ**р**сі*), і гука [ŋ], які на пісьме перадаецца спалучэннем *ng* (*Readi**ng*** – *Рэды**нг***).

Калькаванне ўжывалася намі ў перадачы назваў акіянаў, мораў ды інш. (*Pacific Ocean* – *Ціхі акіян*).

Пры пераходзе з адной мовы ў іншую запазычанае ўласнае імя, як і любое іншае запазычанае слова, імкнецца знайсці сваё месца ў сістэме мовы перакладу. Для гэтага яму трэба атрымаць адпаведнае фанетычнае і арфаграфічнае афармленне. Пры гэтым адбываюцца шматлікія марфалагічныя перараскладанні, асацыяцыі і дысацыяцыі, прадыктаваныя спецыфікай мовы, якая запазычвае імя. Так намі выкарыстоўваўся прынцып адаптацыі імя да граматычнай сістэмы беларускай мовы, г.зн. у тых выпадках, дзе гэта было мэтазгодна, дадаваліся канчатакі жаночага роду (*Susan* – *Сузана*) ці множнага ліку (*Cumbrians* – *Камбрыйскія горы*).

Транскрыпцыя іншамоўных імёнаў часта мае сваім вынікам з'яўленне не ўласцівых беларускай мове гукавых і літарных спалучэнняў, што робіць іх цяжкімі для чытання і вымаўлення. Прынцып мілагучнасці можа паўплываць на правілы практычнай транскрыпцыі, каб зрабіць вымаўленне імя ў мове перакладу больш зручным і натуральным.

Так напрыклад, беларускай мове не ўласцівы збег галосных у межах адной марфемы, таму ён раздзяляецца зычным дзеля гармоніі гукаў. Гэтаму закону падлягаюць і словы іншамоўнага паходжання, дзе спалучэнне галосных раздзяляе зычны гук [й]. Такім чынам, атрымоўваем: *іо* (*ыо*) → *іё* (*ыё*), *іа* (*ыа*) → *ія* (*ыя*), *іу* (*ыу*) → *ію* (*ыю*), *эо* (*ео*) → *іё* (*ыё*), *эа* (*еа*) → *ія* (*ыя*).

Збег галосных *ау, оу* нейтралізуецца за кошт пераходу галоснага гука [у] у зычны гук [ў] [5, с. 97; 6, с. 12–13]. Такім чынам, згодна з правіламі беларускай фанетыкі атрымліваем *Christ**ia**на – Крыст**ыя**на* (а не *Крыстыана*), *Cor**ya**t – Кор**ыя**т* (а не *Корыат*).

Беларуская літаратурная мова мае адметныя заканамернасці і ў спалучэнні (збегу) зычных. Гукі *л, р* сустракаюцца выключна перад галоснымі ці пасля іх [7, с. 74]. Пры збегу зычных у суседстве з санорным паміж імі ўзнікае беглы галосны [6, с.14–15]. Англійскія імёны тыпу *Gord**o**n*, *Has**e**l* пры вымаўленні маюць менавіта такі збег. У англійскай мове канцавыя санорныя, якія стаяць пасля зычных гукаў, з'яўляюцца складаўтваральнымі. Такім чынам, спалучэнні гукаў [dn], [zn], [zl] і да т.п. перадаюцца на беларускую мову пры дапамозе транслітарацыі: *Gord**o**n – Горд**а**н*, *Has**e**l – Хэйз**э**л,* што дазваляе, па-першае, пазбегнуць непажаданага ў беларускай мове збегу зычных, і, па-другое, захаваць аднолькавую колькасць складоў у імені ў мове-крыніцы і мове перакладу.

Працэс запазычання імёнаў у беларускую мову ідзе ўжо доўгі час. У шэрагу выпадкаў па розных прычынах імёны падпадалі пад неапраўданую дэфармацыю. Найбольш ужывальныя з такіх няправільных транскрыпцый, на жаль, становяцца традыцыйнымі і змяніць іх, як бы гэта ні было мэтазгодна, амаль што немагчыма. Наўрад ці прыжыліся б цяпер у беларускай мове напісанні (з улікам правілаў практычнай транскрыпцыі) такіх вядомых назваў, як *London – Ландан (Лондан), Twain – Туэйн (Твэн), Bacon – Бэйкан (Бэкан).* Таму традыцыйны спосаб таксама захоўваўся. Але ў выпадку, калі няправільная транскрыпцыя яшчэ не стала традыцыйнай з-за параўнальна малой ужывальнасці імя, мы імкнуліся замяніць яе больш адэкватным варыянтам, асабліва ў выпадках, дзе пры перадачы традыцыйным спасабам адбывалася скажэнне слова да непазнавальнасці (напрыклад, *Отава* замест *Атава*, *Мэйн* замест *Мэн*).

У некаторых выпадках падаваліся два або тры варыянты перадачы назвы – новы і традыцыйны (напрыклад, *Кэнзас, Канзас; Ліверпул, Ліверпуль*). Варыятыўнасць захоўвалі, каб перакладчыкі маглі выбраць той варыянт, які больш падыходзіць да таго ці іншага тэксту ці для мэты камунікацыі.

Часам імёны, якія маюць, напрыклад, біблейскую традыцыю перадачы, з'яўляюцца раўнапраўнымі і прадуктыўнымі беларускімі імёнамі: *Jacob – Якаў, Luke – Лука, Paul – Павел.* Шмат якія з іх маюць агульнае паходжанне, але, засвоеныя паводле законаў мовы і вымаўленчых норм свайго народа, набылі такое гучанне, што цяжка ўявіць сабе, што яны паходзяць ад аднаго імя. Таму ў слоўнікавым артыкуле пад нумарам 2 падаецца перадача біблейскага імя (*John – бібл. Іаан*), або гістарычнага (*Cornelius – гіст. Карнелій*) ці міфалагічнага (*Doris – міф. Дарыда*).

Такім чынам, перадача іншамоўных асабовых імёнаў з адной мовы на іншую з'яўляецца вельмі адказнай працай, таму што для яе паспяховага выканання патрабуюцца веды як лінгвістычныя, так і экстралінгвістычныя, а таксама ўмелае і далікатнае іх спалучэнне.

Спадзяемся, што слоўнік будзе карысным не толькі для студэнтаў МДЛУ, але для ўсіх, хто мае дачыненне да перакладу з англійскай мовы на беларускую.

ЛІТАРАТУРА

1. *Таболіч, А. У.* Лінгвістычныя асновы перадачы англамоўных геаграфічных назваў у беларускай мове / А. У. Таболіч // Vocabulum et vocabularium: Сб. науч. тр. по лексикографии. – Гродно, 1998. – С. 37–39.
2. *Вікторка, Л. В.* Лінгвістычныя асновы перадачы англійскіх уласных асабовых імёнаў на беларускую мову / Л. В. Вікторка // Прэпрынты МДЛУ, № 137. – Мінск : МДЛУ, 2003. – 38 с.
3. *Вікторка, Л. В.* Сацыякультурная прастора англійскага і беларускага асабовага імя ў супастаўляльным аспекце / Л. В. Вікторка // Дни науки МГЛУ: Материалы ежегод. науч. конф. преподавателей и аспирантов ун-та, Минск, 25–26 апр. 2012 г. / МГЛУ; редкол.: Н. П. Баранова [и др.]. – Минск, 2012. – Ч. 4. – С. 254–258.
4. *Суперанская, А. В.* Теоретические основы практической транскрипции / А. В. Суперанская. – М. : Наука, 1978. – 255 с.
5. *Падлужны, А. І.* Фаналагічная сістэма беларускай літаратурнай мовы / А. І. Падлужны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 142 с.
6. *Сцяцко, П. У.* Культура мовы / П. У. Сцяцко. – Мінск : Тэхналогія, 2002. – 444 с.
7. *Падлужны, А. І.* Нарыс акустычнай фанетыкі беларускай мовы / А. І. Падлужны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 166 с.

В. М. Гапеева (Мінск)

ВАЛІТЫЎНАСЦЬ: НА МЯЖЫ ІРЭАЛЬНАСЦІ І РЭАЛЬНАСЦІ

Рэальнасць часта мысліцца як нешта ўсеабдымнае і аблігаторнае. Аднак сітуацый, якія апісваюць гіпатэтычнае, патэнцыйнае і ўмоўнае, значна больш. Усе гэтыя падзеі належаць зоне, што знаходзіцца на іншым полюсе рэальнасці, і аб'яднаны тэрмінам *ірэальнасць*.

Магчымы свет – гэта ідэалізаваная тэарэтычная існасць, якая ўтрымлівае рэлевантныя семантычныя характарыстыкі сітуацый. Прататыпам магчымага свету выступае наш актуальны свет. Умовы ствараюць магчымасці і шэраг магчымых сусветаў, якія сумяшчаюцца з імі. Гэтыя сусветы могуць знаходзіцца бліжэй ці далей ад нашых мэтаў, спадзяванняў, жаданняў і г.д. Калі рэферэнцыяльны і выказаны свет супадаюць, мы маем рэаліс ці актуальную мадальнасць, у адваротным выпадку мы сутыкаемся з ірэалісам. Адлегласць паміж гэтымі двума сусветамі запаўняецца семантыкай мадальнасці. Менавіта таму, разважаючы пра ірэальнасць, ёсць сэнс узгадаць мадальнасць, але без атаясамлення адной з другой, бо не кожная мадальнасць

валодае статусам ірэальнасці, і не кожная ірэальная сітуацыя – мадальная. Аднак варта прызнаць, што ўсе значэнні ўскоснай мадальнасці звязаны з сітуацыямі, што не належаць рэальнаму свету.

Кожная мова па-свойму фіксуе гэтыя паняцці, дазваляючы бачыць (прагаворваць) адны катэгорыі і хаваючы іншыя. Для некаторых моў важна паказаць часавую і аспектуальную аднесенасць выказвання, для іншых гэтыя катэгорыі могуць прысутнічаць толькі на ўзроўні лексікі і не быць уключанымі ў граматыку. Усе гэтыя моўныя моманты непарыўна звязаны з кагнітыўнымі працэсамі, і можна доўга спрачацца пра суаднесенасць мовы і мыслення, займаючы пазіцыю прыхільнікаў гіпотэзы лінгвістычнай адноснасці або ўніверсальнай граматыкі, але так і не даць канчатковага адказу датычна прымату аднаго феномену над другім. Тым не менш вывучэнне анталагічна важных з'яў зоны ірэальнасці з пункту гледжання філасофіі і лінгвістыкі можа наблізіць нас да іх лепшага разумення.

Жаданні, намеры, спадзяванні, загады і мары – неад'емная частка жыцця, якая маніфестуе волевыяўленне суб'екта. Для таго каб іншыя даведаліся пра іх, індывід ўжывае адпаведныя словы або граматычныя канструкцыі. Такія і падобныя да іх выказванні прынята ўключаць у семантычную зону волевыяўлення, якая ўтрымлівае адзінкі для азначэння волі суб'екта. Аднак для дакладнага ўяўлення, што варта/мэтазгодна ўключаць ў сферу волевыяўлення, дзе знаходзяцца яе межы, якія прыметы могуць лічыцца варыянтнымі і інварыянтнымі, трэба прааналізаваць сам феномен волі, што немагчыма без звароту да філасофскіх канцэпцый, якія разглядалі праблематыку волі.

Варта адзначыць, што тэма волі і валітыўнасці застаецца па сённяшні дзень спрэчнай, неадназначнай і не ўсімі прымальнай па прычыне немагчымасці правядзення эмпірычных даследаванняў у яе дачыненні. Не ўсе даследчыкі, аднак, пагаджаюцца з гэтым[1], прыводзячы дадзеныя на карысць магчымасці доследна фіксаваць пэўны «зрух», які выяўляецца ў эксперыментах перад непасрэдным выкананнем адвольных рухаў.

Традыцыйна акт волі адыгрывае ролю моста паміж думкай і дзеяннем. У такім разуменні воля – гэта тое, што ініцыіруе дзеянні. Можна рашыцца ці мець намер выканаць дзеянне, аднак гэтыя рашэнні і намеры застаюцца ў галаве, пакуль не адбываецца адпаведнае дзеянне целам. Не ўсе нашы інтэнцыі знаходзяць фізічную рэалізацыю. У тэорыі дзеянняў важным аспектам выступае іх падзел на наўмысныя і ненаўмысныя (у англійскай тэрміналогіі voluntary і involuntary) і тыя ўмовы, якія аддзяляюць адны ад другіх. З іншага боку, пэўныя дзеянні набываюць характар аўтаматычных, выкананне якіх «не патрабуе» ад індывіда падключэння ментальных/валявых і інш. намаганняў. Менавіта з такімі дзеяннямі можа адбыцца збой, які праяўляецца ў так званых «памылковых» дзеяннях (Fehlleistungen). Упершыню апісаныя З. Фрэйдам, яны носяць розны характар і праяўляюцца

[1] Гл. напрыклад, артыкул J. Zhu „Understanding Volition".

ў форме 1) *абмоўкі* (Versprechen); *апіскі*; *ачыткі* (Verlesen); *памылкі слыху* (Verhören); 2) *часовага забывання* (Vergessen), напрыклад імя або намеру; 3) *хавання* (Verlegen) і *губляння* (Verlieren) [1, с. 36–42]. Як бачна, першая група звязана з маўленнем/мовай, другая – з памяццю, трэцяя – з фізічнымі дзеяннямі. Такога кшталту феномены вельмі істотныя для разумення волі, бо яны ілюструюць зазор, што існуе паміж намерам і выкананнем дзеяння, які і запаўняецца воляй.

Калі індывід вырашае нешта зрабіць, то ўзнікае пытанне «надзейнасці выбару», г.зн. ці вызначаецца выбар яго воляй, ці ёсць яго рашэнне свабодным і, калі так, тады да якой ступені. Тут праяўляецца парадокс свабоды, які заключаны ў тым, што, практыкуючы так званую свабоду волі, мы часта «пазбаўляем» сябе свабоды дзейнічаць, магчыма, так, як нам бы хацелася, абіраючы, да прыкладу, «сацыяльна ўхвальнае» дзеянне замест найбольш прыемнага (напр., пайсці на працу, замест таго, каб застацца дома). Такі выбар – таксама ў нечым нашае жаданне, праўда, больш прыхаванае і не зусім цалкам усвядомленае, яно магло быць прадыктавана жаданнем адпавядаць чаканням соцыуму ці атрымаць заахвочванне.

Параўноўваючы моўнае аблічча сферы волевыяўлення, можна заўважыць несупадзенне аб'ёмаў значэнняў і колькасці намінатыўных адзінак, што ўжываюцца для яе абазначэння, у розных мовах. Так, у англійскай мове разводзяцца паняцці *volition* і *will*, і хаця яны выступаюць сінонімамі, паміж імі існуе пэўнае адрозненне: *free will* мае значэнне абсалютнай, аўтаномнай свабоды, а *volition* мае на ўвазе магчымасць выбару.

У беларускай мове дзвюм англійскім адзінкам адпавядае лексема *воля*, якая можа ўжывацца для перакладу як *volition*, так і *will*:

1) *of one's own volition – па сваёй волі.*
2) *God has willed it so. – На тое была воля Бога.*

У той жа час *volition* часта разумеецца і больш адпавядае беларускім адзінкам поля аптатыўнасці, якое ахоплівае семантыку жадання:

3) *She had spoken it without her own volition. – Яна прамовіла гэта, сама таго не жадаючы.*

Сам тэрмін «валітыўнасць» можна сустрэць пры разглядзе відаў мадальнасці або сутнасных характарыстык суб'екта-агенса, які выступае ў ролі прататыпа катэгорыі суб'екта, або канцэптуальных рысаў семантыкі акцыянальных дзеясловаў [2, с. 43]. У вызначэннях валітыўнасці асноўную ролю адыгрываюць фактары волі, намеру, а таксама суб'ектнасці і наяўнасці пэўнага дзеяння. Параўнаем: валітыўнасць – гэта «прадвызначанасць дзеяння свабодным выбарам суб'екта, актам яго волі» [3, с. 324]. Валітыўнасць – гэта «наяўнасць у суб'екта пэўнага намеру выканаць дадзенае дзеянне» [2, с. 43]. Даследчыкі, якія трактуюць валітыўнасць з пункту гледжання мадальнасці, могуць уключаць яе ў саму сферу мадальнасці або ў мадальна спалучаныя катэгорыі. Тыя, што вылучаюць валітыўнасць як асобны тып мадальнасці, вызначаюць яе як тую, «што перадае волю або намер моўцы ці ўдзельніка сітуацыі» [4, с. 30].

Вяртаючыся да ідэі магчымых сусветаў і пытання, чаму яны могуць быць важнымі пры разглядзе тэмы волевыяўлення, варта адзначыць, што кожнае з такіх выказванняў стварае паралельную рэальнасць, у якой індывід бачыць сябе з тымі якасцямі або аб'ектамі, якіх яму/ёй не стае, робіць тое, што не можа пакуль адбыцца з розных прычын у дадзенай рэальнасці, і няма сумневу, што без такіх лексічных і граматычных асаблівасцей мовы, якія даюць мажлівасць будаваць альтэрнатыўныя сусветы, наша камунікацыя была б значна бяднейшай і не такой займальнай.

ЛІТАРАТУРА

1. *Фрейд, З.* Введение в психоанализ: лекции / З. Фрейд. – М. : Наука, 1987. – 456 с.
2. *Болдырев, Н. Н.* Когнитивная лингвистика / Н. Н. Болдырев. – М. ; Берлин : Директ-Медиа, 2016. – 251с.
3. *Зельдович, Г. М.* Прагматика Грамматики / Г. М. Зельдович. – М. : Яз. слав. культур, 2012. – 643 с.
4. *Marin-Arrese, J. I.* Effective vs Epistemic Stance, and Subjectivity/ Intersubjectivity in Political Discourse. A Case Study / J. I. Marin-Arrese // Studies in English Modality: in honor of Frank Palmer. – Bern, 2009. – P. 23–53.

В. М. Касцючык (Брэст)

МОЎНАЯ КАРЦІНА СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ У ТВОРАХ УЛАДЗІМІРА ГНІЛАМЁДАВА: АСАБЛІВАСЦІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ

Прыказкі ў кантэксце твораў Уладзіміра Гніламёдава дэманструюць нацыянальны каларыт таго рэгіёна, які пісьменнік выбраў у якасці аб'екта творчага ўвасаблення. Яны выступаюць яркімі складнікамі створанай пісьменнікам моўнай карціны свету, глыбока нацыянальнай па сваёй сутнасці.

Устойлівыя выслоўі з'яўляюцца захавальнікамі і каталізатарамі чалавечай думкі, інтэлектуальнай спадчыны нашага народа. Ужыванне іх у творах У. Гніламёдава мае мэтанакіраваны, абгрунтаваны характар: прыказкі бачацца выразнымі сродкамі дэкадзіравання народнай свядомасці, паказчыкамі нацыянальнай спецыфікі светаўспрымання:

– Правільна! Гаспадаркі трэба трымацца! – пагадзіўся з ім Якаў Арыстархавіч. – Мы не гуртавыя людзі, мы самі па сабе.

– Ну так! – разважаў Лявон. – ***Калі ты не за сябе, то хто за цябе?*** [1, с. 33].

– А панскую зямлю абяцаў падзяліць, ды нешта не дзеліць! – запярэчыў Мішу Сяргей Сталетнік.

– Ну, не сакрэт, – зазначыў Мікіта, – ***новая мятла па-новаму мяце*** [1, с. 116].

Рэпрэзентуючы нацыянальнае разуменне свету, прыказкі даюць магчымасць пагрузіцца у свет каштоўнасцей беларускага народа, выявіць ацэначную шкалу адносін да фактаў і з'яў рэчаіснасці. Многія з іх у лаканічнай форме надзвычай дасціпна, даходліва ацэньваюць розныя жыццёвыя сітуацыі. Для прыкладу, гутарка Маркела са Свісціянам, якія ў чарговы раз шукаюць аб'ект абірання, грабяжу:

Праз хвіліну якую Маркелу цюкнула думка.

– А можа не да Шалоніка, а зноў да таго твайго Макара наведацца. Ужо ж ён ведае, што да чаго.

– ***З аднаго вала,*** *запомні,* ***дзве шкуры не дзяруць*** [1, с. 253].

Семантыка прыказак у творах У. Гніламёдава нясе ў сабе інфармацыю пра каштоўнасныя арыенціры персанажаў. Так, прыказка ў кантэксце: *– Не памогуць і чары, як хто каму не да пары! – бараніла сібірака Фёкла* [1, с. 253] адлюстроўвае глыбокае меркаванне пра тое, што шлюб даецца Богам і ёсць пэўная вышэйшая наканаванасць у выяўленні гэтай асаблівай сувязі людзей. На тое, што адначасова не могуць два чалавекі быць кіраўнікамі, паказвае ўстойлівае выслоўе ў такім кантэксце:

– Ну, добра, – ён перайшоў на іншае, – камандзір у нас ёсць, але, як водзіцца, тым больш у нашых умовах, патрэбен яшчэ і камісар.

– ***Два мядзведзі ў адным берлагу не ўжывуцца,*** *– засумняваўся Грышка* [1, с. 263].

У. Гніламёдаў выкарыстоўвае прыказкі для рэканструявання маўленчых падсістэм людзей розных сацыяльных асяроддзяў, заняткаў, жыццёвых прынцыпаў. Частыя ўстойлівыя выслоўі ў маўленні Маркела і Свісціяна, людзей нядобрасумленных, грабежнікаў. Мадэль паводзін, жыццёвая псіхалогія гэтых персанажаў адлюстраваны праз наступную прыказку: *У сваю вёску, вядома, не пойдзеш, трэба кагосьці далей шукаць.* ***Не бяры там, дзе жывеш, і не жыві там, дзе бярэш*** *– гэта было вядома аднаму і другому* [1, с. 253].

Светапоглядная пазіцыя названых літаратурных герояў, дзе няма мяжы ў паводзінах, адчування недазволенасці, сораму, выяўляецца праз такі кантэкст: *У новым кажуху Свісціян адчуваў сябе ўтульна і ўпэўнена, нават сам сабе спрабаваў усміхацца: «А дарэмна кажуць, што* ***чужы кажух не грэе.*** *Грэе!»* [1, с. 168]. Агульнанародны вопыт, укладзены ў прыказку, аспрэчваецца персанажам, эксплікуецца новае, індывідуальнае светаўспрыманне.

У кантэкстах У. Гніламёдава прыказкі выступаюць яркімі характарыстыкамі літаратурных герояў. Яны раскрываюць унутраны свет асобы, яе здольнасць абагульняць, тыпізаваць жыццёвыя з'явы. Такімі асаблівасцямі разумовага складу, як назіральнасць, разважлівасць, жыццёвая мудрасць, вылучаецца Лявон Кужаль, пра што сведчаць шматлікія кантэксты:

– Гэта ж, мусіць, у Сібіры так? – азваўся нарэшце Васіль.

– ***Што край, то абычай,*** *– здзіўлена пахітаў галавой Лявон* [1, с. 72].

Адзін час Лявон ужо і пытацца перастаў. І вось Косця, Ганнін сын, нарэшце вярнуўся.

– ***Кожная птушка ляціць у сваё гняздо,*** *– так адрэагаваў Лявон на яго вяртанне ў Пруску* [1, с. 120].

У пісьменніка У. Гніламёдава амаль усе літаратурныя героі ўзбагачаны жыццёвым вопытам, таму і любяць выкарыстоўваць прыказкавы матэрыял у розных мэтах – для самавыражэння, каб «раскрыць сэрца, душу», у функцыі самаапраўдання, схаванага папроку, павучэння, перасцярогі, парады, у якасці «ўзбуджальніка» думкі і інш. Так, каб засведчыць у вачах суразмоўцы сваю разважлівасць, Фёкла выкарыстоўвае прыказку: *– Гэта трэба схаваць, – загаманіла Фёкла, паказваючы на скрынку. – Дакументы. З бежанства яшчэ, з Расіі.* ***Далей схаваеш – бліжэй возьмеш.*** *Яшчэ спатрэбяцца* [1, с. 24]. Для апраўдання паўнамоцтваў камандзіра, яго рашэнняў ужываецца прыказка ў маўленні партызана Зіпунова: *– Камандзір рашае, – зазначыў Зіпуноў, шырока пазяхнуўшы. –* ***Яйцо курыцу не вучыць*** [1, с. 256]. Выразны папрок адлюстроўвае прыказка ў такім ужыванні: *– Неблагі? – у голасе Афінагенава прагучала ці то здзіўленне, ці насмешка над сябрам. – Гэта так здаецца. Вайна, а ён пра вятрак думае.* ***Чорнага кабяля не адмыеш дабяла*** [1, с. 320]. Хутчэй дзеля падтрымання размовы выкарыстана прыказка Кузёмкам, чалавекам-дзіваком:

– Ну, а як ваш Хрысан?

– Даўся ў косці, – азваўся Лявон. – Вялікае начальства з сябе строіць.

Кузёмка прыгадаў старую прымаўку:

– Кажуць: ***службу служы, а сябру дапамажы.***

– Не, у яго таго няма [1, с. 303].

Дзякуючы згаданым прыказкам, думкі персанажаў выражаюцца дакладней, больш інфарматыўна, вобразна і эмацыйна.

У прыказках, ужытых у творах пісьменніка, выяўляюцца розныя тыпы інфарматыўнасці: зместава-фактуальная, што ўтрымлівае звесткі пра факты, падзеі, працэсы, асобы ў акаляючай рэчаіснасці; зместава-канцэптуальная, якая перадае індывідуальна-аўтарскае разуменне з'яў і іх значнасці; зместава-падтэкставая, схаваная інфармацыя, што мае месца дзякуючы здольнасці прыказак выяўляць асацыятыўныя і канататыўныя значэнні. Так, прыказка ***Блізка відаць, ды далёка дыбаць,*** ужытая ў наступным кантэксце: *Мурашка, які хваліўся, што ведае ўсё навакольле, часта спыняўся, разгублена круціў галавою, азіраўся, шукаючы знаёмыя арыенціры. Прайшлі паўз Робанкі, Селяхавічаў, Сухаволля. «Блізка відаць, ды далёка дыбаць», – сказаў Мурашка, успомніўшы вядомую прымаўку* [1, с. 308], адлюстроўвае ўсе названыя тыпы інфарматыўнасці. Яна паказвае на пэўную жыццёвую сітуацыю: прадмет, здаецца, знаходзіцца блізка, але, аказваецца, далёка да яго ісці. Так перадаецца суб'ектыўнае, падманлівае ўспрыманне прасторы. Вядома ж, аўтар творча выкарыстоўвае гэты выраз, падпарадкоўваючы яго мастацкай задуме – паказаць Мурашку, з вуснаў якога прагучала гэта прыказка, чалавекам дасціпным, назіральным, а яго маўленне канататыўна афарбаваным, насычаным жывым нацыянальна-культурным кампанентам. Падтэкставая, схаваная інфармацыя выяўляе псіхалагічны стан правадніка, які зусім разгубіўся, не знаходзячы знаёмых арыенціраў. Прыказка, выкарыстаная персанажам, выступае выразным сродкам яго самаапраўдання перад прысутнымі.

Прыказкі як нацыянальна афарбаваныя моўныя адзінкі нясуць у сабе павучальную і рэгулятыўную функцыі: персанажы твораў У. Гніламёдава часта выкарыстоўваюць іх як сродак навучання якім-небудзь патрэбным рэчам, кіравання паводзінамі членаў соцыуму: *–**Моладасць – буйнасць,** – парушыў маўчанне Кірыла, зноў-такі нібы апраўдваючы ўнука, і дадаў: – **А старасць – кайнасць*** [2, с. 67]. *– **Ажаніцца – не ўпасці: не ўстанеш і не атрасешся,** – сказала яна* [2, с. 139].

Дырэктыўная функцыя прыказак бачыцца ва ўздзеянні на адрасата: згаданыя моўныя адзінкі выяўляюць прамое пабуджэнне да пэўных дзеянняў: *– **Гасцям гадзі, але і сябе не галадзі!** – усмешліва азвалася Стэпа, беручы ў адну руку лусту хлеба, у другую – скрыль паляндвіцы* [3, с. 15]. *– Добрая дзеўка! Але, як кажуць, **хвалі дзень вечарам, а дзяўчыну замужам*** [3, с. 42]. *– Ты, браце, са мной дружы! – пыхнуў ён, раскурваючы цыгарку. – Са мной не прападзеш! Што было, тое сплыло… **«З мядзведзем дружы, а стрэльбу дзяржы»,** – падумаў Кужаль, але прамаўчаў* [4, с. 190].

Прыказкі не толькі абагульняюць веды пра прадметы і з'явы рэчаіснасці, але і тыпізуюць маўленне персанажаў. На аснове іх можна вылучыць розныя тыпы моўцаў-персанажаў: мудрага, памяркоўнага, разважлівага; бязлітасна строгага маралізатара; гумарыстычнага, іранічнага, насмешлівага. Так, шматлікія выслоўі гумарыстычнага характару ўласцівы маўленню Кузёмкі і Гамона, вясковых дзівакоў: *– Ну, не еў, – крыху памяўшыся, сціпла адказаў Кузёмка і адразу пажвавеў, зрабіўся весялейшым. – **Абедаў, а жывот не ведаў,** – дадаў ён, – але я прывыкшы* [3, с. 20].

– Відаць, прапаганда! – усумніўся нехта.

*– **Сказала баба бабе, што ажаніўся бусел на жабе,** – пажартаваў асмялелы Гамон, але ніхто пасля яго жарту не засмяяўся* [1, с. 492].

– Як пагляджу я на цябе – бязбытны ты чалавек! – сказаў Таццянка, павярнуўшыся да Гамона, але прускавец не застаўся ў даўгу:

*– Кажуць, што і **ты з кабылы не злез, як яна жарабілася.***

Прысутныя зарагаталі.

*– **Пасмяяўся гаршчок з катла…** – сказала Міхаліна, якая таксама чула гэтую размову* [2, с. 211].

Асобнае месца ў творах У. Гніламёдава займаюць прыказкі, што перадаюць калектыўны грамадскі вопыт. Побач з «галасамі персанажаў» у тэксце пісьменніка гучыць «голас вёскі». Аўтарам выразна эксплікуюцца прыказкі вёскі Пруска, што так хораша тыпізуюць жыццёвыя з'явы, выяўляючы пазачасавы і ўсеахопны характар канстатацыі: *Вясна ўжо скончылася, заставаўся тыдзень які да сенакосу, самы той час, пра які кажуць: **зязюля падавілася ячменным коласам*** [1, с. 587]. *Ехаць дамовіліся ў сераду, таму што панядзелак цяжкі дзень, а ў **аўторак – аб'едзеш дзявок сорак,** як кажуць у Прусцы* [3, с. 37]. *– Каго за кума ўзяць? – працягваў Лявон. – Каб добры чалавек! У Прусцы ў такіх выпадках згадвалі прымаўку: **«Сыр не закуска, кум не сваяк»*** [5, с. 29].

У кантэксце твораў У. Гніламёдава маюць месца і прыказкі, створаныя рускім народам. Яны адлюстроўваюць свой спосаб нацыянальнага ўспрымання акаляючай рэчаіснасці: *– Але, як у Расіі кажуць,* ***каму вайна, а каму маць радна.*** *Шпронька, я чуў, зноў адчыняе лаўку* [1, с. 324]. *– Хлеб ёсць. Хоць з бульбай, але ёсць.* ***Без чорнага куска везде тоска,*** *– сказала Фёкла, успомніўшы родную мову* [6, с. 9]. *–* ***Красата – да вянца, а ум – да канца!*** *– не здавалася будучая свякроў* [2, с. 149]. *Гаспадыняю – Фёкла.* ***«Дом вясці – не азадкам трасці»,*** *– помніла яна гэту запалонаўскую прымаўку* [4, с. 119]. Паказваючы погляды, жыццёвыя прынцыпы рускага народа, згаданыя прымаўкі надаюць аўтарскім творам яркі нацыянальны каларыт.

Асаблівая адметнасць прыўносіцца прыказкамі ў такія кантэксты, дзе даецца інфармацыя пра нацыянальныя традыцыі. Заўважаецца, наколькі прыцягальны, неабходны прыказкавы матэрыял у такой святочнай падзеі, як сватанне. Асабліва тут ён мае ўстойлівы характар ужывання, нясе ў сабе арнаментальную і рэкламную функцыі. Апрача таго, прыказкі ствараюць даверлівы, гулліва-гумарыстычны тон размовы і выяўляюць рэгулятыўную функцыю, бо выкарыстоўваюцца для наладжвання суразмовы паміж раднёй жаніха і нявесты:

Мікалай падсунуў бліжэй да свата талерку з капустай. Той пакаштаваў і пахваліў, а потым прыгадаў і прымаўку:

– ***Што кажух – то не вата, а што капуста – то не гарбата.*** *Я капусту люблю* [2, с. 40].

– І пра яго, – дзядзька меў на ўвазе Васіля, – нічога благога не магу сказаць – разумны, гарэлкі не п'е. Ды што казаць! ***Які дуб, такі і тын, які бацька, такі і сын.*** *І працавіты вельмі* [2, с. 41].

Як бачым, прыказкі ў творах У. Гніламёдава выступаюць знакавымі моўнымі адзінкамі для рэканструявання беларускай моўнай карціны свету, паколькі яны прама звязаны з сацыяльна-этнічнымі і нацыянальна-культурнымі асаблівасцямі жыцця нашага народа. Яны з'яўляюцца яркімі сродкамі інтэрпрэтацыі чалавекам акаляючага свету, спосабам яго светаразумення.

ЛІТАРАТУРА

1. *Гніламёдаў, У. В.* Вайна : раман / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Беларус. навука, 2014. – 628 с.
2. *Гніламёдаў, У.* Расія : раман / У. Гніламёдаў. – Мінск : ТАА «Харвест», 2007. – 672 с.
3. *Гніламёдаў, У.* Валошкі на мяжы : раман / У. Гніламёдаў // Полымя. – 2010. – № 10. – С. 9–48.
4. *Гніламёдаў, У.* Вяртанне : раман / У. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 429 с.
5. *Гніламёдаў, У.* Валошкі на мяжы : раман / У. Гніламёдаў // Полымя. – 2010. – № 11. – С. 10–41.
6. *Гніламёдаў, У.* Пасля вайны : раман / У. Гніламёдаў // Полымя. – 2014. – № 11. – С. 3–47.

А. М. Лапцёнак (Мінск)

ПАНЯЦЦІ *ЗНАЧЭННЕ* І *ЎЖЫВАННЕ* Ў ТЛУМАЧАЛЬНЫМ СЛОЎНІКУ

Адна з найбольш важных праблем лексікаграфіі – праблема семантычнай структуры мнагазначнага слова, – канчаткова не вырашана і сёння. Для лексікографа важна не толькі размежаваць асобныя лексіка-семантычныя варыянты (ЛСВ), але і размясціць іх у адпаведнасці «з актуальнымі для сучаснай моўнай свядомасці лагічнымі адносінамі» [1, с. 64]. Праблема структурыравання ЛСВ у межах полісеманта ўскладняецца тым, што ў слоўніках выдзяляюць таксама адценні значэнняў і ўжыванні як больш дробныя адзінкі семантычнага члянення значэння. Акрамя таго, сутнасць і суадносіны паміж гэтымі паняццямі не заўсёды відавочныя, слоўнікі выяўляюць разнабой у падачы аднатыпных семантычных адзінак. Дадзены артыкул прысвечаны пытанню падачы ўжыванняў у слоўніку. У сувязі з запланаваным у Інстытуце мовазнаўства НАН Беларусі перавыданнем шматтомнага слоўніка беларускай мовы пытанне іх фіксацыі набывае асаблівую актуальнасць і патрабуе спецыяльнага разгляду.

Адрозніваюць тэрміналагічнае і нетэрміналагічнае выкарыстанне паняцця *ўжыванне*. Нетэрміналагічнае *ўжыванне* – выпадак канкрэтнай рэалізацыі значэння. Кожнае ўжыванне ўяўляе сабой адзінкавую рэалізацыю аднаго з магчымых аспектаў агульнага значэння слова, а абагульненне ўсіх рэальных ужыванняў слова і вызначае яго значэнне. Нетэрміналагічнае ўжыванне рэалізуецца ў слоўніку ў ілюстрацыях. Але значэнні, у якіх рэалізуюцца адметныя, неўласцівыя слову семантычныя сувязі, не могуць падавацца ў слоўніку, бо ў ім павінны фіксавацца толькі агульнапрынятыя, трывала замацаваныя ў моўнай практыцы значэнні [2, с. 31].

Тэрміналагічнае *ўжыванне* – гэта адзінка семантычнага члянення значэння. У лексікаграфіі ўжыванне фіксуецца не ва ўсіх тлумачальных слоўніках, яно адзначаецца ў акадэмічных 17-томным і 4-томным слоўніках рускай мовы, у Тлумачальным слоўніку беларускай мовы (ТСБМ). Аднак у слоўніках не даецца азначэння паняцця *ўжыванне*, звычайна пералічаюцца іх віды і прыводзіцца некалькі прыкладаў, а таксама адзначаюцца ўласцівасці. Так, у 17-томным слоўніку ўдакладняецца, што «вобразнае ўжыванне слова або ўжыванне яго ў параўнанні» даецца, калі яно «шырока ўласціва літаратурнай мове або замацавалася ў ёй як устойлівае спалучэнне» [3, с. XII]. В. У. Вінаградаў пісаў, што «ў слоўніку ... могуць быць (хаця і гэта не абавязкова) зарэгістраваны толькі тыя тыпы ўжывання слова, з якіх відавочна ўжо выпрацоўваецца новае значэнне» [4, с. 22]. У 4-томным слоўніку фіксуюцца асаблівасці ўжывання, «характэрныя» для таго або іншага значэння [5, с. 8], а ў ТСБМ – выпадкі ўжывання слова «не ва ўласцівым яму вобразным ці пераносным значэнні» [6, т. 1, с. 12].

Нягледзячы на выкарыстанне ўжыванняў у слоўніках, у тэарэтычнай лексікаграфіі праблема практычна не аналізуецца. Яна закранаецца ў распрацоўках да Новага акадэмічнага слоўніка рускай мовы [1, с. 71–73].

Даследчыкі плануюць значна пашырыць апісанне словаўжыванняў у слоўніку і прапануюць увесці два спецыяльныя знакі. Знак / павінен адлюстроўваць ужыванні, якія не закранаюць семантычную тоеснасць значэння, але ўжо размываюць яе нетрадыцыйнасцю свайго прымянення. Такім ўжываннем уласцівы навізна, малаўжывальнасць, надзвычай абмежаваная спалучальнасць, але ў той жа час яны павінны выяўляць моўную ўзнаўляльнасць і семантычную рэгулярнасць у радзе блізказначных слоў [1, с. 72]. Такім чынам, прапанаваны падыход не выходзіць за рамкі ўжо рэалізаванага ў слоўніках, калі ў якасці ўжывання рэгіструецца своеасаблівае, але дастаткова пашыранае прымяненне значэння слова.

Праблему ўжывання распрацоўвае Ю. Д. Апрэсян у рамках сістэмнай лексікаграфіі. Паводле даследчыка, ужыванне – гэта выпадак выкарыстання лексемы, што адрозніваецца ад першапачатковага значэння дзвюма асабістымі ўласцівасцямі, якія карэлююць паміж сабой, і якое можа быць атрымана з дапамогай прадуктыўнага правіла [7, с. 126]. Пад прадуктыўным правілам лінгвіст разумее аперацыю, з дапамогай якой з моўнага аб'екта А, які адпавядае зададзенай сукупнасці ўмоў, заўсёды атрымліваецца новы моўны аб'ект В, які мае сукупнасць уласцівасцей, дакладна ўказаную ў гэтай аперацыі [7, с.125]. Так, у якасці ўжыванняў ён разглядае выпадкі карэляцыі семантычнай уласцівасці (нязначнага змянення значэння) з асаблівасцямі спалучальнасці або кіравання дзеясловаў (сінтаксічная ўласцівасць). Згодна з думкай навукоўца, падставай для фіксацыі ўжывання можа быць карэляцыя паміж любымі дзвюма ўласцівасцямі слова (акрамя фанетычнай), важна толькі, каб карэляцыя была абсалютнай [7, с. 128].

Неабходную інфармацыю можа даць аналіз саміх слоўнікаў. У ТСБМ у прадмове прапануецца афармляць як ужыванні выпадкі з «вобразным ці пераносным» значэннямі, але сярод памет даюцца дзве: *у перан. ужыв.* і *ў безас. ужыв*., адзначаецца, што тлумачэння пры іх не фіксуецца [6, т. 1, с. 12]. Але на практыцы як ўжыванні афармляецца значна большая колькасць выпадкаў выкарыстання лексем.

Усе ўжыванні ў ТСБМ умоўна можна падзяліць на 3 групы: 1) у якіх рэалізуецца семантычная спецыфіка асноўнага значэння; 2) якія паказваюць асаблівасці граматыкі; 3) ужыванні, якія ілюструюць сінтаксічныя асаблівасці значэння.

Як ужыванні, звязаныя з семантычнымі асаблівасцямі зыходнага значэння, афармляюцца выпадкі выкарыстання слова ў пераносным сэнсе, пазначаныя паметай *у перан. ужыв.* Параўн.: **адзенне –** вырабы з тканіны, футра і пад., якія надзяюць на сябе. / *у перан. ужыв. Растрэслі адзенне лясы, Даўно адцвілі верасы.* Колас [6, т. 1, с. 134]; **адснаваць –** скончыць (перастаць) снаваць. / *у перан. ужыв. Адснавалі прадвеснія хмары, Адлілі праліўныя дажджы.* Гурло [6, т. 1, с. 178].

У якасці прыкладаў ужыванняў прыводзяцца цытаты з мастацкай літаратуры. Перад лексікографам паўстае праблема размежавання агульнамоўных пераносных значэнняў і індывідуальна-аўтарскіх метафар. Думаецца, што, калі вобраз частаўжывальны і адзначаецца ў некалькіх аўтараў, то гэта ўжыванне, і яно мае тэндэнцыю да пераходу ў разрад самастойных значэнняў.

Акрамя таго, пры пераносных ужываннях адзначаюцца дублюючыя паметы *ў вобразным ужыванні* і *ў паэт. ужыв*. Параўн.: **чара –** *паэт.* Пасудзіна для піцця віна. / *у вобразным ужыванні. Я з кожным днём раблюся больш цвярозым, хоць з большай смагай чару п'ю жыцця.* Дубоўка [6, т. 5, кн. 2, с. 294]; **турботны –** які турбуецца аб кім-, чым-н., клапоціцца пра каго-, што-н. */ у паэт. ужыв. Турботны родны дом Шчаслівых не пабудзіць.* Голуб [6, т. 5, кн. 1, с. 555]. Лексікаграфічны прынцып стандартнасці патрабуе аднастайнага афармлення аднатыпных з'яў, таму патрэбна абмежаванне памет.

Часта ўжыванні ўтрымліваюць указанні на лексічную спалучальнасць або на сітуацыю ўжывання: **драны** – … **4.** *у знач. прым.* Здробнены на тарцы. / Пра стравы. *Драныя аладкі* [6, т. 2, с.165]; **нешта**[1] **–** … 2. Нейкі прадмет, з'ява, пачуццё і пад. / Тое ж з азначэннем. *Нешта казачнае бачу я ў багатых колерах неба…* Бядуля [6, т. 3, с. 403]. Такія ўжыванні пашыраюць ці, наадварот, абмяжоўваюць зыходнае значэнне або паказваюць на іншы дэнатат, што ў цэлым закранае семантычную тоеснасць. Да гэтай групы адносім таксама ўжыванне назоўнікаў са значэннем зборнасці: **вусень –** лічынка матыля, падобная на чарвяка. / *у знач. зб. Вусень пааб'ядаў вясною лісце ў садзе.* Чорны [6, т. 1, с. 514]. Найбольш часта так падаюцца назвы дрэў.

Такія ўжыванні патрабуюць уважлівасці ад лексікографа, бо адметнасць семантыкі сведчыць пра тэндэнцыю да фарміравання самастойнага значэння. У слоўніках, дзе не прыняты ўжыванні, падобныя значэнні не выдзяляюцца або афармляюцца як ЛСВ.

У гэту групу ўключаем і нешматлікія ўжыванні, якія ўказваюць на стылістычную спецыфіку значэння: **фестываль –** грамадская ўрачыстасць з паказам і праглядам якога-н. віду мастацтва. / *у іран. ужыв. – Бабкі, бабкі!.. Цішэй там, фестываль устроілі.* Пташнікаў [6, т. 5, кн. 2, с. 126].

Паслядоўна як ужыванне афармляецца выкарыстанне лексемы пры тоеснай семантыцы, але адрознай ад рэестравага слова часцінамоўнай прыналежнасці. Так падаюцца назоўнікі, прыметнікі, прыслоўі і інш. Параўн.: ***клёш* –** асаблівы крой спадніцы, штаноў з расшырэннем унізе. */ у знач. нескл. прым. Спадніца клёш* [6, т. 2, с. 698]*;* **вусаты** – які мае вусы, вусікі; з доўгімі або густымі вусамі. / *у знач. наз.* вусаты**,** -ага, *м. – Аддай мне птушку! – наступаў вусаты на бялявага.* Арабей [6, т. 1, с. 514]. Звычайна адзначаецца, у значэнні якой часціны мовы ўжыта лексема, для зменных часцін мовы падаюцца канчаткі, а потым без тлумачэння ідзе ілюстрацыя.

У прадмове пры апісанні граматычнай характарыстыкі слова спецыяльна адзначаецца, што лексемы могуць ужывацца ў значэнні іншай часціны мовы [6, т. 1, с. 10]. Звычайна яны афармляюцца як самастойны ЛСВ або адценне значэння: ***даверaны* – 1.** *Дзеепрым. зал. пр. ад* даверыць. **2.** *у знач. прым.* Надзелены давер'ем. **3.** *у знач. наз.* даверaны**,** -ага, *м.* Асоба, якая дзейнічае па чыім-н. даручэнні [6, т. 2, с. 109]. Асноўным крытэрыем

размежавання такіх ужыванняў і самастойных значэнняў з'яўляецца семантычны. Ужыванням уласцівы адрозненні толькі граматычнага фарманта, калі ж яны не супадаюць і семантычна, то вытворнае значэнне фіксуецца або ў якасці адцення, калі яно не выходзіць за рамкі паняційнай агульнасці, або як самастойны ЛСВ.

У некаторых выпадках мы лічым афармленне ўжыванняў памылковым. Так, нельга фіксаваць ужыванні пры рознай граматычнай прыналежнасці і адметнасці пачатковай формы, як у наступных лексемах: ***клубок*** **–** шарападобны маток нітак, шпагату і пад. // Пра тое, што набыло форму шара, камка. / *у знач. прысл.* **клубком.** *Малы, абараняючыся, качаўся клубком па зямлі.* Ракітны [6, т. 2, с. 701]. Такому афармленню супярэчыць не толькі адрозная рэестравая форма слова, але і адметнасць семантыкі значэння і ўжывання. У ТСБМ такія значэнні часцей падаюцца як ЛСВ: **дождж – 1.** Атмасферныя ападкі ў выглядзе капель вады, якія падаюць з хмар. ... **4.** *у знач. прысл.* **дажджом.** Падобна дажджу; у мностве. *Іскры сыпаліся дажджом* [6, т. 2, с. 187] і інш.

Ужыванні, якія характарызуюцца сінтаксічнай адметнасцю, прадстаўлены ў слоўніку дастаткова сістэмна і паслядоўна. Найбольш часта фіксуецца ўказанне на безасабовае ўжыванне дзеясловаў: **асляпіць –** пазбавіць магчымасці бачыць; асляпіць. / *у безас. ужыв. Бляскам агністым засляпіла вочы.* Мурашка [6, т. 1, с. 283].

Часам адзначаюцца паметы *ў знач. вык.* і *ў знач. пабочн.*, аднак у прадмове адзначаецца толькі першая з іх: **наўцёкі –** бягом, уцякаючы ад каго-, чаго-н. / *у знач. вык. Не паспеў падысці да абгарэлай сасны.., а нехта як выскачыць з лесу ды як запляскае. Я – наўцёкі.* Ігнаценка [6, т. 3, с. 329]; **часам –** іншы раз, калі-нікалі. / *у знач. пабочн. А можа, ты – сімулянтка, часам?* Вярцінскі [6, т. 5, кн. 2, с. 304].

У некаторых выпадках сінтаксічныя асаблівасці фіксуюцца ў дадатковым тлумачэнні: **друг –** той, з кім хто-н. дружыць; блізкі сябар, прыяцель. / У зваротку. – *Эй, друг! – гукнуў з-за калючак густы моцны бас.* Ставер [6, т. 2, с. 200] і інш.

Такім чынам, ужыванне як лексікаграфічная катэгорыя патрабуе ўдакладнення і сістэматызацыі. У адпаведнасці з прынцыпам стандартнасці патрэбна дакладна апісаць выпадкі, якія афармляюцца як ужыванні, абмежаваць і ўпарадкаваць спецыяльныя паметы, сістэматызаваць спосабы апісання ўжыванняў значэння.

ЛІТАРАТУРА

1. *Коровaненко, Т. А.* Проблемы семантики в новом академическом словаре / Т. А. Коровaненко // Очередные задачи русской академической лексикографии: сб. / редкол.: А. С. Герд [и др.]. – СПб., 1995. – С. 58–89.
2. Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства; пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 462 с.

3. Словарь современного русского литературного языка: в 17 т. / АН СССР, Ин-т русского языка; редкол.: Ф. П. Филин [и др.]. – М.; Л.: Изд-во АН СССР, 1950. – Т.1 – 767 с.
4. *Виноградов, В. В.* Толковые словари русского языка / В. В. Виноградов // Избр. тр. Лексикология и лексикография / В. В. Виноградов. – М.: Наука, 1977. – С. 206–242.
5. Словарь русского языка: в 4 т. / АН СССР, Ин-т русского языка; гл. ред. А. П. Евгеньева. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Рус. яз., 1981. – Т. 1. – 698 с.
6. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т., 6 кн. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства; пад агул. рэд. К. К. Атраховіча (К. Крапівы). – Мінск: БелСЭ, 1977–1984. – 5 т., 6 кн.
7. *Апресян, Ю. Д.* Исследования по семантике и лексикографии / Ю. Д. Апресян. – М.: Яз. слав. культур, 2009. – Т.1: Парадигматика. – 568 с.

К. П. Любецкая (Мінск)

ТЭРМІНАЛАГІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XX–ПАЧАТКУ XXI СТ.

На сённяшні дзень задача аспектацыі айчыннага тэрміназнаўчага ведання, а таксама яго філіяцыі знаходзіцца ў самым пачатку вырашэння. Прадугледжваецца, што сістэматызацыя набыткаў у справе вывучэння спецыяльнай лексікі паспрыяе падагульненню наяўнага вопыту і фарміраванню ўяўлення аб стане распрацоўкі тэарэтычных пытанняў беларускай спецыяльнай лексікі. У сувязі з гэтым асноўная мэта артыкула прадугледжвае адлюстраванне вынікаў за перыяд 1990–2016 гг., што ў цэлым дазволіць інвентарызаваць наяўнае і паспрыяе вырашэнню далейшых перспектыў дзейнасці.

Характарызуючы **тэматычны** ахоп праведзеных даследаванняў у сферы вывучэння беларускай спецыяльнай лексікі, можна адзначыць, што напрыканцы XX – пачатку XXI ст. даследчыкі ў межах галіновага тэрміназнаўства скіроўваюць сваю ўвагу на вывучэнне такіх сфер, як: анатомія, батаніка, батанічная намеклатура, геалогія, грамадска-палітычная лексіка, граматыка, заалогія, лексіка народных промыслаў і рамёстваў, лексіка чыгуначнага транспарту, матэматыка, метэаралогія, найменні асобы паводле прафесійнай і тэрытарыяльнай прымет, рэлігійная лексіка, сельскагаспадарчая, тапанімічная, тэмпаральная лексіка, тэрміналогія аўтамабільнага транспарту, воднага транспарту, машынабудавання, тэрміналогія права, тэхнічная, сямейна-абрадавая тэрміналогія, фаўністычная, філасофская, энтамалагічная, юрыдычная.

У канцы XX – пачатку XXI ст. навукоўцы звярталіся таксама да асэнсавання гісторыі развіцця пэўных лексіка-семантычных груп: найменні адзення, абутку, галаўных убораў, упрыгажэнняў, матэрыялаў для вырабу

адзення, намінацыі беларускага вясельна-абрадавага жаночага касцюма, занальная лексіка ў найменнях з'яў жывой прыроды, найменні стравы і пітва, энтамалагічныя назвы, вытворча-прамысловыя тапанімічныя назвы, прадметная лексіка, намінацыі водных аб'ектаў, гідранімія і айканімія, тапанімія, тэмпаральная лексіка, назвы асоб па рамёству і прафесіі, назвы чалавека паводле знешняга выгляду, лексіка народных промыслаў і рамёстваў, структурна-семантычная характарыстыка найменняў асобы паводле прафесійнай і тэрытарыяльнай прымет, назвы асоб паводле дзейнасці, назоўнікі са значэннем асобы, лексіка цяслярскага і сталярнага рамёстваў, семантычнае поле «адзенне», дзеясловы са значэннем інтэлектуальнай дзейнасці, метафарычная рэпрэзентацыя псіхалагічнай сферы чалавека, касмаганічная лексіка, апелятыўная лексіка з семантыкай персанальнасці, айконімы, суадносныя з назвамі раслінага свету, фразеалагізмы з кампанентам-арнітонімам, лексіка народнай медыцыны, лексіка хатняга жаночага рамяства, народная лексіка ткацтва, намінацыі адзення, паходжанне назваў адзення, назвы хлеба, канфесійная лексіка, дзеясловы эмацыйнага стану і пачуцця, лексіка і фразеалогія, што называюць міміку, жэсты, дзеясловы кагнітыўнай дзейнасці, ментальныя дзеясловы, лексіка памеру.

У межах **дыяхранічнага** і **гістарычнага** тэрміназнаўства навукоўцаў працягваюць даследаванні на матэрыяле старабеларускай мовы. Так, у заяўлены перыяд прааналізавана мінералагічная лексіка, музычная лексіка, лексемы спецыяльнага прызначэння ў «Трыбунале» (1586), тапанімія, рэлігійная лексіка, анатама-фізіялагічная і медыцынская лексіка, найменні адзення, галаўных убораў і матэрыялаў для іх вырабу ў помніках старабеларускай пісьменнасці, мова старабеларускай навукова-публіцыстычнай літаратуры, лексіка Статута Вялікага Княства Літоўскага (1588), мова беларускага перакладу «Хронікі» М. Стрыйкоўскага пачатку XVII ст., лексіка «Александрыі», мова палемічнай рэлігійнай літаратуры канца XVI ст., мова перакладу «Траянскай гісторыі» пачатку XVII ст., мова беларускай пісьменнасці ранняга перыяду (на матэрыяле Вісліцкага статута XV ст.).

Паколькі праблема беларускай спецыяльнай лексікі, вызначэння яе мовазнаўчай сутнасці застаецца пакуль канчаткова нявырашанай, **феномен спецыяльнай лексікі** стаў цэнтрам увагі лінгвістаў амаль ва ўсіх дысертацыйных і манаграфічных даследаваннях. Пры правядзенні даследаванняў навукоўцы вызначаюць сутнасць і аб'ём паняцця *тэрміналогія*. Пры размежаванні паняццяў *тэрмін* і *номен* сцвярджаецца, што паняцце *наменклатура* вузейшае за паняцце *тэрміналогія*. Навукоўцы прыходзяць да высновы, што наменклатуру можна лічыць складовай часткай тэрміналогіі.

Даволі стракатай з'яўляецца карціна, што прэзентуе **прыметы тэрміна**. Сярод найбольш часта ўзгаданых прымет можна назваць: дакладнасць, адназначнасць у межах пэўнай тэрмінагаліны, кароткасць, зручнасць утварэння ад яго вытворных, стылістычная і экспрэсіўная нейтральнасць, незалежнасць ад кантэксту, матываванасць, сістэмнасць, канвенцыйнасць. Сярод іншых патрабаванняў да тэрміна далучаюць таксама непажаданасць

наяўнасці морфаварыянтаў, плеанастычных варыянтаў, празмернасць інфармацыі, сінанімii, аманімii, дублетаў. Разам з тым навукоўцы прыходзяць да высновы, што не ўсе з пералічаных прымет з’яўляюцца значымымі для выпрацоўкі дэфініцыі тэрміна. Аўтарамі ўзнімаюцца праблемы, што датычаць пытанняў **паняційнай, сістэмнай арганізацыі спецыяльнай лексікі**.

Своеасаблівым сінтэзам большасці існуючых думак, якія часам могуць дапаўняць адна другую, з'яўляецца акрэсленне асноўных **лексіка-семантычных з'яў**, якія ўласцівы розным тэрмінасферам беларускай мовы. Традыцыйна пры гэтым разглядаюцца такія лексіка-семантычныя з'явы, як сінанімія, дублетнасць, варыянтнасць, полісемія, аманімія, антанімія, эмацыйна-экспрэсіўная нейтральнасць тэрмінаў.

Асобнай тэмай для вывучэння стала вызначэнне асаблівасцей функцыянавання **розных часцін мовы** ў тэрміналогіі. Традыцыйна адным з аспектаў вывучэння тэрмінасфер стала вызначэнне **крыніц, шляхоў** і **спосабаў фарміравання** беларускіх тэрмінаў.

Падчас **структурна-генетычнай** характарыстыкі тэрмінаў у даследаваннях беларускіх навукоўцаў прапануецца аналіз запазычвання лексікі іншамоўнага паходжання: спосабаў выкарыстання інтэрнацыянальных элементаў у тэрміналогіі, а менавіта: тэрміны з кампанентамі грэчаскага, лацінскага і рамана-германскага паходжання. Навукоўцамі разглядаюцца беларуская мова як лексічная база і папаўненне спецыяльнай лексікі за кошт уласных рэзерваў. Адным са шляхоў фарміравання фонда спецыяльнай лексікі стала тэрміналагізацыя агульнанародных і дыялектных слоў. Некаторыя з навукоўцаў прыходзяць да высновы, што пераважная частка тэрмінаў створана на базе беларускай нацыянальнай мовы. Запазычанне таксама аналізуецца як крыніца фарміравання беларускіх тэрмінаў.

Асобным аспектам вывучэння спецыяльнай лексікі стала апісанне **спосабаў** яе **ўтварэння** і часавых межаў функцыянавання марфалагічных мадэлей, што спрыяе, з аднаго боку, вызначэнню тыповых і прадуктыўных мадэлей, а з другога – акрэсленню мадэлей нерэгулярнага і непрадуктыўнага ўтварэння.

Структурны аспект вывучэння тэрмінаў арыентаваны традыцыйна на вылучэнне наступных тыпаў: тэрміны-словы, тэрміны-словазлучэнні, словы-сімвалы.

Праблема **асаблівасцей фарміравання** беларускай спецыяльнай лексікі неаднойчы цікавіла даследчыкаў, якія амаль адзінадушна выказваюць меркаванне аб тым, што фарміраванне беларускай спецыяльнай лексікі дэтэрмінавана ўзаемадзеяннем лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў.

Пры вызначэнні відаў **эвалюцыі** беларускай тэрміналогіі вядзецца гаворка звычайна пра дзве формы: натуральнае фарміраванне і спецыяльную тэрміналагічную работу.

Неабходнасць **нармавання** і **ўпарадкавання** беларускай тэрміналогіі выспела ўжо даўно.

На думку навукоўцаў, што працавалі ў сферы **супастаўляльнага** тэрміназнаўства, патрэбна істотнае параўнальнае вывучэнне разнамоўных тэрмінасістэм. Перш за ўсё падобная праца спрыяе вызначэнню на фоне агульных гістарычных тэндэнцый адрозных структур і ўтварэнняў, асэнсаванню нацыянальных тэндэнцый развіцця тэрміналогіі.

Асобнай тэмай для асэнсавання сталі пытанні **тэрміналогіі ў дзяржаўных стандартах**, м**іжнароднай каардынацыі** і **ўніфікацыі** тэрміналагічнай работы.

Пытанні асаблівасцей фарміравання **навуковага стыл**ю беларускай мовы разгледжаны ў працах В. П. Краснея (1998, 2011).

Такім чынам, аналіз распрацоўкі пытанняў спецыяльнай лексікі за апошнія 25 гадоў у Беларусі паказаў, што пэўны вопыт, бясспрэчна, назапашаны. На падставе вывучэння прац дысертацыйнага і манаграфічнага характару можна зрабіць высновы адносна актыўнасці гэтай дзейнасці і кола ўзнятых праблем. На працягу 90-х гг. XX ст. – пачатку XXI ст. асноўнымі аспектамі даследаванняў стала вывучэнне пытанняў гісторыі і сучаснага стану тэрміналогіі: тэорыя тэрміна, акрэсленне статуса тэрміна і яго семантыкі, узаемаадносіны тэрмінаў і нятэрмінаў, супастаўляльны аспект тэрміналагічных сістэм розных моў, праектаванне тэрміналогіі, тэорыя і практыка тэрміналагічнай тэрмінаграфіі, функцыянаванне і ўпарадкаванне тэрмінагалін, дзяржаўная стандартызацыя, міжнародная каардынацыя і ўніфікацыя, фарміраванне навуковага стылю. Рознааспектныя даследаванні скіраваны перадусім на вырашэнне комплексу тэарэтычных і прыкладных пытанняў. Адзначаныя кірункі вывучэння спецыяльнай лексікі на практыцы часта не маюць выразнага супрацьпастаўлення, а тэарэтычна-практычным даследаванням уласціва перакрыжаванне тэм і праблем. Мяркуецца, што вырашэнне праблем айчыннага тэрміназнаўства паспрыяе далейшаму развіццю асобнага кірунка лінгвістычных даследаванняў – тэорыі тэрміназнаўства.

С. С. Мароз, М. С. Ржавуцкая (Мінск)

СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ ПАСЕСІЎНАСЦІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ: ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫ ЎЗРОВЕНЬ

Пасесіўнасць – універсальная моўная катэгорыя, якая характарызуецца сістэмнасцю ў сваім выражэнні. У сучаснай беларускай літаратурнай мове функцыянальна-семантычная катэгорыя пасесіўнасці мае багаты сэнсавы змест і і разнастайныя сродкі яго перадачы.

Агульнавядома, што ўсе функцыянальна-семантычныя катэгорыі фарміруюцца сродкамі розных узроўняў моўнай сістэмы. Катэгорыя пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове ўключае ў свой арсенал лексіка-семантычныя, словаўтваральныя, марфема-марфалагічныя і сінтаксічныя сродкі, з якіх утвараюцца разнастайныя пасесіўныя канструкцыі, здольныя

перадаваць (у залежнасці ад іх структуры і кампазіцыйнай семантыкі) адно з двух асноўных катэгарыяльных значэнняў пасесіўнасці – прыналежнасць ці валоданне.

Мэта артыкула – устанавіць і апісаць сродкі выражэння пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове (на матэрыяле твораў мастацкай, публіцыстычнай, навуковай літаратуры і фальклору) на лексіка-семантычным узроўні.

Назіранні над фактычным матэрыялам сведчаць, што на лексіка-семантычным узроўні сродкі выражэння пасесіўнасці рэпрэзентаваны такімі адзінкамі, як

– займеннікі са значэннем пасесіўнасці;

– прыметнікі са значэннем пасесіўнасці;

– назоўнікі са значэннем пасесіўнасці (у тым ліку і тэрміны роднасці і свайцтва);

– дзеясловы са значэннем пасесіўнасці.

У семантычнай структуры ўсіх пералічаных адзінак прысутнічаюць агульныя інтэгральныя пасесіўныя семы – ‘належаць’, ‘валодаць’, ‘мець’, ‘быць (з’яўляцца, станавіцца) уладальнікам’, ‘быць (з’яўляцца, станавіцца) уласнасцю’ і інш.

Прааналізаваны моўны матэрыял паказвае, што значэнне прыналежнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове выражаюць:

– прыналежныя займеннікі *мой*, *наш*, *наскі* (уст.), *твой*, *ваш*, *свой*; *ягоны*, *іхні*, *ейны* (разм.);

– адносныя займеннікі *чый*, *які*;

– няпэўныя займеннікі *нечы* (*нейчы*), *чыйсьці*, *чый-небудзь*, *абы-чый*, *чый-нічый*; *чыясь*, *чыйся*, *чыёсць* (дыял.);

– пытальныя займеннікі *чый*?,*чыя*?, *чыё*?, *чые*?;

– адмоўныя займеннікі *нічый*, *нічыйны*;

– азначальны займеннік *усіхны* (дыял.).

Агульнавядома, што прыналежныя займеннікі *мой*, *наш*, *твой*, *ваш*, *свой*, *ягоны, іхні, ейны* (разм.) указваюць на прыналежнасць 1-й, 2-й, 3-й асобе або на прыналежнасць усім тром асобам (*свой*): *Прыемна гэта сказаць:* ***мая*** *хата,* ***мой*** *пад’езд,* ***мой*** *двор* (У. Караткевіч. «Чорны замак Альшанскі»). *Нялёгкі выпаў лёс на* ***нашу*** *долю* (К. Кірэенка. «Матчына песня»). *Песня пачулася* ***наская****, нудная* (Янка Купала. «Лета»). *І часта, часта ў падарожжы магіла зрок запыніць* ***твой*** (Якуб Колас. «Рыбакова хата»). *Я ж выйшаў на чыстую дарожку проста перад* ***вашай*** *альтанкай* (Я. Скрыган. «Кругі»). *Ванін, тонкі і спрытны ў* ***сваёй*** *ватоўцы, ... хуценька ўзбег на пагорак* (В. Быкаў. «Праклятая вышыня»). *Асноўная катэгорыя для выкладчыка –* ***ягонае*** *прафесійнае званне* («Лім»). *… яны* [народавольцы] *лічылі цара непасрэдна вінаватым у смерці* ***іхніх*** *паплечнікаў* («Полымя»). [Цётка:] *– Ай, бабачкі, гэтую ж кабеціну* ***ейны*** *муж адшукаў* (В. Быкаў. «Мёртвым не баліць»).

Пранамінатывы *чый*, *які* рэалізуюць пасесіўную семантыку дадаткова да свайго асноўнага значэння адноснасці: «*Няхай бачаць,* ***чыя*** *сіла!*» – падумаў [Міканор] (І. Мележ. «Подых навальніцы»). *… у пераліку розных*

Іванаў ды Ганнаў, за жыццё і здароўе ***якіх*** *павінен быў уголас памаліцца поп, стаяла імя Змітрок* (Я. Брыль. «Нёманскія казакі»). На магчымасць адносных займеннікаў ужывацца са значэннем прыналежнасці ўказваў яшчэ А. А. Шахматаў [1, с. 499], аднак асноўная роля гэтых адзінак – сувязь прэдыкатыўных частак у складаназалежных сказах.

Няпэўныя займеннікі *нечы* (*нейчы*), *чыйсьці*, *чый-небудзь*, *абы-чый*, *чый-нічый*; *чыясь*, *чыйся*, *чыёсць* (дыял.) у сваёй семантычнай структуры спалучаюць пасесіўную сему з семай няпэўнасці – ‘які належыць каму-небудзь (невядома каму)’: … [Жаваранка] *ляжаў у гэтым пекле на* ***нечай*** *маленькай далоні* (І. Пташнікаў. «Найдорф»). *Нават беднага Сцёпку падгледзела* ***чыёсць*** *зоркае вока* (Якуб Колас. «На прасторах жыцця»). *Тое, што Міканор збіраўся бурыць не* ***чыё-небудзь****, а сваё гумно, не давала супакаення* (І. Мележ. «Людзі на балоце»).

Пытальныя займеннікі *чый*?, *чыя*?, *чыё*?, *чые*? выражаюць пытанне аб прыналежнасці каму-небудзь: – *Хто ты, хлопча? – дзед пытае: –* ***Чый*** *сынок?* (Якуб Колас. «Сымон-музыка»). ***Чыя*** *там пшаніца – доўгія загоны?* («Песні пра каханне»). [Яўхім:] – *Чые авечкі*? (І. Мележ. «Людзі на балоце»).

Адмоўныя займеннікі *нічый* і *нічыйны* абазначаюць ‘які не належыць нікому’, а азначальны *ўсіхны* (дыял.) – ‘які належыць усім’: [Сымон:] – *Я ... так ... хлопец ... падарожны, праз сябе сам ... , я ...* ***нічый*** (Якуб Колас. Сымон-музыка). *... вядома, зямля тут* ***нічыйная*** (Т. Хадкевіч. «Песня Дзвіны»). «*Будзе твая ўся* [зямля] – *самая лепшая! Сказаў, парадуваў!* ***Усіхная*** *– ето не твая…» – падумаў Васіль* (І. Мележ. «Подых навальніцы»).

На лексіка-семантычным узроўні пасесіўнасць выражаюць і некаторыя якасныя прыметнікі, якім уласцівы агульныя інтэгральныя пасесіўныя семы. Так, напрыклад, інтэгральная сема ‘належаць’ характэрна для такіх прыметнікаў, як *асабісты*, *уласны*, *агульны*, *чужы*, *прыватны* і пад.: *«Мозаика судьбы» Эдуарда Скобелева – гэта лаканічныя занатоўкі пісьменніка з* ***асабістага*** *архіва* («ЛіМ»). *... і даводзілася цягнуць яго* [*паром*] *сілаю* ***ўласных*** *рук* (У. Караткевіч. «Нельга забыць»). *Дубейка пахадзіў па парабках, гаворачы, што трэба заводзіць* ***агульную*** *гаспадарку* (Я. Скрыган. «Кругі»). *Добрае жыта, але* ***чужое*** (Я. Брыль. «Птушкі і гнёзды»). *На гэты дзень было намечана перасяленне многіх будаўнікоў з* ***прыватных*** *кватэр* (А. Кулакоўскі). *Гэтага настойліва патрабуюць інтарэсы* ***народнай*** *гаспадаркі* («Звязда»). ***Нацыянальны*** *даход*. ***Калгасныя*** *палеткі*.

На нашу думку, у гэтую ж групу мэтазгодна ўключыць якасныя складаныя прыметнікі, што ўтрымліваюць у сваёй семантычнай структуры інтэгральную сему ‘мець’ і абазначаюць знешнюю якасць суб’екта-пасэсара: *Гэты* ***чорнавалосы*** *чалавек гадоў пад пяцьдзясят ... нагадваў правінцыяльнага адваката* (Якуб Колас. «На ростанях»). *На калёсах ... сядзела* ***белагаловае****, малое зусім хлапчаня* (І. Пташнікаў. «Найдорф»). *Страсна спрачаўся з* ***белавалосым*** *мужыком конскі перакупшчык* (У. Караткевіч. «Каласы пад сярпом тваім»).

Сярод назоўнікаў са значэннем пасесіўнасці мэтазгодна вылучыць тры падгрупы: 1) назоўнікі, што абазначаюць суб'ектаў-пасэсараў (уладальнікаў чаго-небудзь), 2) назоўнікі, што называюць аб'екты-пасэсумы (тое, што належыць каму-небудзь, знаходзіцца ў чыім-небудзь уладанні), 3) тэрміны роднасці і свайцтва, што перадаюць свайцкія адносіны. У першую падгрупу ўваходзяць такія адзінкі, як *гаспадар* (*гаспадыня*), *уладальнік* (*уладальніца*), *уласнік* (*уласніца*), *уладар* (*уладарка*), *валадар* (*валадарка*), *уладарнік* (*уладарніца*), *заводчык*, *фабрыкант*, *фермер*, *трымальнік*, *аўтар*, *стваральнік* і пад.: ***Гаспадар*** *Вялікіх Грынявічаў любіў гасцей* («Полымя»). *У Мінюсце Рэспублікі Беларусь ... зарэгістраваны Беларускі Клуб* ***уладальнікаў*** *інтэлектуальнай уласнасці* («ЛіМ»). *Гэта быў муж Ядвісі, ...былы* ***ўласнік*** *камяніцы ў ваяводскім горадзе* (Я. Брыль. «Апошняя сустрэча»). ... ***уладары*** *яго [замка] адчуваюць сябе ў поўнай бяспецы* (В. Вольскі. «Кніга падарожжаў»). *Дык вось які, ён, Апалінарый Фларыянавіч, гаспадар,* ***творца*** *драўлянай казкі і бела-ружовай садовай песні* (М. Вышынскі. «Крыніца, светлая вадзіца»). ***Аўтары*** *даследаванняў*. ***Трымальнікі*** *акцый*.

Назіранні над фактычным матэрыялам паказваюць, што пасесіўныя семы характэрны і для складаных назоўнікаў тыпу *домаўласнік*, *землеўласнік*, *рабаўладальнік* і інш.

У другую падгрупу адносяцца такія адзінкі, як *маёмасць*, *набытак*, *уласнасць*, *багацце*, *дабро* і інш.: *З прыфрантавой паласы ўжо былі эвакуіраваны ўсё паязныя саставы і ўся чыгуначная* ***маёмасць*** (К. Чорны). *…калі ішлі глядзець калгасны* ***набытак*** *– ішоў* [Апенька] *ззаду* (І. Навуменка). [Гунава:] *– Гэта* ***ўласнасць*** *князя* (Э. Самуйлёнак).

Значэнне свайцкай прыналежнасці (адно з катэгарыяльных значэнняў пасесіўнасці) рэалізуюць у сучаснай беларускай літаратурнай мове шматлікія тэрміны роднасці і свайцтва, у семантычнай структуры якіх прысутнічаюць семы, што ўказваюць на свайцкія адносіны: ***Дзед*** *меў да сецей нахіленне…* (Якуб Колас. «Новая зямля»). *І Алёшава* ***маці*** *ад прыпека, і* ***бацька*** *з печы хвалілі яго* [Хоню]… (І. Мележ. «Людзі на балоце»). *Амілін* ***брат*** *ледзьве цягнуў ногі па цяжкай, скібаватай зямлі* (К. Чорны. «Зямля»). [Дзед:] *– ... Акім,* ***прадзед*** *ягоны, таксама нічагоўскі быў* (У. Караткевіч. «Каласы пад сярпом тваім»). … [Драздова] *лаяла ўвесь свет і асабліва* ***мужа*** *свайго Арцёма* (В. Быкаў. «На сцяжыне жыцця»). *Князь і яго* ***жонка*** *маглі перадаць права першага стрэлу любой асобе* (М. Ткачоў. «Замкі і людзі»).

Сярод дзеясловаў са значэннем пасесіўнасці адрозніваюцца дзве падгрупы: 1) дзеясловы са значэннем валодання (пазітыўнага і негатыўнага), 2) дзеясловы са значэннем прыналежнасці.

Адно з двух катэгарыяльных значэнняў пасесіўнасці – значэнне пазітыўнага валодання – перадае ў сучаснай беларускай літаратурнай мове група дзеясловаў, у семантычнай структуры якіх прысутнічаюць інтэгральныя семы 'валодаць', 'мець', 'быць (з'яўляцца, станавіцца) уладальнікам чаго-небудзь' і інш. Гэта такія адзінкі, як *арэндаваць*, *атрымаць*, *браць* (і вытворныя ад яго), *валодаць (уладаць)*, *дастаць*, *завесці*, *мець*, *набыць*, *красці*, *купіць*, *прыдбаць*, *прысвойваць* і пад.: *Харомнае, дзе Аляксандраў бацька*

арэндаваў *зямлю, было гняздом лютых шляхцюкоў* (С. Грахоўскі. «Рудабельская рэспубліка»). *За гэты час* ***атрымалі*** *зямельныя надзелы каля 2 тысяч грамадзян* (Я. Лугін. «Святая задача»). *Дзве трэці зямлі, якой* ***уладаў*** *да вызвалення мужык, пераходзяць да яго без выкупу* (У. Караткевіч. «Каласы пад сярпом тваім»). *Пан ...* ***меў*** *некалькі сёстраў* (Янка Купала. «Адплата кахання»). Дзеясловы са значэннем негатыўнага валодання рэалізуюць значэнні ‘перастаць мець што-небудзь’, ‘перастаць валодаць чым-небудзь’, а што значыць ‘перастаць быць уладальнікам чаго-небудзь’. Гэта такія адзінкі, як *губляць*, *збыць*, *падараваць*, *прадаць*, *страціць* і інш.: *У мінулым годзе запушчаную і ўшчэнт разбураную гаспадарку прыйшлося* ***збыць*** (А. Васілевіч. «Пачакай, затрымайся»). [Гушка:] – *Дык я вопратку* ***прадаў*** (К. Чорны. «Зямля»). ***Губляць*** *рэчы*.

Другая падгрупа дзеясловаў са значэннем прыналежнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове рэпрэзентавана адзінкай *належаць*, якая абазначае ‘быць (з’яўляцца) уласнасцю каго-небудзь’: *Луг і зямля ...* ***належалі*** *князю Радзівілу* (Якуб Колас. «На ростанях»). *Пра гэта расказваюць фотаздымкі, дакументы, зброя, якая* ***належала*** *героям* (В. Вольскі. «Кніга падарожжаў»). *Словам, дубы* ***належалі*** *вёсцы* (Б. Сачанка. «Дубы»).

Такім чынам, лексіка-семантычныя сродкі выражэння пасесіўнасці ў сучаснай беларускай літаратурнай мове – гэта адзінкі рознай часцінамоўнай прыналежнасці (займеннікі, прыметнікі, назоўнікі, дзеясловы), для якіх характэрны агульныя інтэгральныя пасесіўныя семы. Вызначаныя шматлікія адзінкі сведчаць пра багацце мовы і ствараюць неабходныя ўмовы для выбару таго адзінага сродку, які найбольш дакладна перадасць патрэбны пасесіўны сэнс.

ЛІТАРАТУРА

1. *Шахматов, А. А.* Синтаксис русского языка / А. А. Шахматов. – 2-е изд. – Л.: Учпедгиз, 1941. – 620 с.

Е. В. Шилей (Минск)

СЕМАНТИЧЕСКИЕ СОСТАВЛЯЮЩИЕ НАИМЕНОВАНИЙ КОМПАНИЙ г. МИНСКА

Переход от плановой экономики к свободным рыночным отношениям повлек за собой крупные перемены в бизнес-среде нашей страны. В Минске, крупнейшем экономическом и промышленном центре, эти изменения наиболее заметны. За последние десятилетия здесь наблюдается стремительный рост количества компаний в частном секторе экономики. Некоторые организации, некогда бывшие полностью государственными, в настоящее время являются открытыми акционерными обществами с долей частного капитала, ряд компаний по-прежнему остаются национализированными.

Появление новых организаций, рост конкуренции и, как следствие, борьба за внимание клиента вынуждает компании становиться более открытыми по отношению к целевой аудитории, поддерживать контакт с общественностью. Одним из способов привлечения внимания потенциальных потребителей является наименование организации. Название компании выступает не только средством обозначения объекта, это также сообщение, адресованное целевой аудитории, посредством которого организация передает внешней общественности целый ряд сведений о себе.

Анализ наименований организаций с точки зрения семантической структуры позволяет определить как качественный, так и количественный состав данного типа сообщений, то есть что и в каком объеме номинирующий субъект передает общественности о компании. Объем информации, а также характер сведений, отраженных в наименовании, варьируется не только в названиях предприятий, которые представлены в различных сферах деятельности. Даже в пределах одной и той же области степень информативности наименований существенно различается. Для анализа семантической структуры наименований были отобраны организации Минска, предоставляющие услуги по реализации электрооборудования. Выбор компаний данной сферы деятельности объясняется несколькими факторами. Во-первых, производством и/или поставкой электрооборудования занимаются организации разной формы хозяйствования, как государственные, так и частные. Во-вторых, как следствие предыдущего фактора, компании данной сферы весьма разнятся по размеру, начиная от крупных промышленных предприятий, заканчивая небольшими частными фирмами.

Исследование практического материала позволило выявить определенные закономерности и объединить названия компаний в несколько групп. В первую очередь они различаются по объему информации, передаваемой посредством имени объекта, что отражено в семантической структуре эргонима. В целом, названия могут содержать следующие факты об организации: вид предоставляемых товаров или услуг: «Электротеплоприбор», «Светодиоидные светильники»; специфика деятельности организации: «Профильстрой», «Спецтехналадка»; объем предоставляемых товаров и услуг: «Светодиоидный мир», «Мир сварки», «Город света»; уровень качества и обслуживания: «Экспертэнергосервис»; регион происхождения товара: «Белремкомплект», «Белинтегра», «Минсккабель», «Гомельшина», «Уралэлектра». Отдельного рассмотрения требует такой элемент семантической структуры наименования компании, как «евро». С одной стороны, семантика данного компонента реализует значение ‘регион происхождения’: *где-то в Европе*. С другой стороны, элемент «евро», входящий в состав любого сложного слова и наименования организации в том числе, уже давно приобрел значение ‘высокое качество товара, высокий уровень обслуживания’. Примерами названий таких организаций являются «Евроавтоматика», «Евророзетка», «Еврокабель», «Белевротех». Перечисленные выше факты могут встречаться в разных комбинациях и в разном количестве.

Анализ наименований компаний с количественной точки зрения показал, что номинирующий субъект в процессе имятворчества отбирает различный объем информации об организации, который затем выступает в качестве основы наименования. Некоторые названия содержат лишь один факт о компании. Чаще всего в данной сфере деятельности таким фактом является имя основателя организации: «Арнатович Р. П.», «Горовой Андрей Александрович», «Жуков М. И.», «Ротмистров П. Г.». Кроме того, в наименовании отражается суть деятельности компании по метанимическому принципу: «Аккумулятор», «Le Grand». С другой стороны, существуют названия организаций, передающие целый ряд сведений о компании. Как показал количественный анализ, максимально информативные наименования содержат до пяти параметров: «Автооптшинторг Плюс», «Белкортем-горэлтех». Иногда название включает четыре факта: «Белэлектротехприбор», «Электросантехторг», «Электротехпромкомплект». Безусловно, столь длинные названия выступают скорее исключением из правил. Большинство же наименований содержат три или два факта о компании: «Машспецсервис», «Климатмашэнерго», «Белэнергопрофиль», «Интелстрой», «Электроконструкции». Какие именно сведения об организации и в какой комбинации они будут использованы в наименовании зависит от внутренних и внешних факторов. К внутренним факторам относится номинирующий субъет с его видением названия компании. Это видение должно быть достаточно отчетливым и очевидным, чтобы у представителей целевой аудитории не возникало проблем с интерпретацией названия и имя не создавало вопросов в отношении истинного замысла номинатора, как на примере наименования компании, занимающейся поставкой электрооборудования «Минимакс Электро». Все-таки мини- или макси-поставки или оборудование имел в виду номинатор? К внешним факторам следует отнести удобопроизносимость и благозвучность имени. Представителям целевой аудитории бесспорно легче воспринимать, а затем и воспроизводить не слишком длинные и информативно перегруженные названия компаний. Встречаются среди наименований компаний, функционирующих в сфере электрооборудования, и символические названия, которые не передают целевой аудитории никакой информации об организации: «Элвега», «Яска», «Ролан», «Родат».


Для данной сферы деятельности наиболее продуктивным принципом номинации выступает сложение основ. Это позволяет номинирующему субъекту посредством одного сложного слова передать целый спектр сведений о компании. Семантическая структура таких наименований наглядно отражает смысловое строение эргонима. Значение имени объекта определяется исходя из значения компонентов, входящих в состав данного имени. Следует отметить, что элементы семантической структуры имеют различную степень информативности или различную семантическую силу. Например, такие наименования, как «Электроналадка», «Промсварка» состоят из двух компонентов, оба из которых равнозначны по информативности. В результате интерпретации подобных наименований получатель сообщения четко

представляет специфику деятельности компании. Существуют также названия, структура которых включает несколько компонентов (как правило, два), один из которых является ядерным, несущим основную смысловую нагрузку. Применяя классификацию эргонимов Суперанской, такой компонент можно назвать информирующим. Второй же компонент является символическим (основываясь на той же классификации), то есть не передающим какой-либо информации о деятельности организации. Например, в таких названиях, как «Вландэнерго», «Ариясвет», ядерными компонентами выступают «энерго» и «свет». Именно на основании семантики данных элементов целевая аудитория формирует представления о деятельности организации.

Следует отметить наличие еще одной тенденции, весьма распространенной в наименованиях компаний Минска – использование слов иноязычного происхождения. Как правило, это заимствования из английского языка, семантика которых связана со сферой деятельности компании. К таким заимствованиям относятся слова «лайт» от англ. *light* ‘свет’, «хаус» от англ. *house* ‘дом’, «трейд» от англ. *trade* ‘торговать, торговля’, «технолоджиз» от англ. *technologies* ‘технологии’ и пр. Этот факт имеет значение в анализе названий организаций, поскольку заимствованный элемент порой является ядерным компонентом семантической струтуры имени объекта: «Полар Лайт», «Прометейэнерджи», «Пролайт Групп», «Никлайтинг». Необходимо также обратить внимание на тот факт, что порой использование иноязычной лексики в наименовании организации ведет к формированию неверных ассоциаций у представителей целевой аудитории. Например, наименование компании «Санэнерджи» образовано посредством соединения двух слов английского языка «сан» от англ. *sun* ‘солнце’, которое, кстати, изображено на логотипе компании, и «энерджи» от англ. *energy* ‘энергия’. Исходя из семантики данных слов можно было бы предположить, что деятельность компании связана с разработкой или поставкой оборудования, использующего солнечную энергию. Однако это не так, компания занимается производством и торговлей светильниками, потребляющими обычную энергию.

Представленные выше результаты анализа наименований компаний, функционирующих в сфере электрооборудования позовлили систематизировать и объединить их в четыре группы, которые можно представить в форме условной пирамиды. Основание данной пирамиды составляют наиболее информативные наименования, в которых содержится три и более факта об организации. К данной группе относятся не только наименования, образованные по принципу сложения основ и состоящие из одного сложного слова, но и названия, включающие несколько слов: «Минский электротехнический завод им. В. И. Козлова», «Первая аккумуляторная компания», «Промышленные энерготехнологии». На следующем уровне пирамиды представлены наименования, в составе которых содержатся два факта, оба из которых равнозначны по степени информативности. К этой группе относятся как названия, образованные посредством ресурсов одного языка, так и включающие компоненты, заимствованные из английского языка: «Объединение

света», «Ледэлектрика», «Комплектзапчасть», «Максилайт». На следующей ступени пирамиды представлены названия организаций, семантическая структура которых состоит либо из одного компонента информирующего характера, либо из двух компонентов, один из которых является ядерным, несущим основную смысловую нагрузку, а второй является символическим, не передающим каких-либо сведений об организации: «Олди Свет», «Таврида Электрик», «Энерго-Фокс», «Молодцов А. Н.». Вершину пирамиды составляют наименования, относящиеся к символическим, то есть ни один компонент семантической структуры не сообщает каких-либо сведений о компании. К этой же группе наименований относятся и аббревиатуры: «Амитро», «Бомен», «Валарис», «ГСП-Бел». Полученные результаты можно представить графически следующим образом:



В данном примере «И» является показателем информативности, а числовое обозначение отражает количество фактов об организации.

Таким образом, наименования компаний, представленных в сфере электрооборудования, можно классифицировать как по количественному, так и по качественному признаку, в зависимости от того, какую информацию и в каком объеме номинирующий субъект передает целевой аудитории.

А. М. Якушава (Мінск)

СЛОВАЗЛУЧЭННІ З ПРЫСЛОЎЯМІ СТУПЕНІ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (на прыкладзе твораў І. Шамякіна)

Недастатковасць марфалагічных і лексічных сродкаў для выражэння разнастайных ступеней інтэнсіўнасці кампенсуецца ў значнай меры сінтаксічнымі адзінкамі – словазлучэннямі, у якіх функцыю галоўнага кампанента выконвае дзеяслоў, якасны прыметнік або назоўнік, а функцыю залежнага кампанента – прыслоўе ступені і меры. Прыслоўі ў спалучэнні з дзеясловамі, якаснымі прыметнікамі, назоўнікамі, дзеепрыметнікамі, прыслоўямі, дзеепрыслоўямі і займеннікамі выконваюць не толькі граматычную ролю, але

і ролю дадатковых сэнсавых паказчыкаў, дазваляюць удакладніць значэнне. У семантычную групу прыслоўяў ступені і меры ўваходзяць акалічнасныя прыслоўі, але выкарыстоўваюцца і якасныя, таму што яны сінтэзуюць экспрэсіўную ацэнку і паказчык інтэнсіўнасці праяўлення прыметы. Асабліва гэта назіраецца пры выражэнні надзвычай высокай ступені якасці. Наша ўвага накіравана на разгляд сінтаксічных сродкаў выражэння ступеней праяўлення якасці, галоўным з якіх з'яўляецца спалучэнне дзеяслова, прыметніка, назоўніка з залежным ад яго прыслоўем, якое абазначае ступень або колькасць. Колькасныя прыслоўі размяшчаюцца прэпазітыўна ў адносінах да прыметнікаў і дзеясловаў (з якімі часцей за ўсё спалучаюцца), а постпазіцыя ўспрымаецца ўжо як інверсія, што надае пэўную экспрэсію і эматыўнасць мастацкаму слову: *Узрадаваўся, што галава не* ***атупела зусім*** *– варушацца шарыкі* [1, с. 54]. Прыслоўі ступені абазначаюць характар інтэнсіўнасці прыметы і пры спалучэнні з прыметнікамі і дзеясловамі аб'ядноўваюцца семантычным кампанентам якасці, які праяўляецца ў большай ці меншай ступені. Найбольшай частотнасцю валодаюць словаспалучэнні з прыслоўямі *вельмі, амаль, зусім, трохі, крыху*. Прыслоўі ступені – важны сродак стварэння экспрэсіі ў мастацкім тэксце, дзе яны спалучаюцца з прыметнікамі і дзеясловамі для характарыстыкі знешняга выгляду людзей, іх паводзін і стану: *Але* ***вельмі ўжо простая прычоска*** *– гладка зачэсаныя назад і сабраныя ў куксу светлыя валасы ...* [2, с. 179]. *Але як не хвалявацца, калі бачыў, што дарагі чалавек траціць сілы:* ***зусім спалатнеў твар****, пасінелі вусны ...* [1, с. 95]. *Ён* ***вельмі прыгожа гаварыў*** *аб новым жыцці, аб новай вёсцы ...* [3, с. 265]. *Бацька чатырох дачок* ***зусім расчуліўся*** [1, с. 95]. *Ёсць у нас* ***дужа сярдзіты стары*** *– фізік, які чамусьці проста, здавалася, ненавідзеў нас, маладых настаўніц* [4, с. 41]; або апісання прыродных замалёвак ці навакольнага асяроддзя: *Але гэта не аднастайная роўнядзь, на якой няма за што зачапіцца позірку і якая мае* ***вельмі сумны выгляд увосень*** [2, с. 50]. *І ад таго* ***[лес] здаваўся вельмі мірным****, прадвызначаным на радасць чалавеку* [1, с. 156]. *Вось яна: нешырокая, але доўгая дзялянка, паўз квартальную прасеку, у абкружэнні больш сталага лесу з роўнымі радамі* ***не надта высокіх****, але дзябёлых, прыгожых, з белаватай карой, з густымі шапкамі галля маладых* ***дубоў*** [2, с. 123]. *Аляксей падхопліваецца, садзіцца, глядзіць на прыгожыя прырэчныя вербы,* ***на вёску****, вялікую і нейкую* ***крыху бязладную****, раскінутую* [2, с. 50]. У мове мастацкай літаратуры адзначана канструкцыя, якая выражае або падкрэслівае роўную меру праяўлення прыметы. Залежным кампанентам у яе складзе з'яўляецца суадноснае па сэнсе прыслоўе *роўна*: *лажыліся на зямлю роўна*. Па сваёй семантыцы прыслоўе *роўна* валодае неабмежаванай спалучальнасцю, хоць аналіз тэкстаў мастацкай літаратуры выявіў нямнога такіх спалучэнняў.

Для выражэння значэння паўнаты, цэласнасці і вычарпальнасці праяўлення прыметы выкарыстоўваецца канструкцыя з прыслоўем *зусім*: *«Пла?.. – хацеў спытаць Лагун і не скончыў слова, твар яго перасмыкнуўся, чалавек-асілак* ***зусім па-дзіцячаму ўсхліпнуў****, па шчоках, пабітых некалі ў маленстве воспай, пацяклі слёзы»* [4, с. 318]. ***Зусім добра***! [4, с. 226].

А потым, на фоне акна, дзяўчына ўбачыла, што ў яго амаль ***зусім белая галава*** [2, с. 141–142]. Канструкцыі з залежнымі прыслоўямі (*крыху, ледзь, ледзьве, бадай, трохі, трошкі, амаль*), якія выражаюць даволі значную колькасць семантычных адценняў, звязаных з паняццем непаўнаты, невычарпальнасці або недастатковасці якасці, у лексічных адносінах неаднародныя і вельмі стракатыя па сваёй структуры. Найбольшай сінтаксічнай спалучальнасцю з прыслоўяў дадзенай групы характарызуецца прыслоўе *амаль*, якое выражае некаторую недастатковасць да нормы: *віселі амаль нерухома; амаль кожны дзень; непасрэднасць, амаль дзіцячая; працягнула тонкую, амаль празрыстую далоню да яго; амаль зусім белая галава; навокал амаль першабытная прырода; па-святочнаму адзетая, прыгожая, амаль вясёлая; амаль стогнучы*. Па частаце ўжывальнасці ў даследаваных тэкстах пасля прыслоўя *амаль* ідуць канструкцыі з прыслоўем *крыху*, якое абазначае нязначную ступень, частковасць праяўлення якасці: *вёску, крыху бязладную, крыху мутныя вочы, крыху стомленым голасам*. Прыслоўе *ледзь* (*ледзьве*) – сінонім да прыслоўя *крыху*. Розніца паміж імі ў тым, што *ледзь* выражае яшчэ меншую ступень праяўлення якасці, чым *крыху*: *ледзь бачную, сярэбраную вяровачку; ледзьве шамкаў*. Але па сваёй семантыцы гэтыя прыслоўі вельмі блізкія. Астатнія прыслоўі гэтай семантычнай групы прадстаўлены значна меншай колькасцю прыкладаў. Ужываюцца яны ў прэпазіцыйным становішчы ў словаспалучэнні: *бадай жа з бацькоўскай клапатлівасцю, бадай весела, трохі мяшком ляпнуты, трохі як бы стомленая, як бы трохі прыжмураныя вочы, ужо трошкі загрубелыя*. Значэнне вельмі высокай ступені інтэнсіўнасці прыметы выражаецца сінтаксічнымі канструкцыямі з прыслоўямі *надта, вельмі, дужа, надзвычай, надзвычайна, незвычайна*. Прыслоўі *надта, надзвычай, надзвычайна, дужа* спалучаюцца практычна з усімі якаснымі прыметнікамі: *надта высокіх дубоў, надзвычай звяглівы сабачка, жыццё здавалася надзвычай прыгожым і цікавым, надзвычайна акуратнай і чыстай, дужа сярдзіты стары*. Найбольш частотнае ў даследаванай намі літаратуры прыслоўе *незвычайна* спалучаецца практычна з неабмежаванай колькасцю дзеясловаў: *адзецца незвычайна, незвычайна адбіваўся, незвычайна пахлі*. Для падкрэслівання вельмі высокай ступені інтэнсіўнасці і паўнаты праяўлення прыметы ўжываецца стылістычна нейтральнае прыслоўе *вельмі*, якое звычайна выкарыстоўваецца ў ад'ектыўных і дзеяслоўных канструкцыях: *вельмі здаваўся мірным; вельмі прыгожа гаварыў; прыгожа ж вельмі ён выступаў; вельмі каштоўную пасудзіну; вельмі дзіўнымі поглядамі; вельмі блізкім, родным чалавекам; вельмі хітрае нападзенне; вельмі ўжо простая прычоска; вельмі сумны выгляд*.

Значэнне празмернасці прыметы перадаецца канструкцыямі з прыслоўямі *занадта, залішне*. Звычайна залежнае слова ў гэтых канструкцыях знаходзіцца ў прэпазіцыі, прычым на яго нярэдка падае лагічны націск: *занадта дагледжаная барада*. Прыслоўе *залішне* ярка стылізавана, бо ўказвае на суб'ектыўна ўспрымаемую меру якасці: *... і я адказаў на дзіва смела, можа нават* ***залішне мнагаслоўна*** *– не па-салдацку* [4, с. 277].

Прыслоўі ступені, што распаўсюджваюць якасныя прыметнікі ў сінтаксічных канструкцыях, належаць да катэгорыі акалічнасных па значэнні і сінтаксічнай функцыі. Значэнне розных ступеней прыметы, інтэнсіўнасці праяўлення якасці можа быць выражана і ў спалучэнні з якаснымі і якасна-акалічнаснымі прыслоўямі. Такія прыслоўі адначасова ўказваюць на якасць якасці і на паўнату ці інтэнсіўнасць яе праяўлення. Асабліва часта такія прыслоўі ў сінтаксічных канструкцыях выкарыстоўваюцца для абазначэння празмернасці і вельмі высокіх ступеней якасці, напрыклад: *Над сасняком вісеў ненатуральна жоўты месячык і каля яго* ***фантастычна яркая*** *зорка – планета, пэўна* [1, с. 312]. *Ён хворы,* ***страшэнна кашляе*** [4, с. 302]. *І толькі, калі* ***напісанае прыгожа і чыста****, без адзінай кляксы, было перапісана ў трэці ці нават у чацвёрты раз, ён прачытаў ліст яшчэ раз …* [3, с. 278]. *Я не магла больш трываць, я не магла глядзець на яго, бачыць яго агідны, заўсёды* ***чыста выгалены*** *твар …* [4, с. 21].

Агляд словаспалучэнняў з прыслоўямі ступені паказвае, што ў беларускай мове існуе развітая сістэма сінтаксічных сродкаў для выражэння разнастайных ступеней інтэнсіўнасці прыметы, уласцівай прадметам. Паколькі прыслоўі ступені, інтэнсіўнасці і паўнаты праяўлення прыметы не складаюць марфалагічна кампактнай групы, таму словазлучэнні з імі характарызуюцца сінаніміяй і ўзаемазамяняльнасцю.

ЛІТАРАТУРА

1. *Шамякін, І. П.* Збор твораў : у 23 т. / І. П. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2011. – Т. 5 : Аповесці, 1988–1993.
2. *Шамякін, І. П.* Збор твораў : у 23 т. / І. П. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2010. – Т. 2 : Апавяданні, 1953–2003.
3. *Шамякін, І. П.* Збор твораў : у 23 т. / І. П. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2010. – Т. 1 : Апавяданні, 1944–1951.
4. *Шамякін, І. П.* Збор твораў : у 23 т. / І. П. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2011. – Т. 3 : Аповесці, 1945–1970.

СЕКЦЫЯ 2. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА І СВЕТ

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАГА ГУМАНІТАРНАГА ПРАЦЭСУ

Н. Горбани Эбрахими (Иран),
П. В. Васюченко (Беларусь)

ЛИТЕРАТУРНЫЕ ЖУРНАЛЫ «БОХАРА» (ИРАН) И «УЗВЫШША» (БЕЛАРУСЬ): ОПЫТ ТИПОЛОГИЧЕСКОГО СРАВНЕНИЯ

Современный рынок печатных изданий Ирана впечатляет многообразием литературно-художественных журналов. Насчитывается 86 изданий, 56 из которых предназначены для широкой читательской аудитории. Они отличаются читательским адресом, целевым назначением и выполняемыми функциями. Негосударственный журнал «Бохара» является одним из наиболее известных, популярных и авторитетных журналов, который издается на протяжении 18 лет и уже насчитывает в своем архиве 109 номеров. До иранской революции (1979) художественно-литературные журналы «Сохан», «Йагма» и «Айандех» благодаря активной литературной деятельности заняли настолько высокие позиции в литературной жизни страны, что и сегодня являются авторитетными литературными источниками. После революции журнал «Бохара» продолжил их традиции.

Издание журнала «Бохара» началось летом 1998 г. под руководством Али Дехбаши. До этого он являлся редактором культурно-художественного журнала «Келк». Это издание пользовалось большой популярностью среди востоковедов и по своей деятельности было похоже на журнал «Бохара». К сожалению, сегодня литературно-художественный журнал «Бохара» из-за материальных трудностей и отсутствия поддержки государства издается нерегулярно. На страницах издания то и дело встречаются объявления, в которых редактор просит аудиторию своевременно оплачивать подписку. В одном из номеров журнала под рубрикой «Слово редактора» Али Дехбаши напечатал свой «Печальный рассказ», где жаловался на судьбу издания. На первой полосе каждого номера размещается реклама, которая, в отличие от остальной информации, публикуется в цвете, чем привлекает к себе внимание.

На современном этапе высокий темп развития большинства печатных изданий обусловливается динамикой изменения информационного пространства, но трансформация их структуры и визуального образа также играет большую роль в привлечении читателей. Журнал «Бохара» сохранил свой визуальный образ, уделяя большее внимание содержанию. Все статьи, графические изображения и фотографии представлены в черно-белом цвете. Таким образом, влияние внешней формы, визуальных свойств и цветовых

решений, которые направлены на привлечение внимания аудитории, не играет большой роли в увеличении коммерческого значения и преимущества журнала «Бохара» перед другими. Даже повышение контрастности акцентных элементов – заголовков, иллюстраций – не выходит за рамки стандартного оформления журнала, сохраняя черно-белое оформление. Обложка каждого издания имеет свой цвет, но только как фон. На цветном фоне представлена фотография героя номера в черно-белом цвете, что также соответствует визуальной концепции журнала.

Таким образом, не внешний имидж, а содержание определяет специфику литературно-художественного издания «Бохара».

Журнал включает в себя информацию по иранистике, литературе, искусству Ирана и других стран. В нем размещены материалы, разнообразные по жанрам и тематике. Среди них литературная критика, презентация иранских и зарубежных книг, репортаж, житейская история, очерк, портретный очерк, разнообразные литературные и исторические статьи, исторические документы, поэзия, отзывы на новые книги, библиографические материалы, фотографии. Авторами материалов являются такие известные иранские писатели и литературоведы, как Ирадж Афшар (исследователь в области культуры и иранской литературы, иранист и библиограф), Мохаммед Реза Шафии Кодкони (писатель, поэт и литературовед), Дарюш Шайган (философ и мыслитель), Али Дехбаши (журналист и литературовед), Джале Амузегар (исследователь в области древних языков) и др.

«Бохара» считается одним из крупнейших литературно-художественных журналов, который, в отличие от других иранских печатных СМИ такого формата, имеет большой объем и разнообразие рубрик. Каждый номер напоминает по размерам и форме книгу. Несмотря на постоянное увеличение объема и сегмента литературно-художественной тематики журнал «Бохара» стремится не только сохранять свою популярность, но и развиваться в условиях жесткой конкуренции. Он информирует читателей об актуальных событиях литературной жизни страны. Али Дехбаши сам готовит подробную информацию о литературных конференциях и иных мероприятиях. Под его руководством читателям становятся доступны многие документальные материалы. Освещаются литературная деятельность современных и давно ушедших писателей и редакторов, их произведения, о которых раньше никто не писал или о них было сказано очень мало. На страницах журнала раскрываются тайны жизни литературных деятелей. Примером этому могут служить следующие материалы: «Юбилейный сборник об Эхсан Нараги» [1] (иранский писатель и социолог), «Юбилейный сборник об Абдол-Хусейн Заринкуб» [2] (иранский литературовед, литературный критик и историк) и «История издания в Иране» [3].

Публикация таких материалов носит просветительский и популяризаторский характер. Журнал ставит своей целью предоставление читателю качественного и интересного материала.

Редактор журнала и его коллеги разрабатывают новые рубрики. Например, «Ночь памяти» посвящается выдающейся иранской или зарубежной личности, деятелю литературы и искусства. В эту рубрику уже

попали такие имена, как Рабиндранат Тагор, Гюнтер Грасс, Осип Мандельштам, Петер Хандке, Умберто Эко, Ханна Арендт, Вирджиния Вулф, Хушанг Эбтехаж, Бахрам Бейзаи и др. Около половины объема каждого номера отводится на эту рубрику, в которой читатели могут найти доклады, критику, статьи и обсуждение творчества писателей, литературных деятелей. Например, около 120 страниц последнего номера журнала [4] было посвящено памяти Абдол-Рахима Джафари, основателя и бывшего директора издательства «Амир Кабир» в Иране, которое является самым крупным частным предприятием в Иране и на Ближним Востоке. Этот номер включает в себя такие материалы, как «Из воспоминаний моего отца», «В ожидании утра», «Гастон Галлимар посетил Иран», «Чем занимался Джафари», «Гений Абдол-Рахим Джафари», «Абдол-Рахим Джафари в отчете ЮНЕСКО», «Лица и события в памяти Абдол-Рахима Джафари». На обложке номера размещен портрет героя номера.

Несмотря на конкуренцию печатных изданий с электронными журналами и высокоскоростными сайтами журнал «Бохара» регулярно издается с интервалом в два месяца и имеет свою аудиторию читателей. За 18 лет существования журнал сумел занять значительный сегмент рынка литературно-художественной печати и высоко поднял планку качественных характеристик своего содержания.

Разнообразные материалы «Бохара» развивают у читателей глубокое понимание литературы и искусства, религиозных идей, исторических событий, древней культуры Ирана. Например, в рубрике «Несколько вопросов о поэзии Хафиза» [5], Мохаммед Реза Шафии Кодкони рассматривает понятие «вино» в поэзии и культуре Ирана.

Портретный очерк как художественно-публицистический жанр широко представлен в журнале. А. Тертычный справедливо полагает: «Суть публикации данного типа заключается в том, чтобы дать аудитории определенное представление о герое выступления. Решая эту задачу, журналист, как правило, в первую очередь стремится раскрыть самое главное – показать, каким ценностям служит этот герой, в чем видит смысл своего существования» [6, с. 251]. Например, статью «Парвиз Марзбан в одном взгляде» Али Дехбаши посвятил мастерству переводов Парвиза Марзбана. В статье также проводится анализ двух пьес, написанных Оскаром Уайльдом, – «Идеальный муж» (1895) и «Женщина, не стоящая внимания» (1893), которые Парвиз Марзбан переводил в 1956 г. и 1964 г. Он также перевел 2 из 14 томов «Истории цивилизации» Уильяма Джеймса Дюранта и другие произведения, о чем рассказывается на страницах журнала [7]. Статья «Фридрих Рюккерт и мир персидского языка» посвящена немецкому поэту, переводчику и иранисту. Али Дехбаши считает, что иранские произведения, переведенные Фридрихом Рюккертом на немецкий язык, стали причиной широкой популярности и развития персидского языка в Германии [8].

В журнале «Бохара» публикуются такие известные иранские репортеры, как Таранех Маскуб, Хамид Раси, Аскар Бахрами, Али Тарафдари и др. Исследователь С. Гуревич замечает: «задача любого репортера

заключается прежде всего в том, чтобы дать аудитории возможность увидеть описываемое событие глазами очевидца (репортера), т.е. создать эффект присутствия» [9, с. 87]. Ярким примером выступает работа репортеров на трехдневной конференции «Семь министров и семь мудрецов» (сравнительно-исторический анализ произведения «Синдбад-наме»), которая проводилась в Женевском университете в Швейцарии в 2014 г. [10]. Автор репортажа «Памятная ночь Наджаф Дарябандари» и его же герой – современный иранский писатель и переводчик [11].

В журнале «Бохара» широко представлены статьи по литературе, лингвистике, истории и развитии цивилизации. Авторами статей являются такие известные иранские писатели и литературоведы, как Мохаммед Реза Шафии Кодкони, Абдол-Хусейн Азаранг, Турадж Даряи, Дарюш Шайган и др. К примеру, статья «Вера и правила зороастризма в “Шахнаме” Фирдоуси» рассматривает книгу д-ра Колсума Газанфари «Понятие действительности зороастризма в “Шахнаме”, Заратустра, вера и правила», изданную в 1979 г. в Германии на английском языке [12]. Статья знакомит аудиторию с зарождением веры зороастризма в Иране через «Шахнаме», и, таким образом, показывает тесную связь культур и обычаев прошлого и настоящего. Лингвистическая статья Мохаммада Реза Батени «Язык и концепция коммуникации» [13] излагает основы концепции коммуникации и показывает результаты сопоставления их с языком. В статье «Принципы искусства рассказывания сказок в персидской литературе» ее автор Мохаммад Реза Шафии Кодкони, опираясь на древнюю иранскую литературу, утверждает, что «концепция рассказывания» долгие годы была известна иранским литературоведам, но она никогда не рассматривалась как искусство. Автор затрагивает и концепцию *fiction therapy*, которая на Западе стала популярна только во второй половине XX века [14].

Среди многообразия материалов журнала «Бохара» читателю представлены работы, созданные в таком художественно-публицистическом жанре, как очерк, который совмещает в себе репортаж и исследование, примером которого является материал «Шахнаме» [15]. В очерке Сирус Алинежад исследует иллюстрированную книгу «Шахнаме», выпущенную издательством «Амир Кабир» в 1971 г. Писатель рассказывает о достижениях Абдол-Рахима Джафари как редактора, об энергии, которую он долгие годы вкладывал в свое дело, и проблемах, которые встречались на его пути.

Н. Маслова отмечает что: «Путевой очерк, как и некоторые другие журналистские жанры, относится к наиболее ранним формам текстов, ознаменовавших становление журналистки. Очевидно, это объясняется тем, что подобная путевому очерку форма отображения действительности была чуть ли не первой в художественной литературе» [16, с. 256].

Некоторые материалы посвящаются личности умершего человека, с целью напомнить о его достижениях, ценных для нынешнего поколения. Материалы, написанные в художественно-публицистическом жанре эпитафии, занимают целый раздел каждого номера. Это работы об умерших

иранских и зарубежных писателях, литературоведах и других выдающихся личностях. Например, такие материалы, как «В память о Ждафар Саждади» [17] (исследователь мистико-эзотерических традиций) Хакима Ешраги, «Память о профессоре Е. Майкеле Бонин» [18] (географ, декан института изучения проблем Ближнего Востока Аризонского университета) Азиты Хамедании, «Фарахманд, последние дни» [19] в память об Али Реза Фарахманде, журналиста и переводчика Сируса Алинежадема, «В память о профессоре Хафез Фарманфармаиян», иранском историке, Мохаммеда Реза Ганунпарвара [20].

Публикации в жанре житейской истории часто появляются на страницах журнала «Бохара». Жанр, который, с одной стороны, имеет фантастический сюжет, с другой – обладает документальным характером отображения действительности. В таком жанре написан материал «Роль писателя» Парвиза Дваия, созданный на основе книги «Встреча» Милана Кундеры (2009) [21].

Рассказ как литературно-художественный жанр редко встречается на страницах журнала «Бохара». По нашим подсчетам в семи последних номерах представлен один рассказ и одно поэтическое произведение. Рассказ Мохаммеда Али Джамалзадеха «Жареный гусь» представляет собой образец современной иранской иронической прозы [22]. В целом на страницах «Бохары» литературная критика доминирует над беллетристикой.

В журнале появились такие характерные материалы, как «Таджикские книги и издания» Масуда Ерфаняна [23] и «Торкестан, первая персиоязычная газета в Османской империи» Масуда Хоссейнипура [24], которые представляют читателям информацию о зарубежных печатных изданиях, литературе и художественной деятельности. Эти материалы представляют жанр обзора. В них дается оценка публикациям, раскрываются их сильные и слабые стороны, представлены отрывки статей с комментариями обозревателя.

Информационный жанр представлен в форме интервью, в котором журналист задает вопрос известной личности. Отметим материал Сируса Алинежада «Еще продолжу работу в “Амир Кабир”, потому что я не совершил ошибки» [25]. В материале раскрываются литературные достижения издательства «Амир Кабир» в Иране и отмечаются заслуги его директора Абдо-Рахима Джафари.

Обычно в последнем разделе журнала «Бохара» размещаются отзывы на иранские и зарубежные произведения, а также презентации новых книг и авторов. Примером может служить отзыв на книгу «Востоковедение против вестернизации», написанную французской писательницей Латитой Нанкуетой [26], и презентация книги «Кровь и принадлежность, путешествие в новый национализм», канадского писателя, журналиста и сценариста Майкла Гранта Игнатьева [27].

Таким образом, журнал «Бохара» продолжает литературную деятельность крупнейших литературно-художественных изданий, которые активно работали до революции, и чье место пустовало среди других изданий

в последние годы. «Бохара» не только представляет и популяризирует древнюю иранскую литературу и культуру, но и развивает современную персидскую литературу, а также знакомит читателей с современной мировой литературой.

Эта характеристика журнала позволяет провести прямые и косвенные параллели с белорусским изданием «Узвышша», несмотря на то, что белорусский журнал выходил в 1920–30-е годы. «Узвышша», как и иранский журнал, появился в результате соперничества двух принципов творчества – массового и элитарного. «Бохара» противостоял массовой культуре, нивелировке общественных вкусов, и «Узвышша» сопротивлялся коллективизации искусства, постановке литературы «на вал» – принципам, которые проповедовал до этого «Маладняк». Количественная составляющая иранской прессы, на фоне которой вынужден самореализовываться журнал «Бохара», впечатляет: 85 литературно-художественных изданий-конкурентов. «Узвышша» соревновался с литобъединением «Маладняк», число членов которого достигало 500. Основатели «Узвышша» – А. Бабарека, П. Глебка, В. Дубовка, Т. Кляшторный, К. Крапива, М. Лужанин, Я. Пуща, К. Чорны и др. обещали создать литературу, «якой здзівяцца вякі і народы».

Оба журнала создавались в послереволюционный период, эпоху радикальных перемен. Они вынуждены были соотносить свою стратегию с ведущей политикой, интересами правящих режимов. Их создатели пытались отвоевать необходимую для полноценного функционирования журналов степень свободы. Тональность некоторых выступлений журналистов «Бохары», как отмечалось выше, наполнена социальным и политическим критицизмом.

В том же направлении выступали и белорусские авторы. Например, В. Дубовка высказывался о том, что «узвышенцы» признают руководящую роль партии, но в такой степени, в которой она отвечает их творческим целям. А. Бабарека призывал говорить с писателями «не камандаю, а культураю». Деятельность обоих журналов представляет собой образец умеренного, рассудительного (памяркоўнага) нонконформизма.

Оба издания демонстрируют бережное отношение к национальной культуре, фольклору, литературной классике, родному языку (фарси – белорусскому). В аксиологической шкале «Бохары» преобладают религиозные ценности ислама, в программе «Узвышша» – национальная идея, которая в маскимальной форме реализовалась в программном стихотворении В. Дубовки «О Беларусь, мая шыпшына…» (1926).

И «Бохара», и «Узвышша» консолидировали вокруг себя определенные литературные силы, представляли то или иное направление искусства. «Бохара» собрал круг постоянных авторов – писателей, критиков, журналистов, переводчиков, по-современному мыслящих, ориентирующихся на передовые идеи мирового искусства. Журнал «Узвышша» представлял прогрессивное одноименное литературное объединение, разделяющее сокровенную мечту Максима Богдановича вписать белорусскую литературу в контекст мировой. Один из способов реализации этого проекта – художественный перевод, который практиковали оба журнала.

Творческие взгляды «узвышенцев» отражены в «Тезисах» Адама Бабареки, своеобразной программе объединения, опубликованной в первом номере одноименного издания. Идеолог и ведущий критик «Узвышша» прокламировал такие творческие принципы, как культура белорусского языка, жизненная символика художественного произведения, концептуальная образность, динамичность композиции, белорусская жанровость, единство творческо-художественной идеи, разнообразие формальных реалий, аквитизм. Последнее понятие происходит от латинского *aqua vita* ‘живая вода’ и расшифровывается как «трансфармацыя творчай энергіі мас у творчую энергію пісьменніка» [28].

Оба журнала выделяются жанровым разнообразием содержания, в котором, однако, значительное место занимают материалы литературно-критической и культурологической направленности.

Об этом свидетельствует контент первого номера «Узвышша».

Номер открывается повестью Змитрака Бядули «Салавей». В нем же публикуются объемные литературоведческие заметки А. Бабареки, исследования профессора Вознесенского («Паэмы Янкі Купалы»), профессора Пиотуховича («Беларуская драматургія»), где анализируется, между прочим, пьеса Янки Купалы «Тутэйшыя», теоретическая статья Плащинского «Кніга лірыкі як мастацкае цэлае», размышления Яра «Праз “Учора” да “Заўтра”» и его же эссе «Драматычны элемент у творчасці нашых продкаў», помещается руб-рика «Кнігапіс», публикуются «Злыя нататкі» Николая Бухарина, перепечатанные из газеты «Правда», заметки В. Дубовки «У звязку з пытаньнямі аб беларускіх мэлёдыях у творчасьці Шопэна», где приводятся даже ноты [28].

Оба журнала сталкивались не только с экономическими трудностями. Для «Узвышша» они были связаны с политическими гонениями, репрессиями, в результате которых журнал был закрыт. Журнал «Бохара» выстоял, но и сегодня переживает проблемы экономического порядка.

Сопоставление творческого опыта иранского и белорусского журналов свидетельствует: в культурной жизни каждого народа имеются исторические отрезки, когда творцы ищут свое литературное «узвышша» (например, классицисты, «парнасники» во Франции, приверженцы «чистого искусства» и акмеисты в России, «узвышенцы» в Беларуси), соизмеряют свое творчество с классическим эталоном, который, хотя и незримо, как образцы Гринвичской лаборатории, но всегда существовал. Как правило, такие эпохи связаны со стремлением той или иной культуры не только вписаться в мировой контекст, но и сохранить при этом свою национальную самобытность.

ЛИТЕРАТУРА

1. Юбилейный сборник об Эхсан Нараги / Бохара. – 2013. – № 91. – С. 428–496 (на фарси).
2. Юбилейный сборник об Абдол-Хусейн Заринкуб / Бохара. – 2013. – № 91. – С. 210–321 (на фарси).

3. *Азеранг, Абдол-Хусейн*. История издания в Иране / Абдол-Хусейн Азеранг // Бохара. – 2013. – № 91. – С. 145–152 (на фарси).
4. Материалы и исследования / Бохара. – 2016. – № 109. – С. 48–166 (на фарси).
5. *Шафии Кодкони, Мохаммед Реза*. Несколько вопросов о поэзии Хафиза / Мохаммед Реза Шафии Кодкони // Бохара. – 2016. – № 109. – С. 6–16. (на фарси)
6. *Тертычный, А. А.* Жанры периодической печати: учеб. пособие для вузов / А. А. Тертычный. – М.: Аспект пресс, 2000. – 312 с.
7. *Дехбаши, Али.* Парвиз Марзбан в одном взгляде / Али Дехбаши // Бохара. – 2014. – № 100. – С. 465–467 (на фарси).
8. *Дехбаши, Али.* Фридрих Рюккерт и мир персидского языка / Али Дехбаши // Бохара. – 2013. – № 91. – С. 356–360 (на фарси).
9. *Гуревич, С. М.* Газета: вчера, сегодня, завтра : учеб. пособие для вузов / С. М. Гуревич. – М. : Аспект Пресс, 2004. – 288 с.
10. *Тарафдари, А. М.* Семь министров и семь мудрецов / А. М. Тарафдари // Бохара. – 2014. – № 103. – С. 488–490 (на фарси).
11. *Маскуб, Таранех.* Памятная ночь Наджаф Дарябандари / Таранех Маскуб // Бохара. – 2014. – № 100. – С. 291–294 (на фарси).
12. *Метгалчи, М.* Вера и правила зороастризма в «Шахнаме» Фирдоуси / М. Метгалчи // Бохара. – 2014. – № 100. – С. 63–71 (на фарси).
13. *Батени, Мохаммад Реза.* Язык и концепция коммуникации / Мохаммад Реза Батени // Бохара. – 2014. – № 103. – С. 21–26 (на фарси).
14. *Шафии Кодкони, Мохаммед Реза.* Принципы искусства рассказывания сказок в персидской литературе / Мохаммед Реза Шафии Кодкони // Бохара. – 2012. – № 91. – С. 11–20 (на фарси).
15. *Алинежад, Сирус.* «Шахнаме» Амир Кабир / Сирус Алинежад // Бохара.– 2016. – № 109. – С. 101–105 (на фарси).
16. *Маслова, Н. М.* Путевые заметки публицистическая форма / Н. М. Маслова. – М.: Изд-во МГУ, 1977. – 115 с.
17. *Ешраги, Хаким*. В память о Ждафар Саждади / Хаким Ешраги // Бохара. – 2014. – № 97. – С. 428–433 (на фарси).
18. *Хамедани, Азита.* Память о профессоре Е. Майкеле Бонин / Азита Хамедани // Бохара. – 2011. – № 97. – С. 435–439 (на фарси).
19. *Алинежад, Сирус.* Фарахманд, последние дни / Сирус Алинежад // Бохара. – 2014. – № 100. – С. 491–496 (на фарси).
20. *Ганунпарвар, Мохаммед Реза.* В память о профессоре Хафез Фарманфармаиян / Мохаммед Реза Ганунпарвар // Бохара. – 2015. – № 107. – С. 509–513 (на фарси).
21. *Дваии, Парвиз.* Роль писателя / Парвиз Дваии // Бохара. – 2014. – № 103. – С. 80–82 (на фарси).
22. *Джамалзадех, Мохаммед Али.* Жареный гусь / Мохаммед Али Джамалзадех // Бохара. – 2014. – № 103. – С. 356–364 (на фарси).

23. *Ерфанян, Масуд.* Таджикские книги и издания / Масуд Ерфанян // Бохара. – 2012. – № 91. – С. 97–113 (на фарси).
24. *Хоссейнипур, Масуд.* Торкестан, первая персиоязычная газета в Османской империи / Масуд Хоссейнипур // Бохара. –2014. – № 97. – С. 51–59 (на фарси).
25. *Алинежад, Сирус.* Еще продолжу работу в Амир Кабир, потому что я не совершил ошибки / Сирус Алинежад // Бохара. – 2016. – № 109. – С.127–133.
26. *Гуджлу, Фарзанех.* Востоковедение против вестернизации, литературная и культурная картина Франции и Ирана со времен иранской революции / Фарзанех Гуджлу // Бохара. – 2014. – № 100. – С. 414–416 (на фарси).
27. *Солтани, Сима.* Кровь и принадлежность, путешествие в новый национализм / Сима Солтани // Бохара. – 2014. – № 103. – С. 513–520 (на фарси).
28. Узвышша. – 1926. – № 1.

М. М. Воінава-Страха (Мінск)

КАРЦІНА СВЕТУ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ І ТАДЖЫКСКАЙ НАВЕЛІСТЫЦЫ

Мадэляванне карціны свету ў мастацкай прасторы сучасных беларускай і таджыкскай літаратурах адбываецца праз прызму рэалій XXI стагоддзя на каардынатах універсальных паняццяў, што спрадвеку складаюць аснову чалавечага быцця: станоўчыя (сям'я, род, справядлівасць, каханне, вернасць, дабрыня і г.д.), як фундамент, і адмоўныя (здрада, двудушнасць, хцівасць, падман, зайздрасць і г.д.), як своеасаблівыя пункты адліку разбурэння ўніверсуму.

Кожная з акрэсленых літаратур, скіроўваючы ўвагу на анталагічныя пытанні, арыентуецца на сусветны і ўласна нацыянальны вопыт пазнання Сусвету. Разглядаючы карціну свету «як адметны тып вобразна-канцэптуальнай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці, які мае свой ракурс бачання і ў аснове якога знаходзіцца пэўная мадэль свету» [1, с. 10], акцэнтуем увагу на спецыфічным характары спосабаў яе стварэння ў беларускім і таджыкскім прыгожых пісьменствах. Іх унікальнасць абумоўлена непаўторнасцю мастацкага стылю пісьменнікаў, якія робяць намаганні ў межах тэкставай тканкі адлюстраваць сутнасць уласнага ўспрыняцця рэчаіснасці, паказаць асаблівасць тых ці іншых складнікаў анталагічнай праблематыкі, як асновы мадэлявання карціны свету. Прааналізуем, якім чынам адметныя прадстаўнікі нацыянальных літаратур, Ато Хамдам у таджыкскім і Уладзімір Сцяпан у беларускім мастацтве слова, дасягаюць вышэйакрэсленай мэты.

Адным з пунктаў адліку ў анталагічнай сістэме У. Сцяпана з'яўляецца сям'я як фундамент, на які абапіраецца чалавек у працэсе стварэння ўласнай мадэлі свету. Так, у навеле «Ключ» у якасці цэнтру выступае дом, баць-

коўская хата як сакральны пачатак і адначасова сімвал прадаўжэння, трываласці роду. Памяць продкаў, сканцэнтраваная ў родным доме, абумоўлівае ўстойлівасць карціны свету, надзяляе сілай яе стваральніка. Менавіта па гэтай прычыне герою згаданага твора невыносная сама думка аб магчымым разбурэнні бацькоўскай хаты: «Калі ён уяўляў сабе дом разрабаваным, з выбітымі вокнамі, з разламанай падлогай, загаджаны, закіданы смеццем – яму рабілася млосна» [2, с. 27]. Родны дом надзяляе героя пачуццём абароненасці, упэўненасці, спакою, адчувальна ўраўнаважвае яго душэўны стан.

Парадаксальным і адначасова заканамерным выступае ўспрыняцце героем навелы «Ключ» бацькоўскай хаты не толькі як пачатку, але і фінальнага пункту адліку жыцця. Аналагічны матыў прасочваецца і ў навеле «На вуліцы школьнай»: галоўны герой Віцька Кныш напярэдадні ўласнага скону вяртаецца менавіта на малую радзіму, дзе хутка, пасля другога інсульту, і знаходзіць свой апошні прытулак.

Матыў закальцаванасці лініі лёсу ў адной прасторы, у дадзеным выпадку бацькоўскай хаты, выглядае ў пэўнай ступені лагічным, бо складае ўражанне своеасаблівай завершанасці жыццёвага цыклу. Разам з тым, гэта думка супярэчыць галоўнай – аб увасабленні роднага дому як прадаўжэнні роду. Пры павярхоўным разглядзе абодва пункты погляду надзелены сэнсам. Аднак мастацкая карціна свету У. Сцяпана пазбаўлена фатальнай трагічнасці, прыхаванай у ідэі закальцаванасці чалавечага жыцця. Герой навелы «Ключ» застаецца жыць, адмаўляючыся ад намеру здзейсніць самагубства. Такім чынам, канстатуецца адзін з найважнейшых складнікаў мадэлі рэчаіснасці аб забеспячэнні трываласці свайго роду праз яго прадаўжэнне.

Вышэйадзначанае дазваляе вылучыць важную асаблівасць карціны свету – устойлівасць, бо яна фарміруецца пад уплывам не хаатычна выбраных элементаў, а толькі тых ідэй і паняццяў, якія складваліся і выпрацоўваліся на працягу істотнага часавага адрэзку, прайшлі, такім чынам працэс выпрабавання і своеасаблівай крышталізацыі падчас жыццёвых пературбацый. Акрэсленая ўласцівасць мадэлі свету ў мастацкай сістэме У. Сцяпана абумоўлівае адначасова і ўстойлівасць ідэйнага грунта, на якім трымаецца чалавечае жыццё.

Для таджыкскага мастака слова Ато Хамдама сям’я выступае сапраўднай асновай жыццесцвярджэння чалавека. Так, сэнс існавання для героя навелы «Чужы чалавек» неаддзялімы ад ідэі яднання сям’і і цесна суадноснай з ёй думкай аб важнасці прадаўжэння роду. Памяць аб продках сінанімічна, у нейкай ступені, бяссмерцю: «Самога сябе ён добра вывучыў і дакладна ведаў, што пакутуе праз палкае і нясцерпнае жаданне застацца ў гэтым свеце і пасля смерці – страшна падумаць, што пойдзеш у нябыт і ніхто не ўзгадае цябе добрым словам і не будзе сумаваць без цябе хоць адно кароткае імгненне» [3, с. 21].

Бяссмерце ў дадзеным выпадку ўспрымаецца як станоўчае прызнанне нашчадкамі здзейсненага ў жыцці, што для самога героя аналагічна ўсведамленню напоўненасці сэнсам ўласнага існавання. Менавіта па гэтай прычыне

безапеляцыйнае далучэнне Маўлона-амака да катэгорыі «чужых» з боку маці нявесткі падчас няўдалага наведвання ўнука нечакана пахіснула аснову, якая, фарміруючыся дзесяцігоддзямі, напаўняла сэнсам жыццё і здавалася цалкам непарушнай.

Прадстаўленая карціна здаецца парадаксальнай па сваёй сутнасці. З аднаго боку, навідавоку рэалізацыя ідэі прадаўжэння роду, з іншага ж – прасочваецца факт своеасаблівага адрачэння ад сваіх каранёў, што разрывае родавы спадчынны ланцуг і парушае, такім чынам, трывалы падмурак карціны свету – сям'ю ў шырокім сэнсе слова як пераемнасць пакаленняў. Але ж фінал навелы «Чужы чалавек» з'яўляецца адкрытым, бо адмаўленне ад родавага гнязда ў творы прадстаўлена ўскосна. Гэта думка выражана не прамым нашчадкам – сынам ці ўнукам, – што пакідае надзею на перамогу ідэі непарушнасці сямейных каштоўнасцей і трываласці родавага дрэва. Вышэйакрэсленае можа быць цалкам абгрунтавана фактам фарміравання роду на працягу стагоддзяў. Воля аднаго чалавека здольна пэўным чынам пахіснуць, але не цалкам парушыць яго.

Агульнай прыкметай у навелах У. Сцяпана і А. Хамдама з'яўляецца тое, што паняцце сям'і і ідэі прадаўжэння роду, як асновы карціны свету, падвяргаюцца выпрабаванню ў мастацкай прасторы абодвух аўтараў. Так, герой твора «Кандуіт» У. Сцяпана ўсё ж заканчвае жыццё самагубствам. Стары Маўлон-амак з навелістычнага апавядання А. Хамдама «Чужы чалавек» застаецца пазбаўленым магчымасці наведваць і браць актыўны ўдзел у выхаванні ўнука Бацька Мехры, гераіні навелы «Прадавец шчасця», нягледзячы на намаганні ўбачыцца з дачкой, перавагу аддае матэрыяльным, а не сямейным каштоўнасцям.

Ідэя родавага гнязда як сімвала трываласці карціны свету відавочна дамінуе ў тэкстах беларускага і таджыкскага пісьменнікаў. Галоўным сведчаннем таму з'яўляецца матыў даравання. Мехры («Прадавец шчасця» А. Хамдама) не трымае зла на бацьку за тое, што ён пакінуў іх з маці шмат гадоў таму назад і не жадае зблізіцца з дачкой ні пры якіх абставінах. Сяргей Валянцінавіч («Штурман» У. Сцяпана) знаходзіць у сабе сілы і, мінуючы, здавалася б, апраўданую крыўду за сіратлівае дзяцінства, едзе з лёгкім сэрцам на сустрэчу з бацькам.

Цалкам ідэнтычнай у абодвух аўтараў выступае ідэя аб наканаванасці чалавечага лёсу. Ато Хамдам у навелістычным апавяданні «Прадавец шчасця» пацвярджае агульнавядомае выказванне аб тым, што «чалавек мяркуе, а Бог распараджаецца» [3, с. 59]. Апавядальнік, журналіст аднаго з перыядычных выданняў Таджыкістана, дэталёва спланаваўшы свой працоўны час, насуперак намечанаму аказваецца прамым сведкам заблытаных падзей з жыцця яго калегі Мехры. Планы яе маці на сямейнае шчасце, спробы самой Мехры наладзіць кантакт з бацькам праз шмат гадоў, на жаль, не спраўдзіліся.

Беларускі пісьменнік У. Сцяпан таксама неаднаразова звяртаецца да вышэйакрэсленай думкі. Напрыклад, у творы «Па той бок ночы» пісьменнік

акцэнтуе ўвагу на безнадзейнасці спадзяванняў літаратара-творцы на тое, «што прыдуманае ім, перажытае, а потым перанесенае на палатно, паперу, ператворанае ў словы, выявы, вобразы, – уратуе яго» [2, с. 87]. За сістэматычнае парушэнне маральных норм непазбежнае ўсё ж не абмінае герояў навелістычнага апавядання. Жыццё Віктара скончылася заўчасна пры незразумелых абставінах, а Кастуся напаткала невылечная хвароба. Дамінуючым у дадзеным выпадку з'яўляецца матыў расплаты. Здзяйсненне Страшнага суда за грахі падкрэслівае ідэю аб неабходнасці прытрымлівацца пастулатаў універсальнай аксіялагічнай сістэмы як іманентнага складніка карціны свету.

Пэўная фатальнасць карціны свету У. Сцяпана і А. Хамдама не абумоўлівае, аднак, яе безвыходнасць і трагічнасць. Героі твораў не захоплены ў пастку лёсу. Так, Мехры («Прадавец шчасця» А. Хамдама) працягвае жыць згодна з уласна створанай ёю мадэллю, захоўваючы аптымізм і не трымаючы крыўды на бацьку. У навелістычным апавяданні «Па той бок ночы» У. Сцяпана фатальнае кола размыкаецца праз асобу апавядальніка, які, выступаючы сведкам трагічнага лёсу Кастуся і Віктара, працягвае ісці па дарозе жыцця дзякуючы сваёй актыўнай пазіцыі.

Падчас канструявання мадэлі свету адбываецца аналіз з'яў і падзей з пункту гледжання іх судакранання з універсальнай аксіялагічнай сістэмай. У мастацкай прасторы беларускага і таджыкскага навелістаў станоўчыя і разбуральныя якасці суіснуюць як атрыбут іманентна стракатага чалавечага лёсу. Раскрываючы чалавечыя заганы, аўтары пазбягаюць аднатыповай палярызацыі свету на добрае і адмоўнае. Адзначанае знакам «мінус» – непазбежны кампанент свету, з якім узаемадзейнічае персанаж. Аднак дадзены атрыбут не дэманструецца пісьменнікамі як фатальны элемент. Ён выступае хутчэй сродкам матыву выпрабавання, дзякуючы якому забяспечваецца трываласць уласнай жыццёвай пазіцыі, а, значыць, і ўстойлівасць карціны свету.

Так, «невыводная чалавечая зайздрасць» несупынна суправаджае герояў твораў «Паліто» і «Каханне» («Гісторыя III») У. Сцяпана. Перыядычна ствараючы перашкоды, зайздрасць, аднак, не замінае мастаку («Паліто») упэўнена ісці далей па жыцці і займацца любімай справай, а прыгажуні Тоні («Каханне») нарадзіць дзіця і са шчырай надзеяй стварыць свой лёс. Праз уласную сквапнасць і недальнабачнасць Міця («Мятлік белы. Ястраб шэры») губляе ўсе грашовыя зберажэнні. За парушэнне біблейскага запавету аб пералюбу Марат («Donna Mia») застаецца з безваротна пашкоджанай машынай.

Таджыкскі пісьменнік А. Хамдам ёміста паказвае тое, як людскія заганы (ліслівасць, жаданне выслужыцца, ганарлівасць, двудушнасць), неадзяліма становячыся часткай карціны свету, не займаюць, аднак, дамінуючага становішча. Іх праяўленне дэманструецца, як правіла, праз прызму іроніі і гумару. Гэты факт надае карціне свету жыццесцвярджальную афарбоўку («Дзякуй, настаўнік!», «Чыноўніцкія метамарфозы», «Розныя ацэнкі», «Пасада не дазваляе», «Крывадушнік» інш.).

Такім чынам, асновай карціны свету ў мастацкай сістэме У. Сцяпана і А. Хамдама выступаюць сям'я і ідэя аб важнасці прадаўжэння роду як знаку яго ўстойлівасці і моцы. Нягледзячы на тое, што дадзеныя паняцці падвяргаюцца выпрабаванню ў навелістычнай прасторы абодвух аўтараў, матыў даравання спрыяе гарманізацыі і дазваляе канстатаваць перавагу сямейных каштоўнасцей і трываласць родавага дрэва. Пэўная фатальнасць лёсу, бясспрэчна, уплывае на светабачанне герояў і працэс мадэлявання карціны свету. Аднак устойліва сфарміраваная аксіялагічная сістэма і актыўная пазіцыя персанажаў у працэсе ўласнага лёсавызначэння ў значнай ступені нівеліруюць ідэю непазбежнай наканаванасці. Адмоўныя прыкметы і падзеі, становячыся часткай рэчаіснасці, праз прызму іроніі і дзякуючы матыву расплаты, набываюць функцыю фону для ўдасканальвання і крышталізацыі канструктыўных складнікаў, што, пры выразнай поліфанічнасці, абмоўлівае сістэмны характар карціны свету.

ЛІТАРАТУРА

1. *Кавалёва, Р. М.* Жанравы код фальклорнай карціны свету : Няказкавая проза. Дзіцячы фальклор. Загадкі. Казкі / Р. М. Кавалёва, Т. В. Лук'янава. – Мінск : Белпрынт, 2012. – 122 с.
2. *Сцяпан, У.* Адна капейка : кніга прозы / Уладзімір Сцяпан. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – 224 с.
3. *Хамдам, А.* Жыццё не спыняецца : апавяданні / А. Хамдам. – Мінск : Беларускі рэспубліканскі літаратурны фонд, 2013. – 176 с.

К. А. Ермаковіч (Мінск)

МЕТАДЫЧНЫЯ СРОДКІ ФАРМІРАВАННЯ КАШТОЎНАСНА-СВЕТАПОГЛЯДНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ВУЧНЯЎ X–XI КЛАСАЎ У СУЧАСНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДАПАМОЖНІКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Падручнік па беларускай літаратуры ў сучасным адукацыйным літаратурным працэсе выступае асноўным складнікам вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. У якасці вучэбна-метадычнага комплексу неабходна разумець навучальную сістэму комплекснага прызначэння, якая ўяўляе сабой сукупнасць лагічна ўзаемазвязаных паміж сабой дыдактычных кампанентаў для забеспячэння неперарыўнасці і паўнаты ўсяго цыкла навучання беларускай літаратуры ў школе [1, с. 438]. Сучасная педагагічная навука паводле функцый вучэбна-метадычнага комплексу вылучае яго асноўны (нарматыўныя дакументы ў галіне адукацыі, вучэбная праграма, тэматычны план, каляндарна-тэматычнае планаванне, план-канспект урока, падручнік, падручнік-хрэстаматыя, вучэбны дапаможнік, хрэстаматыя для пазакласнага чытання, вучэбна-метадычныя дапаможнікі для настаўніка, мультымедыйныя


сродкі, да якіх адносяцца электронны падручнік, электронны даведнік, электронны практыкум, тэставая камп'ютарная праграма і інш.) і дадатковы (каляндарна-тэматычнае планаванне, дыдактычныя матэрыялы для вучня, літаратуразнаўчыя слоўнікі, кнігі, выдадзеныя ў серыі «Школьная бібліятэка», выстаўкі-альбомы, прысвечаныя жыццю і творчасці беларускіх пісьменнікаў, альбомы ілюстрацый, сродкі нагляднасці, аўдыёвізуальныя сродкі навучання, электронныя сродкі навучання, зборнікі тэставых заданняў і інш.) кампаненты. Задачай асноўнага кампанента з'яўляецца забеспячэнне засваення вучнямі вызначанага адукацыйным стандартам абавязковага мінімуму зместу ведаў, уменняў і навыкаў па прадмеце. Дадатковы кампанент вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай літаратуры выконвае дапаможную функцыю, накіраваную на забеспячэнне дыферэнцыраванага падыходу да навучання, на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, развіццё творчых здольнасцей вучняў і эфектыўную вучэбна-метадычную дзейнасць настаўніка. Ва ўмовах аксіялагізацыі літаратурнага навучання выкарыстанне вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай літаратуры адыгрывае выключнае значэнне. Як адзначаюць даследчыкі, ядром вучэбна-метадычнага комплексу выступае падручнік, які разглядаецца не як асобная, ізаляваная адзінка, а як галоўнае звяно метадычнай сістэмы. Акрамя таго падручнік разглядаецца як інавацыйная мадэль навучання, якая дапамагае забяспечыць выкладанне прадмета «Беларуская літаратура», рэалізаваць асобасна арыентаваны падыход у літаратурнай адукацыі [1, с. 439].

Вучэбныя дапаможнікі па беларускай літаратуры для X–XI класаў адносяцца да падручнікаў гісторыка-літаратурнага тыпу і прызначаны для аглядавага і манаграфічнага вывучэння твораў. Прапанаваныя артыкулы для вывучэння твораў ваеннай тэматыкі ў названых вучэбных дапаможніках адлюстроўваюць асноўныя звесткі пра гістарычны і літаратурны працэс, асноўныя біяграфічныя дадзеныя пра пісьменніка, падаюць тэкстуальны аналіз твораў, вылучаных вучэбнай праграмай у спісах для чытання і вывучэння, для дадатковага чытання. Адначасова ў прадстаўленых падручніках уключаецца матэрыял па тэорыі літаратуры. Аднак па прадстаўленых звестках не заўсёды можна вылучыць аксіялагічныя дамінанты, вызначыць жыццёвыя прыярытэты грамадства праз жыццёвы шлях пісьменніка, праз сістэму вобразаў, паказаную ў творах ваеннай тэматыкі.

Існуе шэраг патрабаванняў да канцэптуальных асноў пабудовы вучэбнага дапаможніка. Асноўным з іх навукоўцы адзначаюць адпаведнасць прынцыпам дыдактыкі, г.зн. што матэрыял павінен выкладацца з арыентацыяй на дасягненні сучаснай навукі (прынцып навуковасці); неабходны ўлік узроставых асаблівасцей вучняў, наяўнасць дадатковых тлумачальных тэкстаў, дыферэнцыраваных заданняў (прынцып даступнасці); ажыццяўленне ўзаемасувязі вучэбнага дапаможніка з наглядными матэрыяламі, наяўнасць ілюстрацыйнага матэрыялу (прынцып нагляднасці); паслядоўнае выкладанне матэрыялу ад простага да больш складанага, падзел падручніка на раздзелы, тэмы (прынцып сістэмнасці); наяўнасць тэарэтычных і практыка арыентаваных пытанняў і заданняў (прынцып сувязі тэорыі з практыкай).

З мэтай вызначэння ўзроўню даступнасці, лёгкасці ўспрымання матэрыялу, яго падачы ў падручніку, а таксама магчымасці самастойнай працы вучняў, падрыхтоўкі да ўрокаў (у першую чаргу нетрадыцыйных, дзе значная роля адведзена ўрокам-канферэнцыям, урокам-дыспутам) сярод вучняў X–XI класаў было праведзена апытанне.

На першае пытанне анкеты *«У якім падручніку найбольш зразумела і даступна пададзены вучэбны матэрыял?»* 56 % рэспандэнтаў назвалі падручнік па беларускай літаратуры, што сведчыць пра адносную даступнасць выкладу матэрыялу. Адзначым, што прапанаваная ў падручніку сістэма пытанняў і заданняў не выклікае ў вучняў цяжкасцей, успрымаецца як неабходны элемент для засваення матэрыялу. На гэта ўказваюць адказы на другое пытанне *«Выкананне заданняў якога падручніка выклікае ў вас найбольшыя цяжкасці?»*, дзе падручнік па беларускай літаратуры ўвогуле не згадваецца. На думку рэспандэнтаў, цяжкасці падчас працы з падручнікам усё ж узнікаюць. Адказы на пытанне *«Што, на ваш погляд, можа выклікаць цяжкасці ў працы з падручнікам?»* адлюструем у выглядзе дыяграмы (малюнак):



Прычыны цяжкасцей у працы з падручнікам

У працэсе вывучэння вучэбна-метадычнага комплексу па беларускай літаратуры значная ўвага надавалася наяўнасці асаблівасцей аксіялагічнага (у прыватнасці, уліку прынцыпаў аксіялагічнай дамінанты, часавай далучанасці) і біяграфічнага падыходаў.

Метадычны апарат падручніка скіраваны на тое, каб дапамагчы творчаму і самастойнаму засваенню твора кожным вучнем. Адной з функцый падручніка з’яўляецца стварэнне ў вучняў уяўлення аб узроўні сучаснай навукі. У гэтых адносінах тыпалагічныя характарыстыкі школьных падручнікаў адрозныя.

Як паказвае аналіз педагагічнай літаратуры, неаднаразова ўзнікалі праблемы пабудовы падручніка, звязаныя з канструяваннем яго зместу (у адпаведнасці з прынцыпам навуковасці), з магчымасцямі ідэйна-выхаваўчага патэнцыялу, а таксама з метадычным забеспячэннем вучэбнага дапаможніка. Адзначым, што вышэй пералічаныя пытанні разглядаліся ў працах Н. Н. Баранскага, Ф. П. Кароўкіна, Д. Д. Зуева, А. В. Пёрышкіна, М. Н. Скаткіна, Н. М. Шанскага і іншых вучоных.

Сучасны падручнік па літаратуры для вучняў X–XI класаў разглядаецца не столькі як дапаможнік для дамашняй работы па замацаванні матэрыялу, колькі арыентуе на самастойнае вывучэнне пытанняў вучэбнага прадмета, на пошук новых ведаў, іх сістэматызацыю і абагульненне. Такая асаблівасць падручніка спрыяе самастойнаму вызначэнню вучнямі асноўных звестак пра жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, індывідуальнаму вылучэнню аксіялагічных дамінант грамадства ў пэўны перыяд праз сістэму вобразаў, увасобленых у творах ваеннай тэматыкі.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі павінна фарміравацца не канстатацыя-набор ведаў і ўменняў, а іх вызначаная, навукова абгрунтаваная сістэма. Адным з важнейшых патрабаванняў да стварэння такой сістэмы з'яўляецца ўлік узроставых асаблівасцей вучняў, а таксама спецыфікі вывучаемых у школе прадметаў.

Аналіз сучасных падручнікаў сведчыць, што працэсу фарміравання каштоўнаснага светапогляду вучняў адводзіцца нязначнае месца.

Метадычная паслядоўнасць у працэсе фарміравання светапоглядных вываданняў і паняццяў – яшчэ адно патрабаванне. Для яго рэалізацыі неабходна распрацаваць схемы раскрыцця асноўных паняццяў, дзе б даваўся адказ на наступныя пытанні:

1) Якія веды, неабходныя для засваення гісторыка-тэарэтычных паняццяў па літаратуры, атрымліваюць вучні падчас працы з прапанаванымі вучэбнымі дапаможнікамі?

2) На якім эмпірычным матэрыяле будзе канкрэтызавацца пэўнае паняцце ў падручніку?

3) Якія новыя для вучняў паняцці будуць раскрыты, іх асаблівасці і сувязі з другімі паняццямі?

4) Пры выкладанні якой тэмы і ў якой фармулёўцы мэтазгодна даць вызначэнне паняцця (калі гэта неабходна)?

5) Як будзе забяспечана ў падручніку навучанне вучняў уменню аперыраваць паняццем у працэсе іх вучэбна-пазнавальнай дзейнасці?

Вырашэнне пастаўленых пытанняў абапіралася на асаблівасці рэалізацыі аксіялагічнага падыходу ў навучанні беларускай літаратуры.

Сучасны літаратурны адукацыйны працэс характарызуецца скіраванасцю на фарміраванне і выхаванне гарманічна і ўсебакова развітай асобы, здольнай да адаптацыі ў сацыякультурным, інфармацыйным грамадстве. Зыходнымі пры аналізе метадычных сродкаў арганізацыі вучэбнай дзейнасці вучняў у сучасных дапаможніках па беларускай літаратуры сталі абгрунтаваныя ў даследаванні аксіялагічны і біяграфічны падыходы.

Рэалізацыя аксіялагічнага падыходу да фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі пры вывучэнні твораў ваеннай тэматыкі ў літаратурным адукацыйным працэсе патрабуе дакладнага вызначэння дыдактыка-метадычных мэт, дапаможных матывацыйных і змястоўных прынцыпаў. У сувязі з гэтым адной з важных перадумоў, якая дапамагае забяспечыць якаснае выкананне пастаўленай задачы, з'яўляецца грунтоўнае вывучэнне і аналіз вучэбных праграм па прадмеце «Беларуская літаратура», вучэбных дапаможнікаў і дыдактычных матэрыялаў для забеспячэння адукацыйнага працэсу ў X–XI класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Пры аналізе сучасных дапаможнікаў па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура», улічваючы прынцыпы аксіялагічнай дамінанты і часавай далучанасці, была сканцэнтравана ўвага на наступных асаблівасцях:

- зарыентаванасць праграмы для X–XI класаў на вывучэнне твораў ваеннай тэматыкі (г.зн. на колькасны паказчык названых твораў ад агульнага аб'ёму вывучаемых мастацкіх тэкстаў на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі);
- прадстаўленасць у праграмах такіх твораў ваеннай тэматыкі, у якіх акцэнт робіцца на агульначалавечыя каштоўнасці і вечныя ісціны, увасобленыя ў вобразах галоўных герояў;
- накіраванасць праграм на фарміраванне ў вучняў каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі, на выпрацоўку індывідуальнай сістэмы каштоўнасцей, на стварэнне ўмоў для інтэрыярызацыі каштоўнасных арыентацый грамадства ва ўласныя.

Вучэбнай праграмай прадугледжана, што вучні знаёмяцца з мастацкімі творамі на тэму вайны на працягу ўсяго навучання, аднак больш дэталёвы аналіз і ваеннага, і пасляваеннага перыяду ў грамадстве і ў мастацтве слова адбываецца на III ступені навучання.

Адным з важных пытанняў вывучэння твораў ваеннай тэматыкі бачыцца праблема «несупадзення ў часе». Успрыняцце падзей вайны сучаснікам вельмі адрозніваецца ад таго чытача, «пасляваеннага», ад чытача-дзіцяці вайны. Для сённяшняга маладога пакалення вайна іншая, далёкая.

Каштоўнасна-светапоглядная кампетэнцыя прадугледжвае фарміраванне ў вучняў сродкамі беларускай літаратуры сістэмы духоўна-маральных каштоўнасных арыентацый, гуманістычнага погляду на свет; гатоўнасць асобы да самапазнання, самаўдасканалення і самавызначэння; здольнасць бачыць і разумець навакольны свет, арыентавацца ў ім, усведамляць сваю ролю і прызначэнне, умець выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў і ўчынкаў, прымаць рашэнні.

Аналіз вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры для X–XI класаў праводзіўся з улікам такіх асаблівасцей, як здольнасць садзейнічаць фарміраванню каштоўнасных арыенціраў вучняў у працэсе вывучэння твораў ваеннай тэматыкі, развіццю творчых навыкаў вучняў, уменняў самастойна ацэньваць нестандартныя сітуацыі, характары, абгрунтоўваць меркаванні,

даваць якасную ацэнку-характарыстыку персанажам, вызначаць асноўныя каштоўнасці для герояў твора і імкнуцца да іх інтэрыярызацыі, г.зн. магчымасці фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі з дапамогай падручнікаў. Таму характарыстыка дапаможнікаў уключала: тэарэтычны аналіз манаграфічных і аглядавых артыкулаў пра літаратуру ваеннай тэматыкі і заданняў да іх з улікам іх непасрэднага дачынення да фарміравання каштоўнасных арыентацый вучняў.

Дыдактычную накіраванасць падручнікаў на вывучэнне твораў ваеннай тэматыкі як аднаго са складнікаў фарміравання каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі мэтазгодна адлюстраваць у наступных блоках, якія адпавядаюць складаемым каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі.

Б л о к 1. Мадэліраванне дзейнасці, накіраванай на фарміраванне літара-туразнаўчых ведаў, уменняў і навыкаў:

- арыентацыя на засваенне асаблівасцей асноўных пытанняў тэорыі і гісторыі літаратуры;
- уменні суадносіць набытыя тэарэтычныя звесткі з асаблівасцямі іх практычнага ўвасаблення падчас аналізу мастацкага твора.

Б л о к 2. Мадэліраванне дзейнасці, накіраванай на ўдасканаленне аналі-тычных ведаў, уменняў і навыкаў:

- арыентацыя на засваенне маральных эталонаў дабра і справядлівасці як духоўных ідэалаў народа;
- фарміраванне нацыянальнай годнасці і патрыятызму.

Б л о к 3. Мадэліраванне дзейнасці, накіраванай на фарміраванне пачуц-цёва-творчых ведаў, уменняў і навыкаў:

- фарміраванне пачуцця суперажывання герою;
- развіццё пазіцыі «я»-вучня;
- развіццё навыкаў успрымання каштоўнасцей грамадства, пераносу іх на сваю сістэму каштоўнасцей (працэс інтэрыярызацыі);
- фарміраванне ўмення выказваць уласны пункт погляду на праблему.

Скіраванасць школьных падручнікаў і дыдактычных матэрыялаў на выкарыстанне твораў ваеннай тэматыкі ў працэсе фарміравання каштоў-насна-светапогляднай кампетэнцыі патрабуе ўдакладнення заданняў і практы-каванняў, пашырэння тэарэтычнага дыяпазону ведаў вучняў, увядзення такіх паняццяў, як светапогляд, самавызначэнне, каштоўнасная сістэма поглядаў герояў твора.

ЛІТАРАТУРА

1. *Бельский, А. И.* Учебно-методический комплекс по белорусской литературе / А. И. Бельский // Белорусская педагогическая энциклопедия: в 2 т. – Минск, 2015. – Т. 2. – С. 438–440.

О. О. Лілік (Чернігів, Україна)

КАТАСТРОФІЗМ СВІТОВІДЧУТТЯ ЗА ПОВІСТЮ С. АЛЕКСІЄВИЧ «ЧОРНОБИЛЬСЬКА МОЛИТВА (ХРОНІКА МАЙБУТНЬОГО)» І РОМАНОМ В. ДРОЗДА «ЛИСТЯ ЗЕМЛІ»: ЕЛЕМЕНТИ КОМПАРАТИВНОГО АНАЛІЗУ[1]

На межі ХХ і ХХІ ст. в українській і білоруській літературах виникла література нового типу, яка зафіксувала радикальні зміни в житті і свідомості людей, перегляд традиційних усталених істин та уявлень, переосмислення цінностей, трансформацію світогляду людини. Поява цих текстів безносередньо пов'язана з аварією на Чорнобильській атомній електростанції. Для сучасних філософів, митців, культурологів Чорнобиль асоціюється не лише з соціотехноекологічною катастрофою, а насамперед стає символічною культурною подією й апокаліптичним текстом про відкладення кінця цивілізації, культури й людини в післяатомну добу. Усі ці трансформації в фізичному і духовному житті постчорнобильської людини прагнуть зафіксувати і письменники у своїх творах. До таких літературних текстів, на нашу думку, варто віднести повість С. Алексієвич «Чорнобильська молитва (хроніка майбутнього)» [1], яка за багатьма параметрами переплітається з романом українського письменника-шістдесятника В. Дрозда «Листя землі» [2].

Насамперед збігаються авторські задуми – донести до майбутніх поколінь правду про події відповідного історичного періоду, зафіксувавши спогади і враження простих людей, очевидців і учасників подій, передавши народне бачення ситуації, прагнення відтворити атмосферу епохи, дух часу.

По-друге, тривалий період роботи над художніми творами, адже обидва автори упродовж двох десятиліть збирали і фіксували свідчення. Задум роману «Листя землі» В. Дрозд указав у передмові до роману: «Справжній літописець свого буття – сам народ, письменник – лише вуста його... Десятиліттями я записував і збирав свідчення людей, які пройшли крізь великі випробування новітнього часу, їхні поривання і надії, їхні думи, досвід їхнього життя, нерідко – трагічний, духовний пошук народу – основа цього роману» [2]. С. Алексієвич так згадує про процес роботи над повістю: «Я довго писала цю книжку… Майже двадцять років… Зустрічалась і розмовляла з колишніми працівниками станції, вченими, медиками, солдатами, переселенцями, самоселами… З тими, для кого Чорнобиль – основний зміст їхнього світу, усе всередині і довкола отруєно ним, а не тільки земля й вода. Вони розповідали, шукали поради… ми думали разом… Часто вони спішили, боялись, що не встигнуть, я ще не знала, що ціна їхнім свідченням – життя. «Запишіть… – Повторювали. – Ми не все зрозуміли, що бачили, але хай зостанеться. Хтось прочитає і зрозуміє. Потім. Після нас…». Не даремно вони спішили, багатьох уже немає в живих» [1]. Отже, автори здійснили масштабну пошукову-збиральницьку роботу, накопичили великий корпус мемуарно-документальних матеріалів.

[1] Артыкул падаецца ў аўтарскай рэдакцыі.

По-третє, подібною є композиція творів, що складається із окремих частин, кожна з яких може сприйматися як самостійний, композиційно і сюжетно завершений текст. Так, повість С. Алексієвич складається з прологу і трьох розділів. У вступі авторка пропонує історичну довідку про наслідки аварії на Чорнобильській атомній станції для білоруських земель з періодичних видань («Народна газета», «Огоньок», збірник «Чорнобиль»), енциклопедичних довідників, Інтернет-видань 2002–2005 рр. Розділи «Чорнобильської молитви» написані у формі окремих монологів, тому повість не має наскрізного сюжету і є подібною до циклу репортажів. Авторами цих монологів є різні за віком, освітою, соціальним статусом люди: Зінаїда Євдокімівна Коваленко, самосіл; Петро С., психолог; Євгеній Олександрович Бровкін, викладач Гомельського державного університету; Аркадій Філін, ліквідатор; Сергій Гурин, кінорежисер; Геннадій Грушевой, депутат білоруського парламенту, голова фонду «Дітям Чорнобиля»; Слава Костянтинівна Фирсакова, доктор сільськогосподарських наук [1]. Респонденти діляться спогадами і враженнями, висловлюють власні судження про аварію на ЧАЕС і її результати, формулюють наукові й світоглядні концепції. О. Трухан визначає жанр твору як «роман-свідчення», бо характерною особливістю є входження факту в художній текст, жанрова дифузія, діалектика взаємодії традиційних і нових жанрів, що супроводжується взаємопроникненням і взаємозбагаченням. «Для художнього втілення катастрофічної ситуації в «Чорнобильській молитві» С. Алексієвич обрала оригінальну жанрову форму – «жанр голосів». «Роман свідчення» – прямий комунікативний акт між автором та очевидцями трагедії, деколи між самими респондентами, який породжує вищий тип діалогу – з читачем. Постать автора тут є надзвичайно важлива, адже формуючи текст, відтворюючи почуті інтерв'ю, автор кореспондує читачеві свою інтенцію: пропозицію подумати між минулим і майбутнім людства» [3]. Монологи в повісті розглядаємо як жанр літератури, оскільки зустрічаємо «монологи» кількох людей, інколи цілої групи, як зазначає автор – «народний хор», «солдатський хор». Таким авторським прийомом завершується кожний із розділів повісті, він є опозиційним до одноголосих роздумів (монологів). Кожен монолог має власну назву, яка безпосередньо пов'язана зі змістом, наприклад: «Монолог одного села про те, як кличуть душі з неба, щоб з ними поплакати і пообідати», «Монолог про те, що знайдеш дощового черв'яка, і куриця радіє, а те, що в чугунці кипить, теж не вічне», «Монолог свідка, у якого болів зуб, коли він бачив, як упав Христос і почав кричати», Монолог про те, що ми давно злізли з дерева і не придумали такого, щоб воно зразу росло колесом» [1]. Автор компонує ці розповіді-інтерв'ю, продумує логічність розташування матеріалу, використовує обрамлення, повтори, дзеркальну композицію. Твір починається і закінчується сповідями жінок – «самотнім людським голосом».

Роман «Листя землі» В. Дрозда за змістом також є збіркою свідчень. Авторське бачення свого задуму письменник окреслив так: «Бажаю того чи ні, але у «Листях землі» «творю суд» над цілою епохою – над найскладнішою, мабуть, у нашій історії сотнею літ. Але «творю суд» не від власного

імені, від імені духу, який у мені і мені надиктовує. Чий це дух – Майстра всесвіту, народу, самого життя? Дух цей вищий і значиміший, аніж я, я – тільки записувач, писар» [2]. Жанр твору «Листя землі» не можна визначити однозначно: Н. Колощук зазначає, що це «синтетичний, багатошаровий твір: елементи соціально-психологічного, соціально-побутового, символіко-фантастичного (міфологізованого) повістування тут сплетені в одне ціле» [4, с. 155]. Усі події роману «Листя землі» подаються крізь призму народного світобачення: це не об'єктивне відтворення історичних подій, а своєрідно інтерпретована минувшина. Роман складається з окремих сюжетно-оповідних частин, котрі мають форму стилізованих сказань.

По-четверте, подібною є тематика й проблематика обох художніх творів. Зупинимось більш детально на повісті С. Алексієвич «Чорнобильська молитва (хроніка майбутнього)». Епіграфом до твору взяті слова М. Мамардашвілі: «Ми повітря, ми не земля» [1]. Уже в першому абзаці письменниця фактично формулює мету своєї праці: «… про Чорнобиль усі знають тільки у зв'язку з Росією й Україною. Ми ще повинні розказати про себе…» [1, с. 2]. У пролозі авторка характеризує шкоду, завдану білоруським землям і народу чорнобильською катастрофою; порівнює результати Другої світової війни й аварії на ЧАЕС; визначає обсяг постраждалої території; висвітлює судовий процес над «винуватцями» чорнобильської катастрофи [1, с. 3]. Вступна частина вирізняється офіційним, документальним характером, вона має форму довідки. Матеріал подається об'єктивно, відсторонено, автор не подає власних коментарів, чи роздумів. На прийомі контрасту побудована друга частина вступу, що має назву «Самотній людський голос» і характеризується інтимним, відвертим харакетром. Це розповідь-сповідь Людмили Ігнатенко, дружини загиблого пожежника Василя Ігнатенка. Монолог супроводжується авторськими коментарями про поведінку оповідача, наприклад: «Мовчить», «Закриває обличчя руками і мовчить», «Замовкає надовго» [1, с. 5–12].

Оповідачка розподіляє своє життя на дочорнобильське, яке позначене коротким щасливим подружнім життям, і післячорнобильське, коли, будучи на шостому місяці вагітності, упродовж чотирнадцяти днів вона доглядала ураженого радіацією чоловіка й інших п'ятьох пожежників в лікарні. Читача вражають натуралістичні описи змін людського організму під дією радіації, проте найбільше шокує самозреченість жінки, яка заради любові пожертвувала власним здоров'ям, життям своєї ненародженої дитини.

Третя частина прологу має назву «Інтерв'ю автора з самою собою про пропущену історію і про те, чому Чорнобиль ставить під сумнів нашу картину світу». С. Алексієвич розглядає аварію на ЧАЕС як початок нової історії, бо 26 квітня 1986 року стала кульмінаційним моментом історії: «За одну ніч ми перемістились в інше місце історії. Здійснили стрибок в нову реальність, і вона, ця реальність, виявилася вище не лише наших знань, а й нашої уяви… Порвалась лінія часу» [1, с. 16].

Однією з тем «Чорнобильської молитви» є доля простої людини в умовах постчорнобильського світу. Особливу увагу приділяє письменниця описові відчуттів чорнобильської людини, особливостям сприйняття усіма

іншими чорнобильців: «Мені здається, що ви розглядаєте мене … Просто спостерігаєте. Запам'ятовуєте. Йде якийсь експеримент над нами. Всім цікаво. Не можу позбавитись цього відчуття…» [1, с. 61].

Опитані згадують у своїх сповідях про відчайдушність і героїзм радянських людей під час боротьби з наслідками аварії. Досить часто вони працювали без захисного спорядження, не дбаючи про власне здоров'я, не думаючи про матеріальні цінності, не знаючи про можливі наслідки для організму.

Усі респонденти відчувають нерозривний звязок із землею своїх батьків. Вони тяжко переживають розлуку, деякі повертаються до рідних домівок («Удень ми жили на новому місці, а вночі на батьківщині. Уві сні» [1, с. 91]). На нашу думку, тут виявляється така риса ментальності й філософування східнослов'янських людей, як антеїзм (віра в те, що людина черпає силу й життєву наснагу від рідної землі). Подібні ідеї знаходимо в романі «Листя землі» Володимира Дрозда, де поліщуки наголошують на тому, що їхнє життя зосереджене довкола рідного краю, там, де знаходяться могили пращурів, де закопана пуповина [2]. Герої «Чорнобильської молитви» формулюють свою концепцію буття: «Хай вона отруєна, з радіацією, проте це моя батьківщина. Ніде ми більше не потрібні. Навіть пташці своє гніздо миле» [1, с. 27].

Усіх турбує подальша доля рідної землі, шляхи її реабілітації. Слава Костянтинівна Фирсакова, доктор сільськогосподарських наук, пропонує рекомендації щодо ведення господарства на забруднених територіях, раціоналізації господарської діяльності : «Усі довкола кричать: на цій землі жити не можна. А я відповідаю – можна. Потрібно навчитись на ній жити. Мати мужність. Закриймо забруднені території, обнесемо дротом (третину країни!), покинемо й втечемо. Землі у нас ще багато. Ні! З одного боку наша цивілізація антибіологічна, людина найстрашніший ворог природи, а з іншого боку, вона – творець. Перетворює світ. …» [1, с. 81].

Висновки і перспективи подальших досліджень. Отже, твори С. Алексієвич і В.Дрозда мають багато точок дотику, зокрема: основним принципом організації тексту в обох творах є діалогізм; у творах спостерігається поєднання документального та епіко-художнього жанру; присутність ефекту документальності дала змогу авторам продемонструвати відчуття особистої причетності до зображуваних подій. Через призму людських переживань письменники висвітлюють об'єктивну картину доби та на філософському рівні осмислюють проблеми суспільства.

ЛІТЕРАТУРА

1. *Алексиевич, С.* Чернобыльская молитва (хроника будущего) / С. Алексієвич [Електронний ресурс] – Режим доступу : // http: www.alexievich.org.
2. *Дрозд, В.* Листя землі : роман / В. Дрозд. – К. : Укр. письменник, 1992. – 559 с.

3. *Трухан, О.* Діалогізм як визначальна риса в жанровій структурі роману В. Забитко «Невмите небо» та «роману-свідчення» С. Алексієвич «Чорнобильська молитва : хроніка майбутнього» [Електронний ресурс] / О. Трухан. – Режим доступу : // http : www.ellic.pu.if.ua.
4. *Колошук, Н.* Про поетику роману В. Дрозда «Листя землі» / Н. Колошук // Літературознавство. Бібліографія. Інформатика: Доповіді та повідомлення III Міжнародного конгресу україністів. – Харків : Око, 1996. – С. 154–156.

Т. В. Міхнюк (Мінск)

ПРАБЛЕМА ЗЯМЛІ Ў ТВОРАХ Я. КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ» І І. МЕЛЕЖА «ПАЛЕСКАЯ ХРОНІКА»

Паэма «Новая зямля» Якуба Коласа – класіка беларускай паэзіі, найвялікшае дасягненне аўтара. Менавіта там знайшлі адлюстраванне старонкі асабістай біяграфіі паэта, выяўлены яго пачуцці, імкненні, ідэалы, спадзяванні. Сам аўтар называў паэму аўтабіяграфічным творам. І гэта сапраўды так. Паэт абапіраўся на рэальныя факты, якія добра ведаў, выкарыстоўваў свае шматгадовыя назіранні за жыццём працоўнага сялянства. Толькі веданне жыцця народа, яго думак і імкненняў забяспечыла магчымасць Я. Коласу стварыць рэалістычны твор, вобразы якога маюць абагульняючае значэнне.

Па маштабнасці тэматыкі і багаццю жыццёвага зместу паэма «Новая зямля» амаль не мае роўных паэм у беларускай літаратуры. Гэта эпічны твор аб лёсе сялянства, аб яго шляхах да волі і шчасця. У паэме аўтар з усіх бакоў адлюстраваў прыроду, жыццё народа, яго працу, побыт, псіхалогію. Таму даследчык творчасці Я. Коласа А. Я. Міхневіч называе паэму «энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства канца XIX ст.» [1, с. 2].

Галоўныя героі паэмы – простыя сяляне. Яны мараць набыць кавалачак зямлі, пабудаваць хату, жыць, працуючы на сваім надзеле, гадаваць дзяцей. На працягу ўсяго твора галоўныя героі задаюць сабе пытанне: як вызваліцца з-пад панскай улады і здабыць сабе шчасце. Яны жывуць у няволі, церпяць прыгнёт і таму самае дарагое і моцнае іх жаданне – гэта свабода і зямля.

Зямля нібы магнітнае поле, вакол якога групуюцца, да якога цягнуцца ўсе героі абодвух твораў. Іван Мележ выключна глыбока, моцна, ніколькі не ўступаючы ў гэтым плане ні Якубу Коласу, ні Кузьме Чорнаму, развіваючы іхнюю традыцыю, паказаў арганічную, як бы нават стыхійную, сувязь селяніна з зямлёю.

Калі параўнаць герояў твора Якуба Коласа і герояў Івана Мележа, можна сказаць з упэўненасцю, што адзіным сэнсам іх жыцця з'яўляецца зямля. Зямля для Васіля Дзятла – яго жыццё, радасць і гора, светлыя мары і горкія пакуты. Зямля – ён сам. Так жа адносіцца да зямлі і Міхал. «Усе сілы чалавека – у зямлі, – разважае Васіль. – І сіла ўся, і радасць. Няма зямлі – няма, лічы, чалавека» [2, с. 15].

Жыццё Васіля паказана пісьменнікам ва ўсёй складанасці і супярэчлівасці, што вынікае як з асаблівасці яго характару, так і сацыяльна-палітычных абставін. Малюючы вобраз Васіля Дзятла, Іван Мележ псіхалагічна праўдзіва выяўляе дваістасць яго натуры як працаўніка і ўласніка. У душы героя шмат цеплыні, шчырасці, мяккасці, такі ён у сям'і, у адносінах да маці, да Ганны, якую пакахаў на ўсе жыццё, такі ў працы.

У вобразе Васіля вельмі прывабліваe яго настойлівасць у дасягненні сваёй мэты. Ён упарты, калі ведае, што гэта выгадна яму асабіста, і смелы.

Аўтар падкрэслівае незвычайную працавітасць Васіля, які зусім не ведае стомы. Хлопец кіруе гаспадаркай, ды не абы як, а, калі так можна сказаць, са смакам: жывёла ў час накормлена і дагледжана, у гумне – парадак. На сенакосе Васіль таксама стараецца з усіх сіл, каб быць не горш за астатніх, загартаваных ў працы мужчын. Гэта любоў да штодзённай працы перадалася Васілю ад бацькоў і дзядоў. Змалку загартоўваючыся ў працы, ён добра ведаў, што жыццё – не вясёлае, бесклапотнае свята, а доўгі і клопатны будзень.

Герой твора не чакае ад жыцця ніякай палёгкі і працуе да горкага поту, да здранцвення рук: «Усё мацней уграваla. Пот мачыў цвёрдыя, двух колераў валасы, поўз на лоб, абпалены сонцам, засцілаў вочы, цёк на кволыя, яшчэ амаль дзіцячыя грудзі, прыклейваў да спіны ўшчэнт закарэлую сарочку. Каса станавілася ўсё цяжэйшая. Рукі наліваліся ўтомаю, балелі ў локцях і плячах, слабелі, нагам было млосна. Млосць расплывалася і па ўсім целе. Хацелася сесці. З цягам часу жаданне гэтае не толькі не адыходзіла, а усё мацнела. Сесці, хоць на купіну, хоць у ваду. Пасядзець трохі, адпачыць, а там можна зноў устаць, зноў ісці... Але Васіль не сеў. Ён трываў. Гэта было ўжо не ў навізну – цярпець, адольваць стому, адганяць прывабліваю спакусу пагуляць, паленавацца…» [3, с. 21–22], спадзеючыся, што ўдасца падрамантаваць хату, купіць лепшага каня, адборнага збожжа.

Толькі не пад сілу гэта Васілю, бо на пустой ніве нічога не родзіць, а ўраджаю нават не хапае для сябе. І таму зразумелай становіцца мара Васіля прыдбаць кавалак глушакоўскага поля каля цагельні, дзе з году ў год збіраўся добры ўраджай. Тады – Васіль упэўнены – спраўдзіцца і ўсё астатняе, бо ён ужо даўно засвоіў, што шчырая, да салёнага поту, праца на добрай зямлі – залог дабрабыту. А юнак хоча жыць багата, так, як Корч, а можа і яшчэ багацей. Васіль глядзіць на жыццё глыбей, ён не задумваецца, «куды падацца?», яго хвалюе больш важнае пытанне: «Калі ж ето стане жыць так – што на душы лёгко!..» [4, с. 27].

Гэта жаданне настолькі моцнае, што, не зважаючы на пагрозы Карчоў і новай улады, ён уначы самавольна заворвае поле, а пасля ўступае ў бойку з Яўхімам. Гэты ўчынак Васіля, як і пазнейшая сутычка за зямлю з Міканорам, успрымаецца драматычна, выклікае шчымлівы боль і спачуванне герою.

Нават і ў часы моцнага, чыстага, шчырага кахання Васіль не перастае думаць аб зямлі.

Па свежых слядах праводзім паралель з Міхалам з паэмы «Новая зямля» Я. Коласа. Беззямелле і галеча прымушаюць яго «вандраваць у жыцці: «хадзіў на сплаў ён, на віціны, разоў са два хадзіў у Прусы» [1, с. 12], а пасля

наняўся лесніком да князя Радзівіла. Міхал працуе не шкадуючы сіл, здароўя. Ён ахоўвае лес, даглядае статак, «правіць» сенакосы, «ставіць» рабочых, выконвае шматлікія загады і даручэнні кіраўніка. У працы ён знаходзіць задавальненне, верыць у яе як аснову жыцця і дабрабыту, спадзяецца сваімі рукамі здабыць сваё шчасце. Дзякуючы руплівай і стараннай працы, неабжытыя і занядбалыя куткі, у якіх апынаецца герой паэмы, становяцца ўтульнымі і квітнеючымі:

Усё зацвіло, загаманіла,
Бы жыватворная тут сіла
Ад сну прыроду абудзіла [5, с. 17]

Міхал – чалавек клапатлівы, спагадлівы. Ён верны муж і патрабавальны бацька. Шчыра любячы дзяцей, ён сур'ёзна ставіцца да іх. Наймаючы «дарэктара», Міхал спадзяецца:

А вось мо з меншых што і будзе,
Няхай яны ўжо йдуць у людзі [1, с. 22].

Герой твора паважна адносіцца да брата Антося і разам з ім любіць пажартаваць, павесяліцца, падзяліцца земляробчай мудрасцю.

Працуючы ў Радзівіла, Міхал сутыкаецца з жорсткімі і няўмольнымі законамі, якім трэба падпарадкоўвацца працоўнаму чалавеку. Служба ставіць яго ў поўную залежнасць ад волі пана ляснічага. Спакою Міхал на службе не знае:

То дуб ссякуць, бярозку зваляць...
Або патравяць сенажаці [5, с. 72].

Акрамя догляду за лесам у абавязак Міхала ўваходзіла многае іншае, патрэбнае непасрэдна пану:

То пастуха згадзі, служанку ...
Касцоў наймай і жней... [Там жа, с. 74].

Але і тут ляснічы ўсё роўна знойдзе зачэпку, каб аблаяць. Прыгнёт, знявага, прыніжэнне, лаянка, пагрозы, варожыя адносіны сялян – усё гэта цяжкім грузам кладзецца на душу Міхала. Героя не задавальняюць умовы жыцця і працы, і ён шукае выйсця з цяжкага паднявольнага становішча. Так Міхал разважае:

А дзе ж той выхад? Дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То – наймацнейшая аснова
І жыцця першая ўмова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць [Там жа, с.76].

Вызваліцца з-пад улады пана, стаць свабодным, на думку Міхала, можна адзіным шляхам набыцця зямлі:

Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут,
І там зажыць сабе нанова:
Свая зямля – вось што аснова! [Там жа, с. 52]

Думка аб зямлі свяціла Міхалу «зоркай яснай» [1, с. 7] у самыя змрочныя дні, надаючы сэнс яго жыццю. Зямля ва ўяўленні Міхала – «аснова ўсёй айчыне» [Там жа], надзея на вызваленне «з няволі цяжкай, з паланення» [Там жа], «промень волі і свабоды» [Там жа]. Стаць гаспадаром на сваёй зямлі – значыць стаць распарадчыкам свайго лёсу.

Мара Міхала аб зямлі высакародная, узвышаная. Гэта не ўласніцкі разлік (як раней лічылася ў літаратурнай крытыцы), а спроба духоўнага разняволення, самасцвярджэння асобы. Зямля павінна належаць таму, хто на ёй працуе. Галоўны герой хоча быць гаспадаром на сваёй зямлі. І калі б так адбылося, Міхал здабыў бы свабоду, незалежнасць, дабрабыт, адчуў бы асалоду вольнай працы. Але мара аб набыцці зямлі аказалася фантастычнай, ілюзорнай. Міхал памірае, не здзейсніўшы сваю мару набыць зямлю, але перадае свой запавет брату Антосю:

Вядзі ж ты рэй, вядзі... адзін...
Як лепшы брат, як родны сын.
Бог не судзіў мне бачыць волі
І кідаць зерні ў свае ролі...
Зямля... зямля... туды, туды, брат,
Будуй яе... ты дай ёй выгляд...
На новы лад, каб жыць нанова...
Не кідай іх... Га-а-х! – І – гатова! [5, с. 64]

Лёс Міхала з сённяшняга пункту гледжання ўспрымаецца з болем і трывогай. Хворы, абяссілены жыццём, ён памірае, так і не дачакаўшыся жаданай волі. Якуб Колас спачувае Міхалу, паэтызуе яго мару аб свабодзе, аб нязбытнай мары жыцця на сваёй зямлі, яго любові да зямлі. Але паэма «Новая зямля» — не толькі твор аб трагізме лёсу селяніна-бедняка, а таксама аб усім, чым багата і цікава жыццё сялян, аб клопатах і занятках дарослых, аб гульнях дзяцей і іх вучобе, аб святочных днях і буднях.

Бацька паэта (з яго спісаны вобраз Міхала) зямлю ўсё ж такі набыў. Таму аўтар паэмы не лічыў бесперспектыўным шлях набыцця ўласнай зямлі.

Падобная трагедыя з планамі Васіля на зямлю напаткала яго. Праз тры гады ён, ажаніўшыся з нялюбай Пракопавай Маняй, меў гаспадарку, пра якую раней мог толькі марыць: у яго добры конь, будуецца новая хата, «непагана бульба ідзе ля цагельні на палосцы, вытаргаванай у Манінага бацькі» [3, с. 65]. Аднак гэта не прыносіць яму задавальнення. А тут яшчэ ў вёсцы пачаў ствараццa калгас. Герой упарта пачынае супраціўляцца. Валоданне ўласнай зямлёй не дазваляе Васілю зразумець, што адбываецца ў жыцці. У гэтым па сутнасці прычына яго драмы. Ён мае ўжо сваё ўяўленне пра шчасце. Аўтарытэт новага жыцця, на яго думку, павінен грунтавацца на матэрыяльным дабрабыце. Аддаць у агульнае карыстанне свайго каня, карову, не дыхаць паветрам стойла, якое яму здаецца прыемнейшым за ўсе пахі на зямлі – гэта не для Васіля. Ён хоча быць упэўнены, што яго жывёла дагледжана, ён, нарэшце, хоча адчуваць, што гэта толькі яго і больш нічыё. Гэта не сквапнасць Васіля, а нармальная псіхалогія ўласніка-селяніна,

сапраўднага гаспадара. Другая справа, што ісці не ў нагу з усімі (хай сабе ўсе астатнія ідуць правільна) – вельмі складана. Так сталася і з Васілём. У сутычцы з Міканорам, прадстаўніком беднага сялянства, які безаглядна прымае ўсё новае і бяздумна імкнецца прывесці ў жыццё, Васіль пераможаны. Пераможаны фізічна, сацыяльна, надламаны маральна. Ён страціў каханне, згубіў зямлю, якая была ягонай запаветнай марай, сэнсам і мэтай існавання. Васіль, які раней адчуваў зямлю, як жывую, самую для яго дарагую істоту, любіў яе, раптам губляе ўсякую павагу да яе.

Гэта быў сацыяльны драматычны канфлікт часу. Колас і Мележ з вышыні сённяшніх дзён, у гістарычнай перспектыве паказалі і сцвердзілі сацыяльную непазбежнасць і заканамернасць падзей выключнага грамадскага значэння. Усебаковы аналіз рэчаіснасці, глыбокае яе чалавечае асэнсаванне вылучылі перад пісьменнікамі на першы план гуманістычны аспект, гуманістычны сэнс грандыёзнага пералому. Ва ўсіх перыпетыях гісторыі, у яе немінучым поступе мастакі слова бачылі перш за ўсё чалавека. Паказваючы гістарычную непазбежнасць падзей, выяўляючы іх грамадскую патрэбу, І. Мележ і Я. Колас у сваіх творах асноўную ўвагу скіроўвалі на чалавечы лёс, бо глыбока разумелі боль, пакуты, адчай і роспач чалавека-селяніна, у якога з зямлёю звязана ўсё жыццё, які без зямлі не бачыў сэнсу і мэты свайго існавання.

ЛІТАРАТУРА

1. *Міхневіч, А. Я.* Якуб Колас разважае, радзіць, смяецца… (Выбраныя выслоўі народнага песняра) / А. Я. Міхневіч. – Мінск : БелДІПК, 2002. – 108 с.
2. *Васілевіч, А.* Люблю, хвалююся – жыву : нататкі, эсэ, роздум / А. Васілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 55 с.
3. *Гніламёдаў, У. В.* Ад даўніны да сучаснасці / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 245 с.
4. *Жураўлёў, В. П.* Адвечная сіла зямлі: Паводле раманаў «Палескай хронікі» Івана Мележа / В. П. Жураўлёў // Роднае слова. – 1999. – № 11. – С. 27–33.
5. *Колас, Я.* Новая зямля: паэма / Я. Колас. – Мінск : Беларусь, 1968. – 400 с.

С. А. Сігаева (Мінск)

ВОБРАЗЫ-АРХЕТЫПЫ АНТЫЧНАЙ МІФАЛОГІІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

Трансфармацыя антычных традыцый, уласцівая перыяду еўрапейскага рамантызму канца XVIII – пачатку XIX ст. арганічна працягвалася і ў пачатку XX стагоддзя, у тым ліку, у беларускай паэзіі. Лепшае сведчанне гэтаму – творчасць беларускага паэта Уладзіміра Жылкі.

Сёння творы Уладзіміра Жылкі, аднаго з найбольш цікавых і самабытных паэтаў з трагічным лёсам, яскрава ўпісаліся ў залаты фонд айчыннай літаратуры, яго імя заняло адно з самых ганаровых месцаў на беларускім парнасе.

Творчасць Уладзіміра Жылкі на інтэлектуальным узроўні адпавядала традыцыям еўрапейскага рамантызму. Рамантызм як культурная з'ява паўстаў у культуры як рэакцыя на Асветніцтва і навукова-тэхнічны прагрэс і характарызаваўся сцвярджэннем самакаштоўнасці духоўна-творчага жыцця асобы, выяўленнем моцных, бунтарскіх характараў, вяртаннем да старажытных вытокаў, міфалогіі. Вобразы антычнай міфалогіі былі даволі распаўсюджанымі і ў творчасці Уладзіміра Жылкі.

Адвечным вобразам, да якога звярталіся творцы, бадай, усіх культурных эпох, з'яўляецца вобраз Праметэя, вобраз стваральніка чалавека, героя, які пакутвае і які ўвасабляе сабой свабоду.

Звернемся да архаічнага вобраза, адлюстраванага Уладзімірам Жылкам (верш «Праметэй»):

О няволя... нясіла... Ды не!
З гордых вуснаў не вылеціць стогн!
Пакарацца, хіліцца не мне!
Гнеў, як полымя, мора імкне,
І ў вякі, і ў вякі мой праклён!
Мой праклён, мой пратэст — нібы гром,
Хай пачуюць, хто думаў, хто смеў,
Хто маім прасвятляўся агнём.
Ганьба! Вечная ганьба багом,
Чый магутны, няправедны гнеў! [1, с. 73].

Вобраз прывабіў пісьменніка сваёй сілай, непахіснасцю. Уладзімір Жылка робіць акцэнт на яго нязломнасці перад вышэйшымі сіламі, а таксама на спадзяваннях героя старажытных міфаў на тое, што людзі пачуюць яго. Як лічыць Уладзімір Калеснік, паэт адчуваў, што яго светапогляд і палітычная пазіцыя – не прыватная асабістая справа: «на яго арыентаваліся многія, і ён пачуваў маральны абавязак дапамагаць парадай і прыкладам кожнаму, хто, як і ён, шчыра імкнуўся быць карысным свайму народу, гатовы быў змагацца за ўз'яднанне радзімы і свабоднае жыццё ў роўнасці і гістарычнай справядлівасці. Як мастак Жылка ўмеў пранікаць у душы другіх людзей, ён разумеў тыя маральныя цяжкасці, з якімі сутыкаліся асабіста сумленныя аднакашнікі» [2, с. 140]. Верш напісаны ад імя самога лірычнага героя. Такі падыход у інтэрпрэтацыі вобраза робіць яго больш набліжаным да тагачаснага чытача.

У пражскі перыяд Уладзімір Жылка пачаў вырашаць галоўную праблему сваёй творчасці на той перыяд – набліжэнне беларускай паэзіі да еўрапейскай і сусветнай. Тэматыка яго тагачасных твораў агульначалавечая: жыццё і смерць, прыгажосць і брыдота і г. д. Менавіта ў гэты перыяд Уладзімір Жылка піша верш, прысвечаны Персі Шэлі, у якім мы сустракаем вобраз Нарцыса (верш «Да Персі Шэлі»):

Як магло бы дзяўчо без люстэрка
Кволых вёснаў пазнаць харaство?
Што было б к параўнанню ёй мерка
І прыбрацца было б якаво?

Ці Нарцыс ганарыўся б з уроды,
Ці дазнаўся б ўладарства свайго,
Каб не светлыя ціхія воды,
Што адбілі ў глыбінях яго? [1, с. 92]

Нарцыс – яшчэ адзін распаўсюджаны паэтычны вобраз, які прыйшоў да нас з часоў антычнасці. Юнак, якога багі ў пакаранне прымусілі закахацца ва ўласнае адлюстраванне. Адарвацца ад сузірання ў Нарцыса не было моцы, ён памёр ад знясілення і ператварыўся ў кветку – цудоўны і халодны нарцыс. Вобраз Нарцыса, як і Праметэя, прываблівaў разнастайных мастакоў, а ў псіхалогіі нават замацаваўся тэрмін «нарцысізм», які абазначае фіксацыю свядомасці індывіда выключна на самім сабе.

У вершы Уладзіміра Жылкі вобраз Нарцыса – не цэнтральны, але паводле мастацкага напаўнення і экспрэсіўнасці валодае вялікім ідэйным зместам. Можна меркаваць, што з вобразам Нарцыса паэт атаясамлівае сябе: чалавека, які «глядзіцца» ў творчасць свайго настаўніка, як у люстэрка, і спасцігае тую ўладу, тую прыгажосць, якую гэтая творчасць у сябе ўвабрала. Уладзімір Жылка выкарыстаў у вершы вобраз Нарцыса, маючы на ўвазе найбольш падкрэсленую ў старажытных міфах яго характарыстыку як асобы самазадаволенай, самаўлюбёнай. Аднак паэт, акрамя таго, сканцэнтраваў сваю ўвагу на ўладзе, уласцівай прыгажосці Нарцыса, параўноўваючы яе з творчасцю свайго настаўніка і куміра Персі Шэлі.

Уладзіміра Жылку прываблівалі не толькі вобразы антычнай міфалогіі, але і антычныя формы верша (вершы «Гекзаметр», «Пентаметр»). Гэта, відаць, было выклікана імкненнем паэта далучыць беларускі народ, беларускую літаратуру да сусветнай культуры. Менавіта ў «Гекзаметры» сустракаецца вобраз Палады.

Паладай называюць Афіну – адну з важнейшых багінь грэчаскага пантэона, багіню справядлівасці, мудрасці і ваеннай магутнасці. Атрыбутамі Афіны з’яўляліся змяя і сава, а свяшчэнным дрэвам – аліва. Нягледзячы на тое, што Афіна прымае ўдзел у справах людзей, няма ніводнага міфа, які б распавёў пра яе каханне ці прыгоды. Афіна ўспрымалася хутчэй як дух дзяржаўнай мудрасці і разважлівасці.

Уладзімір Жылка ў вершы «Гекзаметры» згадвае Паладу нібы міма-ходзь і менавіта як сімвал вышэйзгаданай мудрасці, разважлівасці:

Смутак пахмуры чала не замрочыць спакушаных, мудрых,
Цяжкі панурасці грэх не зачэпіць ніколі разважных,
І абурэнне іх дух з раўнавагі не выведзе раптам –
Дзева Палада спакой іх і ціхую яснасць вартуе [Там жа, с. 80].

У вершы Палада згадваецца як трапны вобраз, што дапамагае лепш адчуць настрой верша. Трэба адзначыць, што для Уладзіміра Жылкі было

характэрна менавіта такое адлюстраванне вобразаў антычнай міфалогіі, якое мела на мэце пашырэнне вобразна-паэтычнай сістэмы яго твораў.

Асаблівую цікавасць уяўляе адлюстраванне Уладзімірам Жылкам вобразу Пенелопы.

Пенелопа – дачка спартанца Ікарыя і німфы Перыбеі, маці Тэлемаха, жонка Адысея. Пенелопа дваццаць год чакала вяртання Адысея ў Ітацы. У сусветнай культуры вобраз Пенелопы з'яўляецца ўвасабленнем шлюбнай вернасці.

Верш «Развітанне Пенелопы» забраў у У. Жылкі шмат часу і працы. Паэт пачаў яго ў Празе перад ад'ездам на радзіму, а закончыў у 1928 г. Апошнюю рэдакцыю паэт назваў «Развітанне» і жанр твора акрэсліў як Lai – від сярэдневяковай лірыкі, дзе пераказваліся сюжэты папулярных раманаў.

Даследчыкі творчасці Уладзіміра Жылкі лічаць, што ў творы антычнасць выступіла не столькі тэматычным, колькі стылістычным кампанентам, што з'яўлялася спецыфікай пераасэнсавання вобразаў антычнай міфалогіі паэтам. «Яго трывожылі Адысеевы роздумы, ці прызнаюць і пазнаюць яго на радзіме, але ж усё гэта поўна выказана ў вершы «На эміграцыі». З гэтай, хіба, прычыны паэт і не закончыў у Празе свайго «Развітання Пенелопы». Пэўная літаратурнасць задумы прывяла да знарокавай віртуознасці, але форма не напаўнялася зместам, не страляла» [3, с. 286]. Пры стварэнні вобраза Пенелопы Уладзіміру Жылку давялося шмат у чым пераасэнсаваць тую аснову, на якой быў напісаны твор: трактоўку сцэны развітання Пенелопы з Адысеем. Гэта было звязана з жыццёвымі варункамі, у якіх апынуўся паэт, і паспрыяла таму, што твор быў значна аддалены ад свету антычнай міфалогіі. «Развітанне» прачытваецца як узор інтымнай лірыкі, што набліжае паэта да еўрапейскай рамантычнай плыні. Аднак у кожную пэўную эпоху, у кожнага пэўнага народа рамантычная плынь мела сваё ўласнае аблічча. Гэта ж датычыцца і творчасці Уладзіміра Жылкі. Таму мы і назіраем, як падабенства з паэтыкай эпохі рамантызму ў спецыфіцы адлюстравання вобразаў антычнай міфалогіі ў паэта, так і адрозненні. Падабенства, звязанае з разгледжанымі вобразамі, заключаецца ў набліжэнні рэчаіснасці, якая акаляе беларускага паэта, са старажытнымі вобразамі. Адрозненні ж – у адсутнасці эпічнага разгортвання антычных сюжэтаў, што характэрна, напрыклад, для англійскіх паэтаў. Па-сапраўднаму аб'ядноўвае еўрапейскіх паэтаў і Уладзіміра Жылку тое, што, да якіх бы элементаў вобразнасці яны не звярталіся, заўсёды адлюстроўвалі сучаснае ім быццё, адгукаліся на выклікі часу.

Уладзімір Жылка не імкнецца да эпічнага адлюстравання і пераасэнсавання старажытных міфалагічных сюжэтаў. Гэта добра бачна і на вобразе Нарцыса, і на вобразе Палады. Праз іх аўтар робіць больш разнастайным вобразны свет сваёй паэзіі.

Уладзімір Жылка быў паэтам адраджэння і, разам з тым, рабіў спробу далучыць беларускую літаратуру да сусветнай. На яго ўплывалі розныя сусветныя эстэтычныя кірункі, у тым ліку, і англійскі рамантызм.

ЛІТАРАТУРА

1. *Жылка, У.* Выбраныя творы / У. Жылка; укладанне, прадмова і каментарыі М. Скоблы – Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. – 358 с.
2. *Калеснік, У.* Ветразі Адысея. Уладзімір Жылка і рамантычная традыцыя ў беларускай паэзіі / У. Калеснік. – Мінск: Маст. літ., 1977. – 328 с.
3. *Лявонава, Е.* За рубеж чалавечага слова… . Вытокі эстэтычнага ўніверсалізму Уладзіміра Жылкі / Е. Лявонава // Роднае слова. – 2003. – № 8. – С. 25–27.

Т. С. Супранкова (Мінск)

ЛЕГЕНДА АБ ПАНЕ ТВАРДОЎСКІМ: ЛЯ ВЫТОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ФАЎСЦІЯНЫ

Беларуская культура, цесна знітаваная з заходнееўрапейскай культурнай традыцыяй, яшчэ з сярэднявечнага перыяду вяла з ёй актыўны дыялог, у выніку якога ва ўжытак мовы ўваходзілі новыя запазычаныя словы, у архітэктуры і выяўленчым мастацтве выкарыстоўваліся раманскі і гатычны стылі, у літаратуру пранікалі папулярныя сюжэты аб Александрыі, Троі ці Трыстане. Прыкладам такой міжкультурнай камунікацыі з'яўляецца і сюжэт аб доктары Фаўсце, што пабачыў свет у франкфурцкай друкарні Ёгана Шпіса ў 1587 годзе як ананімны твор «Гісторыя доктара Ёгана Фаўста, знакамітага чарадзея і чарнакніжніка». Гэта першая па часе зафіксаваная версія легенды, хоць прататыпаў і перадумоў да ўзнікнення менавіта такога топасу ў сусветнай культуры было даволі шмат.

Калі паспрабаваць ахарактарызаваць парадыгму фаўсціяны, можна ўбачыць, што ў аснове яе ляжыць архетып бунта, паўстання, забароны і парушэння, што зафіксавана яшчэ ў тэксах старажытнасці: біблейскай гісторыі аб Адаме і Еве з Кнігі Быцця, паўстання анёлаў на чале з Люцыферам з «Кнігі Еноха», у міфе аб Праметэі, што быў апрацаваны вялікім грэчаскім драматургам Эсхілам. Вобразы Фаўста і Мефістофеля становяцца вечнымі, як і сама фаўсціяна становіцца вечным сюжэтам. Матывамі гэтага топасу з'яўляюцца дамова з д'яблам, пошук праўды любымі сродкамі, абмежаванасць чалавечых ведаў і расчараванне ў іх, вечна выратавальнае Вечна-Жаночае і інш. Безумоўна, найлепшая ў сусветнай літаратуры апрацоўка топасу фаўсціяны належыць пяру нямецкага пісьменніка і мысляра эпохі Асветніцтва Ёгану Вольфгангу фон Гётэ, таму ў літаратуразнаўстве падзяляюць развіццё сюжэта аб Фаўсце на «дагётэўскае», «гётэўскае» і «паслягётэўскае».

Па гётэўскай версіі міжкультурная камунікацыя топаса фаўсціяны пашыраецца, міф набывае скаладанейшыя філасофскія канатацыі, якія становяцца цікавымі для еўрапейскіх філосафаў, пісьменнікаў, драматургаў,

мастакоў і кінематаграфістаў. З'яўляецца шмат версій і мадыфікацый міфасюжэта, якія непасрэдна ці апасродкавана адсылаюць нас да гётэўскага тэксту, ў першую чаргу, ці да версіі народнай легенды. Расійская даследчыца фаўсціяны Г. Ішымбаева, вывучаючы функцыянаванне фаўстаўскай міфалагемы і філасафемы ў нямецкай і рускай культурах, прапануе размежаваць паняцці фаўстаўскага і фаўсціянскага: «Гётевская трактовка героя немецкой Реформации подверглась бесконечному количеству модификаций в художественном творчестве писателей всего мира – от прямых подражаний и продолжений, через использование реминисценций и аллюзий, создающих нейтральный фон, до откровенных пародий и травестии классического текста. Именно «Фауст» Гёте так или иначе повлиял на три типа произведений родственной тематики – о Фаусте и Антифаусте, о фаустовских и антифаустовских героях, о фаустианских и антифаустианских персонажах» [1, с. 4]. Нямецкі літаратуразнаўца Карл Тэенс прапаноўвае размяжоўваць розныя інтэрпрэтацыі фаўстаўскага сюжэту. У залежнасці ад таго, у якой ступені аўтар хоча звярнуць нашу ўвагу на дыялог свайго твора з фаўсціянай, можна вылучыць:

1) Geschichte der Faustgestalt («гісторыю вобраза Фаўста») – ўсемагчымыя інтэрпрэтацыі, звязаныя з асобай гістарычнага і легендарнага Фаўста. У дадзеным шэрагу варта ўзгадаць інтэрпрэтацыі Марла, Ленца, Клінгера, Гёте, Гейнэ, Ленаў, Пушкіна, Т. Мана і інш., якія нават у сваёй назве ўказваюць на прыналежнасць да твораў такога тыпу. Сюды ж можна дадаць творы кшталту «Захавальнікі кароны» Арніма, «Мефіста» К. Мана ці «Заход Еўропы» Шпэнглера, дзе Фаўст таксама прысутнічае як персанаж, хоць і не з'яўляецца галоўным героем;

2) Geschichte des Faustthemas («гісторыя тэмы Фаўста») – галоўны герой мае шмат агульнага з Фаўстам, але фаўсціянскія алюзіі не з'яўляюцца першачарговымі. Так, напрыклад, драма К. Імермана «Мерлін» адсылае нас да рыцарскіх раманаў артураўскага цыкла, дзе герой-чарадзей таксама здзяйсняе неверагодныя справы;

3) Аналогіяй да сачыненняў аб Фаўсце з'яўляюцца «Манфрэд» Байрана, «Бранд» Ібсэна, «У Дамаск» Стрындберга, «Трагедыя чалавека» Медаха і інш. Тут падабенства з фаўсціянскім сюжэтам адчуваецца вельмі цмяна [2].

Выкарыстоўваючы досвед нямецкіх калег, Г. Ішымбаева прапануе ўвесці яшчэ два ключавых паняцця для даследавання дадзенай праблемы: фаўстаўскага і фаўсціянскага. «Понятие фаустианского, с нашей точки зрения, приложимо к литературно-культурным явлениям, близким фаустовской теме, но не тождественным ей и выходящим за пределы сюжета об историческом и легендарном докторе Фаусте. Фаустианская сюжетика имеет библейские корни и в ряде случаев существенно видоизменяется под влиянием фольклора, прежде всего народной сказки о глупых чертях и использующих их хитрых мужиках. Так, фаустианскими, по нашему мнению, являются «Эликсиры сатаны» Гофмана, «Братья Карамазовы»

Достоевского, «Так говорил Заратустра» Ницше, «Конец мелкого человека» Леонова, «Жизнь Клима Самгина» М. Горького, «Москва» Андрея Белого, «Мастер и Маргарита» Булгакова, «Гелиополис» Юнгера и т. д., где Фауст как таковой отсутствует, но архетипическая связь с сюжетом о сделке человека с демоном налицо.

Особенностью всех фаустовских и фаустианских произведений, заключающих константу вечного сюжета о договоре между человеком и сатаной, является то, что они – более или менее явственно – «окликают» трагедию Гёте. Ее отзвуки слышны то как классические вариации на классическую тему, то как вызывающие пародии на первоисточник. Последнее характерно для сочинений об Антифаусте, антифаустовских и антифаустианских героях и персонажах» [1, с. 5–6].

Такім сюжэтам з'яўляецца і паданне аб пане Твардоўскім, якое стала складвацца на тэрыторыі Рэчы Паспалітай (не толькі Польшчы, але і Вялікага княства Літоўскага) у другой палове XVI ст., набываючы новыя інтэрпрэтацыі на працягу наступных стагоддзяў, запазычваючы тэмы з фальклору і сярэднявечных еўрапейскіх легенд. Паспрабуем вызначыць месца дадзенага сюжэта сярод твораў сусветнай фаўсціяны.

Не ўсе даследчыкі згодныя з непасрэдным уплывам нямецкай народнай легенды на паданне аб пане Твардоўскім, але, безумоўна, гэта гісторыя займае пачэснае месца ў шэрагу такіх твораў фаўсціянскага характару, як апавяданні аб самараніне Сімоне-магу, стараперсідскім Зохаку, антыяхійскіх Кіпрыяне і Юстыне (іспанскі Фаўст Кальдэрона называецца «Маг-цудатворац»), візантыйскім Феафіле, кельцкім Мерліне, італьянскім Каруле, чэшскім Жыта і нямецкім Фаўсце. Пачынаючы з першай чвэрці XIX ст., паданні аб Твардоўскім сталі прыцягваць увагу фалькларыстаў, этнографаў, літаратуразнаўцаў. Некаторыя з іх згаджаліся з відавочным уплывам легенды аб доктары Фаўсце. Сярод іх можна назваць польскага фалькларыста і гісторыка літаратуры Казімежа Уладзіслава Вуйцыцкага, які апублікаваў у 1837 г. першы зводны тэкст паданняў аб Твардоўскім, нямецкіх даследчыкаў Т. Фогля [3], В. Лепельмана, Ё. Гольдштэрна, чые загалоўкі навуковых прац сцвярджалі, што легенда аб Твардоўскім – польскі варыянт фаўсціянскай версіі. Тым больш што сама нямецкая легенда аб Фаўсце з'явілася ў польскім перакладзе таксама ў 1587 г., у год выдання яе Ёганам Шпісам у друкарні Франкфурта-на-Майне. Прыхільнікі ж нацыянальнай версіі з'яўлення такога героя бачылі прататып Твардоўскага ў польскіх сярэднявечных паданнях (Скарбнік, Пётр Дунін, Бэлфегор) і нават у сачыненнях рымскага паэта Вергілія. Таму, карыстаючыся тэрміналогіяй К. Тэенса, меркаванні вучоных у інтэрпрэтацыі прыналежнасці да фаўсціяны легенды аб пане Твардоўскім вагаюцца паміж гісторыяй «вобраза Фаўста» і «тэмы Фаўста». На нашу думку, гэты сюжэт безумоўна належыць фаўстаўскай тэме, але мае пэўны шэраг спецыфічных асаблівасцей, таму лагічным было б аднесці яго да катэгорыі «Geschichte des Faustthemas».

Паспрабуем правесці аналогіі ў гісторыях Фаўста і Твардоўскага, каб вылучыць асаблівасці «тэмы Фаўста» у польска-беларускай версіі легенды. Разгледзім спачатку этымалогію прозвішчаў галоўных герояў. Наконт паходжання прозвішча Фаўста, як і Твардоўскага, існуюць розныя версіі. Калі шукаць аналогіі ў нямецкай мове, то назоўнік жаночага роду «die Faust» перакладаецца як «кулак» (распаўсюджанае ў Нямеччыне прозвішча, указвае на цвёрдасць і моцнасць характара, сілу духа), у лацінскай мове прыметнік «faustus» абазначае «шчаслівы» (негледзячы на свой род заняткаў, ён імкнецца знайсці шчасце і быць шчаслівым забароненымі сродкамі). Германіст Віктар Жырмунскі сцвярджае, што Фаўст – асоба гістарычная. Пра яго ёсць узгадкі паміж 1507 і 1540 гадамі, аб чым сведчаць яго сучаснікі ў гістарычных дакументах (вядомыя нямецкія гуманісты Філіп Меланхтон, Філіп фон Гутэн, біскуп Бамбергскі Георг III і інш.) [4, с. 271–272]. Далей расійскі даследчык прыводзіць канкрэтныя месцазнаходжанні гэтай неардынарнай гістарычнай постаці. Прадстаўляе цікавасць наступнае сведчанне: «К Меланхтону (Манлию) восходит известие, будто Фауст учился в Краковском университете, где в то время «публично преподавали магию» (подразумевается так называемая «естественная» магия в отличие от черной магии или чернокнижия). Сведения эти повторяют позднейшие авторы, следующие за Меланхтоном – Манлием (Вир, Мейгериус, Лерхейм и др.)… Существенно, что они наличествуют в польских «Анналах» Станислава Сарницыуса…» [4, с. 273–274]. Паводле дакументальных сведчанняў, Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве (1364 г.) – старэйшая навучальная ўстанова для зямель польскіх і Вялікага княства Літоўскага, у якой навучаўся і наш славуты першадрукар Францыск Скарына ў пачатку XVI ст., набыла вядомасць яшчэ і тым, што там вывучалася ніграмантыя.

Станіслаў Сарніцыус заўважае: «А так как в Кракове в старину более, чем в других местах, занимались магией, то многие упорно утверждают, что при помощи магических чар жители Кракова вызывали тени польских героев такими по виду, какими описывал своих героев Овидий, и после печатали их изображения и рисовали на углах домов» [4, с. 26]. Гэта заўвага пралівае пэўнае святло на постаць пана Твардоўскага, пра якога ў Беларусі да сённяшніх дзён ходзяць легенды ў сувязі з выкліканнем духа Барбары Радзівіл. Таму, абапіраючыся на гэтыя звесткі, можна зрабіць выснову, што нямецкі Фаўст і польскі Твардоўскі, – розныя людзі. Нямецкія гісторыкі мяркуюць, што гістарычны пан Твардоўскі паходзіў з Нюрнбергу і навучаўся ў Вітэнбергу медыцыне, пасля пасяліўся ў Кракаве 1565 г. Як і Фаўст, ён меў лацінізаванае імя – «Dhur», што паходзіць ад прыметніка «durus», а па-польску гучыць як «twardy» – «цвёрды», «моцны», «строгі». А ў польскай мове прозвішча падаўжаецца ў «Твардоўскі». Як можна ўбачыць, этымалогія імён гэтых герояў аб'яднана канцэпцыяй цвёрдага і нязломнага характару, жаданнем ісці да канца ў дасягненні мэты, каб дакрануцца да таго, што іншым не дазволена, і стаць шчаслівым. Гэтыя матывы будуць важнымі для Ё. В. Гётэ ў яго далейшай трактоўцы вобраза Фаўста і ў рэалізацыі ідэй вялікага нямецкага пісьменніка ў канцэпт звышчалавека Ф. Ніцшэ.

Важным матывам фаўсціяны з’яўляецца кантракт з нячыстай сілай. Усе хрысціянскія творы імкнуцца акцэнтаваць увагу на дадзеным моманце, каб вывесці мараль: гэтага рабіць нельга. У хрысціянскай трактоўцы біблейскай прыпавесці аб грэхападзенні Адама і Еву спакусіў сатана, што ўсяліўся ў змея. Шэдэўрам сусветнай літаратуры, дзе гэты сюжэт яскрава прадстаўлены, з’яўляецца «Страчаны рай» Джона Мілтана. Усе астатнія сярэднявечныя легенды, апісваючы такога кшталту гісторыі, таксама нясуць падобную канатацыю. Паколькі нямецкая версія была ранейшай, чым гісторыя аб Твардоўскім, і, магчыма, паўплывала на польска-беларускую, то выданне Шпіса таксама прасякнута павучальнымі ноткамі. Гісторыя пана Твардоўскага звязаная з Кракавам, дзе мог навучацца і Ёган Георг Фаўст чорнай і белай магіі. Паводле К. Вуйцыцкага, Твардоўскі лячыў народ і займаўся вядзьмарствам, каб вынайсці лекі супраць смерці. Дамова з нячыстай сілай тлумачыцца ў легендзе вельмі важкай прычынай: галоўны герой сам захварэў і не хацеў паміраць, таму такі сродак быў, паводле яго меркавання, адзінай надзеяй на працяг зямнога жыцця («bo nie chciało mu się umrzeć» [5]). Фаўст жа, паводле народнай легенды, таксама будучы лекарам, «захотел постигнуть все глубины неба и земли» [4, с. 39]. Але нямецкі герой перад прыняццём такога рашэння, як падпісанне дамовы (факт дамовы фіксуюць абедзьве версіі), тры разы размаўляе з Мефістофелем і толькі пасля заключае з ім кантракт, тэкст якога прыведзены ў творы. Нямецкая версія педантычна прапісвае ўсе яго пункты: вызначаны тэрмін дзеяння кантракта – дваццаць чатыры гады, а таксама абавязкі двух бакоў – Фаўста і Мефістофеля. У польскай версіі тэрмін дамовы не акрэслены, і гэта важная рыса менавіта славянскага менталітэту. Адзінае, што сказана аб умове, паводле якой нячысцік забярэ душу Твардоўскага, – усё адбудзецца ў Рыме. Неакрэсленасць тэрміна стане важным аспектам для Гётэ, бо яго герой аднайменнага твора сам дыктуе ўмовы кантракту, спадзеючыся на сваю перамогу і на пройгрыш Мефістофеля. Дарэчы, абедзьве версіі падкрэсліваюць незвычайную вучонасць лекараў і чарнакніжнікаў і тое, што героі прыкладаюць шмат намаганняў, каб спасцігнуць розныя навукі, дазволеныя і забароненыя. Але ў нямецкай версіі важным з’яўляецца матыў часу, у польскай – месца.

Наступны абагульняючы аспект расповядаў пра чарнакніжнікаў – «цуды», якія з дапамогай нячыстай сілы яны робяць. Твардоўскі загадвае д’яблу звезці срэбра з усёй Польшчы ў руднік Олькуш і засыпаць яго пяском, перакуліць Пясчаную скалу і паставіць яе тонкім канцом уніз і г. д. Твардоўскі атрымліваў усё, што хацеў: ездзіў на намаляваных конях, лётаў па паветры без крылаў, скакаў на пятуху хутчэй, чым на кані, плаваў з каханкай на чоўне па Вісле супраць цячэння без вёслаў і ветразя, запальваў вёскі на адлегласці ў сто міль, з дапамогай чарадзейства вярнуў сабе маладосць (матыў амалажэння прысутнічае і ў Гётэ). У нямецкай версіі Фаўст часта размаўляе з нячыстым духам на філасофскія тэмы: пра пекла, сатану і яго прыслужнікаў, пра структуру сусвету, здзяйсняе падарожжа ў пекла, вандруе па свеце. Але ёсць і бытавыя замалёўкі, кшталту фокусаў Твардоўскага: адпілаванне сабе нагі, пажыранне воза сена, палёт у паветры і інш.

Жаночыя вобразы – вельмі важныя частка фабулы і яшчэ адзін кансалідуючы фактар расповедаў. У легендзе аб Твардоўскім спачатку ёсць узгадка пра яго каханку, якую ён катаў у чаўне па Вісле. Пасля шляхціч бярэ шлюб з маладой пані, разгадаўшы яе загадку, але праз некаторы час праганяе яе. Пані Твардоўская пабудавала для сябе з гліны домік на кракаўскім кірмашы і гандлявала там гаршчкамі і міскамі. Твардоўскі завеў экіпаж, багаты двор з прыслугаю і не меў нястачы ў грошах. Праязждаючы праз кракаўскі кірмаш, ён кожны раз загадваў сваім слугам разбіваць гаршчкі, якімі гандлявала яго жонка. Тая пасылала яму за гэта праклёны, а Твардоўскі рагатаў. У народнай кнізе Фаўста наведвае жаданне ажаніцца, але чорт пераконвае яго ў прывабнасці чужаложства. Спадарожніцамі чарнакніжніка аказваюцца найпрыгажэйшыя жанчыны свету, нячыстыя духі, нават сама Алена Спартанская. Гэты матыў стане важным пасля і для Гётэ, але ў яго вобраз Алены напоўнены сімвалічным сэнсам і азначае шлях новаеўрапейскай культуры да канонаў антычнай прыгажосці і іх пераасэнсаванне, ў прыватнасці эстэтыкай Веймарскага класіцызму. У версіі народнай легенды Фаўст выклікае Алену як духа, каб прадэманстраваць студэнтам, як ён паказвае духаў Аляксандра вялікага і яго жонкі імператару Карлу V. Пасля, калі застаецца адзін год да сканчэння кантракту, Алена становіцца яго наложніцай і нараджае яму сына, які валодае прарочым дарам. Са смерцю Фаўста абодва знікаюць. Паводле нясвіжскай і іншых версій аб выкліканні духа каралевы Барбары, каханай Жыгімонта Аўгуста, якія не зафіксаваныя ў Вуйцыцкага, кароль Рэчы Паспалітай звярнуўся да чарнакніжніка Твардоўскага. Барбара Радзівіл не была з каралеўскага роду, але сваёй знешняй і ўнутранай прыгажосцю скарыла сэрца самаго караля, таму яна з'яўляецца сімвалам прыгажосці ў беларускай літаратурнай традыцыі. Такім чынам, агульны матыў выклікання памерлай прыгажуні прысутнічае і там, і там.

У версіі, запісанай Вуйцыцкім, матыў малітвы да Маці Божай і яе заступніцтва, якое збаўляе Твардоўскага ад кіпцюроў чорта, іграе важную ролю ў фабуле і кардынальна супрацьлегла нямецкаму аналагу. Даследчык Ю. К. Бягуноў параўноўвае легенду аб Твардоўскім з падобным сюжэтам аб Саве Грудцыне ў рускім фальклоры, шукаючы агульнае. Сярод такіх матываў ён таксама адзначае нябеснае заступніцтва Марыі: «С повестью о Савве Грудцыне сказания о Твардовском роднит демонологическая тема: герой русской повести – сын устюжского купца Грудцына-Усова Савва продал свою душу дьяволу. Обманутый Названным братом (а на самом деле, сатаной), он изведал немало приключений и даже совершил подвиги на полях сражений; в конце концов, Савва был избавлен от адского огня Богородицей. В основе польской и русской демонологических легенд лежит мотив службы дьявола человеку с коварным замыслом овладеть его душой. Этому замыслу не суждено осуществиться. И Грудцын, и Твардовский, два великих грешника, были спасены Богородицей по молитве к ней. В этом нетрудно заметить нечто общее. И в польских католических сказаниях, и в русских православных преданиях о деве Марии исключительное значение придается молитве, обращенной к ней» [6, с. 84].

Яшчэ адной кропкай сутыкнення з'яўляецца матыў расплаты. У нямецкай Народнай кнізе Фаўст прадстаўлены як негатыўны герой, які займаецца чарадзействам, што супярэчыць духу хрысціянскай царквы і асуджаецца. З памылак героя чытачу варта вынесці павучальны ўрок. Доктара Фаўста суправаджае злы чорт Мефістофель, які абяцае галоўнаму герою розныя жыццёвыя ўцехі і, выконваючы яго капрызы, забірае яго душу праз дваццаць чатыры гады. Хоць у канцы расповеду Фаўст і жадае адвярнуцца ад злых спраў, аўтар быццам бы не дае яму ніякага шанцу, паколькі адмяніць дамову з чортам ні ў якім разе нельга. У адным з фінальных эпізодаў галоўны герой кажа аб будучай пагібелі: «Ах, кто избавит меня теперь от несказанного пламени преисподней? Ибо нет помощи, ибо рыдания о грехах бесполезны. Нет покою ни ночью, ни днем. Кто же спасет меня, несчастного? Где мое прибежище? Где мой щит, помощь и спасение? Где моя крепость и оплот? Чем мне утешиться? Не святителями Божьими, ибо я стыжусь к ним воззвать и не услышу ответа, но лучше мне закрыть лицо свое, чтобы не видеть ликования избранных» [4, с. 98].

У легендзе аб Твардоўскім няма дакладнага тэрміну заключэння дамовы. Канец прыгодам галоўнага героя прыходзіць неўзабаве: д'ябал вырашыў забраць нястрыманага шляхціча да сябе і абхітрыў яго. Дарэчы, Твардоўскі так і не збіраўся ехаць у Рым. Падпільнаваўшы пана ў цёмным лесе, чорт хоча ўзяць з яго слова, што той наведае вечны горад. Але Твардоўскі адмаўляецца, пасля чаго нячысты вырывае з коранем сасну і так моцна б'е ёй па назе шляхціча, што ламае яму нагу (магчыма, адсюль пайшла мянушка Твардоўскага – «калчаногі (kuternogą)»). І ўсё ж чорт абхітрыў яго: Твардоўскі раз апынуўся ў карчме з назваю «Рым». Пераступіўшы парог, ён пабачыў багата апранутага пана, з-пад шапкі яго паказваліся рогі, з ботаў – кіпцюры, ззаду быў хвост. Твардоўскі зразумеў, што прыйшоў час расплаты. Д'ябал схапіў яго і вынес праз трубу з коміну, пасля падняў у нябёсы. Пабачыўшы родную зямлю, ён узносіць малітву да Марыі, і Багародзіца збаўляе недарэку, ратуючы ад пякельнага агню. Але і нябёсы не захацелі прыняць пана Твардоўскага, і ён да Страшнага суду вымушаны знаходзіцца паміж небам і зямлёю. Так, гэта гісторыя мае і этымалагічны характар: тут даецца тлумачэнне таго, чаму на месяцы мы бачым пляміны.

Такім чынам, у гісторыі Фаўста і Твардоўскага ёсць шмат агульнага – іх злучае эпоха Адраджэння з яе смелымі ідэаламі, адзіныя матывы, гістарычная канкрэтыка. Але ў кожнай легендзе прысутнічаюць і нацыянальныя аспекты, якія з'яўляюцца праяўленнем ментальных установак тых культур і этнасаў, у межах якіх яны нарадзіліся. Легенды аб Фаўсце і Твардоўскім сталі не толькі цікавымі гісторыямі, але і набылі далейшыя апрацоўкі і выклікалі шырокі рэзананс у нацыянальнай і замежнай літаратурах. Што тычыцца айчыннай літаратуры, то легенда аб Твардоўскім паслужыла крыніцай беларускай фаўсціяны, маючы агульныя топасы і матывы з нямецкай версіяй, а ў далейшыя эпохі (у першую чаргу рамантызму) з'явілася прадметам літаратурнага дыскурсу.

ЛІТАРАТУРА

1. *Ишимбаева, Г. Г.* Русская фаустиана XX века: учеб. пособие / Г. Г. Ишимбаева. – М. : Флинта, 2014.
2. *Theens, K.* Doktor Johann Faust. Geschichte der Faustgestalt vom 16. Jahrhundert bis zur Gegenwart / K. Theens. – Meisenheim am Glan: Westkulturverlag Anton Hain, 1948.
3. *Vogl, T.* Twardowski – der polnische Faust / T. Vogl. – Wien, 1861.
4. Легенда о докторе Фаусте. – М. : Наука, 1978.
5. *Wójcicki, K. W.* Klechdy starozytne podania i powiesci ludu polskiego i Rusi / K. W. Wójcicki. – Warszawa : Państ. Inst. Wydawniczy, 1972.
6. *Бегунов, Ю. К.* Сказания о чернокнижнике Твардовском в Польше, на Украине и в России и новонайденная «История о пане Твердовском» / Ю. К. Бегунов // Советское славяноведение. – 1983. – № 1. – С. 78–90.

З. І. Траццяк (Полацк)

МАТЫЎ ВЯРТАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЕ ПРА ПЕРШУЮ СУСВЕТНУЮ ВАЙНУ

Кнігі Э. М. Рэмарка (E. M. Remarque, 1898–1970), прысвечаныя ўзброеным канфліктам першай паловы XX ст., мелі бясспрэчны ўплыў на беларускую ваенную прозу 1960-х – 70-х гг. В. Быкаў апавядаў пра знаёмства з творчасцю нямецкага пісьменніка: «Недзе з часоў хрушчоўскай адлігі ў савецкім друку пачалі паяўляцца кнігі славутых заходніх аўтараў… Можа, першым з гэтага шэрагу пачалі выдаваць раманы Рэмарка, які адразу знайшоў немалую папулярнасьць сярод чытацкай моладзі…» [1, с. 277]. Прадстаўнікоў “лейтэнанцкай прозы” ўразіла адкрытасць, з якой празаік апавядаў пра ваенную рэчаіснасць: яго персанажы крытыкавалі камандаванне і ўлады, стратэгію і тактыку бою, працу інтэнданцкіх і медыцынскіх служб, адносіны з цывільнымі і ворагам і г.д. Паводле Л. Сіньковай, «сінанімічным паняццю “рэмаркізм” … у савецкім кантэксце выступіла якраз “акопная праўда” – г.зн. праўда, пісьменнікам-ветэранам перажытая, але нібы недастатковая, патрабуючая дапаўнення “праўдаю стаўкі”» [2, с. 57]. Менавіта апошняя, мабыць, выклікала б адмоўна-іранічны каментар самога Э. М. Рэмарка.

Выключнае становішча мастака слова на айчыннай гуманітарнай прасторы не заўсёды карэлявалася з меркаваннямі замежных крытыкаў. Амерыканскі навукоўца Х. Блум ва ўступе да зборніка артыкулаў, прысвечанага раману «На Заходнім фронце без перамен», адзначыў: «… Хаця рэмаркаўскі стыль лаканічны і напружаны, яго пратаганісту не хапае запамінальнай індывідуальнасці і арыгінальных поглядаў, каб на працяглы час зацікавіць чытача» (*…Though Remarque’s style is terse and tense, his protagonist lacks significant personality or mind to be of lasting interest to the reader*) [3, p. 2].

Паказальна, што адносіны да твораў нямецкага празаіка палярныя, але гэта не памяньшае здабыткаў Э. М. Рэмарка. Дзякуючы яго раманам (у сукупнасці з кнігамі І. Бехера, Л. Рэна, А. Цвэйга, Э. Юнгера і інш.), мажліва зазірнуць за другі бок акопаў, а гэта тым больш актуальна, бо ў хрэстаматыйных творах А. Барбюса, Дж. Дос Пасаса, Р. Олдынгтана і Э. Хемінгуэя персанажы змагаліся супраць ворага-немца. Акрамя таго, пісьменнік знайшоў запамінальную форму ўвасаблення некалькіх матываў, што шчыльна асацыююцца з прозай пра Першую сусветную вайну.

Раман «Вяртанне» (*Der Weg zurück*, 1931) [4] прысвечаны працэсу адаптацыі былога камбатанта да мірнага жыцця на радзіме. Паказальна, што Э. М. Рэмарк скрупулёзна ахарактарызаваў практычна ўсе праблемы, якія атруцілі жыццё дзейных асоб, якія не шмат часу таму пакінулі акопы. Паводле Д. Затонскага, галоўны персанаж твора ўвасобіў былых салдат, яны «страцілі веру і адначасова прагнулі веры, адчаіліся і адначасова не страцілі надзею, … разбуралі міфы і прыдумлялі замест іх новыя» [5, с. 327]. Матыў «вяртання» аднолькава значны для розных нацыянальных літаратур (згадаем творы «Усе людзі – ворагі» (*All Men are Enemies*, 1933) Р. Олдынгтана, «Сарторыс» (*Sartoris*, 1929) У. Фолкнера, «Фіеста» (*Fiesta*, 1926) і «Салдацкі дом» (*Soldier's Home*, 1925) Э. Хемінгуэя). Айчыннае мастацтва слова 20 – 30-х гадоў неаднаразова звярталася да яго. Дарэчы, нашы літаратары рана пазнаёміліся з творчасцю Э. М. Рэмарка. У жніўні 1930 г. у «Беларускай вёсцы» апублікаваны ўрывак з «На Захадзе няма змен». Праз год надрукаваны пераклад пад назвай «На заходнім фронце без перамен», здзейснены Х. Шынклерам з рускай мовы [6].

Матэрыялам нашага даследавання былі апавяданне «На этапе» (1916), аповесць «Дзве душы» (1918–1919), раман «Віленскія камунары» (1931–1932) і дакументальна-мастацкая кніга «На імперыялістычнай вайне (Запіскі салдата 2-й батарэі N-скай артылерыйскай брыгады Лявона Задумы)» (1926) М. Гарэцкага, аповесці «Набліжэнне» (1936) З. Бядулі і «Затока ў бурах» (1928; 1956) Я. Скрыгана, раман «Праз гады» (1934) П. Галавача.

Паводле Е. Лявонавай, Э. М. Рэмарк належаў да «пакалення, для многіх прадстаўнікоў якога вайна так і не закончыцца» [7, с. 157]. Гэта назіранне мажліва распаўсюдзіць і на персанажаў яго кніг: некаторыя не здолелі пераадолець псіхалагічную траўму і прызвычаіцца да мірнага ладу, абумоўленага рэпрэсіўным характарам сучаснай ім цывілізацыі. Дзейныя асобы «ішлі дадому, усё здавалася ясным, простым: прыйсці і пачынаць жыць па-новаму, не так, як жыў да вайны» [8, с. 129], але выканаць мару-імператыў складана, а часам і немагчыма, бо прыходзілася змагацца за права адстойваць непадобныя да масавых каштоўнасці і нязвыклы лад жыцця. Акрамя таго, стаўшы асобамі сталага веку, былыя франтавікі маглі патрапіць у віхуру Другой сусветнай. Беларускія празаікі ўвасобілі тыпалагічна падобную сітуацыю. Аднак, іх дзейным асобам не наканавана адпачыць ад вайны хаця б некалькі год. Першая сусветная не мела лагічнага заканчэння, бо яе падзеі наклаліся на ўзброеную барацьбу палітычных груповак за ўладу на прасторах былой велізарнай імперыі.

Пачуццё франтовога таварыства – найвялікшая каштоўнасць персанажаў Э. М. Рэмарка. Паводле М. Тычыны, гэта паняцце «ў яго ўвесь час пашыраецца да значэння паняцця «братэрства» народаў і нацый» [9, с. 137]. Мастак слова не абыходзіўся без увасаблення дзейных асоб, якія пагардліва глядзелі на былых сяброў, разам з якімі яны гібелі ў акопах і прымалі смерць. Аўтар згадваў і пра сацыяльную стратыфікацыю, і пра несупадзенне палітычных поглядаў герояў. Беларускія мастакі слова звярталі ўвагу на разбурэнне франтавога таварыства часоў Першай сусветнай вайны пад уплывам рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны, падзей, звязаных з пабудовай інтэрнацыянальнага грамадства («прыцягненне-адштурхоўванне» Тарэнты і Сузона з рамана «Праз гады» П. Галавача).

Нямецкія і беларускія пісьменнікі разумелі, што іх персанажы-камбатанты і тылавікі ці цывільныя ўвасаблялі дзейных асоб, якія карысталіся рознымі семіятычнымі сістэмамі. Засваенне і фармуляванне правіл сусвету ў іх ішло адрозным чынам. Толькі частка чалавечых каштоўнасцей, пададзеных у выглядзе звыклых лексічных адзінак, захавала агульны для абодвух груп сэнс. Таму міжасабовыя зносіны ўяўлялі пакутны працэс, які прыносіў адчуванне непаразумення і раздражнення. Бяскрыўдныя выказванні былых франтавікоў, зробленыя ў нязвыклай форме, здаваліся цывільнаму апафеозам цынізму. «Пачэсныя й разумныя бацькі» з аповесці «Дзве душы» з абурэннем жаліліся на сыноў, што кпілі з іх: «чаму вам, старым, здаровым ня быць, вы да дваццацёх гадоў без парток хадзілі й ня стрігліся, а я з васемнаццёх лет у падрадчыка Лявонава ў Маскве тачку цягаў, а цяперь цераз Мікалая Краважэрнага тры гады ў Кірпатых адседзеў, у вакопах, па трое дзён-начэй ня еўшы» [10, с. 84]. Былыя франтавікі у творах Э. М. Рэмарка і беларускіх пісьменнікаў адчувалі, што яны не разумелі не толькі бацькоў. Стомленыя забойствамі і разбурэннем, дзейныя асобы спрабавалі знайсці рацыянальнае тлумачэнне таму, што моладзь усур'ёз гуляла ў вайну («Вяртанне») ці безаглядна кіраваліся ў эпіцэнтр новай бойкі («Праз гады»).

Пісьменнікі падкрэслівалі, што іх персанажам не ставала часу на пошукі адэкватных шляхоў увасаблення ўласных поглядаў, бо суайчыннікі не падрыхтаваліся да канструктыўнага дыялогу. Вярнуўшыся з вайны, дзейныя асобы абіралі дзве лініі паводзін: замоўчвалі франтавы вопыт ці спрабавалі прыпадобніць аповеды да запатрабаванняў масы, каб не шакіраваць цывільных. Напрыклад, Я. Скрыган выклаў сумневы свайго персанажа – Уладыся Барэйкі: «… вядома, можна было гаварыць бог ведае што. Няважна – праўда ці няпраўда, цяпер яму не страшна, а расказаць можна і сваё, і тое, што бачыў чужое. Калі б так расказаць, як ён бачыў, – валасы маглі б падняцца дыбка» [11, с. 48].

Вяртанне дадому станавілася сінонімам сямейнай трагедыі. Э. М. Рэмарк і айчынныя празаікі («На этапе») апавядалі пра незайздросны лёс былых салдатаў, якія пакутавалі ад сапраўдных ці выдуманых паражэнняў з боку блізкіх. Часцей за ўсё персанажы сумняваліся ў каханні жонак, іх здольнасці дачакацца, дараваць ці зразумець. Празаікі падкрэслівалі, што не ўсе адносіны праходзілі выпрабаванне вайной, бо нехта, спакутаваны адзінотай,

забываўся на франтавіка ў віры новых адносін, нехта вымушана прымаў заляцанні (жонка Альфрэда Бетке), нехта выракаўся мужа, пачуўшы пра яго калецтва (жонка Міхася з аповесці З. Бядулі «Набліжэнне»).

І нямецкі, і беларускія пісьменнікі не абыходзілі спецыфічны момант вяртання: адаптацыю да мірнага жыцця персанажаў, што страцілі фізічнае ці псіхічнае здароў'е. Мастакі слова абіралі жорсткія, натуралістычна завостраныя моманты, каб засведчыць, што нельга «глядзець на вайну, як на нешта прыгожае… абпяваць войны самымі пекнымі песнямі» [12, с. 188]. Тым больш, што чалавек гвалтоўна вырываўся са звыклай плыні жыцця. З. Бядуля падаў існаванне інваліда, які страціў зрок, так: «…З кожным днём пачынае абвастрацца, як брытва, яго слых… Як скупы песціць золата, песць рыжы Антось людскія галасы. І ўсё прывыкнуць не можа да сваёй егіпецкай ночы. Лягчэй і хутчэй да яго слепаты прывыкаюць хатнія, родныя… У яго, Антося, нічога не пытаюцца. Непатрэбны ён… Чужы…» [13, с. 114].

Сімптаматычна, што неўратычны стан былых франтавікоў пагаршаўся, бо жахлівыя сны вярталі персанажаў Э. М. Рэмарка, П. Галавача, М. Гарэцкага да мінулага. Перажытае звычайна прымала вытанчана-пачварныя формы, выклікаючы прыкрыя пачуцці, якія немагчыма было забыць. Вынікам адмоўных эмоцый рабіліся выбухі некантралюемай агрэсіі. Лявон Задума («На імперыялістычнай вайне») саромеўся, што без асаблівай нагоды пабіў сабаку і знішчыў голуба.

Варта ўвагі, што дзейныя асобы з кніг Э. М. Рэмарка шмат часу трацілі на пошукі годнага занятку, які б не траўмаваў душу. Для некаторых гэты працэс меў заканчэнне ў форме расчаравання, што прыводзіла да самагубства. Але пісьменнік не хаваўся за праявамі песімізму, таму Эрнэст – галоўны герой рамана «Вяртанне» – змог пераадолець страхі і крочыць далей, прымаючы ўласнае выбітнае становішча. Беларускія празаікі адразу кідалі дзейных асоб у віхуру падзей: неабходна было наладжваць гаспадарку, займацца праблемай палітычнага і нацыянальнага самавызначэння, супрацьстаяць састарэлым каштоўнасцям.

Матыў «вяртання» застаўся надзвычай актуальным і для наступнага пакалення айчынных пісьменнікаў-баталістаў. Новая генерацыя (В. Быкаў, І. Навуменка, І. Чыгрынаў і інш.) спазнавала Першую сусветную вайну не па творчасці беларускіх мастакоў слова, што па ідэалагічных чынніках замоўчвалася, надзейна схаваная ў спецхранах, а па спадчыне замежных аўтараў, кшталту Э. М. Рэмарка і Э. Хемінгуэя.

ЛІТАРАТУРА

1. *Быкаў, В.* Доўгая дарога дадому. Кніга ўспамінаў / В. Быкаў. – Мінск : Кніга, 2002. – 544 с.

2. *Сінькова, Л.* Творчасць Івана Навуменкі ў люстэрку ідэй «страчанага пакалення» / Л. Сінькова // Паміж тэкстам і дыскурсам: беларуская літаратура XX–XXI стст.: гісторыя, кампаратывістыка і крытыка (літаратурная крытыка, артыкулы, гутаркі). – Мінск : Паркус плюс, 2013. – С. 56–60.

3. *Bloom, H.* Introduction / H. Bloom // Erich Maria Remarque's All Quiet on the Western Front. Bloom's Modern Critical Interpretations. New Edition / ed. by H. Bloom. – N. Y.: Infobase Publ., 2009. – P. 1–2.
4. *Remarque, E. M.* Der Weg zurück: Roman / E.M. Remarque. – Kiepeheur & Witsch, 1998. – 334 S.
5. *Затонский, Д.* Эрих Мария Ремарк, или Двадцать лет спустя / Д. Затонский // Художественные ориентиры XX века. – М. : Сов. писатель, 1988. – С. 313–348.
6. *Рэмарк, Э. М.* На Заходнім фронце без перамен / Э. М. Рэмарк // пер. з расійскай мовы Хв. Шынклера. – Мінск : Беларус. дзяржа. выд-ва, 1931. – 171 с.
7. *Лявонава, Е.* «Як з такой высокай праўдай паказаць і нашу вайну…» Эрых Марыя Рэмарк і яго ўплыў на творчасць Васіля Быкава і Віктара Някрасава / Е. Лявонава // Беларускае мастацтва слова XX ст. у еўрапейскім мастацкім кантэксце: тыпалогія, рэцэпцыя, пераклад. – Мінск : БДУ, 2014. – С. 156–170.
8. *Галавач, П.* Праз гады : раман / П. Галавач. – Мінск : Маст. літ., 1984. – 368 с.
9. *Тычына, М.* Народ і вайна / М. Тычына. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 433 с.
10. *Гарэцкі, М.* Дзве душы / М. Гарэцкі // Творы: Дзве душы : аповесць. Апавяданні. Жартаўлівы Пісарэвіч : п'еса. Літаратурная крытыка і публіцыстыка. Лісты. – Мінск : Маст. літ., 1990. – С. 6–106.
11. *Скрыган, Я.* Затока ў бурах / Я. Скрыган // Выбраныя творы ў двух тамах. – Т. 2 : Апавяданні. Авповесці. Літаратурны роздум. – Мінск : Маст. літ., 1985. – С. 7–55.
12. *Зарэцкі, М.* Сьцежкі-дарожкі / М. Зарэцкі. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1928. – 396 с.
13. *Бядуля, З.* Набліжэнне : аповесць / З. Бядуля. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 230 с.

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ І СВЕТ: ШЛЯХ ДА СУСВЕТНАГА ПРЫЗНАННЯ

І. А. Бурдзялёва (Мінск)

НАЦЫЯНАЛЬНАЕ І ЎНІВЕРСАЛЬНАЕ Ў ТВОРЧАСЦІ В. МАРЦІНОВІЧА

Дыялектычнае адзінства нацыянальнага і ўніверсальнага – імпліцытная ўласцівасць мастацкага тэксту, які прэтэндуе на выяўленне нацыянальнай карціны свету і праз прыватнае, рэгіянальна непаўторнае ўзыходзіць

да ўніверсальнага і агульначалавечага. Вылучыць і размежаваць гэтыя ўзаемапранікальныя кампаненты ў той ці іншай культурнай з'яве або ў літаратурнай спадчыне пэўнага пісьменніка досыць складана, асабліва калі гэта творчасць пісьменніка-білінгва, якім з'яўляецца сучасны пісьменнік Віктар Марціновіч. Праўда, двухмоўныя або нават трохмоўныя аўтары ў гісторыі беларускай літаратуры – з'ява звычайная, як і пісьменнікі, якія ў межах літаратуры Беларусі выяўлялі сябе на мовах суседніх краін. Адметнасць айчыннага літаратурнага працэсу ў тым, што скіраванасць да ўніверсалізму пэўным чынам уплывала і на выбар моўнай абалонкі мастацкага твора.

Шматмоўны характар літаратуры Беларусі быў прадвызначаны яе развіццём на цывілізацыйнай мяжы і ўдзелам у культурным дыялогу паміж Усходам і Захадам. Сёння Беларусь належыць да тых нямногіх краін, якія вымушаны змагацца за прыналежнасць да свайго нацыянальнага дыскурсу шэрагу пісьменнікаў, якія ў даўняй і новай літаратуры пісалі не толькі на беларускай, але і на царкоўнаславянскай, лацінскай, польскай, па-сутнасці, на ўсіх тагачасных літаратурных мовах. Варта адзначыць, што дзеля дасягнення большага ўніверсалізму і камунікацыі з больш шырокай чытацкай аўдыторыяй ў тым грамадска-палітычным і культурным кантэксце выбар мовы рабіўся, як правіла, не на карысць беларускай. З цягам часу найбольшыя прэферэнцыі ў літаратурным жыцці атрымала польская мова, як мова міжнацыянальных зносін ў мульцікультурнай і шматканфесійнай Рэчы Паспалітай. Элітарная латынь выступала ў якасці агульнаеўрапейскай, універсальнай мовы. Мікалай Гусоўскі, прэзентуючы пры папскім двары адукаванай Еўропе сваю радзіму, ВКЛ, не мог гэтага зрабіць інакш, як на латыні. Сымон Будны, выдаўшы па-беларуску «Катэхізіс» і «Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам», большую частку твораў піша па-польску, а актыўную палеміку з еўрапейскімі мыслярамі вядзе на лаціне.

Пісьменнікамі-білінгвамі былі Я. Баршчэўскі, Я. Чачот, У. Сыракомля, В. Каратынскі, А. Рыпінскі. Двухмоўнасць гэтых творцаў XIX стагоддзя асіметрычная, іх разнастайную польскамоўную спадчыну сціпла дапаўняюць нешматлікія беларускамоўныя тэксты, і толькі ў творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча польскамоўны і беларускамоўны пласт прыйшлі да раўнавагі. У імкненні да максімальнай дыялагічнасці суседніх літаратур трохмоўнымі паэтамі былі Я. Лучына і А. Гурыновіч. Двухмоўнасць можна было пабачыць ў межах аднаго мастацкага твора – гэта інтэрмедыі школьнага тэатру, «Камедыя» К. Марашэўскага, «Ідылія» В. Дуніна-Марцінкевіча. Нягледзячы на тое, што ў выніку ўздзеяння цэлага комплексу зусім не літаратурных, а у першую чаргу грамадска-палітычных фактараў, беларускамоўныя творы гэтых аўтараў адносна нешматлікія, мы залічаем іх шматмоўную спадчыну да здабыткаў нацыянальнай літаратуры. Як, дарэчы, у курсе даўняй беларускай літаратуры вывучаецца творчасць пісьменнікаў, беларусаў-літвінаў па паходжанні, якія пісалі выключна на латыні ці па-польску – Ф. У. Радзівіл, А. Нарушэвіч, М. Карыцкі, Ф. Князьнін, І. Быкоўскі, Г. Мастоўская і многія іншыя, пазначаючы, што іх творчасць – гэта наш агульны з іншымі народамі

Рэчы Паспалітай культурны здабытак. У літаратуры Беларусі, якая здаўна развівалася на культурным памежжы, адчувала на сябе моцны ўплыў разнародных ідэйна-эстэтычных канцэпцый, не мова твора вызначала яго прыналежнасць да той ці іншай нацыянальнай літаратуры, а яго ідэйная скіраванасць, праблематыка, адлюстраванне мясцовыя актуалій, увасабленне ў творчасці нацыянальнага светаадчування і архетыпаў нацыянальнай свядомасці.

Двухмоўе, але ўжо беларуска-рускае, характэрна і для літаратуры XX стагоддзя. Паказальны прыклад Алеся Адамовіча, які раманы і аповесці пісаў па-руску, а крытычныя і публіцыстычныя творы – па-беларуску, на гэтых жа мовах пішуць свае творы Валянцін Тарас, Эрнест Ялугін, Міхась Шэлехаў, Аляксандр Станюта і інш. На рускай мове пачыналі свой шлях Леанід Дайнека і Віктара Казько, а потым цалкам перайшлі на беларускую.

На сённяшні дзень, ва ўмовах рынкавых адносін, асноўную канкурэнцыю беларускамоўнай літаратуры складае рускамоўная літаратурная плынь. Два стагоддзі русіфікацыі зрабілі сваю справу, ды і прагматычныя меркаванні прымушаюць творцаў кіравацца на мову колькасна большых суседзяў. Сацыялагічнае даследаванне, праведзенае ў 2014 годзе лабараторыяй «Новак», сведчыць, што 94 адсоткі нашых суграмадзян чытаюць па-руску, толькі 5 – па-беларуску і астатнія – на іншых мовах. Якая доля нацыянальнага кампаненту ў творах рускамоўных пісьменнікаў, як яны самі сябе пазіцыяніруюць? Ці можна назваць беларускімі пісьменнікамі В. Тарасевіч, В. Грамыка, Г. Альхоўскую, А. Драздова, Я. Пастэрнак, А. Жвалеўскага, А. Смятаніна? Творы гэтых аўтараў выдаюцца шматтысячнымі тыражамі ў Расіі і ў анатацыях часам не пазначаецца, што пісьменнік з Беларусі, ды і самі творы, дзеля большага ўніверсалізму і таксама на карысць шырокага чытача цалкам пазабаўлены нацыянальнага кампаненту, падзеі ў іх адбываюцца дзе заўгодна, толькі не ў Беларусі.

Якія сёння крытэрыі далучэння таго ці іншага аўтара да нацыянальнага дыскурсу? У асноўным яны засталіся тымі ж, але сталі больш жорсткімі, бо ў сучаснага пісьменніка ёсць выбар мовы, якога былі пазбаўлены, скажам, творцы XIX стагоддзя. З гэтай нагоды прыгадваецца палеміка, якая разгарнулася пасля надання Святлане Алексіевіч Нобелеўскай прэміі. Думаецца, пры ўсёй рускамоўнасці Алексіевіч належыць беларускай літаратуры, бо як самабытная пісьменніца яна сфарміравалася ў беларускім ментальным і культурным асяроддзі, а сваімі настаўнікамі найперш называе Алеся Адамовіча і Васіля Быкава. А. Адамовіч, па-сутнасці, літаратурны хросны пісьменніцы, назваў абраны ёю жанр «саборным раманам» або «раманам галасоў», і ў гэтым суплёце моцна гучаць і галасы беларусаў, якія апавядаюць пра свой індывідуальны шлях ў агульнай савецкай гісторыі. Але і скептычныя выказванні наконт прыналежнасці С. Алексіевіч да айчыннага нацыянальнага дыскурсу таксама зразумелыя: павелічэнне рускамоўнасці літаратуры Беларусі – працэс небяспечны, бо паступова можа прывесці да нівеліроўкі паняцця нацыянальнай ідэнтычнасці, нацыянальнай культуры,

разумення беларускай літаратуры як самабытнага і самакаштоўнага складніка літаратуры сусветнай. Палеміка ў гэтым накірунку яшчэ раз пацвярджае спецыфіку літаратуры Беларусі, яе хранічна шматмоўны характар і ў звязку з гэтым некаторую размытасць крытэрыяў самога паняцця «нацыянальная літаратура». Усё вышэйсказанае падкрэслівае абавязковы асобны падыход да кожнага аўтара.

Віктар Марціновіч працягвае традыцыю двухмоўнасці беларускай літаратуры. Кожны цотны раман ён піша па-беларуску, а няцотны па-руску, прычым адначасова з арыгінальнай версіяй творы выходзяць і ў перакладах. Сваё стаўленне да білінгвізму пісьменнік сфармуляваў наступным чынам: «Не лічу праблемай, калі беларускі пісьменнік піша па-руску. Болей за тое, працягваю лічыць, што складнікам нацыянальнай ідэнтычнасці на дадзеным этапе ёсць білінгвізм» [1]. Першы раман пісьменніка «Паранойя» (2009) выйшаў на рускай мове, праз два гады з'явіўся беларускамоўны твор, раман «Сцюдзёны вырай» (2011). По словах аўтара, твор пра тое, «што такое Беларусь».

Трэці раман Марціновіча «Сфагнум» (2013), нягледзячы на рускамоўнасць, заснаваны на беларускіх архетыпах, творчым пераасэнсаванні міфапаэтычных матываў, алюзіях на беларускую класіку – А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, М. Гарэцкага з яго пошукамі «патаемна-беларускага». Калі мець на ўвазе герояў рамана, трох маладых гопнікаў, якія вымушаны хавацца ад сваіх падзельнікаў у палескай глушы і бадзяцца па балоце ў пошуках скарбаў, то тут відавочная адсылка да Мележаўскай «Палескай хронікі». Як заўважыў Марціновіч, «па сутнасці, мой новы раман – "Людзі на балоце-3", бо першых людзей на балоце напісаў Мележ, другіх – Караткевіч у "Дзікім паляванні". Я вырашыў вярнуцца да тэмы, трымаючы ў галаве тое, што балота і Беларусь – гэта вельмі блізкія з'явы» [1]. І. Мележ не толькі ва ўсёй паўнаце і цэласнасці аднавіў традыцыйны свет Палесся, але і паказаў пачатак разбурэння гэтага ўладкаванага сялянскага светабыцця, як сацыяльны гвалт над вяскоўцамі пераходзіць у маральна-этычную плоскасць, запускае працэсы агульнай дэградацыі, вынікам якой праз некалькі пакаленняў сталіся героі-маргіналы рамана «Сфагнум», маладыя хлопцы з завадскіх ускраін, разгубленыя, дэзарыентаваныя, без адчування каранёў і перспектывы дзеці ўчарашніх вяскоўцаў. Сацыяльны гвалт нарадзіў сацыяльнае балота, і беларускі прыродны ландшафт падаецца своеасаблівым сінонімам сучаснаму беларускаму сацыяльнаму ландшафту.

В. Марціновіч выкарыстоўвае, мабыць, самы нацыянальны беларускі архетып – балота, якое пэўным чынам зліваецца з беларускай ідэнтычнасцю. Мастацкая літаратура традыцыйна звяртаецца да тэмы балота і беларусаў як людзей на балоце, калі імкнецца канцэптуальна патлумачыць спецыфіку беларускай гісторыі, грамадства, культуры, сам «дух нацыі». Балота называюць своеасаблівым кодам, з дапамогай якога можна зразумець асаблівасць беларускага менталітэту, размытасць і неакрэсленасць нацыянальнага характару, інтравертнасць і ірацыяналізм, кансерватызм і разам з тым

непастаянства, тую «ліючую форму», пра якую пісаў І. Абдзіраловіч. Актуалізацыя нацыянальнага архетыпа балота ў рамане В. Марціновіча пралягае ў розных плоскасцях – сацыяльнай, міфалагічнай, філасофскай.

В. Марціновіч падкрэсліваў, што твор адрасаваны перадусім беларусам, таму што беларусы пабачаць там усё тое, што не пабачаць расіяне. У першую чаргу гэта спецыфічна беларуская міфалогія балота. Балота ў нацыянальнай культурнай прасторы разглядаюць як хтанічную першааснову Беларусі. Згодна з беларускай міфалогіяй, балота ў рамане В. Марціновіча паказваецца як трансцэдэнтная рэчаіснасць. У яго свае насельнікі: вядзьмак, сябрукі-крумкачы, а недзе ў цэнтры балота, у бяздонным возеры, атабарыўся цмок, якога хлопцы, пятляючы па балоце, не бачаць, але чуюць. Як балота ўтрымлівае ў сябе архетып глыбіні, так і ў свядомасці мясцовых жыхароў прысутнічае вертыкаль, якая вядзе да захавання пракаветных сакральных, містычных уяўленняў пра свет. Гарадскім хлопцам, якія даўно адарваліся ад сваіх каранёў, неверагоднымі падаюцца старажытныя замовы, галашэнні, незвычайны складаны крыж, якім жагнаецца старая паляшучка, наяўнасць у рэальным жыцці цмокаў, жанчын-русалак, усе гэтыя элементы прота-культуры, з якімі ім даводзіцца сустракацца ў правінцыі і якія цалкам рэальна ўплываюць на іх лёс.

Разважанні над назвай твора паступова пераводзіць гаворку на філасофскі ўзровень. Сфагнум – першаэлемент балота і па-сутнасці ўсё балота – суцэльны сфагнум, толькі ў розных стадыях існавання. «Тут з яго ўсё складаецца, гляньце пад ногі: купіны, торф пад нагамі – усё сфагнум. Купіна – жывы сфагнум, торф – перагнілы. Вадзіца гэта чорная – таксама сфагнум у рознай ступені раскладання… Сфагнум – лекі, сфагнум – паветра, сфагнум – агонь, сфагнум – зямля пад нагамі», – кажа тутэйшы балотны жыхар [2, с. 221–222]. Так у раман уваходзіць універсальны матыў бясконцага пераўтварэння, захавання балансу і раўнавагі свету. Усе, што калісьці жыло і існавала, немінуча раскладаецца на першаэлементы – аснову далейшых пераўтварэнняў. Думка, што ўсё існуючае мае шанец потым паўтарыцца ў новым абліччы і новай якасці, вяртае да міфалагічных поглядаў на балота як першаматэрыял, з якога створаны навакольны свет. Матыў пераўтварэння спалучаецца з матывам пераходу. «Сабраўся ў дарогу», так у вёсцы гавораць пра тых, хто сабраўся адыходзіць з гэтага свету. Смерць як пераўтварэнне, пераход з аднаго стану ў іншы з’яўляецца неабходным механізмам вечнасці. Такім чынам, балота ўспрымаецца ўвасабленнем законаў вечнабыту.

Марціновіч творча працуе з універсальнымі катэгорыямі часу і прасторы, падпарадкоўваючы іх беларускім міфапаэтычным уяўленням. Адметна выкарыстаны ў рамане архетып дома. Гэта спусцелая дзедава хата ў вёсцы, куды на схоў прывёў сваіх сябрукоў Шульга, адзін з найбольш поўна выпісаных герояў рамана. Тут у ім нібыта абуджаецца той самы «голас продкаў». Хлопец адразу «перамяніўся і выглядаў цяпер не на мазурыка-пачаткоўца з няўцямным мінулым і яшчэ менш уцямнай будучыняй, а на маладога гаспадара, чалавека зямлі, душэўнага хлопца. З гонарам ён кажа: Ну так, гэта мая зямля». Дом, паказаны як жывая істота з цёплымі навобмацак

бярвеннямі, «нібыта ўсё яшчэ дыхаў, усё яшчэ не пакідаў надзеі жыць» [2, с. 301]. Праз архетып дому закладзены матыў магчымага вяртання да першавытокаў, да сваёй чалавечай існасці, шанец, які аўтар хочацца пакінуць герою. Некалькі разоў рытмічна паўтараецца ў рамане адна і тая ж насталь-гічная дэталь: дзверы пакінутых вясковых дамоў зачыненыя не на замок, а на клямку. Па вясковых звычаях гэта азначае, што «гаспадара дома няма, але ён недзе паблізу. Яго можна даклікацца, калі пакрычаць як след» [2, с. 304].

Актуальнасцю ў сённяшнім культурна-нацыянальным кантэксце вызна-чаецца раман Віктара Марціновіча «Мова» (2014). Чаму і гэты, вельмі нацыянальны раман, таксама выйшаў у двух моўных версіях, Марціновіч патлумачыў: «У гэткіх умовах – два варыянты: адварочвацца ад суайчын-нікаў, чакаць, пакуль яны прачнуцца ці будзіць іх, спрабаваць дагрукацца на той мове, якую яны пакуль лічаць “сваёй”» [3]. У гэтым плане ідэйная скіраванасць рамана «Мова» адсылае чытача да будзіцельскага пафасу «нашаніўства». Твор адметны арыгінальнасцю аўтарскай ідэі і нетрывіяль-ным мастацкім вырашэннем традыцыйнай і вельмі балючай для беларускай літаратуры тэмы: ролі мовы ў самавызначэнні і самазахаванні нацыі. «У “Мове” я паспрабаваў сабраць у незвычайным сюжэце маё разуменне багажу праблем, звязаных з нашай ідэнтычнасцю, з культурай, мовай і гісторыяй. З тутэйшасцю, з правінцыйнасцю, з гатоўнасцю адмовіцца ад свайго», – кажа аўтар [3]. Найважнейшыя пытанні нацыянальнай экзістэнцыі аўтар схаваў пад абліччам лінгвістычнага баевіка, але, як слушна заўважылі крытыкі, на самой справе раман належыць да сацыяльнай фантастыкі, да жанру сацыяльнай антыўтопіі і перагукаецца з класічнымі антыўтопіямі О. Хакслі «О дзіўны новы свет» і «451 градус па Фарэнгейту» Р. Брэдберы.

Падзеі рамана адбываюцца ў 4741 годзе па кітайскім календары ў Мінску, які знаходзіцца на ўскрайку квітнеючай Расейска-Кітайскай дзяр-жавы. У гэтай дзяржавы ёсць вораг, супраць якога змагаецца ўсемагутны Дзяржнаркакантроль, і вораг гэты – мова. Яна абвешчана «моцным несубсты-ваваным наркотыкам», за ўжыванне якога пагражае дзесяць гадоў строгага рэжыму, а за распаўсюд – смяротная кара. Мова, па словах аўтара – галоўны герой рамана, яго галоўны «несубстываваны» персанаж. Для адных мова – дзяржаўны вораг, для другіх – сродак нажывы, для джанкі яна – магчымасць адчуць неверагодныя эмоцыі. Для беларускамоўных маргіналаў, якія жывуць і дзейнічаюць у падполлі, мова і Беларусь – сэнс жыцця. Іх мэта – сабраць ацалелыя фрагменты беларускіх тэкстаў, аднавіць лексічны склад і такім чынам па рэштках рэканструяваць мову.

Раман выконвае функцыю сацыяльнага папярэджання і малюе буду-чыню, якая цалкам магчымая па логіцы далейшага развіцця сённяшняга грамадства. Духоўная дэградацыя і страта мовы ішлі побач. Атрымалася шчаслівае ў сваёй духоўнай непрасветленасці грамадства спажывання, дзе няма ні Беларусі, ні беларусаў, ні мовы. Ад яе засталіся толькі фрагменты тэкстаў, прычым наркатычнае ўздзеянне яны маюць выключна на тутэйшых. В. Марціновіч прымушае герояў кайфаваць з тэкстаў Л. Геніюш, У. Жылкі,

С. Пільштыновай, А. Мрыя, якія выклікаюць у спажыўцоў эмацыянальны выбух, асацыятыўныя відзяжы, шмат цытуе Шэкспіра ў пералажэнні У. Дубоўкі.

Якім чынам адбылася страта Беларусі? Гістарычныя рэфлексіі адной з гераінь спраектаваны на сённяшнія рэаліі: «Была краіна. Прыгожая краіна. Была гісторыя. Гісторыя ваяроў ды волатаў... Была культура. Культура, якой больш няма… Была мова… Усяго гэтага болей няма. За мову спачатку сталі браць на вуліцах… Калі міліцыянты чулі, што чалавек размаўляе не па-руску, падыходзілі ды забіралі… «Махаў рукамі, лаяўся матам» – пазначалася ў судовых выраках. Потым закрылі навучанне на мове. Потым абвясцілі яе наркотыкам і знішчылі ўсе кніжкі» [4, с. 107]. Але мова валодае незвычайным запасам трываласці і з'яўляецца больш, чым проста сродкам камунікацыі. У працяг традыцый структуралізму мова разглядаецца А. Марціновічам як код, у адпаведнасці з якім структуравана бессвядомае, і таму і «кайф ад яе ўзнікне сам сабою», ад сутыкнення падсвядомасці з той матрыцай, паводле якой яна арганізавана. Мова з'яўляецца небяспечным ворагам таталітарнай дзяржавы, скіраванай на ўніфікацыю і стандартызацыю, бо абуджае тыя пласты ірацыянальнага падсвядомага, якія непадуладны дзяржаўным забаронам, і на ўзроўні геннай памяці абуджае згадкі пра нацыянальную ідэнтычнасць, правакуе непажаданы выбух эмоцый, відзяжоў з гістарычнай спадчыны, прымушае адчуваць кайф ад беларускіх слоў і «наркатычных гукаў» – «дз», «дж», «ў», або рабіць агаворкі, як кажуць, па Фрэйду: у мужчынскім родзе «сабачка», «подпіс», «медаль» і іншыя «абмовачкі».

Твор В. Марціновіча плённа ўзаемадзейнічае з літаратурнай спадчынай. Па-першае, ён апелюе да вядомай кожнаму школьніку тэзы Ф. Багушэвіча «Не пакідайце мовы беларускай, каб не ўмерлі!.. Гаворка, язык і ёсць адзежа душы». Па-другое раман можна лічыць разгорнутай алюзіяй на скразны матыў паэзіі Янкі Купалы: тутэйшыя – гэта беларусы на ўзроўні падсвядомасці, бо так сталася, што на ўзроўні свядомасці, лагічных каштоўнасных арыенціраў ані згадкі пра Беларусь не засталося. Прысутнасць гэтага матыву можна ўбачыць, напрыклад, у купалаўскім вершы «Суды», дзе Беларусь-пакутніца «Чуць жывая жыве, пазабытая, // У сне з'яўляючысь родным сынам» [5, с. 21]. Або сустрэць у радках верша «О так! Я пралетар!..» – «Мне бацькаўшчынай цэлы свет, // Ад родных ніў я адвярнуўся. // Адно, не збыў яшчэ ўсіх бед: // Мне сняцца сны аб Беларусі!» [6, с. 124].

Як кожны пісьменнік эпохі постмадэрну, В. Марціновіч «асуджаны» на выяўленне катастрафізму, які стаў галоўнай прыкметай сучаснага мыслення. Шчаслівага вырашэння сюжэту ў пісьменніка няма. Калі мова – код, то яго можна ўзламаць, што і робіць Дзяржнаркакантроль, прадаўшы па дэмпінгавых коштах тысячы тэкставых скруткаў з псіхалінгвістычнымі патэрнамі. Яны ўзарвалі лексічную і граматычную структуры мовы, замяніўшы яе выпадковымі камбінацыямі сімвалаў, і такім чынам перафармаціравалі свядомасць. Той, хто валодаў мовай, страчвае магчымасць размаўляць на ёй.

Канцоўка рамана песімістычная, але тым не менш неадназначная. Аўтарскае разуменне нацыянальнага беларускага характару транслюецца праз кітайца Чу Ліня, які курыруе распаўсюджанне мовы-наркотыка. Ён не надта шануе беларусаў за іх залішнюю паслухмянасць і пасіўнасць у пераломныя моманты гісторыі, але разам з тым адзначае і парадаксальную трываласць, якая пераходзіць межы фармальнай логікі: «Там, дзе вас крыўдзяць, дзе трэба загінуць ці забіць таго, хто вас зняважыў, вы проста сыходзіце, заміраеце, думаеце, што трэба перачакаць… Вы – не людзі, вы вада!.. Хапаеш вас, спрабуеш утрымаць, а вы праходзіце скрозь пальцы… Ваду немагчыма зніштожыць!.. Немцы, рускія, саветы, кітайцы – усе спрабавалі з вамі ваяваць. Павынішчалі найлепшых. Падумалі, што перамаглі. А вадзе не патрэбныя героі. Супраціў вады – у яе прыродзе» [4, с. 90]. Бачыцца тут спасылка на неўміручасць беларускага балота, непераможнасць вады, узгвадваецца тая «ліючая форма», пра якую казаў І. Абдзіраловіч.

Нягледзячы на скіраванасць да балючай нацыянальнай праблемы, твор Марціновіча атрымаўся надзіва ўніверсальны. Як заўважыў адзін з крытыкаў, яго можна перарабіць пад кожную канкрэтную краіну з захаваннем атмасферы арыгіналу. Дзеянне рамана можна перанесці, прыкладам, у Іспанію, і ў якасці «наркотыка» выкарыстаць, напрыклад, каталонскую мову: «Твор можна трансліраваць на любую мову, якой пагражае выміранне» [7].

Віктар Марціновіч свядома ідэнтыфікуе сябе як прадстаўніка беларускай літаратуры і яе перспектывы бачыць ў неаднароднасці сусветнага культурна-літаратурнага кантэксту, дзе небяспечныя працэсы глабалізацыі і ўніфікацыі, якія вядуць да стварэння наднацыянальнай культуры, нараджаюць і супрацьлеглую з’яву – рост цікавасці да літаратур так званых «малых народаў», іх новае адкрыццё светам. «Часцяком чуеш, што на мове пішуць выключна тыя, хто імкнецца “замкнуцца” ў “гета”, што беларускамоўныя творы – “правінцыйныя”, а рускамоўныя – “інтэрнацыянальныя”, бо вымушаныя вытрымліваць канкурэнцыю з вялікім светам Рускага Слова. Але гэта ўжо не сучасны падыход. Справа ў тым, што, глабалізаваўшыся, свет імкнецца сёння шукаць вялікія тэксты *ad marginem* – па ўскрайках. Англійская мова ўніфікавала чытача, стварыла такі ж “еўрапейскі” стандарт у раманах, які існуе ў ежы, вопратцы, шопінгу. Усе, хто вытыркаецца з гэтага стандарту, усе, хто жыве ў сваім невялічкім магічным свеце, робяцца найбольш цікавымі: гэтым тлумачыцца колішні ўзлёт лацінаамерыканскай літаратуры, цікаўнасць да сербаў ды ўвогуле Балканаў, феномен папулярнасці палякаў ды ўкраінцаў. Таму слоган тут такі: хочаш быць інтэрнацыянальным — пішы па-свойму» [8].

Паслядоўнае двухмоўе ў творчым самавыяўленні В. Марціновіч тлумачыць імкненнем пераадолець моўна-культурны раскол грамадства, жаданнем паспрыяць яго салідарызацыі і вяртанню ў агульнае нацыянальнае рэчышча: «Мне здаецца, гэта адзіны спосаб дагрукацца да земляка-чытача, з яго моўным, платформавым і светапоглядным расколам суб’екта» [1]. Такім чынам, пісьменнік надзяляе ўласны білінгвізм кансалідуючай функцыяй,

імкненнем у новых палітычных і культурных рэаліях уздзейнічаць на нацыянальную свядомасць, якая ў большасці па-ранейшаму знаходзіцца ў стане летаргіі.

Звычайна аўтар у працэсе свайго творчага сталення праходзіць шлях ад індывідуальнага і нацыянальнага да агульначалавечага і ўніверсальнага. Аналіз ідэйна-тэматычнай і вобразнай спецыфікі твораў В. Марціновіча, яго шматлікіх інтэрв'ю і выказванняў у інтэрнэт-прасторы дае падставу сцвярджаць, што як пісьменнік ён рухаецца ў супрацьлеглым напрамку – ад універсальнага да ўсё больш нацыянальна-адметнага, беларускага, і гэты нацыянальны складнік з твора ў твор набірае ўсё большую ўдзельную вагу. Пры гэтым нацыянальнае ў творах В. Марціновіча атрымліваецца сугучным агульначалавечым праблемам, што забяспечвае цікавасць да яго твораў як айчыннага, так і замежнага чытача.

ЛІТАРАТУРА

1. *Марціновіч, В*. Мой новы раман – «Людзі на балоце-3» / В. Марціновіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http nn.byc=ar&i=110414. – Дата доступу : 31.03.14.
2. *Марціновіч, В.* Сфагнум : раман / В. Марціновіч ; пер В. Рыжкова. – Мінск : Кнігазбор, 2013. – 320 с.
3. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://nn.by/?c=ar&i=134719& lang=ru. – Дата доступу : 30.10.2016.
4. *Марціновіч, В.* Мова : раман / В. Марціновіч ; пер Л. Міхеевай. –Мінск : Кнігазбор, 2014. – 264 с.
5. *Купала, Я.* Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1997. – Т. 3 : Вершы, пераклады. – 342 с.
6. *Купала, Я.* Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1997. – Т. 4 : Вершы, пераклады – 446 с.
7. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://delaemvmeste.by/ martinovich/ – Дата доступу : 20.10.2016.
8. *Марціновіч, В*. Ці «сялянская» мова наша / В. Марціновіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://budzma.org/news/viktar-marcinovich-ci-syalyanskaya-mova-nashaya.html. – Дата доступу : 2.09.2016.

А. В. Карнацкая (г. Мінск)

САМАІДЭНТЫФІКАЦЫЯ ЯК АСНОВА МАДЭЛЯВАННЯ АКСІЯЛАГІЧНАЙ КАРЦІНЫ СВЕТУ Ў АПОВЕСЦІ У. СЦЯПАНА «ДЗЕД»

Самаідэнтыфікацыя з'яўляецца неабходнай умовай паўнавартаснай сацыялізацыі чалавека. Пытанне самаідэнтыфікацыі асабліва актуалізуецца ў пераломныя моманты жыцця асобы ці цэлага грамадства. У такі час у людзей ёсць моцная патрэба ў асэнсаванні сябе, сваёй індывідуальнасці

і асабістага месца ў свеце, сваёй культурнай ці нацыянальнай прыналежнасці. Творчыя асобы адчуваюць гэта асабліва абвостраna і нярэдка робяць прадметам асэнсавання ва ўласнай творчасці. Асэнсаванне чалавекам самога сябе, свайго ўнутранага свету з'яўляецца неабходным пры яго станаўленні і развіцці.

У сусветнай літаратуры нямала таленавітых твораў прысвечана праблеме самаідэнтыфікацыі, у якіх шматгранна, глыбока, псіхалагічна дакладна адлюстраваны працэс самапазнання асобы, самавызначэння, сацыялізацыі, інкультурацыі; выяўлены тыя фактары, якія аказалі на асобу найбольшы ўплыў, вызначылі яе светапоглядныя прыярытэты. Асаблівае месца ў адлюстраванні працэсу самаідэнтыфікацыі асобы належыць аўтабіяграфічнай прозе, якая па вызначэнні арыентуецца на самаасэнсаванне пісьменніка. Менавіта даследаванне аўтабіяграфічнай прозы дазваляе найбольш аб'ектыўна ўсвядоміць псіхалогію творчасці, этапы творчай эвалюцыі, шляхі станаўлення, працэсы сацыялізацыі і самаідэнтыфікацыі аўтара, а таксама агульную сістэму яго аксіялагічных каардынат і светапоглядных прыярытэтаў.

Пад *самаідэнтыфікацыяй* у розных галінах навукі (псіхалогіі, філасофіі, сацыялогіі) звычайна разумеюць самапазнанне асобы, самавызначэнне, фарміраванне персанальнай ідэнтычнасці, унутраную аснову асобы, а таксама атаясамленне сябе з пэўнай сацыяльнай групай. Гэты працэс абумоўлены ўплывам эканамічных, палітычных, сацыяльных фактараў, а таксама нацыянальна-культурным самавызначэннем грамадства, да якога належыць асоба [1, с. 12].

Самаідэнтыфікацыя – адзін з ключавых момантаў у фарміраванні асобы, паколькі ступень і накіраванасць самавызначэння індывіда ў канкрэтным соцыуме ўплывае на фарміраванне яго каштоўнасных установак і жыццёвых стратэгій, інакш кажучы, з'яўляецца асновай мадэлявання аксіялагічнай карціны свету. У аксіялагічную карціну свету ўваходзяць такія важныя паняцці, як сістэма маральных і культурных каштоўнасцей, этычных норм і правіл паводзін. Каштоўнасці з'яўляюцца базавымі, найбольш агульнымі адзінкамі аксіялагічнай карціны свету. «…Каштоўнасныя арыентацыі, з'яўляючыся найважнейшым элементам унутранай структуры індывіда, выступаюць падставай яго ідэнтыфікацыйных стратэгій» [2, с. 215]. Пры дапамозе каштоўнасцей індывід рэгулюе свае паводзіны і дзейнасць. У гэтай сітуацыі каштоўнасці служаць асэнсаваным нарматыўным зместам самаідэнтыфікацыі.

У працы «Сем вандровак у структуру свядомасці» псіхолагам М. А. Шчарбаковым выдзяляюцца і аналізуюцца сем узроўняў самаідэнтыфікацыі: сацыяльна-прафесійны («я – інжынер»), сямейна-кланавы («я – сын»), нацыянальна-тэрытарыяльны («я – беларус»), рэлігійна-ідэалагічны («я – дэмакрат», «я – мусульманін»), эвалюцыйна-відавы («я – чалавек»), полавы («я – мужчына»), духоўны (узровень не вызначаецца пэўным вербальным сцверджаннем, бо гэта комплекс адчуванняў, светаўспрыняцця, сістэмы каштоўнасцей) [3, с. 91–95]. Кожны чалавек можа актуалізаваць адначасова адзін або адразу некалькі ўзроўняў самаідэнтыфікацыі.

Аўтабіяграфічная аповесць Уладзіміра Сцяпана «Дзед» кампазіцыйна складаецца з мініяцюр, непаслядоўных адносна храналогіі падзей і адрозных паводле праблемна-тэматычных абсягаў. Кожная мініяцюра мае сваю назву і ўтрымлівае апісанне асобнага факта ці эпізоду з жыцця аўтара-апавядальніка альбо некаторых яго родных ці блізкіх. Твор ахоплівае пэўнае кола праблем (датычнае ўплыву на светаасэнсаванне персанажа і яго маральнае станаўленне), даволі акрэслены перыяд жыцця героя (дзіцячыя і юнацкія гады), не мае моцна разгалінаванай сюжэтнай структуры (але выяўляе тыя сітуацыйныя моманты, якія адыгралі вызначальную ролю ў фарміраванні яго каштоўнасных арыенціраў).

Галоўны герой аповесці – чалавек, якому аўтар адводзіць цэнтральнае месца і ў творы, і ў сваім рэальным жыцці, хто больш за іншых, на думку аўтара, паўплываў на яго станаўленне як асобы, творцы і індывідуальнасці – дзед пісьменніка. У. Сцяпан з адчувальным гонарам у інтанальнасці аповеду адзначае: «Мяне назвалі па дзеду». І дадае: «Памятаю свайго дзеда Уладзіміра добра. Ён памёр, калі мне ішоў дваццаць першы год» [4, с. 199]. Пісьменнік такім чынам падкрэслівае, што дзед быў поруч з ім на працягу самых важных перыядаў у фарміраванні асобы – дзяцінства, падлеткавых гадоў, юнацтва.

Шмат у якіх мініяцюрах Уладзімір Сцяпан падкрэслівае, што на яго сацыяльна-прафесійную самаідэнтыфікацыю (у прыватнасці на выбар прафесійнай дзейнасці) паўплываў менавіта дзед. Так, напрыклад, аўтар адзначае, што дзед «ставіўся да кніжак і малявання з павагай неверагоднай». І тут жа піша: «Ён навучыў мяне касіць, кляпаць касу і гайстрыць яе шурпатай мянташкай. Пілаваць і калоць дровы, араць і скарадзіць, вадзіць каня і хадзіць за плугам, запрагаць і выпрагаць каня, правільна валіць дрэва, так, каб яно не захрасла і не паламала іншыя, меншыя. Ён цярпліва паказваў і тлумачыў, як і што павінен рабіць мужчына» [Там жа, с. 199–200]. Здавалася б, кніжкі і маляванне – гэта адно, а цяжкая сялянская праца – зусім іншае. Чаму ж пісьменнік аб’ядноўвае ўсё ў адзін шэраг? Думаецца, тым самым аўтар падкрэслівае сутнасць мудрай народнай педагогікі: навучышся руплівасці і сумленнасці – гэта будзе ўласціва табе ва ўсіх відах дзейнасці.

Дзед з павагай ставіўся да кніг і захаплення ўнука імі, што, безумоўна, магло паспрыяць далейшаму выбару прафесійнай дзейнасці Уладзіміра Сцяпана – пісьменніцкай. Непарыўна з прафесійным ідзе моўны кампанент: для Уладзіміра Сцяпана не паўставала пытанне, на якой мове займацца творчасцю, бо беларуская мова натуральна з дзяцінства ўвайшла ў яго ўжытак, а значыць, павінна была стаць і сродкам прафесійнай дзейнасці. І хоць па прафесіі Уладзімір стаў мастаком, але і пісьменніцкае прызванне не змагло застацца схаваным унутры творцы: ён займаецца пісьменніцкай і журналісцкай дзейнасцю. Цікава, што ў творы аўтар (акрамя падзагалоўка «акварэльныя малюнкі») не закранае тэму сваёй адукацыі мастака, не паказвае, якім чынам прыйшоў да гэтага выбару.

Правамерна таксама адзначыць, што дзякуючы дзеду пісьменнік свядома ідэнтыфікаваў сваю нацыянальную прыналежнасць, адчуў крэўную повязь з зямлёй, на якой быў узгадаваны і якую шчыра палюбіў. Дзякуючы дзеду адбылася яго нацыянальна-тэрытарыяльная самаідэнтыфікацыя. Пісьменнік па-мастацку вытлумачвае, што менавіта дзед адкрыў яму прыгажосць беларускіх краявідаў і навучыў атрымліваць асалоду ад працы, прышчапіў павагу да народных традыцый і любоў да нацыянальнай мовы: «Я забыўся тысячы родных слоў. Тых, прамоўленых дзедам доўгімі восеньскімі вечарамі, летнімі днямі на палявых і лясных дарогах. Шкадую, што няўважліва слухаў, што не запісваў, што не збярог… Але ведаю, што многія згадаю, калі вазьму ў руку ці дакрануся позіркам: да травінкі, да дрэва, да кавалка цагліны, ці прысню або пакаштую… І тады я зноў пачую голас свайго дзеда» [4, с. 200].

Калі выдзяляць сямейна-кланавы ўзровень самаідэнтыфікацыі, то можна адзначыць, што з дзедам У. Сцяпана звязвалі глыбокія крэўныя сувязі. Ён ідэнтыфікаваў сябе як унука, які мае ў асобе дзеда апору і падтрымку для любых пачынанняў, а таксама першага настаўніка, крытыка і памочніка. Гэта дапамагло герою развіць самаідэнтыфікацыйны ўзровень і пачаць задумвацца аб сваёй новай ролі ў сям'і, аб тым часе, калі ён сам стане дзедам. Такім чынам, дзед пісьменніка заклаў у душу юнака глыбокае і трывалае разуменне значнасці сямейных сувязей, разуменне ролі мужчыны ў сямейным асяродку.

Палавы (гендарны) узровень самаідэнтыфікацыі адыграў вельмі важную ролю для развіцця юнака. Сталы мужчына навучыў маленькага хлопчыка не толькі пэўным відам сялянскай працы, але галоўнае – навучыў адказнасці, руплівасці.

У творы амаль не закранаецца духоўны і рэлігійна-ідэалагічны ўзроўні самаідэнтыфікацыі. Аўтар распавядае, што ў хаце бабулі і дзядулі віселі тры абразы, аднак ніколі не ўдакладняе, якім чынам сам дзед вызначаў сваю духоўнасць ці рэлігійную прыналежнасць. Толькі ў адной мініяцюры чытаем: «Ні дзед, ні баба маліцца мяне не вучылі. У маладыя гады дзед спяваў у царкоўным хоры. Аднойчы ён расказаў доўгую малітву. Тое было, калі я хварэў» [Там жа, с. 205]. У сувязі з гэтым складана вызначыць ступень духоўнасці і рэлігійнага самавызначэння самога пісьменніка.

Эвалюцыйна-відавы ўзровень самаідэнтыфікацыі закладзены ў чалавеку ад нараджэння, таму па змоўчанні прыкладаецца да аўтара: ён без сумненняў адчувае сябе чалавекам, таму дадзены ўзровень самаідэнтыфікацыі непасрэдна не разглядаецца ў творы.

Такім чынам, у творы па-мастацку адлюстравана, з дапамогай чаго і на якіх узроўнях у дзіцячыя і юнацкія гады адбывалася самаідэнтыфікацыя будучага пісьменніка. Гэты працэс мае чатыры узроўні: сацыяльна-прафесійны, сямейна-кланавы, нацыянальна-тэрытарыяльны і палавы. Варта адзначыць, што своеасаблівым каталізатарам на ўсіх узроўнях самаідэнтыфікацыі быў дзед пісьменніка.

Са смерцю завяршылася фізічнае жыццё дзеда Уладзіміра як чалавека, але жыццё дзеда Уладзіміра як асобы, якая аказала вялікі ўплыў на юнака, паспрыяла яго самаідэнтыфікацыі, фарміраванню маральна-этычных каштоўнасцей, працягваецца ў памяці Уладзіміра Сцяпана і ў гэтай аповесці. Асоба гэта ажывае кожны раз, як узгадвае ўнук дзедаву навуку, якая адаслала яго ў вялікае жыццё.

ЛІТАРАТУРА

1. Большой психологический словарь // сост. Б. Г. Мещеряков, В. П. Зинченко. – Олма-пресс, 2004. – 639 с.
2. *Вильданов, Х. С.* Национальные ценности в структуре этнокультурной и национальной самоидентификации индивида / Х. С. Вильданов // Фундаментальные исследования. – 2014. – № 9. – С. 214–218.
3. *Щербаков, М. А.* 7 путешествий в структуру сознания (теория и практика развития личности) // М. А. Щербаков. – М.: Ин-т развития личности, 1998. – 304 с.
4. *Сцяпан, У. А.* Адна капейка : кніга прозы // У. А. Сцяпан. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2012. – 224 с.

Л. В. Первушина (Минск)

«СВОЕ» И «ЧУЖОЕ» КАК ОТРАЖЕНИЕ НАЦИОНАЛЬНОЙ САМОИДЕНТИФИКАЦИИ В ЭМИГРАНТСКОМ ТВОРЧЕСТВЕ Н. АРСЕНЬЕВОЙ АМЕРИКАНСКОГО ПЕРИОДА

В быстро меняющемся глобализованном сверхиндустриальном мире, в условиях неуклонно интенсифицирующихся миграционных/эмиграционных/иммиграционных потоков большое значение приобретает процесс осмысления каждым человеком своей расовой, национальной и этнической принадлежности. С одной стороны, современные тенденции к взаимопересечению и взаимопроникновению различных культур способствуют гибридизации, креолизации и возникновению новых национально-этнических образований. С другой же, особую важность приобретает сохранение отдельных культур, их этно-культурного колорита и национального самосознания. Отождествление «себя» с определенной этнокультурной или национальной группой является важным фактором становления личности, поэтому вопросы национальной самоидентификации занимают значимое место в философии, культурологии, психологии и литературе последних десятилетий XX – начале XXI века. Одним из принципов постижения мира и «одним из наиболее значимых гносеологических инструментов, определяющих специфику межкультурного взаимодействия», являются философские категории «свой» – «чужой» [1, с. 117]. На этой основе формируется концепт культуры

всеобъемлющего, универсального характера: «противопоставление “свои” – “чужие” в разных видах пронизывает всю культуру и является одним из главных концептов всякого коллективного, массового, народного, национального мироощущения» [2, с. 165].

Особенно отчетливо бинарная оппозиция «свой» – «чужой» представлена в литературе эмиграции. Сопоставление «своего» (т.е. изначально данной человеку культуры) и «чужого» (т.е. особенностей культуры новой страны проживания) позволяет более глубоко раскрыть особое историко-культурное, социальное и психо-эмоциональное наполнение произведений, созданных в противоречивой по своему содержанию среде нового общества, где трансформации подвергаются все пласты когнитивной сферы, а также сознательных и бессознательных процессов внутреннего мира личности. Известно, что философско-мировоззренческой основой творчества писателей в изгнании неизбежно становится экзистенциальный вопрос бытия, включающий два аспекта: осмысление своего отношения к родине (степень сохранения аутентичной культуры и своей национальной идентичности) и установление связей с культурой принимающей страны (степень адаптивности, преодоление межэтнических барьеров, глубина проникновения в мышление других этносов и способность формирования гибридной идентичности).

Большой интерес представляет репрезентация национальной идентичности в эмигрантской поэзии белорусской писательницы Натальи Арсеньевой (1903–1997). В данной статье рассматривается американский период ее литературной деятельности (1950–1997-х гг.) и выявляется глубоко индивидуальное восприятие автором родины и чужбины, пространства и времени, воссоздания прошлого в актуальном настоящем и устремленности в будущее. Весь творческий путь писательницы воспроизводит ее жизнь как непрерывную цепь этапов вынужденной эмиграции в разных странах в различные периоды времени. Начиная с 1980-х гг. в литературно-художественных поисках Н. Арсеньевой не наблюдается интенсивности. В то же время очевидно углубление философского и психологического содержания ее поэзии. Высокохудожественные, интеллектуально насыщенные поэтические произведения американского периода представляют серьезную аксиологическую значимость. В них раскрываются особенности процессов самоопределения культурной и национальной идентичности автора, выявляется место художественного наследия писательницы в мультикультурном и полиязычном литературном мире Америки на пересечении сложной системы культурных координат.

Художественное наследие Н. Арсеньевой отличается белорусоцентричностью, в нем очевидно сопротивление процессам ассимиляции, культурной адаптации и поглощению личности транснациональным, американским «плавильным котлом». Моделирование действительности и раскрытие внутреннего мира человека в поэзии данного периода осуществляется ею на основе четко выраженных бинарных оппозиций «свой» – «чужой», «Родина» – «чужбина», «дом» – «изгнание», которые

выявляют «территориальную, индивидуальную, историческую особенности личности» [3, с. 163], подчеркивают принадлежность к определенной культурной группе и свидетельствует о национальном своеобразии. В творчестве Н. Арсеньевой отмечается тенденция к сохранению своей этнической самоидентификации и использованию монолингвизма. Отсутствие духовной потребности стать автором-билингвом и выразить себя на языке принявшей ее страны объясняется авторской установкой писать о своей стране для своих соотечественников, для белорусов диаспоры: «А ў мяне не было чужога асяроддзя. Я жыла сярод беларусаў. Беларускае асяроддзе заўсёды было ў нашай сям'і» [4, с. 266]. Русская по национальности, «из рода тех Арсеньевых, который дал поэта Михаила Лермонтова, она всю себя отдает служению белорусского слова, народа» [5, с. 458]. Поэзия Н. Арсеньевой демонстрирует интенсивное присутствие родной культуры в реалиях принимающей страны, сохранение белорусского языка как элемента национальной идентичности, репрезентацию национального и духовного наследия белорусского народа.

Выявляя особенности своего мировосприятия и идентифицируя себя с белорусской культурой, Н. Арсеньева осознанно выбирает наиболее приемлемую для себя «аккультурационную стратегию этнической идентификации» [3, с. 160], осуществляет четкую демаркацию культур и «проводит границы своего этнокультурного пространства» [Там же, с. 164]. Писательница конструирует определенную концептуально, содержательно и художественно наполненную эстетическую территорию, которая включает в себя мощный образ-архетип ее родного «Дома», культурно-историческую память и особую духовную атмосферу той этнокультурной среды, где она воспитывалась, получала образование и взрослела. Национальная самоидентификация писательницы становится феноменом сознания, посредством которого происходит в ее творчестве автобиографическая реконструкция памяти и интенциональное восстановление эпизодов жизни, а «социальная практика переводится в плоскость ментальных образов, выражаемых в языке» [6, с. 7], что дает возможность в интеллектуальном творчестве Н. Арсеньевой восстанавливать обычаи, традиции и духовные ценности белорусского народа.

Категория *свое* в американский период ее творчества (впрочем, как и до него) представлена образами родной страны, близкой ей культуры. А категория *чужое* определяется теми негативными тенденциями, которые отчуждают от родины, трансформируют сознание и ломают жизнь человека, обрекая на вынужденное изгнание и жизнь в эмиграции. В центре философско-художественной картины мира автора – образ Родины во всей его семантической, образной и идейной наполненности. Он становится доминантной составляющей, которая объединяет все остальные образы, цементирует все творчество Н. Арсеньевой и выявляет, по словам А. Макмиллина, «вселенскую ностальгию по Беларуси» [7, p. 259]. Тема родины лейтмотивом проходит через все произведения Н. Арсеньевой, а мысли о ее трудной судьбе определяют духовные искания писательницы.

Следовательно, сопрягая «две культурные системы, культуру настоящего и будущего, т.е. культуру новой страны и культуру памяти в одну цельную модель» [8, p. 144], осмысливая «свое» на фоне «чужого», автор наполняет творчество реалиями своей страны и образами родной природы. Таким образом восстанавливается, возрождается желаемый образ дорогой ее сердцу родины. Он воспроизводится на уровне мышления, идей, проблемно-тематического комплекса и образной системы.

Необходимость покинуть Германию и искать прибежища в США, невозможность вернуться на европейский континент, напротив, еще больше отдалиться от своей земли, отражены в «трагическом настроении» [7, с. 99] и внутреннем волнении души лирической героини пейзажной лирики – маринистских стихов *На моры*, *Развітанне*, *Каб сэрца Вікінгаў мы мелі*, *Тут гэтага няма*, *Знаю* (1950–1952 гг.) и др. Мотив расставания приобретает интенсивную эмоциональную окраску, воспроизводит боль утраты и придает зримую и осязаемую определенность образам. Неизбежное определение своего «я» в новой реальности нашло свое отражение в психологически насыщенных, повторяющихся образах, основанных на столкновении и противопоставлении внутри бинарной оппозиции «свой» – «чужой». Так, безвозвратно удаляющаяся во времени и в пространстве родина представлена как «своя», родная, горячо любимая земля: *І ўсё далей сплывае ў шэрасць, у змрок той Край, дзе люба ўсё. О, Беларусь, хай так мы з верай Цябе ўдалеч панясём!* [9, с. 232]. *А Бог судзіў нам несці сны аб родным краі аж за моры!* [Там же, с. 231].

Америка же, новая земля будущего приюта, представляется страной изгнания, является «чужой», неизвестной и непознанной территорией. Она вызывает чувство недоверия, неприятия, настороженности: *О, Новы Край, будзь нам прытулкам цёплым і ўтульным, але ня Бацькаўшчынай, не!* [Там же, с. 236]. Многократно возникает экзистенциальный, философский вопрос преодоления боли разлуки и поиска смысла жизни в чужих условиях: *Як параіць сабе, Каб яшчэ раз паверыць чужыне і жыць*? [Там же, с. 237]. Ностальгические мотивы очевидны в произведениях *Куды тугу мы дзенем*?, *Хоць мы лісты*, *Вера*, *Месяц*, *Зарана* и др: *Парваліся із роднай зямлёю гужы, ды сумую па ёй я ня менш, не слабей, хоць бяжыць без сцяжын да другой карабель* [Там же, с. 237]. Со всей силой любящей души выявляется экспрессия авторского сознания в стихотворении *О, шыпшына мая, Беларусь!*: *А удару па цягліцах струн із тугою, і зь сілай нячутай: О, шыпшына мая, Беларусь, маё шчасце й пакута*! [Там же, с. 232].

В эмиграции преодолевается время и расстояние, оживает в сознании образ далекой родины, становящийся ближе и принимающий яркие, зримые очертания. Родная сторона – духовная опора, источник вдохновения и силы изгнанника на чужбине: *Мы дапаляліся і гаслі, мы зноў шугалі ў гару, зьмянялі выганы і яслі ў адным імкненні: «Беларусь!»* [9, с. 232]; *О, Беларусь, о Беларусь мая! Праз боль пякучы граць Цябе Табе, Табою!* [Там же, с. 286]. Мысли о возвращении на родину не оставляют сознание автора/лирической

героини, они прямо или опосредованно выражены в ткани поэтических произведений *Верце*, *Развітанне*: *З адною думкай: Зноў пабачыць, З ліпнёвай радасцяй Гарачай Прыльгнуць да роднае мяжы…* [10, с. 232]. В стихотворении *Майму жыццю* ностальгические переживания имеют побуждающую силу и обостряют чувства, становятся отчетливой жизненной потребностью: *Жыццё, ня шмат ужо дарогі, штораз пусцей, цямней наўкола. Дык дай мне роднага парогу даткнуць, пакуль замкнецца кола!* [9, с. 217]

Как известно, в этнических литературах «наследие и культура определенного народа представлены через этнически разделенное прошлое, мифы, фольклор, сказки или легенды и через передачу личного, семейного опыта и культурных ценностей, а не через образы мультикультурного общества и адаптацию идентичности в культуру мейнстрима» [11, p. 1046]. Национальная самоидентификация писательницы проявляет себя через воссоздание картин природы родного края (произведения *У гушчарах*, *Калоссе, Самотныя,* цикл *Прывіды*, цикл *Вясна, Лета, Восень, Зіма* и др.), через субъективную реконструкцию памятных событий (*Лістапад*, *Усіх памятаем мы*, *Малачай*, *Ліст*, *На сцежцы* и др.), через сны и мечты о родном крае (*Замала*, *Сон*, *І мне сніцца* и др.). Возникают в памяти дорогие места (Минск, Вильно, Нарочь, Случчина), воссоздаются очертания знакомых мест (произведения *Вежа*, *Завулак, Дамок*, *Сад*, *Увесну*). Интертекстуальные и интермедиальные ссылки на белорусские песни *(Туман, туман па даліне, Вараты скрыпяць, маразы чуваць* и др.) и национальные танцы позволяют более полно отразить картины жизни народа.

Америка – новая окружающая среда – определяется в поэзии Н. Арсеньевой 1950–1970-х гг. как «чужое», другое, далекое. В новом крае все реалии жизни имеют особую окраску и воспринимаются сознанием иначе: *Дзе ўздыхае адно бясплодны сухавей, дзе цішыня і то, здаецца, не такая…і чужога месца снедзь* [10, с. 146]; *Тут гэткае завуць – зіма! У нас такой зіме й назву не прыдумаць…* [10, с. 238]. Чужой берег показан как перенаселенный, душный и шумный мегаполис: *Й тут бярэ ў палон Вясна муры й сівы бетон скуголяць тармазы задыханых машын, нязграбна слізгаючыся на павароце…* [Там же, с. 238]. В новом крае душа автора/ лирической героини не может испытать подлинной полноты бытия, не в состоянии открыть себя этому миру: *Яна тут, як і мы, вандроўніца і госця* [Там же, с. 239]. А, следовательно, нет легкого, радостного и безмятежного постижения действительности: *Мне лёгка, хай ад працы Шчымяць і ныюць пальцы Доля ўжо такая Ды радасці маёй няма дзе разгуляцца, муры, муры, муры зусюль яе сціскаюць… адно каменне звоніць* [Там же, с. 239].

Опосредованный образ новой страны появляется лишь в некоторых произведениях (*Ільвы*, *Восені*, *Жаўцее ліст* и др.). И это лишь подтверждает, что «в центре собственной этнокультурной среды образ “чужого” менее эмоционален и более взвешен… Эта субъективная осознанность представляет собой континуум, на одном полюсе которого находится определенность этнической идентичности, на другом – неопределенность» [12, с. 163].

Благодарность стране, принявшей писательницу, нашла отражение только в декларативном стихотворении *Жыві! (У 200-я ўгодкі Злучанных Штатаў Амерыкі, 1976)*: *Няхай жа моц твая не гасне, а чорны дым вайны не засціць ані Твой шлях, ні зорны сцяг!* [10, с. 318].

Автор затрагивает важную проблему духовного опустошения современного высокотехнологического общества. Коммерциализация, рационализация, прагматично организованная жизнь меняют смысложизненные ценности и идеалы, а развитие новых технологий «делает людей слепыми ко всем подлинным ценностями, не оставляет времени для подлинно человеческой деятельности – мышления» [13, с. 51]. Н. Арсеньева воссоздает все ускоряющийся ритм жизни, выявляет отчуждение человека от многокрасочной действительности и его роботизацию: *Ніхто не пляскае, Бо й хто тут мае час зірнуць на Божы свет адкрытымі вачыма? Імкне натоўп. І енчаць, і вішчаць Машыны ў гоне, Міма, міма, міма…* [10, с. 239].

Иногда описание чужбины наполняется белорусскими реалиями, что ведет к определенной гибридизации, т.е. содержит *транскультурный (hybrid*) образ, сформировавшейся между двумя культурами Старого и Нового Света и наделяющийся их качествами. Так, чужой берег воспринимается как Нарочь: *Мне ж здаецца… гэта-ж Нарач, Нарач!* [9, с. 260]. Река времени, впадающая в Гудзон, напоминает реку на родине: *Імкліваю Вяльлёй пяе сівы Гудзон Мурамі Вільні таюць небасягі* [Там же, с. 287], а ветер приносит дыхание родины: *бо вецер з Гудзону сяньня нейкі зусім беларускі* [Там же, с. 270].

К категории «своего», принадлежит и такое важное качество личности, как духовность, внутренняя связь души с Божественной силой, выход за пределы своих чисто утилитарных потребностей и прикосновение к Высшему, Божественному. Духовность формирует индивидуальное сознание личности, дает силу достойно нести свой жизненный крест и заставляет признать ответственность перед судьбой. В глубоко откровенном и интенсивно личном произведении *Мой скарб* с большой силой исповедальности осмысливается опыт жизни лирической героини, который имеет значение для прошлого, настоящего и будущего. Проговариваются, артикулируются важные мысли: *Мне лёс даў, можа, болей, як каму. Жыццё мне дорыць сны блізу на кожным кроку. Што для адных нуда і каламуць – мяне пранізвае балюча і глыбока* [10, с. 247].

«Чужое» в человеке – отсутствие этой духовной связи с Божественным: *Без веры, без імкненняў сэрца – пусціня, Адцвілая, зрудзелая, сухая…* [Там же, с. 245–246].

В произведениях высокой духовной поэзии (*Радасць*, *І была там вясна*, *Каласы*, *Крыж* и др.) Н. Арсеньева раскрывает свое понимание духовного смысла человеческого существования, расширяет границы сознания и укрепляет основы своей веры. На высоком уровне философского обобщения она говорит о тех чистых Православных истоках, которые рассеивают тьму невежества и неверия, с которых начинается духовная

жизнь человека: *Каб у кожнай дарозе Бог крочыў із намі, а мы з верай нязвернаю крочылі з Ім!* [9, с. 285]. Духовное бытие является субъективной реальностью, определяющей менталитет человека и народа, возвышает личность над обыденной жизнью и придает нравственный смысл человеческой деятельности. Все эти произведения являются продолжением высокой духовной поэзии, гимна-молитвы *Магутны Божа*! *Ўладар сусьветаў* [Там же, с. 115], которому отводится «вяршыннае месца ў мастацкім шэрагу малітваў за Бацькаўшчыну» [7, с. 111].

Произведение *Крыж* (1988 г.) в художественно-эстетическом и религиозном планах связано с гимном *Магутны Божа*, в нем создается мощный художественно-эстетический образ Спасения. Автор использует богатую образно-символическую систему, вносит эмоциональный накал и трансформирует личные переживания в масштаб общезначимого: *Магутны Божа*», – *без слоў прасілі мы ўсе, а, рукі узняўшы ў выш, стаяў нязрушна на ўгорка схіле ён, гэткі родны ўжо сэрцу Крыж. Тут – дождж імгненна каменне сплямiў, рассыпаў кроплі ў траве, ў лісці… няйнакш – і Нехта дзесь там, над намі, наш Крыж вадою святой хрысціў* [10, с. 319].

Жизнь далекой родины остается важной частью национальной идентичности Н. Арсеньевой, включающей мысли и мечты о своем народе, осмысление его культурно-исторической памяти. К небесам обращается лирическая героиня в наивысшие моменты духовного подъема, вознося к ним свои просьбы о безопасности и счастливой доле белорусских людей. Именно Божественной силе она доверяет, полагается на нее, просит оградить людей от бед и ищет заступничества в определении их судьбы: *Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай краіну нашу», – маліўся хор, і ўторыў натаўп, і спелай нівай хіліўся, ветру наперакор…* [Там же, с. 319].

Одной из ужасных трагедий, последствия которой испытала белорусская земля, стала авария на Чернобыльской АЭС. Писательница внутренним взором постигла глубину горя людей, услышала звон Чернобыльского колокола и откликнулась на самую страшную катастрофу XX века, духовно поддержав всех, кто подвергся воздействию радиации, лжи, обмана, предательства. Это событие было воспринято ею как знамение, указывающее каждому человеку на его долг ответственности за собственные действия во имя будущих поколений. Свою боль она отразила в стихотворении *Чарнобыль* (1992), представив собственный вариант краткой, но емкой художественной реконструкции событий дня: *…чорны сцень…. найчарнейшы… Чарнобыль – ужо крые, накрыў іхны дзень, што з худой пастушковае жменькі хутка выпадае пужка, што ён, як і безлічы меншых маленькіх, моўчкі прыме пакутлівы скон, што узноў над маёй Беларусяй прарасце, забуяе бяда…* [Там же, с. 321].

И вновь вера в могущественную Божественную силу и надежда на восстановление жизни возникают в проникновенных словах: *…Ды лепей вазьму памалюся, Да людскага і свой боль дадам. /Божа! Божа! Адзіны ў Сусвеце, што ўсё знае, ўсё можа, зрабі ж, каб за нас не пакутвалі дзеці, не яны каб, а мы неслі крыж!* [Там же, с. 321].

Наконец, категория «свое» в творчестве Н. Арсеньевой связана с идеей раскрытия творческого потенциала человека, создания духовных ценностей, передающихся из поколения в поколение. Автор прославляет действенную силу поэтического слова и его безграничные возможности, адресует наставления будущим мастерам слова и призывает к самореализации, полному проявлению своего художественного таланта (произведения *Поэтам*, *Імкні, паэт!*, *Ціхая, Святая*, *Каб паэты маглі* и др.): *Імкні-ж паэт, разьліся ў гімнах! Дзіўны, святы ці чуеш пал?* [9, с. 225]; *Будуй, твары, ня дай душы астыць!* [Там же, с. 256].

«Чужое» – силы, вызывающие стагнацию, разрушающие вдохновение и полет мыслей, мешающие процессам полной самоактуализации и реализации креативных планов. На чужбине, в эмиграции трудно творить и расширять индивидуальные созидательные возможности человека. Поэтому необходима напряженная работа и максимальная мобилизация всех душевных усилий творческой личности, чтобы преодолеть сопротивление «чужого»: *…ужо не паляцім, каб нават мелі крылы…сканаем недзе й мы, Не шуганўшы ў сінь!* [10, с. 245]; *Мне ў залатую высь не ўзняцца, як лісты* [Там же, с. 249].

Поэтическое творчество Н. Арсеньевой 1950–1997 годов отражает собой особую модель вхождения личности эмигранта в американское общество, при которой сохраняется притяжение к своей родной культуре, а образ Родины становится все ярче и объемней. Мировоззренческая оппозиция «свое» – «чужое» является способом познания окружающего мира, выявляет особенности национальной идентификации автора и проявляется на всех уровнях творчества писательницы.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Матвеичева, Т. В.* «Свой» и «Чужой» как способ самоидентификации культуры / Т. В. Матвеичева // Грамота. – No. 8 (50). – Ч. I. – 2015. – С. 117–119.
2. *Юлдашбаев, А. Ф.* Особенности выражения концепта «свой»–«чужой» в современных англоязычных фильмах / А. Ф. Юлдашбаев // Науч. ведомости Белгород. гос. ун-та. – Сер. Гуманит. науки. – Т. 11, No. 18. – 2011. – С. 164–170.
3. *Егизарьянц, А. А.* Определение этнической идентичности мигрантов в контексте психоанализа / А. А. Егизарьянц. – Вестн. № 2 (159). – С. 159–164. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : www.vestnik-mgou.ru/Articles/Doc/6889. – Дата доступа : 05.06.2017.
4. *Прончак, Л.* Беларуская Амерыка. (Размова з Наталляй Арсенневай) / Л. Прончак – Мінск : Полымя, 1994. – 415 с.
5. *Сачанка, Б.* Пад сузор'ем сярпа і молата : аповесці, апавяданні, запісы розных гадоў / Б. Сачанка. – Мінск : Кнігазбор, 2016. – 548 с.
6. *Харченко, Е. В.* Прагмалингвистический аспект межкультурных коммуникаций. Конфликт «свое»–«чужое» в условиях глобализации / Е. В. Харченко, Л. Шкатова. «Свое» и «чужое»: Межкультурые коммуникации в полипарадигмальном аспекте / ред. Л. А. Шкатовой. – Челябинск : Челяб. гос. ун-т, 2003. – С. 5–41.

7. *McMillin, A.* Home Thoughts From Abroad: Three Belarusian Poets in Emigration /A. McMillin // Canadian-American Slavic Studies. – 1999. – V. 33, No. 2–4. – P. 253–263.
8. Wong, Sau-Ling Cynthia Immigrant Autobiography: Some Questions of Definition and Approach / American Biography: Retrospect and Prospect // ed. Paul John Eakin. – Wisconsin : the Univ. of Wisconsin Press, 1991. – P. 142–155.
9. *Савік, Л.* Пакліканыя: Літаратура беларускага замежжа / Л. Савік. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 479 с.
10. *Арсеннева, Н.* Між берагамі / Н. Арсеннева. – Нью-Ёрк : БІНІМ, 1979. – 350 с.
11. *Арсеннева, Н.* Выбраныя творы / Н. Арсеннева. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2002. – 259 с. – (Сер. 1. Мастацкая літаратура) .
12. *Mehta, P.* Identity / P. Mehta // The Greenwood Encyclopedia of Multicultural American Literature / ed. E. S. Nelson. – V. IV. – P. 1043–1047.
13. *Лоренц, К.* Вопросы философии / К. Лоренц. – 1992. – No. 3. – С. 39–52.

М. С. Рагачэўская (Мінск)

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ: ПОГЛЯД З ЗАМЕЖЖА

Імя нашай суайчынніцы, Святланы Аляксандраўны Алексіевіч, стала сінонімам свабоды, антываеннага пафасу і новай Беларусі, краіны з мала вядомай у замежжы культурнай і свядомаснай спадчынай. Пад свядомаснай спадчынай мы маем на ўвазе менталітэт, мадэлі светаўспрыняцця і светапоглядныя каштоўнасці.

Нарадзілася С. Алексіевіч у 1948 г. у горадзе Івана-Франкоўску (Украіна), а з 1950 г., пасля пераезду, жыве ў Беларусі. Пісьменніца працавала выхавацелькай Асавецкай школы-інтэрната, настаўніцай гісторыі і нямецкай мовы Белажэвіцкай сямігадовай школы Мазырскага раёна, журналістам у розных раённых і рэспубліканскіх газетах і ў часопісе «Нёман». Яна была ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны». Літаратурную ж дзейнасць Святлана Аляксандраўна пачала ў 1975 г. і піша на расейскай і беларускай мовах. На гэты момант літаратурная спадчына С. Алексіевіч змяшчае дакументальныя аповесці «У вайны – не жаночы твар» (1985), «Апошнія сведкі» (1985), «Цынкавыя хлопчыкі» (1990), «Зачараваныя смерцю» (беларус. 1993, рус. 1994), «Чарнобыльская малітва» (1997), «Час сэканд-хэнд» (2013).

Пісьменніца атрымала наступныя ўзнагароды: Прэмія Ленінскага камсамола (1986), Прэмія Курта Тухольскага (1996), Прэмія Трыумф (Расія, 1997), Прэмія Гердэра (1999), Прэмія Рэмарк (2001), Нацыянальная прэмія крытыкі (ЗША, 2006), Прэмія Angelus (2010), Узнагарода імя Капусцінскага (Польшча, 2011), Прэмія міру Нямецкага кнігагандлю (2013), яна таксама стала Афіцэрам Ганаровага ордэну мастацтваў і літаратуры Французскай Рэспублікі (2014) і Лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры (2015).

Парадаксальным з’яўляецца тое, што ўнутраны позірк (айчынныя і рускамоўныя сродкі масавай інфармацыі) на творчасць Святланы Аляксандраўны не заўсёды паглыблены, усебаковы і аб’ектыўны. Звяртаючыся да міжнароднага водгуку, які выклікалі творы С. Алексіевіч, мы ў першую чаргу скіроўваем увагу на крытычныя крыніцы на англійскай мове. Безумоўна, жыццё і творчасць пісьменніцы на Нямеччыне не засталіся незаўважанымі нямецкамоўнай крытыкай. С. Алексіевіч, па зразумелых прычынах, больш вядомая ў нашах краінах-суседках – Расіі, Украіне, Польшчы, Германіі. У дадзеным даследаванні ў цэнтры ўвагі – больш аддаленыя літаратурна-крытычныя і масмедыйныя крыніцы, погляды на творчасць С. Алексіевіч з тых краін і культур, для якіх не толькі сама аўтар, але і краіна яе грамадзянства да нядаўняга часу з’яўляліся нейкай экзатычнай з’явай.

Крытычныя водгукі, што сведчаць аб міжнародным прызнанні, можна падзяліць на тры этапы. Першы – гэта перыяд з’яўлення артыкулаў у міжнародных СМІ пераважна напрыканцы 1990-х і пачатку 2000-х гг., г. зн., да атрымання Нобелеўскай прэміі. Другі этап – падчас прыняцця рашэння Нобелеўскім камітэтам. І трэці – рэцэпцыя твораў пасля таго, як іх пераклалі на англійскую і іншыя мовы, і з імі пазнаёміліся замежныя чытачы і літаратуразнаўцы.

Можна сцвярджаць, што ўжо ў 1990-х гг. С. Алексіевіч пачала пракладваць шлях да міжнароднага прызнання праз «экалогію душы», дакладней, праз зварот да падсвядомаснага, нявыказанага, траўматычнага, да чалавечага душэўнага вопыту. На першым этапе ўжо былі перакладзены дакументальныя аповесці «У вайны – не жаночы твар» (выдадзены па-англійску ў Расіі, выдавецтва «Прагрэс») і «Цынкавыя хлопчыкі» (ЗША, перакладзены і выдадзены ў 1992 г.; перакладчыкі Джулія і Роберт Уітбі). Гэтыя ж самыя творы пазней перакладаліся нанова, з крыху зменены мі на англійскай мове назвамі.

Праваднікамі да гэтых аповесцяў служылі прадмовы, у якіх амаль адсутнічае сама асоба С. Алексіевіч. Замест падачы біяграфічных звестак пра пісьменніцу крытыкі і перакладчыкі ставілі мэтай азнаямленне сваіх чытачоў найперш з рэаліямі савецкай рэчаіснасці. Так, у сваёй прадмове Л. Хайнеман адзначае, што агульнае ўяўленне пра рэаліі Савецкага Саюза было заснавана на прапагандысцкім дыскурсе халоднай вайны. Аднак непасрэднае знаёмства з воінамі-афганцамі запэўніла аўтара ў тым, што паміж вайной амерыканскіх салдат у В’етнаме і савецкіх – у Афганістане – існавала вельмі цеснае падабенства. Разам з тым, у прадмове, якая прызначалася для англамоўнага чытача, дэталёва апісваецца, якім чынам салдаты адзначалі сваю групу крыві (таму што ў адрозненне ад амерыканцаў, гэтую інфармацыю кожны адзначаў на сваёй вопратцы ці на целе, як мог), як усе лісты з фронта падвяргаліся цэнзуры, і чаму амаль не захаваліся здымкі (каб утаіць сапраўдны стан спраў у Афганістане), як забаранялася размаўляць на гэтыя тэмы (у адрозненне ад існавання псіхааналітыкаў у ЗША, якія дапамагалі перажыць псіхалагічныя траўмы), пра цынкавыя труны і пра забарону на іх адкрыццё,

пра адсутнасць абвяшчэння прычын гібелі і г.д. [8]. У названым даволі дэталёвым аглядзе тлумачацца тыя ваенныя рэаліі, якія маглі падацца знаёмымі амерыканскаму чытачу праз параўнанне з В'етнамскай кампаніяй. Перакладчыкі твора ў сваю чаргу даюць гістарычную даведку аб падзеях, тлумачаць рэаліі, што немагчыма перакласці на англійскую мову, аднак пра саму аўтарку «Цынкавых хлопчыкаў» інфармацыя мінімальная.

Падчас працы Нобелеўскага камітэта і адразу пасля атрымання ўзнагароды С. Алексіевіч з'явіліся шмат прафесійных водгукаў, аглядаў, артыкулаў і каментароў. Яны давалі пашыраныя звесткі аб пісьменніцы, прасочвалі яе творчы шлях, цытавалі яе творы і знаёмілі чытача з інтэрв'ю. Амаль усе загалоўкі крытычных артыкулаў на англійскай мове натхняльныя, пазітыўныя, дабразычлівыя: «Чаму Нобелеўская прэмія Святлане Алексіевіч – гэта добра для літаратуры?» (Flavorwire.com), «Захавальніца памяці» («The New Yorker»), «Святлана Алексіевіч заслугоўвае заняць месца побач з Пінтэрам і Гордзімер» («The Guardian») і інш. Названыя і многія іншыя публікацыі сцвярджаюць гуманізм пісьменніцы і стварэнне ёю асаблівага новага жанру, які сцірае межы паміж журналістыкай і мастацкай літаратурай. Па словах пісьменніцы, яна працуе ў галіне дакументальнага рэпартажу, а таксама ў жанры «гісторыі пачуццяў» [3]. Даследчыкі адносяць яе кнігі да дакументальнай прозы, раманаў-араторый, раманаў-сведчанняў, калектыўных сведчанняў, эпічнага хору, дакументальных маналогаў, літаратурнай журналістыкі. Самыя яркія, выбітныя крытычныя артыкулы на англійскай мове з'явіліся ў перыяд з 8 кастрычніка 2015 г. па сакавік 2016 г. І толькі адзін загаловак на англійскай мове (расійскі медыйны сайт Russian-Insider.com) выражае цалкам негатыўны водгук.

У водгуках замежных журналістаў, пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў адзначаецца стан беларускага грамадзянства і беларуская ідэнтычнасць С. Алексіевіч, уважліва ставяцца да яе біяграфіі і грамадскай пазіцыі, яе светапогляду і разважанняў пра асабістую творчасць. Кожны аўтар пастараўся прывесці сваё разуменне падстаў, па якіх нашу суайчыннiцу ўзнагародзілі высокай прэміяй, што дазволіла і ёй, і краіне пад назвай Беларусь атрымаць сапраўднае міжнароднае прызнанне. У прамове Нобелеўскага камітэта гаворыцца, што прэмія даецца С. Алексіевіч за «паліфанічнае пісьмо», «помнік пакутам і мужнасці ў наш час» (Сара Данiус). Маша Гессэн, заснавальніца часопіса «n+1» і перакладчыца, адзначае заслугу С. Алексіевіч ў тым, што пісьменніца ставіць пад сумненне ўвесь савецкі лад, працуе толькі з «жывымі», гэта значыць, рэальна існуючымі людзьмі, што яна выкрывае гістарычныя трагедыі і іх карані, што мае справу з «маленькім» і «простым» чалавекам [6]. Філіп Гурэвіч (часопіс «The New Yorker») адзначае выдатнае спалучэнне у творах аўтаркі высокай праўды дакумента і багатага ўяўлення [7]. Джонатан Стурджон, журналіст і рэдактар, таксама аптымістычна ставіцца да прозы, якая набліжае рэчаіснасць да вымыслу [12].

У нядаўніх артыкулах, што друкуюцца амаль праз год пасля ўручэння Нобелеўскай прэміі, аўтары ўжо не лічаць неабходным тлумачыць з'явы і рэаліі савецкіх часоў. Гэты аспект цалкам страціў актуальнасць. У гэтых

артыкулах і прадмовах з’явілася тое, чаго не было ў 1990-х і пачатку 2000-х: тлумачэнне і звесткі аб тым, што такое Беларусь. Гэтыя звесткі нязменна ўтрымліваюць інфармацыю пра палітычны лад Беларусі і стаўленне Святланы Аляксандраўны да сучаснай палітыкі Расіі [5], адзначаецца і такі аспект, як «паглыбленне эмацыйнага спасціжэння Расіі падчас і пасля рападу Савецкага Саюза» [10].

На нашу думку, міжнароднае прызнанне звязана не ў апошнюю чаргу з фарміраваннем у творах С. Алексіевіч вартасці ўнутранага жыцця, «экалогіі душы», культа чалавечай годнасці. Чарговы віток цікавасці да Нобелеўскай лаўрэаткі ўзнік у сувязі з выхадам у свет новай кнігі «Час сэканд-хэнд», якую пераклала на англійскую мову Бэла Шаевіч і якая неўзабаве была ўключана ў дзесятак найлепшых кніг года, па выніках рашэння часопіса «The New Yorker». Гэтая серыя дакументальных аповесцяў атрымала новыя хвалебныя водгукі. На вокладцы прыведзены словы мноства літаратурных дзеячаў і журналістаў, сярод якіх і такі вядомы пісьменнік, як Дж. М. Кутзее, таксама Нобелеўскі лаўрэат. Ён заўважае менавіта псіхалагічную вартасць кнігі: «Гэта кніга, якая заварожвае; у ёй Святлана Алексіевіч дырыжыруе багатай сімфоніяй галасоў, якім апавядаюць свае гісторыі кахання і смерці, радасці і журбы, і ў той жа час намагаюцца зразумець сэнс дваццатага стагоддзя, такога трагічнага для іх краіны» [4]. Можна ўпэўнена сцвярджаць, што на сучасным этапе міжнародная ўвага ў нейкім сэнсе пераключаецца менавіта на эмацыйны аспект.

Вяртаючыся да кантэкстаў, у якіх пісьменніца распрацоўвае праблемы скалечанай вайной душы, узгадаем у якасці прыклада ролю ваеннай псіхіятрыі, а дакладней, яе амаль што адсутнасць, і як вынік – паказ цяжкага стану псіхічна траўмаваных вайной людзей. Як піша расійскі часопіс «Комплексная национальная безопасность», адзначаючы новы штуршок у развіцці ваеннай псіхіятрыі як асобнай галіны навукі, прычынай для гэтага паслужыла перад усім «Вялікая Айчынная вайна, калі значна ўзрасла колькасць ваеннаслужачых, якія атрымалі псіхалагічную траўму. …Для іх сталі ствараццa спецыялізаваныя аддзяленні ў прыфрантавых шпіталях, што было новаўвядзеннем у сусветнай практыцы. Трэба сказаць, вопыт рускіх атрымаў прызнанне і распаўсюджанне на Захадзе» [2]. Гэты апошні сказ – няпраўда, і доказ таму – значна больш ранняе развіццё ваеннай псіхіятрыі ў Вялікабрытаніі (на падставе навуковых распрацовак Э. Джонса і С. Уэслі ў кнізе «Ад кантузіі да ПТСР[1]: Ваенная псіхіятрыя ад 1900 г. да вайны ў Заліве»): «Згодна агульнай думцы, ваенная псіхіятрыя ў Злучаным Каралеўстве пачыналася падчас Першай сусветнай вайны» [9, с. 1]. У савецкага ж салдата нават падчас Афганскай вайны такая дапамога цалкам адсутнічала. Невыдуманыя героі дакументальна-мастацкіх аповесцей С. Алексіевіч нібыта пацвярджаюць гэта: «Тады не было ў нас гэтых псіхатэрапеўтаў. Псіхааналітыкаў. Прыбяжыш да суседкі… Да мамы» [1]. Ва ўступе да англійскага перакладу дакументальнай аповесці «Цынкавыя

[1] Посттраўматычнае стрэсавае расстройства.

хлопчыкі» Л. Хайнеман піша: «Аж да 1998 г. савецкія псіхолагі ніколі не чулі пра ПТСР, і даведаліся пра гэты сіндром толькі падчас візіта амерыканскіх псіхолагаў, спецыялістаў у вобласці пасляваеннай траўмы. Да гэтага паводзінскія парушэнні лячыліся з дапамогай медыкаментаў – так савецкая псіхіятрыя заўсёды лякавала псіхічныя расстройствы» [8, с. 13].

Пісьменніца С. Алексіевіч не магла не адзначыць цяпер ужо «негуманістычныя» адносіны да чалавека, і гэтая ідэя сустракаецца у кожным творы. Так, адзін з герояў кажа: «Было шмат звар'яцелых. Спачатку яны былі ў агульных палатах, потым іх змясцілі асобна» [1]. Месца прафесійнага псіхалагічнага дыскурса займае пласт з вобласці нявыказанага ці падаўленага, забароненага савецкай прапагандай, вынесенага ў сферу моўнага «камуфляжа», перыфразы. Траўма асацыявалася са словам «звар'яцелы» – пачварная рэдукцыя свядомасці салдата, які вярнуўся з вайны, і таго, хто не вярнуўся або пакончыў з сабою. Тыпы траўматычных станаў пісьменніца зводзіць да трох: «анямела», «алкагалізм» і «заіканне». У выніку на працягу ўсіх дыялогаў і маналогаў удзельнікаў ваенных дзеянняў, што запісала С. Алексіевіч, вымалёўваецца «аняменне» іншага парадку, што вылілася ў траўматычны «нечалавечы» дыскурс. Фраза-эўфемізм «загінуў, выконваючы інтэрнацыянальны доўг» замест «загінуў у баі» сама па сабе ператварылася ў механізм падаўлення псіхікі. У выніку, як піша Л. Хайнеман пра свой першы вопыт сустрэчы з ветэранамі Афганістана, яны паўтаралі амерыканскім псіхолагам шмат разоў, што «…ўрэшце, урэшце яны маглі гаварыць з тымі, хто іх разумеў». Аўтар далей задаецца пытаннем: «Я не мог не здзіўляцца: няўжо яны не размаўлялі са сваімі бацькамі?» [8, с. 8–9].

Вобраз вайны паўстае перш за ўсё праз знявечаныя чалавечыя целы – шок, які ніколі не пакіне свядомасць і памяць. Адзіная праўда ў век траўмы – гэта тое, што цела, а не дух становіцца каштоўнасцю, органы набываюць ідэйны змест, ахвяра цела не апраўдвае амбіцыі дзяржавы ў Афганскай вайне. Чалавек варты жыць перш за ўсё ў целе. Гэтая думка падказана абсалютным дамінаваннем вобразаў скалечанага цела, што нават не патрабуе цытавання ні з аднаго з тэкстаў, паколькі яны перанасычаныя апісаннямі параненых, трупаў, крыві, абгарэлых і пазбаўленых рук, ног, мужчынскіх органаў, зроку, нюху целаў – жывых і мёртвых.

Для многіх чытачоў твор С. Алексіевіч стаў сапраўдным адкрыццём, у поўным сэнсе слова эпіфаніяй. Менавіта таму і адбыўся так званы «суд над цынкавымі хлопчыкамі», калі некалькі напалоханых уладамі ўдзельнікаў інтэрв'ю, імёны якіх нават былі зменены, апратэставалі свае ж словы і абвінавацілі С. Алексіевіч у «паклёпе, антыпатрыятызме і ачарніцельстве». Так тады лічылі многія. Падкрэслім, што рэцэпцыя твора адразу пасля яго надрукавання і праз некалькі дзесяцігоддзяў пазней – розная. Цяпер для новых пакаленняў «Афган» – вайна бацькоў і нават дзядоў, як для нашага пакалення некалі паўставала Другая сусветная. Вастрыня прытупілася, праблемнае поле нібыта згубіла надзённасць. Нязменным застаецца толькі псіхалагізм, што мэтанакіравана пакідае адбітак на чытацкім успрыняцці.

Зробім выснову, што «экалогія душы», як яе выяўляе С. Алексіевіч, складаецца з наступных кампанентаў: псіхічная траўма, нанесеная вайной, экалагічнай катастрофай ці таталітарнай сістэмай, неабходнасць «агалашэння» траўматычнага вопыту, стварэнне «хору» з гэтых галасоў з дапамогай аўтарскага адбору, кампіляцыі, рэдагавання, украплення асабістых каментарыяў і разважанняў, стварэнне атмасферы агульнага болю душы, яе пакутаў, якія ў сваю чаргу прызваныя фарміраваць катарсіс у чытача і такім чынам «экалагізаваць» нашу свядомасць і падсвядомасць. А гэта нам бачыцца безумоўным дасягненнем на міжнародным узроўні пры напісанні літаратурнага твора. Прычына поспеху і міжнароднага прызнання, на наш погляд, не проста, як сказана ў тэксце Нобелеўскага камітэту, у «шматгалосым гучанні яе прозы і ўвекавечанні пакут і мужнасці» [11], а ў паказе «экалогіі душы», той самай, што, траўмаваная вайной і «чырвонай уладай», хварэе, як і навакольная прырода, і патрабуе ачышчэння.

ЛІТАРАТУРА

1. *Алексиевич, С.* Цинковые мальчики / С. Алексиевич // Библиотека Максима Мошкова [Электронный ресурс]. – 2006. – Режим доступа : http://lib.ru /NEWPROZA/ALEKSIEWICH/aleksiewich.txt_Ascii.txt. – Дата доступа : 30.11.2016.
2. Комплексная национальная безопасность [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа : http://dknb.ru/448. – Дата доступа : 20.10.2016.
3. «Что же такое наша память?» Беседа Альмиры Усмановой со Светланой Алексиевич // Беларусь в мире. – № 3 (10). – 1998.
4. *Coetzee, J. M.* «Praise for Svetlana Alexievich and Secondhand Time» / J. M. Coetzee // Alexievich, S. Secondhand Time: The Last of the Soviets. – Deckle Edge, 2016. – Cover matter.
5. *Donadio, R.* Svetlana Alexievich, Novel Laureate of Russian Misery, Has an English-Language Milestone / R. Donadio // The New York Times [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.nytimes.com/2016/05/21/books/svetlana-alexievich-a-nobel-laureate-of-russian-misery-has-her-english-debut.html?_r=0. – Date of access: 01.11.2016.
6. *Gessen, M.* The Memory Keeper. The oral histories of Belarus's new Nobel laureate / M. Gessen // The New Yorker [Electronic resource]. – 2015. – Mode of access: http://www.newyorker.com/magazine/2015/10/26/the-memory-keeper. – Date of access: 01.11.2016.
7. *Gourevitch, Ph.* Nonfiction Deserves a Nobel // Ph. Gourevitch // The New Yorker [Electronic resourse]. – 2014. – Mode of access : http://www.newyorker.com/culture/cultural-comment/nonfiction-deserves-nobel. – Date of access : 01.11.2016.
8. *Heinemann, L.* Introduction / L. Heinemann // Alexievich, S. Zinky Boys: Soviet voices from a forgotten war / transl. J. and R. Whitby. – N. Y. : W. W. Norton & Company, 1992. – 222 p.

9. *Jones, E.* From Shell Shock to PTSD: Military Psychiatry from 1900 to the Gulf War / E. Jones, S. Wessely. – N.Y. : Psychology Press, 2005. – 320 p.
10. *Mort, V.* Svetlana Alexievich's Chorus of Fire / V. Mort // The New York Times Magazine [Electronic resource]. – Mode of access : http://www.nytimes.com/2015/10/09/magazine/svetlana-alexievichs-chorus-of-fire.html. – Date of access : 01.11.2016.
11. Nobelprize.org [Electronic resource]. – 2016. – Mode of access : http://www.nobelprize.org/nobel_prizes/literature/laureates/2015/. – Date of access : 01.11.2016.
12. *Sturgeon, J.* Why Svetlana Alexievich's Nobel Prize Is Good for Literature / J. Sturgeon // flavorwire.com [Electronic resource]. – 2015. – Mode of access : http://flavorwire.com/541793/why-svetlana-alexievichs-nobel-prize-is-good-for-literature. – Date of access : 01.11.2016.

В. У. Сцепаноўская (Наваполацк)

СРОДКІ СТВАРЭННЯ ПСІХАЛАГІЗМУ Ў ЛІТАРАТУРЫ
(на матэрыяле аповесці І. Шамякіна «Ахвяры»)

Раскрыццё псіхалогіі чалавека характэрна для літаратуры ва ўсе перыяды яе развіцця, бо аб'ект пазнання – духоўны свет асобы. Адлюстраванне сродкамі мастацкай літаратуры унутранага свету герояў, яго думак, перажыванняў, эмацыянальнага стану, жаданняў называюць тэрмінам «псіхалагізм».

Інтэнсіўнае станаўленне і шырокае замацаванне ў літаратуры псіхалагізм атрымоўвае ў XIX–XX стст., што мае глыбокія культурна-гістарычныя перадумовы. Яно звязана перш за ўсё з актывізацыяй самасвядомасці чалавека Новага часу. Сучасная філасофія адрознівае свядомасць, «якая сама сябе ажыццяўляе», і свядомасць, «якая вывучае сябе». Апошнюю называюць самасвядомасцю. Самасвядомасць рэалізуецца галоўным чынам у выглядзе *рэфлексіі* – самапаглыбленасці чалавека, яго засяроджанасці на ўласнай персоне. Актывізацыя і нарастанне рэфлексіі ў людзей Новага часу звязаны з вострым перажываннем разладу чалавека з самім сабой і ўсім навакольным асяроддзем, а то і татальным адмаўленнем ад яго. Пачынаючы з мяжы XVIII–XIX стст. такія жыццёва-псіхалагічныя сітуацыі сталі шырока адлюстроўвацца еўрапейскай літаратурай, а пазней – і пісьменнікамі іншых рэгіёнаў. Адзін з важных стымулаў рэфлексіі літаратурных персанажаў – абуджанае ў іх душах сумленне, якое хвалюе і мучыць на толькі пушкінскіх Барыса Гадунова, Анегіна, але і Андрэя Балконскага з «Вайны і міру», Рыбака з аповесці В. Быкава «Сотнікаў».

Новую і арыгінальную форму псіхалагізм набыў у шэрагу літаратурных твораў мінулага стагоддзя. Замацаваўся мастацкі прынцып адлюстравання *плыні свядомасці*. Вызначанасць унутранага свету чалавека тут можа знікаць зусім. Ля вытокаў *плыні свядомасці* – творчасць М. Пруста і Дж. Джойса.

У раманах Пруста свядомасць героя складаецца з яго ўражанняў, успамінаў і створаных фантазіяй карцін. Яна вольная ад імкнення да якогасьці дзеяння, «как бы оттесняет в сторону окружающую реальность и предстает как «убежище, защита от мира», а в то же время – как нечто поглощающее и присваивающее внешнюю реальность. Во французском «новом романе» 1960-1970-х годов (А. Роб-Грийе, Н. Саррот, М. Бютор) постижение и воссоздание нескончаемо текучей психики приводило к устранению из литературы не только «твёрдых характеров», но и персонажей как личностей» [1, с. 179–180].

Псіхалагізм у літаратуры XIX – XX стст. стаў дасягненнем амаль усіх існуючых жанраў. Але з максімальнай паўнатой паказаны ён у сацыяльна-псіхалагічным рамане.

Вельмі спрыяльнымі для паказу псіхалагізму з'яўляюцца:

- *эпісталярная форма* («Юлія, або Новая Элаіза» Ж.-Ж. Русо, «Бедныя людзі» Ф. М. Дастаеўскага);
- *аўтабіяграфічны (дзённікавы) аповед ад першай асобы* («Карабель» В. Гігевіча);
- *аповед ад трэцяй асобы* («Чароўная гара» Т. Мана).

Вызначаюцца разнастайныя формы псіхалагізму:

1) *адкрыты*, «*дэманстратыўны*»;
2) «*падтэкставы*» (калі імпульсы і пачуцці герояў толькі ўгадваюцца).

Арсенал мастацкіх сродкаў адлюстравання ўнутранага жыцця чалавека дастаткова багаты:

1) апісанне ўражанняў героя;
2) кампактнае абазначэнне таго, што адбываецца ў яго душы;
3) падрабязныя характарыстыкі перажыванняў аўтарам-апавядальнікам;
4) няўласна-простая мова, у якой зліты галасы героя і апавядальніка;
5) дыялогі персанажаў, гутаркі паміж імі (у вусных зносінах ці перапісцы);
6) унутраныя маналогі персанажаў;
7) дзённікавыя запісы;
8) сны і галюцынацыі, якія выяўляюць падсвядомае ў чалавеку – тое, што хаваецца ў глыбінях псіхікі і невядома яму самому.

Разам з такога роду ***прамым*** пранікненнем ва ўнутраны свет чалавека літаратура добра ведае таксама формы яго ***ўскоснага*** асваення, пры якіх *рысы знешнасці, позы, рухі, жэсты, міміка, інтанацыі* персанажаў з'яўляюцца сімптомамі таго, што робіцца ў іх душах.

У беларускай літаратуры паглыбленым і шматгранным псіхалагізм стаў у пачатку XX ст., калі актыўна пачалі развівацца эпічныя жанры, фарміраваліся яркія творчыя індывідуальнасці. Побач з эмацыянальна-лірычным паказам псіхалогіі (Я. Купала, Цётка, М. Багдановіч, Г. Леўчык) і падзейна-драматычным (К. Каганец) усталёўваўся аналітычны, які прадугледжвае раскрыццё псіхалогіі праз унутраную мову героя, прамое адлюстраванне

рухаў яго душы. У творчасці Я. Коласа і М. Гарэцкага ён спалучаецца з падзейным і пластычна-канкрэтным увасабленнем характару. У творчасці маладнякоўцаў узаемадзейнічалі эмацыянальны і падзейны спосабы псіхалагізму, прычым другі пераважаў у прозе 30-х гг. Аднак яшчэ з другой паловы 20-х гг. пад уплывам традыцый класічнага рускага і заходнееўрапейскага рамана, тэорыі «жывога чалавека» развіваўся аналітычны прынцып, які дамінуе ў творчасці К. Чорнага, некаторых творах П. Галавача, М. Зарэцкага, Р. Мурашкі, Б. Мікуліча. У першыя пасляваенныя гады пераважаў аднабакова падзейны спосаб псіхалагічнага аналізу. З сярэдзіны 50-х гг. псіхалалагізм бурна развіваецца па ўсіх стылявых лініях. Назіраецца спалучэнне аналітычнага пачатку з канкрэтна-рэалістычным, пластычна-дэталізаваным (І. Мележ, І. Пташнікаў, В. Казько). Гэтыя якасці дапаўняюцца у В. Быкава вострым драматызмам, у Я. Брыля – эмацыянальным успрыманнем псіхалогіі. Эмацыянальна-паэтычнае выяўленне ўнутранага жыцця героя – характэрная асаблівасць творчасці І. Навуменкі, падзейна-драматычнае – І. Шамякіна, сінтэз эмацыянальнага з падзейна-драматычным – У. Караткевіча, падзейнае – У. Карпава. Псіхалагічны аналіз у сучаснай беларускай літаратуры ажыццяўляецца шматбакова, што сведчыць пра яе мастацкае багацце, стылявую поліфанічнасць.

Пісьменнік І. Шамякін вядомы ў літаратуры як майстар пабудовы дынамічнага сюжэту, стварэння вострай інтрыгі. Але не менш таленавіты пісьменнік у раскрыцці ўнутранага стану сваіх герояў. Гэта яскрава бачна на прыкладзе аповесці «Ахвяры». У дадзеным творы аўтар увесь час паказвае стан найвышэйшага напружання персанажаў, што дазваляе чытачу прасачыць за развіццём іх думкі, пачуццямі, намерамі, імкненнямі, марамі. У аповесці пісьменнік скіроўвае свой позірк на вайну, звяртаецца да тэмы «асобых» атрадаў і іх ролі ў партызанскім руху. Тэма ўвогуле не новая ў беларускай літаратуры. Аднак аповесць І. Шамякіна адметная тым, што аўтар імкнецца даследаваць у ёй не столькі саму злачынную з’яву, колькі яе псіхалогію.

Псіхалагізм у творы выяўляецца па-рознаму. І. Шамякін адлюстраваў перажыванні герояў з дапамогай шматлікіх прыёмаў:

1. Сцісла характарыстыка пачуццяў персанажа:

Брагінскаму ўжо не рабіла асаблівай радасці апека Золатава, хоць ён па-ранейшаму быў уважлівы і ласкавы [2, с. 19];

І Шабовіч акрыяў духам [2, с. 144];

А Ман чамусці быў задумлівы, хоць гаварлівасцю ён ніколі не вызначаўся.

2. Падрабязнае апісанне унутранага стану героя аўтарам. Такое апісанне

І. Шамякін дае практычна кожнаму персанажу свайго твора:

Увогуле Аксана чалавек супярэчлівы. На здзіўленне ўсім, нават бацькам, спакойная, да адчайнасці смелая, з маленства завадатаркай была, але плаксівая. Не ад болю плакала – ад чуллівасці ... [2, с. 89];

Усё жыццё ён жыў з гэтым страхам – захварэць. На вачах у яго, малога, памерлі ў іх шматдзетнай сям'і дзве яго сястрычкі. Ён радаваўся, што тут, у атрадзе, можа, упершыню за жыццё, страх захварэць пакінуў яго. Якая дробязь – захварэць у той час, калі жывеш пад пагрозай смерці без хваробы. Праўда, да сённяшняга дня смерць ні разу не пралятала так блізка, і ён не думаў пра яе. Але так паводзілі сябе амаль усе партызаны – не баяліся смерці і баяліся радыкуліту. Баяўся Брагінскі, але яму ёсць чаго баяцца, яго хвароба смяртэльная ... [2, с. 84];

Золатаў плакаў. Наўзрыд. Шчыра плакаў. Толькі ў пачатку сваёй работы ў органах ён перажываў вось гэтак, калі ўчыніў несправядлівасць – прысудзіў да смерці невіноўнага, раскайваўся і плакаў над падзеннем сваім. Пасля, акрамя страху і лёгкіх пакут сумлення, такія стрэсавыя эмоцыі не ўзнікалі. Душа яго зачарсцвела [2, с. 156].

3. Самы частотны прыём стварэння псіхалагізму ў аповесці – няўласна-простая мова:

Ігар засмяяўся: як проста! Мудрэц атаман! Золатаў папярхнуўся салам. Абдало яго халодным ліўнем. Зразумеў, што партызаны – не НКУС. Супраць партыйнай групы тут не выступіш. Як ён не падумаў? [2, с. 19];

Незразумелы арышт, падумаў Шабовіч. Арыштавальнікаў нямнога, і большасць афіцэры, невядома, хто сядзіць у кабіне, за рулём і з аўтаматам, кукарда фуражкі і вочы свецяцца паверх праменя ліхтара, пагонаў не відаць. А што, калі паспрабаваць вырваць аўтамат? На дзевяць арыштаваных адзін вартавы, у нязручнай позе, відаць, стаіць на сядзенні на каленях. Застрэліць ён можа аднаго, двух, не больш. Не, відаць, ёсць нейкая страхоўка, ды і «опель», безумоўна, ідзе ўпрытык [2, с.26];

Золатаў ўздрыгануўся, бо мільганула думка: а што, калі артыст Дзядзюля насачыняў пра Мінск? Во плюхнешся. Не, не можа быць!. Гэтым не жартуюць. Ды і звышсур'ёзны Ман адразу раскусіў бы. А Ман вельмі сур'ёзна паставіўся да лёсу Кавалёва. Аднак адчуванне нейкай неасэнсаванай трывогі засталося. Ад пачуцця гэтага – як прыступ хранічнай хваробы, зноў абудзілася падазронасць: нікому з іх тут нельга верыць. Але ад каго тады атрымоўваць інфармацыю?.. [2, с. 83].

4. Дыялогі:

– Цябе нябось у легкавушцы везлі? З прабачэннямі. Памыліліся ці сыгралі спектакль?

– Які спектакль? – шчыра не зразумеў Чурсік.

– Ты нас выдаў? Прызнавайся!

Паліцай падхапіўся з крэсла, закрычаў:

– Не выдаваў я! Адкуль я знаў, хто вы! Чорт вас ведае! Думаў – свае людзі.

– Не крычы, дзіця разбудзіш, – знарок шэптам, пагрозлівым шэптам загадаў Стась. – А мы і ёсць свае. Мы – свае! Разумееш? [2, с. 44].

5. Унутраныя маналогі:

Аксаны: *Божа, я раблюся падобнай на цётку. У душы маёй пасяляецца страх. Што я буду рабіць, калі Стась не прыйдзе гэтую ноч? Колькі я магу*

чакаць яго? Дзе? Вярнуся ў Мінск і там буду шукаць яго след. Не, ён не можа загінуць. Не! Адступі, кастлявая! Адступі! [2, с. 98];

Ігара Кіпеня: *А што гэта я баюся яго? Няхай ён баіцца! Ён павінен баяцца мяне! Забойца і здраднік! Кіну яму ў твар! Але спакойна, Ігар. Спакойна. Табе нельга хвалявацца. Тваё жыццё – у спакоі* [2, с. 170].

6. Сны Стася Шабовіча:

Заснуў непрыкметна. Спаў неспакойна, з кашмарнымі снамі: увесь час за ім гналіся фашысты ў абліччы нелюдзяў. Але ён адпомсціў: ва ўпор стрэліў у гаўляйтара Кубэ. Здзейсніў план, які выношвалі [2, с. 65]. Гэты сон дэманструе нам напружанасць апошніх сутак жыцця хлопца, псіхалагічна ярка адлюстроўвае настрой героя.

Я сплю. Ты знаеш, я нават бачу сны. Во зараз – многа людзей. Як бы ў нейкім парку. Святочныя людзі. Радасныя. Калі ты бачыла радасных людзей? І ад таго мне стала лёгка, я фізічна адчуваў, як з цела майго выцякае, як нясвежая кроў, чорная стома. А з паветра, празрыстага, сонечнага, улівалася ва ўсе поры цела нябачная бадзёрасць. Што бальзам. І міг, нейкі міг мне стала вельмі лёгка [2, с. 101].

7. На наш погляд, у аповесці ёсць момант, які адлюстроўвае ход думак аднаго з герояў, што набліжаецца да плыні свядомасці. Гэта той эпізод, калі Золатава знесла ракой. Ад нечаканасці, страху, роспачы, безвыходнасці ў яго галаве праносяцца наступныя думкі:

Дзе ж яго баявыя таварышы? Пакінулі аднаго? Пакінулі, сволачы! Хто стане падстаўляць сябе пад кулі? Узаемавыручка ў баі – прыгожыя словы. Ніхто нікога не выручае, кожны думае пра сваю шкуру ... Дзе яны, ворагі? На тым ці на гэтым беразе? Колькі іх? Калі ўгледзелі яго, адным пісталетам не адбіцца. Што ж застаецца? Пусціць кулю сабе ў скроню? Ці ў сэрца? Дзе менш баліць? Ад якой раны хутчэй наступіць смерць?.. Так недарэчна скончыць сваё жыццё! Якую радыёграму дасць у Цэнтр Ман? Падлюга Ман! Здраднік! Фашыст! Недарэмна ўзяў сабе нямецкае прозвішча. Безумоўна, пастараецца ачарніць яго, мёртвага. Як? Як прадставіць яго смерць? Ці стане хоць сумлення перадаць, што загінуў выпадкова – напароўся на засаду [2, с. 74].

Акрамя вышэй прыведзеных прыёмаў прамога выражэння псіхалагізму, у аповесці унутраны стан персанажаў падаецца пісьменнікам і ва ўскоснай форме:

● праз інтанацыю:

Не маеце права! Гэта ўзурпатарства! [2, с. 18];

Во дзіва! Першы раз бачу цвярозага начальніка [2, с. 22];

● знешнасць:

Холад манаўскіх вачэй спалохаў Золатава [2, с. 19];

Хрысціна адчыніла ім і, прытуліўшыся да касяка, збялелая, моўчкі прастаяла на адным месцы [2, с. 26];

● рухі:

Шабовіч скалануўся [2, с. 32];

Яна прыляпіла сябе да сцяны, ажно стукнулася патыліцай аб рамку з фатаграфіямі [2, с. 44];

● жэсты:

Ты што – не давяраеш мне? Вопытнаму чэкісту? Я даўно заўважаю! – і сурова пагразіў пальцам [2, с. 146];

● міміку:

Дзядзюля прыжмурыўся і да крыўднага скептычна агледзеў маёра [2, с. 70].

Такім чынам, І. Шамякін у аповесці «Ахвяры» падрабязна і глыбока перадае перажыванні герояў. Твор пастаянна трымае ў напружанні. Прыгодніцкія элементы не перашкаджаюць пісьменніку заставацца тонкім аналітыкам, псіхолагам. І сама напружанасць у творы псіхалагічная.

ЛІТАРАТУРА

1. *Хализев, В. Е.* Теория литературы / В. Е. Хализев. – М., 2000.
2. *Шамякін, І.* Драма: Аповесці, гіст. сцэны / І. Шамякін. – Мінск, 1990.

Т. В. Ушылава (Мінск)

ПЫТАННІ САМАВЫЗНАЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў ТВОРАХ Ф. БАГУШЭВІЧА

Праблема самавызначэння беларускага народа займае значнае месца ў творчасці многіх прадстаўнікоў беларускай культуры другой паловы XIX стагоддзя. Адным з першых, хто на поўны голас заявіў аб гэтых праблемах і паспрабаваў даць адказ на іх, быў пачынальнік нацыянальнага адраджэння Францішак Бенядзікт Багушэвіч. Лёсавызначальнымі для беларускага народа зборнікамі-маніфестамі сталі яго «Дудка беларуская» і «Смык беларускі». Ён узняўся на абарону «тутэйшага», расказаў яму пра «бацькаву спрадвечную мову», пра «сваю зямлю», пра багатую гісторыю краіны. А ці не гэта з'яўляецца асноўным для вырашэння чалавекам важнага пытання: «хто я такі?».

Францішак Багушэвіч скрупулёзна на працягу ўсяго жыцця аналізаваў гістарычныя падзеі, рысы народа, асаблівасці мовы. Як аўтар называе нашу краіну? «Спрадвеку, як наша зямелька з Літвой злучылася, як і з Польшчай з'ядналася дабравольна, дык усе яе «Бяларусяй» звалі, і не дарма ж гэта! Не вялікая, не малая, не чырвоная, не чорная яна была, а белая; нікога не біла, не падбівала, толькі баранілася…» – ці не падказка гэта простаму чалавеку, што існуе назва? [1, с. 34]. Францішак Багушэвіч сцвярджае, што нашая краіна займала годнае месца ў геапалітычнай прасторы Еўропы: «…як тое зярно ў гарэху, была наша зямліца – Беларусь!» [1, с. 34]. І дзе ж тая «наша зямліца»? – «Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак…» [1, с. 34]. Зборнікі Францішка Багушэвіча «Дудка беларуская» і «Смык беларускі» напісаны ад імя Мацея Бурачка

і Сымона Рэўкі з-пад Барысава адпаведна. І гэта не выпадкова. Просты чалавек распавядае такому ж простаму бяздольнаму «мужыку», што ён мае права на годнае існаванне незалежна ад статусу, нацыянальнасці і веравызнання. Як жа не паверыць тутэйшаму «дурному, як варона», мужыку больш дасведчанаму і разумнаму (але такому ж бяздольнаму) зямляку? Бо ён сцвярджае: «…я шмат гдзе быў, шмат чаго відзеў і чытаў: і пераканаўся, што мова нашая ёсць такая ж людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая. Чытаў я ці мала старых папераў, па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі а нашай мовай чысцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася…» [1, с. 33].

А ці мае наш народ мову як паказчык сталай нацыі? Гэта адно з галоўных пытанняў, якое паэт уздымае ў сваёй творчасці. Менавіта яго словы стануць «запаветам» для беларусаў: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!» [1, с. 34]. Такі заклік падхапілі ўсе багушэвічавы прыхільнікі і паслядоўнікі. Гэтае пытанне актуальнае і зараз. Францішак Багушэвіч і сёння папярэджвае нас: «Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі…» [1, с. 34]. Што перашкаджае сучаснаму беларусу карыстацца сваёй «бацькавай спрадвечнай мовай»? Чаму за такі тэрмін мы не ўсвядомілі гэтага ўрока? Чаму мы працягваем думаць, што мова наша – «мужыцкая», «што ёю нічога добрага ні сказаць, ні напісаць не можна» [1, с. 33]? Аўтар дае адказ і свайму пакаленню, і нам, нашчадкам: «Ой, не! Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная, як і другім добрым людцам, і гаворым жа мы ёю і шмат добрага, але так ужо мы самі пусцілі яе на здзек…» [1, с. 33]. Спрадвечнаму беларускаму слову аўтар надае сакральны сэнс, роднае слова паўстае сімвалам праўды: «Ой, нашто ж мне дана тая мая мова, / Як я не ўмею сказаць тое слова, / Каб яго пачулі, каб яго пазналі, / Каб яго, тое слова, ды *праўдай* назвалі…» [1, с. 46]. «Дудка…» павінна абудзіць беларуса, адкрыць яму вочы на рэальнае становішча спраў, а «Смык…» – стаць тым інструментам, які закране глыбокія нацыянальныя струны, прымусіць увесь свет пачуць беларускае слова.

А ці ведаў гэты пакрыўджаны народ, што ён мае назву? Зараз мы ўсведамляем, што мы – «беларусы». А кім лічыў сябе палачанін ці гарадзенец тых часоў? Са шматлікіх твораў XIX стагоддзя можна даведацца, што лічылі нашыя землякі сябе «тутэйшымі» [2, с. 5]. Гэтак жа, як і беларус у творы «Хрэсьбіны Мацюка»: «*Тутэйшы*, – кажу я, – свой чалавек: / Сын бацькі свайго, а бацька дзяцей, / Тут і радзіўся, тут жыву век» [1, с. 54].

Для заваёўнікаў Беларусі важна было дамагчыся таго, каб карэннае насельніцтва думала, што яно рускае і праваслаўнае або польскае і каталіцкае [2, с. 6]. Супраць гэтай сістэмы паўстаў Мацей, ён мужна вынес усе пакуты, але не здрадзіў сабе: «…каб сто катоў / Дралі мне скуру, пяклі на агню, / Я веры сваёй тыкі не змяню!» [1, с. 56]. Ці не штуршок гэта для патэнцыйнага чытача? Гераізм Мацея і больш, чым праз сто гадоў, здзіўляе і натхняе. Беларус у творах Францішка Багушэвіча – гэта чалавек, які любіць

сваю зямлю, шануе яе. Такой пранікнёнай і кранальнай любоўю да сваёй радзімы прасякнуты верш «Мая хата». Тонкай ніткай праведзена параўнанне паміж старой, нахіленай хатай і родным краем. Але і нават такая «хата» – мілая і дарагая сэрцу беларуса: «Кепска ж мая хатка, падваліна згніла, / І дымна, і зімна, а мне яна міла; / Не буду мяняцца хоць бы і на замкі, – / Калок свой мілейшы, як чужыя клямкі» [1, с. 45]. Беларусу не трэба іншай долі, не трэба лепшай урадлівай зямлі, бо: «Ад чужога хлеба губы абсядаюць» [1, с. 45]. Хоць і паказвалі «мужыка» не ў лепшым святле, рабілі з яго бязглуздага дурня, але ён не «дурны, як варона». Ва ўсе часы сумленны чалавек пакутваў ад несправядлівых судоў, заможных і хцівых паноў, але беларус пакутваў яшчэ і ад таго, што яго не лічылі прадстаўніком годнага народа. Ды і прасіў ён не шмат: «…Каб сваю зямельку араць / І ўмерці на ёй хоць калі» [1, с. 98].

Францішак Багушэвіч прадбачыць, што змены будуць. Але ці хуткія яны? Пісьменнік памёр на ўзыходзе новага стагоддзя і даў сваім словам натхненне ўсім тым, хто прыйшоў на літаратурную ніву роднай краіны. «Смык ёсць, а хтось скрыпку, можа, даробе, а там была “Дудка” – вот і мы зробім музыку…» – прапанова, на якую адгукнуліся ўжо ў новым XX стагоддзі выбітныя прадстаўнікі сваёй краіны: Алаіза Пашкевіч, Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас, Алесь Гарун, Пімен Панчанка, Ніл Гілевіч, Максім Танк і яшчэ шмат іншых таленавітых творцаў [1, с. 85]. У іх творах пра родны край і свой народ чуецца філасофія знакамітага беларускага песняра [3, с. 17].

Францішак Багушэвіч кінуў заклік беларусам, каб мы ўсвядомілі, што з’яўляемся прадстаўнікамі багатай гістарычна і культурна нацыі. Творчасць знакамітага беларускага пісьменніка раскрывае рысы характару беларуса: памяркоўнасць, незайздроснасць да чужога, працавітасць, добрае пачуццё гумару. Пісьменнік паказаў усяму свету, хто такі беларус, і сцвердзіў яго права на існаванне. Францішак Багушэвіч – постаць лёсавызначальная ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці і ўмацаванні роднай мовы. Нельга ўявіць беларускую літаратуру і гісторыю без яркай, шматграннай асобы пісьменніка: «Дзякуй табе, браце, Бурачок Мацею, / За тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею, / Што між братоў нашых знаходзяцца людзі / З кахаючым сэрцам і баляшчай грудзяй» (Адам Гурыновіч) [1, с. 370].

ЛІТАРАТУРА

1. Выбраныя творы / Францішак Багушэвіч; уклад. з тэксталагіч. падрыхт., прадм. і камент. Язэпа Янушкевіча. – Мінск: Беларус. навука, 2015. – 445 с. (Беларускі кнігазбор: БК. Серыя І, Маст. літ.).
2. *Лашук, В.* Да пытання аб назовах і саманазовах беларусаў у творчасці Францішка Багушэвіча / В. Лашук // Роднае слова. – 2001. – № 5. – С. 5–6.
3. *Бельскі, А.* Дзякуй табе браце, Бурачок Мацею… Духоўная прысутнасць і вобраз Францішка Багушэвіча ў творчасці беларускіх паэтаў / А. Бельскі // Роднае слова. – 1998. – № 11. – С. 17–25.

СЕКЦЫЯ 3. КУЛЬТУРА, ПЕРАКЛАД

ПЕРАКЛАД ЯК СРОДАК РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў СВЕЦЕ

Д. А. Букаеў (Мінск)

ПРАБЛЕМА АДЭКВАТНАСЦІ ПРЫ ПЕРАКЛАДЗЕ СУЧАСНЫХ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ З БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ НА НЯМЕЦКУЮ

Пераклад як від лінгвістычнага пасрэдніцтва ў цяперашнюю эпоху глабалізацыі з'яўляецца важнай часткай сучаснага жыцця, бо, нягледзячы на вялізарную колькасць людзей, якія валодаюць дзвюма і больш мовамі, перакладчык патрэбны ўсё так жа, як сто і больш гадоў таму. Пераклады сустракаюцца паўсюль – у інструкцыях, Інтэрнэце, кнігах... Яны могуць быць зроблены як для навукоўцаў, спецыялістаў, так і для простых людзей. Калі нейкая з'ява распаўсюджана, часта ўзнікае навуковая галіна, якая вывучае гэтую з'яву, усё, што з ёй звязана.

Перакладазнаўства як навуковая галіна ўзнікла даўно, але знаходзіцца ў пастаянным развіцці, бо сама з'ява перакладу, яе аб'ект прагрэсуюць увесь час. Узнікаюць новыя погляды на добра вядомыя праблемы, неабходнасць іх вывучэння ніколі не скончыцца.

Адной з мэт перакладазнаўства з'яўляецца абазначэнне крытэрыяў, якія б дазвалялі ацаніць вынікі працэсу працы перакладчыка. Такім крытэрыем у перакладазнаўстве выступае «адэкватнасць». Гэты тэрмін – перакладчыцкі і з'яўляецца аналагам тэрміна «эквівалентнасць». Тэрмін «адэкватнасць» абазначае роўнасць дзвюх з'яў ва ўсіх адносінах, а калі справа датычыцца пытанняў, звязаных з мовамі, роўнасць ва ўсіх адносінах немагчымая [1, с. 56].

Што разумеюць як адэкватнасць? Расійская даследчыца І. С. Аляксеева дае наступную трактоўку: «Адэкватнасць – суаднясенне перакладзенага тэксту мэце перакладу» [2, с. 128]. Што такое мэта тэксту? Тут трэба звярнуцца да лінгвістыкі, дакладней, да вылучаных ёй функцый мовы як сродка камунікацыі. Шматлікія даследчыкі выдзяляюць розныя функцыі, але іх можна аб'яднаць у некалькі асноўных: кагнітыўную (мова накоплівае і захоўвае веды пра свет, у якім мы жывём), аператыўную (прадпісанне пэўных дзеянняў і пабуджэнне да іх выканання), эмацыянальную/экспрэсіўную (перадача пачуццяў) і эстэтычную (перадача пачуцця прыгожага) [2, с. 129]. Гэтыя функцыі ў розных тыпах тэкстаў выражаны нераўнамерна. У навуковых тэкстах, напрыклад, эмацыянальная функцыя іграе вельмі невялікую ролю, бо галоўная мэта навуковых тэкстаў – перадаць чытачу пэўную інфармацыю, якая з'яўляецца вынікам навуковай працы і не можа

несці ў сабе эмацыянальны кампанент, бо навука не аперыруе эмоцыямі чалавека, а дае яму пэўныя веды. Таксама эстэтычная функцыя іграе падпарадкаваную ролю, бо яна выражаецца толькі ў суаднясенні мовы навуковага артыкула з нормамі той мовы, на якой ён напісаны.

Але якія функцыі выконваюць тэксты мастацкага стылю, у першую чаргу, паэтычныя творы? Звернемся да наступнай цытаты: «Асновай вершаванага маўлення з'яўляецца эмацыянальна павышаны строй перажыванняў, які падкрэслівае ў гаворке ўсе формы перадачы найтанчэйшых адценняў думкі і пачуцця» [3, с. 253]. І далей: «Зварот да верша ёсць своеасаблівая заяўка на эмацыянальна афарбаванае маўленне. Адсюль і выцякае, па сутнасці, галоўная рыса вершаванага маўлення – сталасць аднароднай, эмацыянальна афарбаванай сістэмы ў адрозненне ад прозы, дзе перад намі пераменная інтанацыя, дзе кожная фраза мае сваю, галоўным чынам лагічна матываваную інтанацыю, якая не паўтараецца ў наступных фразах» [2, с. 253]. Як мы бачым, асноўны акцэнт робіцца на перадачы не столькі інфармацыі, колькі на перадачы чытачу тых пачуццяў, якія адчувае аўтар, героі твора. На аснове гэтага мы можам зрабіць вынік, што асноўная функцыя мовы ў мастацкіх творах – экспрэсіўная. Але важную ролю таксама выконвае і эстэтычная функцыя: «Мову мастацка-літаратурнага твора можна зразумець толькі ў сувязі з той вобразнай сістэмай, якая ляжыць у аснове твора. Яна вызначае матывіроўку і адбор лексічных, інтанацыйна-сінтаксічных, гукавых сродкаў, пры дапамозе якіх ствараецца той ці іншы вобраз. У гэтым сэнсе мова з'яўляецца формай у дачыненні да вобраза, як вобраз з'яўляецца формай у дачыненні да ідэйнага зместу твора. Але форма гэта глыбока змястоўная. Калі мы яе спрасцім, мы спрасцім, аслабім змест, які раскрываецца толькі праз яе» [3, с. 169]. Як мы бачым, форма падпарадкавана зместу, але змест можа раскрыцца толькі праз пэўную форму. Таму эстэтычная функцыя таксама іграе вялікую ролю ў мастацкіх творах. Максім Багдановіч у свой час адзначыў у дачыненні да паэтычных твораў Янкі Купалы і рытмікі яго вершаў характэрныя якасці паэтычнага рытму – «стыхійнасць, напружанасць, напор, з якімі ён выліваецца ў вершы, маркіруючы пачуцці і адчуванні аўтара» [3, с. 129].

У сувязі з тым, што менавіта экспрэсіўная і эстэтычная функцыі дамінуюць у тэкстах мастацкага стылю, паўстае пытанне, як жа перадаць іх пры перакладзе. На сённяшні дзень сярод перакладчыкаў існуе два падыходы да перакладу паэтычных твораў. Першы заснаваны на прынцыпе адаптацыі, згодна з якім чытач перакладу павінен успрымаць яго так, быццам чытае тэкст, створаны на яго мове, а не перакладзены на яе. Другі падыход – захаванне зыходнай карціны свету і перадача яе сродкамі мовы перакладу. Але другі падыход не можа быць прызнаны перакладам у навуковым сэнсе гэтага тэрміна, бо парушае асноўны прынцып, на якім грунтуецца сам тэрмін адэкватнасці перакладу – раўнацэннасць тэкстаў. Калі чытач знаёміцца з тэкстам на яго мове, але не можа ўспрыняць сімвалічны і культурна-эстэтычны код твора, то тэкст не аказвае такі ж уплыў, як арыгінал. Гэта значыць, што эматыўная функцыя не выконваецца і пераклад неадэкватны.

Аднак стратэгія перакладу, заснаваная на адаптацыі, нягледзячы на магчымасць уздзейнічаць на эмоцыі чытача і данесці да яго сімвалічны і эстэтычны аспект твора, стварае і шэраг складанасцей. Галоўная складанасць – не дазволіць перакладу настолькі адысці пры адаптацыі ад арыгінала, што ён фактычна будзе не перакладам, а творам па матывах. Дзеля таго, каб гэтага пазбегнуць, перакладчык павінен дакладна вырашыць для сябе, якія меры ў рамках абранай ім стратэгіі дазволяць адаптаваць тэкст да чытача, але ў той жа час не будуць скажаць творчую задумку аўтара, яго стыль і мастацкія асаблівасці твора.

Звернемся да перакладаў, зробленых беларускімі і нямецкімі перакладчыкамі і прааналізуем іх з пазіцый, якія прадстаўляе адаптацыйная стратэгія. Першы верш, які мы прааналізуем, – «Танец з вужакамі», перакладзены на нямецкую мову перакладчыкамі Уладзімірам Чапегам і Эльке Эрб. У гэтым вершы аўтар апісвае свае адчуванні ў час змагання з дзвюма вужакамі і таксама саму барацьбу:

А з мора ўжо вынырнулі дзве вужакі – дзве неспатольныя помсты.	Aus dem Meer sind schon zwei Schlangen aufgetaucht- zwei ungestillte Rachgelüste.
Яны апантана накідваюцца на мяне, абкручваюць слізкімі шчыльнымі звівамі, пстрыкаюць джаламі ў самы твар ...	Sie werfen sich gegen mich, umwinden mich fest mit den glatten Leibern, züngeln dicht an meinem Gesicht...

Вужакі абазначаюцца аўтарам як *дзве непастольныя помсты – zwei ungestillte Rachgelüste*. Складанае слова *Rachegelüste* уведзена ў пераклад таму, што прамы аналаг слова *помста* (*Rache)* у нямецкай мове абазначае абстрактную з’яву і ў сувязі з гэтым не можа ўжывацца ў множным ліку. Стварэнне складанага назоўніка дазваляе суаднесці паняцце помсты з кожнай з вужак, але таксама дадае яшчэ адзін кампанент сэнсу – слова *Gelüste* можа быць перакладзена на беларускую мову як «моцная цяга да чагосьці, смага да нечага». Гэты кампанент разам са словам «непастольныя» дадае яшчэ адзін слой эмацыйнай напружанасці, узмацняе эмацыянальны кампанент помсты.

Далей мы сустракаем апісанне барацьбы – *яны апантана накідваюцца на мяне*. У нямецкім варыянце – перад дзеясловам прыназоўнік *gegen*, што трошкі мяняе сэнс: вужакі кідаюцца ўжо не *на*, а *супраць* лірычнага героя, што падкрэслівае антаганізм героя і вужакаў, але ў той жа час выступае ў якасці кампенсацыі беларускага слова *апантана*, якое ў перакладзе знікае з прычыны неабходнасці захавання рытму.

Наступны цікавы момант – *абкручваюць слізкімі шчыльнымі звівамі*. У перакладзе знікае слова *шчыльнымі*, але яно кампенсуецца словам *fest*, якое выступае ў якасці вызначэння да дзеяслова *umwinden*. Таксама вызначэнне *слізкімі* перакладаецца словам *glatte* (*гладкія*), што трошкі зніжае інтэнсіўнасць эмацыянальнага кампанента – нешта гладкае ўспрымаецца носьбітамі беларускай мовы як менш інтэнсіўнае, чым нешта слізкае, і тое ж можна

казаць і пра нямецкамоўных чытачоў – *glatt* менш інтэнсіўна, чым, напрыклад, *glitschig*. Таму мы вымушаны канстатаваць факт, што, нягледзячы на захаванне сэнсу, інтэнсіўнасць эмацыянальнага кампанента меншая за арыгінал. Але, нягледзячы на тое, што ў адных выпадках эмацыянальны аспект узмоцнены, а ў іншых аслаблены, мы можам сцвярджаць, што перакладчыкі з перадачай эмацыянальнага ўплыву аўтара на чытача справіліся.

Наступны верш, які мы разгледзім, – «Не прислоняться!» Вальжыны Морт, перакладзены Уладзімірам Чапегам. І адразу мы бачым адзін з аспектаў арыгінала, які, на жаль, пры перакладзе перадаць немагчыма – ужыванне адначасова беларускай і рускай мовы:

Не прислоняться!	*Nicht anlehnen!*
Я – дзьверы ў вагонах мэтро.	Ich bin eine Tür im U-Bahn-Wagen.
Не прислоняться!	*Nicht anlehnen!*

Гэты аспект заснаваны на рэаліях Беларусі, на суседстве беларускай і рускай моў у якасці дзяржаўных і іх адначасовым выкарыстанні ў штодзённым жыцці. На жаль, абмяжоўваючы сябе адной мовай, перадаць усю паўнату сітуацыі немагчыма, але ўжыванне дзвюх моў таксама не дапаможа – сітуацыя, якая склалася ў Беларусі ўнікальна, бо руская і беларуская мова не толькі суіснуюць, але і актыўна ўзаемапранікаюць адна ў адну. Таксама беларуская і руская мовы вельмі блізкія, і ў межах перакладу на нямецкую мову перадаць гэты аспект, на жаль, немагчыма.

Але верш Вальжыны Морт цікавы не толькі гэтым момантам. Разгледзім яшчэ адзін, у якім лірычная гераіня апісвае свае пачуцці ад погляду чалавека, якога называе Варравай:

Ён жа складаў кубік-рубік з маіх успамінаў, і я галавой упіралася ў без-выходнасьць.	Er aber hat Rubiks Zauberwürfel aus meinen Erinnerungen zusammengedreht, und ich bin mit dem Kopfgegen die Ausweglosigkeit gestoßen.

Першае, што бачым – *Rubiks Zauberwürfel*. Праз выкарыстанне складанага назоўніка перакладчык параўноўвае гэтага чалавека з чарадзеем, які кубік не проста *складае,* але карыстаецца магіяй, творыць чарадзейства, стварае з іх чарадзейны кубік-рубік.

Далей гераіня ў арыгінале «ўпіраецца» галавой у бязвыхаднасць, а ў нямецкім варыянце яна ўжо аб яе стукаецца. Тут – як раз добры прыклад адаптацыі, бо ў усходніх славян увогуле бязвыхаднасць – стан, які не наступае раптам, рух да яго ідзе паступова, але для нямецкамоўных чытачоў, культура якіх заснавана на больш пазітыўным поглядзе на жыццё, які грунтуецца на пратэстанцкай этыцы, індывідуалізме і звязанай з імі жыццёвай пазіцыі, выхад з нейкай сітуацыі ёсць заўсёды. Таму для нямецкамоўнага чытача бязвыхаднасць наступае раптам, бо ён не чакае яе, ён не можа ўбачыць яе наступленне. Гэта падкрэсліваецца нават граматычным аспектам

перакладу – у беларускім варыянце дзеяслоў *упіра-лася* апісвае працэс, што цягнецца нейкі час, а ў нямецкай мове *bin gestoßen* – аднаразовае здарэнне.

Увогуле мы бачым, што Уладзімір Чапега адэкватна пераклаў верш Вальжыны Морт, здолеўшы не толькі захаваць эмоцыі, якія перадае арыгінал, але і адаптаваць іх да карціны свету нямецкамоўнага чытача, зрабіць іх для яго зразумелымі і знаёмымі.

Апошні верш, пераклад якога мы прааналізуем – «мой плуг застраг» Вольгі Гапеевай, перакладзены на нямецкую мову Ульянай Вольф. У пачатку наступны ўрывак:

плуг мой застраг	mein pflug steckt fest
зь месца яго ня зрушыць	bewegt sich nicht vom fleck
пачну ўпрошваць	verleg ich mich aufs flehen
варажыць злавацца крыўдзіцца	hexen schmollen grollen
і прасіць прабачэньня	und bitten um vergebung
але куды мне да цьвёрдасьці плуга	werd ich doch nie so hart sein wie er

Першае – адсутнасць вялікіх літар як у беларускім, так і ў нямецкім варыянтах. У нямецкім – гэта парушае правілы, але зроблена з мэтай, каб чытач не мог вылучыць нейкія словы з тэксту як больш важныя. Таксама мы бачым адсутнасць знакаў прыпынку, што дазваляе чытачу самому дзяліць тэкст, адзінае, што яму можа дапамагчы пры гэтым, – падзел верша на радкі.

Цікава таксама, што перакладчыца выкарыстоўвае пэўныя граматычныя сродкі для адаптацыі перакладу. Па-першае, гэта кароткія формы дзеясловаў (*verleg* замест *verlege*, *werd* замест *werde*), што прыбліжае гаворку лірычнай гераіні да гаворкі простых людзей, жыхароў вёсак, для якіх ужыванне кароткай формы дзеясловаў характэрна. Па-другое, мы бачым мадыфікацыю структуры сказа (*und bitten um vergebung* замест *und um vergebung bitten,* больш характэрнай для нямецкай граматыкі), што падкрэслівае эмацыянальны стан гераіні, узмацняе ўплыў на чытача.

Прааналізаваўшы дадзеныя пераклады сучаснай беларускай паэзіі на нямецкую мову, мы можам сцвярджаць, што разуменне адэкватнасці мастацкага перакладу як перадачы ў першую чаргу эмацыянальнага кампанента твора з'яўляецца найбольш паспяховай стратэгіяй перакладу. Праца перакладчыкаў, якія здолелі перадаць гэтую функцыю (у большай ці меншай ступені), з'яўляецца найлепшым пацвярджэннем гэтага погляду.

ЛІТАРАТУРА

1. *Латышев, Л. К.* Перевод: Теория, практика и методика преподавания: учебник для студ. перевод. фак. высш. учеб. заведений / Л. К. Латышев, А. Л. Семенов. – 4-е изд., стереотип. – М. : Издат. дом «Академия», 2008. – 192 с.

2. *Алексеева, И. С.* Введение в переводоведение: учеб. пособие для студ. филолог. и лингв. фак. высш. учеб. завед. – СПб. : Филологический факультет СпбГУ; М. : Издат. центр «Академия», 2004. – 352 с.
3. *Тимофеев, Л. Н.* Основы теории литературы / Л. Н. Тимофеев. – М. : Просвещение, 1963. – 454 с.
4. *Гарадніцкі, Я. А.* Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я. А. Гарадніцкі. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 206 с.

Т. І. Гарановіч (Мінск)

ЛІНГВАПРАГМАТЫЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ПЕРАКЛАДУ АПОВЕСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА «ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ»

Пры перадперакладчыцкім аналізе аповесці відавочнай становіцца адна з асноўных асаблівасцей лексічнага складу тэксту – яго нацыянальная афарбоўка. Менавіта з яе перадачай звязаны шэраг цяжкасцей на перакладчыцкім этапе.

Так, патрабуе аналізу перадача назваў беларускіх гарадоў. Увогуле асноўным спосабам перадачы ўласных імёнаў з'яўляецца транскрыпцыя. Аднак у практыцы перадачы беларускіх геаграфічных назваў склаліся дзве тэндэнцыі – транскрыпцыя з беларускай мовы (што, на наш погляд, лагічна) і транскрыпцыя з рускай мовы (шырока распаўсюджаны спосаб, які замацаваўся ў перакладчыцкай практыцы). Напрыклад, назва горада Рагачова, дзе жыве галоўны герой аповесці Гервасій Выліваха, на англійскамоўнай старонцы Вікіпедыі перадаецца транскрыпцыяй з беларускай мовы *Rahachow*, аднак на афіцыйным сайце Рэспублікі Беларусь www.belarus.by, на сайтах Рагачоўскага райвыканкама і Гомельскага аблвыканкама, вядомага ААТ «Рагачоўскі малочнакансервны камбінат», на старонцы ВВС – транскрыпцыяй з рускай *Rogachev*. Мы аддаем перавагу першаму спосабу, таму што менавіта ён перадае беларускую форму назвы, але пры гэтым адзначаем яго недахоп – у англійскамоўных чытачоў ён не будзе суадносіцца з распаўсюджаным варыянтам *Rogachev.*

Тое ж самае можна сказаць пра перадачу назваў *Полацк*, *Магілёў*, *Лоеў*, *Дуброўна*, якія сустракаюцца ў тэксце аповесці. Іх адпаведнікі на падставе транскрыпцыі з беларускай мовы **—** *Polatsk*, *Mahilyow*, *Loyew*, *Dubrouna*.

Яшчэ адной перакладчыцкай цяжкасцю з'яўляецца праблема перадачы найменняў жыхароў беларускіх гарадоў *рагачовец, палачанін, дубровенцы*. У іншых кантэкстах іх можна было б перадаць спалучэннямі назвы адпаведнага горада са словам *resident* або *dweller*, напрыклад, *Rahachow residents.* Аднак у нашым кантэксце такі адпаведнік будзе неадэкватным: па-першае, ён не падыходзіць стылістычна, таму што характэрны для афіцыйнага або навуковага стылю; па-другое, найменні ўжываюцца ў зваротах, напрыклад, *браты рагачоўцы, выпіце колькі хто можа за нас!!!* або *Бывай, брат Палачанін,*

у якіх *residents* не спалучаецца са словам *Brother(s)*; па-трэцяе, у тэксце найменне *палачанін* ужываецца як імя героя, таму яго не выпадае перадаваць словазлучэннем.

Другі спосаб перадачы – утварэнне адпаведнага наймення ад назвы горада з дабаўленнем суфікса *-er* па аналогіі з *Londoner* або *New Yorker*. Недахопам гэтага спосабу з'яўляецца адносная незразумеласць англійскамоўным чытачам: калі адпаведнік *Rahachow residents* паказвае, што гаворка ідзе пра жыхароў нейкага (хоць, можа, і невядомага) населенага пункта, варыянт *Rahachower* можа быць увогуле незразумелым. Аднак ён падыходзіць ва ўсіх прыведзеных прыкладах ужывання слова ў кантэксце. Трэці тэарэтычна магчымы варыянт – транскрыпцыя – будзе яшчэ менш зразумелым, чым другі, таму што, у адрозненне ад *Rahachower,* слова *Rahachowets* нават па форме не падобна на англійскае слова, што робіць яго ўспрыманне больш складаным. Такім чынам, найбольш адэкватным з трох прапанаваных варыянтаў, на нашу думку, з'яўляецца адпаведнік *Rahachower.* Па гэтай мадэлі ўтвараем адпаведнікі іншых найменняў жыхароў у тэксце.

Пры перакладзе аповесці варта звярнуць увагу і на перадачу назваў пасад. Некаторыя з іх маюць прамыя адпаведнікі ў англійскай мове, напрыклад, *каштэлян – castellan* (наглядчык за замкам), *лоўчы – harbourer.* Некаторыя можна перакласці функцыянальнымі аналагамі, напрыклад, *земскі нісар – country council clerk.* Найменне *наглядчык за бабровымі гонамі* мы прапануем перакласці адным словам – *Beavermaster* – па аналогіі з вядомым *Ravenmaster*, які наглядае за крукамі ў Лонданскім Таўэры.

Адна з адметнасцей твора – шматлікія параўнанні (больш за 40). Несумненна, менавіта даслоўны пераклад найбольш дакладна перадае мову аўтара. Пры перадачы вобразных стылістычных сродкаў, і ў тым ліку параўнанняў, калькаванне можа ўжывацца пры ўмове, што ствараецца яркі вобраз, зразумелы для англійскамоўнага чытача. На наш погляд, шэраг параўнанняў з тэксту можна перакласці даслоўна, напрыклад, *жыццё кароткае, як захад – life is as short as a sunset; вада была белая, як трунак забыцця – the water was white like a beverage of oblivion; нястрыманы, як навальніца, рогат – laughter as irrestrainable as a thunderstorm; немінуча, як лёс, набліжаўся пірацкі карабель – a pirate ship was approaching them as inevitably as fate; слабы, як камар пасярод варожага мора – as weak as a mosquito amidst a hostile sea; паскакаў так, нібы за ім гналіся падатныя начальнікі – broke into a gallop as if pursued by tax collectors* і інш.

Аднак некаторыя параўнанні маюць нацыянальную афарбоўку, якую, з аднаго боку, трэба абавязкова перадаць пры перакладзе для захавання каларыту мовы аўтара, і якая, з другога боку, можа быць незразумелай для англійскамоўных чытачоў. У такіх выпадках тэарэтычна існуе магчымасць падбору функцыянальных аналагаў, напрыклад, у параўнанні *як Дняпро п'е Друць* назвы беларускіх рэк можна замяніць на назвы англійскіх *as the Thames drinks the Kennet*. Такое параўнанне будзе добра зразумела брытанцам, але адразу паўстае пытанне, ці праводзіць такую адаптацыю менавіта

для брытанскага чытача або для амерыканскага, аўстралійскага і г.д. Аднак, галоўнае, што замена на аналагі ў дадзеным прыкладзе вядзе за сабой неабходнасць далейшых замен – услед за заменай *the Dnieper* на *the Thames* трэба было б мяняць і назвы гарадоў, і імёны персанажаў. Такім чынам, у вузкім кантэксце ўжыванне функцыянальных аналагаў магчыма, аднак у шырокім будзе неадэкватным. Такая прагматычная адаптацыя магла б быць прымальнай у тэксце навукова-папулярнага стылю, аднак ніяк не ў мастацкім творы.

У дадзеным выпадку праблему прагматычанй адаптацыі можна вырашыць іншым шляхам – спалучэннем калькавання і кароткіх дабаўленняў, якія б выконвалі функцыю паясненняў, напрыклад, *як Дняпро п'е Друць* можна перакласці не даслоўна *as the Dnieper drinks the Drut*, а *as the (river) Dnieper drinks the waters of the Drut.*

Беларуская геаграфічная назва ўжываецца аўтарам і ў параўнанні *пляскаты, як пінскае балота. Пляскаты* ў дачыненні да берага можна перакласці, як *flat*. З шэрагу адпаведнікаў слову *балота – bog, swamp, marsh, swampland, marshland* – мы разглядаем, у першую чаргу, *swampland* і *marshland*, таму што частка *-land* мае значэнне 'тэрыторыя', 'абшар', такім чынам перадае, што на ўвазе маецца не асобнае балота, а цэлы балотны масіў. Мы прапануем перадаць параўнанне як *as flat as Pinsk* marshland*. *Пінск* суправаджаем сноскай *a Belarusian city in the region of extensive marshlands*.

Параўнанне *хапілі, як сом гарачай кашы?!* таксама выглядае для нас як параўнанне з нацыянальнай афарбоўкай па прычыне ўжывання слова *каша*. Мы лічым, што ў гэтым выпадку пры перакладзе можа ўжывацца калькаванне *got it like a wels catfish got hot porridge?!*, таму што *сом – wels catfish* – водзіцца ў Брытаніі і там вядомы, а *каша*, хаця значна больш распаўсюджана ў нас, мае прамы адпаведнік у англійскай мове – *porridge.* Незразумелай будзе толькі сувязь паміж сомам і кашай, таму дадзім гэтаму параўнанню паясненне ў канцы старонкі: *In the past hot porridge was used as a bait for wels catfish. A wels catfish swallowed a pot of porridge, hot porridge spread all over his stomach causing great pain, the fish swam to the surface where it was killed by fishers*. Такі спосаб лоўлі апісваецца, між іншым, у рускіх і ўкраінскіх крыніцах, прысвечаных рыбнай лоўлі, узгадваецца ў творы М. Горкага «Жыццё Кліма Самгіна». Жорсткасць метаду можна ў пэўнай ступені растлумачыць традыцыйна негатыўным вобразам сома як гіганцкай пачвары, якая нішчыць гусей і качак, а таксама можа зацягнуць у глыбіню чалавека ці нават мядзведзя.

Асобная катэгорыя параўнанняў – параўнанні, у склад якіх уваходзяць імёны людзей, напрыклад, *як у час князя Вячкі, калі трыста хлопцаў на ладдзях паваявалі і разрабавалі ледзь не ўвесь захад балтыйскага ўзбярэжжа; ездзіў, пёс касароты, як Мамай; падлюгі накшталт нясвіжскага Радзівіла, старобінскага Слуцкага або паланецкіх ці менскіх Хадкевічаў*. Тэарэтычна ў гэтых выпадках было б адэкватным калькаванне, таму што значэнне параўнанняў зразумелае чытачу: у першым прыкладзе непасрэдна апісваецца, што адбылося ў *час князя Вячкі*, у другім *Мамай* характарызуецца лаянкай *пёс касароты,* а ў трэцім гістарычныя асобы называюцца *падлюгамі.*

Прымяняем калькаванне да перакладу першага параўнання: *як у час князя Вячкі, калі трыста хлопцаў на ладдзях паваявалі і разрабавалі ледзь не ўвесь захад балтыйскага ўзбярэжжа – as in times of prince Vyachko*, when three hundred guys on boats conquered and robbed nearly the entire west coast of the Baltic Sea.* Уласнае імя суправаджаем паясненнем гістарычна-хранала-гічнага зместу, якое выносім у зноску: *Vyachko of Koknese (1175/1180-1224) – the ruler of the Principality of Koknese in present-day Latvia, who fought against the expansionism of the Livonian Knights*.

Пры перакладзе параўнання *ездзіў, пёс касароты, як Мамай* поўнае калькаванне немагчыма, таму што выраз *пёс касароты* не мае прамога адпаведніка ў англійскай мове. Заменім яго іншай лаянкай, роўнай па экспрэсіўнасці зыходнай, нават з захаваннем вобраза сабакі – *dirty dog, he rode like Mamai*.* У зносцы тлумачым уласнае імя: *Mamai (1335–1380) – a powerful military commander of the Golden Horde.*

У параўнанні *падлюгі накшталт нясвіжскага Радзівіла, старобінскага Слуцкага або паланецкіх ці менскіх Хадкевічаў* слова *падлюгі* перадаем як *skunks* (яно адпавядае не толькі па значэнні, але і стылістычна, у адрозненні ад літаратурнага *villain*). Для захавання норм мовы перакладу ў першай частцы выраза дабаўляем слова *prince – prince Radziwill of Nesvizh.* Пераклад другой часткі (*старобінскі Слуцкі*) аналагічнай канструкцыяй (*prince Slutski of Starobin*) немагчымы; хоць гэтыя фрагменты выглядаюць аднолькава ў беларускай мове, яны маюць рознае значэнне. Па-першае, калі Нясвіж быў цэнтрам уладанняў – Нясвіжскай ардынацыі, Старобін такой функцыі ніколі не выконваў. Старобінскага княства не існавала, Старобін уваходзіў у склад Слуцкага княства, таму ў арыгінале адзначаецца факт валодання Старобіным князем Слуцкам. Па-другое, Радзівіл – гэта прозвішча, Слуцкі – не, таму што Слуцкам валодалі Алелькавічы. Таму мы прапануем апушчэнне назвы *Старобін* пры перакладзе – *prince of Slutsk.* У наступнай частцы параўнання прозвішча магнатаў *Хадкевічаў* ужываецца ў форме множнага ліку, можа перадаваца як *the Khadkeviches* і дабаўлення пры перакладзе не патрабуе. Такім чынам, мы прапануем варыянт перакладу *skunks like prince Radziwill of Nesvizh, prince of Slutsk, the Khadkeviches of Polatsk or Mensk.*

Што датычыцца аўтарскай характарыстыкі *падлюгі*, можна выказаць здагадку, што ў другой частцы параўнання маецца на ўвазе князь слуцкі і капыльскі Міхаіл Алелькавіч (1425–1481) – арганізатар змовы супраць Вялікага князя літоўскага, адзін з варыянтаў якой прадугледжваў перадачу ўсходняй часткі ВКЛ пад пратэктарат Масквы. Змова была выкрыта, Міхаіл Алелькавіч быў абвінавачаны ў дзяржаўнай здрадзе і пакараны смерцю. Аднак зрабіць дакладнае паясненне ў дачыненні да *падлюг* складана: невядома, якія менавіта Радзівіл, Слуцкі і Хадкевічы ўзгадваюцца пісьменнікам.

У шэрагу параўнанняў узгадваюцца вельмі значныя для нашай краіны гістарычныя падзеі, якія не будуць вядомы англійскамоўнаму чытачу. Мы лічым неабходным суправадзіць калькаванне паясненнямі перакладчыка, напрыклад, *як Ракута і Койдан пад Крутагор'ем, латнікі стаялі пасярэдзіне*

поля – like Rakuta and Kaidan at Krutogorye, the warriors stood in the middle of the field (A legendary battle at Krutogorye, now Dzyarzhynsk, a city in Minsk region, in 1240 stopped the Tatar-Mongol invasion of modern Belarusian lands. The Tatar-Mongol troops were headed by khan Kaidan, belarusian troops – by voivode Rakuta).* Звернем увагу на пераклад у нашым кантэксце слова *латнік*. Прамы пераклад *knight* немагчымы па той прычыне, што адно са значэнняў *knight* у англійскай мове – ‘шахматны конь’. Аднак у арыгінале параўнанне адносіцца да пешак – па шахматных правілах у пачатку гульні толькі яны могуць зрабіць *два крокі наперад.* Таму ў нашым кантэксце мы прымяняем генералізацыю і ўжываем варыянт *warrior* – ён адэкватна спалучаецца з імёнамі Ракуты і Койдана, а таксама з фігурамі на шахматнай дошцы, таму што пешкі сапраўды рабіліся ў форме воінаў.

Разгледзім таксама перадачу параўнання *як крыжацкае мора на тры сотні вояў князя Давіда, як асманы на Косавым полі, як рыцары на Белай Гары, рухаліся воі Смерці.* Пры перакладзе фрагмента *як крыжацкае мора на тры сотні вояў князя Давіда* неабходна прымяніць канкрэтызацыю: замест прамога адпаведніка слову *крыжакі – crusaders* – мы ўжываем варыянт *Teutonic Knights*, таму што менавіта ў такой форме крыжакі ўзгадваюцца ў гэтым кантэксце ў англійскамоўных крыніцах. Такім чынам, пераклад выглядае як *like a sea of Teutonic Knights against three hundred warriors of prince David*.* Уласнае імя *David* паясняем: *David, killed in 1326, was a castellan of Hrodna and one of the most famous military commanders of Gediminas, Grand Duke of Lithuania.* Дзве наступныя часткі перакладаем даслоўна: *як асманы на Косавым полі – like Ottomans on the Kosovo field; як рыцары на Белай Гары – like knights at White Mountain*. У зносках даем адпаведныя паясненні пра час, удзельнікаў і вынікі ўзгаданых бітв; такія паясненні, дарэчы, даюцца і ў беларускамоўным выданні аповесці. Пры перадачы фрагмента *рухаліся воі Смерці – warriors of Death advanced* – звяртаемся да канкрэтызацыі: прамы адпаведнік слову *рухаліся – moved* – замяняем на больш вузкі па значэнні *advanced.* Варыянт *advanced* значыць ‘ішлі наперад’, а не ўвогуле ‘рухаліся’ у розныя бакі; на нашу думку, гэта важна перадаць, таму што менавіта ў выніку набліжэння вояў Смерці *Выліваха адчуў, што ніхто ніколі не можа выйграць у сілы, якая сядзела насупраць.* Такім чынам, перадаем параўнанне як *like a sea of Teutonic Knights against three hundred warriors of prince David, like Ottomans on the Kosovo field, like knights at White Mountain warriors of Death advanced.*

Яшчэ адна адметнасць аповесці «Ладдзя Роспачы» – вялікая колькасць інтэрнацыянальных і псеўдаінтэрнацыянальных слоў. Памер аповесці складае 11404 словы. Шляхам суцэльнай выбаркі намі вылучана 104 словы, якія падобны па форме ў беларускай і англійскай мовах, з іх 87 назоўнікаў, 11 прыметнікаў і 6 дзеясловаў, што склала, адпаведна, 84 %, 10 % і 6 %.

Са 104 вылучаных слоў з падобнай формай 55 (53 %) інтэрнацыянальныя – у беларускай і англійскай мовах яны супадаюць і па форме, і па значэнні. Такая доля інтэрнацыянальных слоў з’яўляецца даволі цікавай, бо ў літаратуры па перакладзе яна традыцыйна акрэсліваецца ў 5–10 % ад агульнай лічбы слоў з падобнай формай.

Вялікую долю інтэрнацыянальных слоў у аповесці ў пэўнай ступені можна растлумачыць тым, што пісьменнік даволі часта ўжывае, па-першае, словы грэцкага і лацінскага паходжання (*дыдактыка/didactics*, *маральнасць/morality*, *халера/cholera*, *ерась/heresy*, *апостал/apostle*), а па-другое, словы, якія ўказваюць на нацыянальнасць і ў розных мовах традыцыйна маюць падобную форму (*беларускі/Belarusian, турэцкі/Turkish, грэцкі/Greek, багемец/Bohemian*).

49 слоў (47 %) – псеўдаінтэрнацыянальныя словы, якія маюць цалкам або часткова несупадаючыя значэнні. 7 псеўдаінтэрнацыянальных слоў (14 %) не супадаюць па значэннях цалкам (*герб/herb, мур/moor*); 42 словы (86 %) не супадаюць часткова, напрыклад, *дошка/desk* (у англійскай мове не толькі ‘дошка’, але і ‘палуба’, ‘парта’), *біскуп/bishop* (не толькі ‘біскуп’, але і ‘слон’ у шахматах).

Адметным з’яўляецца факт, што 19 слоў са 104 (18 % ад агульнай лічбы разгледжаных адзінак) знаходзяць у англійскай мове пары інтэрнацыянальных і псеўдаінтэрнацыянальных слоў там, дзе гэтага няма ў рускай. Прыкладамі могуць служыць такія пары слоў, як *водар/odour, стырно/steer, рабаваць/rob, тураваць/tour, гонар/honour, лямант/lament, рушаць/rush, варты/worthy, воцат/acetum, багна/bog, парцалан/porcelain, палац/palace*. На наш погляд, гэта сведчыць пра большую блізкасць беларускай мовы ў параўнанні з рускай да заходнееўрапейскіх моў.

І ўрэшце звернем увагу на перадачу слова *ладдзя* з назвы твора. У тэксце аповесці аўтар ўжывае гэта слова ў двух значэннях – ‘лодка’ і ‘шахматная фігура’. У англійскай мове няма слова, якое мела б два гэтыя значэнні. Англійскі адпаведнік слова *ладдзя* у першым значэнні – *boat*, у другім – *castle* або *rook*. Традыцыйны пераклад назвы аповесці – *The Boat of Despair* – перадае толькі адно значэнне слова *ладдзя* – ‘лодка’.

Такім чынам, аповесць Уладзіміра Караткевіча «Ладдзя Роспачы» не толькі значны твор беларускай літаратуры, але і вельмі багаты і цікавы матэрыял для перакладчыцкага аналізу.

А. А. Макоўскі (Мінск)

РЭАЛІІ ТВОРАЎ Э. ХЭМІНГУЭЯ Ў ПЕРАКЛАДАХ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Э. Хэмінгуэй займае асобае месца ў сусветнай літаратуры. Яго ўнёсак цяжка пераацаніць. Рэдка каго з аўтараў настолькі атаясамліваюць з паняццем стылю, як Э. Хэмінгуэя. Многія пісьменнікі намагаліся пераняць яго манеру пісьма, але мала каму гэта ўдалося. Крытыкі пішуць пра ўплыў стылю Хэмінгуэя на творчасць такіх аўтараў розных краін, як Джон О’Хара і Джэймс Олдрыдж, Грэм Грын і Генрых Бёль, Франка Салінас і Золтан Фабіян [1, с. 4]. Амерыканскі літаратуразнаўца В. Т. Стафард у кнізе,

прысвечанай літаратуры ЗША XX ст., кажа пра стыль Хэмінгуэя: «Стыль ніколі не будзе ў Амерыцы такім, якім ён быў бы без яго прыкладу... Уплыў лаканічнай прозы Хэмінгуэя не толькі на англамоўных пісьменнікаў, але і на пісьменнікаў іншых краін надзвычай значны...» [2, с. 29].

Э. Хэмінгуэй – мастак-псіхолаг, майстар пабудовы дыялогу і маналогу, стварэння адпаведнай атмасферы, настрою, пейзажу. Аддаючы перавагу факту, ён пазбягаў знарочыстых эфектаў і пафаснасці. Стрыманая, «спартанская» манера пісьма Хэмінгуэя прымушае чытача дадумваць, чытаць «паміж радкамі», суадносіць тэкст з падтэкстам.

Хэмінгуэй у сваіх творах прадстаўляе сацыяльна-псіхалагічны аналіз найбольш характэрных з'яў сучаснасці, такіх, як імперыялістычная вайна, варожасць капіталістычнага грамадства да чалавечых памкненняў, народна-вызваленчая барацьба супраць фашызму. Творы Э. Хэмінгуэя ў большасці сваёй належаць да літаратуры так званага страчанага пакалення. Гэта найменне ўзнікла з фразы Гертруды Стайн і пазней узятай Э. Хемінгуэем за эпіграф да рамана «Фіеста» (1926). «Усе вы, – сказала спадарыня Гертруда, – страчанае пакаленне… Уся моладзь, якая зведала вайну». Ці не адразу ж было заўважана, што і ў англійскім, і ў нямецкім, і ў французскім, ды і ў беларускім варыянце фраза Гертруды Стайн перакладаецца таксама і як "пакаленне, што загінула"» [3, с. 130]. Вядома, што для інтэлігенцыі ва ўсім свеце за гэтым «цэтлікам» – «страчанае пакаленне» – стаяла найперш разуменне вайны як бессэнсоўнай бойні. Гэтая тэма была вельмі блізкая беларускім пісьменнікам і перакладчыкам пасляваеннага часу па прычыне таго, што ў Беларусі вырасла сваё «страчанае пакаленне» пісьменнікаў, такіх як Іван Навуменка, Васіль Быкаў, Аркадзь Марціновіч. Магчыма, менавіта па гэтай прычыне творчасць Хэмінгуэя ў Беларусі даўно заняла трывалае месца і стала неад'емнай часткай нашага культурнага жыцця. Да вывучэння асобы пісьменніка і яго творчасці звярталіся беларускія даследчыкі (І. Саверчанка, А. Лукашук, П. Васючэнка), асобныя яго творы пераклалі на беларускую мову многія аўтары, такія як А. Асташонак, А. Бутэвіч (Максім Валошка), В. Воранаў, В. Гардзей, Ю. Гаўрук, П. Марціновіч, Я. Міклашэўскі, В. Небышынец. Трэба адзначыць тое, што асоба вялікага амерыканца Хэмінгуэя прыцягвала ўвагу маладых беларускіх перакладчыкаў, сярод якіх ёсць і выпускнікі МДЛУ.

Але захаванне арыгінальнага індывідуальнага стылю Э. Хэмінгуэя з усімі ўласцівымі яму асаблівасцямі патрабуе ад перакладчыка пэўнага ўзроўню майстэрства. Творы знакамітага амерыканскага пісьменніка насычаны рэаліямі, прычым не толькі амерыканскімі, але таксама іспанскімі, італьянскімі, французскімі. Гэта патрабуе ад перакладчыка не толькі майстэрскага ўжывання трансфармацый, але і пэўнага ўзроўню валодання акрамя англійскай, яшчэ некалькімі замежнымі мовамі.

Увогуле рэалія – гэта кропка сутыкнення мовы і культуры. Г. Д. Тамахін у кнізе «Рэаліі-амерыканізмы» дае наступнае тлумачэнне дадзенага паняцця: «гэта назвы ўласцівых толькі пэўным нацыям і народам прадметаў

матэрыяльнай культуры, гістарычных фактаў, дзяржаўных устаноў, уласных імёнаў і г.д.» [4, с. 5]. Г. В. Чарноў трактуе рэаліі як экзатычную лексіку, а А. Д. Швейцэр вызначае рэаліі як безэквівалентную лексіку.

А. А. Іваноў разглядае эквівалентнасць/безэквівалентнасць лексічных адзінак як супадзенне/разыходжанне значэнняў, абапіраючыся пры апісанні безэквівалентнай лексікі і яе тыпаў на семіятычную класіфікацыю значэнняў. Ён вылучае, такім чынам, тры тыпа значэнняў: *рэферэнцыйнае* (або дэнататыўнае, прадметна-лагічнае), якое выражае адносіны паміж знакам і яго рэферэнтам; *прагматычнае* (або канататыўнае, эматыўнае), якое выражае адносіны паміж знакам і чалавекам ці моўным калектывам, якія карыстаюцца гэтым знакам; і *ўнутрылігвістычнае* (унутрымоўнае), якое выражае адносіны паміж знакам і іншымі знакамі той жа самай моўнай сістэмы. У сувязі з гэтым А. А. Іваноў падзяляе ўсю безэквівалентную лексіку на тры групы: *рэферэнцыйна-безэквівалентная*, якая ўключае ў сябе тэрміны, індывідуальныя (аўтарскія) неалагізмы, семантычныя лакуны, словы шырокай семантыкі, складаныя словы; *прагматычна-безэквівалентная*, якая аб'ядноўвае адхіленні ад агульнамоўнай нормы, іншамоўныя ўстаўкі, скарачэнні (абрэвіятуры), словы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі, выклічнікі, гукаперайманні і асацыятыўныя лакуны (сітуацыйныя рэаліі); і *альтэрнатыўна-безэквівалентная* лексіка, якая ўключае ў сябе ўласныя імёны, звароткі, фразеалагізмы [5, с. 46].

У якасці прыклада ўжывання такой лексікі і яе перакладу можна ўзяць раман Э. Хэмінгуэя «For Whom the Bell Tolls». Гэта ваенны раман, апублікаваны ў 1940 годзе. У ім распавядаецца гісторыя Роберта Джордана, амерыканскага добраахвотніка ў шэрагах рэспубліканцаў падчас грамадзянскай вайны ў Іспаніі. Раман расцэньваюць як адзін з лепшых у спадчыне аўтара, ён быў кандыдатам на Пулітцэраўскую прэмію 1941 года. На беларускую мову твор быў перакладзены Вадзімам Небышынцам і выдадзены ў 1991 годзе выдавецтвам «Мастацкая літаратура».

Для твора характэрна значная колькасць і частотнасць ужывання а л ь т э р н а т ы ў н а - б е з э к в і в а л е н т н а й л е к с і к і. У групу альтэрнатыўна-безэквівалентнай уключаецца лексіка, якая, у залежнасці ад абранага спосабу перакладу, можа быць альбо рэферэнцыйна-безэквівалентнай (г.зн. разыходзіцца з адпаведнай адзінкай мовы перакладу ў рэферэнцыйным значэнні), альбо прагматычна-безэквівалентнай (г.зн. разыходзіцца з ёй у прагматычным значэнні). Сярод такой лексікі найбольш частотнымі з'яўляюцца ўласныя імёны.

Усе ўласныя імёны, ужытыя ў рамане, можна ўмоўна падзяліць на наступныя групы:

1) прозвішчы і імёны (сярод іх і мянушкі);
2) геаграфічныя назвы (звычайна той краіны, дзе адбываецца дзеянне);
3) назвы розных устаноў.

Многія ўласныя імёны ўжываюцца ў якасці алюзій і патрабуюць ад чытача пэўнай дадатковай інфармацыі, якая датычыцца падзей і асоб, на якіх робіцца спасылка. Таму ў творы падаецца каментарый, дзе тлумачыцца кожная падзея і кожная асоба.

Падзеі рамана «Па кім звоніць звон» адбываюцца ў Іспаніі, а таму ў ім маецца значная колькасць іспанскіх імёнаў і геаграфічных назваў (*Pablo*, *Greco*, *Segovia*, *Sierra de Gredos*); але ёсць і алюзіі на прадстаўнікоў іншых культур (*John Donn – англійскі паэт*; *Garbo – амерыканская кінаактрыса*). Сустракаюцца таксама назвы, пазычаныя з замежных краін (*Vicksburg – горад у ЗША*; *the Avenue du Maine – вуліца ў Парыжы*; *San Valley – курорт у ЗША*).

Прааналізаваўшы спосабы перакладу, ужытыя ў творы «Па кім звоніць звон», было вызначана, што ўласныя імёны перадаюцца з дапамогай транслітарацыі, практычнай транскрыпцыі, калькавання, прамога пераносу з каментарыем, а таксама змешаным спосабам. Пераклад імёнаў спосабамі транслітарацыі і транскрыпцыі не дае чытачу ніякай інфармацыі акрамя замежнага гучання, таму даюцца паралельныя тлумачэнні, або каментарый у канцы твора.

Уласныя імёны і прозвішчы звычайна транслітарыруюцца з іспанскай мовы з улікам беларускага правапісу (*Pablo – Пабла*, *Maria – Марыя*), пры перадачы іншых імёнаў выкарыстоўваецца традыцыйны спосаб (*Horatius – Гарацый*, *Bachus – Бахус*) або практычная транскрыпцыя (*Jackson – Джэксан*). Традыцыйны спосаб уласцівы для перакладу антычных імёнаў. Імёны англа-амерыканскага паходжання перадаюцца пераважна з дапамогай транскрыпцыі (*John Donne – Джон Дон*; *Woods – Вудс*), але ёсць і выпадкі ўжывання транслітарацыі (*Garbo – Гарба*; *Harlow – Гарлаў*). Мянушкі перадаюцца спосабам апісальнага перакладу (*Moors – Мараканцы*), або спосабам практычнай транскрыпцыі (*Stonewall Jackson – Стоўнуал Джэксан*).

Геаграфічныя назвы перадаюцца таксама спосабам практычнай транскрыпцыі (*Sun Valley – Сан Вэлі*), транслітарацыі (*Vicksburg – Віксбург; Valencia – Валенсія*) або ўжываецца калькаванне (*The Basque country – Краіна Баскаў*). Пераклад некаторых геаграфічных назваў адбываецца з дапамогай прамога пераносу з ужываннем каментарыя, але такі спосаб не з'яўляецца частотным.

Назвы ўстаноў перакладаюцца пераважна спосабам калькавання (*Chartres Cathedral – Шартрскі сабор*; *Cathedral at Leon – Леонскі сабор*), некаторыя – з дапамогай транслітарацыі (*Prado – Прада*).

Этнонімы перадаюцца спосабам транслітарацыі, пры гэтым некаторым надаецца беларускія фіналі (*Berbers – берберы*, *Iberians – іберыйцы*). Пры перакладзе некаторых этнонімаў, напрыклад, *Sioux* апроч транслітарацыі ўжываецца удакладненне: *…that figure… that stood on that hill holding a service revolver as the Sioux closed in around him* '…тую велічную постаць чалавека… з армейскім рэвальверам, які стаіць на ўзгорку, а з усіх бакоў да яго падступаюць індзейцы племені сіу'.

Акрамя альтэрнатыўна-безэквівалентнай лексікі, у рамане зафіксавана таксама ўжыванне прагматычна-безэквівалентнай лексікі. У саставе якой можна вылучыць *асацыятыўныя лакуны* ці *сітуацыйныя рэаліі.* Такія рэаліі вымагаюць дастатковага ведання народных звычаяў (прыкмет, правілаў народнай этыкі), а таксама асаблівасцей светаўспрымання

таго ці іншага народа і яго эстэтычнай іерархіі каштоўнасцей. Так пры перадачы метафар, заснаваных на вобразах жывёл, трэба браць пад увагу тыя традыцыі, якія склаліся ў кожнага народа. Як адзначае П. Ньюмарк, спецыфіка англійскага слова *horse* ў тым, што гэты вобраз выклікае пазітыўныя асацыяцыі – «здаровы, грацыёзны, пародзісты» [6, с. 21]. У той жа час у беларускай традыцыі, асабліва калі метафара тычыцца жанчыны, *кабыла* – гэта вялікая, няздатная, непрыгожая кабета. Згаданае абумоўлена розным укладзеным сэнсам эстэтычнага светаразумення кожнага народа, таму падобныя сітуацыйныя рэаліі вымагаюць ад перакладчыка пэўнага каментарыя ці трансфармацыі. У рамане Э. Хэмінгуэя «Па кім звоніць звон» даволі часта ўжываюцца параўнанні дзяўчыны з маладым жарабём: *Thou art no* ***colt of a girl*** *with cropped head* [7, с. 34] – *І не дзяўчынка са стрыжанай галавой* [8, с. 79].

У дадзеным выпадку назіраецца апушчэнне сітуацыйнай рэаліі, якая можа быць недакладна ацэнена беларускамоўным чытачом.

Але ў пэўных сітуацыях гэтую сітуацыйную рэалію можна захаваць. Напрыклад, калі яна кампенсуецца далейшым кантэкстам: *She moved awkwardly as a colt moves, but with that same grace as of a young animal* [7, с. 14] – *Яна рухалася трохі нязграбна, быццам маладое жарабя, але з той жа грацыяй* [8, с. 41].

Слова *grace* ‘грацыя’ кампенсуе магчымасць узнікнення негатыўнай канатацыі, звязанай з успрыняццем рэаліі. У такіх выпадках можна ўжываць спосаб літаральнага перакладу.

Але сярод усёй прагматычна-безэквівалентнай лексікі ў рамане асабліва вылучаюцца *вульгарызмы* і *іншамоўныя ўстаўкі*, якія ўводзяцца з мэтай стварэння атмасферы, набліжэння дыялогаў да рэальнай сялянскай простай і нават часам грубаватай гаворкі. Але ў 1940 годзе цэнзура была жорсткай і таму аўтар сутыкнуўся з канкрэтнай праблемай перадачы вульгарызмаў [9].

Адным з рашэнняў было простае захаванне арыгінальнага іспанскага слова ці фразы (перадача лексікі з дапамогай прамога ўключэння) – *cabron*. Такім чынам аўтар перадаваў чытачу задачу перакладу гэтых слоў. Вадзім Небышынец перакладае такую лексіку як звычайныя іншамоўныя ўстаўкі.

Другі спосаб – гэта ўжыванне ўніверсальных нарматыўных англійскіх слоў, якія хаця бы часткова нагадвалі арыгінал. Прыкладам могуць служыць словы Ансельма аб негатыўным стаўленні Пабла: *I this and that in the this and that of thy father. I this and that and that in thy this* [7, с. 7]. У гэтым выпадку ў перакладзе В. Небышынца можна вылучыць тры варыянты перадачы гэтай лексікі:

1) з ужываннем такіх жа ўніверсальных нарматыўных беларускіх адпаведнікаў: *Так цябе і ператак* [8, с. 27]; *Go to the unprintable and unprint thyself* [7, с. 24] – *Пайшоў бы ты, сам ведаеш куды, так цябе і ператак*;

2) з заменай універсальнага нарматыўнага англійскага выразу беларускім вульгарызмам: *And if we do not do this smartly we are* ***obscenitied*** [Там же, с. 51] – *А калі тут мы не скарыстаем якой-небудзь хітрасці, дык будзем* ***сядзець па вушы ў дзярме*** [8, с. 110].

3) з апушчэннем універсальнага нарматыўнага слова, ужытага замест вульгарызма: *That we blow up an obscene bridge and then have to* ***obscenely*** *well* ***obscenity*** *ourselves off out of these mountains?* [7, с. 24] – *Што мы павінны ўзарваць гэты паскудны мост і потым выбірацца адгэтуль пакуль цэлыя?* [8, с. 61].

Безумоўна, лексіка такога тыпу мае вялікае значэнне для захавання каларыту твора, таму, па магчымасці, яе неабходна захоўваць. Па той жа прычыне апушчэнні аўтарскіх вульгарызмаў і нарматыўных слоў, якія іх замяняюць з'яўляюцца непажаданымі. Выпадкі ж трансфармацыі ўніверсальных нарматыўных выразаў з негатыўнай канатацыяй у беларускія вульгарызмы можна лічыць апраўданымі, таму што яны робяць гаворку дзеючых асоб больш натуральнай. Але такія трансфармацыі павінны строга адпавядаць стылю мастацкага твора і не быць занадта частотнымі, што і ўдалося зрабіць В. Небышынцу.

У перакладзе В. Небышынца даволі часта ўжываюцца іншамоўныя ўстаўкі. Можна вылучыць некалькі спосабаў іх перадачы.

1. Прамое ўключэнне іншамоўнага слова з тлумачэннем у спасылцы: *Salud, Camarada* [7, с. 5] – *Прывітанне, таварыш* [8, с. 25]; *Hola!* [7, с. 10] – *Здарова!* [8, с. 34]; *Chico* [7, с. 30] – *Хлопчык* (ісп.) [8, с. 70]; *Ole!* [7, с. 32] – *Брава!* (ісп.) [8, с. 75]; *Que va* [7, с. 32] – *Вось яшчэ! А як жа!* [8, с. 76].

Тлумачэнне можа таксама падавацца паралельна, адразу ў тэксце перакладу: *Then we ate paella with fresh sea food, clams in their shells, mussels, crayfish, and small eels* [7, с. 46] – *А яшчэ мы елі paella – такую страву з рысу і ўсялякай марской драбязы – рачкоў, малюскаў, ракавінак, маленькіх вугроў.* [8, с. 100].

2. Прамое ўключэнне іншамоўнага слова без перакладу ў спасылцы. Гэты спосаб перакладу ўжываецца ў двух выпадках:

а) калі слова з'яўляецца не першы раз і каментарый быў змешчаны раней;

б) калі тлумачэнне падаецца паралельна самім аўтарам, ці калі значэнне слова зразумелае без перакладу. У гэтым выпадку перакладчык не мае неабходнасці перадаваць такую лексіку на беларускую мову і такім чынам ён можа захаваць «іншамоўную атмасферу і каларыт»: *Pues nada. There was nothing.* [7, с. 44] – *Pues nada. Ніякіх* [8, с. 95]; *Thick head. Tonto* [7, с. 44] – *Доўбня. Tonto* [8, с. 97].

3. Перадача іншамоўных уставак з ужываннем беларускіх адпаведнікаў: *Give me another cigarette, Ingles, and* ***vamonos*** [7, с. 54] – *Дай мне яшчэ адну цыгарэту, Ingles і* ***пачнём*** [8, с. 115]; *And we went up into the town to the* ***Plaza****…* [7, с. 56] – *І мы пайшлі на гарадскі* ***пляц*** [8, с. 118].

Кожны з прыведзеных спосабаў перакладу мае свае адметнасці. Так У. Голышаў у інтэрв'ю «Harvard Business Review – Расія» піша: «Калі страта сапраўды істотная, то часам даводзіцца даваць зноску. Але зноска – гэта пашкоджанне тэксту, прыкмета паразы перакладчыка. Чым зносак менш, тым лепш» [9]. З іншага боку, уключэнне іншамоўнага слова без спасылкі, нават калі яна ўжо давалася раней, можа заблытаць чытача, у выніку чаго ён будзе вымушаны звярнуцца да адпаведных слоўнікаў, альбо прапусціць гэтую рэалію. Але яшчэ менш пажаданым спосабам, безумоўна, з'яўляецца пераклад

іншамоўных уставак, што выклікае страту мясцовага каларыту. Адпаведна, найбольш удалай з'яўляецца сітуацыя з ужываннем аўтарскага тлумачэння такой лексікі і яе поўнага захавання пры перакладзе. Але дадзеная сітуацыя не самая частотная.

Падводзячы вынікі, можна сказаць, што перадача рэалій у цэлым выканана адэкватна. Вадзім Небышынец пры перакладзе рэалій ужывае спосабы транскрыпцыі, транслітарацыі, калькавання, а таксама ўключае пласт неперакладзенай лексікі. Магчыма, у выпадках адсутнасці спасылак і тлумачэнняў, перакладчык спадзяецца, што чытач сам знойдзе значэнні незразумелых слоў ці ён лічыць, што дадзеныя словы не з'яўляюцца актуальнымі для чытача.

Мяркуючы па арыгінальным тэксце і па тэксце перакладу можна сцвярджаць, што Э. Хэмінгуэй імкнуўся перадаць культурныя рэаліі краін, у якіх адбываецца дзеянне, а перакладчык, разумеючы намер аўтара, адлюстраваў гэта ў сваім перакладзе.

ЛІТАРАТУРА

1. *Кашкин, И. А.* Эрнест Хемингуэй : критико-биографический очерк / И. А. Кашкин. – М. : Худож. лит., 1966. – 356 с.
2. *Штандель, А. Б.* Некоторые особенности стиля Хемингуэя-романиста (Роман «И восходит солнце») // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 10, Филология. – 1974. – № 1. – С. 29–40.
3. *Топер, П.* Ради жизни на земле. Литература и война: Традиции. Решения. Герои. – Изд. 2-е, доп. и перераб. – М. : Сов. писатель, 1975. – 568 с.
4. *Томахин, Г. Д.* Реалии – американизмы: пособие по страноведению : учеб. пособие для ин-тов и фак-тов иностр. яз. / Г. Д. Томахин. – М. : Высш. шк., 1988.
5. *Иванов, А. О.* Безэквивалентная лексика / А. О. Иванов. – СПб. : Тип. изд-ва СПбГУ, 2006. – 200 с.
6. *Факторович, Д. Е.* Основы теории художественного перевода / Д. Е. Факторович. – Минск : Кнігазбор, 2009. – 182 с.
7. *Hemingway, E.* For Whom The Bell Tolls [Электронны рэсурс] / E. Hemingway. – Рэжым доступу : http://royallib.com/book/heminguey_ernest/For_Whom_The_ Bell_Tolls.html.
8. *Хэмінгуэй, Э.* Па кім звоніць звон / Э. Хемінгуэй ; пер. В. Небышынец. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 480 с.
9. Ernest Hemingway's style [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.artikel33.com/englisch/1/ernest-hemingways--for-whom-the-bell-tolls-style.php.

М. С. Ржавуцкая, С. С. Мароз (Мінск)

ГРАМАТЫЧНЫЯ ТРАНСФАРМАЦЫІ Ў ПЕРАКЛАДЗЕ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ

Працэс перакладу з адной мовы на другую немагчымы без пэўных змен, паколькі «мае на ўвазе работу асобнага чалавека па інтэрпрэтацыі і перакадзіроўцы асобнага тэксту» [1, с. 89]. Аб'ектам перакладу з'яўляецца

не сістэма мовы як нейкая абстракцыя, а канкрэтны моўны твор (тэкст арыгінала), на аснове якога ствараецца іншы моўны твор на іншай мове (тэкст перакладу). Разыходжанні ў фармальных і семантычных сістэмах дзвюх моў патрабуюць ад перакладчыка ўмення «выканаць шматлікія і якасна разнастайныя міжмоўныя пераўтварэнні – так званыя перакладчыцкія трансфармацыі – з тым, каб тэкст перакладу з максімальна магчымай паўнатой перадаваў усю інфармацыю, заключаную ў зыходным тэксце» [2, с. 190].

Пры граматычных трансфармацыях «пераўтвараецца фармальная структура выказвання і застаецца нязменным набор сем, якія канстытуіруюць яго сэнс» [3, с. 118–119]. Асноўнай прычынай такога тыпу трансфармацый з'яўляецца неізаморфнасць структур зыходнай мовы і мовы перакладу.

На матэрыяле арыгінала і перакладу твораў Івана Мележа на рускую мову пакажам магчымыя тыпы граматычных трансфармацый як спецыфічных прыёмаў перакладчыцкай дзейнасці.

У лінгвістычнай літаратуры па перакладазнаўстве ўсе трансфармацыі зводзяцца да чатырох элементарных тыпаў (перастаноўкі, замены, дабаўленні і пропускі), з якіх пры параўнанні на граматычным узроўні арыгінала і перакладу твораў Івана Мележа на рускую мову былі выяўлены фактычна ўсе магчымыя тыпы: *граматычныя перастаноўкі*, *граматычныя замены*, *граматычныя дабаўленні*, *граматычныя пропускі*.

1. Г р а м а т ы ч н ы я п е р а с т а н о ў к і – такі тып перакладчыцкіх трансфармацый, пры якім змяняецца размяшчэнне моўных элементаў у тэксце перакладу ў параўнанні з тэкстам арыгінала. Элементамі перастановак могуць быць словы, часткі сказа. Адной з прычын граматычнага змянення парадку моўных элементаў з'яўляецца несупадзенне ў пабудове некаторых канструкцый беларускай і рускай моў. Так, пытальныя сказы ў беларускай мове могуць мець у сваім сказе часціцу *ці*, месца якой – толькі ў пачатку сказа. У рускай мове беларускай канструкцыі з часціцай *ці* адпавядае канструкцыя з часціцай *ли(ль)*, якая стаіць пасля слова, з якім спалучаецца: – ***Ці*** *хутка, мамка, наша сяло?* («Мінскі напрамак») – *Скоро* ***ли*** *наше село, мамка?* (пераклад Л. Ракоўскага); – ***Ці*** *не занядужаў ты?* («Людзі на балоце») – *Уж не занедужил* ***ли*** *ты?* (пераклад Н. Кісліка).

Граматычныя перастаноўкі выяўляюцца і пры перадачы беларускіх складаных сказаў з даданымі азначальнымі часткамі на рускую мову сказамі з дзеепрыметнымі зваротамі або адзіночнымі дзеепрыметнікамі, што могуць знаходзіцца і ў прэпазіцыі да пояснёнага слова. Пры гэтым граматычныя перастаноўкі спалучаюцца з граматычнымі заменамі: *Ніна ўбачыла справа вострыя палоскі святла,* ***што павольна паўзлі адна за другою*** («Мінскі напрамак») – *Нина увидела справа острые* ***ползущие друг за другом*** *полоски света* (пераклад наш); *Пазіраючы на постаці,* ***што набліжаліся****, Туравец адчуў, як цела цяжэе ад напружанага чакання* («Мінскі напрамак») – *Следя за* ***приближающимися*** *фигурами, Туровец чувствовал, как всё тело тяжелеет от напряжённого ожидания* (пераклад наш); *Старшы лейтэнант недаверліва прыслухоўваўся да цішыні,* ***што панавала ў прыродзе*** («Мінскі напрамак») – *Старший лейтенант недоверчиво прислушивался к* ***царившему в природе*** *покою* (пераклад наш).

2. Г р а м а т ы ч н ы я з а м е н ы – такі тып перакладчыцкіх трансфармацый, пры якіх замяняюцца граматычныя адзінкі: формы слоў, часціны мовы, члены сказа, тыпы сінтаксічнай сувязі і інш. Параўнанне арыгінала і перакладу твораў Івана Мележа на рускую мову паказала, што на граматычным узроўні сустракаюцца: а) *замены ў простым сказе*, б) *замены простага сказа на складаны*, в) *замены складанага сказа на просты*, г) *замены ў складаным сказе*.

Замены ў простым сказе. Пры заменах членаў сказа словы і групы слоў у тэксце перакладу ўжываюцца ў іншых сінтаксічных функцыях, чым іх адпаведнікі ў тэксце арыгінала, інакш кажучы, адбываецца змяненне сінтаксічнай структуры сказа: *Міканор Глушак… нервова дыміў, ледзь* ***стрымліваў*** *гнеў* («Завеі, снежань») – *Миканор Глушак… нервно дымил, едва* ***сдерживая*** *гнев* (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай); *Машына імчала па дарозе,* ***мінала*** *вёскі і палі* («Мінскі напрамак») – *Машина мчалась по дороге,* ***минуя*** *деревни и поля* (пераклад Л. Ракоўскага); *Камандуючы ўважліва слухаў, аднак амаль нічога* ***не запісваў*** («Мінскі напрамак») – *Командующий внимательно слушал, почти ничего* ***не записывая*** (пераклад Л. Ракоўскага). Замена асабовага дзеяслова дзеепрыслоўем, на нашу думку, паўплывала пэўным чынам і на семантыку сказа: дзеянне, якое ў арыгінале было, верагодна, асноўным, стала ў перакладзе дадатковым,

Замены простага сказа на складаны. Просты сказ можа быць трансфармаваны ў складаназалежны: *Павярнуўся* [Башлыкоў] *назад* ***крыкнуць Апейку, папярэдзіць*** («Завеі, снежань») – *Повернулся* [Башлыков] *назад,* ***чтобы крикнуть Апейке, предупредить*** (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай). Замена, відаць, прадуманая: даследчыкі лічаць, што ў рускай мове менш прадуктыўныя канструкцыі з акалічнасцю мэты, выражанай інфінітывам, і больш пашыраныя даданыя акалічнасныя часткі мэты (*прышёл для того, чтобы…*). У беларускай мове прадуктыўныя канструкцыі тыпу: *прыехаў дамовіцца*, *прыйшоў параіцца* і г.д.

Просты сказ можа быць трансфармаваны і ў складаназлучаны: *Страх і надзея… поўнілі хлопца адчайнай смеласцю, адвагай,* ***гатовай на ўсё*** («Людзі на балоце») – *Страх и надежда… переполняли хлопца отчаянной смелостью и отвагой,* ***и он был готов на всё*** (пераклад Н. Кісліка). Відавочна, граматычная замена прывяла да пэўных семантычных зрухаў: у арыгінале характарызуецца лексічная адзінка (слова *адвага*), у перакладзе выкарыстана частка складаназлучанага сказа з семантычным адценнем прычыны.

Замены складанага сказа на просты. Такі тып трансфармацыі звязаны з перакладам на рускую мову складаных сказаў з даданымі азначальнымі часткамі, перадача якіх патрабуе ўжывання дзеепрыметнага зварота, характэрнага для рускай літаратурнай мовы і малапрадуктыўнага ў беларускай мове: *Нядоўга было чакаць і малін,* ***што густа спелі ў гадзючых зарасніках*** («Людзі на балоце») – *Недолго было ждать и малины,* ***густо зреющей в гадючих зарослях*** (пераклад Н. Кісліка); *Агонь,* ***што асвятляў хату чырвоным, мігатлівым святлом****, гатоў быў вось-вось згаснуць…*

(«Людзі на балоце») – *Огонь,* ***едва освещавший хату красным дрожащим светом,*** *готов был вот-вот погаснуть…* (пераклад М. Гарбачова); *Туравец,* ***які сачыў за полем****, убачыў наваддалек постаці* («Мінскі напрамак») – *Туровец,* ***тоже наблюдавший за полем****, увидел тёмные фигуры…* (пераклад Л. Шапіры).

Замены ў складаным сказе могуць ахопліваць:

а) сродак падпарадкавальнай сувязі: *У Куранях… не была такой хаты,* ***якая*** *не мела б рыбалоўнай прылады* («Людзі на балоце») – *В Куренях не было такой хаты,* ***где*** *б не имелось рыболовной снасти* (пераклад Н. Кісліка); [Ганна] *падалася да класа, у* ***які*** *ўвайшло некалькі чалавек* («Завеі, снежань»). – [Ганна] *направилась в класс,* ***куда****… зашли несколько человек* (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай); …[Ганна] *прайшла праз Парасчыны дзверы, знізу* ***якіх*** *вырэзвалася вясёлая палоска святла* («Завеі, снежань») – ...[Ганна] *прошла мимо Параскиных дверей,* ***откуда*** *сквозь щель внизу прорезывалась весёлая полоска света* (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай);

б) від сувязі: *Ногі ў разношаных ботах ступалі цвёрда,* ***а*** *на касцістым твары была рашучасць* («Завеі, снежань») – *Ноги в разношенных сапогах ступали твёрдо, на костистом лице была решительность* (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай); …*Ступілі ў сенцы, змрок іх памог* [Башлыкову] *ухаваць утрапенне* («Завеі, снежань») – …*Вошли в сени,* ***где*** *темнота помогла скрыть его* [Башлыкова] *волнение* (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай). Названы тып трансфармацый выклікае не толькі граматычныя змены, але ў пэўныя семантычныя зрухі ў сказе, таму адносіць іх толькі да ўласна граматычных будзе неправамерна.

3. Г р а м а т ы ч н ы я д а б а ў л е н н і – тып трансфармацый, які прыводзіць да пашырэння структуры сказа за кошт увядзення ў яго дадатковых кампанентаў: *Ад загумення проста да шляху – дарога, вылізаная саннымі палазамі* («Завеі, снежань») – *От загуменья к шляху* ***вела*** *дорога, вылизанная санными полозьями* (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай); …*Башлыкоў вярнуўся за стол* («Завеі, снежань»). – ...[Башлыков] *вернулся,* ***сел*** *за стол* (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай). Дабаўленні, як і замены, могуць змяняць не толькі структуру сказа перакладу параўнальна са сказам арыгінала, але і ўплываць на семантычную напоўненасць адзінкі.

4. Г р а м а т ы ч н ы я п р о п у с к і – тып трансфармацый, пры якім адзін або некалькі кампанентаў сказа апускаюцца. Граматычныя пропускі – гэта пропускі, апраўданыя кантэкстам. Пэўныя словы або спалучэнні слоў могуць быць семантычна лішнімі, гэта значыць яны выражаюць значэнні, якія можна ўзнавіць з тэксту і без іх дапамогі: *Васіль, каб не падумалі чаго-небудзь непатрэбнага – што* ***ён*** *баіцца Ганны, напрыклад, – перанёс свету бліжэй* («Людзі на балоце») – *Василь, чтобы не подумали чего лишнего – что боится Ганны, например, – перенёс свиту поближе* (пераклад Н. Кісліка); *Доўгі, нязграбны хлопец Мікалай… паказваў пузатага багацея-кулака, другі, трохі шапялявы Апанас,* ***выдаваў з сябе*** *папа* («Завеі, снежань») – *Долговязый, нескладный парень Николай… изображал пузатого*

богатея, кулака, немного шепелявый Апанас – попа (пераклад Д. Кавалёва і Т. Залатухінай); *Каля* ***крамы****, як звычайна ў нядзелю, тоўпілася нямала святочнага народу* («Людзі на балоце») – *Магазин, на котором ещё алел первомайский лозунг, был открыт. Возле, как обычно по воскресеньям, толпилось немало праздного народа* (пераклад Н. Кісліка).

Такім чынам, аналіз арыгінала і перакладу твораў Івана Мележа на рускую мову паказаў, што ў працэсе ўзнаўлення мастацкага тэксту на іншай мове выкарыстоўваюцца ўсе магчымыя тыпы граматычных трансфармацый (перастаноўкі, замены, дабаўленні і пропускі), якія могуць паўплываць і на семантычную напоўненасць адзінкі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Абаева, Е. С.* Субъективность восприятия юмора как переводческая проблема / Е. С. Абаева // Языковая личность и эффективная коммуникация в современном поликультурном море : сб. материалов междунар. науч.-практ. конф. – Минск, 2015. – С. 89–91.
2. *Бархударов, Л. С.* Язык и перевод: Вопросы общей и частной теории переводов / Л. С. Бархударов. – М. : Междунар. отношения, 1975. – 239 с.
3. *Швейцер, А. Д.* Теория перевода: Статус, проблемы, аспекты / А. Д. Швейцер / Акад. наук СССР, Ин-т языкознания ; отв. ред. В. Н. Ярцева – М. : Наука, 1988. – 215 с.

Н. Л. Русецкая (Люблін, Польшча)

ПЕРАКЛАДЫ ТВОРАЎ У. НЯКЛЯЕВА НА ПОЛЬСКУЮ МОВУ

Асоба беларускага пісьменніка і палітыка, кандыдата на пост прэзідэнта Беларусі ў 2010 г. Уладзіміра Някляева за апошнія гады набыла папулярнасць у першую чаргу ў суседніх з Беларуссю краінах: Расіі і Польшчы. Дзякуючы Маскоўскаму Театру.doc. і спектаклю «Двое в твоем доме» па п’есе Алены Громінай, з якім тэатр удзельнічаў у розных тэатральных фестывалях, вядомасць Уладзіміра Някляева пашырылася таксама на іншыя краіны Еўропы. Варта падкрэсліць, што гэтая вядомасць Някляева звязана выключна з ягонай палітычнай дзейнасцю. На старонках польскіх перыёдыкаў прозвішча пісьменніка згадваецца ў сувязі з дзейнасцю апазіцыі ў Беларусі і фігуруе ў артыкулах, прысвечаных прэзідэнцкім выбарам 2010 і 2015 гадоў. У Беларусі ж Уладзімір Някляеў даўно і добра вядомы быў найперш як пісьменнік, паэт-песеннік, галоўны рэдактар колішняга літаратурнага часопіса «Крыніца», тыднёвіка «ЛіМ», старшыня Саюза пісьменнікаў, а толькі потым грамадскі актывіст, лідар кампаніі «Гавары праўду» і кандыдат на пост прэзідэнта.

Польскі чытач, як нам здаецца, і да сёння добра не знаёмы з пісьменнікам Уладзімірам Някляевым, чые творы пачалі перакладацца і друкавацца

ў Польшчы зусім нядаўна. Першым перакладам Някляева на польскім рынку было апавяданне «Kot* w worku (* z ogonem średnio długim średnio puszystym). Lektura dla myszy» [беларус. «Кот Клаўдзіі Львоўны»], апублікаванае ў анталогіі сучаснай беларускай прозы «Białoruś. Kraina otoczona wysokimi górami…» (Olsztyn, 2004), падрыхтаванай Малгажатай Бухалік (Małgorzata Buchalik) у суаўтарстве з Катажынай Катыньскай (Katarzyna Kotyńska). У 2011 г. у Гдыні мастацкі квартальнік «BLIZA», № 1 (6) перадрукаваў пераклад гэтага апавядання на сваіх старонках.

З упэўненасцю можна сказаць, што грамадская і палітычная дзейнасць, а таксама ўдзел Някляева ў прэзідэнцкіх выбарах 2010 г. паспрыялі большай цікавасці да ягонай літаратурнай творчасці з боку польскіх перакладчыкаў і выдаўцоў. Праз год пасля сумна вядомых падзей у Мінску на польскім кніжным рынку з'явіліся адразу два паэтычныя зборнікі беларускага паэта: «Poczta gołębia / Галубіная пошта» (Уроцлаў, 2011) і «Pożegnalny gest Zygmunta / Развітальны жэст Жыгімонта» (Варшава, 2011). Укладальнік і перакладчык зборніка «Галубіная пошта» Адам Паморскі. Кнігу «Развітальны жэст Жыгімонта» ўклаў Язэп Янушкевіч, ён жа напісаў прадмову, а перакладчыкам вершаў выступіў польска-беларускі паэт Чэслаў Сэнюх. Выданні выйшлі ў двухмоўных версіях, што стала ўжо добрай традыцыяй для паэтычных польска-беларускіх зборнікаў. У 2015 г. выйшаў з друку польскі пераклад празаічнага твора пісьменніка – «Automat z wodą gazowaną z syropem lub bez» (Уроцлаў, 2015; пераклад Якуба Берната). Сёлета, як вядома, раман «Аўтамат…» увайшоў у шорт-ліст прэміі «Angelus». Кнігі намінантаў з'явіліся ў сетцы кнігарняў Empik і пачалі актыўна рэкламавацца. Сустрэчы ж, якія часам адбываюцца з Уладзімірам Някляевым у Польшчы, ладзяцца польскімі і польска-беларускімі пераважна палітычнымі і грамадскімі структурамі ў падтрымку дэмакратызацыі ў Беларусі і, адпаведна, маюць грамадска-палітычную скіраванасць.

Чаму так адбываецца? Няўжо на палітычныя імпрэзы запатрабаванне ў польскім грамадстве ёсць, а на літаратурныя няма? Адназначнага адказу на гэтае пытанне даць нельга. Немагчыма сцвердзіць, што творчасць Някляева не можа зацікавіць польскага чытача. Нават калі мы ў чарговы раз прыгадаем словы Катажыны Бартноўскай, што палякі не чытаюць паэзіі, то празаічны твор мог бы знайсці свайго чытача пры адпаведнай рэкламе і папулярызацыі беларускай кнігі ў Польшчы, чаму ўласна і спрыяюць такія літаратурныя прэміі, як згаданая вышэй «Angelus». Менавіта дзякуючы гэтай літаратурнай узнагародзе шторaз часцей згадваюцца ў Польшчы імёны беларускіх пісьменнікаў. У 2009 г. у фінале прэміі апынуўся пераклад рамана Ігара Бабкова «Адам Клакоцкі і ягоныя цені» / «Adam Kłakocki i jego cienie» (пераклад Малгажаты Бухалік). У 2011 годзе сярод іншых за перамогу ў фінале змагаліся раман Наталкі Бабінай «Рыбін горад» / «Miasto ryb» у перакладзе Малгажаты Бухалік і кніга Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча» / «Wojna nie ma w sobie nic z kobiety» ў перакладзе Ежы Чэха, гэтая другая і атрымала прэмію.

Штогод на польскім кніжным рынку з'яўляюцца новыя імёны і творы беларускіх аўтараў, а кнігі, іх аўтары і перакладчыкі становяцца таксама лаўрэатамі розных літаратурных прэмій у Польшчы. Працэс літаратурных узаемін паміж Беларуссю і Польшчай развіваецца нягледзячы на не самыя спрыяльныя палітычныя ўмовы і складаную сітуацыю культуры ў сучасным свеце ўвогуле.

Звернемся ж непасрэдна да кніжных выданняў беларускага пісьменніка Уладзіміра Някляева, адрасаваных польскаму чытачу. На самым пачатку хачу звярнуць увагу на рэч, якая звязана з літаратурнымі тэкстамі і іх перакладамі толькі апасродкавана, калі меркаваць з чыста філалагічнага гледзішча, але з'яўляецца складовай часткай кнігі, – на графічныя шаты польскіх выданняў. З першага погляду, каб не розны фармат кніг, можна было б падумаць, што гэта трохтомнік – настолькі падобны колер вокладак і іх графічнае вырашэнне. Дамінуюць шэра-блакітныя адценні ў агульным фоне, а на ім тэкст і малюнкі трох колераў – чорнага, белага і чырвонага. І калі ў выпадку з выданнямі KEW: «Галубіная пошта» і «Аўтамат» – гэта можа быць наўмысны крок, то ў сітуацыі паэтычных зборнікаў, выдадзеных у розных месцах, можна лічыць гэта цікавым супадзеннем.

У працяг разважанняў пра графічнае афармленне вокладак звернем яшчэ ўвагу на той факт, што ў кнізе «Развітальны жэст Жыгімонта» на вокладцы дубліруецца назва і прозвішча аўтара па-польску і па-беларуску, адразу паведамляючы чытачу, што выданне двухмоўнае. Зборнік «Галубіная пошта» на вокладцы мае толькі польскі надпіс, а пра існаванне яшчэ адной – беларускай паловы, мы даведваемся толькі на другой старонцы. Ёсць заўвагі і ў дачыненні да спосабу напісання прозвішча беларускага паэта па-польску і па-беларуску. Уроцлаўскае выдавецтва прапаноўвае: «Niaklajeŭ», а варшаўскае выдавецтва піша: «Niaklajeu». З беларускім варыянтам у паэтычным зборніку ва Уроцлаве зусім не справіліся, маем на другой старонцы – «Някляев».

Што датычыць уласна назваў паэтычных кніг Уладзіміра Някляева, то «Галубіная пошта», выдадзеная накладам KEW, паўтарае назву паэтычнага беларускамоўнага зборніка вершаў з 1987 года, надрукаванага ў Мінску ў серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі» выдавецтвам «Мастацкая літаратура». Мінскае выданне аб'яднала выбраныя вершы з папярэдніх зборнікаў паэта, такіх як «Адкрыццё» (1976), «Знак аховы» (1983), «Наскрозь» (1985). Верш, які даў назву і мінскаму, і уроцлаўскаму выданням узяты са зборніка «Вынаходцы вятроў» (1979), за які паэт быў узнагароджаны Прэміяй ленінскага камсамола Беларусі. У том польскіх перакладаў увайшлі вершы не толькі з пералічаных, але і з пазнейшых зборнікаў Някляева, такіх як «Прошча» (1996), «Так» (2005), «Кон» (2010). Варта, аднак, заўважыць, што ўкладальнікі, запазычыўшы назву ў ранейшага беларускамоўнага зборніка, у пэўнай ступені ўвялі чытача ў зман, таму што змест зборнікаў розны: уроцлаўскае выданне 2011 г. не з'яўляецца перакладам тых самых выбраных твораў, якія былі змешчаны ў мінскай «Галубінай пошце» 1987 года выдання. Зборнік

«Развітальны жэст Жыгімонта» мае арыгінальную назву і не паўтарае назвы беларускіх выданняў паэтычных кніг Някляева.

Затрымаемся яшчэ крыху на афармленні кніг. У зборніку «Галубіная пошта» вершы ўкладзены на ўзор выбраных твораў – раздзеламі, кожны з якіх мае назву выдадзенага раней зборніка і прадстаўляе тэксты з іх. Такі падзел (вельмі, дарэчы, слушны) прадугледжвае звычайна наяўнасць у кнізе так званых шмуцтытулаў і калантытулаў на кожнай асобнай старонцы. На жаль, у зборніку «Галубіная пошта» тое, што мелася быць шмуцтытулам прысутнічае ў выглядзе вельмі невыразнага калантытула, змешчанага толькі адзін раз – па-над першым вершам з таго ці іншага тома. Яго можна і зусім не заўважыць, і тым больш цяжка трымаць увесь час у галаве, пакуль чытаеш наступныя творы з дадзенага раздзела. У зборніку «Развітальны жэст Жыгімонта» падзел на раздзелы зроблены паводле жанраў – «Вершы», «Песні» і «Паэмы», у асобны раздзел вылучаны таксама «Варшаўскія вершы». У большай частцы вершаў пазначаны год напісання.

Вельмі добра для паэтычнага выдання, як нам здаецца, змяшчаць кожны верш на асобнай старонцы. У двухмоўных паэтычных выданнях, такім чынам, мы маем з левага боку беларускі тэкст, з правага – пераклад на польскую мову. Менавіта так укладзены зборнік «Галубіная пошта» ўключна са зместам напрыканцы кнігі.

У «Развітальным жэсце» таксама злева знаходзіцца беларускі, а справа – польскі варыянт, але на адной старонцы можа быць змешчана два, а нават і тры невялікія па памеры вершы. Такое нагрувашчанне тэкстаў часткова перашкаджае чытанню і ўспрыняццю паэзіі. Умоўна кажучы, няма неабходнай паўзы паміж асобнымі паэтычнымі творамі. Найгорш у зборніку зроблены змест, дзе ў адным радку змешчаны і польская, і беларуская назвы верша, а таксама пададзены адразу дзве лічбы – нумары старонак да кожнай моўнай версіі. Можна, канечне, сказаць, што варшаўскія выдаўцы бераглі лес за кошт эканоміі паперы, але паэзія патрабуе больш прасторы, якой, у сваю чаргу, уроцлаўскія выдаўцы пакінулі зашмат: на старонцы фармату А4 часта знаходзіцца зусім невялікі (напрыклад, чатырохрадковы) верш.

Варта яшчэ некалькі слоў сказаць пра перакладчыкаў. Адам Паморскі – старшыня польскага ПЭН-цэнтру, вядомы польскі перакладчык рускай літаратуры, а таксама перакладчык і папулярызатар беларускай літаратуры. Чэслаў Сэнюх – польскі беларус, перакладчык беларускай літаратуры на польскую мову, перакладаў творы Якуба Коласа («Новая зямля»), Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Янкі Брыля. Раман Някляева «Аўтамат з газіроўкай…» пераклаў на польскую мову журналіст, супрацоўнік тэлеканала «Белсат» – Якуб Бернат. Напярэдадні ўручэння прэміі «Angelus 2016» ён прызнаваўся ў інтэрвью: «Nigdy nie studiowałem filologii, a białoruskiego nauczyłem się podczas pracy w Bielsacie. Uładzimir Niaklajeu jest zaś poetą i ma bardzo poetycki styl pisania, który niezwykle ciężko przełożyć w takiej samej formie. Postanowiłem wiec go uprościć, by czytało się dobrze polskiemu

czytelnikowi nieprzyzwyczajonemu do poetyckiej natury autora» [1]. Заўважым, што «спрашчэнне» не найлепшы падыход да перакладу нават празаічнага твора, тым больш, калі аўтар – паэт.

Цяпер пяройдзем да вершаў, якія ўвайшлі ў склад перакладных зборнікаў. Тут варта падкрэсліць той факт, што дастаткова значная колькасць вершаў прадублявана. Мы не выступаем супраць існавання ў межах адной культуры некалькіх перакладаў таго самага твора, наадварот, варта адкрыта вітаць такую з'яву. Ва ўсякім разе розныя пераклады з'яўляюцца вельмі каштоўным матэрыялам для перакладазнаўства, але ў дадзеным выпадку хацелася б пабачыць большую колькасць перакладзеных вершаў.

Напрыканцы агульных звестак пра перакладныя паэтычныя зборнікі Някляева і іх змест варта дадаць, што ў абодвух паэтычных выданнях змешчана таксама слова Някляева ў судзе пасля прэзідэнцкіх выбараў на Беларусі 2010 г. У «Развітальным жэсце Жыгімонта» ёсць таксама прадмова па-беларуску і яе пераклад на польскую мову ўкладальніка Язэпа Янушкевіча, напрыканцы змешчана слова ад перакладчыка па-польску і рэзюмэ па-ангельску.

Цікава яшчэ звярнуць увагу на пэўную акалічнасць. Выданні рыхтаваліся адначасова і незалежна адно ад другога, а на адваротах вокладак выдаўцы змясцілі наступную інфармацыю. «Галубіная пошта»: «To **pierwszy** w Polsce **tak obszerny** wybór wierszy Uładzimira Niaklajewa...»; «Развітальны жэст Жыгімонта» «**pierwsze dwujęzyczne** wydanie twórczości Niaklajeua poza granicami jego ojczyzny». Атрымліваецца, што абодва зборніка ў нечым «першыя», але нагадаем, што ў анталогіі 2008 г. «Чала я не хіліў прад сілай» былі надрукаваныя ў дзвюх моўных версіях тры вершы і ўрывак з паэмы «Прошча» ў перакладзе Адама Паморскага (усе гэтыя пераклады ўключаны ў «Галубіную пошту»), а таксама ўрывак з паэмы «Паланэз» у перакладзе Чэслава Сэнюха. Пра самае першае з'яўленне вершаў Някляева на польскай мове згадвае Гражына Харытанюк у «Бібліяграфіі беларускай літаратуры ў Польшчы да 1994 г.», дзе падае інфармацыю пра публікацыю перакладаў Тадэвуша Хрусьцялеўскага ў часопісе «Literatura Radziecka» (1983, № 3, s. 86). Згадаем і першы пераклад апавядання Някляева «Кот…» у альштынскай анталогіі 2004 года. Зразумела, што для рэкламных тэкстаў гэтая інфармацыя не зусім прыдатная, але, магчыма, не варта рабіць акцэнт на тым, што выданне «першае», а пашукаць іншыя магчымасці прыцягнуць увагу большай колькасці чытачоў.

З-за абмежаванага памеру дадзенага артыкула мы не будзем разглядаць пераклад рамана, а звернемся толькі да асобных паэтычных прыкладаў. На пачатку адзначым, што беларуская паэзія ў польскіх перакладах часта губляе свой рытмічны малюнак, які перадае не толькі майстэрства вершапісання, але часта абумоўлены мелодыкай самой мовы, на якой створаны арыгінал. У выпадку з тэкстамі паэта-песенніка Уладзіміра Някляева рытміка і мелодыка верша з'яўляюцца той неад'емнай складовай часткай твора, якая

стварае тое, што і называецца паэзіяй. Гнуткасць, меладычнасць някляеўскіх інтанацый часта перахопленая, як перавяслам, зламаным радком. Польскія перакладчыкі часта не маюць магчымасці паўтарыць рытм беларускага верша з-за асаблівасцей самой польскай мовы – фіксаванага націску. Возьмем адзін прыклад. Невялікі двухстрофны верш Някляева «Над вадой». Ніжэй пададзены арыгінальны тэкст і польскія пераклады.

У. Някляеў		
Над вадой		
Сьвятая, запаветная,	Przejrzysta, święta,	Święta i swoja własna,
Уся ў сабе сама,	upragniona,	Z siebie samej wynika
Вада	Sama w istności swej,	Woda
такая сьветлая,	Ta woda	taka już jasna,
Нібы яе няма.	taka prześwietlona,	Że aż w niebyt umyka.
	Jakby nie było jej.	
І да сьвятла		Do światłości
празрыстая,	Od światła jasna,	przejrzysta,
Уся сама ў сабе,	promienista,	w siebie samą tchnie
Душа	Sama w istności swej,	życie
такая чыстая,	Ta dusza	Dusza
Нібы няма яе.	taka przezroczysta,	taka już czysta,
	Jakby nie było jej.	Że aż niknie w niebycie.
	Пераклад *Ч. Сэнюха*	Пераклад *А. Паморскага*

Трэці радок у кожнай страфе разбіты графічна на два, вылучаючы і акцэнтуючы паўзай істотныя для сэнсавай напоўненасці твора лексемы – *вада* і *душа*. Цікава, што абедзьве страфы складаюцца пераважна з тых самых слоў, аўтар змяняе толькі іх парадак у сказе (радку), адрознымі, але вельмі блізкімі па значэнні, з'яўляюцца першы і трэці радкі, у якім «вада» – «святая, запаветная» і «такая светлая», а «душа» – «да святла празрыстая» і «такая чыстая». У другім і чацвёртым радках «вада» і «душа» выглядаюць, як блізняты: «уся ў сабе сама/уся сама ў сабе», «нібы яе няма/нібы няма яе».

Параўнаем цяпер з тым, што атрымалася ў перакладах. У абодвух перакладах захаваная «прыступка» ў трэцім радку, якая стварае дадатковую паўзу і кладзе дадатковы сэнсавы націск. У тэксце перакладу Чэслава Сэнюха двойчы паўтораны тыя самыя другі і чацвёрты радкі ў першай (пра ваду) і ў другой (пра душу) страфе без змены парадку словаў: «sama w istności swej» і «jakby nie było jej». Адсутнасць перастаноўкі, як аднаго з прыёмаў наяўнага ў арыгінале, істотна збядняе тэкст перакладу. Хаця менавіта ў гэтых радках ажыццёўлена спроба захаваць арыгінальны рытмічны малюнак – з націскам на апошні склад. Акрамя таго, у польскім тэксце Сэнюха замест абстрактных элементаў паэтычнага свету Някляева, якімі ёсць «вада» і «душа», з'яўляюцца не акрэсленыя больш дакладна «ta woda» і «ta dusza».

Адам Паморскі спрабуе перадаць аўтарскі прыём, замяняючы «гульню словамі» на «гульню сэнсамі», у радках замест перастановак адбываюцца

частковыя замены лексічнага складу, якія не змяняюць выказвання сутнасна: «Z siebie samej wynika / w siebie samą tchnie życie» і «Że aż w niebyt umyka / Że aż niknie w niebycie». І хоць перакладчык не паўтарае дакладна рытмічны малюнак верша, такі падыход бачыцца нам больш удалым.

Звернем увагу на выкарыстаную ў тэксце яшчэ адну лексему – «няма». У культурнай прасторы беларусаў апошніх дзесяцігоддзяў за справай Валянціна Акудовіча гэтая лексема набыла асаблівую выразнасць, сталася ў пэўнай ступені знакам, маркерам беларускага «коду адсутнасці». І гэта момант «непераклададальнасці», з якім таксама даводзіцца змагацца перакладчыкам.

Асобна хацелася б разгледзець цыкл «Варшаўскіх вершаў» з тому «Развітальны жэст Жігімонта». З 1999 г. Някляеў жыў нейкі час у Польшчы, менавіта тут былі напісаны творы, якія пазней склалі зборнік «Так» – адны з іх трапілі ў раздзел «Вершы», але большая частка – у «Варшаўскія вершы», у склад якіх увайшлі таксама вершы з кнігі «Кон» і інш. Некаторыя назвы вершаў варшаўскага цыкла гавораць самі за сябе: «Вуліца Варшаўскай бітвы», «Лазенкі», «Новы Сьвят». Варшава з'яўляецца месцам дзеяння ў вершы «Устаць. Прыбрацца. Выпіць каву…». І тут мы назіраем тое, што можна назваць падвоеным пераламленнем: калі паэт выкарыстоўвае ў сваёй творчасці вобразы, запазычаныя з гісторыі, культуры, штодзённасці сучаснай Польшчы, яны праходзяць працэс творчага пераасэнсавання і на выхадзе знаёмяць беларускага чытача з польскімі культурнымі знакамі і рэаліямі, а потым адбываецца «вяртанне» запазычаных элементаў у радзімую культуру праз пераклад, на выхадзе тэкст прапаноўвае польскаму чытачу «беларускі» погляд, назіранне збоку, але пры гэтым трэба памятаць, што арыгінальны (беларускі) тэкст прайшоў творчую пераапрацоўку ў працэсе перакладу.

Гучаць у варшаўскіх вершах традыцыйныя для эмігранцкай паэзіі матывы непрыязнай чужыны, адзіноты, тугі па радзіме ў такіх творах, як «Чэрствым хлебам чужыны», «Самалёт», «Успамін пра Беларусь над магілай Манэргейма». У гэтым самотным эмігранцкім стане паэт заўважае і адчувае блізкасць Бога – «Калі пісаць», «Церні», «Я спытаўся ўчора ў Бога», «Анёлы», «Апостал».

Затрымаемся на адным вершы – «Чэрствым хлебам чужыны», які ў зборніку «Развітальны жэст Жігімонта» мае крыху іншы варыянт: замест «чэрствага» ў тэксце арыгінала маем «чорны хлеб» (іншая аўтарская версія ці памылка ўкладальніка?), але менавіта гэты вобраз нас цікавіць у перакладах. У зборніку «Галубіная пошта» першы радок выглядае наступным чынам: «Чэрствым хлебам чужыны, які здабываю штодня» і ягоны пераклад у выкананні Паморскага – «Po okruchy gorzkiego na obczyźnie chleba / Który co dzień zdobywam...». Так «чэрствы хлеб чужыны» ператварыўся ў «okruchy gorzkiego na obczyźnie chleba». У арыгінале маем выразна «хлеб чужыны», у перакладзе – гэта нібыта той самы хлеб, ад якога на чужыне засталіся толькі горкія акрушкі. У Чэслава Сэнюха, для якога адпраўным пунктам быў радок «Чорным хлебам чужыны, які здабываю штодня…», атрымалася так: «Na chleb powszedni w obczyźnie, który co dnia zdobywam». Хлеб у дадзенай

версіі не «чорны» і не «чэрствы», а звычайны, штодзённы, прычым гэта зусім непатрэбна падкрэслена перакладчыкам двойчы – «powszedni» і «co dnia zdobywam».

У развагах даследчыкаў пра пераклад паэзіі часта сустракаецца думка, што перакладчык – гэта супернік паэта. Напэўна добра, калі гэтак здараецца. Увесці тэкст у новую культурную прастору, захаваць (па магчымасці) арыгінальныя культурныя коды, зрабіць іх чытэльнымі для чытача перакладу альбо знайсці для іх адпаведнікі і эквіваленты – гэта не самая лёгкая задача, якая патрабуе не толькі добрага валодання мовай арыгінала і мовай перакладу, але і высокім майстэрствам вершаскладання, адчуваннем таго, чым ёсць сапраўдная паэзія, калі «простыя словы» і «простыя рэчы» адкрываюць чытачу невядомыя раней сэнсавыя адценні. На жаль, пераклад не заўсёды дорыць арыгінальнаму тэксту жыццё ў свеце іншамоўнай культуры. Здараецца, што пры перакладзе тэкст цалкам губляе тое, што было паэзіяй, нягледзячы на захаваныя фармальныя прыкметы, такія як рытм, рыфма і метр. Верш Някляева «Здабыў я ўрэшце волю на зямлі» ў працэсе перакладу на польскую мову, ажыццёўленага Чэславам Сэнюхам, страціў усё: рытм, рыфму, мелодыку. Засталася філасофія, але, адарваная ад паэтычнай формы, яна ўжо не ўспрымаецца так бліскуча, як у арыгінале.

Здабыў я ўрэшце волю на зямлі. Сябры былі. Каханыя былі. Іх стала меней. Адзіноты – болей… І гэта ўсё, бадай, што я займеў ад волі.	Zdobyłem wreszcie wolność na tej ziemi. Przyjaciół miałem. Kochanki miałem. Teraz ich mniej. Za to więcej samotności... To bodaj wszystko, co mam od wolności.

Шкада толькі, што з усіх пералічаных вышэй польскіх выданняў, ніводнае не дачакалася грунтоўнай рэцэнзіі, адзінае выключэнне – прысвечаны апавяданню «Кот…» артыкул Дзмітрыя Клябанава [2], галоўным недахопам якога з'яўляецца той факт, што гэта чарговая спроба беларуса патлумачыць польскаму чытачу нашу беларускую літаратуру. Дзеля рэальнага засваення нашай літаратуры польскай культурнай прасторай патрэбны погляд знутры, аналіз перакладных тэкстаў носьбітамі арыгінальнай польскай культуры.

ЛІТАРАТУРА

1. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://belsat.eu/pl/news/bialoruska-powiesc-w-tlumaczeniu-naszego-redakcyjnego-kolegi-walczy-o-angelusa. – Дата доступу : 29.10.2016.
2. *Klabanau, D.* Lektura dla myszy, ale nie tylko: władza w ujęciu Uładzimira Niaklajeua (na podstawie satyry „Kot w worku [* z ogonem średnio długim i średnio puszystym]" / D. Klabanau // Galeria. Częstochowski magazyn literacki Literackiego Towarzystwa Wzajemnej Adoracji „Li-TWA". – 2015. – № 35. – S. 94–99.

А. У. Таболіч (Мінск)

ЗАХАВАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ ПАЭТЫЧНАГА СІНТАКСІСУ ПРЫ ПЕРАКЛАДЗЕ
(на матэрыяле англійскай і беларускай моў)

Паэтычны тэкст мае свае асаблівасці на розных этапах яго стварэння і перакладу на іншыя мовы. Пры перакладзе неабходна перадаць не толькі фанетычныя і лексічныя асаблівасці верша, але і яго сінтаксічную будову. Сінтаксіс паэтычнай мовы таксама мае свае правілы ў перадачы розных адценняў выразнасці.

Сінтаксічныя структуры англійскай і беларускай моў характарызуюцца як агульнымі рысамі, так і значнымі адрозненнямі ў сваёй будове. І гэта не дзіўна, бо мовы належаць да розных тыпалагічных груп паводле сінтаксічнага складу. Як адна з моў аналітычнага складу, англійская мова мае цвёрды парадак слоў, а адхіленні ад правіл носяць экспрэсіўны характар. Інверсія мае лімітаваны характар, нават у паэзіі. Іншымі паказчыкамі адрозненняў можна лічыць прэпазіцыю і постпазіцыю прыметнікаў. На аснове гэтага мовы супрацьпастаўляюцца як мовы са свабодным парадкам слоў (беларуская) і «пазіцыйныя мовы», мовы з перавагай прэпазіцыі прыметнікаў (англійская) і мовы з постпазіцыяй прыметнікаў (польская) [1, с. 186].

Не толькі тропы (лексічныя выразныя сродкі), але і элементы паэтычнага сінтаксісу ўзмацняюць выяўленчыя магчымасці паэтычнай мовы, надаюць ёй розныя эмацыянальна-экспрэсіўныя адценні. Іх называюць стылістычнымі фігурамі. Яны адыгрываюць пэўную мастацкую ролю ў тэксце, дапамагаюць вобразнаму выражэнню думак і пачуццяў паэта.

Як захаваць элементы паэтычнага сінтаксісу ў перакладзе? І ці магчыма гэта ў перакладзе англамоўнай паэзіі на беларускую мову і наадварот? Якія спосабы перадачы стылістычных фігур існуюць пры перакладзе паэзіі? На некаторыя з гэтых пытанняў мы паспрабуем адказаць шляхам аналізу перакладзенай англамоўнай паэзіі на беларускую мову і беларускамоўнай паэзіі на англійскую.

Калі для перакладу бярэцца не асобнае слова або граматычная форма, а спалучэнне моўных адзінак, для перакладчыка ўзнікаюць складаныя моманты, якія тлумачацца двума фактарамі: несупадзеннем правіл лексіка-семантычнай спалучальнасці і розніцай у правілах сінтаксічнай спалучальнасці. У такім выпадку перакладчыку неабходна зрабіць выбар – захаваць від словазлучэння, зрабіць частковае пераўтварэнне ці прымяніць поўнае пераўтварэнне [2, с. 190].

Поўны пераклад выкарыстоўваецца тады, калі правілы спалучальнасці супадаюць у мовах. Так, напрыклад, назва верша Максіма Багдановіча «Першае каханне» перакладаецца як «The First Love». Частковы пераклад мае некалькі варыянтаў: скарачэнне, гэта значыць пропуск элементаў словазлучэння («April Rise»/«Красавік») (A. Henry), пашырэнне, гэта значыць дабаўленне

элементаў у словазлучэнні («The Seasons»/«Поры года») (I. Russel), функцыянальная замена, гэта значыць змена лексіка-семантычнага або марфалагічнага статусу элементаў словазлучэння («Wrapped In Winter»/«Зімовае ўбранне») (G. Schultz), перастаноўка, змена парадку слоў у рамках словазлучэння («Love's Philosophy»/«Філасофія кахання») (P. B. Shelly) [3].

Скарачэнні дыктуюцца складовай структурай радка. Напрыклад, пры перакладзе радка *What is this life, if full of care...* з верша «Leisure»/ «Адпачынак» Уільяма Дэйвіса словазлучэнне *full of care* перакладаем як *у турбоце* (W. Davies). Радок з верша Антаніны Хатэнка *Мой Божа, Волю звыш прымаю* перакладаецца як *God, I accept the Will of Heaven* [4, p. 249].

Цяжкую праблему пры перакладзе з англійскай мовы на беларускую і наадварот ствараюць атрыбутыўныя словазлучэнні, якія патрабуюць дэталёвага аналізу перад перакладам. Напрыклад, радок *Green grasses grow* з верша Лэнгстана Х'юза «Silver Rain»/«Срэбны дождж» перакладаем як *Трава зазелянее* замест *Вырасце зялёная трава* (L. Hughes). Англійская перакладчыца Вера Рыч пісала ў адным з артыкулаў, што пры перакладзе беларускай паэзіі ў яе найбольшыя цяжкасці выклікалі беларускія «каляровыя» дзеясловы тыпу *чырванець*, *зелянець*, бо такіх дзеясловаў у англійскай мове няма [5, p. 45]. І пры перакладзе трэба мець гэта на ўвазе.

Яшчэ складаней перакладаць сказ, бо ў сказе існуе парадак слоў, які адрозніваецца ў англійскай і беларускай мовах. Калі ў беларускай мове парадак слоў адносна вольны, то ў англійскай мове ён фіксаваны. Праўда, у паэзіі правіла можа парушацца, але толькі ў некаторых выпадках.

Прыгадаем інверсію, перастаноўку слоў на нязвыклае для іх месца ў сказе. Інверсія надае фразе асаблівую інтанацыю, дапамагае лагічна і эмацыянальна падкрэсліць найбольш значныя словы і выразы. У беларускай мове гэта пастаноўка выказніка перад дзейнікам, азначэння – пасля азначаемага слова, дапаўнення – перад выказнікам. У вершы Алега Мінкіна ёсць такі сказ: *Які гэта жаль бачыць / у стылай імгле / сад абляцелы амаль*. У перакладзе Веры Рыч сказ гучыць наступным чынам: *It's painful when I see there / wrapped in the cold clammy mist / the orchard that stands all but bare* [4, p. 145]. Як бачым, словазлучэнне «назоўнік + прыметнік» (*сад абляцелы*) перакладаецца сказам. У англійскай паэзіі парадак слоў часта падпарадкоўваецца рытміка-інтана-цыйнай структуры радка і структуры рыфмы. У вершы Роберта Бёрнса «Bonny Bells»/«Прыгожыя званочкі» ёсць радок: *Fresh over the mountains breaks forth the morning* (R. Burns). Гэты радок можна перакласці сказам з прамым парадкам слоў (*Празрысты ранак прабіваецца праз горы*), але такога, як у арыгінале, эфекту не атрымаем. Мабыць, больш блізкім варыянтам перакладу быў бы наступны: *Празрысты прабіваецца праз горы ранак*. Перакладаючы з беларускай на англійскую мову, трэба трымацца па магчымасці англійскага парадку слоў, як напрыклад: *Калі ўжо аціх лістападавы шал... – When the whirlwind of leaves falling down grew calm…*; *Божа, калі ты пачуеш літаны мае*? *– O God, when wilt Thou listen to my litanies?* [6, с. 26, 60].

Своеасаблівым сінтаксічным сродкам выразнасці лічыцца паралелізм, прыём паралельнага размяшчэння аднатыпных па сваёй будове элементаў паэтычнага тэксту як, напрыклад, у вершы Янкі Купалы «Песня», дзе супастаўляюцца прыродныя з'явы з жыццём маці і яе сына. Гэты прыём абавязкова захаваць у перакладзе:

Там, гэй, на ліпе, на расахатай, / Птушка гняздо ўе, будуе, / Там у хаціне, там у пахілай / Маці сыночка гадуе;

There, in the linden which is branchy, / A bird is making a nest, / There, in a poor hut which is bending, / Mother is raising her son (пераклад А. Таболіч).

Розныя віды паўтораў – тыповая з'ява для паэтычнай мовы. Паўтараючы асобныя словы і фразы, паэт падкрэслівае іх значнасць. Паўторы не вельмі цяжка захаваць пры перакладзе. Гэта і робіць Алесь Разанаў пры перакладзе паэмы Томаса Стэрна Эліята «Ash Wednesday»/ «Попельная Серада»:

Because I do not hope to turn again / Because I do not hope / Because I do not hope to turn;

Бо не маю надзеі вярнуцца ізноў / Бо не маю надзеі / Бо не маю надзеі вярнуцца [7, с. 49].

Паўторы бываюць рознымі: метр, алітарацыя, паўтор марфем, слоў і фраз, паўтор канструкцый. Як прыклад возьмем радкі з санета XVIII Уільяма Шэкспіра:

So long as men can breathe or eyes can see, / So long lives this and this give life to thee.

У перакладзе Уладзіміра Дубоўкі яны гучаць наступным чынам: *Ты будзеш жыць, аж покуль будуць людзі, / І будуць вочы бачыць, дыхаць грудзі*.

Як бачым, у перакладзе паўтор захаваўся толькі ў слове *будуць*. А другі радок пераўтвораны моцна дзеля рыфмы.

У паэме «Song of Hiawatha»/«Спеў аб Гаяваце» Генры Лангфэла паўтор стварае фальклорны каларыт і надае вершу песенную рытмічнасць. Для захавання гэтай асаблівасці ў перакладзе Аркадзь Куляшоў таксама карыстаецца паўторам першага прыназоўніка, але словазлучэнне з другім прыназоўнікам (*of*) трансфармуецца ў іншую структуру:

With the odors of the forest, / With the dew and damp of meadows, / With the curling smoke of wigwams, / With the rushing of great rivers (H. Longfellow);

Дзе народжаны легенды / З іх лясным духмяным пахам, / З халадком лугоў вільготных, / З мірным дымам над вігвамам [8, с. 17].

Стылістычная фігура шматзлучнікавасці, паўтарэння злучнікаў паміж аднароднымі членамі сказа, часта запавольвае тэмп паэтычнай мовы, надае вершу ўзнёсласць і падкрэслівае сэнс кожнага слова. Напрыклад:

І пушча, і поле, і рэкі тут чулі, / Як Цётка спявала, як марыў Бядуля, / Як слёзы рассыпаў Мацей Бурачок (П. Броўка);

And pushchas, and fields, and rivers – all heard / How Tsiotka was singing, Biadulia was dreaming / How tears were shed by Matsey Burachok (пераклад А. Таболіч).

Злучнік паўтараецца і ў вершы «Journey of the Magi»/«Паломніцтва вешчуноў» Томаса Стэрна Эліята, дзе ён апісвае цяжкі шлях да сапраўдных хрысціянскіх каштоўнасцей. Верш напісаны *verse libre* і пабудаваны на пэўным сінтаксічным рытме. Цяжкасць заключаецца ў тым, як перастварыць тэкст арыгінала сродкамі беларускага сінтаксісу так, каб дасягнуць адпаведнага эстэтычнага эфекту:

And the night-fires going out, and the lack of shelters, / And the cities hostile and the towns unfriendly / And the villages dirty and charging high prices; / A hard time we had of it;

І начныя кастры затухалі, і схавацца не было дзе, / І варожасць гарадоў, і няветлівасць мястэчкаў, / І бруд у вёсках, і высокія цэны ўсюды – / Вельмі цяжкі час быў у нас.

Тут паўтор злучніка падкрэслівае адну за другой цяжкасці на шляху да святыняў, а інверсія дапаўнення ў заключным радку ўзмацняе эфект [7, с. 63].

З беларускай мовы прывядзем пераклад з верша Таццяны Сапач, зроблены Верай Рыч, дзе падкрэсліваецца займеннік *мы*:

Мы – дзеці чорнага горада, / Мы выйшлі з ягонага чэрава, / Мы сталі ягоным голасам;

We are children of a black city, / We have come out of its belly, / We have become its voice [6, с. 18].

Такія паўторы называюцца анафарай. Кальцавая анафара таксама мае месца ў паэзіі. Напрыклад, у вершы Альфрэда Тэнісіна «Званіце, званы»:

Ring out, wild bells, to the wild sky, / The flying clouds, the frosty light, / The year is dying in the night, / Ring out, wild bells, and let him die! (A. Tennison);

Званіце, дзікія званы / Аж да аблокаў, што плывуць. / Год памірае уначы, / Званіце, дзікія званы! (пераклад А. Таболіч).

Эпіфара – паўтарэнне слоў або выразаў у канцы паэтычнага твора. Эпіфара звычайна падкрэслівае, узмацняе агульны каларыт твора. Напрыклад, у вершы «Spring»/«Вясна» Уільям Блэйк у кожнай страфе паўтарае *Merrily, merrily to welcome in the Year*. Пераклад павінен захаваць гэтую асаблівасць: *Весела, весела, весела ўсім!*.

Фігура, калі паўтараецца слова на стыку дзвюх канструкцый, называецца падхватам, які, па-першае, паказвае сувязь паміж дзвюма ідэямі, а, па-другое, узмацняе экспрэсіўнасць і рытм. Як прыклад, прыгадаем радкі з верша Джона Кітса «Ode on a Grecian Urn»/«Ода грэчаскай вазе» [9, p. 213–214]:

Beauty is truth, truth beauty, – that is all / Ye know on earth, and all ye need to know;

Прыгажосць – праўда, праўда – прыгажосць, / Вось і ўсё, што трэба ведаць вам, зямлянам.

Супрацьлеглы працэс (бяззлучнікавасць) назіраецца пры адсутнасці злучнікаў. У вершы Роўзмары Гарлэнд «Rainbow»/«Вясёлка» выкарыстоўваецца пералік без злучнікаў, што падкрэслівае прыгажосць вясёлкі з яе непаўторнымі колерамі, якія плаўна пераходзяць адзін у другі:

Violet, indigo, blue and green, / Yellow, orange and fiery red... (R. Garland);

Фіялкавы, кубавы, зялёны і сіні, / Жоўты, аранжавы, ярка-чырвоны.

У адным з апошніх вершаў Рыгора Барадуліна ёсць пералік розных вобразаў Радзімы. Аўтар нават не ставіць косак перад словамі пераліку, а каб падкрэсліць іх, раздзяляе іх кропкамі [10, с. 548]:

Песня пеўня. / Серп маладзічка. / Годная шляхцянка брукаванка. / Тая ж тумановая фіранка. / Гулкая гамонка малатка;

Songs of the cock. / The sickle of the moon. / The worthy ladylike cobbled street. / The curtain veiled in mist. / The resonant voice of a hammer (пераклад А. Таболіч).

Неабходна звярнуць увагу на стылістычную ролю адмоўя. Па-першае, яно сведчыць пра ўсхваляванасць, ажыўленасць героя, па-другое, робіць радок лаканічным. У вершы М. Арнольда адмоўе мае эмацыянальнае адценне адчаю:

Eh, love, let us be true / To one another! For the world… / Hath really neither joy, nor love, nor light, / No certitude, no peace, no help for pain. (M. Arnold);

Любая, давай гаварыць праўду / Адзін аднаму! / Бо ў свеце... / Няма любові, няма і радасці, / Няма веры, няма спакою, няма ратунку ад болі (пераклад А. Таболіч).

У вершы пра маці Рыгор Барадулін пры дапамозе адмоўя перадае свой сум і нявыказаны боль:

Сказаць мне слоў апошніх не змагла, / Я не пачуў, што гаварылі вочы. / Была хвароба прыжывалкай ціхай, / А не было каму падаць вады [Там жа, с. 428];

You had no chance to say your parting word, / I did not feel what eyes had me to teach. / The illness dwelled as sponges in the heart / But no one came to quench my mother's thirst (пераклад М. Савіцкага).

Шматпрыназоўнікавасць дазваляе вылучыць інтанацыйна словы і выразы і надае ім адпаведную экспрэсіўнасць. Як прыклад прыводзім радкі з верша Уладзіміра Арлова:

У спакоі тваіх вачэй, / У смаку тваіх слёз, / У таемнасці тваіх слоў;

In the peace of your eyes, / In the taste of your tears, / In the mystery of your words (пераклад В. Рыч).

Рытарычнае пытанне мае сваёй мэтай звярнуць увагу чытача на тую ці іншую з'яву. Прыклад з верша Таццяны Сапач «Вясна»:

Хто цябе намалюе, / Бяссоньне вясновай начы?;

Who can paint you, ever, / O insomnia of the spring night? (пераклад В. Рыч).

Паэтка сцвярджае, што намаляваць бяссонне немагчыма, бо гэта «спалоханы голас, зацятая цемра, звыклы страх і змора».

Роберт Брыджэс перадае пачуццё жалю і суму па мінулых шчаслівых днях, калі прырода поўнілася прыгожым жыццём. У вершы «Салаўі»/ «Nightingales» ён пісаў:

Where are those starry woods? / O might I wander there, / Among the flowers, which in the heavenly air / Bloom the year long! (R. Bridges);

Дзе ж зорныя лясы, каб мог блукаць там я / Сярод чароўных кветак, якім цудоўнае паветра / Дае жыццё ўвесь год! (пераклад А. Таболіч).

У перакладзе рытарычнае пытанне можна перадаць таксама адмоўным сказам, як гэта зрабіў У. Дубоўка ў XVIII санеце Шэкспіра:

Shall I compare thee to a summer's day? – Я з летнім днём цябе не параўнаю.

Дарэчы, Самуіл Маршак захоўвае рытарычнае пытанне: *Сравню ли с летним днём ее черты?*.

Рытарычны зваротак мае наступную сутнасць: падкрэсліць зваротак з мэтаю ўзмацнення выразнасці верша. Захаваць такі зваротак пажадана ў перакладзе.

А рытарычны вокліч ужываецца як эмацыянальная рэакцыя на пэўную падзею. Таццяна Сапач ужывае рытарычны вокліч каб выказаць сваё захапленне падзеяй:

О Час пераможных шэсьцяў – / Крышацца брукі ад маршаў;

O time of victorious processions – / The pavements crackle with marshes! (пераклад В. Рыч).

Сутнасць умаўчання ў паэтычнай мове – выконваць розныя функцыі, сярод якіх можна назваць такую, як даць магчымасць чытачу самому разважаць над працягам. Пімен Панчанка заканчвае сказ менавіта з такой мэтай:

Бадзяешся, цікавішся / І праўдаю, і казкамі... / Музеі ватыканскія, / Халупы афрыканскія…;

We wander and get interested / In real things and fairy tales… / Museums in Vatican, / Shabby huts in Africa… (пераклад А. Таболіч).

У вершы «Маналог пад калядны блюз»/«Talking After Christmas Blues» Эйдрыян Хенры ставіць мэту падкрэсліць кожны момант святочнага каляднага стала і выказаць свае пажаданні:

There was whisky / vodka / dry Martini /…and 12 New Year resolutions / all of them about you (A. Henry);

Была гарэлка, / віскі, / сухое віно Марціні /...і дванаццаць навагодніх пажаданняў / звязаных толькі з табою [3].

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што роля паэтычнага сінтаксісу ў перадачы розных эмоцый даволі значная. І перадаць сінтаксічныя асаблівасці верша пры перакладзе таксама важна для захавання эстэтычнай функцыі. Але мовы адрозніваюцца ў спосабах выражэння розных сінтаксічных сродкаў. У перакладзе з беларускай на англійскую мову найцяжэйшым момантам нам бачыцца пераўтварэнне інверсіі і пераклад розных прыназоўнікаў, якія значна адрозніваюцца ў параўнаных мовах, а ў перакладзе з англійскай на беларускую мову значную цяжкасць ствараюць марфалагічныя адрозненні і рытмічная будова англійскага радка, якія моцна ўплываюць на сінтаксічную структуру верша.

ЛІТАРАТУРА

1. *Сцяцко, П. У.* Уводзіны ў мовазнаўства : дапаможнік / П. У. Сцяцко. – Гродна : Гродз. дзярж. ун-т, 2001. – 229 с.

2. *Казакова, Т. А.* Практические основы перевода / Т. А. Казакова. – СПб. : Союз, 2000. – 320 с.

3. *Таболіч, А. У.* Срэбны дождж / А. У. Таболіч. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 1999. – 112 с.
4. Poems on Liberty / Reflections for Belarus / transl. V. Rich. – Prague : Radio Free Europe / Radio Liberty, 2004. – 312 p.
5. *Rich, V.* Slutskija Tkačykhi – A Translator's View / V. Rich // Zapisy 22. – N. Y., 1996. – P. 45–58.
6. *Сапач, Т.* Няхай не пакіне нас Восень : вершы / Т. Сапач ; пер. В. Рыч. – Мінск : Медысонт, 2008. – 72 с.
7. *Таболіч, А. У.* Ліхтарык глогу : пераклады English – Belarusian / А. У. Таболіч. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2006. – 108 с.
8. *Лангфэла, Г.* Спеў аб Гаяваце : паэма / Г. Лангфэла ; пер. А. Куляшова. – Мінск : Маст. літ., 1994. – 157 с.
9. *Keats, J.* Selected Poems / J. Keats. – London : Penguin Books Ltd, 1996. – 247 p.
10. *Барадулін, Р.* Et Orbi Omini / І свету ўсяму // Р. Барадулін. – Мінск : Рым.-катал. парафія Св. Сымона і Св. Алены, 2016. – 680 с.
11. *Таболіч, А. У.* Таямніцы мастацкага перакладу / А. У. Таболіч. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 148 с.

В. У. Фурс (Мінск)

ЛЕКСІЧНЫ СКЛАД СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ БІБЛІЙНЫХ ПЕРАКЛАДАЎ: КРЫНІЦЫ ФАРМІРАВАННЯ

Вывучэнне мовы біблійных перакладаў на пачатку XXI ст. з'яўляецца працягам традыцый, закладзеных у беларускай біблеістыцы даследчыкамі перакладаў Ф. Скарыны і В. Цяпінскага, канфесійных твораў часоў Адраджэння і Рэфармацыі. Дыскусіі ў друку, абмеркаванне пытанняў пра творчую свабоду перакладчыка Святога Пісьма, пра магчымасць міжканфесійнага беларускага перакладу сведчаць пра цікавасць грамадства і запатрабаванасць даследаванняў, прысвечаных сучасным беларускім перакладам Бібліі.

У нашым даследаванні мы звярнуліся да 9 перакладаў Евангелля паводле Мацвея на сучасную беларускую мову: Лукі Дзекуця-Малея і Антона Луцкевіча (Лодзь, 1926–1927; Хельсінкі, 1931; Лондан, 1948; Таронта, 1991); Вінцэнта Гадлеўскага (Вільня, 1939); Яна Станкевіча (Нью-Ёрк, 1973); айца Мікалая (Мацукевіча) (Таронта, 1988); Анатоля Клышкі (Мінск, 1989–1992); Біблейскай камісіі Беларускай праваслаўнай царквы (Экзархат) (Мінск, 1991; 2007); Васіля Сёмухі (Мінск, 1995, 2002); Міхася Міцкевіча (Мічыган, ЗША, 1998); Уладзіслава Чарняўскага (Мінск, 1999; 2003). У кожным з перакладаў было даследавана 150 вершаў (3 выбаркі па 50 вершаў) з тэкстаў розных жанрава-стылістычных тыпаў: афарызмаў, наратыўных і аргументатыўных фрагментаў.

Было праведзена сістэматычнае супастаўленне дзевяці перакладаў Евангелля паводле Мацвея на сучасную беларускую мову з грэчаскім рэканструяваным «тэкстам большасці» (II ст.), з лацінскай Вульгатай (405), зацверджанай на Трыдэнцкім саборы 1546 г., з перакладам Я. Вуйка на польскую мову (1599) як самым аўтарытэтным падчас стварэння большасці каталіцкіх перакладаў, з Елісавецінскай (Сінадальнай) Бібліяй (1751) і рускім сінадальным перакладам (1876), які з'яўляецца асноўным перакладам на рускай мове ў XIX–XX ст.

Варыянты разглядаліся на розных моўных узроўнях. Лексічны пласт аказаўся найбольш разнастайным. Гэты ўзровень бліжэй за іншыя звязаны з рэчаіснасцю, з'яўляецца самым рухомым і неаднародным паводле складу, мае здольнасць змяняцца пад уздзеяннем знешніх фактараў, менавіта таму ў ім сустракаецца найбольшая колькасць моўных адрозненняў. Разгледзім асноўныя крыніцы з'яўлення гэтых варыянтаў у мове перакладаў на некаторых прыкладах.

1. **Тоесныя варыянты**

Самая вялікая колькасць разыходжанняў, адзначаных на лексічным узроўні (65 %), – гэта раўнапраўныя варыянты ў межах сучаснай беларускай літаратурнай мовы, зафіксаваныя ў акадэмічных тлумачальных слоўніках беларускай мовы [1; 2]. Семантычны аб'ём лексем адпавядае першакрыніцы і яны не маюць канфесійнай маркіраванасці.

Пры перакладзе афарызма Мц. 5.4 (*Шчасныя тыя, што плачуць, бо яны суцешацца*)[1] беларускія перакладчыкі па-рознаму перадаюць слова, адпаведнае грэч. *παρακληθήσονται*: *παρακαλέω* перакладаецца як 'побуждать, ободрять, вселять мужество; утешать' [3, с. 157]. Дзекуць-Малей абірае форму *ўцешацца*, *уцешыцца* 'знайсці ў кім-, чым-небудзь для сябе ўцеху, задавальненне; абрадавацца' [2, т. 2, с. 89]; Гадлеўскі, Станкевіч, а. Мікалай – *будуць пацешаны*, *пацешыць* 'суцешыць, заспакоіць' [Там жа, т. 4, с. 134]; Клышка – *усцешаны будуць*, Міцкевіч – *усьцешацца*, *усцешыцца* 'знайсці для сябе задавальненне, уцеху ў кім-, чым-н., узрадавацца' [Там жа, т. 2, 74]; Экзархат, Сёмуха, Чарняўскі – *суцешацца*, *суцешыцца* 'прынесці каму-н. супакаенне, палёгку; заспакоіць' [Там жа, т. 1, с. 399]. Такім чынам, усе прыведзеныя варыянты маюць тоеснае лексічнае значэнне і ў дадзеным фрагменце з'яўляюцца раўнапраўнымі.

Напрыклад, пры перакладзе фрагмента Мц. 13.19 – *да кожнага, хто слухае слова пра Валадарства і не разумее, прыходзіць ліхі* Дзекуць-Малей, Гадлеўскі, Міцкевіч прыводзяць займеннік *ўсякі*, астатнія перакладчыкі – *кожны* (*кажны*). Грэч. *παντὸς* мае значэнні 'усякі, кожны' ('всякий, каждый') [3, с. 162], таму бодва варыянты могуць быць прызнаны раўнавартаснымі адпаведнікамі.

Іншамоўны ўплыў з'яўляецца даволі значным для беларускіх біблійных перакладаў (асаблівую ролю адыграў пераклад Якуба Вуйка для каталікоў і Сінадальная Біблія для праваслаўных). Гэты ўплыў адбываецца не толькі непасрэдна праз запазычванне лексем, але і на ўзроўні граматыкі, пабудовы словазлучэнняў і сказаў, выбары слоў з сінанімічнага рада.

[1] Тут і далей беларускі тэкст прыведзены паводле перакладу У. Чарняўскага (2003).

2. **Царкоўнаславянізмы**

Царкоўнаславянскі ўплыў адзначаецца ў тых выпадках, калі выбар лексемы з шэрагу падобных абумоўлены яе падабенствам да царкоўнаславянскага адпаведніка.

Варыянты *праведных* і *неправедных* (Экзархат, Сёмуха) з'явіліся пад уплывам цсл. **пра́ведныѧ**, **непра́ведныѧ**, паколькі ў астатніх беларускіх перакладах прыводзяцца адпаведна прыметнікі *справядлівых і несправядлівых* (Мц. 5.45 – *і пасылае дождж на праведных і няправедных*). Словаформа *чуеш* ('бачыш, заўважаеш') у Станкевіча і а. Мікалая надзвычай блізкая да цсл. **чꙋ́єши** (Мц. 7.3 – *а бервяна ў воку сваім ня чуеш*). Слова *дасца* (Экзархат, Сёмуха), не ўласцівае для сучаснай беларускай мовы, можна патлумачыць уплывам цсл. **дастся** (Мц. 7.7 – *прасіце, і дасца вам*). Паказальна, што ў перавыданні Экзархата ў 2007 г. *дасца* ўжо зменена на нарматыўную для беларускай мовы форму *дадзена будзе*.

Экзархат ужывае царкоўнаславянізм *Ісус* (Мц. 2.1; 14.22; 14.25; 14.27; 14.29; 14.31), што звязана з канфесійнай прыналежнасцю перакладчыка.

Міцкевіч утварае кальку *блудадзеянні* паводле словаўтваральнай мадэлі цсл. **любодѣ́ѧнїѧ** (Мц. 15.19; 19.9).

3. **Паланізмы**

Паланізмы сустракаюцца толькі ў каталіцкіх перакладах, найперш у В. Гадлеўскага. Уплыў польскага тэксту вызначаецца ў выпадках, калі пераклады маюць супадзенне з перакладам Я. Вуйка, якое адсутнічае ў грэчаскім тэксце і ва ўсіх іншых беларускіх перакладах.

Гадлеўскі і Чарняўскі ўжываюць лексему *згінуў* з дыярэзай, якая, хутчэй за ўсё, з'явілася пад уплывам польскага перакладу (*zginął* у Вуйка) (Мц. 5.29 – *бо лепш для цябе, каб згінуў адзін з тваіх членаў*), Чарняўскі ўжывае слова *горшыць* (*gorszy* ў Вуйка) (Мц. 5.29 – *бо калі тваё правае вока горшыць цябе*). Уплывам польскага *pokój czyniący* можна патлумачыць словазлучэнне *чынячыя супакой* у перакладах Гадлеўскага (*багаслаўлены супакой чынячыя*), Станкевіча і айца Мікалая (*шчасьлівыя чынячыя супакой*) (Мц. 5.9).

Гадлеўскі ўслед за Вуйкам абірае форму *міласэрдзе атрымаюць* (параўн. з *miłoserdzia dostąpią*) (Мц. 5.7 – *багаслаўлены міласэрныя, бо яны міласэрдзе атрымаюць*), у Чарняўскага прыводзіцца вельмі падобная форма, якая адрозніваецца парадкам слоў: *атрымаюць міласэрнасць*.

Гадлеўскі і Чарняўскі ўжываюць прыметнік *цэзарава*, Станкевіч – *цэсарава* (Мц. 22.21 – *тое, што цэзара, аддайце цэзару*). Гэтыя выпадкі можна лічыць наследаваннем заходняй (рымскай) традыцыі, пар. польскае *cesarski*. Іншыя перакладчыкі выбіраюць слова *цараву* (Дзекуць-Малей) ці *кесарава* (праваслаўныя перакладчыкі).

Гадлеўскі і Чарняўскі выкарыстоўваюць слова *згаршэнне* 'спакуса, здрада' [5, вып. 12, с. 153] пад уплывам польскага *zgorszenie* (Мц. 13.41 – *пашле Сын чалавечы сваіх анёлаў і збяруць з каралеўства ягонага ўсе згаршэнні*).

4. **Архаізмы**

Лексемы кваліфікуюцца як архаічныя ў тым выпадку, калі яны адсутнічаюць у нарматыўных слоўніках беларускай літаратурнай мовы, але зафіксаваныя ў «Гістарычным слоўніку беларускай мовы» [5], слоўніку І. І. Насовіча [6].

Станкевіч ужывае архаізм *адзяржаць* (Мц. 5.7 – *шчасьлівыя міласэрныя, бо яны адзяржаць міласэрдзе*, Мц. 7.8 – *бо кажны просячы адзержуе*): слова *одзерживаць* прыведзена ў Насовіча са значэннем ‘атрымліваць’ (‘получать’) [Там жа, с. 359]. Слова *воліць* (Мц. 5.45 – *бо Ён воліць сонцу свайму ўсходзіць і над добрымі й над благімі*) у перакладзе Міцкевіча можна кваліфікаваць як архаізм, паколькі яно ўжыта ў Насовіча са значэннем ‘угаворваць, прымушаць пераканаццямі’ [Там жа, с. 64].

Станкевіч выкарыстоўвае архаічную форму *бяз сьці* (Мц. 13.57 – *няма прарокі бязь сьці*): дзеяслоў *сьціць* ужыты ў Статуце ВКЛ 1588 г. і перакладаецца на рускую мову словамі ‘чтить, почитать; поклоняться’ [цыт. па: 7, с. 1110].

Станкевіч і а. Мікалай прыводзяць архаізм *вояў* (Мц. 8.9 *Бо я, і людзіна′ падуладная, і маю пад сабой вояў*), зафіксаваны ў «Гістарычным слоўніку беларускай мовы» [5, вып. 4, с. 121].

5. **Дыялектная лексіка**

Найбольшая колькасць тэрытарыяльна абмежаванай лексікі сустракаецца ў перакладзе Станкевіча.

Станкевіч прыводзіць дыялектызм *часны* ‘временный’ [7, с. 1284] (Мц. 13.21); слова *сяўба* ў значэнні ‘насенне’ [Там жа, с. 1031] (Мц. 13.37), дыялектызм *ё* [Там жа, с. 348] (Мц. 13.37, 13.38, 13.39 двойчы); *гаспадарства* ‘государство, держава’ [Там жа, с. 204] (Мц. 13.38, 13.41, 13.43, 13.44, 13.45, 13.47); *людзіна* (‘чалавек’) [Там жа, с. 654] (Мц. 15.18, 15.20 – двойчы); *падумкі* ‘помыслы, мысли’ [Там жа, с. 809], *забіўствы* ‘убийство’ [Там жа, с. 394], *блявузганьні* ‘богохульство’ [Там жа, с. 137] (Мц. 15.19); *цяпло* ў значэнні ‘агонь’ [Там жа, с. 1265] (Мц. 13.40); *расказаў* у значэнні ‘загадаў’ (Мц. 19.7); *длякаецца*: *длякацца* ‘быть где-л. дольше, чем нужно, задерживаться, мешкать’ [Там жа, с. 316].

У Гадлеўскага прадстаўлены такія лексічныя дыялектызмы, як *хваціць* (Мц. 6.34 – *хваціць на кожан дзень свае бяды*) [4, т. 5, с. 298], *галасьба* (Мц. 2.18 – *Голас быў чутны ў Раме, плач і галасьба вялікая*) [7, с. 183].

Станкевіч і а. Мікалай ужываюць дыялектызмы *ейны* (Мц. 7.9 – *калі сын ейны папросе ў яе хлеба*) [Там жа, с. 345], *дзярлівыя* (Мц. 7.15 – *а ўнутры – ваўкі дзярлівыя*) [Там жа, с. 374], дыялектызм *даткнуўся*, вядомы ў паўночна-заходніх беларускіх гаворках [4, т. 2, с. 26] (Мц. 8.3 – *Ісус, выцягнуўшы руку, даткнуўся да Яго*).

6. **Актуалізацыя розных значэнняў мнагазначных слоў**

Некаторыя лексічныя разыходжанні выкліканы перадачай розных значэнняў мнагазначных слоў, і ў большасці выпадкаў гэта абумоўлена зваротам да розных крыніц перакладу.

Дзекуць-Малей, Станкевіч, а. Мікалай, Экзархат перакладаюць грэч. *ποιμανεῖ* паводле яго першаснага значэння ‘пасвіць, пасвіць авечак’ (‘пасти, пасти овец’) [3, с. 172] (Мц. 2.6 – *бо з цябе выйдзе Правадыр, каторы ўпасе народ Мой Ізраільскі*). Гадлеўскі, Клышка, Міцкевіч, Чарняўскі (як Вульгата (*reget*) і Вуйк (*rządził*)) актывізуюць пераноснае значэнне ‘кіраваць’ (‘руководить’) [Там жа, с. 172]: *бо з цябе выйдзе павадыр, каторы будзе кіраваць народам маім ізраільскім* (Гадлеўскі).

Грэч. υιοζ (Мц. 5.9) мае значэнні 1. ‘сын’; 2. ‘патомак, нашчадак’ (1. ‘сын’; 2. ‘потомок, наследник’) [5, с. 214]. Клышка актуалізуе для перакладу другое значэнне – *дзецьмі* (*шчаслівыя міратворцы; бо яны будуць названы Божымі дзецьмі*), астатнія перакладчыкі – слова *сынамі*.

Такім чынам, найбольшая колькасць варыянтаў сустракаецца ў перакладах Я. Станкевіча (як вынік вялікай колькасці дыялектызмаў), В. Гадлеўскага (што звязана з часам стварэння тэксту, залежнасцю ад кананічнага польскага перакладу). Найменшая колькасць моўных змен назіраецца ў перакладзе Экзархата, і гэта тлумачыцца арыентацыяй перакладчыцкага калектыву на дакладнае наследаванне першакрыніцам і прызначэнне тэксту для богаслужэбнага ўжытку.

Нягледзячы на тое, што біблійныя пераклады ствараліся на розных этапах фарміравання беларускай мовы і з улікам розных першакрыніц, самая вялікая колькасць лексічных адрозненняў належыць варыянтам, якія з’яўляюцца раўнапраўнымі ў межах сучаснай беларускай літаратурнай мовы, не маюць канфесійнай маркіраванасці і дакладна перадаюць змест перакладаемых слоў. Іншыя лексічныя разыходжанні ў перакладах звязаны з асаблівасцямі развіцця беларускай мовы: значная колькасць дыялектызмаў абумоўлена станаўленнем літаратурнай мовы на базе жывых народных гаворак, існаванне Беларусі на памежжы усходняй і заходняй хрысціянскіх традыцый тлумачыць наяўнасць запазычанняў з польскага і царкоўнаславянскага тэкстаў.

УМОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ

Вуйк (Wujk) – Ewangelia według Św. Mateusza / przekł. pol. W. O. J. Wujka. – 3-e wyd., popr. – Kraków : Wydaw. Apostolstwa Modlitwy, 1962. – 1462 s.

Вульгата – Biblia Sacra Vulgata: editionis Sixti V. et Clementis VIII Pont. Max. Jussu recognita atque edita. – Roma : Typ. S.C. de Propaganda Fide, 1886. – 936 p.

Гадлеўскі – Святая Эванэлія Езуса Хрыста паводле Матэуша: чатыры Эванэліі / пер. кс. В. Гадлеўскі, Магістар Тэалогіі. – Гродна : Гродзен. Рым. Катал. Дыяцэзія, 1998. – 120 с.

Грэчаскі – Τὸ Κατὰ Ματφαῖον Αγιον Ευαγγέλιον / Евангелие Господа нашего Иисуса Христа : на четырёх яз.: эллин., славян., рос. и белорус. : с параллельными местами / Белорус. Православ. Церковь Моск. Патриархата, Белорус. Библ. Комис. – Минск : Белорус. Экзархат, 1991. – 235 с.

Дзекуць-Малей – Паводле Мацьвея Сьвятое Эвангельле / Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста. – Лондан : Брыт. і замеж. бібл. т-ва, 1948. – 93 с.

Клышка – Паводле Мацвея Святое Дабравесце / Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста / пер. А. Клышкі // Спадчына. – 1989. – № 2. – С. 46–51; 1990. – № 1. – С. 46–51; 1990. – № 2. – С. 40–58; 1990. – № 3. – С. 54–61.

а. Мікалай – Сьвятое Евангельле паводле Мацея. Напрастольнае сьвятое Евангельле / Новы Запавет Госпада і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста / уклад. архіепіскап Мікалай, першы герарх Беларус. Праваслав. Царквы. – Таронта : [б.в.], 1988. – 316 с.

Міцкевіч – Евангельле паводле Мацьвея / Мацьвея і Марка евангеліе / пер. М. М. Міцкевіча ; рэд. М. Пруская. – Michigan : Grand Rapids, 1998. – 121 с.

Сёмуха – Паводле Мацьвея Сьвятое Дабравесьце / Новы Запавет і Псалтыр / пер. В. Сёмухі. – Мінск : Бацькаўшчына, 1995. – 499 с.

Станкевіч – Евангеля паводле сьвятога Мацьвея. Сьвятая Бібля : кн. сьвятога пісьма Старога й Новага закону : з мовы габрэйскае а грэцкае. – Нью Ёрк : [б.в.], 1973. – 840, 260 с.

Царкоўнаславянскі – От Матфея Святое Благовествование // Евангелие Господа нашего Иисуса Христа: на четырёх яз.: эллин., славян., рос. и белорус. : с параллельными местами / Белорус. Православ. Церковь Моск. Патриархата, Белорус. Библ. Комис. – Минск : Белорус. Экзархат, 1991. – 235 с.

Чарняўскі – Евангелле паводле Мацвея / Новы Запавет / пер. на беларус. мову У. Чарняўскага ; навук. рэд. Ж. Некрашэвіч-Кароткая ; літ. апрац. тэксту А. Бокуна. – Мінск : Бібл. т-ва ў Рэсп. Беларусь, 2003. – 304 с.

Экзархат – Святое Дабравесце паводле Матфея / Евангелие Господа нашего Иисуса Христа : на четырёх яз. : эллин., славян., рос. и белорус. : с параллельными местами / Белорус. Православ. Церковь Моск. Патриархата, Белорус. Библ. Комис. – Минск : Белорус. Экзархат, 1991. – 235 с.

ЛІТАРАТУРА

1. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы : больш за 65 000 слоў / І. М. Бунчук [і інш.] ; АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; пад рэд.: М. Р. Суднік, М. Н. Крыўко. – Мінск : Беларус. энцыкл., 1996. – 784 с.
2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; пад агул. рэд. К. К. Атраховіча. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1977–1984. – 5 т.
3. Греческо-русский словарь Нового Завета : пер. «Краткого греческо-английского словаря Нового Завета» Б. М. Ньюмана / рус. пер. и ред. В. Н. Кузнецовой. – М. : Рос. библ. об-во, 1997. – 238 с.

4. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча : у 5 т. / уклад.: Ю. Ф. Мацкевіч [і інш.] ; рэд. Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979–1986. – 5 т.
5. Гістарычны слоўнік беларускай мовы / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства ; пад рэд. А. М. Булыкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982–2017. – 37 вып.
6. *Насовіч, І. І.* Слоўнік беларускай мовы / І. І. Насовіч. – Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1983. – 778 с.
7. *Станкевіч, Я.* Белорусско-русский (великолитовско-русский) словарь / Я. Станкевіч. – N. Y. : Lew Sapiega Greatlitvan, 1990. – 1305 с.

БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАГА ГУМАНІТАРНАГА ПРАЦЭСУ

Н. Г. Апанасовіч (Полацк)

ПОЛІКУЛЬТУРНАЯ ПРАСТОРА Ў РАМАНЕ В. АДАМЧЫКА «ЧУЖАЯ БАЦЬКАЎШЧЫНА»

Сярод шэрагу закранутых праяў заходнебеларускай рэчаіснасці ў рамане «Чужая бацькаўшчына» ў поле зроку В. Адамчыка патрапіла пытанне шматнацыянальнага складу насельніцтва і звязаныя з гэтым міжнацыянальныя ўзаемадачыненні і полікультурная сітуацыя на «ўсходніх крэсах». Дадзены ракурс не з'яўляецца цэнтральным у рамане, тым не менш добра заўважная цікавасць аўтара да гэтага аспекту жыцця.

В. Адамчык паказвае практычна ўвесь склад насельніцтва Заходняй Беларусі, прадстаўлены не толькі палякамі і беларусамі, але і тымі нацыянальнымі меншасцямі, якія стала пражывалі або ў той ці іншы момант з розных прычын мелі дачыненне да гэтых зямель. Таму сярод персанажаў рамана будуць не толькі беларусы і палякі, але і прадстаўнікі яўрэйскага насельніцтва. Узгадваюцца ў аповедзе пра святкаванне калядаў і «рускія» – праваслаўныя жыхары вёскі, якія павінны былі прытрымлівацца посту, калі для каталікоў ужо надышоў час каляднага мясаеду [1, с. 294]. Сустрэнуцца на старонках рамана і татары (штатныя грузчыкі дварчанскай станцыі браты Кулеміны), і прадстаўнікі іншых народаў.

Акрамя «ўсходніх крэсаў» у рамане будзе ўзгадана і далёкая башкірская зямля (г. Бугуруслан), куды ў эвакуацыю адпраўляліся беларусы ў пошуках паратунку ў час ліхалецця Першай сусветнай вайны. Пісьменнік

апісвае і адметнасць прыроднага ландшафту чужыны, і каларыт мясцовай гаворкі, нацыянальнага адзення. Між тым В. Адамчык падкрэслівае цяжка-прымальнасць іншага ладу жыцця, абвостранае адчуванне не «свайго» і практычную немагчымасць адаптавацца да «чужога». Нязвыклая зямля не стала новай радзімай, а вяртанне ператварылася ў сапраўдную сямейную трагедыю Верамеяў.

Праўдзівае апісанне складу насельніцтва не толькі з'яўляецца асаблівасцю фактаграфічнай асновы рамана, але дазваляе максімальна пагрузіцца ў гістарычную прастору і час. Зварот да міжкультурнага аспекту зроблены і для аб'ектыўнага паказу той сітуацыі, якая склалася ў выніку палітыкі Польшчы ў адносінах да беларускага насельніцтва.

Гэтая спроба асэнсаваць нацыянальны характар праз спасціжэнне сябе і погляд на сябе праз іншых цалкам укладваецца ў канцэпцыю імагалогіі, што мае на мэце «выявить истинные и ложные представления о жизни других народов, стереотипы и предубеждения, существующие в общественном сознании, их происхождение и развитие, их общественную роль и эстетическую функцию в художественном произведении» [2, с. 24]. В. Адамчык не толькі характарызуе шматнацыянальную прастору Заходняй Беларусі, але і перадае прынятыя ў тагачасным грамадстве стэрэатыпы, праз натуральна-побытавыя сітуацыі праўдзіва і дакладна перадае звесткі пра сфарміраваныя ў народнай традыцыі вобразы ўспрыняцця «іншых».

У рамане пісьменнік як бы супрацьпастаўляе дзве асноўныя нацыянальныя групы: беларусаў і палякаў. Беларускае выяўляецца найперш праз зварот да этнаграфічнага ракурсу. Цікавасць да штодзённасці дазволіла аўтару распавесці пра традыцыйны ўклад жыцця, адметнасць мясцовых узаемаадносін і паводзінаў, адлюстраваць рытуалы і святы, што рэгламентавалі і вызначалі жыццё тагачаснага вяскоўца. Пісьменнік акрэслівае каштоўнасную парадыгму, якая ўключае ў сябе найперш маральна-этычны аспект, звязаны з рэгламентацыяй штодзённага жыцця, спробай зрабіць больш прадвызначанай і прадказальнай будучыню, ілюструе кодэкс паводзінаў у сям'і і грамадстве, у тым ліку і праз асэнсаванне паняццяў «свой» – «чужы».

Беларуская прастора паказана як гарманічна-ўладкаваная, зарыентаваная на спрадвечныя каштоўнасці, вызначаная спалучанасцю традыцыйнага і хрысціянскага светапогляду. В. Адамчык стварае поўную і шматмерную мадэль беларускага свету, які ўключыў у сябе не толькі лакальнае, адметна заходнебеларускае, а найперш выявіў тыповае, агульнанацыянальнае: «Праз каларытныя рысы мясцовага побыту выразна выступае сэнсавая значнасць усёй беларускасці, узнікае вобраз краю агульнанацыянальнай пэўнасці і акрэсленасці» [3, с. 532].

Нягледзячы на захопленасць беларускімі рэаліямі, аўтар здолеў пазбегнуць адкрытай ідэалізацыі, а прадстаўленая карціна намалявана праўдзіва і рэалістычна. Найперш гэта выяўляецца праз вобразы саміх беларусаў, якія паказаны ў рамане як складаныя і супярэчлівыя асобы. Кожны прадстаўнік-беларус – гэта індывідуальнасць, характарыстыка якой не ўкладваецца толькі ў паняцці «добры» – «дрэнны». Абагульнены вобраз тыповага беларуса

з рамана ўвасоблены ў дбайным і спрытным гаспадары, які разумна і ашчадна ставіцца да свайго набытку, імкнецца да жыццёвай уладкаванасці, разважлівых адносін да жыцця. Да гэтага кола можна прылічыць большасць верасаўцаў, у тым ліку і старога Корсака, сям'ю Мондрых і іншых. У вясковай грамадзе цэняцца «багатыры», тыя, хто ўмее здабыць і зарабіць уласнай працай, руплівасцю і гаспадарлівацю. Сярод паважаных якасцей – працавітасць, гаспадарчы спрыт і працоўнае майстэрства. Вяскоўцы клапоцяцца пра скаціну, як пра членаў сям'і. Імкненне да дабрабыту і заможнасці не асуджаецца, а падаецца як натуральнае жаданне чалавека дасягнуць лепшага жыцця, шчаслівейшай долі.

Сяляне паказаны як спрытныя і цікаўныя, надзеленыя гумарам і «вострым языком». Розум, жыццёвая кемлівасць і народная мудрасць выўляюцца ў шматлікіх прыказках і прымаўках, якія да месца, трапна і дасціпна ўжываюць верасаўцы.

Акрэслівае аўтар і межы рэлігійнай свядомасці беларусаў, размяжоўваючы тое, што з'яўляецца прадметам «святасці» ці рытуальна-фармальнай неабходнасці. Прадстаўленыя ў рамане беларусы – людзі духоўныя, але пры гэтым яны далёкія ад рэлігійнага фанатызму, а да выканання рэлігійных абавязкаў ставяцца з пэўным жыццёвым практыцызмам і рацыяналізмам.

Каштоўнасцю сярод вяскоўцаў з'яўляецца адукацыя, якую мала хто мог сабе дазволіць. Яна не давала відавочных пераваг у жыцці, але была той прыступкай, якая нараджала надзею на змену статуса і далучэнне да свету «багатых» ды адрознівала бедняка ад больш заможнага, паляка ад беларуса. Звярнуўшы ўвагу на далікатнасць асаднікавага сына Франэка, вясковыя дзяўчаты канстатуюць: «Дзіва што – асаднік, вучоны» [1, с. 186]. На самой справе адукаванасць не была гарантам матэрыяльнай забяспечанасці, але імкненне да яе было відавочным.

Разам з тым у заходнебеларускай вёсцы сустракаем і лайдакоў, і не вельмі ўдалых гаспадароў, сярод якіх ёсць і бязладная сям'я Кумагэравых ды непаважаныя Рэпкі. Бачым сапраўдную атмасферу, насычаную хлуснёй, забабонамі, імкненнем адседзецца і не ўмешвацца ў тое, што можа мець дрэнныя наступствы, – бо «ў шырокай плыні народнага жыцця не можа быць толькі чыстых і толькі мутных струменяў» [3, с. 533].

Польская прастора прадстаўлена найбольш з афіцыйнага боку. Гэта і шматлікія культурна-палітычныя рэаліі, паводле якіх было арганізавана жыццё на ўсходніх крэсах, і атрыбуты дзяржаўнасці, выяўленыя праз уніформу, партрэты Пілсудскага і г.д.

Сярод прадстаўнікоў польскай нацыі мы сустрэнем асаднікаў, якія былі пераселены на ўсходнія землі адпаведна з тагачаснай эканамічнай палітыкай і мелі перавагі ў матэрыяльным і фінансавым забеспячэнні. Зямлі ў іх было столькі, што трэба было наймаць сялян для яе апрацоўкі.

Прадстаўнікі паліцыі становяцца ўвасабленнем дзяржаўнай палітыкі «на ўсходніх крэсах». У адносінах да беларускага насельніцтва, мовы яны вядуць сябе бязлітасна і жорстка. Ды і палякі ніжэйшых узроўняў грамадства (чыгуначнікі, кіроўца аўтобуса) радыя паздзекавацца з беларуса, паказаць сваю перавагу.

Трэба адзначыць, што В. Адамчык і ў адлюстраванні прадстаўнікоў польскага боку імкнецца пазбегнуць спрошчанасці, таму мясцовых палякаў паказвае рознымі. Такімі рознымі бачацца асаднікі Грабянкі. Аўтар звяртае ўвагу на іх больш-менш спагадлівыя адносіны да нанятых працаўнікоў. Анця і Чэся Доўнар, нягледзячы на тое, што бацька іх быў звычайным стрэлачнікам на станцыі, выяўлены як прадстаўніцы іншага, адрознага ад сялянскага, свету і паказаны глыбокімі асобамі, адукаванымі і выхаванымі жанчынамі.

Калі беларускасць выяўляецца ў шматлікіх дыялектызмах, якімі перанасычана мова вяскоўцаў, то афіцыйнае жыццё, сфера адукацыі агучваюцца па-польску. На польскай мове складаюцца афіцыйныя паперы. Такім будзе тэстамент Таквілі Мондрай, загад-«росказ» гміны аб працы вяскоўцаў на шарварцы, «паваланні» аб прызыве ў «войска Польскае» верасаўскіх рэзервістаў. На польскую мову пяройдзе і Чэся Доўнар, калі захоча дыстанцыявацца ад Міці. Пры гэтым, нягледзячы на непісьменнасць, большасць беларусаў рамана разумеюць польскую мову.

Калі палякі сябе выразна выяўляюць з боку нацыянальнай ідэнтычнасці, яўна паказваюць сваю перавагу і пануючы стан адносна насельнікаў іншых культур: «У Польсцы мейсца толькі для полякув!» [1, с. 438], то праблему нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў В. Адамчык выяўляе ва ўсёй складанасці. Аўтар імкнецца разабрацца ў вытоках этнічнай абыякавасці. Сярод «ідэйных», тых, хто выразна праяўляе сябе як беларус, можна назваць толькі Міцю Корсака і яго старэйшага таварыша Лаўрына Царыка. Гэта пераканаяыя беларусы, якія разумеюць важнасць нацыянальнай і з ёй звязанай дзяржаўнай самастойнасці. Нягледзячы на перашкоды і ўціск, якія чыняцца польскімі ўладамі, яны актыўна шукаюць беларускі шлях.

Праявай беларускага стане і інтэлектуальная сфера: Міця будзе прагна хацець вучыцца, будзе пісаць вершы па-беларуску, выпісваць і чытаць беларускія газеты. У пэўным сэнсе ён ускладзе на сябе абавязкі асветніка, таго, хто павінен тлумачыць, абуджаць і быць прыкладам. Малады Корсак карыстаецца павагай сярод вяскоўцаў не толькі дзякуючы свайму добраму, спагадліваму характару, але і адукаванасці, розуму.

Аднак, нягледзячы на паважлівыя адносіны да Міці, яго аўтарытэт, беларускае пытанне не стане для вяскоўцаў надзённым і важным. І справа тут будзе не толькі ў «забітасці» і засяроджанасці на матэрыяльным, мяшчанскім, але і ў палітычна-сацыяльным і культурна-гістарычным. Аб гэтым разважае мясцовы філосаф, «фейчар», як называюць яго вяскоўцы, Марцін Ваўчок. На сваім вопыце ён зразумеў, што перашкодай для пабудовы кар'еры вайскоўца з'яўляецца не польскае паходжанне. Развагі Ваўчка пра нацыянальнае пытанне з пазіцый рэлігійнай прыналежнасці ілюструюць найбольш распаўсюджаны стэрэатып: «каталік – значыць паляк», які здаўна будзе выкарыстоўвацца ўладамі ў спекулятыўных мэтах. Цікавым ў гэтым сэнсе падаецца тонкае разуменне спецыфікі моўных асаблівасцей. У адказ на сцверджанне Ваўчка аб сваім польскім паходжанні Міця заўважае пра яго прозвішча: «Па-польску было б Вільчэк» [1, с. 334].

Разам з тым сама сацыяльна-эканамічная сітуацыя дыферэнцыруе асяроддзе каталікоў, сярод якіх добра бачна і стэрэатыпная вылучанасць беларусаў. Ксёндз, да якога звернуцца Алеся з Імполем для афармення адносін, будзе кіравацца стэрэатыпам, што Верасава – вёска «піякув і зладзеюв, мейсцовэ яндро цемносці» [1, с. 285]. Пры гэтым сам будзе далёкі ад праведнага ідэалу.

Каларытна і яскрава прадстаўлена ў творы і яўрэйскае насельніцтва. Найперш праз род заняткаў, якім традыцыйна быў гандаль. Яўрэі трымаюць лаўкі, вядуць сталы гандаль і прадаюць мануфактурныя тавары. В. Адамчык звяртае ўвагу на дыскрымінацыю, адпаведна якой яўрэям нельга было займацца продажам спіртнога. Разам з тым на прыкладзе ўтрымальніцы «цукерні», да якой завітваюць мужчыны-верасаўцы пасля ўдалага гандлю, пісьменнік раскрывае такія характэрныя для ўспрымання яўрэяў якасці, як іх баязлівасць, прыстасавальніцтва, хітрасць, здольнасць да махлярства: «Дзе вы бачылі тыя бутэлькі? Хіба ж можна прадаваць яўрэям гарэлку? Ой, не той свет настаў. Бедны яўрэй ўжо і не чалавек» [Там жа, с. 252]. Гэты стэрэатыпны вобраз аказваецца добра вядомым і мясцовым жыхарам, таму верасаўскія мужчыны, скарыстаўшыся сквапнасцю гаспадыні, падманваюць яе і радуюцца ўдала праведзенаму махлярству без усялякіх пакутаў сумлення.

Прыметамі набліжэння гуманітарнай катастрофы, якую прынясе яўрэйскаму народу фашызм, стане фраза, выказаная пляткаркай Вольгай: «Вой, ці чулі ж яшчэ? У Дварчаны з Нямешчыны жыдэ наехалі» [Там жа, с. 355]. Для пацвярджэння сваёй весткі, якой не далі веры верасаўцы, Вольга звяртаецца да наіўна-хрысціянскага тлумачэння: «Вуньдзека яшчэ ў Бібліі пішацца, што яны згінуць. А тыя, што застануцца, пазбіраюцца ў адно месца, зноў на тую зямлю, адкуль прыйшлі» [Там жа, с. 356]. Створаная нечаканым тлумачэннем сітуацыя набывае падвойны сэнс, дзе чуецца прарочае прадказанне таго ахвярнага шляху, што прыйдзецца перажыць яўрэйскаму насельніцтву.

Ідучы за гістарычнай праўдай, аўтар не мог не згадаць пра часы знаходжання на заходнебеларускіх землях немцаў. Знакамі мінулага стануць і даўнейшая нямецкая бойня, і атынкаваная немцамі-пастаяльцамі хата Ваўчка, традыцыя ставіць навагоднюю елку Корсакамі. Пры гэтым аўтар пазбягае палітычнай ацэнкі і акцэнтуе сваю ўвагу на характарыстыках, якія вызначаюць чужынцаў у плане характару, культурнага ўзроўню. Адамчык падкрэслівае парадак, заведзены немцамі: замест глінянай паклалі драўляную падлогу, на святы елі цукеркі і шакалад і нават дзяліліся гэтымі прысмакамі з «зібітым і некультурным насельніцтвам». У гэтым жаданні далучыць да еўрапейскіх традыцый не мелася павагі, імкнення прасвяціць, а было імкненне паказаць сваю перавагу, падкрэсліць дасканаласць сваёй нацыі: «О, культура! Пан будзе помніць!» [Там жа, с. 296]. Пісьменнік не дазваляе сабе крытыкі і захоўвае нейтральнасць выкладу. Наадварот, праз параўнанне ўпарадкавання ладу жыцця двух народаў (палякаў і немцаў) гаворыць аб

гаспадарліваці, рацыяналізме, акуратнасці як спрадвечных якасцях нямецкага народу. У параўнанні з гэтым і палякі, і беларусы выглядаюць безгаспадарлівымі: «Паляк-то такі самы галадранец і гультай, як і наш чалавек. А немец – не! Немец некалі ў нашай вёсцы на пяску капусту садзіў, і расла, качанэ раслі, як тыя чыгуны… Калейку, во, правёў, так хоць паляку ёсць на чом ездзіць» [1, с. 97].

Прыведзеныя меркаванні выяўляюць глыбіню пісьменніцкага бачання свету і разумення жыцця, у якім не бывае толькі станоўчага і толькі адмоўнага. Так і нямецкая прысутнасць, нягледзячы на ўсе найжахлівейшыя наступствы (Міця, напрыклад, згадвае, што для будаўніцтва калейкі быў вынішчаны лес [Там жа]), разам з тым стала з'явай культурнага абмену. Г. Тычко слушна заўважае: «"Інакшасць" – у якой бы форме яна не выяўлялася: у мове, рэлігійных рытуалах ці народных звычаях – на Беларусі спакон вякоў не перашкаджала культурнаму абмену, цывілізацыйнаму дыялогу» [4, с. 40].

Беларуска-літоўскія дачыненні прадстаўлены найперш праз інтэлектуальную сферу: газетамі, выпісанымі Міцем, і згадкай пра Віленскі ўніверсітэт. Думаецца, такі выбар ракурсу не выпадковы і адсылае да міфа Літвы-Беларусі, са слаўнай мінуўшчынай і амаль безнадзейнай, але неўміручай марай пра будучыню, вольную і незалежную.

В. Адамчык у сваім раманным цыкле працягне тэму полікультурных дачыненняў беларусаў з іншымі народамі, паглыбляючыся ў рэчышча імагалогіі, спрабуючы асэнсаваць беларускі характар, нацыянальную культуру, паміж іншага, і праз бачанне іншых народаў, што жылі ў цесным суседстве.

ЛІТАРАТУРА

1. *Адамчык, В.* Чужая бацькаўшчына : раман / В. Адамчык. – Мінск : Папуры, 2015. – 511 с.

2. Поляки и русские в глазах друг друга / отв. ред. В. А. Хорев. – М. : Индрик, 2000. – 272 с.

3. *Каваленка, В. А.* Вячаслаў Адамчык / В. А. Каваленка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – Т. 4, кн. 1 : 1966–1985. – 928 с.

4. *Тычко, Г. К.* Палілог культур праз беларускі літаратурны кантэкст / Г. К. Тычко // Матэрыялы XIX Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытанняў, прысвеч. Дням слав. пісьменства і культуры (Мінск, 22–24 мая 2013 г.) : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2013. – Ч. 1. – С. 40–46.

Г. І. Басава (Мінск)

ДЫХАТАМІЯ «СВОЙ – ЧУЖЫ» ВА ЎЗАЕМАДЗЕЯННІ КУЛЬТУР І ЯЕ РОЛЯ Ў МІЖКУЛЬТУРНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

Прадстаўленасць культуры ў псіхіцы, апасродкаванасць псіхічных працэсаў культурнымі формамі (артэфактамі) абумоўліваюць спецыфічнае перажыванне чужога пры кантакце з носьбітамі іншай культуры. Шмат каму з нас знаёма пачуццё адчужанасці, ды і некаторага «шоку», калі мы раптам трапляем у іншае культурнае асяроддзе ці проста ў натоўп замежнікаў, хай нават у сябе на радзіме. Гэта пачуццё і ёсць вынік спантаннай псіхічнай рэакцыі ва ўмовах міжкультурнага кантакту. На ўзроўні першаснага асэнсавання перажыванні чужога фармулююцца звычайна ў апазіцыйных катэгорыях «сваё» – «чужое» («роднае», «блізкае» – «чужое»). У дачыненні да розных сітуацый міжкультурных кантактаў вылучаюць некалькі значэнняў слова *чужое*:

а) замежнае, іншакультурнае – тое, што знаходзіцца па іншы бок пэўнай мяжы – радзімы;

б) анамальнае – дзіўнае, нязвыклае, незвычайнае, своеасаблівае;

в) яшчэ не пазнанае, але даступнае вопыту, пазнанню;

г) не спазнавальнае да канца, неспасціжнае, прынцыпова закрытае для пазнання як чыста знешняе (трансцэндэнтнае);

в) злоснае, жудаснае.

Прыведзеным значэнням слова *чужое*, відавочна, адпавядаюць наступныя апазіцыйныя значэння слова *сваё*:

а) унутранае, роднае;

б) звыклае, «нармальнае»;

в) ужо знаёмае;

г) знаёмае, пазнанае, унутранае (іманентнае);

д) бяспечнае, якое выклікае пачуццё абароненасці.

Аксіялагічная дыферэнцыяцыя («небяспечна» vs. «бяспечна», «карысна» vs. «шкодна», «сваё» vs. «чужое» і г.д.) ляжыць у аснове чалавечай жыццядзейнасці, таму і ў міжкультурнай камунікацыі мы сутыкаемся, у першую чаргу, з ацэньваннем, вынікі якога аказваюць істотны ўплыў на пачатак, ажыццяўленне і наступствы камунікацыі [1, с. 29]. Схільнасць да распазнавання прадметаў навакольнага свету (фактычна, сваіх уражанняў пра яго) – асноўная ўласцівасць чалавека, якая дапамагае яму пераадолець страх перад кантынуальнасцю сусвету, бо «нішто так не падбадзёрвае, як класіфікацыя» [2, с. 450].

Маркеры свайго і чужога ў міжкультурнай камунікацыі ўтвараюць *тры ўзроўні*:

• агульнакамунікатыўных установак («свая» vs. «чужая» мова, культура) – узровень сістэмы;

• канцэптаў («своё» vs. «чужое» слова, імя, разуменне слова і інш.) – узровень элементаў;

• камунікатыўных паводзін («свая» vs. «чужая» мадэль паводзін, гаворка) – узровень дыскурсу.

Агульнакамунікатыўныя ўстаноўкі прадугледжваюць наяўнасць наіўнага, спрошчанага прадстаўлення (этымалогія слова *чужы* звязана з нечым дзіўным, незвычайным; «свая» мова звязваецца з яснасцю, празрыстасцю), якое ў той ці іншай ступені ўласціва ўсім камунікантам. У сацыяльным плане агульная ацэнка чужой мовы («моўны імідж») выяўляецца ў масавай культуры і літаратуры, у адукацыі, эканамічных і палітычных перавагах і г.д. Агульная ацэнка складаецца з мноства суб'ектыўных фактараў. Напрыклад, выбар замежнай (першай, другой, трэцяй…) моў у сферы адукацыі і самаадукацыі шмат у чым звязаны не толькі з эканамічнай і культурнай сітуацыяй у свеце, але і з усталяванымі стэрэатыпамі, міфалагемамі. Звычайна наіўная аксіялогія прыпісвае станоўчыя якасці роднай мове (самая прыгожая, прывабная, дакладная і г.д.). Міфы пра чужыя мовы і народы (міфалогія семіятычнай мяжы) суадносяцца са ступенню сфарміраванасці талерантнай свядомасці ў дадзеным соцыуме і з паводзіннымі стэрэатыпамі асобнага карыстальніка мовы і носьбіта культуры. Зразумела, у нацыянальнай канцэптасферы даецца ацэнка толькі тым мовам, якія маюць значэнне для дадзенай нацыі. Гэта можа тлумачыцца тэрытарыяльнай блізкасцю, культурнай звязанасцю або дамінаваннем мовы на міжнароднай арэне ў пэўны гістарычны прамежак (напрыклад, англійская, кітайская і г.д.).

Межы паміж сваім і чужым заўсёды размытыя і нетрывалыя, таму што нават геаграфічная карта, якая дакладна акрэслівае дзяржаўныя межы, ніяк не суадносіцца з прыроднай і культурнай рэальнасцю. Культурную рэчаіснасць таксама нельга адлюстраваць на карце, паколькі проціпастаўленне «свой – чужы» ствараецца не толькі аб'ектыўнымі фактарамі, але і іх суб'ектыўным адлюстраваннем у свядомасці [3, с. 127].

Для прыкладу эфемернасці міжкультурных межаў варта прыгадаць міфалагізацыю мяжы СССР. Паказальным у гэтым плане з'яўляецца Германія ў найноўшай гісторыі. Спачатку палітычнае супрацьстаянне стварыла фізічную рэальнасць Берлінскай сцяны. Але яе знішчэнне ў канцы XX стагоддзя не прывяло да знікнення мяжы семіятычнай, паводзінскай. Памяняліся знакі: калі «пры сацыялізме» ФРГ мела негатыўны імідж, то зараз тэрыторыя былой ГДР, а дакладней, яе жыхары, якія пражываюць цяпер не толькі на ранейшай геаграфічнай тэрыторыі, атрымалі мянушку *Dunkeldeutschland* (цёмная Германія) і г.д. [4, S. 20–26]. Падобных прыкладаў больш чым дастаткова ў палітычнай семіялогіі. Яны лішні раз пацвярджаюць, што ў прыродзе межаў няма, межы праводзяцца чалавекам, яны семіятычныя, культурныя, ідэалагічныя, істотныя для выжывання групы індывідаў з пэўным стэрэатыпам паводзін.

Фактар культурнай (моўнай, семіятычнай) мяжы з'яўляецца фундаментальным для міжкультурнай камунікацыі. Сам факт яе наяўнасці прадугледжвае, што камуніканты маркіруюць сваю прыналежнасць да розных культур

і вызначаюць сябе ў тэрмінах «свой» vs. «чужы» (незалежна ад якаснай ацэнкі). Падобная маркіроўка не азначае непазбежнага супрацьстаяння, агрэсіўнай камунікацыі, а, наадварот, спрыяе пошуку камунікатыўнага балансу, які грунтуецца на двух антаганістычных прынцыпах: сімпатыі і антыпатыі, узаемадзеяння і ўздзеяння. Незалежна ад дамінавання таго ці іншага прынцыпу ў канкрэтным камунікатыўным акце, узаемнае прызнанне семіятычнай мяжы ёсць канстанта для міжкультурнай камунікацыі.

Пазіцыя чалавека, які з'яўляецца актарам у міжкультурных зносінах, традыцыйна этнацэнтрысцкая, паколькі кожны глядзіць на свет праз уласныя культурныя фільтры. Уласна этнацэнтрызм – з'ява нейтральная. Ён можа быць гнуткім і нягнуткім. Падрыхтоўка спецыяліста ў сферы міжкультурнай камунікацыі прадугледжвае развіццё гэтай гнуткасці, якая дазваляе глыбей пранікаць, але не сціраць межы іншай культуры. Падзеленасць культур на свае і чужыя супакойвае, стварае і падтрымлівае эфемернае пачуццё бяспекі. У міжкультурнай камунікацыі спрацоўвае рэакцыя замазахавання, якая праяўляецца ў імкненні застацца ў межах звыклых, камфортных дыскурсіўных практык. Гэтым тлумачыцца той факт, што маніпулятыўныя прыёмы абапіраюцца на існуючыя традыцыі, забабоны, міфалагемы і г.д.

Чалавек, які трапляе ў іншую культуру, асабліва ўпершыню, трапляе такім чынам у іншы свет, выпрабоўваючы самыя розныя модусы перажывання чужога. Аднак перажыванне чужога дапаўняецца таксама і перажываннем свайго як кантрасна супрацьлеглага чужому. Сітуацыя міжкультурнага кантакту і ёсць у дадзеным выпадку дынамічнае ўзаемадзеянне свайго і чужога. Пры гэтым межы паміж дадзенымі апазіцыйнымі катэгорыямі становяцца рухомымі. Так, уплыў іншых культур чалавек адчувае яшчэ ў дзіцячым узросце, асабліва дзякуючы інтэнсіўнаму развіццю сродкаў камунікацыі: дзіця слухае, глядзіць казкі розных народаў, цяпер нямала дзяцей бываюць за мяжой. Вывучэнне замежнай мовы – гэта таксама пэўны аспект кантакту з іншай культурай. Усё гэта сведчыць аб тым, што разглядаемыя апазіцыйныя катэгорыі функцыянальныя і ўзаемазамяняльныя. Такім чынам, чужое можа выступаць і як нешта незвычайнае, прывабнае, экзатычнае, што ўзбуджае цікавасць чалавека. Сацыяльныя групы, якія адкрыты чужому, сустракаюць яго дружалюбна, прынята называць *ксенафіламі* (лацінаамерыканцаў, нідэрландцаў, эскімосаў). Сацыяльныя групы, якія варожа сустракаюць чужое, называюць *ксенафобамі* (албанцаў (пасля другой сусветнай вайны), японцаў (да сярэдзіны XIX ст.), арабаў). Так, асновай сацыяльнай салідарнасці ў арабаў з'яўляецца супрацьстаянне іншым групам – як унутры этнасу, нацыі, так і па-за імі.

Камунікатыўныя паводзіны чалавека скіраваны на дэлімітацыю, адмежаванне камунікатыўнай і жыццёвай прасторы, што прадугледжвае ідэнтыфікацыю са «сваёй» аўдыторыяй і дыстанцыраванне ад «чужых». Ідэнтыфікацыя і дыстанцыраванне з'яўляюцца ўзаемаабумоўленымі працэсамі, двума бакамі адной семіятычнай мяжы. Даследчыкі размяжоўваюць дыскурс ідэнтычнасці і дыскурс адчужэння ў сферы палітыкі. Верагодна, падобны падыход з'яўляецца рэлевантным і ў сферы міжкультурнай камунікацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Карасик, В. И.* Языковой круг: личность, концепты, дискурс / В. И. Карасик. – Волгоград, 2002.
2. *Барт, Р.* Система моды. Статьи по семиотике культуры / Р. Барт. – М., 2003.
3. *Степанов, С. С.* Язык внешности / С. С. Степанов. – М., 2001.
4. *Bashaikin, N.* Kommunikation unter Freunden: russische unddeutsche Sprache und Literatur im Vergleich; ein Sammelband / N. Bashaikin, R. Belentschikow, A. Burkhardt. – N. Novgorod, 2001.

А. У. Бахур, В. М. Капліч,
Я. А. Шапарава, Н. І. Здановіч (Мінск)

ЭКАЛАГІЧНАЯ СЦЕЖКА «КАЗКА НЕГАРЭЛЬСКАГА ЛЕСУ» ЯК АБ'ЕКТ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ПРЫРОДЫ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

У цяперашні час экалагічны турызм з'яўляецца адным з найбольш запатрабаваных відаў падарожжаў. На думку даследчыкаў, цікавасць да яго выклікана ўстойлівым пагаршэннем якасці навакольнага асяроддзя, а таксама павышэннем экалагічнай свядомасці людзей, у якіх з'явілася патрэба ў зносінах з прыродай [1].

Сёння пад тэрмінам *экалагічны турызм* разумеецца асаблівая форма падарожжаў, у якой адпачынак на прыродзе спалучаецца з пазнаннем яе аб'ектаў і з'яў [2].

У Рэспубліцы Беларусь адным з самых распаўсюджаных відаў экалагічнага турызму, які актыўна развіваецца ў апошні час, з'яўляецца падарожжа па экалагічных сцежках, дзе наведвальнікі могуць папаўняць свае веды пра прыроду.

Экалагічная сцежка – гэта спецыяльна распрацаваны і абсталяваны маршрут, які праходзіць праз розныя экалагічныя сістэмы, прыродныя аб'екты, архітэктурныя помнікі, якія маюць эстэтычную, прыродаахоўную і гістарычную каштоўнасць, на якім турысты атрымліваюць вусную (з дапамогай экскурсавода) або пісьмовую (стэнды і г.д.) інфармацыю аб гэтых аб'ектах. Арганізацыя экалагічнай сцежкі – адна з форм выхавання экалагічнага мыслення і светапогляду [3].

Для захавання і пашырэння біялагічнай разнастайнасці на Зямлі асаблівае значэнне маюць батанічныя сады. Назіраецца агульнасусветная тэндэнцыя ўзмацнення экалагічных, прыродаахоўных і сацыяльна значных функцый батанічных садоў на урбанізаваных тэрыторыях. У сувязі з гэтым, напрыклад, «Амерыканская асацыяцыя батанічных садоў і арбарэтумаў (дэндрарыяў)» нядаўна змяніла сваю назву на новую: «Амерыканская асацыяцыя публічных паркаў і арбарэтумаў (дэндрарыяў)», а некаторыя афрыканскія батанічныя сады атрымалі новую назву – «экалагічны цэнтр» [4].

У большасці сваёй батанічныя сады з’яўляюцца базай для вучэбнай работы навучэнцаў і студэнтаў па батаніцы, прыродазнаўстве, экалогіі, ахове прыроды, садовым дызайне.

У Заходняй Еўропе пачатак батанічным садам паклалі манастырскія сады, дзе былі аптэкарскія агароды. Наяўнасцю такіх садоў адрозніваліся ў першую чаргу манастыры ордэна езуітаў і ордэна Святога Роха. З манастырскімі супернічалі ўніверсітэцкія батанічныя сады, заснаваныя ў Оксфардзе, Кёльне (першы ўніверсітэцкі батанічны сад у свеце), а з XIX ст. яны ствараліся практычна пры кожным універсітэце Еўропы [5]. Батанічныя сады зямнога шара (усяго больш за 1 000) аб’ядноўваюцца заснаванай ў 1960 годзе Міжнароднай асацыяцыяй батанічных садоў (IABG), якая мае еўрапейскія і азіяцкія аддзялення [6].

На тэрыторыі былога СССР найстарэйшы з існуючых батанічных садоў знаходзіцца ў Тбілісі (заснаваны ў 1625 г.). Самым першым на Беларусі быў Гродзенскі каралеўскі батанічны сад, які стварыў Жан-Эмануэль Жылібер згодна з заказам гродзенскага старасты А. Тызенгаўза. У 1778 г. у ім было 1 500 відаў экзатычных раслін. Потым Жылібер заклаў яшчэ адзін батанічны сад – пры Віленскім універсітэце [7]. Найстарэйшы з дзеючых на тэрыторыі Беларусі батанічных садоў – заснаваны ў 1847 г. Батанічны сад Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках.

Батанічныя сады выкарыстоўваюцца як для дэманстрацыі відаў, так і ў адукацыйных мэтах. Іх тэрыторыі найбольш прывабныя з пункту гледжання бяспекі для наведвальнікаў і прыстасаванасці для экалагічнага выхавання турыстаў і экскурсантаў. Менавіта таму для стварэння экалагічнай сцежкі намі абрана тэрыторыя батанічнага саду філіяла БДТУ, размешчанага на тэрыторыі Негарэльскага лясгаса. Называецца экалагічная сцежка «Казка Негарэльскага лесу»: у склад экскурсійнага аповяду, акрамя навуковай інфармацыі аб прыродных аб’ектах, уключаны міфы і легенды беларусаў і іншых народаў, звязаныя з прыроднымі стыхіямі (лесам, вадой). Тэму «казачнасці» падтрымліваюць і назвы пунктаў прыпынку. Гэта спрыяе дасягненню наступнага:

● па-першае, аддаецца даніна народнай традыцыі, калі існавала глыбокая вера ў тое, што ўсе прыродныя стыхіі і сфера пражывання чалавека населены шматлікімі багамі і духамі (такім чынам міфалогія спрыяе захаванню слядоў традыцыйнай экалагічнай культуры);

● па-другое, выхоўваецца паважнае стаўленне да спроб патлумачыць незразумелае, хоць гэтыя тлумачэнні сучасным чалавекам успрымаюцца як цікавая, наіўная казка.

Экалагічная сцежка «Казка Негарэльскага лесу» мае працягласць 980 м, і ўключае ў сябе 11 пунктаў прыпынку, якія знаходзяцца ў партэрнай частцы і дэндрарыі батанічнага саду, заснаванага ў 1963 г. Кожны з прыпынкаў характарызуецца пэўнай фларыстычнай або гісторыка-культурнай каштоўнасцю. У найбольш цікавых пунктах сцежкі ўсталяваны 5 інфармацыйных стэндаў. На ўсім яе працягу наведвальнікі бачаць як асобныя драўляныя скульптуры, так і кампазіцыйныя групы, а таксама вырабы з лазы.

На першым прыпыначным пункце «Захавальнікі саду» («Garden Keepers») экскурсанты даведваюцца пра тое, што у пасадках партэрнай часткі батанічнага саду БДТУ расце 25 відаў і 70 дэкаратыўных формаў іглістых раслін [8]. Ролю «захавальнікаў» таямніц саду выконваюць не толькі Лесавік у выглядзе драўлянага карча з вачыма, але і шэраг туй (калона- і шарападобныя, пірамідальныя).

Другі прыпынак – «Мядзведжы куток» («Bear's Corner») – там наведвальнікаў сустракае драўляная скульптура мядзведзя. Беларусы лічылі, што мядзведзь – перакінуты ў звера чалавек (недарэмна можа хадзіць на дзвюх лапах і харчавацца раслiннай і мясной ежай). Яшчэ ён лічыўся адным з увасабленняў бога Вялеса, а таму заступнікам хатніх жывёл. У знак асаблівага шанавання клышаногага кожны год 6 красавіка беларусы адзначаюць «Камаедзіцу» – свята абуджэння Мядзведзя, ажыўлення прыроды і нараджэння вясны [9, с. 410]. Неабходны атрыбут гэтага свята – камы гарохавай кашы, якія прыносіліся ў лес як пачастунак мядзведзю. У гэтым кутку саду ўсё – для яго ці нагадвае пра яго: ляшчына мядзведжая, вішня птушыная, журавіны, вінаград, вялізныя пухнатыя суквецці гартэнзіі (так падобныя на «камы» кашы).

Журавіны ў Новай Англіі часам называлі *Bearberries* (літаральна 'мядзведжая ягада'). Асабліва багатыя на гэтую карысную ягаду балоты Віцебшчыны і Палесся. Для людзей прывабная яна не толькі сваімі лекавымі якасцямі, але і простымі ўмовамі захоўвання: дастаткова заліць яе вадой і паставіць у халодным месцы. Першыя еўрапейскія пасяленцы называлі журавіны *Craneberry* (літаральна 'ягада-журавель'), таму што раскрытыя кветкі на сцяблінах нагадвалі ім шыю і галаву жураўля. Недарэмна ў нас існуе дыялектная назва ягады – *жураўліны*.

Вінаград – расліна паўднёвая, аднак археолагі сведчаць, што ў Беларусі ён быў распаўсюджаны па меншай меры з XVI ст. Пацвярджэнне таму – яго выявы на кафлі печаў.

Рэальныя мядзведзі лёгка залазяць на дрэвы (асабліва бортныя) і з задавальненнем штурмуюць каменныя вяршыні. Таму на нашай сцежцы побач з мядзведзем якраз дарэчы самаробны «ракарый». Дзякуючы дызайнерскаму мастацтву ён ператварыўся ў сапраўдную «Каменную казку» («Stone Tale») – наш трэці прыпынак. Гэта – цудоўны свет з камення і кветак.

Шматлікія валуны на нашай зямлі – гэта сляды доўгай дарогі ледавікоў [10]. Пры дэталёвым вывучэнні валуноў навукоўцы-геолагі знаходзяць сотні відаў горных парод, самыя буйныя з якіх – гэта граніты і гнейсы (адпаведна 65–75 на 20–25 % з улічаных). Пераважаюць гэтыя пароды і сярод меншых па памеры камянёў, аднак сярод іх часта сустракаюцца парфірыты, крышталічныя сланцы, кварцыты і г.д., разнастайныя па колеры і структуры. Вапнякоў і даламітаў шмат сярод валуноў Мінскага і Віцебскага ўзвышшаў (уключаючы груды памерам у 1–1,5 м). Геолагі лічаць прадстаўнікоў гэтых ападкавых парод «абарыгенамі», выламанымі ледавікамі не ў Скандынавіі, як большасць каменных глыбаў, а дзесьці паблізу.

У Беларусі культ камянёў вядомы з даўніх часоў. Чалавека дзівіла яго нязменнасць, вечнасць у параўнанні са зменлівай прыродай. Народная фантазія верыла ў тое, што гэта не проста высечаныя ледніком груды, а закамянелыя людзі, жывёлы, выпечаны хлеб. Нават у наш час навукоўцы налічваюць больш за 500 культавых камянёў: камяні-абярэгі; камяні-следавікі (са следам Божай Маці, Ісуса, святых ці нават д'ябла). Нямала камянёў маюць дачыненне да дахрысціянскіх бостваў («Дажбогаў камень», «Воласкамень», «Пярун-камень»). Пасля прыняцця хрысціянства іх «перахрысцілі», гэта значыць альбо выбілі на іх крыж, як на славутых «Барысавых камянях» на Віцебшчыне, альбо паставілі побач крыж. Але сутнасць застаецца нязменнай: гэта па-ранейшаму месца пакланення, пра што сведчаць «ахвяры» у выглядзе манет, збажыны, стужачак і элементаў адзення побач з культавымі камянямі. Можа, неўсвядомленае шанаванне камянёў і садейнічала фарміраванню традыцыі ўключэння камянёў у кампазіцыі садоў і паркаў у якасці элементаў альпійскіх горак і ракарыяў.

Сярод камянёў ракарыя – касачы, кракос, нарцысы і цюльпаны, лён шматгадовы, а побач – яго «сваяк» лён-даўгунец. Можна сказаць, што ён беларусаў апранаў, гадаваў і лячыў. Акрамя нітак з валакна, з насення лёну атрымліваюць алей, які таксама выкарыстоўваюць для тэхнічных мэт. Гэты алей, як і насенне, ужываюць у медыцыне. Жмыхом, які атрымліваюць пры перапрацоўцы лёну, кормяць малочных жывёл. Высушанае і размолатае ільняное насенне злёгку падсольвалі і елі з варанай бульбай падчас шматлікіх пастоў. Для лячэння прэласцяў у немаўлят выкарыстоўвалі «саскобы» з туга нацягнутага ільнянога палатна. У фальклорнай традыцыі захаваліся шматлікія правілы і забароны на пасеў, уборку і апрацоўку нашай галоўнай тэхнічнай культуры. Нездарма паслядоўнасць аперацый ад сяўбы да вырабаў замацаваная ў песні пра тое, як «Пасеялі дзеўкі лён».

Калі мядзведзя ў ракарыі прывабілі б камяні, дык кветкі цікавыя істотам, якіх па легендзе Бог назваў сваёй «любімай казюлькай» і якія насяляюць «Пчаліны мегаполіс» («Bee's Megalopolis»), што знаходзіцца на 4-м прыпынку сцежкі.

У свеце налічваецца каля 50 млн сем'яў меданосных пчол (каля 80 % ва Усходнім паўшар'і, 20 % – у Заходнім). На пачатак 2013 г. у Беларусі налічвалася каля 238 тыс. пчаласем'яў, прычым большасць з іх (81 %) – у фермерскіх гаспадарках. У Еўропе вядомыя разнастайныя пароды меданосных пчол [11, с. 235–245]. На тэрыторыі Палесся і Бярэзінскага біясфернага запаведніка захавалася ў чыстым выглядзе сярэдняруская парода пчол. Шырокае распаўсюджанне атрымала найбольш каштоўная помесь сярэднярускай і карпацкай парод. Гаспадаркі ўсіх катэгорый у год атрымліваюць у сярэднім 3 300 т мёду (з яго 2 800 т – прымаецца ад насельніцтва).

Пчалярства ў Беларусі прайшло доўгі шлях ад бортніцтва да сучасных пчальнікоў. Цяпер у Беларусі крыху больш за 900 гаспадарак. За апошнія гады колькасць пчаліных сем'яў па розных прычынах зменшылася ў 3 разы [12].

Як у сапраўдным мегаполісе, тут ёсць пчаліныя дамы (гэта пчальнік з вульлямі) і месца працы (яблыневы сад і бярозава-ліпавая прысада). З апошняй у 1963 годзе і пачынаўся дэндрарый гэтага батанічнага саду, які цяпер ператварыўся ў сапраўдны лес.

Нават цяпер лясы займаюць амаль трэцюю частку тэрыторыі Беларусі. У першабытную ж эпоху толькі рэкі – гэтыя «божыя дарогі» перасякалі непралазныя лясныя гушчары. Гэты таямнічы і небяспечны свет палохаў чалавека. Рэальнай пагрозай былі дзікія звяры, але чалавек «засяляў» лес і іншымі персанажамі, у існаванне якіх верыў. Духі лесу і вады ў традыцыйнай культуры фактычна выконвалі ролю «захавальнікаў» прыроды і тым самым фарміравалі экалагічную свядомасць.

Паводле легенд у лясах Беларусі жылі Пушчавік, Купальскі Дзядок, Кадук, Баба-яга (Ягіня), Лясун (Лесавік, Лясны дзед) [13]. Адзін з такіх «захавальнікаў» лесу – Гаевы дзед (Гаюн). Яго імправізаваны дамок прытуліўся на ўскрайку паляны на стаянцы «Уладанні Гаюна». Міфалогія беларусаў – адна з асноўных падтэм на прыпынках «У гасцях у Лазавіка» і «Кветкавая феерыя Русалкі». Праз міфалагічных персанажаў – Гаюна і Лесуна – разглядаецца і праблема аховы прыроды: лясоў і іх насельнікаў. Калі Гаюн зберагаў лясныя расліны, дык насельнікаў лесу ахоўваў Лясун, якога «чакаюць» мядзведзі на паляне наступнага прыпынку.

Батанічныя сады – асяродак распаўсюджання інтрадуцэнтаў (мігрантаў) у свеце, як і ў Беларусі. «Абарыгены» ў нашых лясах – гэта каля 1 650 вышэйшых раслін. З іх 28 відаў дрэў, каля 60 кустарнікаў. Інтрадуцэнты («мігранты») у нашым садзе – 650 відаў дрэваў і кустоў (з Паўночнай Амерыкі – больш за 150, з Японіі і Кітая – больш за 50, з Еўропы – больш за 300).

На прыпынку «Царства Голанасенных», адзін з 4 абарыгенных відаў якіх – сасна – з'яўляецца асноўнай лесаўтваральнай пародай у Беларусі, выразна бачная аб'ектыўная роля батанічных садоў у свеце і ў нас. У садзе большасць з відаў Голанасенных – інтрадуцэнты: сасна Веймутава, елка белая, піхта, лістоўніца, туя, тсуга, псеўдатсуга Мензіса.

Балоты – яшчэ адно прыроднае асяроддзе беларусаў. Яны займаюць плошчу ў 2,5 млн га [14] і паводле спосабу ўтварэння падзяляюцца на 3 тыпы. Ім адпавядаюць 3 міфічныя істоты: Балотнік, Багнік і Аржавенік [13]. А гаспадаром балотных раслін лічыўся Лазавік. На стэндзе прыпынку «У гасцях у Лазавіка» адлюстраваны гэты міфічны гаспадар – аднавокі карузлік памерам з пазурык. Густыя кусты пераплеценага лазняка былі домам для яго гарэзлівых спадарожнікаў – Лознікаў.

Дэкаратыўна-ліставыя дравесныя расліны ў садзе прадстаўлены 35 відамі і 45 дэкаратыўнымі формамі. Гэта віды і садовыя формы барбарыса, бярозы, бузіны, граба, вярбы, пузыраплодніку, рабіны, ляшчыны [8]. Менавіта апошнюю расліну беларусы памылкова называюць «арэхам». Пра гэта даведваюцца наведвальнікі на прыпынку «Залаты арэшак». З 6 відаў роду арэх нашага саду амаль абарыгенным з'яўляецца грэцкі, які паспяхова выспявае на Палессі. А найлепш з прыхадняў у азеляненні Мінска прыжыўся арэх манчжурскі.

У Беларусі, як і ва ўсёй Еўропе, у садова-паркавым мастацтве па чарзе панавала мода на французскі ці англійскі паркі. Неад'емнай часткай батанічных садоў заўсёды былі вадаёмы. На прыпынку «Кветкавая феерыя Русалкі» вакол вадаёма з фантанам размяшчаецца калекцыя кветкава-дэкаратыўных раслін, што ўключае 28 відаў і гатункаў аднагадовых, 17 двух- і 254 шматгадовыя кветкавыя культуры. Іх дапаўняе калекцыя ліставых куставых раслін, якія прыгожа квітнеюць, што ўключае 45 відаў і 103 дэкаратыўныя формы і гатункі [8].

Драўляная Русалка на беразе вадаёма сушыць валасы на сонцы і з захапленнем назірае за кветкавым морам, што відазмяняецца з вясны да восені. Гэта адзін са шматлікіх духаў вады, што з эпохі рамантызму стаў таксама вобразам літаратурных твораў. У міфалогіі беларусаў вядомы яшчэ Вадзянікі, Азярніцы, Вірнікі, Баламуцень і г.д. Але толькі аднаму з духаў вады прысвечаны цэлы абрадавы тыдзень, які так і называецца – Русальны [13, с. 562–569].

Такім чынам, экскурсія па вучэбна-пазнавальнай экалагічнай сцежцы «Казка Негарэльскага лесу» дае магчымасць вывучэння асаблівасцей не толькі флоры і фаўны Беларусі, але яе матэрыяльнай і духоўнай культуры, наведвальнікі знаёмяцца з міфалагічнымі ўяўленнямі мясцовага насельніцтва, якія склаліся яшчэ ў першабытную эпоху і актыўна спалучаюцца з сучаснымі этнаграфічнымі святамі.

ЛІТАРАТУРА

1. *Бессараб, Д. А.* Вопрос о происхождении экологического туризма / Д. А. Бессараб // Труды БГТУ. Лесное хозяйство. – 2015. – № 1 (174). – С. 240–243.
2. *Сергеева, Т. К.* Экологический туризм / Т. К. Сергеева. – М. : Финансы и статистика, 2004. – 358 с.
3. Рекомендации по развитию экологического туризма в Беларуси [Электронный ресурс] // Белгипролес. – 2008. – Режим доступа : www.belgiproles.by/documents/doc_60.pdf. – Дата доступа : 28.02.2015.
4. Ботанические сады [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://studopedia.ru/3_103417_botanicheskie-sadi.html. – Дата доступа : 15.01.2017.
5. Ботанические сады [Электронный ресурс] // Дендрологические парки и ботанические сады. – Режим доступа : official.academic.ru/5271. – Дата доступа : 15.01.2017.
6. *Головкин, Б. Н.* Ботанические сады [Электронный ресурс] / Б. Н. Головкин. – Режим доступа : http://knowledge.su/b/botanicheskie-sady. – Дата доступа : 15.01.2017.
7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1996. – Т.3. – С. 380.
8. Ботанический сад [Электронный ресурс] / БГТУ. – Режим доступа : https://www.belstu.by/faculties/lh/lpisps/botanicheskij-sad.html. – Дата доступа : 20.12.2016.

9. Жыцця адвечны лад : Беларускія народныя прыкметы і павер'і : у 3 кн. / уклад. У. Васілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1998. – Кн. 2. – С. 410.
10. Камни и валуны Беларуси [Электронный ресурс] / Фотоэнциклопедии Беларуси. – Режим доступа : http://www.fotobel.by/valuny-belarusi/. – Дата доступа : 12.02.2017.
11. *Каплич, В. М.* Основы пчеловодства : учеб. пособие / В. М. Каплич [и др.] ; под ред. В. М. Каплича. – Минск : БГТУ, 2009. – С. 235–245.
12. Проблемы и направления развития пчеловодства в Белоруссии [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://roypchel.ru/pchelovodstvo/v-belorussii.html#h2_1. – Дата доступа: 15.01.2017.
13. Зямная дарога ў вырай. Беларускія народныя прыкметы і павер'і : у 3 кн. / уклад. У. Васілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1999. – Кн. 3. – 654 с.
14. Болота Беларуси [Электронный ресурс] // Фотоэнциклопедии Беларуси. – Режим доступа : http://www.fotobel.by/foto-belorusskoj-prirody/bolota-belarusi/. – Дата доступа : 12.02.2017.

Т. І. Голікава, І. В. Владыка (Мінск)

БЕЛАРУСКІЯ РЭАЛІІ Ў КАНТЭКСЦЕ МІЖКУЛЬТУРНЫХ КАНТАКТАЎ: НАЙМЕННІ ТУРЫСТЫЧНЫХ АБ'ЕКТАЎ У АНГЛАМОЎНЫМ ДАВЕДНІКУ «BELARUS»

У апошнія гады ў Беларусі вялікая ўвага надаецца пытанню развіцця міжнароднага турызму і пазітыўнага іміджу краіны за мяжой. Адзін з аспектаў гэтага пытання – стварэнне разнастайнай турыстычнай прадукцыі (мапаў, тэкстаў экскурсій, турыстычных дапаможнікаў) на замежных мовах, а перадусім на англійскай мове. Адной з актуальных праблем, якія паўстаюць перад іх стваральнікамі, з'яўляецца перадача сродкамі замежных моў беларускіх рэалій.

Як вядома, рэаліі (або рэаліі-з'явы) – гэта культурна-спецыфічная інфармацыя пра прадметы, паняцці ці з'явы, уласцівыя жыццю (быту, культуры, гісторыі) пэўнай этнакультурнай супольнасці і незнаёмыя практычнаму вопыту іншых этнакультурных супольнасцей. У цэнтры нашай увагі – рэаліі-словы, гэта значыць моўныя сродкі абазначэння рэалій-з'яў (словы, словазлучэнні і сказы), інакш кажучы, моўныя носьбіты нацыянальных і гістарычных своеасаблівасцей ці каларыту.

Асаблівасці перадачы беларускіх рэалій прааналізаваны намі на прыкладзе даведніка «Belarus» брытанскага выдавецтва «The Bradt Travel Guides», вядомага як першы замежны турыстычны даведнік на англійскай мове, прысвечаны Беларусі. Ён утрымлівае практычную інфармацыю, а таксама шматбакова раскрывае турыстычны патэнцыял усіх шасці абласцей краіны [1]. Па словах аўтара Найджэла Робертса (Nigel Roberts), які з 2001 г. штогод наведвае Беларусь і імкнецца расказаць пра яе найбольш праўдзіва, каб «стварыць своеасаблівы мост паміж заходнімі чытачамі і турыстычнай інфра-

структурай Беларусі» [1]. Сёння існуюць тры выданні даведніка – 2008, 2011 і 2015 гг. Заўважым, што першыя два выданні былі перакладзены на французскую, італьянскую, польскую і рускія мовы [Там жа], што робіць яшчэ больш актуальным пытанне аб дакладнасці перадачы беларускіх рэалій на замежную мову.

На 248 старонках даведніка намі былі выбраны больш за 1 800 беларускіх рэалій, прадстаўленых 5 300 моўнымі адзінкамі (слоў, словазлучэнняў і выразаў). Для аналізу іх перадачы мы спыніліся на назвах турыстычных аб'ектаў (ТА), да якіх мы залічылі помнікі архітэктуры, адметныя мясціны, рэлігійныя пабудовы, мемарыялы, музеі, тэатры, культурныя і спартыўныя аб'екты. Гэты падклас рэалій зацікавіў нас складанай структурай моўных адзінак, якія часта ўключаюць у сябе як родавыя словы, так і ўласныя імёны (ІУ): назвы (*стадыён «Дынама»*), імёны і прозвішчы (*помнік Марку Шагалу*), агіонімы (*царква св. Іллі*), а таксама прыметнікі, утвораныя ад тапонімаў, якія паказваюць на месцазнаходжанне аб'екта (*Мірскі замак*), што дазваляе нам закрануць і праблему перадачы ІУ як этнакультурных рэалій.

У выніку нашага аналізу выяўлены наступныя асаблівасці перадачы беларускіх рэалій.

1. ТА могуць мець у арыгінале некалькі варыянтаў назваў: афіцыйна-дзелавыя, нейтральныя і гутарковыя (напр., *Каложская царква святых Барыса і Глеба*, *Каложская Барысаглебская царква*, *Каложа*), поўныя і скарочаныя варыянты (напр., *Парк культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў*, *Парк Чалюскінцаў*), або некалькі раўназначных варыянтаў (напр., *«Мінскія вароты»*, *«Вароты Мінска»*, *«Вароты горада»*), што стварае перад перакладчыкам сітуацыю выбару.

2. У кожнай чацвёртай рэаліі аўтар даведніка ўжываў ад 2 да 5 варыянтаў яе перадачы ў мове перакладу (МП), што выклікана кантэкстуальнай неабходнасцю ўтварэння сінанімічных форм. Напрыклад, згадваючы *Замкавую гару ў Навагрудку*, пасля апісальнага перакладу 'a hill, on which the ruins of the 14th-century castle stand' [2, p. 141] аўтар выкарыстоўвае генералізацыю 'the hill' [Там жа], 'the bluff' [Там жа] і калькаванне рэаліі 'the castle hill' [Там жа] для эканоміі сродкаў пры далейшым апавяданні пра гэты аб'ект. Але часта варыятыўнасць перадачы ТА можна растлумачыць непаслядоўнасцю аўтара, які сутыкнуўся са складанай назвай. Напрыклад, *Парк Гомельскага палаца-паркавага ансамбля Румянцавых-Паскевічаў* (раней – *Парк імя Аляксандра Васільевіча Луначарскага*, а сёння – *Парк культуры і адпачынку*) атрымаў тры варыянты перадачы ў даведніку: 'the gardens of Rumantsev's Palace in Gomel' [Там жа, p. II]; 'the Rumyantsev-Paskevich Park' [Там жа, p. 220, 225], Lunacharsky Park [Там жа, p. 227] – без тлумачэння пра тое, што гэта адзін і той жа аб'ект, што прыводзіць да скажэння інфармацыі пра яго.

3. Складаная структура найменняў ТА прыводзіць да спалучэння некалькіх прыёмаў перадачы рэалій, якія мы ўмоўна падзялілі на самастойныя (калькаванне, функцыянальны аналаг, генералізацыю, апісанне, тлумачэнне і метанімію) і дапаможныя.

а) самы распаўсюджаны з самастойных прыёмаў – калькаванне (≈70 %), які дазваляе захаваць унутраную форму, а значыць і пазнавальнасць назвы на мове арыгінала (МА) для замежнага турыста. Амаль кожны другі выпадак калькавання суправаджаецца дапаможным прыёмам перастаноўкі кампанентаў, як таго патрабуе сінтаксічная сістэма МП, дзе родавае слова ўжываецца пасля слоў, якія яго характарызуюць, напр. – *Парк Горкага* ‘Gorky Park’ [2, p. 110]. Але *кінатэатр «Беларусь»* аўтар даведніка перадаў як ‘Cinema Belarus’, прыняўшы родавае слова за частку назвы: *The newest movie theatre in Minsk is called Cinema Belarus* [Там жа, p. 85];

б) каля 5 % усіх варыянтаў перадачы рэалій – гэта выпадкі паралельнага ўжывання 2–3 самастойных прыёмаў перадачы рэалій, напрыклад, для згадкі пра *Камянецкую Вежу* або *«Белую вежу»*, Н. Робертс ужывае адначасова 3 прыёмы перадачы: транслітарацыю, калькаванне і апісанне ‘Byelaya Vyezha’, ‘White Tower’, ‘a cylindrical tower’ [Там жа, p. 169]. Вартая ўвагі перадача назвы *Благавешчанскай* (*Благовещенская* – рус.) *царквы ў Віцебску* ‘Blagovezhenskaya Annunciation Church’ [Там жа, p. 192], дзе ўнутры аднаго варыянта перадачы – два прыёмы: транслітарацыя і калькаванне;

в) да дапаможных прыёмаў можна аднесці прыёмы перадачы ІУ, якія часта з’яўляюцца кампанентамі рэалій, такія як *транслітарацыя*, *транспазіцыя*, *традыцыйная перадача* і *прамы графічны пераносе*.

Самым распаўсюджаным з іх можна адзначыць т р а н с л і т а р а ц ы ю (57 %). Заўважым, што толькі ў 5 % перадача адбылася адназначна з беларускай мовы і ў 52 % – адназначна з рускай (у 16 % выпадкаў перадача ІУ лацініцай на абедзьвюх мовах супадала, напрыклад *Брест/Брэст* ‘Brest’ [Там жа, p. IV], *Мир/Мір* ‘Mir’ [Там жа, p. 137]).

На нашу думку, мэтазгодна прытрымлівацца прынцыпу прыярытэту беларускай мовы пры выбары МА для перадачы рэалій, у першую чаргу тапонімаў, гідронімаў і антрапонімаў, каб не парушаць прынцыпу нацыянальна-моўнай прыналежнасці імён уласных [3, с. 155] і захаваць іх нацыянальна-культурны каларыт.

У выпадку з імёнамі гістарычных асоб, якіх лічаць «сваімі» некалькі народаў (напр. князь *Вітаўт* ‘Vitaŭt’ (бел.) і ‘Vitautas’ (літ.); *Адам Міцкевіч* ‘Mitskevich/Mickievič’ (бел.) і ‘Mickiewicz’ (пол.)), мяркуем, што у тэкстах, прысвечаных менавіта Беларусі, больш правільна было б ужываць беларускі варыянт транскрыпцыі імені па аналогіі з назвамі рэк, якія працякаюць па тэрыторыі некалькіх краін.

Варта адзначыць беларускія назвы геаграфічных аб’ектаў, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі. Мяркуем, што ў асобных выпадках магчыма ўжываць старажытную беларускую назву з яе сучасным варыянтам і тлумачэннем у дужках: *Вільня* (сучасны Вільнюс, сталіца старажытнай Літвы), *Viĺnia* (now Vilnius, the ancient capital of Grand Duchy of Lithuania), што сустракаецца ў Н. Робертса: ‘the commonwealth’s capital Vilno (now Vilnius)’ [2, p. 165].

Пры наяўнасці розных алгарытмаў для перадачы беларускіх тэкстаў лацініцай мы прапануем кіравацца рэкамендацыямі ААН [4] аб выкарыстанні «Інструкцыі па транслітарацыі геаграфічных назваў Рэспублікі Беларусь літарамі лацінскага алфавіту» ўзору 2000 г. [5].

Вяртаючыся да аналізу перадачы назваў ТА ў прыкладзе з *Барысаглебскай (Каложскай) царквой*, аўтар перадаў імя аднаго святога з рускай мовы ‘St Boris’ – (з беларускай было б ‘Barys’), а другога – з беларускай ‘St Hleb’ – (з рускай было б ‘Gleb’). Заўважым, што для імён святых, агульных для хрысціян усяго свету, неабходна ўжываць прыём транспазіцыі.

Паказальна, што *царква Іллінская ў Бешанковічах* перадаецца як ‘Church of St Elias’, а *Іллінская царква ў Оршы*, на той жа старонцы – як ‘Church of St Illy’ [2, p. 203]. Адзін жа з кампанентаў імені рускага святога *Аляксандра Неўскага* перададзены прыёмам транспазіцыі ‘Alexander Nevsky’ [Там жа, p. 192], чаго не патрабуе паходжанне святога. Адзначым, што прыём транспазіцыі двойчы быў ужыты і для перадачы імені паэта *Максіма Багдановіча* ‘Maxim Bogdanovich’ [Там жа, p. 109, 176];

г) улічваючы шматканфесійную спадчыну Беларусі, для перадачы назваў рэлігійных пабудоў трэба ўжываць прыём дабаўлення для абазначэння прыналежнасці да хрысціянскай канфесіі. Так, для абазначэння каталіцкай канфесіі Н. Робертс выкарыстоўваў адпаведнае слова *Catholic* у 80 % як ‘Roman Catholic’ і аднойчы як ‘Polish Roman Catholic’, каб адзначыць адметнасць стылю. (Гаворка ішла пра *Фарны касцёл у Нясвіжы* [Там жа, p. 139].) Для абазначэння праваслаўнай царквы ўжывалася слова ‘Orthodox’ (аднойчы як ‘eastern Orthodox’, магчыма, з-за стылю ТА, для пратэстанцкіх рэлігійных аб’ектаў – ‘Lutheran’, ‘Calvinist’ і ‘Reformist’. Але ў выпадку з былым пратэстанцкім збудаваннем у Заслаўі дабаўленне ‘Reformist’ было ўжыта некарэктна ‘the Reformist Saviour and Transfiguration Church’ [Там жа, p. 142], бо цяпер гэта праваслаўная царква.

Мэтазгодна ўказваць прыналежнасць да манаскага ордэна, што дазваляе апусціць абазначэнне канфесіі (напр., *касцёл каталіцкага ордэна дамініканцаў* (ці *дамініканскі касцел*) *у в. Княжыцы*) ‘a Dominican church built in 1681 in the village of Knyazhytsy’ [Там жа, p. 215].

4. Пры перадачы назваў рэлігійных будынкаў у беларускай мове могуць ужывацца дзве сінтаксічныя мадэлі:

а) *царква*/*касцёл*/*сабор*/*манастыр*/*кляштар* + назоўнік(і)/ІУ у Р. скл. (*царква святых Барыса і Глеба*);

б) прыметнік (утвораны ад назоўніка(ў)/ІУ з мадэлі 1) + *царква* (і г. д.) (*Барысаглебская царква*).

Часта назва храма можа выражацца паводле абедзвюх мадэляў: *царква святога Мікалая і Свята-Мікалаеўская царква*, але ў пэўных выпадках гэта складана ажыццявіць (толькі *касцёл Адшукання Святога Крыжа*, але *Крыжаўздзвіжанская царква*). На англійскай мове назвы храмаў таксама можна перадаць згодна з дзвюма мадэлямі:

а) *church*/*cathedral*/*monastery*/*cloister* + *of* + N (noun group) (*Cathedral of Sts Peter and Paul)* [Там жа, p. 229];

б) N (noun group) + *church* (etc.) (*Assumption Church)* [Там жа, p. 215].

У даведніку «Belarus» выкарыстоўвалася пераважна першая мадэль (70 % выпадкаў).

5. Назвы храмаў, дзе есць імёны двух святых, перадаюцца ў даведніку паводле трох мадэляў:

а) *Sts* + N + *and* + N (*Cathedral of Sts Peter & Paul*) [2, p. 225];

б) *St* + N + *and* + *St* + N (*Kolozhskaya Church of St Boris and St Hleb*) [Там жа, p. 181];

в) *St* + N + *and* + N (*Church of St Simeon and Helena*) [Там жа, p. 110].

Найбольш карэктнай з іх нам падаецца самая частотная мадэль 2.

6. Трэба заўважыць, што адпаведна з камунікатыўным заданнем тэксту даведніка і яго будучым рэцыпіентам, аўтар актыўна карыстаецца эксплікатыўнымі прыёмамі перадачы рэалій. Можна вызначыць два дапаможныя прыёмы перадачы рэалій – элемент апісання (ужыванне дэскрыптыўнага прыметніка) (напр. *the brick-built Orthodox Church of the Resurrection)* [Там жа, p. 185], а таксама элемент тлумачэння (каментар, які ўваходзіць у структуру рэаліі і не можа быць апушчаны) (напр. *Капліца-пахавальня Паскевічаў* – ‘Mausoleum in the gardens of Rumantsev’s Palace in Gomel’) [Там жа, p. II].

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што на сённяшні момант ні замежнаму, ні айчыннаму перакладчыку немагчыма прытрымлівацца паслядоўнасці і абгрунтаванасці пры перадачы беларускіх рэалій на англійскую мову, бо дагэтуль яшчэ не існуе дастаткова поўнага слоўніка для пары моў беларуская-англійская, у якім былі б замацаваныя формы перадачы беларускіх рэалій. Для паспяховага развіцця міжнароднага турызму ў Рэспубліцы Беларусь было б карысна распрацаваць беларуска-англійскі слоўнік турыстычных (краіназнаўчых) рэалій, які б уніфіцыраваў перадачу беларускіх рэалій з улікам інтралінгвістычных фактараў – фанетычных, лексічных і граматычных адметнасцей беларускай мовы, а таксама экстралінгвістычных, звязаных са складанай гісторыяй беларускага народу, білінгвізму, наяўнасці розных алгарытмаў для перадачы беларускіх тэкстаў лацініцай, што тлумачыцца гістарычнай і культуралагічнай спецыфікай айчынных рэалій.

ЛІТАРАТУРА

1. *Робертс*, *Н.* Автор англоязычного путеводителя по Беларуси: приезжайте сюда с открытым сердцем и без стереотипов : беседа с автором путеводителя «Belarus» Н. Робертсом [Электронный ресурс] / Н. Робертс ; беседовал А. Лычавко // Интернет-портал TUT.BY. – Минск, 2015. – Режим доступа : http://news.tut.by/society/309486.html. – Дата доступа : 19.10.2015.

2. *Roberts*, *N.* Belarus / N. Roberts. – Chalfont St. Peter ; Guilford : Bradt Travel Guides, The Globe Pequot Press, 2011. – 248 p.

3. *Ермолович, Д. И.* Имена собственные: теория и практика межъязыковой передачи : учеб. пособие для вузов / Д. И. Ермолович. – М. : Валент, 2005. – 416 с.

4. Romanization of Belarusian geographical names: Resolution X/6 (2012) of Working Group on Romanization Systems of United Nations Group of Experts on Geographical Names (UNGEGN) [Electronic resource] – N. Y., 2012. – Mode of access : http://www.eki.ee/wgrs/res/res_10_6.htm. – Date of access : 14.04.2016.
5. Инструкция по транслитерации географических названий Республики Беларусь буквами латинского алфавита (сфера действия общеобязательная) [Электронный ресурс] : Постановление Государственного комитета по земельным ресурсам, геодезии и картографии Республики Беларусь, 23 ноября 2000 г. № 15 // Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка. – Мінск, 2016. – Рэжым доступу : http://knihi.com/storage/Translitaracyja_ hieahraficnych_nazvau.html. – Дата доступу : 14.04.2016.

Т. Г. Гуцева (Минск)

НЕОБХОДИМОСТЬ КОМПАРАТИВИСТСКОГО ИЗУЧЕНИЯ РЕЛИГИЙ В УСЛОВИЯХ ГЛОБАЛЬНОГО МИРА

В условиях современных реалий все острее ставится вопрос о готовности людей к жизни в новых условиях, и все более важными становятся вопросы формирования межкультурной компетентности, то есть развития определенных знаний, умений и навыков, позволяющих эффективно контактировать представителям разных культур. Обострилась необходимость отойти от сугубого академизма и максимально усилить практический аспект в преподавании гуманитарного знания, в том числе и религиоведения, знания не как самоцели, а знания как инструмента для ориентации в жизни и работе современного специалиста, востребованного на рынке.

В современных мультикультурных и мультирелигиозных обществах все более актуальной задачей становится гармонизация этноконфессиональных отношений посредством изучения верований других традиций и развития взаимопонимания, доверия и уважения. Как отмечает К. Армстронг: «Религия снова стала той внушительной силой, с которой пришлось считаться любым властям… и, без сомнения, будет играть важную роль во внутренней и внешней политике будущего».

В рамках цивилизационного подхода религия оценивается в качестве одного из главных системообразующих элементов цивилизации, под которой понимается культурная преемственность и духовное единство человечества, являющееся высшим результатом исторического развития. Религиоведение, являясь комплексной дисциплиной, использует самые разнообразные методы познания. Изучение религии находилось в русле общего интереса к культуре, расширяло знания европейцев об иных культурах, человеческой истории в целом.

Сравнительно-историческое исследование сопоставляет временные этапы развития одной и той же религии; разные религии, существующие одновременно, но находящиеся на неодинаковых стадиях развития. Большое значение имеет сравнение сопоставимых образов в разных религиях, западных и восточных культурах и т.п.

Европейские мыслители на протяжении многих веков углубленно изучали христианскую религию. Ситуация изменилась в эпоху Просвещения, когда именно христианство подверглось критике со стороны европейской философской элиты. Усилились поиски «естественной религии», основные положения которой можно было бы вывести из человеческой природы. И философы вынуждены были обращаться помимо христианства к другим религиям, надеясь обнаружить в ходе их сравнительного анализа общие для всего человечества верования. В результате накапливались знания об индуизме, буддизме, даосизме, конфуцианстве, исламе и других религиях. Пробудившийся в Европе интерес к религиям неевропейских народов, более толерантное отношение к ним расширили предмет исследования. Это явилось одной из важнейших предпосылок возникновения религиоведения. Принцип историзма при изучении религии стал широко применяться в немецкой философии.

Развитие филологии, в ходе которого были получены достоверные переводы священных текстов народов Индии, Среднего и Ближнего Востока, а также проведение сравнительного анализа языков, позволившего сделать вывод о существовании нескольких языковых семейств, происходило вместе с развитием сравнительной мифологии. Особая роль в утверждении компаративистского метода исследования религий принадлежит английскому ученому немецкого происхождения, санскритологу Ф. Максу Мюллеру, переводчику текстов Ригведы, который после основательного исследования индуизма переходит к сравнительному изучению религий. Он подчеркивал, что понять религию как феномен можно только на путях сравнительного исследования. Он утверждал, что тот, кто знает одну религию, не знает ни одной. Чтобы оценить значение той или иной религии, важно обнаружить ее древнейшую форму, сравнить с другими типами религии. Религия нуждается в объективном рассмотрении, а это возможно, если исследователь в состоянии выйти за рамки собственных верований и научных предпочтений.

Важную роль в развитии компаративистского метода изучения религий сыграл М. Вебер. Он не считал единственным «Западный тип рациональности» содержательную предпосылку которого создала иудаистско-христианская форма религиозности. На основе сравнительного анализа мировых религий Вебер выделил три самых общих типа, каждый из которых задает специфический способ отношения к миру. Каждому из этих трех типов свойственна своя установка, определяющая направление жизнедеятельности, вектор социального действия. Один тип – конфуцианство и даосизм, религии Китая, – это религии *приспособления к миру*, два других – религии *неприятия мира*: индуизм и буддизм, религии Индии, – это религии *бегства от мира*; иудаизм и христианство, возникшие на Ближнем Востоке и впоследствии распространившиеся по всему миру, – это религии *овладения миром.*

Мировые религии – это этические религии, религии спасения. Каждая по-своему учит служить добру и отвергать зло. От Вебера идет традиция, которая рассматривает религию прежде всего как мотив социального действия, выявляет ее роль в процессе тех или иных социальных преобразований. Чтобы религиозное учение могло стать социально значимым фактором, оно должно влиять на поведение, деятельность достаточно больших масс. Спиноза подчеркивал, что специфика иудаизма заключается не только в идее богоизбранности еврейского народа, но и в гораздо большей, по сравнению с другими религиями, роли религиозных обрядов.

Сравнивая ислам с христианством, можно заметить, что начинались они по-разному. Но затем в каждой религии постепенно складывается свой «ислам» (строгие правила поведения для масс, основанные на страхе ада), свой «монастырь» (убежище аскетов, беглецов из мира, в котором царит зло), свой «джихад» – священная война: в средневековом христианстве – крестовые походы, рыцарские ордены и т.п. Повсюду религия дробится на секты и течения, проклинающие друг друга. Повсюду господствует буквальное понимание священных книг.

В моральной сфере христианство принесло с собой взгляд на личность как на существо, наделенное свободой, разумом, чувством ответственности и способностью любить. Победа христианства над более богатой и развитой культурой Античности объясняется его способностью дать ответ на вопросы о смысле жизни и о смерти, о взаимоотношениях людей и историческом бытии человека.

В иудаизме и исламе учение о боге в меньшей мере отделено от религиозных этико-правовых принципов и концепций. В буддизме, конфуцианстве, даосизме, дзэн-буддизме всегда были сильны традиции иррационализма, стремление к сверхчувственному и надлогическому постижению Абсолюта. Особенность большинства китайских учений – практическое отсутствие идеи сверхестественного.

Философы мусульманских стран следовали ряду принципов, свидетельствующих о применении ими метода сравнительного изучения религии. Прежде всего это признание исторического характера религии и попытки анализировать специфику различных религий.

Религия выдвигает критерии, ценности, через призму которых человек осознает себя и мир вокруг себя. Мировоззренческая функция религии обеспечивает человеку целеполагание и смыслополагание. Религиозные идеи и ценности, культовая деятельность, религиозные организации регулируют поведение людей. Религия санкционирует определенные способы поведения. Человек приобщается к культуре и традициям, в возникновении и развитии которых религия сыграла большую роль. Современные народы наследовали ментальные и культурные традиции своей религии. В содержательном плане (в сфере смыслов, идей, образов, представлений) вклад религий в формирование культуры и менталитета народа огромен.

В условиях глобализации, в результате миграции населения различные исторические общности, народы, нации начинают сегодня вступать в тесное взаимодействие друг с другом. События последнего времени в станах

Западной Европы показали, что межкультурные, межэтнические контакты не исключают и конфликтов, возникающих на разной почве, в том числе и на религиозной. Поэтому столь важно воспитание этнической и религиозной толерантности. В любой национальной культуре немаловажное место занимают религиозные ценности. Если язык – это универсальная оболочка общественного сознания, то религия – это общий источник самых глубоких и жизненно важных смыслов общественного сознания.

Современное религиоведение использует метод сравнения, доказавший свою высокую эффективность и теоретическую плодотворность. Сегодня он крайне необходим для налаживания диалога и взаимодействия стран и народов. Недостаточность религиозного просвещения, безграмотность большинства населения в вопросах религии, информационная война способствуют созданию базы для привлечения молодых людей в ряды религиозных экстремистов. Активное присутствие религиозного фактора в современной системе международных отношений глобального мира стало уже признанным явлением. В основе христианства, ислама, буддизма, иудаизма, индуизма – при всех различиях и особенностях – лежат базовые общие моральные, нравственные, духовные ценности: милосердие, взаимопомощь, правда, справедливость, уважение к старшим, идеалы семьи и труда. Эти ценностные ориентиры невозможно чем-либо заменить, их надо укреплять. На духовно-нравственный потенциал возложена функция взаимосвязи, объединения внутреннего мира смыслов с внешними. На основе усвоенных ценностей, лежащих в его основе, человек выбирает цели и задачи, способы и средства осуществления деятельности. Духовно-нравственный стержень всех религий является основой взаимопонимания между людьми, столь несхожими по происхождению, воспитанию и интересам. И на этом стержне строятся все принципы диалогов, толерантности, солидарности.

В условиях современных глобальных вызовов и угроз вопрос о значимости культурных различий, моделей поведения, в основе которых лежат религиозные различия, способность их осознать, понять и адекватно учесть в процессе коммуникации является решающим [1, с. 13].

ЛИТЕРАТУРА

1. *Армстронг, К.* Битва за Бога. История фундаментализма / К. Армстронг. – М., 2013.

А. М. Ізергіна (Мінск)

ДА ПЫТАННЯ ЗАХАВАННЯ ЭТНІЧНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ Ў ЛІТВЕ

Актуальным у кантэксце працэсаў глабалізацыі з’яўляецца навуковае вывучэнне і асэнсаванне месца і ролі дыяспар у сацыяльным жыцці, калі фарміраванне адзінай інфармацыйнай і эканамічнай прасторы ёсць адна з прычын радыкальнай змены сітуацыі ў сферы міграцыйных працэсаў. У кантэксце дадзенай праблемы адной з задач з’яўляецца ацэнка ўплыву

дыяспары на палітычную, эканамічную, адміністрацыйна-прававую, культурную і іншыя сферы жыцця грамадства, усталяванне сувязяў з метраполіяй. Адраджэнне нацыянальнай ідэнтычнасці сярод розных пакаленняў беларусаў за мяжой можа быць эфектыўна выкарыстана для ўмацавання эканамічнай і культурнай прысутнасці беларускай дзяржавы ў розных краінах свету [1, с. 6].

У перыяд з канца XIX ст. да 1980-х гг. беларуская дыяспара ахоплівала ад 1/6 да 1/3 часткі беларусаў. На тэрыторыі былога Савецкага Саюза са спыненнем існавання гэтай дзяржавы адбываецца вылучэнне малых этнічных груп як асобных сацыяльна-структурных адзінак, у дачыненні да якіх ужываюць тэрмін *дыяспара*. Словам *дыяспара* (з грэчаскай мовы – ‘рассяленне’) прынята называць сукупнасць пэўнага народа, якая жыве за межамі метраполіі і валодае асноўнымі рысамі нацыянальнай адметнасці народа – мовай, культурай, самасвядомасцю. Тэрмін *беларуская дыяспара* пачаў актыўна ўжывацца ў навуковых даследаваннях і публіцыстыцы адносна нядаўна, атрымаў сваё распаўсюджванне ў беларускай гістарыяграфіі з канца 1980-х гг. [2].

Нягледзячы на амаль стагадовую гісторыю існавання беларускіх асяродкаў у замежжы, яны дагэтуль застаюцца мала вывучанымі: толькі чатыры грунтоўныя працы, прысвечаныя жыццю беларускай дыяспары ў асобных краінах, – «Беларусы ў ЗША» В. Кіпеля, «Беларусы ў Аўстраліі», «Беларусы ў Вялікабрытаніі» Н. Гардзіенкі, «Беларусы ў Канадзе» Я. Садоўскага (на англійскай мове). Навукоўцамі з розных краін у накірунку даследавання беларускай дыяспары ў Літве былі асветлены асобныя тэмы [3–9]. Але сёння адсутнічае праца, прысвечаная этналагічнаму вывучэнню беларусаў у літоўскай дзяржаве. Такім чынам, мэта дадзенай працы – даследаванне пытання захавання этнакультурных асаблівасцей беларусаў Літвы. Тэрыторыя даследавання – межы сучаснай літоўскай дзяржавы. Крыніцай даследавання сталі этнаграфічныя матэрыялы, якія былі сабраны аўтарам падчас сустрэч з беларусамі Літвы на працягу 2015 года ў г. Вільнюс. Рэспандэнты прадстаўляюць два пакаленні жыхароў Вільнюса: людзі ва ўзросце ад 35 да 60, рэспандэнты старэйшыя за 65 год.

У выніку геапалітычных падзей на працягу XX ст. палітычная карта Цэнтральна-Усходняй Еўропы змяналяся тройчы – пасля Першай і Другой сусветных войнаў, распаду Савецкага саюза, беларусы, якія былі карэннымі жыхарамі Паўднёва-Усходніх тэрыторый сучаснай Літвы, сталі нацыянальнай меншасцю Літоўскай дзяржавы. Палітыка Польскай, Літоўскай, Савецкай дзяржаў, пад уплывам якіх знаходзілася беларуская этнічная група ў выніку геапалітычных катаклізмаў, была накіравана на інтэграцыю і асіміляцыю беларускага насельніцтва.

Працэс этнічнай мабілізацыі беларусаў Літвы на сучасным этапе звязаны з палітыкай перабудовы. У БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, пачалі заўважацца пэўныя прыкметы лібералізацыі і дэструкцыі савецкага грамадства. Пачалі ўзнікаць першыя беларускія культурна-асветныя арганізіцыі. У 1988 г. быў арганізаваны клуб аматараў беларускай народнай творчасці «Сябрына» [10, арк. 4], Таварыства беларускай культуры [Там жа, арк. 10].

Пасля абвяшчэння незалежнасці Літвы большасць беларусаў, якія стала пражываюць у гэтай дзяржаве, прынялі яе грамадзянства, а пэўная колькасць атрымала беларускае. Істотна іншы маштаб набыў «нацыяналізм дыяспары» – гуртаванне суродзічаў, выяўленне і рэалізацыя іх нацыянальных імкненняў. Беларуская грамада выразна заявіла ўладам і грамадскасці аб сваіх нацыянальных патрэбах, неабходнасці адраджэння культурнай і гістарычнай спадчыны беларусаў на Віленшчыне. Так, у Вільні з 1993 г. дзейнічае беларуская сярэдняя школа імя Францыска Скарыны. Навучальная ўстанова з'яўляецца пераемніцай традыцый Віленскай беларускай гімназіі, якая была цэнтрам беларускага грамадскага жыцця ў Паўднёва-Усходняй Літве і цэнтрам беларускай адукацыі на працягу свайго існавання (1919–1944). Гэта была адукацыйная ўстанова высокага ўзроўню, таму там, акрамя беларусаў, вучыліся і яўрэі, і палякі, рускія, латышы.

Сёння гімназія імя Францыска Скарыны з'яўляецца адзінай поўнай сярэдняй беларускай школай за мяжой. Школа імя Францыска Скарыны ў Вільнюсе – цэнтр беларускай культуры. Шэраг прадметаў у школе выкладаецца на беларускай мове. Спецкурс «Этнакультура Беларусі» знаёміць з асаблівасцямі беларускай мовы і культуры. Але ў школе ганарацца не толькі тым, што ўплываюць на фарміраванне пачуцця патрыятызму ў сваіх вучняў, але і іх высокім узроўнем адукацыі. Выпускнікі школы маюць магчымасць паступаць ва ўстановы вышэйшай адукаці Рэспублікі Беларусь.

2 верасня 2002 года па ініцыятыве Аб'яднання беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы ў школе быў адкрыты музей беларускай літаратуры і мастацтва. Асноўную экспазіцыю музея складаюць карціны беларускіх мастакоў, якія жывуць у Літве, карціны, падораныя Саюзам мастакоў Рэспублікі Беларусь, экспанаты, якія распавядаюць пра класікаў беларускай літаратуры, выстава «Янка Купала ў дыялогу культур», рэдкія, унікальныя кнігі. У фондах музея беражліва захоўваюцца шматлікія фатаграфіі, фотакопіі рукапісаў Я. Купалы, Я. Коласа, Ф. Багушэвіча, Цёткі, якія перадаў Віленскі музей імя А. С. Пушкіна.

У 2001 г. у Вільні было зарэгістравана грамадскае аб'яднанне «Беларускі музей імя Івана Луцкевіча», якое ставіць мэтамі даследаванне старажытнай гісторыі, фіксацыю гістарычнага працэсу і прэзентацыю гістарычных ведаў у грамадстве. Сваю дзейнасць стваральнікі грамадскага аб'яднання разумеюць як працяг віленскай музейнай традыцыі, якая была закладзена Іванам Луцкевічам [11]. Віленскі беларускі музей імя Івана Луцкевіча, дзейнасць якога была ўмоўна падзелена на два перыяды (1921–1939, 1939–1945), захаваўся ў памяці наведвальнікаў як сапраўдная «беларуская Мека», цэнтр культурнага жыцця беларусаў у Вільні, «святое месца». Установа, якая збірала, захоўвала, даследавала, папулярызавала сведчанні слаўнай беларускай гісторыі, этнаграфіі, мастацтва. Згадкі пра Музей можна знайсці ва ўспамінах вядомых беларускіх грамадскіх дзеячаў, паэтаў, мастакоў, педагогаў і звычайных наведвальнікаў, якіх кранулі багацці, сабраныя шчырым захавальнікам Іванам Луцкевічам. Трагічны лёс Музея і яго заснавальнікаў адбіўся

ў памяці сучаснікаў. Гэта стала значнай стратай для ўсяго беларускага народа. Менавіта таму не спыняюцца намаганні сучасных навукоўцаў, накіраваные на пошук, вывучэнне і аднаўленне страчанай спадчыны. Адраджэнне Віленскага беларускага музея Івана Луцкевіча – гэта аднаўленне і захаванне нацыянальнай памяці беларусаў, вяртанне нацыянальнага сімвала [10, арк. 10].

У Літоўскай Рэспубліцы дзейнічаюць «Таварыства беларускай мовы», «Таварыства беларускай культуры». На факультэце славістыкі Віленскага педагагічнага ўніверсітэта – кафедра беларускай мовы, літаратуры і этнакультуры. У самой Вільні, Салечніках (Шальчынінкай), Свянцянах (Швянчонісе), Вісагінасе, Друскінінкаі і іншых месцах культурна-асветную працу вядуць 15 беларускіх арганізацый, сярод іх ёсць Грамадства былых палітвязняў. Яны аб'яднаны вакол Каардынацыйнага савета беларускіх суполак у Літве. З 1991 года беларускія мастакі ў Вільнюсе (А. Аблажэй, А. і К. Балаховіч, С. Зелянко, В. Кузьменка, В. Падбярэзскі, А. і С. Поклад і іншыя) удзельнічаюць у выставах Аб'яднання беларускіх мастакоў краін Балтыі «Маю гонар». З 1997 г. выдаецца газета беларусаў Літвы «Рунь» [Там жа, арк. 4; 12].

Беларускае насельніцтва Літвы можна падзяліць на дзве групы – аўтахтоннае насельніцтва і насельніцтва, якое мігравала з тэрыторыі Беларусі ў пасляваенны час. Падзел звязаны з гістарычнымі працэсамі, якія адбываліся на працягу XX стагоддзя. На ідэнтыфікацыю чалавека з той альбо іншай нацыяй уплываюць розныя фактары. Па-першае, палітыка дзяржавы ў якой пражывае чалавек і з якой атаясамлівае сябе. Па-другое, працэсы ўрбанізацыі і глабалізацыі. Па-трэцяе, рэлігійны фактар. З улікам вышэйпералічаных умоў неабходна разглядаць этнакультурныя асаблівасці беларускага насельніцтва Літвы.

Адносна месца жыхарства беларусаў Літвы можна падзяліць на дзве групы – вясковае і гарадское насельніцтва. Для вясковага насельніцтва характэрным з'яўляецца пражыванне ва ўласных дамах з падворкам і гаспадарчымі пабудовамі. Беларускае гарадское насельніцтва ў большасці пражывае ў кватэрах шматпавярховых дамоў [Там жа, арк. 3].

Сучасныя будаўнічыя тэндэнцыі з'яўляюцца дамінуючымі пры пабудове і абсталяванні ўласнага жылля беларусаў Літвы, але ў той самы момант людзі імкнуцца ўключыць у інтэр'ер жылля свае нацыянальныя адметнасці: ручнікі з беларускім арнаментам, саламяныя павукі, гістарычныя дзяржаўныя сімвалы і г.д. [Там жа, арк. 1].

Ва ўмовах глабалізацыі для захавання сваёй ідэнтычнасці малыя этнічныя групы звяртаюцца да сваіх традыцый. Традыцыйная культура беларусаў ёсць адзін з вызначальных нацыянальных сімвалаў. Асаблівасцю захавання і рэпрэзентацыі беларускай культуры ў Літве з'яўляецца яе адраджэнне сімвальнай элітай у гарадскім асяроддзі (пад сімвальнай элітай будзем разумець сацыяльна актыўную частку насельніцтва, пераважна навуковай і творчай інтэлігенцыі, якая стварае і тыражуе этнічныя каштоўнасці і сімвалы і тым самым фармуе і мабілізуе самасвядомасць беларускага насельніцтва ў Літве). У сельскай мясцовасці колькасць беларусаў, якія сябе прылічваюць

да беларускай нацыі, нязначная. Тлумачыцца гэта некалькімі прычынамі. Па-першае, адсутнасцю сувязі пакаленняў, калі частка беларусаў у пасляваенны час была рэпрэсіравана. Па-другое, аддаленасцю ад гарадскіх цэнтраў, дзе пытаннямі адраджэння і захавання займаюцца беларускія арганізацыі. Па-трэцяе, рэлігійны фактар, калі часам у адпаведнасці з прыналежнасцю да пэўнай канфесіі чалавек адносіць сябе да той альбо іншай нацыі. Неабходна ўлічваць, што ўплыў і аўтарытэт мясцовай царкоўнай іерархіі для вясковага насельніцтва больш значны, чым расповеды «незнаёмцаў» пра беларускую культуру. У дадзеным накірунку спрацоўвае механізм падзелу «свой – чужы».

Адным з крытэрыяў вызначэння беларусаў Літвы як асобнай этнічнай групы з'яўляецца моўны. На сучасным этапе беларуская мова ў Літве юрыдычна і фактычна – мова беларускай этнакультурнай групы з абмежаваным характарам, ужываецца пераважна ў паўсядзённым жыцці і ў вуснай форме. Валоданне ёю ці яе вывучэнне тлумачыцца найперш суб'ектыўнымі прычынамі. Тым не менш яна знаходзіць пэўную рэалізацыю на макра- і мікраўзроўнях у літоўскім грамадстве і выглядае наступным чынам: 1) выкарыстанне беларускай літаратурнай мовы ў літаратурнай унармаванай і прастамоўнай разнавіднасцях; 2) сфера ўжывання беларускіх дыялектаў на беларуска-літоўскім памежжы; 3) беларускі лінгвістычны ўплыў на маўленне прадстаўнікоў іншых нацыянальных груп [8, с. 226].

У той самы час неабходна адзначыць, што валоданне і выкарыстанне беларускай мовы не з'яўляўляецца поўным крытэрыем ідэнтыфікацыі носьбіта з нацыяй, на мове якой ён размаўляе. Пацвярджэннем з'яўляецца артыкул навукоўца Валерыя Чэкмана, які быў напісаны па выніках мовазнаўчай экспедыцыі 1989 г. па тэрыторыях, дзе пражываюць палякі. У сваёй працы аўтар разглядае пытанні «простай мовы» (беларускай) і суадносін выкарыстання беларускай, польскай і літоўскай моў польскім насельніцтвам Літвы. Даледчык звяртае ўвагу на тое, што ўсё беларускамоўныя палякі лічаць польскую мову хутчэй за культурную і прэстыжную. З чужымі людзьмі стараюцца заўсёды размаўляць па-польску. На пытанне, якую мову беларускамоўныя палякі лічаць за сваю родную (нават, тыя якія размаўляюць выключна па-беларуску), без разваг абіраюць польскую, толькі адзінкі назвалі роднай мовай «простую», ніхто з апытаных не называе яе беларускай [13].

Вызначальным нацыянальным сімвалам беларусаў з'яўляецца традыцыйны касцюм. Сярод беларусаў Літвы распаўсюджаны касцюмы з дзвюма асноўнымі відамі вышыўкі – геаметрычнай і раслінай. Традыцыйны касцюм беларусы апранаюць на святы, у паўсядзённым жыцці – сучаснае адзенне.

У пытанні захавання традыцыйнай культуры неабходна вылучыць два ўзроўні. Першы – сямейныя традыцыі. Згодна са словамі Міраславы Русак: «У нас так прынята. Вялікае свята – Вялікдзень, Каляды – збіраемся ўсёй сям'ёй, прыязджаюць дзеці, унукі… на Каляды гатовім ежу. Патрэбна каб было 12 страў, вось дамаўляемся і кожная гатовіць. Гэта постная куцця – усё без мяса. Абавязкова куццю робім, кожны з нас спрабуе» [10, арк. 2].

Другі – рэпрэзентацыя і захаванне беларускімі арганізацыямі. Так са слоў Валянціна Стэха: «Мы рыхтуемся загаддзя. Вось, напрыклад, перад Калядамі даём абвестку, што ў гэтым годзе калядаваць будзем у такі дзень.

Часам людзі самі тэлефануць запрашаюць, часам самі звонім – удакладняем. У дзень калядавання з гуртом “Сябрына” ідзем віншаваць людзей са святам з казой, зоркай. За столькі год людзі ўжо ведаюць і самі запрашаюць» [10, арк. 4]. Традыцыйным стала для беларусаў Літвы «Свята беларускай песні», якое адбываецца штогод у розных гарадах літоўскай дзяржавы. На мерапрыемства прыязджаюць беларускія калектывы з усёй Літвы, таксама на свята запрашаюць калектывы з Беларусі [Там жа, арк. 1].

У той жа самы момант у жыцці беларусаў Літвы ёсць і цяжкасці. Адна з іх – стварэнне беларускай дыяспары. Справа ў тым, што актывістамі нацыянальнага ўздыму ў 1980-я – 90-я гг. ў большасці былі людзі ва ўзросце 20–40 гадоў. Прайшло некалькі дзясяткаў гадоў – моладзь, якая нарадзілася ў Літве ў гэты перыяд далучаецца да працэсу глабалізацыі: выязджае вучыцца і працаваць за межы Літвы, а людзі, якія прыязджаюць з Беларусі з мэтай навучання, працы – не праяўляюць сваёй актыўнасці. Аднаўленне беларускіх суполак практычна не адбываецца і ў выніку колькасць беларусаў у Літве зніжаецца. Калі ў 1989 г. паводле дадзеных перапісу ў Літве пражывала 63 тысячы беларусаў, то за 12 гадоў колькасць беларусаў зменшылася: паводле дадзеных Літоўскага статыстычнага дэпартамента, на тэрыторыі Літоўскай дзяржавы ў 2001 г. пражывала 42 866 беларусаў [14].

Такім чынам, у выніку геапалітычных змен на карце Еўропы на працягу XX ст. беларусы ператварыліся з карэнных жыхароў Віленшчыны ў нацыянальную меншасць Літоўскай дзяржавы. Сёння беларусы ў Літве з’яўляюцца трэцяй па колькасці нацыянальнай меншасцю. Уздым беларускага жыцця на сучасным этыпе ў Літоўскай рэспубліцы звязаны з пачаткам перабудовы. Для развіцця беларускіх цэнтраў у Літве важнае месца займае стабільная грамадска-палітычная і культурная сітуацыя ў Беларусі, дзяржаўная зацікаўленасць у захаванні сваіх этнічных асаблівасцяў. Этнанацыянальныя ідэалогіі, захаванне і распрацоўкі творчай элітай вобразаў мінулага спрыяюць кансалідацыі беларускай супольнасці і фарміраванню этнічнай ідэнтычнасці розных узроўняў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Гурко, А.* Сувязі беларускага этнасу / А. Гурко // Наука. – 2016. – № 33. – 15 жн. – С. 6.

2. *Коваль, В.* Контакты белорусского и украинского диаспор межвоенного периода [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://docviewer.yandex.by/?url=ya-serp%3A%2F%2Fpdf.kamunikat.org%2.F13178-10.pdf&lang=be&c=55606669feb7. – Дата доступа : 03.05.2015 г.

3. *Адамковіч, А.* Беларусы ў Літве: учора і сёння / А. Адамковіч // Вільня. – Вільня, 2010. – Кн. 1. – 200 с.

4. *Ціхаміраў, А.* З гісторыі беларускай дыяспары ў Літве / А. Ціхаміраў // Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя / пад рэд. А. Мальдзіса, А. Смаленчука. – Мінск, 2006. – 359 с.

5. *Багалейша, С. В.* Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915–1924 гг. / С. В. Багалейша. – Мінск : Беларус. дзярж. аграр. тэхн. ун-т, 2014. – 231 с.
6. *Плыгаўка, Л.* Беларуска-літоўскія рэгіянальныя кантакты ў сістэме інтэрферэнтных з'яў полікультурнай зоны / Л. Плыгаўка – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2001. – 39 с.
7. *Плыгаўка, Л.* Сацыялінгвістычная сітуацыя ў сучаснай Літве / Л. Плыгаўка // Slovenska-slovaskė jazykovė, literarne a kulturne vzt`ahy. – Prešov, 2007. – С. 210–218.
8. *Плыгаўка, Л.* Беларуская мова ў Літве: сацыякультурны і лінгвістычны аспекты / Л. Плыгаўка. – Vilnius : Vilniaus ped. univ. leidykla, 2009. – 340 с.
9. Kalba ir tarpkultūririe komunikacija / L. Plygavka. – Vilnius : Vilniaus ped. univ. leidykla, 2009. – 190 p.
10. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Ф. 6. Воп. 14. Спр. 226.
11. Виленский музей [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://vilnia.com/museum/default.asp?newsId=16. – Дата доступа : 18.11.2014 г.
12. Рунь / заснавальнік Таварыства беларускай культуры ў Літве. – Вільнюс. – 1997–2001.
13. *Чэкман, В.* Над этнічнай і моўнай мапай палякаў Літвы / В. Чэкман // Рунь. – 1996. – № 4. – С. 6.
14. Статистика Литвы [Электронный ресурс] // Литовский Департамент статистики. – Режим доступа : http://www.stat.gov.lt/07.pdf. – Дата доступа : 18.11.2014 г.

Т. М. Саўчук (Мінск)

СПЕЦЫФІКА ЭМПІРЫЧНАЙ АРГУМЕНТАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКА- І РУСКАМОЎНАЙ ГУМАНІТАРЫСТЫЦЫ

Зварот да эмпірычнай аргументацыі ў дыскурсе гуманітарных навук – натуральная і таму пашыраная з'ява. Абгрунтаванне новых ідэй, доказ гіпотэз, падтрымка пэўных пунктаў погляду звычайна прадугледжвае выкарыстанне не толькі тэарэтычных разважанняў, але і фактычных даных. Прыватныя выпадкі, да якіх апелюе аргументатар падчас доказу тэзіса, уваходзячы ў структуру аргументацыі, набываюць статус фактаў і ўтвараюць асобую – фактуальную, або эмпірычную, мадэль аргументацыі. Выкарыстанне фактуальных схем у аргументатыўнай практыцы грунтуецца на ўніверсальным механізме іх уздзеяння: калі рэцыпіент згаджаецца з эмпірычнымі аргументамі, ён абавязкова прымае і тэзіс на падставе канвенцыянальнай (узгодненай і агульнаўсвядомленай) сувязі паміж складнікамі аргументацыі.

Аналіз навуковых артыкулаў камунікатыўных накірункаў гуманітарыстыкі (сацыялогіі, псіхалогіі, культуралогіі, лінгвістыкі, журналістыкі) дае падставу меркаваць, што эмпірычная аргументацыя ў навукова-гуманітарным дыскурсе характарызуецца спецыфічнасцю, крыніца якой – своеасаблівасць гэтага тыпу дыскурсу.

Выяўленне адметнасці аргументацыі патрабуе кагнітыўна-прагматычнага падыходу, які дае магчымасць вылучыць і ахарактарызаваць разнавіднасці фактуальных аргументатыўных схем. Звернемся да агульнапрынятай тыпалогіі, вытокі якой можна адшукаць у арыстоцелевай «Рыторыцы», але якая набыла сучасны выгляд у апрацоўцы Х. Перэльмана – заснавацеля так званай неарыторыкі [1]. Факты (прыватныя выпадкі) у складзе эмпірычнай аргументацыі, паводле Х. Перальмана, могуць разглядацца ў трох іпастасях: як прыклады, ілюстрацыі і ўзоры/антыўзоры. Прагматычныя адрозненні паміж імі ў наступным. Прыклады накіраваныя на прывядзенне аўдыторыі да пэўнага абагульнення, а таксама на падмацаванне зробленага абагульнення. Ілюстрацыі прызначаныя замацаваць перакананасць рэцыпіента ў правільнасці ўжо вядомай і прынятай заканамернасці, падмацаваць усталяванае правіла, узмацніць эфект яго прысутнасці ў свядомасці аўдыторыі. Мэта ўзораў і антыўзораў, адпаведна, – схіліць да пераймання пэўнага тыпу паводзін або адхіліць ад яго [Там жа, с. 207–224].

Выкарыстанне дадзеных мадэляў у навукова-гуманітарнай камунікацыі звязана з адказам на шэраг праблемных пытанняў, якія тычацца крытэрыяў дыферэнцыяцыі фактуальных схем, спосабаў іх вербальнага прадстаўлення, а таксама ўплыву дыскурсіўна-тыпалагічных прымет гуманітарыстыкі на прагматыку фактаў.

Дыферэнцыяцыя эмпірычных мадэляў прадугледжвае перш за ўсё ўлік функцыянальнай накіраванасці прыватнага выпадку, які ўключаецца ў склад абгрунтавання: абагульненне для прыкладу, пацвярджэнне для ілюстрацыі, рэгламентацыя для ўзору/антыўзору.

Абапірацца можна таксамі і на фармальныя паказчыкі, адзін з якіх – колькасць фактуальных пасылак. Так, для карэктнага абагульнення патрабуецца некалькі тыповых прыкладаў. (Ужыванне множнага ліку, дарэчы, з’яўляецца прагматычна важкім.) Пры гэтым яны павінны быць зразумелымі, праўдзівымі, бясспрэчнымі, рэпрэзентатыўнымі, разнастайнымі, стымуляваць да пераходу ад адзінкавага або прыватнага да агульнага, гэта значыць выконваць функцыю тыпізацыі. Ізаляваны факт звычайна не вядзе да абагульнення, а таму не мае статусу прыкладу і разглядаецца як дадатковая інфармацыя, тлумачэнне, гэта значыць як складнік аргументатыўнага рэсурсу, які толькі падтрымлівае аргументацыю, але не ўтварае яе.

Ілюстрацыя ж, у свою чаргу, звычайна адзінкавая. Яна не прадугледжвае пераходу да абагульняючага палажэння, а толькі палягчае разуменне правіла. У адрозненні ад няўдалага прыкладу, які можа паставіць пад сумненне прымальнасць абагульняючага палажэння і нават абвергнуць яго, недарэчная ілюстрацыя не ўплывае на прымальнасць тэзіса. Яна толькі сведчыць пра некампетэнтнасць аргументатара, які не разумее агульнага палажэння або не здольны адэкватна яго падмацаваць. Таму патрабаванні да ілюстрацыі менш жорсткія, чым да прыкладу: яна можа выклікаць сумненні, быць не абавязкова тыповай, але эфектнай, прыцягваць увагу, закранаць эмацыянальную сферу, уздзейнічаць на ўяўленне аўдыторыі.

Яшчэ адным фармальным паказчыкам эмпірычных схем з’яўляецца парадак іх падачы. Часцей за ўсё прыватныя выпадкі, якія папярэднічаюць тэзісу, разглядаюцца як прыклады, а тыя, што размяшчаюцца пасля яго, – як ілюстрацыі. Такі падыход адлюстроўвае натуральны рух думкі па інэрцыі ад прыватнага да агульнага, таму падаецца відавочным. Але трэба ўлічваць, што паслядоўнасць падачы фактаў у натуральнамоўнай камунікацыі нефіксаваная: яна вызначаецца прагматыкай выказвання. Калі абагульняючы тэзіс – парадаксальнае палажэнне, лепш падрыхтаваць да яго шэраг прыкладаў, калі ж тэзіс не з’яўляецца складаным і супярэчлівым, прыклад дарэчны і пасля абагульнення.

Розніца паміж прыкладам і ілюстрацыяй не заўсёды заўважная, а вось мяжа паміж гэтымі тыпамі фактаў і прыватнымі выпадкамі, якія падаюцца як узоры, вельмі выразная. Справа ў тым, што, прыклады і ілюстрацыі падмацоўваюць дэскрыптыўныя (апісальныя) выказванні (пра тое, што ёсць), а ўзоры/антыўзоры падтрымліваюць аксіялагічныя (ацэначныя) суджэнні (пра тое, што павінна быць). Ацэначнасць (пазітыўная для ўзору, негатыўная для антыўзору) – галоўная дыстынктыўная рыса фактаў рэгламентуючага тыпу. Акрамя таго, суб’ект, паводзіны якога падаюцца як ўзорныя, павінен, па словах Перэльмана, «валодаць мінімумам прэстыжу» [6, с. 219], толькі тады яго дзеянні будуць годнымі пераймання. Варта заўважыць, што неабходнай умовай дзейснасці пасылак-рэгламентацый з’яўляецца супадзенне каштоўнасных арыенціраў прапанента і аўдыторыі.

Эмпірычная аргументацыя звычайна маркіруецца вербальнымі сродкамі. Індыкатарамі прыкладаў і ілюстрацый з’яўляюцца выразы рознай лексіка-граматычнай прыроды кшталту: *Аналіз даных дыяграм дазваляе зрабіць вывад, што…* , *Згодна з атрыманымі данымі можна гаварыць пра…* , *Рэзультаты тэсціравання дазволілі меркаваць, што…* , *Паводле статыстыкі*, *Па выніках сацапытанняў*; *Па выніках нашага анкетавання*; *Згодна з вынікамі анкетавання*, *Па атрыманых даных*; рус. *Приведенные результаты позволяют сделать вывод о том, что...* , *Исходя из приведенных данных, можно сделать два вывода...* , *Эти цифры дают представление о...* , *Эти данные говорят о том, что…* , *Как видно из данных таблицы, Как видно из рисунка, По данным государственной статистики* і інш.

У складзе дыскурсіўных клішэ з названай прагматыкай рэгулярна ўжываюцца вытворныя дзеясловаў *паказваць*, *сведчыць*, *пацвярджаць/показывать*, *свидетельствовать*, *подтверждать*: *Разгледжаны намі перыяд паказвае, што…* , *Гэта сведчыць пра тое, што…* , *Аналіз адказаў на пытанне сведчыць, што…* , *Разгледжаныя змены з’яўляюцца паказчыкам…* , *Як сведчыць фразеалагічны матэрыял…* , *Рэзультаты даследавання пацвярджаюць наступную гіпотэзу…* , *На аснове даных, атрыманых у ходзе даследавання, былі пацверджаны…* , *Паказчыкі ў дыяграмах пацвярджаюць…* , *Пацвярджаннем гэтага служыць і…* , *…што з’яўляецца сведчаннем…* ; рус. *Результаты многочисленных исследований подтверждают…* , *Полученные результаты свидетельствуют о...* , *Приведенные выше примеры показы-*

вают, как... , *Элементарный языковой эксперимент показывает, что...* , *Как показывают материалы...* , *Первые наблюдения показали, что...* , *Это/вот еще одно подтверждение*, *Анализ статистических данных свидетельствует о том, что…* , *Анализ полученных в ходе опроса материалов показывает, что...* , *Проведенный социологический опрос показал, что...* , *Этот показатель отражает, насколько важно…* , *Показателем этого является…* , *…о чем свидетельствуют контексты*, *…что экспериментально подтверждает…* , *…что подтверждается многочисленными фактами* і інш.

Што тычыцца маўленчых формул з лексемамі *прыклад*, *ілюстрацыя/ пример*, *иллюстрация*, вербалізатараў *так*, *напрыклад/так*, *например*, яны дэманструюць прагматычную мнагазначнасць і выкарыстоўваюцца недыферэнцыравана: іх функцыянальная накіраванасць выяўляецца ў кансітуацыі. У наступным дыскурсіўным фрагменце лексічнае і прагматычнае значэнні маркёра эмпірычнай аргументацыі не супадаюць: *Тагачасныя «паўстанцы» прадэманстравалі сваё бяссілле. У такім бунце няма «палітычнай праграмы», таго, што можа нанесці капіталізму значнае пашкоджанне (а розных «супраціўленцаў» капіталізм здольны выкарыстаць і самастойна: **напрыклад**, актывісты Greenpeace чамусьці ніколі не ладкуюць свае акцыі супраць шкодных прадпрыемстваў, якія Еўропа вынесла на афрыканскі кантынент, затое перад камерамі эфектна штурмуюць на сваіх лодках кітабойныя судны)* [2, с. 55]. Дадатковым сродкам кваліфікацыі прыватнага выпадку як антыўзору тут служыць іранічная афарбоўка выказвання.

Дарэчы, іронія можа быць і асноўным крытэрыем спецыфікацыі фактаў, што, у залежнасці ад кантэксту, разглядаюцца як антыўзоры або ілюстрацыі: рус. *Технические средства и социальные технологии, разработанные для облегчения жизни, замечательно справились со своей задачей. Они настолько облегчили удовлетворение почти любой потребности современного человека, что усилие, необходимое для удовлетворения потребностей и для совершенствования собственно личностных средств развития и самореализации, стало не нужно. <…> В комфортном, легком мире в таком совершенствовании нет нужды. Человек удовлетворен, он сыт, ленив, неактивен. Однако, становится все более типичным достижение этого состояния, так сказать, не деятельностным путем. Человек достигает чувства удовлетворенности, сытости, но он «наедается» досыта и удовлетворяется отбросами, суррогатами, имитациями и иллюзиями, созданными с помощью технических средств. Достигает чувства удовлетворенности способом, который ведет не к развитию, а к деградации* [3, с. 27].

Вербалізацыя ўзараў/антыўзараў з дапамогай лексічных адпаведнікаў і іх вытворных нехарактэрная для гуманітарнага дыскурсу і мае адзінкавыя праяўленні. Больш арганічна выглядае далучэнне да лексемы *прыклад/ пример* ацэначных кваліфікатараў: *У айчыннай прэсе назіраецца паступовае вяртанне да роздуму, меркавання. Хаця гэтым вызначаюцца далёка не ўсе выданні, маюцца **даволі станоўчыя** прыклады. Так, мяняе інфармацыйную тактыку «СБ. Беларусь сегодня»…* [4, с. 84].

Пры ідэнтыфікацыі фактаў, што рэгламентуюць пэўную мадэль паводзін, дапамагае, акрамя паказчыкаў аксіялагічнай мадальнасці, таксама кантэкст: рус. ***Отрадно отметить**, что в настоящее время **многие музыкальные коллективы**, наряду с концертной деятельностью **ведут большую исследовательскую работу. К числу таких коллективов следует отнести** фольклорный ансамбль «Живая Старина»* [5, с. 24].

Нярэдкая з'ява ў навукова-гуманітарнай аргументацыі – спалучэнне ў адным кантэксце ўзораў і антыўзораў – рэалізуе псіхалагічны прынцып кантрасту і, адпавядна, спрыяе дасягненню пераконваючага ўздзеяння: *Аналіз засведчвае прыкметнае зніжэнне тэкставых і літаратурных вартасцей многіх журналісцкіх твораў. Дый іншага і чакаць нельга. Самы таленавіты творца, калі яго паставіць на канвеер, паступова губляе індывідуальны стыль, а то і кваліфікацыю, бо прывыкае да хуткапісу, да шаблону і штампаў. **Добра яшчэ, калі** журналіст трымае сваю тэму, **скажам, як** эканамічны аглядальнікм «Рэспублікі» Андрэй Патрэбін, калі ён спецыялізуецца і выступае ў рамках пэўнага тэматычнага напрамку. **А то ж не!** Сталі майстрамі на ўсе рукі. Учора пра мараль, сёння пра транспарт, заўтра, паслязаўтра пра манастыры, спорт, выяўленчае мастацтва, навуку. Адкуль тут будуць глыбіня і арыгінальнасць меркаванняў* [6, с. 155]. Іранічнасць і эмацыянальнасць выказвання, відавочна, прызначаныя ўзмацніць уздзеянне фактуальнай аргументацыі.

Гуманітарны дыскурс, які пранізаны каштоўнаснымі адносінамі, немагчымы без дэманстрацыі аўтарскай ацэнкі фактаў, што звычайна адбываецца з дапамогай рознага кшталту акцэнтуатараў: ***яркім** прыкладам з'яўляецца*, ***наглядна** ілюструе сказанае*, ***найбольш значным** паказчыкам стала*, ***знакавым** фактам змен можа служыць*, *гэта **зусім справядліва** дае падставу лічыць*, ***красамоўна** сведчыць аб*, *гэты дакумент мае **надзвычай важнае значэнне***; рус. ***ярким** примером тому являются*, *представленные на рисунке данные **со всей очевидностью** свидетельствуют о том, что*, *приведенные данные фиксируют **весьма тревожную** картину… , все это **ясно** указывает на*, ***явно** свидетельствует о том, что*, *является **одним из самых заметных** показателей* і інш.

Аксіялагічныя вербальныя паказчыкі, накіраваныя на тое, каб сфарміраваць адносіны да факта, зрабіць яго прадметам асаблівай увагі, ужываюцца цалкам легітымна. Але нельга выключаць, што такія «памочнікі» выступаюць як сродак інтэлектуальнага і эмацыянальнага ціску на рэцыпіента: рус. *С фактами вымогательства взяток по личному опыту знаком каждый второй из числа опрошенных нами соотечественников. Это – **плохая новость**, поскольку данный факт является **убедительным свидетельством** широкой распространенности бытовой коррупции в нашем обществе. Но ретроспективный взгляд на эту проблему дает **весомые основания** и **для весьма оптимистического вывода**. **Столь явные и высокие темпы** проявления в массовом сознании признаков очищения белорусского общества от коррупции можно считать **впечатляющими*** [7, с. 141].

У выніку такіх маніпуляцый абгрунтаванне замяняецца ўнушэннем, а гэта забаронены прыём. Аналагічна кваліфікуецца неадпаведнасць аксіялагічнай афарбоўкі эмпірычных пасылак сапраўднаму прагматычнаму значэнню выказвання. Такую з'яву мы называем «памылковай навігацыяй»: ***Факт*** *узвядзення журналістам царквы за грошы, зароблены на газетным бізнесе,* ***пераконвае****, што журналістыка дамаглася магчымасці таксама спрабаваць сябе ў пошуках новых светапоглядных арыенціраў для грамадства* [8, с. 111]. Выказванні з прыведзеных фрагментаў (*факт пераконвае*, рус. *данный факт является убедительным свидетельством*) і да іх падобныя варта разглядаць не больш, чым рытарычны прыём, які патрабуе крытычнай інтэрпрэтацыі. Падставы для такога заключэння дае ўсведамленне прынцыповага моманту, што аб'ядноўвае эмпірычную аргументацыю ўсіх разгледжаных тыпаў: абгрунтаванне, пабудаванае на апеляцыі да прыватнага выпадку, заўсёды носіць індуктыўны характар. Гэта значыць, сапраўднасць пасылак не гарантуе сапраўднасці тэзіса, а толькі робіць яго больш ці менш верагодным. Факты не маюць сілы доказу, а іх пераконваючая сіла вызначаецца шматлікімі дыскурсіўнымі параметрамі.

Адэкватная пабудова, якасны аналіз і ацэнка эмпірычнай аргументацыі ў дыскурсе гуманітарных навук магчымыя толькі з улікам вызначаных і ахарактарызаваных вышэй заканамернасцей.

ЛІТАРАТУРА

1. *Перельман, Х.* Из книги «Новая риторика : трактат об аргументации» : пер. с фр. / Х. Перельман, Л. Олбрехт-Тытека // Язык и моделирование социального взаимодействия. – М., 1987. – С. 207–264.
2. *Дракo, І.* Грамадства і пошук ідэй / І. Дракo // Беларус. думка. – 2008. – № 1. – С. 54–58.
3. *Тхостов, А. Ш.* Культура и патология: побочные эффекты социализации / А. Ш. Тхостов, К. Г. Сурнов // Национальный психологический журнал. – 2006. – № 1. – С. 20–27.
4. *Іўчанкаў, В. І.* Слова і ісціна ў парадыгме сучаснай журналістыкі / В. І. Іўчанкаў // Весн. БДУ. Сер. 4. – 2011. – № 2. – С. 83–86.
5. *Мищенко, Л. А.* Коммуникативные функции народного музыкального инструментального искусства: прошлое и настоящее / Л. А. Мищенко // Наука. Искусство. Культура. – Белгород, 2013. – Вып. 2. – С. 13–27.
6. *Стральцоў, Б.* Масавая інфармацыя без удзелу мас? / Б. Стральцоў // Беларус. думка. – 2003. – № 12. – С. 154–158.
7. *Бубнов, Ю. М.* Коррупция как социальная болезнь / Ю. М. Бубнов // Социологический альманах. – Минск, 2011. – Вып. 2. – С. 138–149.
8. *Вараб'ёў, В.* Не «чацвёртая ўлада», а палітычны інстытут грамадства! / В. Вараб'ёў // Беларус. думка. – 2003. – № 4. – С. 108–118.

Змест

ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭННЕ

Беценко Т. П. Язык фольклора в межкультурном осмыслении 3
Краеў А. Ю. Базавая лексіка ў беларускай, рускай і славацкай мовах: агульнае і адрозненні 7
Лысова Н. Б. Дакументальная ўтопія: нататкі пра творчасць Святланы Алексіевіч у кантэксце літаратурна-мастацкага працэсу 12
Паўлоўская Н. Ю. Мадальнасць смехавога дыскурсу і працэсы транспанавання 20

Секцыя 1. БЕЛАРУСКАЯ МОВА І СВЕТ

БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАГА ГУМАНІТАРНАГА ПРАЦЭСУ

Акуленка А. А., Леонцьева В. В. Лексемы кітайскага паходжання ў сучаснай беларускай мове (па матэрыялах лексікаграфічных крыніц і корпусных тэкстаў) 26
Арцёмава В. А. Дэйктычныя дзеясловы ў беларускай і англійскай мовах: параўнальна-супастаўляльны аспект 32
Барысенка В. У. Беларуская мова ў сістэме вышэйшай адукацыі. Вопыт выкладання кітайскім студэнтам 38
Казакевіч Т. Г. Лінгваметадычныя аспекты вывучэння фразеалогіі пры выкладанні беларускай мовы як замежнай 43
Кардубан Ю. М. Кампрэсіўнае словаўтварэнне ў беларускай і англійскай мовах: супастаўляльны аспект 45
Кныш Л. С. Дзеяслоў: некаторыя цяжкасці пры навучанні беларускай мове замежных студэнтаў (праз пасярэдніцтва рускай мовы) 51
Лобань Н. П., Фендзіч А. М. Канатонім *Кастусь Каліноўскі* ў кантэксце мастацкіх твораў 55
Пятигор Н. Г. Ассоциативный метод обучения иностранному языку 58
Старавойтава Н. П. Методыка выкладання беларускай мовы як замежнай з дапамогай скайпу 62
Строк А. В. Асэнсаванне шляхоў вырашэння праблемы нацыянальнай мовы ў Ірландыі як крыніца ідэй для паляпшэння становішча беларускай мовы 65
Сямешка Л. І. Лексічны мінімум у сістэме навучання беларускай мове як замежнай: ад лексемы да канцэпту 71
Якуба С. М. Тэсціраванне ў сістэме навучання беларускай мове як замежнай 80

АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ
СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІНГВІСТЫКІ

Бут-Гусаім С. Ф. Анамастыкон гістарычнай прозы
і навукова-папулярнай літаратуры Зінаіды Дудзюк 85
Вікторка Л. В. Збеларушчаны свет: з досведу ўкладання «Англійска-
беларускага слоўніка геаграфічных назваў і асабовых імёнаў» 91
Гапеева В. М. Валітыўнасць: на мяжы ірэальнасці і рэальнасці 95
Касцючык В. М. Моўная карціна свету беларусаў
у творах Уладзіміра Гніламёдава: асаблівасці рэпрэзентацыі 98
Лапцёнак А. М. Паняцці *значэнне* і *ўжыванне*
ў тлумачальным слоўніку 103
Любецкая К. П. Тэрміналагічная дзейнасць у Беларусі
ў канцы XX – пачатку XXI ст. 107
Мароз С. С., Ржавуцкая М. С. Сродкі выражэння пасесіўнасці
ў сучаснай беларускай літаратурнай мове: лексіка-семантычны ўзровень .. 110
Шилей Е. В. Семантические составляющие наименований
компаний г. Минска 114
Якушава А. М. Словазлучэнні з прыслоўямі ступені
ў беларускай мове (на прыкладзе твораў І. Шамякіна) 118

Секцыя 2. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА І СВЕТ

БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ
СУСВЕТНАГА ГУМАНІТАРНАГА ПРАЦЭСУ

Горбани Эбрахими Н., Васюченко П. В. Литературные журналы
«Бохара» (Иран) и «Узвышша» (Беларусь): опыт типологического
сравнения 122
Воінава-Страха М. М. Карціна свету ў сучаснай беларускай
і таджыкскай навелістыцы 130
Ермаковіч К. А. Метадычныя сродкі фарміравання
каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі вучняў X–XI класаў
у сучасных вучэбных дапаможніках па беларускай літаратуры 134
Лілік О. О. Катастрофізм світовідчуття за повістю С. Алексієвич
«Чорнобильська молитва (хроніка майбутнього)» і романом
В. Дрозда «Листя землі»: елементи компаративного аналізу 140
Міхнюк Т. В. Праблема зямлі ў творах Я. Коласа «Новая зямля»
і І. Мележа «Палеская хроніка» 144
Сігаева С. А. Вобразы-архетыпы антычнай міфалогіі
ў беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя 148

Супранкова Т. С. Легенда аб пане Твардоўскім:
ля вытокаў беларускай фаўсціяны 152
Трацяк З. І. Матыў вяртання ў беларускай прозе
пра Першую сусветную вайну..... 159

БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ І СВЕТ: ШЛЯХ ДА СУСВЕТНАГА ПРЫЗНАННЯ

Бурдзялёва І. А. Нацыянальнае і ўніверсальнае
ў творчасці В. Марціновіча 163
Карнацкая А. В. Самаідэнтыфікацыя як аснова мадэлявання
аксіялагічнай карціны свету ў аповесці У. Сцяпана «Дзед»..... 171
Первушина Л. В. «Свое» и «чужое» как отражение национальной
самоидентификации в эмигрантском творчестве Н. Арсеньевой
американского периода..... 175
Рагачэўская М. С. Святлана Алексіевіч: погляд з замежжа 183
Сцепаноўская В. У. Сродкі стварэння псіхалагізму ў літаратуры
(на матэрыяле аповесці І. Шамякіна «Ахвяры») 189
Ушылава Т. В. Пытанні самавызначэння беларускага народа
ў творах Ф. Багушэвіча 194

Секцыя 3. КУЛЬТУРА, ПЕРАКЛАД

ПЕРАКЛАД ЯК СРОДАК РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў СВЕЦЕ

Букаеў Д. А. Праблема адэкватнасці пры перакладзе сучасных
паэтычных твораў з беларускай мовы на нямецкую..... 197
Гарановіч Т. І. Лінгвапрагматычныя падыходы да перакладу
аповесці У. Караткевіча «Ладдзя роспачы»..... 202
Макоўскі А. А. Рэаліі твораў Э. Хэмінгуэя
ў перакладах на беларускую мову..... 207
Ржавуцкая М. С., Мароз С. С. Граматычныя трансфармацыі
ў перакладзе мастацкага тэксту 213
Русецкая Н. Л. Пераклады твораў У. Някляева на польскую мову..... 217
Таболіч А. У. Захаванне элементаў паэтычнага сінтаксісу
пры перакладзе (на матэрыяле англійскай і беларускай моў) 225
Фурс В. У. Лексічны склад сучасных беларускіх біблійных
перакладаў: крыніцы фарміравання..... 231

БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАГА ГУМАНІТАРНАГА ПРАЦЭСУ

Апанасовіч Н. Г. Полікультурная прастора
ў рамане В. Адамчыка «Чужая бацькаўшчына» 237
Басава Г. І. Дыхатамія «свой – чужы» ва ўзаемадзеянні культур
і яе роля ў міжкультурнай камунікацыі 243
Бахур А. У., Капліч В. М., Шапарава Я. А., Здановіч Н. І.
Экалагічная сцежка «Казка Негарэльскага лесу»
як аб'ект рэпрэзентацыі прыроды і культуры Беларусі 246
Голікава Т. І., Владыка І. В. Беларускія рэаліі ў кантэксце
міжкультурных кантактаў: найменні турыстычных аб'ектаў
у англамоўным даведніку «Belarus» 252
Гуцева Т. Г. Необходимость компаративистского изучения религий
в условиях глобального мира 257
Ізергіна А. М. Да пытання захавання этнічнай ідэнтычнасці
беларускай супольнасці ў Літве 260
Саўчук Т. М. Спецыфіка эмпірычнай аргументацыі
ў беларуска- і рускамоўнай гуманітарыстыцы 266

Навуковае выданне

БЕЛАРУСКАЯ МОВА, ЛІТАРАТУРА, КУЛЬТУРА І СВЕТ: ПРАБЛЕМЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ

Зборнік навуковых артыкулаў
па выніках Міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Мінск, 3–4 лістапада 2016 г.)

Адказны за выпуск *П. В. Васючэнка*

Рэдактары: *А. М. Боброўская, В. С. Забродская, К. І. Кавалёва*
Ст. карэктар *С. А. Іванова*
Камп'ютарная вёрстка *Т. С. Квасавай*

Падпісана ў друк 10.09.2018. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс. Рызаграфія. Ум. друк. арк. 16,04. Ул.-выд. арк. 18,73. Тыраж 100 экз. Заказ 35.

Выдавец і паліграфічнае выкананне : установа адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт». Пасведчанне пра дзяржаўную рэгістрацыю выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў ад 02.06.2017 г. № 3/1499. ЛП № 02330/458 ад 23.01.2014 г. Адрас: вул. Захарава, 21, 220034, г. Мінск.